Барыс
# САЧАНКА

## Выбранае

3

# Барыс
# САЧАНКА

Выбраныя
творы
ў трох
тамах

# 3

# Барыс
# САЧАНКА

## Аповесці

Мінск
«Мастацкая
літаратура»
1995

ББК 84(4Беи)6
С 22
УДК 882.6-31

С $\frac{8820600000-015}{М\ 302(03)-95}$ 99—95

ISBN 5-340-01433-9(т. 3)
ISBN 5-340-01224-7

© Б. І. Сачанка, 1995

# Аповесці

# Баравое рэха

## I

У той дзень, прыйшоўшы дадому абедаць, бацька сказаў мне, што яшчэ да майго прыезду на вакацыі, ён выбіў у Ласіным Лагу латку травы, і добра было б, каб я з'ездзіў і падвярнуў пракосы.

— Хай бы сохла сена,— разважаў ён уголас.— А заўтра, як Бог дасць ды стаяцьме на пагодзе, можна будзе і зграбці яго, у стог скласці...

Рабіць дома мне ўсё роўна не было чаго, і я згадзіўся. Адразу ж з-за стала папраставаў у сенцы, выкаціў на падворак веласіпед, стары, даўні мой веласіпед,— яго купіў бацька, калі я вучыўся ў дзесятым класе,— прывязаў да рамы граблі.

— Ну, я паехаў! — не ведаю каму і навошта крыкнуў я і, паставіўшы нагу на педаль, лёгка ўскочыў на сядзенне.

Ласіны Лог — самая блізкая лясная сенажаць нашага калгаса. Звычайна яе штогод праўленне дзеліць між людзьмі, каб яны касілі там сваім каровам сена. Лугоў у калгасе і без гэтай сенажаці хапае, а сена на працадні — круці не круці — даваць трэба, бо чым жа, як не сенам, будзе зімою карміць чалавек худобу, і ў праўленні надумалі: хай лепей кожны сам накосіць сваёй карове, чым будзе браць з калгаса гатовае. Трава ў Ласіным Лагу расла добрая, ядкая, дастаўляць сена ў вёску таксама няцяжка, бо сенажаць роўная і нават у глыбокую восень сухая, і людзі не адмаўляліся, бралі тое, што ім давалі.

Ехаць у Ласіны Лог можна па розных дарогах. У вёсцы нават смяяліся, што па якой дарозе ні паедзь — патрапіш у Ласіны Лог. Сёння я хацеў быць на сенажаці як можна хутчэй, каб, пакуль схаваецца сонца, параскідаць пракосы, і яны хоць бы трохі абвянулі, прасохлі, а таму і выбраў дарогу самую кароткую і, мусіць, самую нецікавую. Поле, лес, дзялянкі, зноў поле, зноў лес і зноў дзялянкі... Сама дарога — шырокая, расцёртая, разбітая машынамі, з глыбокімі выбоінамі-ямінамі ледзь не на кожным кроку. Па такой дарозе нялёгка было б ехаць на веласіпедзе, даводзілася б яго бадай што больш весці рукамі, чым ехаць на ім,

каб узбоч вузенькім паскам не вілася добра вытаптаная людскімі нагамі і веласіпеднымі коламі сцяжынка. Уз'ехаўшы на яе, я падумаў, як добра, што нехта здагадаўся пракласці гэтую сцяжынку. А то ну кудою б, скажам, вось я дабіраўся да Ласінага Логу? Ды і не толькі я, а і ўсе, у каго ёсць веласіпеды. І тут жа згадаў, што тады, калі бацька купляў мне веласіпед, такіх сцяжынак узбоч дарог не было, бо не было гэтулькі і веласіпедаў — цяпер іх у вёсцы набагата больш, чым сабак, ёсць амаль у кожнага, хто можа нагамі дастаць педалі. Ужо нават не веласіпеды ў модзе, а матацыклы. Кожны падшыванец, што зарабляе капейку, толькі пра тое і марыць, як бы гэта на матацыкл свой сесці ды праехацца з канца ў канец па вёсцы, каб аж вецер увушшу свістаў. Нічога не скажаш, багацее вёска, жыць па-другому пачынае. Не тое, зусім не тое, што было нават чатыры гады таму назад, калі я ад'язджаў у інстытут...

Далей думкі мае павярнулі трошкі ў іншы бок. Я падумаў, што вось я, сын селяніна-калгасніка, у наступным годзе закончу інстытут, атрымаю дыплом інжынера, і гэта анікога ўжо не дзівіць, бо стала звычайнасцю. Разам з тым мне было радасна, што я зноў вярнуўся на ўсё лета ў вёску і зноў, як бывала, еду ў Ласіны Лог варочаць сена, бы я і не вучыўся нідзе чатыры гады, бы я зусім і не выязджаў адсюль нікуды, а жыў і жыў сабе дома, у бацькавай хаце. Зноў я буду прывыкаць да вясковае яды, да грабляў, касы, плуга, зноў буду гэтак жа, як некалі, любавацца, калі ўбачу скіданы мною стог сена ці абагнаны загон бульбы. Зноў, калі мне бывае здасца, што звенавы няправільна перамераў зробленую мною работу і аблічыў, буду хапаць з яго рук драўляную стрыголку, бегаць па лузе ці па полі і мераць, а пасля на кавалачку паперы множыць, дзяліць, дзяліць і множыць, і да хрыпаты ў горле даказваць, што звенавы памыліўся, што ён не так, як трэба, мераў і аблічыў мяне, нібыта мне і папраўдзе гэта так важна і я цалкам залежу ад таго заробленага мною працадня... Зноў я аж цэлых два месяцы буду штодзень ад пуза есці бульбы і сыраквашы, зялёнай цыбулі і агуркоў, і зусім забудуся, што ў горадзе ёсць сталоўкі, кафэ і рэстараны... На два месяцы я стану тым звычайным вясковым хлопцам, якім я і быў да свае вучобы ў інстытуце...

На сенажаці я паставіў веласіпед да камля дуба, што рос навідавоку, на беразе лесу, а сам, перавярнуўшы ўверх зубамі граблі, вострым канцом грабільна пачаў варочаць

сена — яно было зялёнае, духмянае, як чай, і амаль сухое, бо пракосы былі нятоўстыя; толькі дзе-нідзе, пад купінамі ці за кустамі, трава ляжала вялая і спадыспаду, калі яе перавернеш, белая і сырая. І я хадзіў ад пракоса да пракоса і з кожнай хвілінай адчуваў усё больш і больш, як мае мускулы наліваюцца пругкай і нейкай асабліва прыемнай сілай, як пачынаюць зусім так, як і некалі, брыдзець далоні рук, як мне робіцца лёгка і добра ад таго, што я зноў узяўся рабіць тое, ад чаго патроху пачаў быў ужо адвыкаць. Сонца стаяла высока і пякло, смаліла па-паўдзённаму, палетняму, але я не зважаў на гарачыню — махаў і махаў граблямі, раскідваў і раскідваў грабільнам па пакошы сена. І толькі калі перавярнуў апошні пракос і выйшаў зноў на бераг лесу, да свайго веласіпеда, адчуў лёгкую стому ў плячах і што з непрывычкі я трошкі спацеў. Я расцягнуў замок тэніскі і паваліўся на траву ў цень, што падаў ад дуба,— дуб гэты быў тоўсты, стары і неяк цудам ацалеў тут, на беразе. Голле знізу было абсечана — церабілі дзядзькі, каб паслаць пад стагі адзёнкі,— камель парэпаны, карысты, а вершаліна аблуплена, абсмалена перуном і ўсё адно густая, пышная.

З-пад дуба добра аглядалася сенажаць — шырокі хвалісты абсяг травы над лёгкімі павевамі ветру то чырванеў, то жаўцеў, то бялеў ад красак, што распукнуліся і сама цвілі. Дзе-нідзе, бліжэй да лесу, рыжэлі, бы лінейкі ў школьным сшытку, пракосы. Два стажкі амаль хаваліся ў траве далёка, аж з таго краю сенажаці. Кружыў высока ў паднябессі коршак, павольна, нібы нешта хацеў зрабіць, ды ўсё не асмельваўся. Свістаў на беразе лесу ў кустах касец, пішчаў крутагаловік. І ўсюды нылі камары. Нылі і надта ж балюча кусалі за голыя рукі. Каб адкараскацца ад надакучлівай заедзі, я прывязаў зноў да рамы веласіпеда граблі і, злёгку націскаючы на педалі, выехаў на дарогу.

Праўда, вельмі хутка я адумаўся, што рабіць дома мне няма чаго, і збочыў з дарогі направа, на вузкую лясную сцяжынку, што вяла да леснічоўкі,— у ёй, гэтай леснічоўцы, жыў са сваёй сям'ёй ляснік Тамаш Буда. Я і сам не ведаю, навошта я гэта зрабіў. Ці то мне рупіла палюбавацца старымі выносістымі соснамі, што стаялі адсюль скрозь аж да самай леснічоўкі, ці то захацелася паглядзець, ці паспелі на баравых прагалах суніцы, ці то цягнула, вабіла мяне тая старая і бадай што апошняя ў нашых мясцінах леснічоўка, якую я не бачыў вось ужо блізка тры гады... Аднак, як бы там ні было, я так рашуча крутнуў

руль веласіпеда направа, што пра тое, каб вяртацца дадому па той дарозе, па якой я ехаў на луг, нечага было і думаць.

Сцяжынка была цесная, месцамі яна ледзь прадзіралася праз зараслі крушыны, алешніку і лазы. Але гэта толькі напачатку, бо далей ішоў змрочны хвойнік, бор. Тут сцяжынка падымалася ўгору і з кожным кіламетрам прыкметна шырэла. Сонца, хаця і зрушыла з паўдня, усё яшчэ пякло нясцерпна, і нават у засені дрымучых дрэў адчувалася яго ўсемагутная сіла. Паветра, настоенае на пахах смалы-жывіцы і лясных красках, было густое, цяжкае. І я, патросшыся трохі па карэннях, што вытыркаліся, пляліся вузламі спрэс па сцяжынцы, злез з веласіпеда і пакаціў яго ўзбоч па порсткім і гнуткім верасе.

За маладымі купчастымі хвойкамі, за якімі пачыналіся новыя, толькі што адведзеныя дзялянкі, я спыніўся: насустрач мне, проста па сцяжынцы, торкаючы сюд-туд пыскаю, бег вожык. Натапыраны, нашашэраны, іголкі так і тырчалі ва ўсе бакі; на іх, там дзе спіна, жаўцелі два сухія бярозавыя лісцікі — вожык, няйнакш, іх падабраў і некуды нёс.

Я стаіўся — чакаў, калі вожык дабяжыць да мяне. Тады сцягнуў з галавы кепку і накінуў яе на вожыка. Вожык, спалоханы, спыніўся. Падкаціўшы да камля сасны веласіпед, я падняў шапку і рукою ўгарнуў у яе вожыка — ён быў тоўсты і надзіва рахманы, нават не скруціўся ў клубок, не схаваў у калючкі сваю востранькую сівую пыску — толькі злосна пырхнуў і чхнуў, бы ўсё адно малое дзіця, якому неспадзявана далі панюхаць табакі.

Выпускаць вожыка, каб ён бег і далей сваёй дарогай, мне не хацелася. «Завязу яго дадому, хай пажыве трохі ў нашай хаце, мышэй паловіць. А то развялося іх, хоць ты ката ў суседзяў прасі...» — падумаў я і паставіў шапку з вожыкам на багажнік. Але як толькі я ступіў крок наперад, вожык скаціўся ў ягаднік. Я зноў спыніўся, узяў з багажніка шапку і зноў угарнуў у яе вожыка. І ў гэты момант пачуў, што паблізу мяне зашуршэла лісце. Я выпрастаўся: па лесе, адтуль, дзе былі новыя леспрамгасаўскія дзялянкі і дзе ўсюды на соснах жаўцелі смалістыя лапы падсочкі, ішла дзяўчына; ішла павольна, раз-пораз прыгінаючыся, каб не зачапіцца галавою за голле,— у руках яна несла вядро, поўнае ўкоптур смалы-жывіцы. Сіняе, у белыя бубачкі плацце было паднята вышэй, чым звычайна носяць у вёсцы дзяўчаты, і з-пад яго нават у рослым ягадніку добра відаць былі аж вышэй калень стройныя

загарэлыя ногі. Дзяўчына павярнулася, каб перамяніць з рукі ў руку вядро, і ў ёй я пазнаў Марту, дачку лесніка Тамаша Буды. Сэрца маё трывожна забілася, зусім так, як білася яно некалі, калі я прыязджаў да Марцінага брата Юзіка (разам з ім мы рыхтаваліся да экзаменаў у інстытут) і бачыў Марту. Тады яна вучылася яшчэ ў школе, толькі перайшла ў дзесяты клас і не была замужам...

Марта зірнула на мяне і, вядома, таксама мяне пазнала.

— Змітрок! — ускрыкнула, нібы спалохаўшыся, яна. Паставіла вядро з жывіцай у ягаднік і ў наступную хвіліну была ўжо ля мяне, на сцяжынцы.— Даўно прыехаў?

— Ды не, толькі што...

Мы стаялі зусім побач і не зводзілі адно з аднаго вачэй. Апошні раз мы бачыліся гады тры таму назад. Гэта было таксама ўлетку, калі я прыехаў на канікулы, таксама ў лесе, нават на гэтай самай сцяжынцы, толькі трохі бліжэй да поля. Я ішоў тады па грыбы, а Марта бегла ў вёску, нечага трэба было ёй купіць у магазіне. Яна, гэтак жа вось, як цяпер, падала мне руку і, помніцца, сказала: «Змітрачок, павіншуй мяне, я выйшла замуж!» Каб толькі ведала яна, як балюча кальнулі мяне тыя яе словы! Не, тое, што Марта выйшла замуж, было мне не навіна. Пра гэта я ведаў яшчэ ў горадзе. Ды адно чытаць пра такое ў пісьме, іншае чуць з вуснаў той, пра якую столькі мроіў, якую ў думках даўно ўжо інакш і не зваў, як сваёй. «Я ведаю,— сказаў тады я,— і, вядома, віншую...» У мяне, мусіць, быў вельмі разгублены выгляд і не той голас, якім я гаварыў звычайна, бо Марта раптам спыталася: «А чаму — вядома? — і паглядзела мне ў вочы.— Ты што, не рады?..» «Не, чаму ж, я рады»,— сказаў я, але так, што Марта здагадалася, што ў мяне на душы. «Даруй мне, Змітрок,— сказала яна.— Я думала, што ў цябе ўсё прайшло. Помніш, ты ж пісаў мне ў апошнім сваім пісьме...» Так, я добра помніў тое пісьмо. Я паслаў яго Марце ў злосці ў той дзень, калі мне напісалі з вёскі, што Марта вечар у вечар ходзіць у клуб і ля яе ўвіхаецца нейкі шафёр з геалагічнай партыі, якая шукала ў нашай мясцовасці вось ужо некалькі год запар нафту. У тым пісьме была праўдай адна толькі мая злосць, а ўсё астатняе — і дзяўчына, з якой я быццам дружу ў горадзе, і вечары, на якія я з ёю хаджу, і танцы, кіно — усё, усё ад пачатку да канца было выдумка, плён мае хваравітае рэўнасці. Як я шкадаваў пасля, што тое пісьмо не парваў, а паслаў Марце!.. А Марта стаяла і гаварыла: «Не крыўдуй на мяне. Ты ж пісаў, што ў цябе ёсць

дзяўчына і не такая, як я, а гарадская...» Яна знарок зрабіла націск на слове «гарадская», нібы хацела мяне ў нечым абвінаваціць, папракнуць... «Чаму ты думаеш, што гарадская абавязкова лепшая за цябе, вясковую?» — спытаўся я. Але Марта мне нічога не адказала, толькі раптам успляснула рукамі, успомніла, што магазін у дванаццаць гадзін зачыняецца на абед і яна можа не паспець, і, хуценька развітаўшыся са мной, заспяшала ў вёску.

Я згадаў тую даўнюю нашу сустрэчу і ўсміхнуўся: тры гады прайшло, і вось мы стаім з Мартаю зноў на той самай сцяжынцы, дзе стаялі некалі, і зноў гаворым... Пра што? Ах, хіба не ўсё роўна цяпер пра што гаварыць, абы толькі гаварыць, абы не маўчаць...

Марта адразу ж заўважыла маю ўсмешку. Спыталася:

— Ты чаго смяешся? Што, я змянілася, не такая, як была? — і абцягнуўшы на таліі плацце, вельмі прыдзірліва агледзела сябе.

Не, яна не змянілася. Знешне была тою ж Мартаю, якую я некалі кахаў і якою яна асталася ў маёй памяці яшчэ са школы. Хіба можа трошкі папаўнела. Але паўната ёй была да твару, яна рабіла яе яшчэ больш прывабнай. І я сказаў пра гэта Марце.

— А ты змяніўся,— сказала яна, і ў вачах яе, глыбокіх, вялікіх, чорных, я ўбачыў, як успыхнула раптам радасць.— Памужнеў, у плячах раздаўся... І, здаецца, папрыгажэў...

Яна ўсміхнулася, адкрыта, прыгожа і разам з тым неяк сумна, усміхнулася так, як умела ўсміхацца адна толькі Марта, і больш ніхто на свеце. Божа, што б я аддаў за гэтую ўсмешку некалі! А цяпер стаяў і не ведаў, што мне рабіць — хваліць, як добра выглядае Марта, так, як хваліць яна мяне, ці лепей за ўсё маўчаць і толькі сарамліва ўсміхацца. Я выбраў апошняе.

А Марта не сціхала, гаварыла і гаварыла:

— Зусім не такі ты, як быў, чужы нейкі... Я цябе добра помню таго, і часта ўспамінаю...

У тым, што Марта на мяне не забылася і часта ўспамінае, яна прызнавалася ўпершыню, і я не знайшоў нічога лепшага, як таксама прызнацца:

— І я цябе ўспамінаю...

Я сказаў гэтыя словы, і тут мяне нібы прарвала — я міма сваёй волі загаварыў пра тое, у чым не прызнаваўся яшчэ нікому:

— Разы два нават сніў... Быццам я зноў вязу цябе

перад сабою на веласіпедзе, помніш, як вазіў у тое лета, калі ты скончыла дзесяцігодку, і я прыехаў на канікулы... Вакол ноч, цемра... І мы... Удваіх...

— Праўда? — усміхнулася зноў Марта, і зрэнкі ў яе вачах пашырэлі.— Ты б прыязджаў да нас калі ў леснічоўку, а то і табе, напэўна, сумна аднаму ў вёсцы...

Гэта было нешта новае, бо пасля таго як Марта выйшла замуж, яна ні разу не запрашала мяне прыязджаць у леснічоўку. І я адразу захацеў ведаць, што ж у Марты здарылася.

— А муж твой што на гэта скажа? — знарок гулліва, як бы са смехам, спытаў я.

— А ты хіба не ведаеш? Яго ж няма тут, ён паехаў...

І праўда, што ж гэта я абы-што пытаю? Хіба ж я дзён колькі назад не чуў сам на свае вушы, што Марцін муж завербаваўся і паехаў на лесараспрацоўкі ў Карэлію, каб зарабіць грошай і скончыць хату, якую пачаў стаўляць у вёсцы?..

— Тым горш, што яго няма дома. Яшчэ нехта напіша, што я да цябе ездзіў...— паспрабаваў я звесці ўсю сваю гаворку на жарт, бо адчуў, што сказаў і так лішняе — мне не трэба было прызнавацца, што я і цяпер яшчэ калі-нікалі ўспамінаю Марту, сню яе па начах...

Але Марта не зразумела майго жарту.

— Хай пішуць... Ваўкоў баяцца, у лес не хадзіць,— сказала яна зусім сур'ёзна. І толькі цяпер яна ўбачыла, што я нешта трымаю перад сабою ў шапцы.— Што гэта там у цябе?

— Вожык.

— Няўжо? — шчыра здзівілася Марта.— Дай мне яго, Зміцрок,— папрасіла яна і ступіла крок да мяне, каб зазірнуць у шапку.

Цяпер мы стаялі зусім блізка адно ад аднаго і я ўсім сваім целам адчуваў гэтую блізкасць. Я бачыў, як то апускаюцца, то падымаюцца яе яшчэ па-дзявочы поўныя, тугія грудзі, як зардзеліся лёгкім румянцам яе шчокі, чуў, як часта і цяжка пачала яна дыхаць. Няўжо і яна адчувала так маю блізкасць, як адчуваў яе я?..

— Вазьмі,— падаў я Марце шапку з вожыкам.

— Дзякуй,— сказала яна з дрыготкім хваляваннем у голасе.— А па шапку прыедзеш. І прычына нейкая будзе, калі ты ўжо стаў такі баязлівы...

Яна зноў усміхнулася і ўзяла шапку. На момант, толькі на адзін момант, як рука дакранулася мае рукі. І я адчуў

цеплыню і ўсю гарачную спакуслівую прывабнасць яе маладога, дужага цела. І ледзь стрымаўся, каб не абхапіць Марту за плечы, не прыцягнуць да сябе. Яшчэ б хвіліна, і я зрабіў бы гэта — сціскаў бы яе ў сваіх абдымках і цалаваў бы, цалаваў бы гэтак жа горача і хмельна, як цалаваў некалі, у тое лета, калі праводзіў Марту па вечарах да лесніхоўкі...

Але нешта мяне ўсё ж стрымала. Што? Тое, што Марта здрадзіла майму каханню і стала жонкаю чужога, невядомага мне чалавека? Ці я ўспомніў другую дзяўчыну, Валю, з якой я пазнаёміўся летась, калі быў на практыцы?.. Толькі я раптам адступіў назад да свайго веласіпеда, борзда ўскочыў на сядзенне і нават не развітаўшыся памчаў прэч ад Марты...

## II

Мо праз кіламетр я спыніўся, зноў павёў веласіпед узбоч сцяжынкі. Пашкадаваў — чаму я так не па-людску расстаўся з Мартай?.. Што яна падумае пра мяне?..

Але праз хвіліну супакоіўся. Хіба мне не ўсё роўна, што пра мяне падумае Марта? Яна першая парушыла нашу клятву, першая зрабіла такое, што не дае ёй права спадзявацца на што-небудзь лепшае ад мяне. Дурніца яна ўсё ж! Не паступіла ў інстытут, не магла года пачакаць, бежкам выйшла замуж. І каб хоць кахала таго шафёра... А то, пэўна ж, не кахала. Бо каб кахала, хіба б гаварыла гэтак са мною, як сёння. «Хай пішуць. Ваўкоў баяцца, у лес не хадзіць». Не, гэта быў ужо не жарт, а нешта большае. І ў вачах такі смутак, боль. Убачыла мяне, узрадавалася, бы дзіця, таго не ведаючы, што мне яна — мінулае, даўняе, напаўзабытае... Як рэха ў бары. Тут было, тут няма яго...

І адразу ж адчуў, што гавару сам сабе няпраўду. Гэта толькі так мне здавалася, пакуль я быў у горадзе, пакуль не прыехаў сюды, у вёску, і не ўбачыў Марту. А ўбачыў — ажыло тое, што было некалі між намі. Хіба ж не захацелася мне абхапіць Марту рукамі, прыцягнуць да сябе і цалаваць, цалаваць, як цалаваў некалі?.. Так захацелася, што каб не зрабіць гэта, я ўскочыў на веласіпед і ўцёк ад Марты. А яна?.. Таксама, як і я, успомніла тое, што было між намі, ці, можа, жывучы адна ў лесе, затужыла па мужу?.. Кажуць жа, што маладой жанчыне вельмі цяжка быць доўга без мужа... А яна ж не бачыла яго ўжо не адзін

месяц — муж яе паехаў з вёскі яшчэ зімою і з таго ні разу і не прыязджаў... Не, мусіць, усё ж яна казала праўду — яна не забываецца на мяне і шкадуе, што выйшла замуж не за таго, каго кахала... Які ж і я быў дурань — напісалі мне, што яна ходзіць у клуб, што ля яе ўвіхаецца нейкі шафёр, я і даў волю сваёй злосці... Што ёй аставалася рабіць?.. Спадзявацца на мяне, чакаць? Чаго? Я ж чорным па белым напісаў, што ў мяне ёсць другая дзяўчына, што я з ёю дружу і, напэўна, ажанюся. Напісаў, каб выклікаць рэўнасць, каб яна адчула і сама, як гэта балюча ведаць, што той чалавек, у якога ты верыў, якому давяраў усё, самае, здавалася б, патаемнае, раптам аказаўся зусім не тым... А выйшла вунь што...

І перад маімі вачыма праплыло тое апошняе лета перад самым інстытутам, з частымі ляснымі пажарамі, бо яно выдалася сухое, без навальніц і дажджоў, і ўсё сохла і гарэла не толькі ў лесе і на полі, але і ў балотах. Дым засцілаў наваколле, і нават у вёсцы ад дыму і смуроду не было чым дыхаць. І ўдзень і ўночы гарэлі тарфы. Пажары ў той год вялікай шкоды нарабілі не толькі лясам, а і калгасу, бо ў адну з начэй успыхнулі тыя балоты, што былі асушаны і на якіх было пасеяна проса і пасаджана бульба. Агонь непрыкметна падбіраўся да загонаў з просам і бульбай і пажыраў іх адзін за адным на вачах у людзей. І людзі глядзелі на гэта і нічым не маглі памагчы — пласт торфу быў тоўсты, на некалькі метраў углыбіню, і атушыць агонь было нельга...

Тамаш Буда ў тое лета не стыкаўся дома. Не прыходзіў нават абедаць. Дзень пры дні быў у лесе — баяўся, каб не перакінуўся, не ўспыхнуў пажар у яго абходзе. І мы з Юзікам надумалі рыхтавацца да экзаменаў у інстытут разам у іхнім лясным селішчы. Балазе тут было ціха, і ніхто нам не замінаў. Як толькі ўзыходзіла сонца, я выкатваў з сенцаў веласіпед, прывязваў да багажніка кніжкі і мчаў у лес, да леснічоўкі.

Звычайна Юзік выносіў з хаты клятчастую палатняную посцілку, слаў яе пад маладой, кашлатай ліпкай, што расла на мяжы між полем і Тамашовым лугам і адкуль вельмі добра аглядалася ўся лясная сяліба. Палёгшы на жываты, мы па чарзе чыталі — Юзік чытаў — я слухаў, я чытаў — Юзік слухаў. А найбольш чытаў Юзік, бо я, лежачы на посцілцы, не зводзіў вачэй з лесніковай хаты. Я чакаў, калі выйдзе з леснічоўкі Марта, выцягне заткнуты ў вугал сенцаў серп, пойдзе жаць траву. Нажаўшы травы і за-

нёсшы яе ў хлевушок цяляці, яна возьме капаніцу і пачне акопваць у гародзе бульбу ці палоць грады. Вось тады я і буду любавацца яе гнуткай, зваблівай паставай, загарэлымі, поўнымі ікрамі ног, голымі, такімі ўвішнымі рукамі, валасамі, што, заплеценыя ў адну доўгую, тоўстую касу, спадаюць на плечы... Калі сонца падымецца высока і ўжо нават у цяньку нашай кашлатай ліпкі ад духаты недзе будзе дзявацца, Марта прыйдзе да нас, моўчкі прысядзе на краёчак посцілкі, паслухае, што мы чытаем, і пакліча абедаць...

Пасля абеду мы з Юзікам з'ездзім пакупацца ў вяртлявую прахалодную Віць, зноў пачытаем, і на заходзе сонца, калі будуць з пашы гнаць кароў, я паеду дадому, каб заўтра зранку зноў быць тут, на гэтай ціхай лясной паляне. О, з якой бы радасцю я пасадзіў бы тады Марту на раму свайго веласіпеда, вёз бы яе перад сабою цераз лес у вёску, а потым цэлы б вечар танцаваў, не адыходзіў бы ад яе ні на крок! А як добра ўмерклася б, мы непрыкметна зніклі б з клуба і ўжо назад пайшлі б удваіх пеша да леснічоўкі...

Я не раз і не два, а на дні мо па сотні разоў уяўляў, як бы добра было нам быць удваіх з Мартай уночы ў лесе, і сэрца маё замірала ад шчасця...

Але тым летам Марта яшчэ не хадзіла ў клуб на вясковыя пагулянкі, а запрасіць яе самому на танцы ў мяне так і не хапіла смеласці. Я баяўся тады наогул хоць адным якім-небудзь неасцярожным словам ці паглядам выдаць сябе і свае пачуцці, выдаць, што ў мяне на душы. Ух, як я ненавіджу ў сабе гэтую нерашучасць, нясмеласць у самую патрэбную хвіліну!

Усё гэта — і танцы па вечарах у клубе, і праводзіны Марты ноччу цераз лес да леснічоўкі, і хмельныя да самазабыцця пацалункі — прыйшло потым, праз год, калі я прыехаў на вакацыі з інстытута. Я нібы забыўся на ўсё, што нас акружала і што рабілася на свеце, і, як толькі змяркалася, бег у клуб, каб там зноў спаткацца з Мартай, каб згуляць з ёй дзеля прыклёпу пару танцаў і знікнуць да самае раніцы з вёскі... Я быў п'яны ад свайго кахання і ўсё лета жыў толькі адным ім. Старэйшы мой брат Кузьма, які ў той год вярнуўся з войска і таксама вечар у вечар хадзіў у клуб, другі раз жартаваў з мяне:

— Гэта ж ахвоту трэба мець, ноч у ноч бухаць туды і назад па восем кіламетраў!.. Як бы і дзяўчат табе няма ў вёсцы!..

Я чырванеў, але змоўчваў. Для мяне, папраўдзе, не тое што дзяўчат, нікога нідзе не было ў тое лета — быў толькі я ды Марта!..

## III

Сцяжынка віляе, уецца між сосен, лезе ў хмызняк, звіваецца вакол імхоў і беляў, пакуль, нарэшце, не выводзіць мяне на бітую лясную дарогу, па якой ганяюць на пашу і з пашы кароў, ездзяць па дровы, ходзяць па ягады і па грыбы. Паварот — і вось я бачу: наперадзе ўжо свіціцца тая паляна, дзе стаіць Тамашова леснічоўка.

Расказваюць, што даўным-даўно, яшчэ да таго, як скінулі цара, на гэтай паляне жыў пан, які валодаў усімі тутэйшымі палямі і лясамі. Але за некалькі год да рэвалюцыі нехта падпаліў панскія харомы. Яны былі драўляныя, сухія і згарэлі хутка, як свечка. Пакуль сяляне з навакольных вёсак дабеглі да паляны, ад панскіх харомаў астаўся толькі чырвоны жар. Здарылася гэта ўлетку, і пакуль шукалі, хто спаліў пана, сам пан пераехаў жыць у горад, а на паляну, на ранейшае сваё селішча, прывёз аднекуль за вартаўніка інгуша, які ані слова не ўмеў гаварыць патутэйшаму, і той інгуш да восені паставіў сабе хату.

Інгуш быў вельмі паганы, у лес нікога не пускаў не тое што па дровы, а нават па грыбы і па ягады, і калі лавіў каго, не толькі люта біў, але адбіраў у людзей і сякеры, і кошыкі, а часам у якой-небудзь нездаляшчай бабы і хустку з галавы сарве. Нешта летаў са тры цярпелі людзі гэтага вартаўніка, а потым кануў ён, нібы ў ваду. Адны казалі, што яго забілі мужыкі і закапалі ў лесе, другія даводзілі, што інгуш сам не захацеў тут жыць і, выпрасіўшы ў пана гады на два наперад плату за сваю службу, некуды ўцёк... Потым пачалася рэвалюцыя, скінулі цара, і ў гэты глухі лясны край прыйшлі новыя парадкі. А леснічоўка так і асталася стаяць на паляне. Леснікі пачалі мяняцца як не штогод, бо жыць з людзьмі і пільнаваць лес — дужа цяжка. Не дай нікому ссячы дрэва, будзеш добры лясніцтву і вельмі кепскі людзям. А людзі такога не сцерпяць, бо прывыклі да таго, што хто ў лесе не злодзей, той і дома не гаспадар...

На пасадзе лесніка бадай больш за ўсіх утрымаўся Тамаш Буда. Пераехаў у леснічоўку ён нешта перад самай вайною і перажыў тут і вайну, ні немцы, ні партызаны яго так і не зачапілі. Астаўся за лесніка ён і пасля вайны.

Змалку ён засвоіў тую ісціну, што складалася вякамі: салодкі будзеш — праглынуць, горкі — выплюнуць. І стараўся быць ні горкім, ні салодкім — жывучы ўвесь век свой на адным месцы, ён ведаў людзей і ведаў, каму трэба даць ссячы якое бервяно, каб той не насіў за пазухай камень і не глядзеў воўкам, а на каго, калі той ссячэ дрэва сам, можна накласці і штраф, і чалавек той не выкруціцца — заплаціць. Таму парубак у яго абходзе заўсёды было менш, чым у іншых леснікоў, былі нейкія і штрафы, і начальства Тамаша любіла.

З гадамі былое панскае селішча запусцела, зарасло драбналессем, зрабілася тым, чым яно і было калісьці — звычайнай лясною палянай. З аднаго боку яе, як не ў самым лесе, стаяла абгароджаная густым штакетнікам лесніччоўка, з другога — зелянеў лужок, яго Тамаш Буда штолета скошваў сваёй карове на сена. Дарога праходзіла па сярэдзіне паляны і як бы палавініла яе на дзве паляны. І тая палавіна, што бліжэй да вёскі, была не што іншае, як выбіты кароўімі нагамі выган.

Сама лесніччоўка здалася мне цяпер яшчэ меншая, як была, і дужа старавінная. Тоўстыя, няроўна паабразаныя вуглы, маленькія, падслепаватыя вокны, чаратовая страха, аброслыя мохам сцены, складзеныя не па-тутэйшаму з круглых неачэсаных бярвенняў... Лесніччоўка паменшала яшчэ і таму, што за той час, што я не быў тут, вырас садок, які некалі пасадзіў Тамаш па ўсім сваім гародзе. Тая ліпка, пад якою мы з Юзікам рыхтаваліся да экзаменаў у інстытут, цяпер вымахала ў добрую ліпу. Тамаш нават усцягнуў на яе калодны вулей. Стаяла ля плота і тая нешырокая, вышмараваная людскімі штанамі і спадніцамі, лавачка, на якой я праседжваў ночы з Мартай...

Забрахаў сабака. Але на яго брэх з хаты ніхто не выйшаў — ці то не было нікога дома, ці проста не прыслухаліся да сабачага брэху. Толькі пападымалі ўгору галовы і загегеталі гусі, што хадзілі па другі бок дарогі на выгане. Але і яны хутка супакоіліся, не пачуўшы ніякай небяспекі,— пачалі зноў шчыпаць траву.

Мінуўшы паляну, я сеў на веласіпед. Зноў успомніў Марту, ужо неяк больш спакойна, без замілавання і таго хвалявання, з якім успамінаў яе хвіліну назад. Вось тут, ля гэтага каржакаватага, прысадзістага дубка, мы з ёю стаялі, я браў яе на рукі і падсаджваў, каб яна дастала рукамі сук. Падцягнуўшыся, яна скакала на зямлю, а я лавіў яе рукамі... Тут, ля вялізнага густога куста лазы, ад-

нойчы, калі мы позна ўночы ішлі з клуба, нешта перабегла нам дарогу, і мы спалохаліся, думалі, што гэта воўк... А ля гэтае старое, кашлатае сасны Марта мяне першы раз пацалавала сама: абхапіла шыю рукамі і пацалавала... А вось там, ля броду, мы ўпалі, калі я вёз Марту на веласіпедзе ў кіно... Давялося вяртацца назад, у леснічоўку, каб пераадзець запэцканае ў гразь плацце, і ў кіно мы спазніліся... Чакай, што ж мы тады рабілі? Ага, паехалі назад да леснічоўкі і ўсю ноч, аж пакуль не развіднела, сядзелі на лавачцы і слухалі салаўёў. А яны ў тую ноч нібыта пашалелі, аж заліваліся — шчоўкалі, цёхкалі, свісталі...

Я ехаў па дарозе, дзе мне было знаёма кожнае дрэва і кожны куст і дзе ўсё мне напаміналі аб маім каханні, і сэрца маё поўнілася пякуча-шчымлівым болем. З Мартаю ў мяне ўсё скончана, думаў, нібы супакойваў я сам сябе, хай яна астанецца ў маёй памяці тым, што ёсць бадай у кожнага чалавека — маім першым нешчаслівым каханнем. І мне пара прывыкнуць ужо да думкі, што Марта не мая і ніколі не будзе маёй, і больш не вярэдзіць сабе душу ўспамінамі, глядзець на яе, як на нешта даўняе, мінулае, тое, што было і чаго не вернеш. Тым болей што я спаткаў другую дзяўчыну, гарадскую, як і прарочыла мне Марта, і тая дзяўчына, здаецца, шчыра пакахала мяне — з ёю я ўжо ніколі не расстануся...

«Добра, што ўспомніў, ёй трэба напісаць пісьмо, і расказаць, як ездзіў варочаць сена, як сустрэў Марту, і што я думаў, чаму хваляваўся... Хай ведае Валя, што яна мне не абы-хто, а самы блізкі і дарагі чалавек. І я не магу, проста не маю права далей хаваць ад яе тое, што было ў мяне некалі з Мартаю, калі я не ведаў яшчэ яе, Валі...»

## IV

Дома не было нікога — бацька яшчэ не вярнуўся з калгаса, а маці некуды выйшла — ці не нарваць свінням травы.

Я дастаў ключ — яго хавалі пад старое карыта, што, перавернутае ўверх дном, валялася ў двары ля плота, і адамкнуў хату. І на нейкі момант застыў у парозе — стаяў, не рашаючыся праходзіць далей, і аглядаў усё такое знаёмае, звыклае, сваё, нібыта бачыў яго ўпершыню пасля доўгай ростані, нібыта я вярнуўся не з сенажаці, а толькі што прыехаў з горада, з цягніка... Ля дзвярэй стаіць шырокі, мокры ад вядра, з якога пілі ваду, услон, пад ім —

вялізны дубовы цэбар. На сцяне, трошкі далей,— завешаная марляй паліца. У куце, між акон,— стол, засланы палатняным, даматканым абрусам. Два старыя, самаробныя ложкі, канапка, табурэткі... Як і заўсёды, падлога чыста памыта, аж ззяе на сонцы, што слепіць вочы з акон. У адной маснічыне, ля печы,— круглы, карычневы ад смалы сук; у ім — невялічкая дзірачка — некалі, яшчэ хлапчуком, я націраў у гэтую дзірачку запалкавых галовак, потым біў па цвіку малатком і страляў, як з прапяканкі. Бацька аднойчы падлавіў мяне за гэтым заняткам і адсцёгаў дзягаю. Тая шырокая, раменная дзяга таксама вісіць на цвіку ля стрэльбы на глухой сцяне, як вісіць на бэльцы ў кутку ля печы і той стары крамны рукаў з рабой Кузьмовай кашулі, у які бацька гадамі збіраў квіткі аб здачы розных падаткаў — мяса, малака, яек, бульбы, скур, страхоўкі, самаабкладання... У агента, што неяк прыйшоў праверыць, ці разлічыліся мы з дзяржавай, аж выступіў на носе па гарошыне пот, пакуль ён шукаў у тым рукаве патрэбныя яму квіткі. Ён пляваўся, гнуў мацюкі, разоў колькі вылазіў з-за стала, каб пайсці з хаты. Калі ж нарэшце бацька падаў яму патрэбныя паперкі, агент, нават не глянуўшы на іх, параіў бацьку ўсё лішняе спаліць. Бацька на гэта не адказаў нічога, толькі лыпнуў з-пад калматых брывоў вачыма. А як агент выйшаў з хаты, завязаў рукаў ніткаю і павесіў зноў на тое самае месца, дзе ён і вісеў дагэтуль.

— Ыш ты, разумнік знайшоўся! Спалі, дык ён назаўтра прыйдзе і будзе казаць, каб я паказаў яму квітанцыі за ўсе гады. А няма — пляшку стаў, ці вопіс гаспадаркі пачне рабіць... Ведаем такіх. Не першы!..— доўга яшчэ бубнеў, не мог угаманіцца бацька.

Успомнілася гэта, і я ўсміхнуўся. Даўно мінуў той час, па вёсцы не ходзяць ужо агенты, а рукаў вісіць. І будзе вісець яшчэ доўга, бо бацьку не пераканаеш, што праз нейкі час не ўзбрыдзе некаму ў галаву праверыць старыя квітанцыі. Зняверыўся... Пасля вайны, калі ён вярнуўся з палону, патрабавалі ж нейкія ранейшыя дакументы. І каб іх не зберагла маці, закапаўшы ў шкляным слоіку ў гародзе, хто ведае, дзе быў бы бацька...

Хата старая ў нас. Такіх хат у вёсцы ўжо асталося мала — кожны стараецца паставіць новую і не такую, як была, не проста хату, а дом, дзе была б асобна і спальня, і кухня, і прыхожая. Пагаварваў пра новую хату год колькі назад, калі я вучыўся яшчэ ў школе, і мой бацька.

«Людзі стаўляюць, а мы што, хіба ўломкі!» — казаў ён.

Але новай хаты бацька так пакуль што і не паставіў. Вярнуўся са службы ў войску Кузьма, жаніўся, і давялося памагаць стаўляць хату яму. А калі зрабілі хату Кузьму, бацька раптам загаварыў, што новая хата яму не трэба. «З дошак зробяць! — пачаў жартаваць ён.— А да той, дашчанай, бадай што і ў гэтай дажыву...»

У такой крутой перамене бацькавага настрою я бачыў другое. Раней бацька думаў, што я не паступлю нікуды вучыцца, астануся дома, у вёсцы, тады б новая хата была вельмі дарэчы. Жаніўся б і жыў бы ў ёй па праву меншага сына. А цяпер і праўда, навошта нам тая новая хата. У Кузьмы свая ёсць, а мая хата — дзе я сам. Учора я жыў у горадзе, у студэнцкім інтэрнаце, сёння дома, у вёсцы. А заўтра?.. Заўтра я і сам не ведаю, дзе буду...

Дый, відаць, не так лёгка стаўляць новую хату. Пісаў мне тады Кузьма, у адзін толькі раён колькі разоў давялося яму з'ездзіць, каб лесу далі. А трэба ж было яго, той лес, і парэзаць, і пачасаць, і прывезці, потым зруб зрубіць, накрыць, падлогу паслаць, печ зляпіць... Каб усё гэта парабіць — і сіла трэба, і час, і грошы...

І бацька палічыў за лепшае дажываць век свой у старой хаце, чым брацца будаваць новую...

## VI

Паставіўшы веласіпед у сенцы, я сеў пісаць Валі пісьмо. «Любая,— старанна выводзячы кожную літару, пачаў я.— Вось я і дома! Што я раблю, чым жыву, пра што думаю?.. Лепш за ўсё апішу падрабязна, як ёсць, адзін дзень свайго быцця ў вёсцы, і ты, калі ласка, уяві ўсё сама...

Прачынаюся я рана, на досвітку. Але не ўстаю, ляжу нейкі час на вышках у хляве (тут я і сплю, на сенавале) і слухаю вясковую раніцу. Чую, як суха рыпіць недзе аж у тым канцы вёскі журавель, як трубіць у берасцяны ражок пастух, як у кожным двары бразгаюць і дзынкаюць бляшаныя даёнкі — прачнуліся гаспадыні і спяшаюцца даіць кароў. Гучна ляскаюць вясніцы, вішчаць свінні, парасяты, кудахчуць куры, то тут, то там крычаць, гамоняць людзі... Праз невялічкую шчыліну ў страсе ў хлеў залятае ластаўка — прыносіць сваім дзецям корм. Павольна робіць паўз страху круг, нешта весела шчабеча і лёгка ўпорхвае ў гняздо — яно ў самым вільчаку на ду-

бовай сасе, цёпленькае, сухенькае, звітае з гразі, сена і пер'я.

Малыя весела ціліўкаюць, і я бачу, як яны выцягваюць яшчэ зусім голыя шыйкі, разяўляюць кволыя жоўтыя дзюбкі і хапаюць корм. Устаю і я. Адзяваюся і па хісцкіх альховых драбінцах спускаюся ўніз, у хлеў. У хляве пахне гноем, прэлай саломай і малаком — маці, седзячы на табурэціку, доіць карову. Маці, вядома, пытаецца, як я спаў, просіць пачакаць хвіліну і выпіць сырадою, але я не чакаю — выкатваю з сенцаў веласіпед і еду па роснай сцяжынцы, што віецца па бульбяным полі, у лес, еду да нашай буркатухі Віці — кіламетраў за тры ад вёскі я заязіў яе і стаўлю там на ноч кашы. Яны амаль заўсёды парожнія, але затое калі трапіць уюн ці шчупак — як яны лапочуць, б'юцца аб сухое лазовае пруцце!

Пасля я блукаю па лесе, раблю што-кольвек у двары ці ў гародзе (сяку дровы ці памагаю маці палоць і акопваць грады) і сумую, сумую па табе, мая любая Валечка. Як не кожную хвіліну выбягаю на вуліцу, каб паглядзець, ці не ідзе паштальён, ці не нясе ад цябе пісьма. Іншы раз не вытрымліваю і іду сам на пошту. Дзяўчаты, што там працуюць, смяюцца з мяне. «Яшчэ пішуць»,— кажуць яны. І тады я раблюся сам не свой — як цень сноўдаюся па вёсцы і чаго толькі не думаю пра цябе. Мне здаецца тады, што ты неспадзявана захварэла, ці трапіла пад машыну і ляжыш непрытомная ў бальніцы, ці — і гэтае самае страшнае! — сустрэла ў вёсцы якога-небудзь свайго даўняга знаёмага і зусім забылася на мяне...

Я кахаю цябе і буду кахаць вечна. І ў імя нашага кахання я не магу, каб не расказаць пра адну дзяўчыну, з якою я сёння выпадкова сустрэўся, калі вяртаўся з сенажаці — сястру былога майго аднакласніка Марту. Каб ты толькі бачыла, як узрадавалася яна гэтай сустрэчы!..»

Я напісаў гэтыя словы і тут жа схамянуўся, наважыўся іх закрэсліць. Але, падумаўшы, чамусьці не зрабіў гэта, а пісаў далей:

«Ты нічога благога не думай, Валечка. У яе ёсць муж, ён паехаў на заробкі ў Карэлію, і яна, відаць, засумавала па ім. Сустрэча з Мартаю мне напомніла, што ў сім-тым я павінен прызнацца табе: некалі, калі я закончыў першы курс інстытута і прыехаў на вакацыі дадому, я праводзіў Марту дахаты і нават цалаваў яе... Марта — дачка лесніка. Жыве яна ў лесе, робіць на падсочцы... І ты, калі ласка, не думай, што ў мяне з Мартаю можа быць цяпер хоць якая

блізкасць. Усё гэта я напісаў, каб ты ведала пра Марту і ніколі не папракала мяне...

Пішы мне.

Змітрок».

Паставіў дату, перачытаў пісьмо. І яно мне здалося надта ж пустое, няшчырае. Многага з таго, пра што я пісаў, не было зусім, а калі яно і было, дык было не так, як пра гэта я напісаў. За тыя дні, што быў я дома, я Валі так ні разу і не ўспомніў. Наадварот, сумаваў я па Марце. І на пошту хадзіў не таму, што мне не цярпелася хутчэй атрымаць пісьмо ад Валі, а таму, што спадзяваўся там сустрэць Марту — яна, я ведаў, хадзіла туды часта, каб забраць пісьмы ад мужа і Юзіка і ўкінуць у паштовую скрынку свае. Навошта ж мне пісаць Валі няпраўду? Хачу шчырасці, выклікаю на шчырасць Валю, а сам нават у пісьме няшчыры. Дый якая пустата думак, якое ўбоства душы! Не, такога пісьма нельга пасылаць, яшчэ Валя падумае, што я не той, каго яна кахала, і расчаруецца ва мне...

І я парваў пісьмо на дробныя шматкі і ўкінуў у печ.

«Напішу лепей заўтра»,— падумаў я. І тут жа ўкалоў сябе тым, што Марце я пасылаў пісьмы ніколі не перачытваючы і не баяўся, што яна падумае пра мяне не так, як таго можа б хацелася мне... Чаму б гэта?..

У сенцах загрукала секачом маці, і я выйшаў памагаць карміць ёй свіней.

## VI

Дажджу назаўтра не было, стаяла зноў на пагодзе. І мы з бацькам схадзілі ў Ласіны Лог, зграблі сена, скідалі яго ў стог. Нішто сабе стажок, даволі ладнаваты — вазоў на тры. І скідалі мы яго хвацка, прыгожа. Ад адзёнка вузкі, круглы, і чым вышэй, тым шырэйшы. Верх вастранькі, шылаваценькі. Не стог, а цацка!

Калі мы палажылі апошнія апоўзіны і выйшлі на бераг лесу да таго дуба, дзе я адпачываў учора і дзе стаяў і сёння мой веласіпед, было яшчэ рана, сонца толькі-толькі схілілася на вечар. Мы пасядзелі трохі пад дубам, пагаварылі аб сімтым, потым бацька падняўся, яшчэ раз адсюль, зводдалі, палюбаваўся стажком і сказаў, каб я памалу ехаў дадому, а ён па дарозе зойдзе яшчэ ў адно месцейка паглядзець, ці не скасіў там хто травы...

Я прывязаў да рамы вілы, свае і бацькавы граблі, сеў на веласіпед і лёгенька пачаў націскаць на педалі. Ехаў, ехаў,

і зноў не заўважыў, як збочыў на тую сцяжынку, што вяла да леснічоўкі. А калі заўважыў, вяртацца назад было позна, бо праехаў я добрых кіламетраў два. Дый, калі прызнацца шчыра, вяртацца назад мне не хацелася. Нейкая невядомая сіла, нібы наканаванне, вабіла мяне, цягнула ехаць менавіта па гэтай сцежцы. Мне пачало нават здавацца, што сёння павінна здарыцца нешта вельмі важнае, што пераверне маю душу і ўсё далейшае маё жыццё. Я чакаў гэтага нечага новага і незвычайнага, і сам не верыў, што яно можа быць. І праўдзе — ну што магло здарыцца?.. Марта замужам, мужа яна не пакіне, дый я бадай што не захачу, каб яна пакідала яго. Хай жывуць ужо, як сышліся... «Эх, Марта, Марта!.. Куды ты спяшалася?.. Хіба не магла напісаць мне, запытацца, чаму я прыслаў табе тое пісьмо?.. Ці ты выйшла замуж наўмысна, назнарок, каб адпомсціць мне?.. Ці, можа, з гора,— калі не за таго, каго кахаю, дык за абы-каго. А тут акурат і падвярнуўся гэты шафёр... Дый я добры быў — напісаў такое пісьмо і хоць бы слова, паўслова... Анічагуткі, быццам і не пісаў дагэтуль штодзень, быццам і не меў патрэбы расказваць усё, што я думаў, што наогул рабіў. А каб ніхто дома не чытаў маіх пісьмаў, я пісаў іх нямецкімі літарамі, якіх у доме ні Тамаш, ні яго жонка Паўліна не ведалі... Пісаў так да таго апошняга майго пісьма. Тое пісьмо напісаў ужо як трэба, бо мне не было болей чаго хаваць ад Марціных бацькоў... Наадварот, я хацеў, каб яго прачыталі яны і насварыліся на Марту... Я не думаў, што Марта паверыць майму пісьму. Мне ўяўлялася зусім іншае — Марта пачне дапытвацца, чаму я стаў такі злосны і пішу пра тое, чаго няма і чаго ніяк не можа быць. І тады б... Я напісаў, як я кахаю яе, як баюся, каб яна не выйшла замуж за другога. І папрасіў бы,— не хадзі, Марта, у клуб, не танцуй абы з кім, пачакай, калі прыеду я...»

Але Марта мне нават не адказала...

Я чакаў ад яе пісьма доўга, аж пакуль, нарэшце, не напісалі з вёскі, што Марта выходзіць замуж...

Два наступныя леты я не прыязджаў на вакацыі дадому. Адно лета ездзіў разам з усім курсам на цаліну — памагаць цаліннікам убіраць ураджай, другое пракарпеў на практыцы на вялікім заводзе, на Украіне. Шчыра кажучы, цаліна і практыка былі толькі адчэпкай, каб не ехаць у вёску, дадому. Я чамусьці пачаў баяцца паказвацца на вочы тым людзям, якія ведалі мяне змалку, баяўся пажыць сярод іх хоць бы дзень. Гэтая боязь узрасла, калі я неяк

у верасні прыехаў на тры дні дадому — вельмі ж крыўдзілася на мяне маці, што я на яе забыўся і не еду нават пераведацца,— пайшоў у лес па грыбы і спаткаў на гэтай вось сцежцы Марту...

«Трэба хоць цяпер прызнацца Марце, што тое пісьмо я напісаў у злосці, што ніякай дзяўчыны ў мяне не было, што з той, што сябрую, я пазнаёміўся толькі праз два гады, на практыцы,— падумаў цяпер я.— Хай ведае, што я бярог яе каханне, што я напісаў тое пісьмо з адным толькі жаданнем — выклікаць рэўнасць: адчуй, спазнай, маўляў, сама, як гэта балюча, што,калі цябе поблізу няма, я хаджу з другою...»

...Там, дзе я ўчора злавіў вожыка, я зноў спыніўся. Але як ні ўслухоўваўся, ці не шамаціць дзе сухое лісце, як ні ўглядаўся, ці не ходзіць між камлямі соснаў Марта — Марты не ўбачыў.

«Можа, яна сёння дзе далей збірае смалу?..»

Праехаў далей — дзялянкаю, па сцяжынцы,— Марты не было.

«А можа, яна дома?..»

Сеў на веласіпед, даехаў да леснічоўкі. Зноў забрахаў сабака, і зноў на яго брэх ніхто не выйшаў з хаты...

За палянай я падумаў, ці не вярнуцца мне назад, на дзялянку. Можа, Марта збірала смалу далёка дзе ад сцяжынкі і цяпер падышла бліжэй?..

Я ўжо быў крутнуў руль, каб завярнуцца, але ў той жа момант другая думка спалохала мяне: «А што,калі Марціна маці дома і глядзіць у акно? Учора бачыла, сёння таксама... Калі ўбачыць, што я вяртаюся назад, на дзялянкі, здагадаецца пра ўсё. І можа нават насварыцца на Марту...»

Як ні цяжка было мне прымусіць сябе ехаць дадому, але я ўсё ж прымусіў — не, мне ні ў якім разе нельга быць тут, каля леснічоўкі. Мне нельга быць нават у вёсцы. Трэба было і сёлета не ехаць, на вакацыі сюды, дадому, а купіць якую-небудзь турысцкую пуцёўку, а не — паехаць разам з Валяй да яе бабкі, у тую невядомую вёсачку пад Крычавам, што стаіць на беразе Сожа і пра якую так часта ўспаміналa Валя. У гэтай вёсачцы Валя жыла ў вайну да таго, як немцы злавілі з лістоўкамі яе маці і расстралялі... Жыла і пасля, у бабкі, бацькавай маці, аж пакуль не скончылася вайна і яе не забраў у горад матчын брат... Сёлета ўсю вясну бабка пісала Валі, што яна вельмі аслабела, ледзьве соўгаецца па хаце і хацела б перад смерцю пабачыць сваю

ўнучку, пажыць з ёй хоць які месяц так, як жылі яны ўдваіх некалі... І Валя паехала да бабкі. «Калі табе будзе сумна, прыязджай да нас»,— прасіла Валя, калі я праводзіў яе пасля сесіі на цягнік...

## VII

Увечары вярхом на кані прыехаў Кузьма. Ён прывязаў ля двара за штакеціну танканогага гнядога жарэбчыка і ўбег у хату — босы, у старым выцвілым салдацкім галіфэ і такой жа выцвілай, амаль што белай, салдацкай гімнасцёрцы.

— Здароў, студзент,— падаў ён мне руку і, убачыўшы, як я пільна аглядаю яго, засмяяўся.— Што, так у горадзе не ходзяць? — спытаўся ён не то жартам, не то ўсур'ёз.

— Чаму не ходзяць? — паціснуў я жорсткую, жылістую Кузьмову руку.— І ў горадзе ўсякія людзі жывуць. Не адны ж там вучаныя...

— Го-го-го! — не даўшы мне дагаварыць, зарагатаў на ўсю хату Кузьма.— Дык і я ж, можа, не невук, а брыгадзір!

— Ну, а калі ты брыгадзір,— умяшалася ў нашу гаворку маці — яна стаяла з чапялою ля печы, варыла вячэру,— дык не хадзі, бы старац, адзявайся...

— Навошта яго добрае ў поле надзяваць? Запылішся, запэцкаешся... Праўда ж,— падміргнуў ён мне.— Дый часу на гэтыя пераадзяванні няма, сёння не абедаў нават...

— Бо дурны,— уставіла зноў сваё маці.— Колькі разоў казала табе, што работы ўсёй не пераробіш... Памрэш, а работа няробленая астанецца...

— І ўсё адно пакуль жывеш, рабіць трэба,— уздыхнуўшы, нібы між іншым, сказаў Кузьма.— Ды я не дзеля таго прыехаў. Я хацеў сказаць, што заўтра па абедзе мы едзем усім калгасам у Застожжа касіць. Можа б, і ты паехаў, га? — паглядзеў ён на мяне.— Табе дзень сюды, дзень туды, а нам — яшчэ адзін касец!

— Што? — накінулася на Кузьму маці.— Блізкі свет — Застожжа! Гэта ж і начаваць там трэба на камарэчы, і есці, а ён і так высах у горадзе, як таран... Хай хоць трохі апратаецца дома. Хутка ж зноў ехаць...

— Не адгаворвай, маці,— заступіўся за Кузьму бацька — ён, прыйшоўшы з сенажаці, злазіў на гарышча, назбіраў там нейкага бадылля (за зіму скурыў увесь свой, да лісточка, мультан) і цяпер крышыў тое бадыллё на ўсло-

не.— Хай едзе, калі хоча. Хоць праветрыцца, з людзьмі пабудзе...

— Ну дык як, студзент? — падняў зноў на мяне вочы Кузьма.— Паедзем?

Мне было ўсё роўна, куды ехаць, абы толькі не сядзець дома, не ўспамінаць Марту, не думаць, як бы з ёю зноў сустрэцца, пагаварыць. Я адчуваў, што калі буду дома і заўтра, я не стрываю — сяду на веласіпед і паеду па той запаветнай сцяжынцы да дзялянак. А я гэтага не хацеў. І таму сказаў:

— А чаму б і не паехаць?.. Толькі ты мне касу добрую знайдзі,— папрасіў я Кузьму.— Такую, каб ніхто пятак не падрэзаў...

— Што-што, а касу знойдзем,— узрадаваўся Кузьма.— Абы ты толькі ў руках яе трымаў — сама касіць будзе!

— Ну вось,— заламала рукі маці.— Не шукай работы, дык яна сама цябе знойдзе...

— Ціха, ціха, маці,— сказаў зноў сваё важкае слова бацька.— Ні там, ні тут ён яшчэ надта на пуп не браў. Хаця і трэба было, каб помніў, чый ён сын і з чаго есць хлеб яго бацька, каб не смяяўся, не цураўся, як некаторыя, усяго свайго, вясковага...

Кузьма прашлэпаў босымі нагамі па падлозе і аж пацёр далоні.

— Ну вось і яшчэ аднаго касца знайшоў! — і ўжо да ўсіх: — Ну, я паехаў! Яшчэ да сяго-таго забягу...

— Пачакай,— з дакорам паглядзела на Кузьму маці.— Вячэра зараз зварыцца, хоць бы картоплю ў рот укінуў, рабацяга...

— Не, мама, няма калі,— аднекнуўся Кузьма.— Дома і паабедаю і павячэраю ўжо заадно...

Праз хвіліну ён быў ужо на кані. Прыгнуўшы галаву да грывы, ён скакаў некуды ў другі канец вёскі — аж курэў услед за ім пыл.

## VIII

Ад нашае вёскі да Застожжа — кіламетраў дзесяць. Гэта калі ехаць напрасцяк, праз брады. Лета сёлета было не надта сухое: не-не дый дажджыла. Асабліва з вясны. Таму дабірацца на далёкія сенажаці давялося кружным шляхам — летнікам, і не на машынах, а коньмі.

У дарогу збіралася ледзь не ўся вёска — кляпалі косы, ладавалі торбы, падмазвалі каламаззю восі, падганялі ха-

муты і вупраж. З самага ранку з каміноў смачна пахла смажаным мясам — гаспадыні круцілі маладых пеўняў, даставалі з кублаў прыхаваны з зімы скорам — на сенажаць кожны стараўся ўзяць лепшае, каб было аб чым пацягнуць касу. А як толькі спала паўдзённая спёка, рушылі. Цэлы абоз фурманак расцягнуўся па звілістай палявой дарозе. Зашуршаў пад коламі пясок, затарабанілі ў вазах граблі і косы, і на кволую, аксамітна-зялёную збажыну, што густа стаяла паабапал дарогі, паплыў шызы пыл.

Я сеў да Кузьмы на падводу, якая ішла ў канцы гэтага не зусім звычайнага абозу і як бы замыкала яго. З намі, на старых разбайданых калёсах, звесіўшы з драбінак ногі і дугою выгнуўшы шырокую спіну, ехаў і далёкі наш родзіч, мой цёзка Змітро Жолуд. Быў ён самы дужы чалавек у вёсцы, і праз гэта яго імя часта ўспаміналася ў людскіх гаворках. Расказвалі, да прыкладу, што ён, будучы ў партызанах, аднойчы ўзяў у палон жывога немца. Немец трапіўся надзіва ўпарты, ані не хацеў ісці сваімі нагамі да партызан. Сеў на дарозе і, чаго дзядзька Змітро ні рабіў — не зрушыўся з месца. Тады дзядзька раззлаваўся, злёгку аглушыў немца прыкладам па галаве, скруціў вяроўкаю яму рукі і ногі (каб не брыкаўся, зараза, і не лез пазногцямі да твару) і, закінуўшы за спіну, прывалок яго на сабе, бы ўсё роўна мех бульбы, у лагер...

У вёсцы не было ніколі завядзёнкі запрагаць валоў, калі, бывала, здаралася ў бездараж на грэблі, што была за нашаю хатай, засядаў у гразі старшынёў легкавічок (на ім старшыня штодзень ездзіў у райцэнтр да жонкі, якая ўсё ніяк не магла асмеліцца перабрацца ў вёску),— клікалі заўсёды Змітра Жолуда. Ён прыходзіў у ватоўцы, у гумавых ботах, і не паспяваў старшыня агледзецца, як дзядзька выкочваў легкавічок на сухое...

Болей за дзядзьку Змітра ў калгасе ніхто не зарабляў працадзён. І каб калгас быў багаты, перадавы, чалавек не раз бы за сваю працу атрымліваў бы і ўзнагароды, і прэміі, пра яго б ведалі бадай што ў самім Мінску. А паколькі калгас у нас быў так сабе, ні багаты, ні бедны, пра Змітра ніхто нідзе не гаварыў, не пісаў...

Дзядзька Змітро, як, можа, ніхто ў нашай вёсцы, любіў праўду, шчырасць і не цярпеў ніякай маны. І пры гэтым ані не ўмеў прытварацца — усім, каго спатыкаў, казаў у вочы тое, што думаў. За гэта яго паважалі людзі. Любіў ён і яшчэ адно — паразважаць, пагаманіць аб жыцці-быцці.

— Я от, можа, таксама,— пачынаў ён,— пацягаўся па свеце, дарог колькі ўсякіх за вайну перамераў сваімі нагамі... І ўсяго пабачыў, на ўсё нагледзеўся — і на цагляныя дамы, і на рэкі розныя, і на людзей... І скажу табе, чалавеча, лепшага месца, як у нас, нідзе няма. Тут табе і лужок, тут табе і поле, і рэчачка, і лясок. Улетку — рыба, ягады, грыбы, еж, хоць расперажыся; узімку — дзічына, дровы, можна сказаць, на самой печы. І калі бот падраўся, лапаць сплясці можна — лазы ж наўкруг, хоць гаць гаці... Не ўродзіць жыта, бульба ўродзіць. Вымачыць у балоце, на пяску нешта вырасце. Хата струхнела — лясок пад бокам... А яблыкі якія смачныя — ясі і есці яшчэ болей хочаш... Бывала, успомню перад боем куточак свой, грушу, што ў двары маім стаіць, ці як картаплянік пахне, калі яго з поля сцягваеш ды ў агонь кідаеш... І зашчыміць сэрца, нямілым усё на свеце робіцца... Падумаеш: няўжо болей не пабачу свайго дома, не пахаджу, дзе хадзіў?.. Можа, я прывык, кажуць жа, што кожны кулік сваё балота хваліць. Толькі скажу табе, чалавеча, што Бог нас не абдзяліў, зямельку такую зручную даўшы...

Цяпер дзядзька Змітро зацята смактаў тоўстую, як палец, самакрутку і моўчкі глядзеў на свае доўгія ногі, што, абутыя ў гумовікі, ледзьве не валакліся па зямлі.

— Што гэта вы, дзядзька, маўчыцё, не раўнуючы, як на хаўтурах? — не стрываў урэшце Кузьма і павярнуўся тварам да дзядзькі Змітра — Кузьма сядзеў уперадку і правіў коньмі: у тым жа салдацкім галіфэ, у той жа выцвілай гімнасцёрцы, толькі на нагах гэты раз былі абуты таксама, як і ў дзядзькі Змітра, гумовікі.

— А што гаварыць? — не падымаючы галавы, адказаў дзядзька Змітро.— Усё роўна, гавары ці не гавары, ад гэтага нічога не зменіцца...

— Ну тут вы, дзядзька, нешта загнулі не тое,— пакруціў галавою Кузьма.— Так сказаць, песімізму...

Кузьма пасля службы ў войску заўсёды пры зручным выпадку любіў уставіць якое-небудзь «вучонае» слова. Грамата ў брата была невялікая, усяго якіх шэсць ці сем класаў, а ён дужа хацеў, каб пра яго гаварылі, што ён сёетое ведае і ў сім-тым разбіраецца.

— Што не тое,— са злосцю агрызнуўся дзядзька Змітро — ён быў сёння, як і ўсе дзецюкі, трошкі на падпітку.— Хіба не праўду я казаў і кажу: зямля не мае цяпер сілы над чалавекам. Кожны смаркач скончыць школу і — ф'юць!.. У вёсцы астаюцца толькі тыя, хто сам рабіць ужо нічога не

можа. А ўсе астатнія — на вучобу, вярбоўкі розныя, на цаліну, будоўлі...

Памаўчаў, падумаў.

— Ліха яго ведае, можа, і праўда, як некаторыя кажуць, я застарэў... Толькі я, бы дрэва тое, дзе ўрадзіўся, там і памерці хачу. І як бы дрэнна не было мне, усё роўна нікуды адсюль не паеду. І людзей тых ненавіджу, што ўвесь век свой толькі тое і робяць, што па свеце валочацца, усё лёгкага хлеба сабе шукаюць. Дзе начуе, там ужо не днюе... Там добра, дзе нас няма... А я скажу, дзе мы ёсць, там сама лепей... Вазьмі нават бусла, што на хляве ў мяне гняздо звіў... Свет абляціць, а на мой падворак вернецца. То, напэўна ж, і ён не дурны, ведае, што лепей, як у нас, нідзе няма... І нешта рабіць трэба, каб не ўцякалі людзі з дому, каб зямелькі свае не цураліся, а каб была яна даражэй чалавеку за жыццё... Тады мы і з хлебам, і з мясам, і з малаком будзем, і пастаноў розных не трэба будзе па гэтульکі прымаць...

— Во, гэта голас! — падтакнуў Кузьма.— Вунь і сёння з калгаса шэсць сем'яў едзе. І куды — аж на Сахалін! Кідаюць бацькаўшчыну, усё, з чым гадамі зжываліся, да чаго прывыкалі змалку, і едуць...

— Ага,— пажвавеў, заёрзаў на адным месцы дзядзька і нават на момант забыўся смактаць папяросу.— Тут ты падтакваеш мне. А ты на сходзе, на сходзе, дзе начальства, скажы пра гэта!..

— І скажу,— сцебануўшы пужкаю коней, кіўнуў галавою Кузьма.— Думаеце, пабаюся?..

— Ты не гразіся, ты скажы... А то пакуль ты збярэшся гаварыць, глядзі, каб не позна было...— Зноў памаўчаў, падумаў.— Дажыліся вунь да таго, што мая меншая ўжо крык падняла — завярбуюся і паеду. Хоць замуж там выйду... Ты чуў? Каб выйсці замуж, трэба ехаць на край белага свету...— Дзядзька пацягнуў папяросу, марудна выпусціў з рота колцамі дым.— А падумаеш, і праўду кажа. Мая Валя вунь колькі год у дзеўках сядзела. А паехала з вёскі, на трэці ж месяц замуж выйшла. І жыве. Ва ўсякім разе не горш, чым мы з табою — паробіць месяц, ведае, што нешта палучыць...

— Ездзіць кожны з нас умее. А ты паспрабуй так зрабіць, каб не адсюль, а сюды ўсе ехалі,— як бы заспрачаўся з дзядзькам Кузьма.

— Паспрабуй, паспрабуй...— падахвоціў Кузьму дзядзька.— Можа, у цябе што і выйдзе. Бо я колькі ні рабіў — ні-

чога ў мяне не выйшла... Эт, ды што пераліваць з пустога ў парожняе... — Дзядзька абыякава махнуў рукою, яшчэ болей сагнуў спіну і апусціў галаву.

Кузьма болей не чапаў яго, бо ўехалі ў лес,— дарога тут завіляла між дрэў, і трэба было глядзець за коньмі, каб не ўз'ехаць на які-небудзь пень ці не зачапіцца воссю за камель і не паламаць калёсы.

Задумаўся, седзячы побач з ім, і я. Папраўдзе, здаецца ж, па-другому пачалі жыць цяпер людзі — у кожнай хаце ёсць электрычнасць, радыё, купляюць веласіпеды, матацыклы, тэлевізары. І ўсё роўна нечага людзям не стае — уцякаюць з вёскі. І едуць яны таксама ж не гуляць. Значыць, яны трэба і там, куды едуць. І, мусіць, нельга прывязваць чалавека сілком да зямлі, калі ў яго няма ахвоты яе ўрабляць. Хай едзе, куды хоча, куды яго цягне. Вось і мяне таксама не вабіць вёска, бацькава селішча, зямля. І добра гэта ці дрэнна?.. Наогул, дзіўна неяк у мяне бывае: у горадзе я нуджуся па дамоўцы, па вёсцы; варта ж толькі пажыць хоць тыдзень дома, у вёсцы, ірвуся назад у горад... Цела тут — душа там, цела там — душа тут...

Выехалі на вялізную лясную паляну, і Кузьма, акінуўшы вачыма фурманкі, што трэсліся, павольна паўзлі па дарозе, раптам выцягнуў загарэлую жылістую шыю і заспяваў высокім, амаль што дзявочым голасам:

Дзесь паехаў мой мілы ў дарогу,
Кінуў дома ён жану нездарову...

І дзядзька Змітро проста на вачах перайначыўся, змяніўся — выпусціў з рук недакурак, выпраставў плечы і, шырока разявіўшы рот, раўнуў, бы ў парожнюю бочку:

Прыязджае ён праз нядзелю-другую
Ды знаходзіць дзяціну малую.
Э-ха-хо!

Густыя мужчынскія галасы ўмомант падхапілі песню, перакінулі яе, бы вязку сена, з воза на воз. Хвіліна, і ўжо ўвесь абоз эхае, ахае, гарлапаніць на ўвесь лес:

— Ой, скажы мне, скажы, дарагая,
Скуль ўзялася дай дзяціна малая?
Э-ха-хо!

## IX

І вось першы вечар у маладым бярэзніку на грудку, ля самага балота. Кумкаюць як апантаныя жабы, кугакае, бы

малое дзіця, сава, дзьме ў доўгую дзюбу нешта сваё, буркатлівае,вадзяны бугай. Таўкуцца, ныюць, ні на хвіліну не змаўкаючы, мошкі, камары. За балотам, над лесам, далёка-далёка час ад часу ўспыхваюць начныя сполахі. Блісь-блісь-блісь — і патухне. Месяца на небе яшчэ няма — ён толькі ўзыходзіць, працярэбліваецца сваімі вострымі рожкамі праз густыя, чорныя ў вечаровым змроку вяршаліны дрэў — усё роўна як заблудзіўся і шукае дарогі. Парная цяплынь. Пахне завялым аерам — з яго мы паслалі сабе пасцелі, каб было нямулка, мякка спаць.

Я сяджу на пяньку каля берасцянага буданчыка, які мы зрабілі з Кузьмом яшчэ позідну, крыху ў баку ад усіх, на прагаліне, пад прысадзістым галлістым грабам, і ўспамінаю, як аднаго дня, пасля экзаменаў, удваіх з Валяю ездзілі за горад і заначавалі ў лесе. Я злавіў вудаю два шчупакі, некалькі лешчыкаў і плотак, і Валя, выпатрашыўшы іх, варыла юшку ў каструлі, што мы захапілі з сабою, едучы з горада. Якім таемна-прыгожым здаўся ў водсветах полымя мне Валін твар, асабліва тады, калі яна нагіналася, каб зняць лыжкаю пену і памяшаць варыва! Як пунцавелі яе круглыя, смуглявыя шчокі, з якой дабратой і пяшчотай глядзелі на мяне цёмныя-цёмныя, бы ноч, вочы!

Пасля, калі юшка зварылася, Валя разаслала на траве хустачку, парэзала на тонкія лустачкі хлеб, і мы проста з каструлі сёрбалі юшку — яна злёгку аддавала балотнай вадой і дымам і была такая смачная, якой я, здаецца, ніколі яшчэ не еў.

Тым часам добра ацямнела. Мы наламалі яловых лапак, зрабілі з іх нешта накшталт пасцелей. Але за ўсю ноч так і не звялі вачэй. Абняўшыся і прытуліўшыся адно да аднаго, мы ляжалі пад адкрытым небам і глядзелі, як загараюцца і паступова гаснуць зоры, як узыходзіць і паволі плыве нізка над лесам, час ад часу чапляючыся за голле і вяршаліны дрэў, месяц, як кожную хвіліну ўсё навокал мяняе свае абрысы, бляск і колер...

«...Валя, дзе ты цяпер? Што ты робіш там, у сваёй бабкі?..»

У памяці паўстаў той ранак, калі я ўпершыню пазнаёміўся з Валяю. Гэта было на трэці ці чацвёрты дзень майго прыезду на практыку. Прачнуўся тады я нешта вельмі рана і згадаў: учора, калі я вяртаўся з завода, дзяўчынка, што перабягала перада мною вуліцу, рассыпала чарніцы — яна некуды несла іх у плеценым цацачным кошыку. Дзяў-

чынка азірнулася, хацела, мабыць, сабраць ягады, але не паспела — якраз у гэты момант да тратуара пад'ехаў аўтобус і з яго адзін за адным пачалі выходзіць людзі. Дзяўчынка не стала чакаць, пакуль адыдзе аўтобус — пабегла подскакам, на адной назе, далей. А я доўга стаяў і не зводзіў вачэй з тых рассыпаных ягад — яны чарнелі ў пяску і былі бы ўсё роўна жывыя...

«У лесе паспелі ўжо чарніцы,— з нейкай неасэнсаванай радасцю думаў я, лежачы ў той ранак у пасцелі.— На вёсцы цяпер ва ўсіх — і ў баб, і ў мужчын, і асабліва ў дзяцей — чорныя, як мазніцы, раты. А ў лесе цалюткі дзень не сціхаюць песні, крыкі...»

І мне так закарцела дадому, у сваю ціхую лясную вёску, што я падняўся з пасцелі, памыўся пад кранам халоднай — аж зводзіла рукі — вадою і выйшаў на двор. Перад самым змяркannem над горадам прашугала кароткая летняя навальніца, і ўсёды на асфальце яшчэ стылі лужы, і было сыра, нават прахладна. Я пастаяў трохі ля інтэрната, шэрай, без балконаў, каробкі, дзе мне далі ў агульным пакоі ложак, потым прайшоўся па тратуары, перасек вуліцу і апынуўся ў невялікім, вельмі ўтульным скверыку. Ён, гэты скверык, быў у некалькіх кроках ад таго завода, дзе я практыкаваўся, і я вельмі ўпадабаў бываць у ім перад работай.

Я выбраў лаўку з краю, пры вялізнай круглай клумбе. Сеў. І адразу ж адчуў — у скверы пахне чарніцамі. Прынёс яго, гэты пах, сюды, у горад, учарашні дождж, ці, можа, пакінулі яго на лаўках тыя жанчыны, што прывозілі з вёскі паўнюткія кашолкі ягад і перш чым пайсці на базар прадаваць, адпачывалі ў скверыку,— я не ведаў. Аднак чарніцамі пахла так свежа і моцна, што я аж пашукаў вачыма вакол сябе, ці не ляжаць ягады рассыпаныя дзе-небудзь поблізу ў траве...

Вось у гэты момант і падышла да мяне дзяўчына. Была яна невысокая, чарнявая. Жоўтая, пашытая па модзе, шарсцяная сукенка, шчыгульна аблягала яе цела, неяк па-асабліваму адцяняючы высокія грудзі, вузкую — хоць вазьмі ды перашчыкні — талію, стройныя мускулістыя ногі. Дзяўчына неяк надта ж па-свойску, па-дамашняму, нібы мы з ёю былі ўжо даўно знаёмы, усміхнулася і спытала, ці не ведаю я, дзе ў гэтым горадзе вуліца Падвальная.

— А хіба ёсць такая? — пацісnuў я плячыма.

— Некалі была... — зноў усміхнулася дзяўчына.

І ў яе голасе, у тым, як яна глядзела на мяне, было

гэтулькі пяшчоты і дабраты, што я не мог, каб не пагаварыць з дзяўчынаю. Аказалася, што яна, як і я, упершыню ў гэтым горадзе, што яна, як і я, прыехала сюды на практыку і — што самае цікавае — яна вучыцца ў тым самым горадзе, што і я, толькі ў другім інстытуце. Мы пазнаёміліся. Дзяўчыну звалі Валя. Валя Букрэйчык.

Увечары мы сустрэліся зноў. І з таго дня пачалі сустракацца заўсёды пасля работы. Мы хадзілі ў кіно, блукалі разам па горадзе, аглядалі яго выдатныя мясціны. А мясцін гэтых было нямала — цэрквы і касцёлы з паколатымі ад часу сценамі і пазалочанымі макаўкамі і крыжамі, чырвоныя, складзеныя з адмысловай цэглы, якая вытрымала ўсе нягоды чалавечага жыцця і асталася бадай што такая ж, як і стагоддзі назад, вежы і байніцы, тэатры і дамы дзіўнай архітэктуры, кожнаму з якіх было па некалькі вякоў і кожны з якіх выглядаў, бы толькі ўчора з яго знялі рыштаванні...

— А ведаеш,— сказала аднойчы Валя,— у гэтым горадзе ёсць цудоўны парк. Кажуць, адзін з лепшых у Саюзе...

І ў бліжэйшую вольную нядзелю мы селі ў трамвай — ён быў маленькі, нейкай старой, не наскай канструкцыі, з дзвюма суцэльнымі бакавымі лаўкамі паўсцяж сцен, бы ўсё роўна ў старой вясковай хаце,— паехалі шукаць, дзе той парк. Кандуктарка, вельмі вясёлая, бойкая ўкраіначка, параіла нам, дзе лепш за ўсё выйсці, і мы выйшлі на нейкай вузенькай вулачцы і па ёй падняліся на горку, потым спусціліся ўніз — і тут мы ўбачылі высокую зялёную клумбу, а над ёю — белыя лёгкія арачныя вароты.

Парк і праўда быў незвычайны. Тут жа, пры ўваходзе — ставок, у якім надта грацыёзна плавалі белыя і чорныя лебедзі. І мы доўга стаялі ля гэтага стаўка і любаваліся тым амаль што казачным хараством, што ствараюць вада, перавернутыя ў ёй вяршынямі ўніз вербы, сонца і лебедзі...

Потым пайшлі далей па густых, цёмных алеях, скрэсленых удоўж і ўпоперак палосамі святла і ценямі...

Ходзячы па алеях ад дрэва да дрэва, мы так натаміліся, што калі паднялося высока ў неба сонца і пачало прыпякаць, мы не маглі перастаўляць ног. Урэшце натрапілі на лаўку, якая стаяла трохі ў баку ад алеі, і селі.

Вось тут мы ўпершыню і загаварылі, спачатку жартам, потым усё больш і больш сур’ёзна, ці маем мы каму пісаць адсюль пісьмы, ці думае пра нас нехта там, дома... Тут

я і даведаўся, што Валя — круглая сірата, што ні свайго бацькі, ні маці яна не помніць, бо яны загінулі ў вайну, калі ёй не было і трох год. Бацька невядома дзе, бо быў ён на фронце, а потым скінулі яго на парашуце ў лес, да партызанаў, а маці ў вёсцы, ля Сожа. Жыла Валя ў бабкі, бацькавай маці, а як скончылася вайна — пераехала ў горад... Там яна скончыла дзесяцігодку, паступіла ў інстытут... Гэты ж украінскі горад яна выбрала, каб паехаць сюды на практыку, таму што тут, як расказвала ёй бабка, яе бацька, чырвоны камандзір, некалі спаткаўся з маці, тут яны пажаніліся, тут і нарадзілі першую і апошнюю сваю дачку... Тут яны і жылі ў доме № 17 па вуліцы Падвальнай, пакуль не пачалася вайна...

Валя расказвала ўсё гэта, неяк вінавата і сумна ўсміхаючыся, потым раптам расплакалася. Я пачаў яе суцяшаць і неспадзявана — чаму раптам мне захацелася гэта зрабіць, нават і цяпер не ўцямлю? — абняў яе за плечы і пацалаваў.

...Успомніў усё гэта, і мне зноў, як і тады, у тым парку, зрабілася шкада Валі. «А я нават пісьма ёй не паслаў,— упікнуў сябе.— А абяцаў жа напісаць, як толькі прыеду!..»

## X

Касіць зачыналі рана, нацямку. Першы, перахрысціўшыся па старому звычаю на лес, пайшоў Змітро. За ім, увішна махаючы касамі, пачалі выстрайвацца адзін за адным і ўсе астатнія касцы.

Я спачатку стаў за Кузьмой. Але ўжо на другім заходзе прыкметна адстаў. Каса раптам пачала то ўразацца ў купіны, то пакідала за сабою траву, і даводзілася штохвіліны лішні раз махаць, каб яе зрэзаць.

Кузьма, убачыўшы гэта, уваткнуў кассё ў зямлю і пакошаю падышоў да мяне. Я не хацеў пасаваць перад братам і, хаця абліваўся ўвесь потам, аж прыгнуўся — стараўся захапіць як мага шырэйшы пракос.

— Ффіў! — спыніўшыся зводдалі, свіснуў Кузьма.— Ды ты не іначай хочаш увесь луг зараз выгаліць. Так доўга касы не пацягнеш — выдыхнешся і любы смаркач табе пяткі падрэжа...

Ён узяў з маіх рук касу, правёў па вастрыі пазногцем, правяраючы, ці добра яна намянташана. Потым расставіў шырока ногі і, узяўшы пракос як не напалавіну вузейшы,

пайшоў хутка і лёгка, бы забаўляючыся, і каса ў яго зазвінела, запела, тонка і весела:

— Жжык, жжык, жжык...

Спыніўся, дастаў з кішэні штаноў мянташку, зробленую з сітавага дубу, пасыпаў яе сухім пясочкам, павольна правёў ёю па касе. І зноў пачаў лёгка і спорна махаць касою. Трава, доўгая, густая, ляцела з-пад касы па цэламу бярэму, і за кожным узмахам Кузьма рабіў ледзь не крок наперад, пакідаючы за сабою на пакошы дзве роўныя глыбока ўмятыя палоскі слядоў.

Вераўняўшы пракос са сваім, ён пусціў мяне наперад, а сам пайшоў за мною, сказаўшы:

— Можа, з гэтага хлеба есці ты і не будзеш, але касіць усё адно трэба ўмець. Ды не хапай так шырока, трымай касу ў руках, не апускай, не лажы яе на зямлю!..— павучаў ён мяне, косячы ўслед.

Мо праз гадзіну я адчуў, што ў мяне агнём гараць далоні і пачынае тупавата пабальваць між лапатак. Але я не спыняўся — махаў і махаў касою. І чым болей я касіў, тым большая мяне брала ахвота: касіць яшчэ, касіць і ні за што не адстаць ад усіх, не выйсці з пракоса.

«Цікава ўсё ж гэта,— думаў я, махаючы касою.— Здаецца ж, і не касіў, а ўжо ўзяла мяне нейкая цікавасць, нават азарт. А каб пакасіў тыдзень, два? Відаць, на ўсё жыццё палюбіў бы луг, палюбіў бы касьбу. А каб на полі парабіў?.. Паараў, пасеяў, пабаранаваў, а пасля і пажаў, змалаціў?.. Мусіць, палюбіў бы і поле, зямлю. Гм, дык выходзіць нешта дзіўнае: я не люблю зямлі, бо не рабіў на ёй, не ведаю яе?..»

Крокаў праз колькі гэтая думка здалася наіўнай — зямлю ж кідаюць цяпер не толькі маладыя, але і тыя, хто раней трымаўся за яе рукамі і нагамі, хто без зямлі не ўяўляў свайго жыцця. І гэта не так сабе — тут ёсць нейкая прычына. А якая?..

Узышло сонца, і адразу ж плоймай наляцелі авадні, сляпні. Яны як ачмурэлыя з пагрозлівым зыкам кружылі і кружылі вакол касцоў і надта ж балюча кусаліся. Але людзі не зважалі — роўна і расцяжна махалі і махалі косамі...

— Жжык-жжык, шах-шах!..— толькі і чулася адусюль.

Тым часам раса ўвачавідкі ападала, і касіць з кожным крокам рабілася ўсё цяжэй і цяжэй. Трава выпрасталася, станавілася жорсткая і непадатная. Добра, што аб'явілі снеданне, і пярэднія, дайшоўшы да канавы, пачалі па-

ласкаць у ёй свае косы і адзін за адным, як буслы, цыбалі на грудок — усе загарэлыя, у лёгкіх крамных кашулях, знарок надзетых дзеля касьбы,— там, ля буданоў, была кухня.

Зраўняўшы з усімі свае пракосы, пайшлі на грудок і мы з Кузьмой.

— Ну як? — пытаўся дарогаю Кузьма.— Не шкадуеш, што паехаў са мною?

— Не-е!

— Ну, абы не шкадаваў,— засмяяўся брат.— Мы ўцёглыя, нам хоць бы што, а цябе папаломіць дзён колькі, пакуль прывыкнеш. Ды ты вельмі не бядуй. Калі мяне паставілі за брыгадзіра, я таксама думаў не вытрымаю і збягу...

— А цяпер?

— Цяпер нічога, пры-вык!..

## XI

На грудку, забіўшы ў пянёк бабку, Кузьма сеў кляпаць косы, а я злазіў у будан, узяў міску і пайшоў да катла па снеданне — прыварак касцам даваў калгас. Людзей ля катла было небагата, і я яшчэ здалёк у дзяўчыне, што, падпеpackазаўшы бялюткі фартушок, чарпаком накладала ў міскі крутую пшонную кашу, пазнаў Марту. І сэрца маё зноў трывожна забілася: «Чаму яна прыехала сюды, у Застожжа? З іх жа сям'і, здаецца, у калгасе ніхто ніколі не рабіў...»

І як толькі падышоў бліжэй, спытаўся:

— І ты тут, Марта?

— А чаму б мне не быць тут? — неяк гулліва сцепануўшыся, адказала Марта.— Папрасілі, я і паехала...

— А ўсё ж? — спытаўся я яшчэ раз, ужо больш настойліва, бачачы, што сапраўдную прычыну, чаму прыехала ў Застожжа, Марта ад мяне хавае.

— А ўсё ж?.. Прыехала, вось табе і ўсё ж,— сказала яна і ўспыхнула ўся, шчокі яе так і зардзеліся, зайгралі румянцам. Яна адвярнулася, пачала набіраць у катле чарпаком кашу.

— А падсочка? — не адставаў ад свайго я, нібыта ведаць, чаму Марта прыехала на луг, мне было так ужо і важна.

— Падсочка не воўк, у лес не ўцячэ...— Марта крутнулася перада мною і палажыла ў міску поўны чарпак ка-

шы.— Скажы лепей, дзе будан твой? — пераняла яна гаворку на другое.— Нешта я цябе не бачыла на грудку... Сустрэла ўчора Кузьму, кажа, паедзеш... А сёння ўранні гляджу — нідзе цябе няма...

«Няўжо яна праз мяне прыехала сюды?» — мільганула ў маёй галаве, і мне зрабілася горача.

— Мы сабе асобна буданчык зрабілі... Вунь там,— паказаў я рукою на прагаліну, дзе было наша жытло.— Бачыш?

— Бачу,— паднялася на дыбачкі Марта.

І тут вочы нашы сустрэліся. І ў яе глыбокіх, сумных вачах я ўбачыў дакор: навошта, маўляў, пытаеш пра тое, што пэўна ж, добра ведаеш і сам... І мне стала сорамна — я не вытрымаў позірку, першы адвёў свае вочы ўбок.

— Мы з Кузьмой. Прыходзь у госці — адчуўшы сябе вінавата, не ведаю чаму, сказаў я.

— Прыйду,— паабяцала Марта.

## XII

Апаўдні ў Застожжа прыехаў Раман Тарасавіч Кукса — мой калішні настаўнік, цяпер пенсіянер, за вочы — проста Лагарыфм. Убачыўшы на калгасным лузе мяне, былога свайго вучня, ён доўга трос мне руку і ўсё прымаўляў, відавочна падрабляючыся пад Тараса Бульбу:

— Ану павярніся, сынку, я пагляджу, чаму цябе навучылі ў тым бісаўскім горадзе!..

Касцы выходзілі якраз на грудок абедаць, і мы з Раманам Тарасавічам адышліся ў лес. Там, у баку ад дарогі, мы выбралі сярод старых вячыстых дубоў і разлапістых кустоў арэшніку чыстую паляначку, якая была заліта з усіх бакоў яркім ліпнёвым сонцам, і спыніліся, селі ў траву.

— Даўно хацеў цябе бачыць,— казаў, усё яшчэ прыдзірліва аглядаючы мяне, Раман Тарасавіч.— Ды ўсё не выпадала. То ты недзе ездзіў, то я хварэў... Ну расказвай, як жывеш, як вучышся... Дарэчы, я ж таксама некалі збіраўся стаць інжынерам...

— Праўда? — шчыра здзівіўся я.

— Было, было ў мяне такое памкненне!..

— І чаму не сталі?

— Чаму? — Раман Тарасавіч крыва ўсміхнуўся і, памаўчаўшы, вельмі ціха і неяк няпэўна дадаў: — На тое былі прычыны...

— Якія?

— Якія, пытаеш? — прымружыў вока, паглядзеў на мяне Раман Тарасавіч.— Ды ўсё тыя ж, пра якія ты, спадзяюся, чуў...

Ад нечаканасці я аж прыўзняўся.

— Хіба і вы былі... былі...— доўга не мог я падабраць патрэбнага слова.— Хіба і вас... бралі?..

— Цяпер хоць прызнацца можна. А то, думаў, так і памру, і ніхто не ўведае, хто такі Лагарыфм,— ён усміхнуўся.— Такую мянушку далі, нібы я ні пра што і гаварыць не ўмею, а толькі пра лагарыфмы. Горка, як горка было мне слухаць гэта! А зрабіць нічога не мог... Усіх, каго разам са мной пасля вайны выпусцілі, узялі зноў. А на мяне чамусьці забыліся... І я чакаў з дня на дзень, што возьмуць... Быў ніжэй травы, цішэй вады... Эх, Змітрок, зайздрошчу я табе, што ты малады, не ведаеш, што значыць чакаць, што цябе не сёння-заўтра зноў возьмуць. Спыніцца ля тваёй хаты машына, падыдзе да цябе незнаёмы чалавек — і табе здаецца: усё...— Раман Тарасавіч цяжка ўздыхнуў, зняў акуляры і, не спяшаючыся, спакваля працёр хусцінкаю шкельцы. Гэтак жа зусім, як на ўроку, калі рашаў на дошцы задачу.— Бачыш, замест таго каб распытваць, што і як у цябе, я спавядаюся перад табою сам. Не думай, што я хачу, каб ты ведаў яшчэ пра адну ахвяру... Не, я адчуваю перад табою і перад усімі вамі, маімі вучнямі, віну. Вялікую віну. Я даў вам у школе не тое, што трэба было і мог даць. І гэта мяне мучыць...

— Часы былі такія,— уражаны тым, што пачуў, прамовіў я,— і вы не вінаваты...

— Не, усё ж вінаваты,— не згадзіўся са мною настаўнік.— Нельга ва ўсім вінаваціць толькі час. Вінаваты ва многім і людзі. Ёсць яшчэ і цяпер такія, хто гатовы закапаць праўду ў магілу, калі яна горкая. Ім хоць мана, абы салодкая, прыгожая...— Рыгор Тарасавіч памаўчаў: — Мы кажам, за праўду тады садзілі. Не тое! Каб усе мы гаварылі праўду, усіх бы не перасадзілі. Бяда не ў тым, што мы гаварылі, а ў тым, што большасць маўчала, сёй-той маніў, а астатнія, бачачы, як добра тым, хто маніць, пачалі маніць і самі... Ды я загаварыўся...— глянуўшы на гадзіннік, раптам спахапіўся Раман Тарасавіч.— Я ж агітатар. Прыехаў, каб расказаць касцам, што робіцца на свеце. Ты на ўсё лета?

— На ўсё,— кіўнуў я галавою.

— Ну дык часу ў нас хопіць. Пагаворым яшчэ з табою. Толькі ты не саромейся, заходзь да мяне. Я ж цяпер адзін...

— Як адзін? — падняў я вочы на свайго настаўніка.— А Мар'я Хведараўна?

— Памерла... Яшчэ вясною,— сказаў Раман Тарасавіч і ў той жа момант павярнуўся, каб я не бачыў яго твару,— пайшоў напрасцяк праз гушчар у той бок, дзе былі буданы і адкуль чуўся дробны перастук малаткоў і мянташак. Маленькі, згорблены і, здалося мне, вельмі няшчасны...

Я ж яшчэ нейкі час сядзеў на паляне. Зверху праз густую сетку галля і лісця падалі мне на твар гарачыя, сляпучыя промні сонца. Чэкаў недзе зусім побач у верхавінні дзяцел, сцішана перагукваліся ў кустах арэшніку сівавaронкі. Сычэлі нябачныя ў траве конікі. Некуды спяшаліся, беглі заклапочаныя мурашкі. А я сядзеў, прыгнечаны, прыгаломшаны пачутым, і чамусьці ўспамінаў тое, што рабілася ў нашай вёсцы адразу ж пасля вайны. На працадні тады ў калгасе нічога не давалі. Рабіць жа задарма ніхто не хацеў, і ўсё стараліся ўладкавацца ў леспрамгас ці яшчэ куды, дзе плацілі грошы. Рэвізійная камісія штодзень не таму, дык другому абразала па самыя вуглы соткі — не ідзеш у калгас, няма табе і зямлі. Сымон Квасолька, што жыў у другім канцы вёскі, засеяў абагуленае поле — усё роўна калгас яго не сеяў, яно пуставала, як пуставалі і цэлыя абшары скрозь — да ўсяго ў людзей не даходзілі рукі. І Квасольку за «самаўпраўства і самавольны захоп калгаснай зямлі» ўпяклі аж на шэсць год у турму... А ў яго — сям'я, восем ратоў, і ўсе дзеці малыя, адно меншае за другое...

І вось тады на ўроку, калі Раман Тарасавіч схамянуўся, чаму другі тыдзень не ходзіць у школу Алік Квасолька (Сымонаў сын, ён вучыўся ў тым жа, што і я, класе), мы сказалі, што Алік ужо абсякае сучча на складзе, у леспрамгасе, і спыталіся, чаму Сымон Квасолька не дома, а ў турме...

Раман Тарасавіч пачырванеў, рукі ў яго дробна закалаціліся.

— Я прыйшоў на ўрок алгебры,— неяк асабліва гучна сказаў ён.— І я прашу не задаваць мне ніякіх пабочных пытанняў...

На тым уроку ў класе стаяла нязвыклая цішыня. Ніхто нікому не падказваў, ніхто нікому не памагаў рашаць задач — была акурат кантрольная — кожны рашаў за сябе. А Раман Тарасавіч сядзеў за сталом, гартаў журнал і чамусьці не глядзеў на клас...

Потым я ўспомніў Мар'ю Хведараўну... Не, мы, вучні, не тое каб любілі сваю выкладчыцу нямецкай мовы, а хутчэй за ўсё паважалі. Пры ёй мы не маглі выкінуць якую-небудзь штуку, не маглі ісці да дошкі, калі не вывучылі ўрок. І не таму, што яе баяліся, а проста не маглі, і ўсё — такі была яна чалавек. З усяго, што я ведаў пра Мар'ю Хведараўну, усплыло, як у першыя гады пасля вайны мы хадзілі ўсім класам збіраць жалуды — тады садзілі ў стэпах ахоўныя палосы, і мы падрадзіліся назбіраць больш за сто пудоў насення дуба. У лесе мы запазніліся, і калі надвячоркам ішлі дадому, дагналі палонных немцаў. Немцы жылі ля нашай школы, у вялізным, без акон і дзвярэй, зрубе, абгароджаным наўкруг метраў на дзесяць калючым дротам, і штодзень хадзілі на дзялянкі рэзаць лес. У другі раз мы, можа б, прайшлі ля немцаў зусім непрыкметна, нават на іх не паглядзелі. Але перад гэтым здарылася адна прыгода, пра якую багата гаварылі ў нашай вёсцы — немцы, вяртаючыся з лесу, назбіралі грыбоў, якіх у той год усюды было проста процьма, і ўвечары наварылі. І пахварэлі, як адзін — у добрыя грыбы, мусіць, трапілі мухаморы ці паганкі...

Немцы і цяпер шукалі грыбоў — разбрыліся ўзбоч дарогі па лесе і перагукваліся, крычалі адзін аднаму, аж галасіў лес:

— Дзі пільцэн, вэльхэ ротэн мютцэ хабэн, золь ман ніхт нэмэн!*

Як ні прасілі мы Мар'ю Хведараўну сказаць нам, што крычаць адзін аднаму немцы, яна так і не сказала... Сцішылася неяк, задумалася і да самай школы не прамовіла ні слова.

«Чаму?.. Не, немцаў яна не шкадавала, бо гэта не хто іншы, а яны забілі ўсіх яе дзяцей — двух сыноў на фронце, а шаснаццацігадовую дачку тут, у нашым лесе, калі тая прабіралася з мястэчка з нейкімі вельмі важнымі весткамі да партызан... Тады, чаму яна сціхла, чаму не захацела перакласці нам тыя нямецкія словы?.. Хіба палонныя немцы нагадалі ёй яе дзяцей? А мо той лагер за калючым дротам, дзе быў яе муж? — думаў цяпер я.— Хто можа сказаць, што было ў яе тады на душы, чаму яна змоўкла?.. Ніхто, бо Мар'і Хведараўны болей няма...»

---

* Грыбоў, якія маюць чырвоныя шапкі, не браць!

## XIII

Праз дзень, вылезшы з балота на грудок, Кузьма сказаў мне:

— Ну, брат, аставайся тут адзін, без мяне. Я паеду ў вёску, пагляджу, што там у брыгадзе робіцца. Сам ведаеш наш калгас. Не дагледзь — не зробяць. Можа, трэба што маці ці бацьку перадаць?

— А што ім перадаваць? — пацепнуў плячыма я.— Бачыш, пакуль усё добра, кашу.

— Ну ладна, касі,— махнуў ён на развітанне рукою.— А я паеду. Калі шчыра сказаць табе, хвалююся я трохі. Магда ж мая радзіць маецца... Ды што табе да гэтага, халасцяку, табе ж невядомы яшчэ такі сямейны клопат,— усміхнуўся ён.— Жаніцца там у горадзе не надумаў?

— Не,— ухіліўся я ад адказу.— Няма з кім.

— Ну ты мне гэта кінь — няма з кім... А мо па гэтай,— паказаў ён вачыма на грудок,— па Будавай усё сохнеш, га?

— Што ты,— аднекнуўся я — мне здалося, што Кузьма нешта ведае, і я не хацеў выдаваць сябе.

— А яна, брат, па табе сохне,— сказаў ён, смеючыся.— Бачыш, у Застожжа прыехала, як пачула, што і ты едзеш. Ну ладна, глядзі сам, не маленькі...

— Калі вернешся? — спытаўся я, калі Кузьма сабраўся адыходзіць.

— Не ведаю. Пэўна, праз дзень ці праз два, калі дома ўсё добра. А што, можа, прывезці што з дому табе трэба?

— Ды нічога,— памуляўся — казаць ці не? — І я ўсё ж сказаў: — Можа, там пісьмо дома мне ёсць, дык захапі...

— Значыцца, нехтачка ёсць, калі пісьмаў чакаеш...— заўсміхаўся Кузьма.— Ладна, зраблю, што ты просіш. Толькі каб вяселля не скруціў, чарку добрую паставіў!..

— Ну тады тое будзе. Ідзі...

Кузьма выйшаў на дарогу і хутка схаваўся ў зялянiне дрэў. А я ўзяў міску і паволі паклыпаў да катла па абед...

## XIV

Увечары, намахаўшыся касою так, што балела, бы пабітае, усё цела, а рук дык і зусім нельга было падняць — гэтак пакутліва яны нылі, я сядзеў ля свайго буданчыка, ніяк не рашаючыся класціся спаць. Мне раптам пачало здавацца, што вось-вось павінна нешта здарыцца надзвы-

чай важнае, тое, ад чаго будзе многае залежаць у маім жыцці. І я сядзеў, чакаў, сам не ведаючы чаго.

Моўкнуў, паволі агартаўся начною дрымотаю лес. Цемра зацягвала дрэвы, кусты, рабіла іх праз меру густымі і няпэўнымі. Але камары ўсё яшчэ не сціхалі — танютка звінелі і звінелі ў вечаровай шэрані. І было ўсюды ціха-ціха. Нават не крумкалі жабы.

Але вось у гэтай цішы я ўлавіў асцярожныя крокі — нехта, расхінаючы галінкі кустоў, ішоў да майго будана. Я падняў галаву, прыслухаўся: хто б гэта мог быць?..

Амаль не здзівіўся, калі ўбачыў Марту. Я ведаў, што яна прыйдзе да мяне, чакаў гэтай сустрэчы і, прызнацца, трошкі яе баяўся. З таго дня, як напаткаў Марту ў лесе і аддаў ёй вожыка, я многае перадумаў. І вырашыў ні за што не збліжацца зноў з Мартай, быць ад яе як можна далей, не даваць волі сваім пачуццям, не вярэдзіць ні свае, ні яе душы. У мяне ёсць дзяўчына, Валя, я буду сябраваць з ёй. У Марты ёсць муж, і хай яна жыве з ім, жыве і ні на што іншае не спадзяваецца. А тое, што было ў нас некалі, хай забудзецца, як бы яго і не было зусім. Так, і толькі так, іначай усё можа скончыцца вельмі кепска... І для яе, і для мяне... Так, прынамсі, думаў я, калі ўбачыў, што Марта прыехала таксама ў Застожжа...

Марта спынілася як бы ў нерашучасці крокаў за два ад мяне і неяк таямніча спыталася:

— Ты яшчэ не спіш?

— Як бачыш...— абыякава адказаў я: я надумаўся быць неразгаворлівым, не выдаваць таго, што ў мяне на душы, каб Марта адчула сама, што яна цяпер чужая мне, непатрэбная.

Яна села на пянёк поблізу будана, адламала з арэшкавага куста галінку і, выцягнуўшы перад сабою ногі, пачала абмахваць ёю камароў. Вусны яе былі сцяты, а вочы пазмоўніцку блішчэлі.

— Што гэта ты сёння нейкі кіслы...— паглядзеўшы на мяне, сказала Марта, і голас яе задрыжаў.— Ты што, незадаволены, што я прыйшла?.. Дык я магу і назад пайсці.

Яна і папраўдзе ўстала і павярнулася, каб ісці. Я не чакаў, што яна так зробіць. І сказаў:

— Сядзь, пасядзі... Я трохі, мабыць, ператаміўся... Ведаеш, з непрывычкі...— І ўсміхнуўся.

Яна зноў села. Але блеск у яе вачаў патух. Вусны яшчэ больш сцяліся. Яна апусціла галаву, задумалася. Забылася нават на камароў, якія адразу ж абляпілі яе ногі.

— Пра што ты думаеш?..— спытаў я, каб неяк парушыць тую халоднасць, што ўзнікла між намі.

— Ат, пра ўсё,— сказала Марта, як бы ачнуўшыся.— Ты не зважай, раскажы лепей, як жывеш у горадзе...

— Што табе расказваць? Жыву, як і ўсе. Вучуся...

— А як скончыш, куды паедзеш?..

— Не ведаю. Куды пашлюць...

І тут я здагадаўся, што Марту цікавіць не тое, што яна пытае, а нешта зусім *іншае*. І яна пытае пра маё жыццё ў горадзе, пра тое, куды я паеду, як закончу інстытут, каб выведаць тое, *іншае*. Дзеля таго, *іншага,* яна, можа, і прыйшла сюды да мяне ў гэты вечар. І я на момант забыўся, што думаў у першую хвіліну, калі прыйшла Марта. Спытаўся:

— А ты як жывеш?

— Што я,— пацiснула плячыма Марта.— Я дома, замужам...

— Давольна мужам?

— Давольна не давольна, а выйшла замуж, то жыць трэба,— яна сумна ўсміхнулася.— А ты жаніцца не збіраешся?..

Гэтыя словы Марта сказала з такім хваляваннем у голасе, што я здагадаўся: гэта і ёсць тое нешта *іншае,* дзеля чаго яна і прыйшла да мяне.

— Пакуль што не. Няма з кім...— неяк само сабой сарвалася ў мяне з языка звыклае, і ў тую ж хвіліну я пашкадаваў, што сказаў гэта. Бо Марта павярнула галаву да мяне і спытала:

— Як няма? Ты ж пісаў у тым апошнім сваім пісьме...

— То была няпраўда...— прызнаўся я.

— Як няпраўда? — аж падалася ўсім целам да мяне Марта.

— Бачыш,— няўмела пачаў бараніцца я.— Я атрымаў тады пісьмо, у якім мне пісалі, што ты ходзіш у клуб на пагулянкі, што ля цябе ўвіхаецца нейкі шафёр... Ну і раззлаваўся вельмі!.. Выдумаў тую дзяўчыну, каб неяк адпомсціць табе, выклікаць рэўнасць: маўляў, гуляеш ты, не думай, што не гуляю я...

— Дык ты ўсё гэта выдумаў! — не магла апамятацца Марта.— А я, я паверыла...

Яна прыкрыла рукамі вочы, але не заплакала.

— Я не думаў, што ты пасля майго пісьма так зробіш... Тут пісьмо, а тут праз нейкі час пішуць з дому, што ты выходзіш замуж.

— А што мне аставалася рабіць? — падняла на мяне вочы Марта.— Ты напісаў, што я табе болей не трэба. А без цябе мне — хоць куды, усё роўна... Сумна мне вельмі ў тую восень было, Змітрок,— прызналася яна.— У інстытут я не паступіла... Дый так... Можа, каб трошкі развесяліцца, я і ў клуб той пайшла, на танцы... Тыдня не прайшло, а тут пісьмо тое тваё... Далей і сама не помню, што рабіла... А калі падумала, успомніла — заплакала... І цяпер яшчэ плачу...

Яна папраўдзе ўсхліпнула. І ад яе слёз мне зрабілася не па сабе. У тую хвіліну я падумаў, што буду ўсё сваё жыццё шкадаваць, што напісаў тое вар'яцкае пісьмо,— яго, таго пісьма, я не дарую сабе ніколі. А Марце сказаў зусім іншае:

— Няўжо ён такі паганы? П'е?

— Не, не п'е,— пахітала галавою Марта і выцерла хусцінкаю вочы.

— Дык чаго ж тады?

— І сама не ведаю... Вось не магу з ім жыць, і ўсё...

— Што, ён непрыгожы? Брыдкі?

— Даўно вельмі бачыла яго. Шосты месяц ужо... Нават забылася, які ён. Ведаю толькі, што каб была дзяўчынаю, ні за што не пайшла б цяпер за яго замуж...

— Чаму?

Яна паціснула плячыма.

— А ўсё ж?

— І сказаць не магу... Не выйшла б, і ўсё. Можа б, яшчэ і нічога, жыла б я з ім, каб да мяне не жыў ён з жанчынай адной, дзіця ёй не пакінуў...

— Адкуль ты пра гэта ўведала? Сам расказаў?

— Не, жанчына тая да мяне прыязджала. Пачула, што са мною ажаніўся, і прыехала... Перажывала я гэта вельмі спярша, думала, не ўжывуся з ім, кіну. А пасля...

— Што пасля?..

— Пасля махнула на ўсё рукою... Так і жывём, ён сабе, я сабе. Я тут, ён недзе ў Карэліі...

Яна памаўчала. Уздыхнула. Цяжка, са шкадаваннем.

— Змітрок? — раптам, нібы нешта ўспомніўшы, спыталася яна і зноў паглядзела на мяне,— а ты, ты вельмі перажываў, як пачуў, што я выйшла замуж?

Я не адказаў. Дый што я мог ёй адказаць? Помню, прачытаў я ў пісьме, што Марта выходзіць замуж, перад пачаткам заняткаў і не пайшоў на лекцыі. Нешта балюча заныла ў мяне ўсярэдзіне, і дзён колькі не хацелася нічога

рабіць. На лекцыях я сядзеў, не могучы запісаць ні радка з таго, што гаварыў выкладчык. Прыходзіла нават у галаву думка — кінуць інстытут, паехаць дадому, у вёску, і не даць, каб гулялася тое вяселле. І я бадай што зрабіў бы гэта, каб ведаў, што Марта ўсё яшчэ кахае мяне, а не таго, за каго выходзіць замуж. Тады ж я думаў, што яна проста здрадзіла, і мне было да болю, да роспачы крыўдна. Ва ўсім я тады вінаваціў Марту. Аж, выходзіць,— ва ўсім вінаваты я сам...

— Я не чакаў, што ты так зробіш,— сказаў я.— Мне здавалася, што ты мяне ўсё ж кахаеш... Успомню, як хадзілі мы ўночы праз лес з табою да леснічоўкі, і...

— Не трэба пра гэта, Змітрок,— папрасіла Марта.— Лепей раскажы, хто ў цябе цяпер ёсць там, у горадзе?.. Прыгожая?

Я павагаўся — расказаць Марце пра Валю ці лепей не трэба. Калі скажу, што нікога ў мяне няма, усё роўна не паверыць. Дый навошта мне так гаварыць, што гэта дасць?.. І я сказаў:

— Летась пазнаёміліся. На практыцы... Сірата яна — ні бацькі няма, ні маці.

— Ажэнішся з ёй?

— І сам не ведаю...

Марта памаўчала. Тое, што яе так цікавіла, яна выведала. А таму, можа, яна і ўстала, абцягнула на сабе плацце і, стараючыся не глядзець мне ў вочы, сказала:

— Пайду я... Заўтра ўставаць трэба рана...

І мне зрабілася шкада Марты. Шкада, як ніколі. Гэта ж не хто іншы, а я зрабіў яе такою нешчаслівым, я разбіў яе надзею. І каб хоць хацеў таго сам — а то ж выйшла ўсё міма маёй волі, неяк само сабой. Бо не напісаў бы я Марце таго пісьма,— не было б, не мучылася б яна замужам за нялюбым...

— Чакай, я правяду цябе,— сказаў я, таксама ўстаючы.

— Не, не трэба,— адмовілася Марта.— Тут недалёчка, зайду і адна. Спакойнай табе ночы.

Павярнулася, падняла галаву і пайшла ў цемру, пайшла павольна і ціха, бы здань.

## XV

З вёскі Кузьма вярнуўся назаўтра ж. Загадкава паглядзеўшы на мяне, дастаў з нагруднай кішэні гімнасцёркі тэлеграму і падаў мне. Нічога не ведаючы, я імгненна

разгарнуў блакітны тэлеграмны бланк і прачытаў: «БУДУ СЁННЯ СУСТРАКАЙЦЕ ВАЛЯ».

Хвілін колькі я стаяў, бы аслупянелы. Потым перачытаў яшчэ раз тое, што было напісана ў тэлеграме — не, здаецца, усё правільна, тэлеграма адрасавана мне.

— Нічога не разумею,— адчуваючы, як прылівае да твару чырвань, сказаў я.

— Не прыкідвайся. Сам быў такі...— з'яхіднічаў Кузьма. І тут жа мяне паўшчуваў: — Толькі ты дарэмна не сказаў пра гэта нікому. Падрыхтаваліся б, сустрэлі б. Быў бы, адным словам, ажур. А так, выкручвайся, як хочаш, сам. Мая хата з краю, я нічога не знаю...— развёў ён рукамі.

— Я не ведаў, далібог, не ведаў,— кляўся я і бачыў, што брат не верыць ніводнаму майму слову.— Гэта нейкая недарэчнасць, памылка...

— Сварыцца я з табой не хачу, дый няма часу. Бяжы хутчэй дадому і гайда на станцыю! — уладна загадаў Кузьма.— Я прыйду заўтра, пагляджу, што там у цябе за краля... А заадно і жонку праведаю.

— Не радзіла яшчэ?

— Не.

Я паслухмяна аддаў Кузьме касу, а сам, не заходзячы нават на грудок, пайшоў у вёску.

«Няўжо гэта праўда, што едзе Валя? — думаў, губляўся ў здагадках усю дарогу я.— Але ж чаму?.. Што ў яе здарылася? Мы ж не дамаўляліся, што яна прыедзе да мяне...»

## XVI

Дома была сапраўдная паніка. Стол, лыжкі, канапка, табурэты былі ссунуты са сваіх звычайных месцаў да парога, а пасярод хаты, падаткнуўшы падол спадніцы, стаяла з анучай у руках маці — мыла падлогу. Бацька сядзеў на ўколенках у качарэжніку і вышкрабаў на лапатку смецце.

— Падумаеш, пані вялікая прыедзе,— нязлосна бурчаў ён сабе пад нос, не чуючы, што адчыніліся дзверы і ў хату зайшоў я.

— Пані не пані, а ўсё ж чужы чалавек. Яшчэ немаведама што пра нас падумае,— гаварыла маці.

Убачыўшы мяне, абое сціхлі.

— Гэта нейкая недарэчнасць,— яшчэ з парога сказаў

я, каб тоькі нешта сказаць, не стаяць моўчкі.— Можа, нават памылка...

— Памылка! ...— ухмыльнуўся бацька.

— Не, Змітрык, якая ж тут можа быць памылка,— разважыла па-свойму, па-жаночы маці.— Мусіць, сох, сох, ды нешта напісаў такое... А ведама ж, дзяўчына — усё магла падумаць. Але ты не крыўдуй, мы нічога не маем, хай едзе, вось толькі каб у хаце трохі прыбраць... Усё ж як ні кажы, а чужы чалавек...

— Ладна, мама,— хацеў супакоіць я маці.— І так добра будзе.

— Што ладна? — накінуўся ні з таго ні з сяго на мяне бацька.— Пакуль я тут гаспадар, і я не хачу, каб аба мне чортведама што думалі. Калі едзе, значыцца, трэба, каб палюдску ўсё было. Чым меў вучыць, дык лепей вядро якое вады прынёс бы!..

Мне нічога не аставалася, як схапіць парожнія вёдры і бягом бегчы да студні...

## XVII

Цягнік прыходзіў а палове дзесятай, але ўжо ў дзевяць я быў на станцыі. Блукаў па бязлюдным пероне — звычайным, пасланым з негабляваных дошак уздоўж пуцей тратуары,— і з галавы ў мяне не выходзіла думка, што прымусіла Валю так раптоўна паехаць да мяне. Памерла бабка?.. Але тады Валя хутчэй бы паехала ў горад, да матчынага брата... Сумна стала?.. Але Валя не такая, каб паддацца настрою — жыццё навучыла яе цярплівасці, чаканню. Што ж тады ў яе?..

Я перабіраў у памяці ўсё, што толькі магло ў Валі здарыцца, і да нічога пэўнага не прыходзіў...

Урэшце я прымусіў сябе пакінуць строіць здагадкі — усё роўна, строй не строй, нічога з гэтага не выйдзе, дый балазе чакаць заставалася нядоўга, усяго якую паўгадзіну, а там усё стане і само сабой вядома,— сеў пры вакзале на лавачку і ад нечага рабіць пачаў аглядаць станцыю.

Станцыя была невялікая, адусюль заваленая штабелямі дроў і ярусамі бярвення. Толькі з аднаго боку, адкуль ішла дарога — пыльны, шырокі, спярэшчаны машыннымі каляінамі шлях — дроў і бярвення не было,— стаялі звычайныя драўляныя хаты, абшаляваныя на гарадскі манер дошкамі і пафарбаваныя знадворку ў жоўты ці цёмна-зялёны колер, з высокімі ганкамі і шклянымі верандамі. Трое хлапчукоў

ганялі па траве мяч і білі яго наскамі чаравікаў так, што ён аж выў немым стогнам.

Змяркалася. Мутны бледнаваты змрок павольна асядаў на хаты, набліжаў з кожнай хвілінай усё больш і больш і без таго чорную сцяну лесу, што цесна акружала з усіх бакоў станцыю. Але пахла яшчэ зусім як удзень, моцна і густа — насмоленымі гудронам шпаламі, дубовай карою, прэлымі трэскамі, пахла адтуль, дзе грувасцелі штабелі дроў і ляжалі ярусы бярвення. На запасным пуці, у тупіку, рабочыя грузілі вагон. Ля вагона гарэла вялізнае яркае вогнішча, і ў яго святле відны былі чорныя і плоскія, бы выразаныя з кардону, людзі: яны рукамі цягнулі вяроўкі і падбадзёрвалі адзін аднаго гучнымі выкрыкамі:

— Ну, раз-два — узялі! Яшчэ разок! Яшчэ!..

Пасажыры — дзве старэнькія бабкі, дзядзька ў вялізных, самаробных ботах, некалькі вясковых дзяўчат і хлопцаў з чамаданамі і клункамі, чакаючы цягніка, тоўпіліся на пероне і аб нечым ціха перамаўляліся. Маладая жанчына трымала на руках малое і забаўляла яго,— выпучвала шчокі, гучна цмокала языком і час ад часу шчасліва смяялася. З жэзлам у руцэ, у чырвонай шапцы і замасленым выцертым кіцелі шпацыраваў сюды-туды дзяжурны па вакзалу...

Але вось з лесу, асцярожна мацаючы адным вокам яшчэ не густую, вечаровую шэрань, выскачыў паравоз. Адчайна, гулка свіснуў і, мякка падсоўваючыся да станцыі, адразу ж суцішыў ход. Ляснулі буферы, скрыгатнулі колы, зашыпелі буксы — цягнік спыніўся.

Як не бягом я кінуўся да вагонаў. Прабег паўз іх у адзін канец, прабег у другі, зноў вярнуўся назад: Валі нідзе не было відаць. Дый пасажыраў, што тут, на гэтай станцыі, выходзілі, таксама было нямнога — усяго нейкіх чалавек сем-восем. Чамусьці мой позірк упаў на чалавека ў белым палітоне, што, стоячы ў тамбуры, падаваў з вагона чамаданы і наладаваныя сеткі тоўстай, расфуфыранай кабеце. Я падбег да вагона — можа, Валя стаіць за спіною гэтага чалавека? — і здагадаўся пра ўсё: у кабеце я пазнаў Валю, старэйшую Жолудаву дачку...

Вось яна, тая Валя, што пасылала тэлеграмму. Не мне, а дзядзьку Змітру...

Канешне, каб я не хадзіў на пошту, каб не пытаўся пісьмаў, то...

Мне зрабілася сорамна і крыўдна. І я, не чакаючы, калі адыдзе цягнік, памалу пабраўся назад, у вёску...

## XVIII

Мо цэлы тыдзень я быў проста сам не свой. Ад сораму і прыкрасці я не мог глядзець у вочы бацьку, маці, не мог паказацца на вуліцу,— баяўся, што мяне засмяюць нават дзеці. Гэта ж трэба, каб усё так супала! І прозвішча, і нават імя дзяўчыны. Ведама, у горадзе такое б не здарылася, там усюды, на кожным доме, стаіць нумар. А тут...

У Застожжа болей я не паехаў — траву там ужо дакашвалі, дый не хацелася сустракацца ні з Мартаю, ні з Змітром Жолудам, Валіным бацькам. І я не выходзіў з двара — папраўляў платы, якія сям-там збуцвелі і асунуліся, перакідаў ад сенцаў бліжэй да хлява свінушнік, паладзіў на хаце страху, бо ў раптоўныя навальнічныя дажджы, асабліва ў ліўні, яна працякала.

Потым, калі дома не стала чаго рабіць, сеў на веласіпед і паехаў у Качай-балота — яго асушылі, і мне чамусьці вельмі рупіла пабыць там, дзе яшчэ зусім нядаўна гібела спрадвечная багна.

Ехаць у Качай-балота трэба было лесам і міма паляны, дзе ў вайну ў зямлянках жылі партызаны. Паляна тая цяпер зарасла арэшнікам, папаратнікам, і, каб не ямы ад зямлянак, ніхто не сказаў бы, што некалі тут, у лесе, быў партызанскі лагер. А ён жа такі праўда быў — я нават сам начэй колькі начаваў тут, калі перад самым вызваленнем нехта пусціў пагалоску, што немцы намерваюцца ўсіх нас пагнаць у Нямеччыну...

Ходзячы па зарасніку ад ямы да ямы, я неспадзявана наткнуўся на ржавую нямецкую каску, што, перавернутая бокам, ляжала пад разложыстым кустом крушыны... Ці не ў гэтай касцы мы, дзеці, насілі з балота ваду, калі хаваліся ад немцаў?..

І тут я ўспомніў — непадалёку ад гэтай паляны, пад старымі дубамі, пахаваны парашутыст з Масквы... Яго скінулі ў наш лес неяк зімою, у першы год вайны. Немцы засяклі, дзе прызямліўся парашутыст, і паранілі яго. Але і паранены ён не здаўся — дапоўз да партызанскага лагера, перадаў нейкія надзвычай важныя звесткі і — сканаў...

І толькі цяпер я здагадаўся, чаму я ехаў у Качай-балота. Ды гэта ж мне хацелася пабыць ля той магілы. «А што, калі той невядомы парашутыст Валін бацька? — падумалася мне. Валя ж казала неяк, што яго таксама скідвалі ў лес да партызанаў. І там ён прапаў без вестак...»

Я выйшаў зноў на дарогу, праехаў да тых дубоў...

Дубы стаялі з краю, ля самага балота, магутныя, рачкаватыя, і пад імі падымаўся невысокі драўляны помнік, абгароджаны пафарбаванай у зялёны колер дашчанай агароджай... На магілцы цвілі касачы, бялела шаўковая трава...

Ходзячы ўзбоч Качай-балота, якое было парэзана ўздоўж і ўпоперак на роўныя квадраты вузенькімі канаўкамі,— у іх блішчэла, пераліваласся вада,— я ўспамінаў Валю і тое, што не раз чуў ад яе — як яна, калі трохі падрасла, шукала свайго бацьку — пісала пісьмы ў Маскву, у Мінск, да ўсіх бацькавых знаёмых, якіх помнілі бабка і дзядзька... Аднойчы яна чытала газету і там патрапіла на подпіс «А. Букрэйчык». «Антон Букрэйчык»,— прачытала яна. «Тата, яе тата жыве!»

У той жа дзень яна купіла білет на цягнік і паехала ў горад, дзе выходзіла тая газета. У рэдакцыі ёй сказалі, што ніякага Букрэйчыка няма, што «А. Букрэйчык» — гэта псеўданім аднаго супрацоўніка газеты...

— То, можа, ён ведаў майго бацьку Антона Букрэйчыка? — спыталася, усё яшчэ на нешта спадзеючыся, Валя.

Не, супрацоўнік той — вельмі малады хлапец, нядаўні выпускнік універсітэта, ніякага Букрэйчыка не ведаў, нават ніколі не чуў, што дзе-небудзь ёсць людзі з такімі прозвішчамі...

«Няшчасная дзяўчынка! Пражыць усё сваё жыццё і не ведаць ні бацькі, ні маці. Трэба напісаць ёй пра гэтую магілу. А раптам і праўда тут пахаваны яе бацька?..»

Я сеў на веласіпед і паехаў дадому з адною толькі думкаю — больш ніколі не ўспамінаць Марты, думаць толькі пра Валю...

## XIX

Дома, у бацькавай хаце, я застаў Кузьму. Ён быў чыста паголены, паднядзелены — у белай, шаўковай саколцы, чорных напрасаваных штанах, на нагах — новыя паўчаравікі — і п’яны. Убачыўшы мяне, падхапіўся з-за стала. Віхляючыся з боку на бок, пайшоў насустрач. Твар яго аж ззяў да нейкага невядомага ўзрушэння і радасці.

— Віншуй мяне, Змітрок,— ускрыкнуў ён.— Сын у мяне нарадзіўся! — і, аблапіўшы рукамі за плечы, палез да мяне цалавацца.

Я ледзьве выкараскаўся з яго дужых і чэпкіх абдымкаў.

— Люблю я цябе, Змітрок! — крычаў як не ў самае маё вуха Кузьма.— І сына свайго назаву таксама Змітраком!

Вось тады будзе — у адным сяле — тры Змітракі і ўсе Жолуды... Сам чорт не разбярэ, той гэта ці не той, калі каторы з іх на нешта трэба будзе. Ха-ха-ха! — рагатаў Кузьма.— Ды гэта пасля... А цяпер давай да мяне, там усе ўжо нас чакаюць. Вып'ем за здароўе сына!..— і, не даўшы апамятацца, пацягнуў мяне з хаты...

Жыў Кузьма за грэбляю, на пасёлку, адразу ж з канца. І хвілін праз якіх дзесяць мы былі ўжо ў яго хаце. Хата ў Кузьмы была новая, нават яшчэ не патынкаваная, на тры пакоі. У самым вялікім, залі, стаялі ўздоўж сцен упрытык адзін да аднаго сталы, і за імі сядзелі госці — мой бацька, маці, маці Магды (бацькі ў яе не было, не вярнуўся з вайны), радня з нашага і жончынага боку. Усе паспелі ўжо ўзяць па добрай чарцы, а таму былі вясёлыя, гаманлівыя.

Як толькі мы ўвайшлі ў хату, застолле заварушылася, закрычала і ўмомант рассунулася, даючы нам сесці на самым пачэсным месцы. Але Кузьма як бы і не заўважыў гэтага — ганарыста, бы певень, прайшоў па хаце,— павёў мяне ў пакойчык збоку, у спальню, і паказаў сына — ён спаў, абкладзены падушкамі, каб не скаціўся, на пасцелі,— маленькі, чырвоненькі, нібыта толькі што з лазні. Побач з ім на другім ложку ляжала Магда — бледная, змораная. Мне яна слаба ўсміхнулася аднымі толькі куточкамі вуснаў, я павіншаваў яе з сынам, і мы вярнуліся ў залу.

За сталом было тлумна, гармідарна, я выпіў адну чарку, потым другую, вельмі хутка забыўся на свой сорам і сум, разам з усімі смяяўся, жартаваў з Кузьмы, бо той неўзабаве зусім сп'янеў і заснуў за сталом...

Потым я зноў піў, зноў смяяўся...

## XX

Назаўтра я прачнуўся позна і доўга не мог успомніць, як я ўчора пакінуў бяседу, дабраўся дадому, залез на сенавал, распрануўся і нават — што мяне больш за ўсё здзівіла — акуратна склаў у куточак сваю адзежу. Галава балела, аж разламвалася, а ў роце — нібыта я сена еў — мулка і нясмачна. Я ўстаў, нацягнуў на сябе штаны, сарочку, і тут пачуў ля нашай хаты нейчы вельмі знаёмы голас і зычны раскацісты смех. «Дзе я чуў гэты голас?» — Потым здагадаўся: ды гэта ж прыехаў Юзік!

Момант — і я быў ужо на двары. Папраўдзе, ля нашай хаты, акружаны бацькам і маці, стаяў Юзік: у новенькай,

з іголачкі, афіцэрскай форме, падцягнуты, стройны і ад таго яшчэ больш высокі.

— Надоўга? — спытаўся я, ціснучы яму руку.

— У тым і справа, што ненадоўга. Праездам, сёння ўвечары еду...— адказаў Юзік.

— Чаму так мала?

— Служба,— усміхнуўся ён.— Гэта не тое, што ты. На сенажаць ездзіш, гарэлку п'еш, а пасля спіш да самага паўдня...

— Можа, у хату зойдзем? — падняў на Юзіка вочы бацька.— За стол сядзем.

— Не, не трэба...— адмовіўся той.— Застолля ў мяне сёння і так будзе. А Змітрок бадай пасля ўчарашняга ачухацца не можа,— прыдзірліва аглядаючы мяне, зарагатаў Юзік.

— Нядобра ж неяк,— сказала маці.— Вы ж госці, ды яшчэ такія рэдкія...

— Не крыўдуйце, цётка Гэля і дзядзька Пятро,— сказаў Юзік.— Не трэба нам той стол, мы лепей пагаворым трохі са Змітраком. Чатыры ж гады не бачыліся!..

— Выпілі б па чарцы, то і гаворка пайшла б цікавей,— не адступалася ад свайго маці.

— І так пойдзе...— зноў засмяяўся Юзік.

І я адчуў, што ён нешта тоіць у сябе на душы. Ці не збіраецца ён пагаварыць са мною пра нешта такое, пра што не хоча, каб ведалі мае бацькі? Відаць, так. І маці з бацькам зразумелі гэта таксама. Пастаяўшы яшчэ трохі на двары, яны пайшлі ў хату.

А мы з Юзікам пералезлі праз плот у агарод, дзе пад галлістаю яблыняю стаяла шырокая дубовая лаўка — на ёй часта ўвосень начаваў бацька, каб суседскія дзеці не лазілі ў сад (не так абяруць, як паломяць) — і, седзячы там, адзін аднаго перабіваючы, пачалі распытваць і расказваць пра вучобу, пра сваё жыццё ў тыя гады, што мы не бачыліся.

Юзік акурат закончыў вайсковае вучылішча, прыняў узвод, і толькі тое і гаварыў што пра сваю службу — захапляўся сяржантамі і салдатамі, дысцыплінай у часці, тым, як добра сустрэлі і ўладкавалі маладых афіцэраў.

— Не, я нават не чакаў, што ўсё так добра складзецца...— усклікаў раз-пораз ён.

— Не жаніўся яшчэ? — каб збіць гаворку з вайсковай тэмы, спытаўся я.

— Думаю вось... А ты?

— Халасцякую.

— А я жаніцца буду. Ведаеш, надакучыў інтэрнат, сталовыя. Дый што за афіцэр без жонкі?.. Не, жаніцца трэба, інакш сап'ешся, абы чым займацца пачнеш... Дарэчы, жаніцца нам раіў і камандуючы, калі гутарыў з намі,— зноў перайшоў да вайсковага жыцця Юзік.

Я ўсміхнуўся. Дзе падзелася Юзікава неразгаворлівасць, ваўкаватасць, праз якія Юзіка ў школе інакш і не звалі, як Цюхця-маўчун. Перада мною сядзеў зусім іншы чалавек, не той, якога я некалі ведаў.

— Жаніцца, канешне, можна! — знарок разважліва сказаў я.— Толькі вось як будзеш жыць пасля... Памятаеш, нехта сказаў, усе дзяўчаты добрыя, невядома толькі, адкуль кепскія жонкі бяруцца...

— У тым і справа ўся...— згадзіўся са мною Юзік.— Пагляджу я вось на Марту, і душа баліць... Замуж-то выйшла, а што з таго...— Юзік памаўчаў.— Вечар цэлы ўчора мне пра сябе расказвала...— і раптам, падняўшы галаву, паглядзеў мне проста ў вочы.— Кахае яна цябе, Змітрок! Ды яшчэ як кахае! Ночы не спіць, у клуб ходзіць, каб цябе пабачыць... На сенажаць ездзіла...

Я баяўся, што Юзік пачне гаварыць пра гэта, і ўвесь час думаў, што яму адказаць, калі ён раптам неўзначай кранецца нашых адносін з Мартай. Але адказаў самае нечаканае, тое, што першае прыйшло ў галаву:

— Я і сам шкадую, што ў нас з ёю так выйшла.

Мне і праўда было шкада, што Марта выйшла замуж і ўсякая надзея сысціся зноў са мною — рушылася.

— Цяпер ужо нічога не зробіш.

— Яно-то так,— памаўчаўшы, з сумам сказаў Юзік.— Жыццё... Тут так — раз памыліўся, век не перакаешся... Скажу толькі, я рад быў бы, каб ты стаў мужам маёй сястры...

— Але, павер, гэта ўжо, мусіць, немагчыма, Юзік!

— На свеце няма нічога немагчымага,— уздыхнуўшы, адказаў Юзік. І гэтыя словы прагучалі не завучана, а неяк надта ж шчыра.— Асабліва калі абое кахаюць адно аднаго...

Я не хацеў больш спрачацца, даказваць нешта сваё Юзіку. Марта — яго сястра, і ён хацеў ёй шчасця. А я думаў не толькі пра Марту — я думаў пра яе мужа, Валю, сябе... Каб гэтая гаворка была яшчэ ў тое лета, калі я прыязджаў на некалькі дзён дадому і сустрэў у лесе Марту... Цяпер жа мінуў час, я ведаў ужо не толькі Марту, але

і Валю. Тую Валю, якая столькі ўсяго перажыла... Не, я не хацеў, каб яна перажыла ў дадатак да ўсяго яшчэ і здраду дарагога ёй чалавека, у якога яна паверыла...

І таму я не адказаў нічога Юзіку — прамаўчаў.

Мы пагаварылі яшчэ трохі аб сім-тым, але размова неяк адразу ж страціла і для яго, і для мяне сваю цікавасць. Мы больш сядзелі і маўчалі, чым гаварылі. Я нават рады быў, што Юзік нарэшце падняўся з лаўкі і заспяшаўся дадому.

— Я ж еду сёння,— апраўдваўся ён.— І так ледзь выпрасіўся ў сваіх, каб з табой пабачыцца...

Я не затрымліваў яго. Праўда, прайшоўся з ім як не да самага лесу.

— Можа, да нас зойдзем? — запрасіў Юзік.

— Ці варта? — засумняваўся я.

— Ну, глядзі сам...

Мы абмяняліся адрасамі, паабяцалі пісаць адзін аднаму і на тым расталіся...

## XXI

І зноў пацягнуліся дні. Як і раней, я прачынаўся на досвітку, ездзіў на Віць правяраць свае кашы, памагаў дома маці, але рабіў гэта без ахвоты, абы зрабіць.

Бацька, бачачы, што я без прычыны нуджуся, неяк не стрымаў:

— Эх, сын мой, сын!..— пажурыў ён мяне.— Ад зямлі ты адарваўся і неба не дастаў. Нешта рабіць трэба, бо без работы і блыха дохне...

Я і сам ведаў, што трэба нешта рабіць, не сядзець дома склаўшы рукі, а быць з людзьмі — толькі там і адчуваеш сябе, што і ты такі ж чалавек, як і ўсе. Але мужчынскай работы ў калгасе асаблівай не было — час быў такі, што бульбу абагналі ўжо па трэцяму разу, лугі пакасілі, сена зграблі і склалі ў стагі,— памагла балазе пагода,— а збажына яшчэ не паспела. І я цэлымі днямі, бы непрыкаяны, сноўдаўся па вёсцы нідзе не знаходзячы сабе занятку.

Каб адвесці хоць чым душу, паспрабаваў быў зайсці да хлопцаў, з якімі некалі вучыўся ў школе і якія нікуды з вёскі не паехалі — асталіся жыць і працаваць тут, дома. Але іх мала цікавіла мая турбота і мой сум — у іх быў свой клопат: як аплацяць сёлета працадзень, ці не скруціць іх заробку старшыня, як той, леташні,— збожжа, што трэба было аддаць на працадні, ён прадаў у закуп. Старшыню за гэта знялі, але людзям ад гэтага не палепшала...

Аднойчы, таго не заўважыўшы і сам, я апынуўся ў двары Рамана Тарасавіча Куксы. Ён жыў наводшыбе, за вёскаю, ля калгаснага гарода. Пасяліўся ён там нешта гады праз два пасля вайны, калі пераехаў з мястэчка настаўнічаць у нашу школу — хата ўсё роўна пуставала, бо тую сям'ю, што жыла некалі ў ёй, расстралялі немцы.

Нейкі час я стаяў і азіраў сядзібу. Як тут усё было дагледжана, даведзена да ладу — агароджа, двор, невялічкі садок! Кожнае дрэўца пабелена, акапана, грады прапаланы — нідзе ні травінкі. Двор чыста падмецены, дарожка выкладзена чырвонай цэглай.

— Усё, усё сам,— гаварыў Раман Тарасавіч, выходзячы з сякерай у руках з дрывотніка — маленькага навесіка з дошак.— З таго дня, як памерла Мар'я Хведараўна, усё раблю сам... І вару, і мыю, і гарод урабляю...

Ён узяў мяне за плечы і, адчыніўшы фортку, правёў у сад. Тут таксама панавалі тая ж акуратнасць і парадак — кусты парэчак і агрэсту абгароджаны, галінкі яблынь і груш падпёрты. Грады адна ў адну, нешырокія, доўгія, і паўз разоркі пасаджаны кветкі — дробныя ружовыя маргарыткі, блакітныя і жоўтыя касачы, гладыёлусы, вяргіні, астры...

Селі на лавачку пад старою, напалову ўжо ўсохлай грушаю, і я толькі цяпер убачыў, як пастарэў мой колішні настаўнік — твар яго быў бледны, маршчакаваты, рукі бясконца сутаргава калаціліся, дый сам ён, здавалася, увесь калаціўся. Толькі што храбрыўся, усё яшчэ не здаваўся, хацеў жыць.

— Ну, як вы, Раман Тарасавіч? — спытаў я, трохі счакаўшы.

— Ды нішто пакуль...— суха кашлянуў у кулак Раман Тарасавіч.— Больш ляжу, чым хаджу...

— Што, хварэеце? — спытаў я зноў, і мне зрабілася ніякавата: пра што я пытаю ў старога чалавека?

— Хварэю,— трымаючыся адной рукою за грудзі, ціха адказаў Раман Тарасавіч.— Усё збіраюся схадзіць у бальніцу, ды не дабяру часу. То адно, то другое... Але я рад, што ёсць работа, што да мяне хоць на старасці ідуць людзі... Вось і нядаўна прыходзілі — старшыня і твой брат Кузьма. «Парайце,— кажуць,— што рабіць, ніхто не ідзе палоць лён, цвіце няполаны...» А што я магу раіць? Летась абяцалі даць надбаўку на тыя працадні, што зароблены на лёне. І не далі... Бачыш, з чаго ўсё пачынаецца: абяцаў і не даў...— заламаў на руцэ два пальцы Раман Апанаса-

віч.— Сёлета абяцай ужо залатыя горы — ніхто не паверыць... Абяцаць трэба тады, калі напэўна будзе. А так лепей маўчы... Вось так і адбілі патрошку ў чалавека ахвоту ўрабляць зямлю. Той старшыня трошкі, гэты трошкі... Старшыні мяняюцца, а людзі астаюцца адны і тыя ж...— ён адкінуў наском чаравіка каменьчык, што валяўся пад нагамі, і нібы спахапіўся: — Ды што гэта я зноў?.. Лепш ты раскажы што-небудзь пра сябе. Як там, у горадзе? Жаніцца не думаеш?..

— Яшчэ не думаў,— прызнаўся я, трошкі збянтэжаны.

— Жаніся, жаніся, Змітрок,— падахвоціў мяне Раман Тарасавіч.— І думаць тут няма чаго... Калі мне было столькі год, колькі цяпер табе, я, дурань, доўга муляўся, усё ніяк не мог на жаніцьбу рашыцца. І толькі як астаўся зноў адзін, па-сапраўднаму ацаніў, кім была для мяне Мар'я Хведараўна...— на вачах у яго нагарнуліся слёзы.— Эх, Змітрок, зайздрошчу я табе. У цябе ўсё яшчэ наперадзе!..

— Ці варта?.. Хто ведае, што будзе...

— Што б ні было, а таго, што было, ужо не будзе. Гэта пэўна. І таму... Прашу цябе — будзь сумленным, ніколі не рабі таго, у што не верыш сам... Нават пад прымусам. І табе не страшна будзе тады нічога, што б ні здарылася. Сумленне тваё будзе чыстае...

— А вы рабілі? — падняў вочы на настаўніка я.

— Не,— памаўчаўшы, з болем выдыхнуў Раман Тарасавіч.— Памятаю, выклікалі мяне. «Таварыш Кухта,— пытаюць,— скажыце, вы ведаеце, хто такі Пракоп Цімчук?» «Як не ведаць,— кажу я,— трэці ж год жывем у адным пакоі, разам і ядзім, і спім, і на лекцыі ходзім». Паглядзелі на мяне і, нібы цэбар халоднай вады на галаву: «Пракоп Цімчук трацкіст, вораг народа». У мяне і вочы на лоб палезлі. «Падпішыце, што гэта так»,— і падсоўваюць мне паперку. Я, вядома, не падпісаў... Дык мяне... О, колькі мучылі! А потым і самога пасадзілі... Там, ужо ў турме, сустрэў я чалавека, ён і расказаў мне, што Пракоп раскрытыкаваў на сходзе нейкага недацяпу, той і махнуў данос... І Цімчука не стала. Вось як... Часам ад зайздрасці людзі ядзяць адзін аднаго, таму, што ты разумней, прыгажэй за іх... Не будзе цябе, тады яны будуць выглядаць разумнейшыя. Асцерагайся недалёкіх людзей, зайздроснікаў, а калі ўжо тузаешся з імі, кладзі адразу на лапаткі, каб болей не ўсталі,— Раман Тарасавіч сцяў вусны, і ў вачах яго з'явілася жорсткасць — такога яго я бачыў упершыню.— Ты не

думай, што я перад табою... пахваляюся ці апраўдваюся. Я кажу табе тое, што павінен быў сказаць у школе. Як настаўнік... Як чалавек... Урэшце, як старэйшы таварыш, які больш перажыў усяго і пабачыў.

Ад Рамана Тарасавіча я пайшоў позна. Ад усяго, што пачуў, кружылася галава...

## XXII

Неспадзявана разнягодзілася, пайшлі дажджы. Дзён колькі ні на хвіліну не паказвалася сонца, на дварэ было змрочна і сыра. Зусім як увосень з раніцы да позняга вечара плылі і плылі нізкія, цягучыя хмары. І гэта яшчэ болей гняло, давіла мяне. Раней хоць быў лес, было поле, была Віць. Цяпер жа — чатыры цесныя сцяны хаты.

Дождж змыў з сахі ластаўчына гняздо, і, прачнуўшыся неяк уранні, я ўбачыў яго на сене ля сваёй пасцелі. Добра, што паблізу нідзе не шныпарыў кот, інакш бы ад чырвоных, яшчэ зусім голенькіх, у пушку, пісклятак не засталося б і следу. Перапалоханыя старыя ластаўкі, бацька і маці малых, неспакойна кружылі пад страхою хлява, не ведаючы, што ім рабіць. Я схадзіў у хату, узяў малаток, цвікі, кавалак дошкі і сяк-такі прыладзіў ластаўчына гняздо на ранейшае месца да сахі і пасадзіў у яго маленькіх ластавянятак. Як удзячны былі мне за гэта старыя ластаўкі! Яны мо з гадзіну яшчэ не выляталі з хлява і ўсё нешта шчабяталі, ціліўкалі...

Дома, у хаце, я доўга стаяў ля акна, глядзеў на мокрыя грушы і яблыні, з якіх капала, спадаючы па лісці, вада, і думаў пра Валю. Чаму яна мне не піша?.. За тры тыдні — ні аднаго пісьма... Што ў яе здарылася?.. Дамовіліся ж, што напіша, як толькі прыедзе...

Потым я ўспомніў Марту. Успомніў, як прыходзіла яна да мяне ў Застожжы, калі я заставаўся ў будане адзін, успомніў, што гаварыў мне неяк Кузьма: «Ну і ўлягае за табою, Змітрок, гэтая Будава. На пакос ездзіла... У клуб вечар у вечар ходзіць, каб цябе пабачыць. Надоечы сустрэла мяне, пытае: «Што з вашым Змітраком? Не відно нешта яго нідзе...» І мне стала не па сабе. Я ўявіў, як Марта, скінуўшы лодачкі, каб іх не замачыць у расе, ідзе адна надвячоркам у клуб, як танцуе, не зводзячы вачэй з дзвярэй — ці не іду я? — і як пасля, так і не дачакаўшыся мяне, бяжыць ноччу адна цераз лес дадому... І каб хоць яна вінавата была ў тым, што мы не сышліся, а то ж віна-

ваты я. Вінаваты, можа, нават больш, чым сама яна... А што, калі Валя пазнаёмілася там, у бабкі, з якім хлопцам, ходзіць з ім на танцы, гуляе і зусім забылася на мяне? А я тут марнею і сохну, мучаю і сябе, і Марту... Каму гэта трэба? «Гуляй, пакуль гуляецца»,— прыйшлі мне ў галаву недзе чутыя словы,— ці не на радзінах у Кузьмы? І як толькі выбліснула сонца і неба ачысцілася ад хмар, я выкаціў з сенцаў веласіпед, крыкнуў маці, што я хутка вярнуся, і, ускочыўшы на сядзенне, паехаў у лес, да Марты...

## XXIII

Марта была ў бары, на падсочцы: імкліва шмыгаючы між тоўстых і яшчэ мокрых ад дажджу камлёў, яна хутка і спрытна наразала на соснах стамескай вусікі,— прыгнецца, наставіць у самы ніз смалістай лапіны стамеску, выпрастаецца — дж-жык! — і цэлая стружка з шорхатам падае долу.

Я схаваўся за маладую галлістую сасонку і нейкі час любаваўся Мартаю — яе тонкім і гнуткім станам, грудзьмі, што аж распіралі лёгкую жаўтаватую кофтачку, поўнымі загарэлымі рукамі. Потым, калі Марта падбегла зусім блізка, я выйшаў са свае схованкі.

— Аказваецца, ты здорава ўмееш працаваць,— сказаў я, усё яшчэ любуючыся Мартаю.

Ад нечаканасці Марта ўздрыгнула, з рук у яе ледзь не выпала стамеска.

— Ой! — ускрыкнула яна і павярнулася на голас. І ў тую ж хвіліну шчаслівая ўсмешка расплылася па яе твары.— А я ўжо была спалохалася, думала, можа, чужы хто,— сказала яна больш спакойна.

— Я кажу, здорава ты ўсё ж працуеш,— паўтарыў я, пачаўшы гаворку на смяшліва-вясёлы лад, я не хацеў ужо быць сур'ёзным, бо ведаў: развярэджу зноў і сабе і Марце душу, і мы зноў расстанемся, нездаволеныя адно адным. Марце відавочна таксама падабалася, што я так з ёю размаўляю, бо яна расчырванелася, і ў вачах у яе ўспыхнулі тыя шалёныя агеньчыкі, якія я бачыў заўсёды ў той год, калі праводзіў яе з клуба да леснічоўкі.

— А няўжо ж так, як ты, лынды б'еш. Цэлымі днямі сядзіш дома. Нават увечары ў клуб лянуешся прыйсці...

— Адкуль ты гэта ведаеш? — як бы нічога і не казаў мне Кузьма, спытаўся я, радуючыся, што мы гаворым зноў так, як гаварылі некалі, нібы Марта і не выходзіла зусім

замуж, нібы мы з ёю толькі ўчора ўвечары рассталіся і сёння вось сустрэліся зноў.

— Я яшчэ і не тое ведаю,— падміргнула Марта мне вачыма.

— А менавіта?..

— Ды хаця б тое, што ты падараваў адной дзяўчыне вожыка і ні разу нават не спытаў, не прыйшоў паглядзець, як ён жыве. І нават больш: вожык той аказаўся зусім не вожыкам, а важыхаю... І важыха тая нарадзіла важачанят... Яны падраслі ўжо і бегаюць па хаце...

— Ну? — знарок весела ўскрыкнуў я, успомніўшы тую нашу першую сустрэчу вось тут, у бары, калі я ехаў з Ласінага Логу і падараваў Марце вожыка.

— Далібог, праўда. Прыязджай, паглядзіш,— зусім сур'ёзна сказала Марта.

— Калі?

— Ну, хаця б заўтра. Увечары... Я акурат адна дома буду...

— А куды ж бацька, маці пойдуць?

— Недзе ў вёску. На радзіны,— і пачырванела ўся, зарумянілася.

— І ты не баішся быць са мною адна? — жартам спытаў я і, не чакаючы, што яна адкажа, падышоў да яе, гулліва абхапіў за плечы. Гэта адбылося неяк нечакана, міма мае волі, і апамятаўся, прыйшоў у сябе я толькі тады, калі адчуў на сваёй шыі Марціны рукі,— уся закалаціўшыся, яна пачала нервова і прагна цалаваць мяне ў губы, у вочы...

Стрымаць сябе я ўжо не мог.

Цела маё ўмомант налілося пругкай, мускулістай сілай, і ў вушах зазвінела нейкая ціхая, дзіўная музыка. Шыю, твар абдало гарачынёю. Хвілін колькі я стаяў як аглушаны... Потым рукі мае пачалі хінуць Марту да сябе...

— Не трэба...— ледзь выдыхнула яна і адвяла мае рукі ўбок.— Тут людзі ходзяць. Лепей прыйдзі заўтра ўвечары, як сцямнее... Добра?..

Яна, гэты раз ужо сама, прыхінулася да мяне, паднялася на насочкі і пацалавала ў вочы.

— Дык ты прыйдзеш? — па-змоўніцку ціха, шэптам спытала яна.

— Прыйду,— сказаў я і лёгенька адпіхнуў Марту. Потым, пастаяўшы хвіліну, як не подбегам сігануў да свайго веласіпеда — ён стаяў пад сасонкай непадалёку ад сцяжынкі...

## XXIV

Увесь наступны дзень я жыў чаканнем сустрэчы з Мартай. Хадзіў з маці рваць свінням бабоўнік, сек дровы, памагаў бацьку падпіраць голле яблынь, каб яно не паламалася ад яблык, што віселі ўсюды рэпехам. Але што б я ні рабіў, я думаў толькі пра Марту...

У поўдзень я з'ездзіў на Віць, пакупаўся, назбіраў невялікі букецік лугавых кветак — смолак, зязюлек, талерачак, званочкаў, божых слёзак — і ўсё паглядваў на сонца — чакаў вечара, калі змеркнецца і можна будзе ехаць у лес да Марты. А яно, як на тое, вісела і вісела над галавою і быццам не збіралася сёння нават заходзіць. Мне пачало здавацца, што вось-вось нешта здарыцца такое, што перашкодзіць мне быць увечары ў леснічоўцы...

І яно такі здарылася. Вярнуўшыся з рэчкі дадому, я ўбачыў на стале пісьмо. Ад Валі. Нарэшце! Імгненна я разарваў канверт, выняў складзены ўдвая ліст і на момант забыўся на ўсё на свеце. Валя пісала, што яна хадзіла ў лес па ягады, трапіла пад дождж, намокла, прастудзілася і зусім неспадзявана злягла ў бальніцу... Цяпер ёй стала лепш, і яна рада, што можа хоць адпісаць на мае пісьмы. Страшэнна сумна, і яна аддала б, здаецца, усё, каб толькі пабачыць мяне...

«Яна хварэе, а я...»

Мне зрабілася як ніколі яшчэ сорамна перад самім сабою. І тады ж аднекуль, з глыбіні душы, вынікла думка — паехаць да Валі, паехаць сёння ж, не адкладаючы гэта ні на дзень пазней...

## XXV

Увечары я быў ужо на станцыі. Зноў сядзеў на той самай лавачцы, на якой дзён колькі назад чакаў цягніка,— на ім прыехала Жолудава Валя,— зноў ад нечага рабіць аглядаў станцыю, і ў маёй памяці раптам усплылі словы Рамана Апанасавіча: «Жаніся, жаніся, Змітрок».

«А што, калі і праўда ажаніцца? — падумаў я.— Ажаніцца і на жніво прыехаць дадому, ужо ўдваіх, з Валяю...»

З гэткімі думкамі я сеў і ў вагон, калі на станцыю прыйшоў цягнік.

*1964 г.*

# Запіскі Занядбайлы

*ШАНОЎНЫ ДЗЯМ'ЯН ПАРХВІРАВІЧ!*

*У першых радках свайго ліста хачу саабшчыць, што я жыў-здароў, чаго і вам жадаю. А яшчэ да Вас у мяне просьба ёсцека. Летась пажыць да нас у хату напрасіўся нехта Занядбайла, халасцяк. Хаты нам не шкада, жыві. Ён і жыў. Спаў на сенавале, еў тое, што варыла мая Параска. Тады, адпачыўшы, паехаў у свой Мінск. Мы з жонкаю пачалі ўжо і забываць патроху на таго Занядбайлу, аж неяк па вясне, калі канчалася сена, я ўбачыў на сенавале заткнуты ў страху тоўсты сшытак. Вядома, сшытак той я дастаў, узяўся разбіраць, што ў ім напісана. І не змог. Надта ж дробны почырк, чытаць яго — усё адно, што вошы лічыць. І цярпення ў мяне няма, і вочы нешта падводзяць, каб хоць, крый Божа, зусім не аслепнуць. Вы ўжо, Дзям'ян Пархвіравіч, не крыўдуйце, але нікога, акрамя Вас, у Мінску я не ведаю. Ваш жа адрас у мяне астаўся з таго лета, калі Вы мелі ласку жыць у нас. Помніце, Вы тады падарылі мне нават сваю кніжачку: «Дарагому П. І. Кабылкіну на памяць». А ніжэй трохі і адрасок напісалі — «Сёмая шостая лінія, 15а, кв. 17». Дык я параіўся з Параскай і намысліў паслаць Вам сшытак. Можа, убачыце Занядбайлу і аддасце яму, як я зразумеў, яго запіскі. Бо мне яны ні к чаму...*

*Занядбайлу гадоў, мусібыць, пад сорак, але галава ў яго сівая, як усё адно ў старога дзеда. Яшчэ ён казаў, што працуе ў музеі. Сумны такі чалавек, невясёлы, і ўсё нешта думае, думае, нібыта сіліцца ўспомніць штось, ды нешта замінае яму, не дае тое зрабіць.*

*Прабачайце, Дзям'ян Пархвіравіч, што так, ні з сяго ні з таго, патурбаваў Вас. А яшчэ кланяецца Вам і Вашай жонцы, Настасі Раманаўне, мая Параска і просіць, каб не забывалі і прыязджалі зноў у наш лясны край. Гэта і я таксама прашу, бо карова наша ацялілася і малака дае — цьфу, цьфу, каб не сурочыць! — літраў пятнасце ў дзень. І малачко тлусценькае, смачненькае. А дзяваць яго няма*

*дзе. Каб былі Вы ды дзеткі Вашы, Святланка і Петрык, то спажывалі б сабе на здароўечка.*

*Пятро Кабылкін, ляснік.*

*Адраса свайго не пішу, вы яго і так, пэўна, помніце. 6 травеня 1974 года.*

## Уступ

Вось жа казаў праўду паэт, Някрасаў:

> Мужик что бык: втемяшится
> В башку какая блажь —
> Колом ее оттудова
> Не выбьешь...

І мне ў галаву «втемяшилась» — калі, я нават успомніць ужо не магу — таксама «блажь»: быццам я нешта вельмі важнае, патрэбнае згубіў на сцяжынах свайго не такога і доўгага жыцця і што калі я не знайду таго «вельмі важнага, патрэбнага», то і жыць далей мне няма чаго. Сіліў, сіліў я памяць, так і гэтак думаў, што ж такое і дзе я мог згубіць — і... Словам, нічога путнага ў мяне з гэтага так і не выйшла. «А што, каб з горада, з мітусні, тлуму ўцячы куды-небудзь далёка, на прыроду,— цюкнула мне аднойчы.— Пажыць там аднаму ў цішы ды спакоі. Нагадаць сабе, што са мною здаралася, было. Так сказаць, прайсціся яшчэ раз па тых слядах, у якія ступалі ўжо калісь мае ногі. Га?.. Быць таго не можа, каб не знайшлося тое згубленае — «вельмі важнае, патрэбнае». Нейк сама сабою ўявілася раптам лесніччоўка — тая старая, яшчэ даваенная, у якой я начаваў, будучы ў камандзіроўцы на Палессі. Уявілася, паўстала тая лесніччоўка ў маіх вачах, згадаліся гаспадар — рухавы, лёгкі, як вецер, дзядзька Пятро Кабылкін і гаспадыня, сарамяжлівая, дабрадушная цётка Параска... І пацягнула мяне, нібыта магнітам, на Палессе. «Там, там я ўсё, што трэба, успомню. Супакоюся і ўспомню...» Ледзь цяпла, лета дачакаўся. А тады — заяву на адпачынак нашрайбаваў, грошы атрымаў — і ў дарогу. Сутак не прайшло — і я на Палессі, там, дзе хацеў, мроіў быць. Ціхата тут, аж у вушах глухне. Дрэвы, птушкі і я. Ды яшчэ вецер, што падзьме, прашапаціць зрэдку па вяршалінах, разгайдае іх. Гаспадары — ляснік Пятро Кабылкін і жонка яго цётка Параска — пусцілі ў сваю хату ахвотна. Людзі яны ненадакучлівыя, занятыя кожны сваім. Пятро Ігнатавіч дома амаль не стыкаецца, дзень пры

дні гойсае па абходзе, пільнуе лес. Цётка ж Параска то есці ў печы варыць, то ў хаце прыбірае, парсюка корміць, а то карове, якая папасваецца тут жа, у лесе, на паляне, вядро вады занясе. Ім, гаспадарам, не да мяне. Я адзін. Дзень і ноч адзін. Адзін са сваімі думкамі. Сілюся, хачу сабраць іх, звязаць у адно, а яны распаўзаюцца, тая сюды, тая туды, быццам уюны. То адно ўспомніцца, то другое. Апраўдаю сябе ці ўпікну, плюну са злосцю: «І гэта я, я...» Можа, каб хоць трохі накірунак думкам і ўспамінам даць, я і ўзяўся ў сшытак сёе-тое запісваць. Так сказаць, завязваць свайго роду вузельчыкі... Вузельчыкі сабе на памяць.

## Хто я?..

Пра гэта не толькі людзі ў мяне неаднойчы пыталі, але і я сам у сябе. Бо і праўда ж: «Хто я?..» Нарадзіўся я зусім блізка адсюль, у Макранах. Але што беларус — не ўпэўнены. Хутчэй цыган. І не толькі знешне я падобны да цыгана, але нешта цыганскае ёсць у мяне і ў характары. Не магу, як некаторыя, доўга працаваць на адным месцы. Не магу доўга жыць у адной хаце. Не магу доўга сябраваць з адным і тым жа чалавекам. Не магу доўга кахаць адну і тую ж, няхай нават і прыгожую, мілую дзяўчыну... Наогул, нічога доўга не магу. Надакучае! Цягне мяне ўвесь час да новага, яшчэ не бачанага, не спазнанага. «А там, там што?..» І я імкнуся, імкнуся... І... расчароўваюся, зноў і зноў пачынаю шукаць. Чаго — я і сам іншы раз не ведаю. Па натуры сваёй я вандроўнік, валацуга. Здаецца мне: апошняе ў мяне якраз ці не таму, што ў жылах маіх б'ецца бацькава цыганская кроў. А маці мая... Маці беларуска. Жыла спрадвеку ў вёсцы, у Макранах. Там, у Макранах, яна нарадзілася, там і памерла, там і пахавана на вясковых могілках. Помню, памерла маці ўвосень. У глыбокую, халодную восень. Ужо снег пачынаў нават падаць. А я босы выправіўся на могілкі праводзіць яе — не было чаго на ногі абуць. Яшчэ як па дарозе, па храпе, ішоў, нічога, можна было цярпець. А спыніліся ў сасняку — зусім ногі зайшліся, хоць скачы. І жаданне ў мяне тады было, помню, адно — хутчэй бы дамавіну ў магілу апускалі, хутчэй бы жвір рыдлёўкамі сыпалі... Каб не стаяць на могілках, не мерзнуць. Пабегчы б, сагрэцца. А тут, як на тое, цёмная, нізкая хмара насунулася, дождж са снегам секануў. Да касцей холад прабіраў, калаціўся я, бы асінавы ліст. І не

плакаў — не да жалобы, не да слёз мне было, толькі ўздрыгваў, тросся, як у ліхаманцы...

З тае восені і не быў я на могілках. Жыццё гоніць і гоніць мяне, проста як не ў спіну штурхае: «Давай, давай! Няма чаго назад азірацца — наперад, толькі наперад!» Але хто маці мая, дзе яна пахавана — я ўсё ж ведаю. А вось бацька... Пра бацьку, можна сказаць, нічога, амаль нічога не ведаю. Хто ён, дзе магіла яго? А можа, ён жыве яшчэ?.. Бацька пакінуў нас з маці перад самай вайною. Мне тады і года не было. Можа б, і вярнуўся да нас, каб не вайна. Закруцілася, завярцелася тады ўсё — дзе там было бацьку пра нас з маці думаць ці нам — пра бацьку! Ледзьве жывыя мы з маці асталіся. Ну, а пасля вайны... Маці памерла, а я... Я пакінуў вёску, не жыў там, дзе нарадзіўся. Так што, калі і прыязджаў бацька ў Макраны, знайсці мяне там не мог. А ў мяне... Праблема вечная, як анкеты розныя запаўняю — што пра бацьку свайго напісаць? Бязбацькавіч я ці ўсё ж маю бацьку? Зноў жа — селянін я ці гараджанін? Нарадзіўся я ў вёсцы... А жыў... Дзе толькі не жыў я!.. І ў лесе, і ў вёсцы, і ў мястэчку ў дзіцячым доме, і ў горадзе вось каторы ўжо год жыву... І не толькі на гэтыя пытанні я не ведаю, што адказаць, а амаль на кожнае, пра што б у мяне ні спыталі. Хто ў гэтым вінаваты? Маці? Бацька? Я? А можа... Вінавата ў сім-тым і вайна?

## Вайна

Што я помню пра вайну?.. Ну, як стралялі ўдзень і ўночы ў вёсцы і за вёскаю ў лесе. Партызанаў помню, немцаў. Партызаны з лесу найчасцей па начах у вёску наведваліся, ад іх пахла дымам. «Мамаша, может, покушать есть?» — прасілі лагодна яны. Немцы наязджалі ўдзень, на матацыклах ці на машынах. Бегалі па хатах — гергеталі, патрабавалі: «Матка, яйкі, масла, шпек!..» Помню добра паліцая Баўдзея, доўгага, што жэрдка. Яго забілі партызаны ўзімку ў алешніку, тым, што адразу за сажалкай. А калі снег растаў, знайшлі яго мёртвага. І везлі па вуліцы на санях, посцілкай клятчастай акрыўшы, а я стаяў ля свайго двара і глядзеў. Ручаі ўжо тады дзе-нідзе цурчалі, сонца прыгравала, і сані палоззямі аж зямлю чырылі, пакідаючы за сабою палосы-яміны, у якія надта ж імкліва збягала, аж пенілася, вада... І з саней тых ногі Баўдзеевы праўцом тырчалі, валасатыя і сінія-сінія, з вялікімі жоўтымі пазногцямі... Помню карнікаў — у адзежы

чорнай, з чарапамі на рукавах — перад тым як спапяліць Макраны, яны начавалі ў нашай хаце,— лысы адзін такі, галава круглая, што гарбуз, і голая-голая, ні валасінкі. Другі — доўгі, худы, перахлябісты. Ногі ды рукі, а больш, здаецца, нічога ў яго не было — ні жывата, ні галавы. Курыцу аднекуль прынеслі, загадалі, каб маці яе ў печы асмаліла. А маці — ці то ад страху, ці то так ад чаго — не ўтрымала курыцы на вілах, тая ўпала ў агонь. І немцы загергеталі, замітусіліся — усё адно што шэршні. Але маці, на шчасце, падхапіла віламі курыцу, выграбла яе з печы... А потым, раніцою, чуць свет, карнікі тыя выганялі нас з хаты: «Шнэль! Шнэль!» Помню, як ішлі мы па пыльнай дарозе ў спякоту — аж губы смяглі, у галаве мутнела ад гарачыні — доўга-доўга на станцыю. І па баках нас, ззаду, спераду чорнай сцяною сунуліся тыя ж немцы-карнікі — у руках у іх былі аўтаматы, а ў некаторых — і сабакі-ваўкадавы на шворках... На станцыі, у хвойніку, мы начавалі. І там пачулі ад паліцаяў — вёску нашу спалілі. Нас жа, людзей, гоняць у Нямеччыну. І ўсе, дарослыя і дзеці, надта ж плакалі, галасілі, бо і хат сваіх шкада было, і дабра, дый на чужыну ехаць, вядома ж, нікому не хацелася. Маці мая, як змерклася, укінула мяне ў мяшок, усё адно што парася, і загадала, каб я маўчаў, не плакаў і не крычаў, нават калі і балець мне будзе, і папаўзла, пацягнула мяшок той са мною па лесе, мінаючы паліцэйскую варту,— так уцяклі мы ад Нямеччыны... І з тае ночы мы з маці жылі ў лесе — хаваліся за вываратнямі пнёў, у лаўжах, а найчасцей сядзелі ў лазняках, у балоце. І запомніліся найбольш, нават па начах часта сняцца цяпер, дні і ночы тыя, калі дождж ліў і ўсюды мокра вельмі было. Мо таму, што ў такія дні ў маці балелі ногі, і яна нікуды не хадзіла, кроку не магла ступіць, ляжала і толькі стагнала, плакала... Помню пограб той, у якім мы з маці зімавалі адразу ж пасля таго, як немцаў з вёскі прагналі, вызваленне прыйшло. Назбіралі на спаленых селішчах цэглы, зляпілі грубку і палілі тую грубку ўдзень і ўночы, бо холадна ж было і сыра. У грубцы той і есці сабе варылі — бульбу, крупеню нішчымную, капусту... Вясною, як снег растаў, назносілі на сваё селішча абгарэлых дзвярэй, дошак, жэрдак, змайстравалі з іх нешта накшталт будана, нават акенца вымуравалі невялічкае, аблажылі будан дзёрнам... І заходзіць лягчэй, чым у пограб лазіць, і святлей, сушэй. Бо маці ў пограбе сырым зусім абнемаглася, ногі ў яе паапухалі, парабіліся тоўстыя, як калоды. Людзі тады

пачалі з Нямеччыны адзін за адным, а то і сем'ямі прыязджаць. Заходзілі да нас у зямлянку, глядзелі са шкадаваннем на маці. «У бальніцу табе б трэба, Ганна»,— раілі. Не ведалі людзі яшчэ, што да бліжэйшай бальніцы кіламетраў пяцьдзесят. Вёскі ж навокал былі ўсе папалены, пазнішчаны карнікамі. Сама маці не дайшла б да бальніцы, а завезці... На чым яе было везці?.. Ні машыны нідзе, ні каня, ні вала. Лета маці сяк-так прамучылася, а як заасянела, захаладала — зусім падымацца з пасцелі не змагла. «Сыночак, ты не глядзі мяне, глядзі сябе. Бо я ўсе адно не жыцьму, памру»,— казала яна, калі я лепшае што з яды знаходзіў і ёй даваў. Людзі ўсё ж пастараліся, доктара ў вёску прывезлі. Той агледзеў маці, галавою паківаў. «Раней трэба было мяне прывезці. А так...» І хоць доктар парашкоў, таблетак цэлую жменю пакінуў, але лекі тыя не ўратавалі маці — неяк на досвітку паклікала яна мяне да сябе, рот разявіла, мусіць, сказаць нешта хацела, і не сказала ні слова, галаву набок раптоўна пахіліла і заціхла. Я думаў — заснула. Аж не — памерла...

## Жыць, як далей жыць — аднаму?..

Пакуль жывая была маці, я мала пра што думаў. Куды іголка, туды і нітка — куды маці, туды і я. Удваіх яно і смялей, і ахватней, і весялей. Дый маці дарослы чалавек, яна шмат чаго ведала, шмат магла падказаць, шмат чаму навучыць. А аднаму? Як жыць, што рабіць аднаму?

З могілак тады, маці сваю пахаваўшы, прыбег я ў зямлянку і нідзе месца не мог знайсці, супакоіцца ніяк не мог. Шкада мне было і маці, якая асталася начаваць у сырой, халоднай зямлі, шкада было і самога сябе. Я плакаў, ляжаў, сцяўшыся ў камочак на пасцелі, і хадзіў, бегаў па зямлянцы. А тут яшчэ дождж ліў і ліў не перасціхаючы, я ж узяў сабе чамусь у галаву, што вада зацячэ ў магілу, намочыць маці, і як яна там, бедная, ляжаць будзе ў вадзе?..

Змерклася, спаць бы. Дык не, не магу заснуць. То горача мне зробіцца, то холадна. Чую — маці стогне. Здаецца, ляжыць на пасцелі, варушыцца, просіць вады падаць. Падыду да пасцелі — нікога там няма. Зальюся слязьмі, адыдуся — зноў стогн чую. Ледзь раніцы дачакаўся. А тады, ведаючы, дзе мамка мая, галёшы старыя матчыны на ногі абуў і падаўся я дажджом — ён так і не перасціх, ліў і ліў — па гразі, па лужах на могілкі. І там, у змрочным

старым сасняку, прыпаў да свежай матчынай магілы, крыж дубовы рукамі абхапіў, быццам маці сваю абняў, слязьмі заліўся:

— Мамачка мая родная, а нашто ж ты памерла, на каго мяне пакінула-а?

Колькі я так плакаў, слёзы горкія ліў? Мусіць, доўга, бо аж галава разбалелася, уваччу цёмна стала. Апомніўся я неспадзявана, бо пачуў, як хтосьці ўзяў мяне рукою за плячо. Зірк — дзед Антонь, на кульбу абапёршыся, нада мною стаіць. Глядзіць на мяне вачамі маркотнымі, губамі сінімі чуць-чуць варушыць, кажа:

— Унучак, не трэба так, ты ж мужчына. Маці ўсё адно не вернеш. Не, не вернеш...

Выцер я рукавом вочы, носам зашморгаў.

— Ведаю, ведаю я, што такое маці. Сам у твае гады сваю пахаваў. Ды неяк жа, бачыш, выкідаўся, да старасці во дажыў. І ты таксама не загінеш, будзеш жыць. Толькі... Навучыся цярпець, не давай гору верх над сабою браць...

І яшчэ, яшчэ гаварыў засмяглым, сумным голасам дзед Антонь, суцяшаў мяне, абнадзейваў:

— Неяк усё ўладзіцца, перабудзецца. Добрыя людзі не дадуць прапасці... Не, не дадуць!..

З могілак я вярнуўся тады ў Макраны з дзедам Антонем. Ішлі, паапускаўшы галовы,— ён, стары, і я, малы. Дождж усё не аціхаў, ліў і ліў, дарога раскісла, расчвякла; тут і там расцякліся, маршчыніліся ад ветру лужы. Пакуль дабрылі да вёскі — вымаклі і я, і дзед да апошняга рубчыка. І пазамярзалі, пакалелі — не давядзі бог. У мяне дык зуб не трапляў на зуб, аж трэсла ўсяго, як у ліхаманцы. Дзед жа храбрыўся.

— Хе,— крактаў ён, мацаючы кульбай дарогу,— людзі жывуць, і мы жыць будзем. А гора... Дык яно, унучак, не ў аднаго цябе. Такая вайна... Абязвечана, спалена, знішчана... Але мы з табою жывыя во, значыцца, мы яшчэ... Мы яшчэ...

І не мог слова падабраць, што «мы яшчэ...».

У вёсцы, каля зямлянкі сваёй,— яна была зводдалеку ад дарогі, у садзе,— дзед Антонь павярнуўся тварам да мяне, сказаў:

— А мо ў курэнь мой зойдзем, пагрэемся, бульбы наварым, га?

Мне тады было ўсё адно куды ісці, абы толькі ісці, не стаяць на дажджы і холадзе...

## У дзеда Антоня

Зайшоўшы ў зямлянку да дзеда Антоня, здавалася, толькі на адну хвіліну, я так і астаўся там, у дзедавай зямлянцы, жыць. Бо, ледзь пераступіў парог, мне зрабілася блага, і я паваліўся на падлогу.

Цэлы тыдзень дзед паіў мяне рознымі ўзварамі, накрываў сваім кажухом, каб я «прапацеў трынаццаццю патамі». І я... Хоць і паволі, але папраўляўся. Аднойчы, лежачы ў дзедавай зямлянцы, успомніў дождж, могілкі, матчыну магілу і падумаў быў: «Чакай, чакай, а чаго ж гэта дзед Антонь на могілкі тады прыходзіў? Што яму трэба было там?» І, як толькі дзед прысеў на той палок, на якім я ляжаў, накрыты кажухом, я спытаўся:

— Дзед, а вы чаго на могілкі прыходзілі?

— Хэ, унучак,— кракнануў дзед. І задумаўся. Потым, праз якую хвіліну, загаварыў, загаварыў паволі, неяк быццам нават трохі таямніча: — Я казаў ужо табе, што сам я ў твае гады маці сваю пахаваў. І не толькі маці, а і брата, сястру... Тыф пракляты, усю сям'ю нашу выкаціў... Адзін я астаўся. Успомнілася тое... Ну і... Пра цябе падумаў... І падаўся на могілкі — ведаў, дзе цябе шукаць трэба,— ты будзеш там, дзе матчына магіла...

— Адкуль вы гэта маглі ведаць? — здзівіўся я.— Бачылі, як ішоў на могілкі?

— Бачыць-то я не бачыў, а ведаць... Ведаць — ведаў. Я ж кажу, хапянуў я некалі гора. Ох хапянуў! І ў пастушках пахадзіць давялося, і ў парабках... Успамінаць — і то не хочацца таго, пражытага. Таму я і кажу табе: «Давай, унучак, хіба і жыві ў мяне. Я стары, ты малады. Весялей удвух. Бо сам падумай — што ты адзін у зямлянцы той сваёй рабіць будзеш, як зіму зімавацьмеш? А так — усё ж удвух. Адзін занядужае — другі на нагах... Пасабляцьмем адзін аднаму...

Спадабалася мне тое, што гаварыў дзед, хоць і быў я не падрыхтаваны да таго.

— А з зямлянкаю, селішчам як жа будзе, калі буду я ў вас жыць? — спытаўся я з трывогаю ў дзеда.

— Якою зямлянкаю, якім селішчам?

— Ды нашым... маім,— не мог прывыкнуць, як і называць тое селішча, я.

— Го-о,— засмяяўся дзед, аж барада яго, доўгая, сівая, касмылямі, бо не расчэсвалася даўно, затраслася,— знайшоў пра што клапаціцца! Селішча хай другі хто займае,

хай там селіцца. А зямлянку... Калі яна нікому не трэба, на дровы разбяром. Во, зімою ў грубцы спалім, бо хто ж нам дроў прывязе, га?..

— А-а... — расчаравана выдыхнуў я.— А мне... Дзе я падзенуся, калі ад вас пайду?

— А навошта табе ад мяне куды хадзіць? Тут жыві. І зямлянка мая, і селішча, і сад твае. Бо я... Доўга не пражыву, унучак. Сваіх дачакаўся — і хвала Богу. Дый... Ці трэба табе ўсё тое? Ты ж не аседзішся на адным месцы, будзеш шукаць долі. І не ў Макранах, не. Паедзеш ты адсюль. Бо тут, на папялішчах, голадна, няўтульна і адзінока... Думай, як сёння пражыць. А заўтра... Відаць будзе, што рабіць... Дасць Бог дзень, дасць і клопат...

Дзед — ведама, стары чалавек! — глядзеў як у ваду. Бо і праўда ж — не набыўся доўга я ў сваёй вёсцы, у Макранах. Восень, зіму сяк-так перакідаліся з дзедам. А вясною... Зусім загаладалі.

— Хіба пайду я ў пастушкі,— сказаў я аднаго дня дзеду, калі зазелянела ўсё навокал, цёпла стала.— І вам лягчэй пракарміцца будзе, і я дармаедам на вашай шыі не сядзецьму.

Дзед доўга вохкаў, крактаў. І адпускаць мяне яму не хацелася, і трымаць ля сябе не было як... І ўсё ж, так і гэтак памеркаваўшы, дзед выправіў мяне ў дарогу. Нават праснак з апошняй мукі спёк, у торбачку палажыў.

— Толькі, унучак, можа, на цягнік сядзь ды ад'едзься адсюль трохі. Бо блізка ў вёсках, хоць людзі і ёсцека, але кароў у іх няма. Што не спалілі, то паелі хрыцы. Калі ж табе не пашанцуе, не наймешся нідзе ці гаспадар нядобры трапіць, назад у Макраны вяртайся. Можа, якнебудзь выжывем, не памром. Шчаўе нарасце, а там — ягады, грыбы...

Дзед прытуліўся сваёю жорсткаю, што памяло, барадою да маёй шчакі, заплакаў...

Не толькі дзеду мяне, але і мне дзеда таксама было шкада. Добры ён чалавек быў, чулы да людское бяды. Ды яму, як і многім у тыя гады, не пашанцавала. Ад Нямеччыны ён, гэтак жа як і мы с маці, ўратаваўся — пайшоў быў чагось у мястэчка і там заначаваў. А вярнуўся назаўтра пад вечар у Макраны — папялішчы на месцы хат. Пабедаваў дзед ды ў лес, у партызаны. Там хамуты, вупраж правіў, а як вызваленне прыйшло — на селішча сваё вярнуўся, зямлянку ў садзе, які не ўвесь згарэў, зрабіў. Не такую, як мы з маці, а амаль што хату — на два акны, са

столлю роўнаю і падлогай. У дзеда Антоня не было нікога з родных — жонку яго, Тэклю, спалілі немцы разам з іншымі старымі і калекамі, тымі, каго не хацелі ў Нямеччыну вывозіць. Дачкі ж дзве незамужнія, як дзед ні чакаў іх, так і не вярталіся з чужыны на сваё селішча...

## Адзін, зноў я адзін...

З Макранаў, роднай вёскі сваёй, пайшоў я ў суседнія Альшаны. З Альшанаў — у Слабаду. Са Слабады — у Рудню. З Рудні — у Забалоцце. Вёскі былі незнаёмыя, але яны мала чым розніліся, хіба толькі назвамі. А так ва ўсім астатнім былі падобныя — зямлянкі паабапал затравелых вуліц, сухія, абгарэлыя ствалы яблынь, ігруш, абваленыя каміны печаў, пазарастаныя палыном і бур'янам папялішчы на месцы колішніх хат. Людзі, нібы тыя мурашкі, капашыліся тут і там — перакопвалі рыдлёўкамі агароды, часалі бярвенне, снавалі зрубы. Пытаць у каго б там ні было, ці трэба пастушок, проста не паварочваўся язык, бо ніякай жыўнасці — ні кароў, ні свіней, ні нават курэй, нідзе паблізу не было відаць. Так, мінаючы вёску за вёскаю, дабраўся я да чыгункі. Пачакаў цягніка, які вёз кудысь гружаныя бярвеннем вагоны і які даволі доўга стаяў на станцыі, улучыў момант, калі нікога не было ля пуцей, залез на самы верх бярвенняў і лёг, стаіўся. Цягнік неўзабаве рушыў, і я паехаў насустрач пранізліваму ветру, які аж стругаў усяго мяне. Паехаў насустрач ветру і невядомасці. (Ух, аж цяпер холадна, калоціць усяго, як згадаў тое!) А тут яшчэ навальніца надышла, сцябала цэлую гадзіну бізунамі ліўню. І маланкі раз-пораз вочы сляпілі, ляскаў, аж сэрца сціскалася ад жаху, гром. Вымак я і замёрз-замёрз. Да таго ж хацелася вельмі есці,— жывот да спіны падцягвала! — дзедаў праснак, ашчыпваючы па крошцы, я зжаваў яшчэ ў Слабадзе. І таму, як толькі на нейкай невядомай станцыі цягнік спыніўся, я ссунуўся з бярвення, пайшоў шукаць, дзе б пагрэцца, абсушыцца. Трапіў я ў пачакальню вакзала. Пачакальня была невялікая, застаўленая драўлянымі канапамі. Ці то таму, што было яшчэ даволі рана, толькі-толькі пачынала світаць, ці то так чаго, але ў пачакальні не было людзей. Толькі спала, падклаўшы пад галаву абшарпаны гармонік, нейкая пажылая кабета. Спала на канапе, выцягнуўшы на ўсю даўжыню свае абутыя ў буркі ногі. Я пахадзіў па пачакальні, потым сеў у куточак на канапу. Мае крокі, мабыць, пачула

жанчына, бо раптам спыталася: «Гэта ты, Віця?» Я, памаўчаўшы, адказаў, што я не Віця, а Міша. «Міша? — здзівілася жанчына.— Хто ты такі, што яшчэ за Міша?» Давялося расказаць жанчыне, хто я, як і адкуль сюды трапіў. Жанчына ўзрадавалася. «А мяне Поляю зваць. Цётка Поля,— і жанчына паднялася з канапы, села, апусціўшы долу ногі.— Дык ты, кажаш, сірата. І, вядома ж, прагаладаўся, есці хочаш»,— не то сказала, не то спытала цётка. «Хачу»,— шчыра прызнаўся я. «То я цябе накармлю»,— і жанчына неяк няўпэўнена, вобмацкам дастала з-за гармоніка палатняную торбачку. «Вазьмі, пашукай, што тут ёсцека»,— сказала яна да мяне і адсунула ад сябе торбу. Толькі цяпер я здагадаўся, што за жанчына перада мною,— яна сляпая, ані нічога не бачыць; торба ж, якую дастала з-за гармоніка і падала мне,— жабрачая. Але, як кажуць, голад не цётка. І я, счакаўшы хвіліну, падышоў бліжэй да цёткі, зазірнуў у торбу. У торбе былі кавалкі хлеба, вараная бульба і нават цененькія скрылікі сала. «Выбірай, што там лепшае, еш,— лагодна гаварыла між тым да мяне жанчына.— Я не скнара, сама па людзях кармлюся і з людзьмі ахвотна дзялюся тым, што маю».

Я выбраў у торбе акраец хлеба, скрылік сала, пачаў есці. Аж цяпло разлілося па ўсім маім целе, калі я пракаўтнуў жываны хлеб з салам. «Якая смаката! І ядуць жа людзі галоднаю вясноваю парою такое!» — падумаў. Я ж сала дый сапраўднага, заквашанага ў дзяжы і спечанага ў печы хлеба нават ужо і не помніў, калі еў. То з маці перабіваліся на выпадковай ядзе, то з дзедам Антонем зіму сядзелі на бульбе. Бульба ўранні, бульба ў абед, бульба ўвечары. То вараная, то печаная, то ўпрэлая. А потым і бульбы не стала...

«Цётка Поля, а тут, у вёсках, людзі добра жывуць?» — спытаў я, калі трохі пад'еў, прагнаў голад. «Розныя людзі, па-рознаму яны і жывуць. Адны добра, другія не вельмі. Як і ўсюды. А чаму ты пра гэта пытаеш?» — «Ды я хацеў бы за пастушка наняцца. Там, ля дамоўкі маёй, вёскі спалены ў вайну. Ні кароў, ні свіней ні ў кога няма. А тут як?» — «Тут таксама ёсцека спаленыя вёскі. А хоць вёскі і не спаленыя, то каровы не ў кожнай сям'і. Паліцаі, немцы пажэрлі. Ды пастушкі, вядома, людзям трэба. Толькі які з цябе пастушок? Ты ж і ростам, мабыць, не вельмі каб, і худы. А цяперашнім светам... Хто даверыць табе сваю карову? Навотнаму, чужому... А што, калі ты пагоніш карову не на пашу, а так куды ды збаёдаеш? А карова

ў вясковых людзей — вунь якое багацце. Ды яшчэ цяперашнім галодным часам...»

Я не думаў, што мне хтосьці можа не паверыць, пабаіцца даручыць пасвіць сваю карову. «Што вы гаворыце, цётка? Мяне абы кармілі... Дый куды я магу пагнаць тую карову, дзе магу яе збаёдаць?» — «Можа, ты нікуды яе і не пагоніш, не збаёдаеш. Але ж чалавек так падумаць можа, як я кажу. Карова цяпер грошы вялікія каштуе, многія хацелі б мець сваю кароўку. Чула я — крадуць кароў. І з хлявоў выводзяць па начах, і з пашы таксама забіраюць. А ты ж дзіця. Прыйдуць мужчыны, скажуць: «Давай карову!» І што ты зробіш, абаронішся хіба? Дый навошта табе такая марока? Лепш са мною давай пойдзем. Я сляпая. То ты мяне вадзіцьмеш. Карміцьму я цябе, глядзецьму, як сына роднага. Чаравічкі табе куплю, штонікі, пінжачок... Трохі, праўда, сарамнавата па хатах людскіх жабракоў вадзіць, але ты на гэта не зважай. Я прывыкла — і сораму ніякага не ведаю. Бо ні ты, ні я не вінаватыя, што жыццё з намі так абышлося. Ты вось без бацькі, без маці астаўся. А я... Без вачэй. Жыць жа нам з чагось трэба? Я рада была б рабіць што-небудзь, зарабляць сабе на хлеб, як і ўсе людзі зарабляюць. А не магу, бо не бачу. І ты сілы ніякай яшчэ не маеш, каб жыць з працы рук сваіх. Доля спрагае нас разам с табою, і ты, Мішка, згаджайся, павер — ты са мною не прападзеш. Я за мамку табе буду. Калі, вядома, і ты да мяне добрым будзеш. А то ёсцека ў мяне хлопчык, ва ўдавы адной узяла, Віцька. Дзень-два паходзіць са мною — і ўцякае да маці. Тая адлупцуе яго, ён схаваецца. Прыйду я да ўдавы, зноў выправіць хлопца са мною. Дзень-два міне — хлопца няма. Абрыдла мне гэта, памяняла б павадыра. Сорамна, бачыце, яму жабрачку вадзіць. Ведаю — не вельмі добрая гэта работа, і мне самой іншы раз брыдка ў хату людскую заходзіць, прасіць чаго-небудзь. Але што мне рабіць, жыць з чаго? Не прападаць жа з голаду?»

Што такое сорам — я мала тады думаў. Было б што есці, не галадаць бы... І не быць бы аднаму, жыць пры старэйшым. І клопату менш, і смялей, і весялей — «куды іголка, туды і нітка»...

## З цёткаю Поляю

Акрамя таго, што цётка Поля была сляпая, дык яшчэ і са сваімі гуморамі. Так, да прыкладу, яна не любіла

хадзіць з хаты ў хату па вёсках, бо, як прызнавалася, у вёсках давалі толькі хлеб, бульбу ды зрэдку скрылік сала.

— А мне грошы трэба... — казала яна.— Хатку сабе хачу агараць, каб пад старасць па чужых кутках не туляцца...

Таму цётка Поля трымалася бліжэй да вялікіх гарадоў. У святочныя і нядзельныя дні выбірала люднае месца, часцей за ўсё на базары, рассцілала хустку, сядала і спявала надрыўным голасам, падыгрываючы сама сабе на гармоніку, чуллівыя, як правіла, з трагічным канцом песні. Вядома, людзі, праходзячы міма, кідалі ў бляшаную конаўку няшчаснай манеты. У буднія ж дні мы з цёткаю Поляю дабіраліся да чыгуначнага вакзала, куплялі білет на пасажырскі поезд да бліжэйшай станцыі (без білета нельга было тады пранікнуць нават на перон), залазілі ў тамбур і, як толькі цягнік кранаўся, шнуравалі з вагона ў вагон: паперадзе з конаўкай у руках звычайна ішоў я, ззаду, за мною, спяваючы і падыгрываючы сама сабе на гармоніку, тупала цётка Поля.

Позабыт, позаброшен
С молодых юных лет,—

пачынала цётка Поля.

И остался сиротою,
Счастья-доли мне нет,—

падхопліваў, цягнуў я сваім плаксівым, дзіцячым галаском. Людзей песня кранала, многія падымаліся са сваіх месцаў, кідалі ў конаўку хто дзве, хто тры, а хто і дзесяць, дваццаць капеек.

Не абыходзілася і без прыкрасцей. Іншы раз нас затрымлівала міліцыя, ссаджвала з цягніка, вяла ў аддзяленне, запісвала, хто мы, адкуль і чаго раптам жабруем. Але тады, у пасляваенныя гады, такіх, як мы, было многа, займацца намі асабліва нікому не хацелася. І нас выпускалі.

Сабраныя грошы цётка Поля не траціла, берагла кожную капейку.

— Хатку мне трэба агараць,— паўтарала яна як не штодзень.— Не вечна ж пабірацца. Жыць жа па-людску хочацца, хоць і сляпая я...

— А чаму вы, цётка, сляпая? — спытаў я аднойчы ў цёткі Полі.

— Гэ, хлопчык,— адказала неахвотна, з сумам цётка

Поля.— У вайну гэта... Ты без маці, бацькі астаўся. А я... Без мужа свайго.. Без дзетак... І без вачэй...

І цётка расказала, як яна разам з іншымі людзьмі іхняе невялікае прылеснае вёсачкі хавалася ў лазняках і яе злавілі карнікі.

— І каб жа адну мяне. А то ж і мужа майго Лявона, і дзетак — Васілька і Клаву — палавілі. Немцам трэба было ехаць па дарозе, а дарога была замініравана. І каб не падарвацца самім на мінах, яны загадалі наперадзе іх ісці нашай сям'і. І не проста так ісці, а цягнуць за сабою бароны... Бароны з мяшкамі камення. Што было рабіць? Адмовіцца — пастраляюць... А так надзея нейкая заставалася. А раптам няма на дарозе мін, раптам паможа Бог, не падарвёмся... Барон дзве было. У адну ўпрогся Лявон з Клаваю, у другую я з Васільком. І пайшлі мы па дарозе, пацягнулі бароны. Лявон з Клаваю трохі наперадзе, я з Васільком ззаду ад іх. Ведаеш, як у сне тое было, ідзеш — і нагу ставіць баішся, думаеш — вось, вось дзе яна, тая міна...

Міна была ля самай грэблі, там, дзе ніхто ўжо і не спадзяваўся, што яна можа быць. І зачапіла яе Лявонава барана — цёткі Полі мужа! Міна была, як пасля казалі, вялікая, супрацьтанкавая... Што асталося ад мужа, дачкі і сына — яна, цётка Поля, не бачыла...

...Падабралі цётку Полю партызаны. Занеслі на насілках у лагер, выхадзілі, выгаілі. Але зрок вярнуць так і не ўдалося...

— З тых дзён я і пакутую... Адна... Без мужа... Без дзяцей... І без вачэй... — расказвала, скрухліва ківаючы галавою, цётка Поля.— Каб хоць хата была цэлая... А то ж і яе спапялілі прыблуды, каб ім, дай Бог, нікому дабра і на тым свеце не было. І хату не адну нашу спапялілі, а і вёску ўсю... Пасля, як вызваленне прыйшло, людзі з лесу павярталіся. Хто ўзяўся селішча сваё да ладу даводзіць, а хто ў горад падаўся. Ну, а мне што было рабіць? Жыць жа з нечага трэба... От я на гармоніку граць навучылася ды і валачуся па свеце... Сёння тут, заўтра... І сама не ведаю, дзе буду, куды падамся заўтра. Як птушка тая без кубла свайго...

## Іван Іванавіч

З цёткаю Поляю я прахадзіў з базару на бараз, з вагона ў вагон усё лета. Галадаць не даводзілася — яды хапала. А вось што да адзежы, то цётка нічога мне так і не купі-

ла — ні чаравічак, ні штонікаў, ні пінжачка. У цёткі тут быў, як потым я даведаўся, свой разлік.

— Калі цябе апрануць добра, абуць на ногі чаравікі, то... Які ж ты жабрак? Выходзіць, не так бедна нам жывецца, калі мы апранаемся не горш ад людзей... — гаварыла цётка Поля, калі я напамінаў ёй пра абяцанае.

І не купляла мне нічога.

— Дык я ж, цётка, абнасіўся зусім,— казаў я іншы раз цётцы.— Шкада, што вы не бачыце. Ашмоцце на мне адно, сорамна на вочы людзям паказвацца...

— То гэта ж... Ты шкадобу ў людзей выклікаеш. Яны шчадрэйшыя робяцца, лепш нам даюць...

Але мне ад людской шчадроты ані не перападала. Усе грошы, да капеечкі, забірала цётка Поля. Мяняла іх у магазінах на большыя, завязвала ў хустачку і хавала за пазуху. І гэтая, як спачатку здавалася мне, ашчаднасць была не чым іншым, а, як потым я здагадаўся, звычайнай прагавітасцю, скваппасцю, бо ўзяць у цёткі Полі грошай, нават выпіць шклянку морсу было нельга.

— І звычайнай вады папіць можна,— казала яна, калі мы праходзілі міма ларка, дзе прадавалі розныя прысмакі, і я прасіў купіць мне шклянку морсу.— Не салодкая, праўда, але ж і грошай плаціць не трэба, дармовая вада...

Ніколі цётка не вадзіла мяне і ў сталоўку, каб палюдску паесці. Еш тое, што даюць людзі. А людзі не ўсе давалі добрае, было, што давалі і нясвежае, пракіслае. І тады ў мяне балеў вельмі ж жывот, а то і брала на ваніты...

За лета я падрос, штонікі, якія пашыла мне з нямецкай плашч-палаткі яшчэ мая маці, даставалі толькі каленяў. І, вядома ж, я паразумнеў, пачынаў цяпер здагадвацца, чаму ад цёткі Полі ўцякаў мой папярэднік-правадыр Віця. Не любіла цётка Поля нікога, асабліва тых, каго абышла бокам вайна, хто быў дужы, мог усё рабіць і бачыць.

— Гэта мяне адну не пашкадаваў Бог, усё ад мяне забраў. Хату, сям'ю, вочы... А другіх... Другія жывуць у дастатку, у іх усё ёсцека! Для іх і вайна не вайна...— казала яна з нейкай як бы злосцю,— асабліва калі трапляла ў забягалаўку, напівалася так, што хоць ты яе пасярод вуліцы кідай. Тады яна лаяла ўсіх і за ўсё, за што толькі можна лаяць. І была непаслухмяная, брыдкая — мацюкалася, зусім як мужчына, не ішла туды, куды я яе вёў, плакала, успамінала свайго мужа Лявона, дзетак — Клаву і Васілька...

Неяк, калі мы пасля чарговай цётчынай п'янкі ішлі, брудныя, недаспаныя, па вёсцы (звалася тая вёска Бароньκі), нас запыніў вельмі інтэлігентны, апрануты ў цёмнасіні фабрычны касцюм дзядзька.

— Шаноўная... Не ведаю, як вас і назваць,— звярнуўся ён да цёткі Полі,— скажыце, гэта ваш сын з вамі ходзіць? — і ўважліва паглядзеў сваімі добрымі карымі вачыма на мяне.

— А што? — насцярожылася цётка Поля.

— А тое, што дзіцяці догляд трэба... Нават калі яно і чужое, няроднае вам. Ссох хлопец зусім, што таран, і амаль голы...

— То вы б памаглі і накарміць яго, і адзець,— сказала, як звычайна ў такіх выпадках казала, цётка Поля.

— Каб жа я ведаў, што тое, што я дам, пападзе хлопцу... Але я не ўпэўнены ў гэтым.

І чалавек, падышоўшы да мяне бліжэй, падміргнуў, сказаў:

— Верасень хутка, заняткі ў школе пачынаюцца. Ты хочаш вучыцца?

Вучыцца ў школе я, вядома, хацеў. Але як, як было гэта зрабіць?

Цётка Поля непрыкметна таўханула мяне рукою, маўляў, не стой, ідзі, не траць дарэмна часу. Але я не зрушыўся з месца, стаяў, не зводзіў вачэй з незнаёмага і, як мне падалося, добрага чалавека, думаў, што яму адказаць.

— Дык я ж... — урэшце з цяжкасцю вымавіў я.— Я ж увесь час... То тут, то там...

— Я таму і кажу,— вёў сваё чалавек,— каб ты жыў на адным месцы, у школу хадзіў. У нас, у вёсцы, ёсць дом для сірот. Калі хочаш — аставайся, прымем...

Цяпер цётка Поля не вытрымала — балюча таўханула мне кулаком у бок.

— Ідзі, ідзі... Хопіць глупства слухаць. Нехта цябе от так ні за што ні пра што прыме ў гэты дом, нехта цябе карміцьме, дармаеда, садзявацьме, вучыцьме.— І ўжо да таго чалавека: — Не збівай хлопца з тропу, у цябе сваё жыццё, у нас — сваё...

— А ты, кабета, глядзі, бо да адказнасці прыцягнуць можам, што хлопца пры сабе трымаеш, жабраваць яго вучыш. Да слова, і табе ў інтэрнат трэба ўладкоўвацца...

— Сама ведаю, што мне трэба, а чаго не трэба,— агрызнулася цётка.

Мы пайшлі далей па вуліцы сваёй дарогай, а чалавек,

пастаяўшы, пайшоў таксама сваёй дарогай. Толькі наўздагон крыкнуў мне:

— Калі вучыцца хочаш, прыходзь у наш дзетдом, пашукай Івана Іванавіча. Гэта буду я, дырэктар...

Больш у той вёсцы мы не заходзілі ні да каго ў хату. Цётка Поля раптам успомніла, што заўтра нядзеля і трэба сядаць на цягнік, ехаць на базар, і заспяшалася на станцыю. Дарогаю ж яна бубнела, бубнела:

— Дабрадзей, знайшоўся. Ведаю я гэтых дабрадзеяў. І што такое дзіцячы дом, інтэрнат, таксама ведаю. Ні табе паесці ўволю, ні табе паспаць... Кожны камандуе: «Ідзі туды, рабі тое!» Ведаю я гэта... А так... Мы вольныя, як птушкі. Хочам — адпачываем, хочам — па хатах ходзім, хочам — па вагонах. Над намі начальніка няма, што заманецца, тое і робім. Вось дабяромся да базару, пастарцуем — і я куплю табе штонікі, пінжачок, чаравічкі. Не слухай толькі ты нікога, лепш, як са мною, табе нідзе і ні з кім не будзе.

Вядома, ніякіх штонікаў, пінжачка і чаравічкаў цётка Поля мне на базары не купіла. І не думала нават купляць. Дый каб купіла, наўрад ці астаўся б я з ёю ў павадырах пасля ўсяго таго, што пачуў ад добрага чалавека — Івана Іванавіча. Тыя словы, што сказаў ён пра дзіцячы дом, пра школу, не выходзілі ў мяне з галавы. І, праблукаўшы з цёткаю Поляю яшчэ з тыдзень, я нейк аднаго дня сказаў ёй:

— А ўсё ж, цётка Поля, я пакіну вас, паеду ў тую вёску, дзе дзіцячы дом.

— Во дурное дзіця,— ускіпела цётка Поля.— Наслухаўся казак і паверыў. Каму? Выпадковаму чалавеку. Ды на якое ліха ты яму здаўся, будзе цябе нехта так ні за што ні пра што карміць, садзяваць, вучыць?

— Усе адно вы, цётка, мяне не адгаворыце,— гэты раз я быў рашучы.— Я паеду. І сказаў вам пра гэта, каб вы ведалі, не клялі мяне. Давяду вас да станцыі— і паеду. Адзінае, што я прашу,— купіце мне білет.

— Білета ён захацеў? А дулі не хочаш? — аж запырскала слінаю ад злосці цётка Поля.

Да станцыі мы дайшлі разам. А там... Там я пакінуў цётку Полю, развітаўся з ёю назаўсёды!

І хоць кляла яна мяне з апошніх слоў і не дала нават рубля на білет, я не крыўдаваў,— чалавека ж не пераробіш, не зменіш, які ён урадзіўся, такі, мабыць, і будзе.

У той жа дзень я сяк-так пранік разам з іншымі людзь-

мі на перон, папрасіўся ў праваднíка, каб ён пусціў мяне ў вагон. Расказаў яму шчыра, хто я і куды хачу ехаць, і ён паверыў мне, дазволіў сесці ў сваю службоўку...

## Дзіцячы дом

Аднак жа, што я каторы ўжо дзень пішу? Успаміны? Не, не ўспаміны. Проста мне хочацца нагадаць сваё мінулае, зрабіць для сябе сякія-такія высновы, прааналізаваць, калі можна так сказаць, тое, што мною бачылася, перажылося, перадумалася. А што я пакуль больш успамінаю, чым аналізую, дык гэта, мабыць, і правільна, бо ў тым узросце я на свет глядзеў шырока адкрытымі вачыма, бачыў усё, што траплялася, запамінаў і менш за ўсё абдумваў убачанае, рабіў вывады. Мне даводзілася жыць як набяжыць. І я так жыў. Дый якія вывады я мог тады зрабіць? Дзед Антонь сказаў: «Жыві ў мяне». І я жыў, пакуль можна было жыць. Цётка Поля прапанавала: «Хадзем са мною старцаваць». І я... Пайшоў. Быць самім сабою, самастойна нешта рабіць я тады не мог. Мне трэба было слухацца чужое волі, рабіць тое, што загадвалі рабіць, словам, быць ніткаю — «куды іголка, туды і нітка»... Як можна жыць па-другому, я нават не ўяўляў, не мог і думаць, што можна жыць па-другому, інакш. І калі сустрэўся на маёй дарозе Іван Іванавіч і сказаў, што можна жыць не так, як жыву, я... паверыў Івану Іванавічу, пакінуў цётку Полю. Гэта было вялікае шчасце, як цяпер я разумею, стрэцца з такім чалавекам, якім быў Іван Іванавіч. Як ён любіў дзяцей! Меў жонку, меў сваіх двух сыноў, але з намі, дзетдомаўцамі, не расставаўся — мы былі таксама яго дзеці. Ён, ведаючы, што мы — сіроты, стараўся замяніць нам і бацьку і маці, і яму, трэба сказаць, гэта ўдавалася. Іван Іванавіч не пакідаў нас, пакуль мы не клаліся ў пасцелі і не засыналі. Прыходзіў жа ў інтэрнат ён раненька, калі мы яшчэ спалі. Ён і снедаў разам з намі, абедаў і вячэраў. Што ядзім мы, тое есць і ён. І калі хто з нас не мог падняцца з ложка — захварэў, ён быў за няньку, ён выклікаў доктара, ён даваў лекі, ён сачыў за хворым, кожным яго крокам, аж пакуль хворы не ачуньваў, не станавіўся зноў на ногі. Наш дзіцячы дом быў невялікі, мы не мелі сваёй школы, вучыліся разам з тымі дзецьмі, у якіх жывыя былі бацькі. І Івана Іванавіча гэта турбавала, ён часта заходзіў у школу, гаварыў з дырэктарам, настаўнікамі, прасіў, каб яны, як любіў паўтараць Іван Іванавіч, адносіліся да нас, сірот, «добра і яшчэ крышачку лепш».

— Разумееце, гэта дзеці вайны,— казаў ён, па звычцы ківаючы вялікім указальным пальцам.— І вашы, і мае дзеці маглі астацца такімі ж сіротамі. Нам пашанцавала. Але ж магло і не пашанцаваць. Таму і прашу вас — помніце гэта і адносцеся да гэтых дзяцей добра і яшчэ крышачку лепш. Хай не адчуваюць яны сябе сіротамі, хай растуць такія ж жыццярадасныя, вясёлыя, як і ўсе дзеці. Яны, дзеці — наша будучыня! Ад таго, як мы выхаваем іх, залежыць наша заўтра.

І настаўнікі слухаліся Івана Іванавіча. Нават калі хто з нас парушаў дысцыпліну ці не вывучваў урока, не спяшаліся караць, ставіць двойкі. І гэтая дабрыня, клопат падбадзёрвалі нас, мы імкнуліся адказваць на ўвагу — увагай, на дабрыню — дабрынёю.

Акрамя таго, што мы вучыліся ў школе, мы яшчэ шмат і працавалі — самі прыбіралі ў тых пакоях, дзе жылі, памагалі кухарцы на кухні, рэзалі і калолі дровы. Было ў нас і сваё поле, дзе мы сеялі бульбу, агуркі, садзілі капусту, моркву, іншую гародніну. Вясною, летам і ўвосень мы шчыравалі на полі — палолі, акопвалі, збіралі ўраджай. Час ад часу Іван Іванавіч вазіў нас на экскурсіі — то ў Мінск, то ў Маскву, то ў Ленінград. І рабіў гэта не так, як робяць некаторыя, дзелячы дзяцей на лепшых і на горшых. Лепшым — усё, горшым — нічога. Для Івана Іванавіча ўсе дзеці былі роўныя. Вучыцца хтосьці лепей? Дык у яго, можа, задаткі на гэта большыя. А другі вучыцца горш, але затое лепш паказвае сябе ў працы, у спорце. Кожнаму сваё, у кожнага свае здольнасці і магчымасці. І важна выявіць гэтыя здольнасці, знайсці тое, у чым сябе кожны можа найлепш паказаць. Адзін — на полі, другі — на кухні, трэці — у вучобе, чацвёрты — у самадзейнасці, пяты — яшчэ ў чым. Словам, у нас у дзіцячым доме кожны ў нечым перамагаў другіх, а ў нечым адставаў, даваў магчымасць быць наперадзе іншым. У Івана Іванавіча не было любімчыкаў, для яго мы ўсе былі дзеці, адна сям'я. Калі ў нас чаго не хапала, ён прыносіў тое нам з дому. Іншы раз нават сваю зарплату выдаткоўваў на нас — купляў то каму кашулю, то каму касцюмчык, чаравікі, бо гады тыя былі цяжкія, такіх, як мы, хапала, і не заўсёды ўсё можна было выпісаць, прывезці. Іван Іванавіч ездзіў у раён, абіваў парогі сельсавецкага і калгаснага начальства — трэба было дбаць не толькі пра тое, каб мы не мерзлі ўзімку, але і чым нас накарміць, у што апрануць. Як цяпер я разумею, нялёгка давалася Івану Іванавічу ўсё тое, што

мы мелі. Неаднойчы, вярнуўшыся з раёна ці сельсавета, ён падоўгу трымаўся рукамі за грудзі, дзе было сэрца. І хоць знешне заўсёды Іван Іванавіч быў спакойны, не выяўляў сваёй узбуджанасці ці незадаволенасці, бачылі мы, адчувалі: настрой у Івана Іванавіча не той, не той, што быў гадзіну ці дзве назад.

Неяк напрадвесні — я тады хадзіў ужо ў шосты клас — Іван Іванавіч паехаў у раён і не вяртаўся, мусіць, сутак трое. Калі ж ён паявіўся зноў у нашым інтэрнаце, мы не пазналі яго — такі ён зрабіўся худы, нейкі белы. Сабраўшы ўсіх нас у сталоўку — сталоўка ў нас была і за клуб, і за хату-чатыльню, у ёй мы праводзілі свае сходы і абмеркаванні,— ён аб'явіў, што наш дзіцячы дом будзе днямі ліквідаваны.

— Я хадзіў па начальству, стараўся даказаць, што ліквідоўваць наш дом не трэба. Мяне не паслухаліся. Можа быць, і правільна, што не паслухаліся. Ёсць дамы лепшыя, з добрай базай, з выхавацелямі, сваёй школай. Так што...

Ён не дагаварыў, схапіўся рукамі за грудзі, млява асунуўся на падлогу...

Старэйшыя з нас кінуліся да Івана Іванавіча, далі яму вады, вывелі на свежае паветра. Прыбег наш дзетдомаўскі доктар, запрог каня, павёз Івана Іванавіча ў бальніцу.

Ноч тую ніхто ў нашым інтэрнаце не спаў. Усіх клапаціла і нечаканая хвароба Івана Іванавіча, і тая навіна, што прывёз ён з раёна. «Што значыць ліквідаваць наш дом? А дзе падзенемся мы, куды нас накіруюць? Усіх разам ці пашлюць таго туды, а таго зусім у іншае месца?..»

Уранні наш дом наведала сумная вестка — памёр Іван Іванавіч...

Праз дзень мы хавалі Івана Іванавіча, ішлі ўсім дзетдомам за дамавінай, якую вёз наш дзетдомаўскі конь Гарвась на вясковыя могілкі. Ішлі і плакалі. Плакалі, бо расставаліся, расставаліся навечна з родным, дарагім нам чалавекам...

А яшчэ праз нейкі тыдзень у самае вясновае разводдзе мы развіталіся і адзін з адным, і з нашым утульным драўляным домам, што стаяў наводшыбе вёскі,— мы, выхаванцы Івана Іванавіча, раз'язджаліся ў розныя гарады, па розных дзіцячых дамах...

## Новы дзіцячы дом

Можа, каму з былых маіх аднакашнікаў і пашанцавала. Толькі не мне. Да новага дзіцячага дома я так і не прывык. Не прывык, мусіць, таму, што новы дзіцячы дом быў у горадзе, у камяніцы, а я дагэтуль рос у вёсцы, на волі і прасторы. Дый дысцыпліна ў новым дзіцячым доме была даволі суровая. За розныя парушэнні каралі — прымушалі мыць калідоры, пакідалі на ноч без яды, нават садзілі ў цёмны клас. Выхаванцы дзяліліся на здольных і няздольных, любімых і нелюбімых; адным дазвалялася маляваць, чытаць, спяваць і танцаваць у розных самадзейных гуртках, другіх пасылалі толькі падсабляць на кухню, рэзаць дровы, падмятаць двор, зграбаць снег. Дырэктар, выхавацелі былі не такія, як у Бароньках, а нейкія нервовыя, няласкавыя. Як толькі што зробіш не па-іхняму — крычаць, сварацца.

— Эй, ты што гэта! Цябе, дармаеда, кормяць, даглядаюць, а ты...

І пайшло, пайшло... Стой, толькі слухай!

Аднойчы ўвечары ў нашым доме пагасла святло. Я выбег на калідор і трэба ж — патрапіў на вочы дырэктару, Пятру Раманавічу.

— Эй! — крыкнуў да мяне дырэктар. (Як каго зваць з выхаванцаў, ён не запамінаў, не стараўся нават запамінаць.) — Злазь у каробку, паглядзі, можа, пробкі перагарэлі.

Я тады надта ж баяўся электрычнага току. Дакрануцца да лямпачкі ці да разеткі, нават калі быў выключаны ток, для меня было вышэй маіх сіл. А тут лезці ў каробку, правяраць пробкі... Ды яшчэ калі — на вуліцы ж шугала навальніца, бухаў раз-пораз гром, аж сляпілі вочы галлістыя пісягі маланак. І я сказаў, прызнаўся дырэктару:

— Я баюся.

— Чаго ты баішся! — абурыўся, аж затупаў ботамі — ён заўсёды хадзіў у фрэнчы, галіфэ і ботах — дырэктар.— Загінуць? Ну дык калі і загінеш, страта невялікая. Плакаць па табе няма каму...

Я, вядома, выканаў загад дырэктара, палез у каробку, выкруціў перагарэлыя пробкі, на іх месца паставіў новыя. Але дырэктаравы словы ўрэзаліся на ўсё жыццё ў памяць. «Значыцца, я не такі, як усе дзеці. Шкадаваць мяне, аплакваць няма каму. Я адзін. Магу жыць, магу загінуць, болі ці радасці гэтым я нікому не прынясу...»

Дырэктаравы словы я ўзяў вельмі ж блізка да сэрца.

Яны не выходзілі ў мяне з галавы. І сам дырэктар, і выхавацелі, і настаўнікі, і ўсе людзі, што акружалі мяне, нейк пабляклі ў вачах, парабіліся чужымі, нямілымі мне. Дзе б я ні быў, ніколі не хацелася вяртацца назад у новы мой дзіцячы дом. І калі здаў экзамены за сем класаў, я наважыўся як найхутчэй паехаць з гарадка. Выбіраць, куды ехаць, не даводзілася — абы паехаць, абы не быць у нялюбым дзіцячым доме. Ад таго гарадка, дзе амаль у самым цэнтры ўзвышаўся будынак нашага новага дзіцячага дома, зусім непадалёку — кіламетраў, мусіць, за дваццаць — быў абласны горад. У ім, тым горадзе, сярод іншых навучальных устаноў працавала і педвучылішча. Туды, у педвучылішча, я і паслаў заяву і дакументы — а раптам паступлю?

## У педвучылішчы

Мне пашанцавала — я добра здаў уступныя экзамены, мяне залічылі на першы курс педвучылішча. Давялося прывыкаць да самастойнага жыцця. А гэта не так і лёгка. Стыпендыі, якую мне давалі, не хапала і на паўмесяца. А трэба ж было дбаць і пра адзенне, хацелася хоць зрэдку схадзіць у кіно. Добра, што не адзін я такі быў. Разам са мною ў педвучылішчы навучаліся і іншыя дзетдомаўцы, а таксама і хлопцы з вёсак, каму не хапала за што жыць. І вось, каб неяк зводзіць канцы з канцамі, прылаўчыліся мы хадзіць на чыгуначную станцыю разгружаць вагоны. Не паспіш ноч — глядзіш, дзесятка, а то і дзве ў кішэні. Праўда, пасля начной працы не сядзелася на лекцыях, цягнула, нібы магнітам, схіліць галаву, заснуць.

Клапаціла, не давала спакойна жыць і яшчэ адно. Недзе ці не на трэцім курсе я зразумеў: педагога, пры ўсім маім жаданні, з мяне не выйдзе. Каб быць педагогам, трэба цярплівасць, вытрымка. Да таго ж дзень у дзень, год у год паўтараць амаль адно і тое ж, хай сабе кожны раз і новым вучням. Гэта было не па мне. Я не мог доўга быць на адным месцы, прагнуў адкрываць кожны дзень, кожную гадзіну нешта новае і новае. Прачнулася, загаварыла ў мяне няйнакш бацькава цыганская кроў. Яшчэ я заўважыў, што не магу доўга з кім бы там ні было быць, сябраваць. Я надта хутка расчароўваўся ў людзях, бачыў у іх не толькі добрае, але і дрэннае, тое, што некаторыя настойліва хавалі. Прычым дрэннае, тое, што мне не падабалася, засланяла добрае. Дзіўна, але я не мог проста ў вочы

сказаць чалавеку, што мне ў ім не падабаецца. І хоць да мяне гарнуліся аднакурснікі і аднакурсніцы, але я... Усяляк пазбягаў іх шумных кампаній і зборышчаў, шукаў адзіноты. Выйду, бывала, у парк — ён быў каля саменькага Сожа, вялізны, стары, яшчэ графскі, з дрэвамі ў некалькі абхватаў, птушыным граем і думнай цішынёй, сяду дзенебудзь і праседжу цэлы дзень. А то яшчэ — пайду ў бібліятэку, вазьму кнігу — не па праграме, а так, для душы — і чытаю, чытаю... У кнігах я знаходзіў шмат самых розных, часам вельмі супярэчлівых думак, сачыў за жыццём людзей, мне невядомых, хваляваўся, радаваўся і злаваўся. Мае ж равеснікі тым часам хадзілі ў кіно, хлопцы падлабуньваліся да дзяўчат. Усё часцей і часцей я сустракаў на калідорах у інтэрнаце ці на вуліцы знаёмыя мне парачкі. І толькі я жыў не зразумелым нікому, сваім жыццём. Я ўсё больш і больш аддаляўся нават ад тых сваіх аднакурснікаў, з якімі быў нядаўна блізкі. Раней на канікулы я ездзіў у дзіцячы дом, разоў колькі наведваў сваіх аднакурснікаў у вёсках. Цяпер і гэтага я не рабіў. На канікулах я заставаўся ў горадзе, хадзіў у бібліятэку, у парк ці ўладкоўваўся куды-небудзь на працу. Я бачыў — навокал ішло жыццё, адно нараджалася, другое памірала, знікала. Зямля залечвала раны вайны, на месцы спаленых вёсак і разбураных дамоў узнікалі новыя вёскі, новыя дамы. Людзі шукалі і знаходзілі тых, хто згубіўся ў ліхалецце, у вайну. Паспрабаваў і я пашукаць свайго бацьку. Напісаў некалькі пісем у Маскву, Мінск, потым аднаго лета паехаў у тую вёску, дзе я нарадзіўся, жыў,— у Макраны. Вёскі сваёй я, вядома, не пазнаў — так яна змянілася, разбудавалася. Зніклі абгарэлыя платы, дрэвы, не было нідзе відаць і зямлянак. Усюды, куды ні паглядзіш, смалістыя, на пяць-сем акон дамы, маладыя, зялёныя сады. Там, дзе некалі, адразу пасля вайны, пасяліліся былі мы з маці, таксама стаяў дом — вялікі, прасторны, крыты залацістаю гонтаю. Я паспрабаваў быў папытацца, дзе цяпер дзед Антонь. І пачуў ад людзей, што дзеда Антоня даўно няма ўжо на гэтым свеце, ён памёр не то ў сорак сёмым, не то ў сорак восьмым годзе. Мяне ж самога ніхто не помніў, а калі я казаў, чый сын, вяскоўцы здзіўляліся: «Глядзі ты, які вымахаў!» Пра бацьку майго ў вёсцы нічога не чулі. Ва ўсякім выпадку, сам ён не абзываўся, не пісаў нікому пісем. І не прыязджаў. І я, паблукаўшы па вёсцы, пагаманіўшы з людзьмі, адчуў сябе і тут, у сваёй вёсцы, надта ж адзінока і сумна. Нават паабедаць, пераначаваць і то

мне не было ў каго. Адвячоркам, калі гналі з пашы кароў, я пакінуў Макраны, пабраўся назад на станцыю. І з таго часу больш туды так ні разу і не наведваўся. Хоць, адчуваю, трэба было наведвацца. Калі не часта, дык хоць зрэдку.

Тады, у тыя гады, трапілася мне на вочы кніжачка адна. Называлася яна «Афарызмы жыццёвае мудрасці». Гэта потым я даведаўся, хто аўтар кніжачкі. Тады ж прозвішча аўтара мне мала што гаварыла. Дый цяпер не зусім дасведчаным людзям гэтае прозвішча мала што скажа — Артур Шапенгаўэр. Кніжачку я прачытаў і раз, і два, і тры. Спадабалася яна мне. Мо таму, што адпавядала майму настрою, маім думкам. І яшчэ — кніжачка вучыла чалавека, як яму жыць, каб быць шчаслівым. У кніжачцы было вельмі шмат парад, а найгалоўнейшая з іх — не прыслухáцца да таго, што гавораць пра цябе людзі, уцякаць ад іх, старацца як мага больш быць аднаму, сам-насам са сваімі думкамі, настроем. І не хацець многага, абмяжоўвацца тым, што маеш. Берагчы ж трэба толькі адно — здароўе. Якраз ад здароўя і залежыць шчасце чалавека. Ды яшчэ ад таго, што носіш ты ў галаве сваёй, сэрцы. Даведаўшыся, што кніжачку гэтую напісаў філосаф, я загарэўся: «Буду і я філосафам!»

На апошніх курсах педвучылішча я стараўся з усіх сіл, каб вучыцца на «выдатна», трапіць у тыя пяць працэнтаў, што мелі права не ехаць працаваць у школу, а адразу ж падавацца вучыцца далей — у вышэйшыя навучальныя ўстановы. І я такі дамогся свайго — педвучылішча закончыў на «выдатна». І, вядома ж, падаўся ў філосафы, ва універсітэт.

## Я — студэнт-філосаф

Вучыцца ва універсітэце куды лягчэй, чым у педвучылішчы. Паўгода ніхто ў цябе не пытае, што ты робіш,— хочаш зубры што-небудзь, чытай, хочаш спі, гуляй. Пасядзеў на лекцыях гадзін шэсць-восем — і ты вольны. Да таго ж і стыпендыя ніштаватая. Праўда, без ніякай дапамогі і на яе не вельмі раскашуешся. А трэба ж і адзенне самому сабе купіць, і абутак. Дый жыць у Мінску значна цяжэй, чым у меншых гарадах. На праезд і то ўга колькі грошай трэба. Праедзь з Нямігі да універсітэта, з універсітэта да бібліятэкі, з бібліятэкі да сталоўкі, са сталоўкі зноў ва універсітэт ці ў бібліятэку... Хадзіць жа разгружаць

вагоны на чыгуначную станцыю таксама было няёмка. Якніяк, а студэнт вышэйшай навучальнай установы, філосаф. І галадаць таксама не хацелася. Каб мець капейку, налаўчыўся я патроху прыгандлёўваць. Іду па горадзе, бачу каля магазіна ці ў магазіне — чарга выстрайваецца. Я таксама ў чаргу стану. Куплю, што прадаюць. А тады, як разбяруць тое, што прадавалі, дастану купленае і перапрадам. Маўляў, купіў вось, ды не падышло. А каб выгада нейкая была — цану большую назаву. Глядзіш — і паабедаць можна. Неяк, валэндаючыся без дай прычыны па горадзе, зазірнуў я ў букіністычны магазін. Выпадкова. Дзесяткі, сотні разоў праходзіў міма, а то ўзяў ды шуснуў у дзверы. І аж рот разявіў — ад кніжак гнуліся паліцы. І якіх — не толькі новых, але і старых, у скураных пераплётах, з залатым абрэзам і цісненнем. Пагартаў я некаторыя з гэтых кніг, дзве ці тры купіў. У пакоі ў інтэрнаце пачытаў іх. Але трымаць пры сабе не захацеў. Дый трэба былі грошы. Панёс я тыя кнігі назад у букіністычны магазін. Кнігі прынялі, але заплацілі за іх менш, чым я плаціў, купляючы.

— Гэта чаму ж так? — разгубіўся я.

— А мы бяром дваццаць працэнтаў камісійных,— адказалі мне.

— Дык я ж нічога з кнігамі не рабіў. Толькі прачытаў. Дык за гэта ўтрымліваць дваццаць працэнтаў?

Але вярнуць свае грошы, як я ні намагаўся, мне не ўдалося.

Маю спрэчку з тавараведам-прыёмшчыцай чуў барадаты дзяцюк, які тоўкся немаведама чаго ля прыёмнага акна. Калі я, узяўшы квітанцыю, накіраваўся да касы, ён аклікнуў мяне.

— Галава! — сказаў ён і пакруціў ля скроні пальцам.— Навошта сварыцца? Хацелі вярнуць грошы, то трэба было цану сцерці... І вам бы... Далі, колькі б запрасілі. План жа. І па продажу і па скупцы. Не толькі б свае грошы вярнулі, а яшчэ навар мелі б...

Словы невядомага дзецюка ўпалі не на камень. Атрымаўшы стыпендыю, я зайшоў у букіністычны магазін, набраў цэлую сумку кніжак. Каторыя прачытаў, а каторыя нават не пагартаў. Цэны ж, пастаўленыя на апошніх старонках кніг, акуратненька павыціраў. Дзён праз колькі некаторыя з купленых кагадзе кніг я занёс зноў у букіністычны магазін. Жульніцтва маё адразу ж выкрылі, я пачырванеў, але тым не менш меў «навар». І гэта мяне

натхніла. Я ўсё часцей і часцей пачаў заходзіць у букіністычны магазін, купляў старыя кнігі, а потым, выцершы цану, праз тыдзень-другі нёс іх зноў здаваць. Потым ужо, думаючы пра тое, чаму таваравед-прыёмшчыца мяне не адвадзіла такое рабіць, а нібыта натхняла, я зразумеў пра... Але не, не трэба забягаць наперад. Лепш выкладаць усё па парадку. Словам, хутка таваравед-прыёмшчыца ведала мяне, я — яе. Яна іншы раз прасіла, каб я вынес з яе баковачкі кнігі на прылавак, прапаноўвала мне, што купіць. А то — і давала адрас уладальніка бібліятэкі, які хацеў сеё-тое прадаць са сваіх кніг. Я ехаў, купляў кнігі. Таваравeду-прыёмшчыцы за гэта прыносіў то карабок цукерак, то духі, а то і... грошы. Я перазнаёміўся з кнігалюбамі, якія збіраліся па вечарах у букіністычны магазін, даведаўся, што каму з іх трэба, хто што шукае. Бо кнігалюбы ёсць розныя — адзін збірае паэзію, другі — прозу, трэці — філасофію ці што-небудзь яшчэ. Я пакідаў таваравeду-прыёмшчыцы спіс кніг, якія яна павінна была пакінуць, заходзіў штодзень у магазін, забіраў пакінутыя кнігі. А то, бывала, перш чым выносіць кнігі ў залу на продаж, я іх праглядваў і самае, на маю думку, цікавае забіраў сабе. Лацвей мне было гэта рабіць, бо я сам штодзень выносіў кнігі з таваравeдавай баковачкі. Як толькі закончацца лекцыі, я і бягу ў букіністычны магазін. Само сабою зразумела, я добра вывучыў за гэты час цэннік, ведаў, якая кніга колькі каштуе. Праўда, у цэнніку не было цэн на многія кнігі, і гэта, як я зразумеў, надта ж добра. Бо як ні ацэніш тую кнігу, цана якой не пазначана ў цэнніку, так і няхай. Што людзі не купяць, можна потым будзе спісаць ці аддаць у нейкую бібліятэку. Але калі я пазнаёміўся з кнігалюбамі, то здаваў ужо купленыя кнігі назад у магазін рэдка. Часцей жа я браў у магазіне кнігі сам і перапрадаваў кнігалюбам. Я не жмінда, таму цэны назначаў памяркоўныя, і кнігалюбы ахвотна ў мяне куплялі. Нават выгаду пэўную бачылі, бо не трэба было ім цэлымі днямі тырчаць у магазіне, чакаць, калі з'явіцца на прылаўку патрэбная кніга. Кнігалюбы пачалі даваць мне тэлефоны, адрасы, запрашалі заходзіць на кватэру. Гэтак я пазнаёміўся праз некаторы час з усімі ўладальнікамі больш-менш значных прыватных бібліятэк. Грошы я пачаў браць толькі зрэдку, часцей жа прасіў даць што-небудзь з кніг узамен. Бо, як я заўважыў, у кожнай бібліятэцы былі тыя кнігі, з якімі гаспадар надта ж ахвотна расставаўся. А гэта... Гэта былі акурат тыя кнігі, якія шукаў нейкі другі кніга-

люб. У таго, другога, я зноў забіраў непатрэбныя яму кнігі і нёс іх трэцяму... Вядома, у кішэнях у мяне завяліся грошы, прычым немалыя. Бо я любіў не проста памяняць кнігу на кнігу, а ўзяць яшчэ пры гэтым і прыдачу грашыма. Нібыта цыган той на базары — каб з канём на базар прыйсці і з канём з базару пайсці. І выгаду — «навар» яшчэ мець. Інакш, калі з базару цыган без каня пойдзе, яму ў наступны базарны дзень не будзе чаго мяняць, што прадаваць. М-г... Зноў пра сваю цыганскую кроў успомніў!..

Аднак жа, захапіўшыся ўспамінамі пра свой гандаль, я забыўся зусім, што я быў тады студэнт універсітэта, філосаф. Між іншым, і тады таксама я на гэта забыўся. Праўда, што граху таіць, экзамены сяк-так здаваў. Памагала тое, што сярод выкладчыкаў таксама былі людзі, якія любілі кнігі. І я... час ад часу падсоўваў ім то адну, то другую патрэбныя «па тэме» кнігі. Выкладчыкі мяне за гэта любілі, ставілі адзнакі ў заліковую кніжку. Тым не менш, я хутка зразумеў, што мне не трэба было паступаць на філасофскі факультэт. Думаць глыбока пра што б там ні было я не мог, не ўмеў. А які ж з таго чалавека філосаф, хто не можа засяродзіцца глыбока над чым-небудзь, не можа пабыць сам-насам са сваімі думкамі і дзень, і два, і калі трэба, то і тыдзень, месяц, год. Мяне ж цягнула на прастор — ездзіць, хадзіць, глядзець на ўсё, любавацца. І прафесіяй, якая б адпавядала маёй натуры, была, як пачало мне здавацца, журналістыка. Журналісты ніколі не заседжваюцца на месцы, увесь час у дарозе, увесь час нешта цікавае, новае бачаць. І я пагаварыў з адным, з другім, з трэцім выкладчыкамі, папрасіў іх, каб памаглі перавесціся на факультэт журналістыкі. «А што, давай!..» — падахвоцілі некаторыя мяне. І недзе на трэцім курсе я быў ужо студэнтам факультэта журналістыкі.

## Я — журналіст

Гэта толькі здавалася, што маёй натуры найбольш адпавядае журналісцкая праца. Але, як хутка я пераканаўся, журналісты не так і часта ездзяць у камандзіроўкі. У рэдакцыі заўсёды шмат самага рознага неадкладнага клопату — трэба правіць матэрыялы, вычытваць палосы, рэгістраваць, перачытваць тое, што дасылаюць рабкоры, селькоры. Дый, акрамя таго, з камандзіроўкі трэба прывезці нейкі матэрыял — нарыс, артыкул ці фельетон. Ці

хоць бы сабраць факты, а потым сесці ды напісаць. Сабраць факты я яшчэ сяк-так мог, а што да пісання... Ох, нялёгка, нялёгка даваўся мне кожны радок! А газета чакаць не можа, яна не выходзіць з белымі, незанятымі палосамі. Ды і дзяжурствы гэтыя, прычым па начах... «Не быць мне журналістам»,— падумаў я, будучы яшчэ на практыцы.

І не памыліўся. Закончыўшы універсітэт, я атрымаў накіраванне ў раённую газету. На Палессе, на самы поўдзень Беларусі. Што ж, развітаўся я са сваімі знаёмымі кнігалюбамі, букіністамі, паехаў, куды мяне пасылалі. У мястэчку, якое нагадвала хутчэй вёску,— тыя ж драўляныя хаты, тыя ж гародзікі, садкі ў кожным двары, тыя ж пыльныя, зарослыя па баках муравою і лопухамі, вуліцы,— я наняў пакойчык у адзінокай, глухаватай бабкі Маланні, пачаў штодзень хадзіць на працу. Сядзеў у рэдакцыі, ездзіў па калгасах. Вядома, пісаў нейкія матэрыялы. Але яны не радавалі ні самога мяне, ні рэдактара, ні чытачоў. «І чаму толькі вас там вучаць пяць гадоў,— казаў неаднойчы мне рэдактар, мажны, з разбабелым жыватом і вялікай — на ўсю галаву — лысінай. (Сам рэдактар нідзе не вучыўся на журналіста, у газету прыйшоў з прафсаюзнай работы.) — Ні жыцця не ведаеце, ні людзей. Нават пра тое, што бачыце, чуеце, напісаць не можаце». Чытаючы мае матэрыялы, моршчыўся і сакратар, чалавек худы і надта ж вёрткі. «Хлопча, калі ты хочаш працаваць у газеце, вывучай мову. Як жа можна пісаць, выказваць свае думкі, маючы ў запасе два-тры дзесяткі слоў?» У запасе ў мяне, вядома, было не два-тры дзесяткі слоў, але са мною, як, мабыць, і з многімі, адбывалася дзіўнае: як толькі я садзіўся пісаць, дзе і дзяваліся словы, звычайныя чалавечыя словы, лезла ў галаву чортведама што. Так я, калі размаўляю, быццам і бойкі, па слова ў кішэню ніколі не лезу. Ёсць, як кажуць, і лад і склад. А сяду пісаць — ну хоць ты забі мяне, парахня, а не словы. Да таго ж па натуры сваёй я непаседлівы. Мне б хадзіць, бегаць, а тут да стала трэба быць прыкутым, над паперамі карпець. І каб хоць было за што! А то ж атрымліваць зарплату пара надыдзе ці ганарар — і лічыць няма чаго. А трэба ж і за пакойчык заплаціць, і ў сталоўку абедаць хадзіць. Дый у абы-што не апранешся. Як-ніяк — журналіст! Трэба, каб і выгляд адпаведны быў. Бо гэта толькі кажуць так — «па адзёжцы сустрэнуць, а па розуму правядуць». На самай жа справе адзёжка — гэта... Добра ты апрануты — зна-

чыцца, і чалавек прыстойны. Табе і чарку паставяць, і скварку, і старшыня да сябе ў хату пераначаваць пакліча. А прыедзеш ва ўсім звычайным — звычайна і прымуць. Нават паабедаць ніхто не дасць. Галодны цэлы дзень будзеш. А розум... Каму якая справа да твайго розуму — ёсць ён у цябе ці няма?.. Вось адзежа... Яна кожнаму відна, кожны яе ацэніць... Гэта нават цётка Поля ведала.

Словам, апынуўшыся сярод людзей, я пачаў пазнаваць сэнс многіх рэчаў. Скажам, працаваў у нашай рэдакцыі загадчыкам сельгасаддзела хтосьці Бычкоўскі Сільвестр Платонавіч (псеўданім С. Бычок). Марудлівы ва ўсім чалавек, да таго ж рослы, мажны. За плугам такому б хадзіць, касою махаць, а ён у рэдакцыі абжыўся. Ды яшчэ як! Прышлюць скаргу на старшыню ці брыгадзіра. Сільвестр Платонавіч чытае яе, гмыкае, смяецца сам сабе. І не рэгіструе скаргі, не пасылае на рэагаванне — сам едзе правяраць. Ідзе да старшыні калгаса, да брыгадзіра, словам, да таго, на каго скарга напісана, пакажа скаргу... І... за чаркай падзяруць тую скаргу. Старшыня ж ці брыгадзір за гэта бульбачкі адборнай увосень Бычкоўскаму колькі мяшкоў прывязе ці яшчэ чаго-небудзь падкіне. Шыта-крыта. Ці, скажам, той жа ганарар. Па-рознаму яго можна падзяліць. Можна за матэрыял выпісаць і два рублі, можна і пяць. Усё залежыць, якія адносіны ў цябе з рэдактарам, сакратаром. Паклічаш іх пасля ганарару ў рэстаран, паставіш чарку — будзеш мець і адпаведны ганарар. Паклікаць у рэстаран рэдактара і сакратара і я быў не супраць. Але з імі трэба было піць. Прычым піць гэтулькі, колькі і яны. Інакш і рэдактар і сакратар крыўдзіліся: «Ты што, анёлак? Ці ты нас спаіць хочаш, а сам... Ведаем мы такіх! Калі піць, дык піць пароўну!» Паспрабаваў я піць з імі чарка ў чарку, ледзь Богу душу не аддаў. Тыдзень у ложку праваляўся, ратавала мяне бабка Маланне, чым толькі магла. А рэдактар і сакратар пасля любой папойкі ў рэдакцыю прыходзілі назаўтра свежанькія, што агурочкі. Толькі піва бегалі піць праз кожнае паўгадзіны...

Вядома, не ўсе супрацоўнікі ў рэдакцыі былі такія, пра якіх я тут успомніў. Былі і сумленныя, прыстойныя людзі. Карэктарка Ніна, якая хацела вельмі ж замуж выйсці, пра жаніхоў толькі і гаварыла, літработнік Хвастунок — ён надта ж ірваўся вучыцца ва універсітэт, ды паступіць ніяк не мог, загадчык прамысловага аддзела Пятрунін, намеснік рэдактара Захарэвіч — гэтыя ўсё намерваліся вывесці на чыстую ваду С. Бычка, ды чамусьці не асмельва-

лiся — цi не таму, што ў С. Бычка «рука» недзе была...

Словам, я ў раённай газеце не прыжыўся, «прыйшоўся не да двара», адчуваў сябе не «ў сваёй талерцы». (Хм, успомнiў газету i адразу ж штампамi загаварыў!) Таму, папрацаваўшы нешта цi не з год, падаў заяву на iмя рэдактара i звольнiўся па ўласным жаданнi. Пра тое, куды ехаць з мястэчка, дзе працаваць, неяк не думалася. Я сабраў свае небагатыя пажыткi i вярнуўся ў Мiнск.

## Зноў па хатах

У Мiнску чакалi мяне непрыемныя навiны: у букiнiстычным магазiне знялi з працы знаёмую мне тавараведа-прыёмшчыцу. Нехта напiсаў, што яна карыстаецца недазволенымi метадамi прыёму кнiг — на адны i тыя ж кнiгi некаторым завышае цэны, другiм — занiжае. Стварылi камiсiю, камiсiя некалькi дзён правярала букiнiстычны магазiн. Нiчога асаблiвага не выявiлi, але тавараведа-прыёмшчыцу знялi. На яе месца прыслалi новую. Я паспрабаваў увайсцi з ёю ў кантакт, ды з гэтага нiчога не выйшла. Пакiдаць мне кнiгi новая таваравед-прыёмшчыца адмовiлася, не дазваляла яна мне i выносiць iх у залу з прыёмнага пункта. Што было рабiць? У мяне былi адрасы, былi знаёмыя кнiгалюбы. I я па вечарах пачаў зноў наведваць то аднаго, то другога. Удзень жа блукаў па кнiжных магазiнах, скуплiваў тое, што карысталася попытам. Што мяняў, што прадаваў, а сёе-тое, асаблiва старыя кнiгi, набытыя абменам,— здаваў у букiнiстычны магазiн. З гэтага i жыў, пакуль не ўладкаваўся на працу ў музей.

Не магу, каб тут, на адзiноце, не ўспомнiць некаторых сваiх знаёмых, у якiх я бываў, якiя куплялi ў мяне кнiгi. Кожны з iх, гэтых людзей, як я здагадваўся, чалавек з параграфам, мякка кажучы, дзiвак. Жыве, жыве i раптам... Нiбыта з чалавекам што здарыцца — захопiцца чым-небудзь. Адзiн пачынае збiраць маркi, другi — манеты, а трэцi... Кнiгi. Прычым так збiраць, што забывае на сваю работу, дзяцей, жонку. Уся ўвага — кнiгам. Капаецца ў розных даведнiках, складае спiсы, што яму хацелася б мець, цэлымi днямi ходзiць з аднаго кнiжнага магазiна ў другi. А цяпер пачалi выпускаць гэтыя серыi — прыдумалi ж выдаўцы на згубу людзям! Прычым адна кнiга серыi выдаецца тыражом у сто тысяч, другая ў дзесяткi разоў меншым. Адна iдзе ў адкрыты продаж, другая ў магазiны не паступае — iдзе па бiблiятэчным калектары. Паспрабуй, зда-

будзь яе. А чалавек ні спаць, ні есці не можа, у яго няма адной ці дзвюх кніг той ці іншай серыі. У кагосьці ёсць, а ў яго няма. І справа ўжо не ў самой кнізе, справа ў прэстыжы. Што, хіба горшы за таго, хто мае поўную серыю? Гатовы што заўгодна аддаць, абы не адстаць. А серый гэтых... І не пералічыш усе серыі, што ў нас выдаюцца! Іх каля сотні. І ўсе прыгожа афармленыя, а калі паставіш за шкло... Хараство, прыгажосць невыказная! Вачэй не адарвеш. І сам любуешся, і тыя, каго ў госці запросіш, таксама глядзяць. Дэфіцыт жа кніга! Пытанні так і сыплюцца: «Дзе бярэш? Можа б, і мне памог?..» А ты... На сёмым небе ад шчасця. Не так і важна, будзеш ты ці твае сямейнікі чытаць гэтыя кнігі. Нават лепш, што іх не чытаюць, бо калі пачні кнігі чытаць, яны не будуць удаваць такімі навюткімі, а значыцца — прыгажосць не тая. І ўсе серыйнікі збіраюць кнігі новенькія, нячытаныя. Не новую ніхто з іх не возьме нават дарма. За новую ж, тую, якой ніхто і не гартаў, штаны прадасць, а возьме, купіць. Кажуць, раней людзі захапляліся мэбляю, скуплівалі посуд, розныя рэчы з крышталю і золата. Цяпер уся ўвага абывацеляў засяроджана на кнігах, модна стала мець на кватэры бібліятэку. Нічога не зробіш, такі покліч часу. І вінаваты ва ўсім гэтым, як казаў мне адзін мой знаёмы, таксама кнігалюб, мэблёўшчыкі. Гэта яны ва ўсе мэблевыя гарнітуры ўключылі абавязкова кніжныя паліцы. А калі чалавек купіць гарнітур, паставіць у кватэру кніжную паліцу, то трэба ж тую паліцу запоўніць кнігамі... Прычым не проста запоўніць абы-чым, а запоўніць чым-небудзь прыгожым. І пачынаецца бегатня па кніжных магазінах, падбіраюцца кнігі. Кнігі, якія б прыгожа глядзеліся з-за шкла. Найлепш, вядома, падпісачка, серыйка...

Праўда, сярод маіх знаёмых — мала такіх «збіральнікаў». У мяне збіральнікі адмысловыя, такія, якія нічога не пашкадуюць дзеля кнігі і ў якіх кніг... Ну, як зойдзеш у калідор, дык з калідора кнігі і пачынаюцца. Нідзе незанятага кавалачка сцяны няма, куды вокам ні кінь, усюды кнігі, кнігі, кнігі. Новыя, толькі што выдадзеныя, і старыя, яшчэ даваенныя, дарэвалюцыйныя. І кожнага аўтара чалавек хоча мець не толькі поўны збор твораў, а ўсе выданні — і прыжыццёвыя і пасмяротныя. Акрамя таго — мець усё, што толькі і дзе б ні пісаў хто пра гэтага аўтара. Ну, скажам, калі чалавек вывучае жыццё і творчасць гэтага аўтара, хоча нешта сваё сказаць, то тут быццам усё ў парадку, так і трэба. Дык не ж! Проста задача-фікс, ідэя-

фікс! І калі яна народзіцца ў галаве, чалавек не будзе мець спакою, пакуль задачы гэтай не развяжа. І для такіх, як я, такія людзі знаходка. Любую цану назначай за тую кнігу, якая табе выпадкова трапіла ў рукі, чалавек дасць. Важна толькі ведаць такога чалавека, ведаць, што ён збірае...

Занятак мой не такі і бяспечны. І пра гэта я даведаўся ад аднаго знаёмага кнігалюба-юрыста. Аказваецца, за перапрадажу кніг можна чалавека і судзіць. Спекуляцыя! Я, калі даведаўся пра гэта, пачаў мінаць кватэру юрыста. Але ён не мог жыць без кніг. Лавіў мяне на вуліцы і напрамілы бог прасіў заходзіць: «Дык вы ж парушаць законаў не будзеце... Ды і мне з вамі мець справу... Небяспечна»,— казаў я. «Не бойся, заяўляць на цябе я не буду. А каб нехта не прычапіўся, з жонкай маёй гандлюй. Ты ў хату, я з хаты. На выпадак чаго — я нічога не ведаў. Добра?» Патрымаў я свайго законніка на галодным пайку гэтак месяцы два — услед за мною, як сабачка, бегаў, пакуль я зноў не пачаў на кватэру да яго наведвацца. Я ў хату, юрыст з хаты. Пацеха! З жонкай, праўда, гаварыць пра кнігі... Кніг яна не ведала, не ведала сапраўднай цаны рэдкасцям. Кожны раз гандаль з ёю ў мяне зацягваўся, я пачаў дакранацца да яе ручак... Ну, а потым... Даводзілася юрысту падоўгу бегаць па вуліцы, на марозе, пакуль канчаўся наш «гандаль». М-г... Ладная, прывабная была кабета. І цяпер як успомню... Ды не будзем пра тое.

Любіў я заходзіць і да доктара аднаго. Не таго доктара, што лечыць, а доктара навук. Сам ён — матэматык, а збіраў мастацкую літаратуру. Грошай у яго — куры не клююць. Сям'я ж — жонка, таксама вучоная, кандыдат, ды дачушка. Дачушка якраз інстытут канчала. Але кнігамі ніхто так не цікавіўся, як сам доктар. Зайду да яго, ён усё кідае, бяжыць да мяне. «Міхасёк, што прынёс?» Зыркае вачыма з-пад акуляраў, сам лезе ў маю сумку, дастае кнігі. І плаціць... Колькі скажаш, столькі і плаціць. І сядзіць пасля, кожную кніжачку гартае, гладзіць, быццам жывое што. «У-ум, кніга! З усіх цудаў самае вялікае цуда — кніга!» А жонка доктарава паглядзіць так ласкава на мяне, скажа другі раз: «Ты б, Міхасёк, можа, што цікавейшае пашукаў... Скажам, пярсцёнак, японскі парасон ці вазу... Я заплаціла б!» — «Не мая парафія, Яўгенія Парамонаўна. Я кніжнік. І толькі».— «Усе вы кніжнікі, а мне вазу з чэшскага шкла вунь як хочацца мець!» І пойдзе. А дачушка ні тым, ні другім не цікавілася. Яна вечна ля тэлефона сядзела, дзяўчатам, хлопцам званіла. Вядома,

можна было б і мне паспрабаваць закінуць вуды. Дача, машына, кватэра, бібліятэка, цесцеў і цешчын аклады... Словам, сыценька, утульненька жылося б. Плаваў бы як сыр у масле. Але... Думкі ў мяне наконт жаніцьбы ёсць. Таму глядзеў я на доктараву дачушку, не раўнуючы як кот на сала, а каб асмеліцца на што... Не, так і не асмеліўся.

Сярод маіх знаёмых і пісьменнік адзін ёсць. Ён вершы найбольш піша ды п'есы. П'есы яго ідуць у многіх тэатрах, грошай ён таксама мае, дай Бог мне столькі мець. Ды і не толькі мне, а і кожнаму. І задумаў гэты паэт-драматург сабраць нанова сабе тую бібліятэку, якую да вайны ён меў і якая загінула ў акупаваным Мінску. Нават у парадку тым самым, што да вайны ў яго быў, кнігі расстаўляў. А бібліятэка ў яго была — ого-го-о! Каталог, інакш спіс той бібліятэкі ў яго захаваўся, паказваў ён мне яго. Усе кнігі Гумілёва, Белага, Ахматавай, Гіпіус, Пільняка, Розанава, Айхенвальда... Паспрабуй сёння знайдзі тыя кнігі! Ездзіў гэты паэт-драматург у Маскву, Ленінград, хадзіў па букіністычных магазінах, бываў на чорных рынках. Сёе-тое прывозіў. Але тырчаць на чорным рынку яму, сівавалосаму, непрыемна было — як-ніяк, фігура прыкметная, вядомая. То ён надумаў мяне ў Маскву і Ленінград пасылаць. Дарожныя выдаткі на сябе браў. Плаціў і за гасцініцу. Даваў і два шэсцьдзесят сутачных. Зусім як дзяржаўная камандзіроўка. І абавязак мой адзін — пабываць у букіністычных магазінах, пастаяць на чорным рынку. Тое, што патрэбнае паэту-драматургу трапіць на вочы,— забраць. Растрачу грошы, званю ў Мінск. «Так, маўляў, і так, падмацунак трэба. Сёе-тое можна набыць». Іду назаўтра на паштамт, пераводзік ляжыць — тэлеграфны. Зноў хаджу па букіністычных магазінах, зноў сустракаюся з чарнакніжнікамі. І, вядома ж, бяру кнігі не толькі для паэта-драматурга, а і для іншых знаёмых сваіх. Прыеду ў Мінск з Масквы ці Ленінграда — рукі ў мяне адрываюць. Толькі ж і я паразумнеў. Не адразу нясу чалавеку ўсе патрэбныя яму кнігі, якія ў мяне ёсць, а па кніжачцы цыркаю. Маўляў, вазьміце вось гэтую... «А яшчэ я бачыў такую — і называю кнігу, якая ў мяне ўжо ёсць.— Колькі б за яе вы далі?» Чалавек, вядома, хоча мець і гэтую, і тую кнігу... Таму плаціць, не вельмі скупячыся. Ніколі ў мяне асаблівай цягі да грошай не было, а тут і я смак у грашах адчуў.

Ага, дык, значыцца, я вяду думку пра кнігі і кнігалю-

баў. Што найбольш мяне здзіўляе, дык гэта тое, што мала хто з маіх знаёмых кнігі тыя, што я яму насіў, чытаў. Купіць, паставіць на паліцу — і ўсё. Не, не ўсё. Яшчэ са свайго спісачка выкрасліць — такой кнігі яму шукаць не трэба. Дзеля гэтага выкрэслівання, бадай што, і шукаецца кніга. Іншы раз нават крадзецца з дзяржаўнай бібліятэкі, дзе кніга гэтая вунь як патрэбна! І вучоным, і студэнтам. І вось, ходзячы гэтак з кватэры ў кватэру, сустракаўся я з рознымі людзьмі. Як правіла — цікавымі, арыгінальнымі. І нарэшце натрапіў на такога кнігалюба, які ўсё ж чытае кнігі. Ды яшчэ як чытае! Ноч спаць не будзе, калі трапіць у рукі цікавая кніга. Праўда, купляць гэты чалавек кнігу не можа — няма за што. Чалавек хворы, прыкуты да ложка. Яму плацяць пенсію, невялікую, на яе ён сяктак і жыве. Даглядае чалавека сястра. Сястра замужам, мае дзяцей. Прыбяжыць да брата, пакорміць яго, у кватэры прыбярэ — і пабегла. І кніга для Рыгора Апанасавіча — так завуць таго чалавека — не проста кніга, яна адкрывае яму акно ў свет, памагае жыць, цярпець боль. І я пачаў часцей і часцей заходзіць да Рыгора Апанасавіча. Як што цікавае, рэдкае дастану, нясу яму. Ён прачытае, тады я забяру кнігу, прадам. І сустрэчы з гэтым чалавекам, размовы з ім адкрылі мне вочы на многае ў жыцці. «Браце ты мой, няўжо табе варта было вучыцца, заканчваць універсітэт, каб стаць самым звычайным спекулянтам, дзялком? Добра, каб хоць кнігу ты насіў тым людзям, каму яна трэба. А то ж мяшчанам... Паставіць мешчанін кнігу за шкло, схавае яе ад людзей на дваццаць — трыццаць гадоў. Словам, пакуль не памрэ. Падумай — ці дзеля таго пісаў аўтар, ці дзеля таго сляпілі вочы наборшчыкі, ці дзеля таго выдавецтва выдавала кнігу, каб нейкі ідыёт паставіў яе сабе на паліцу, за шкло, і любаваўся ёю? Калі чалавек здымае з абароту грошы, хавае іх тысячамі дома, яго за гэта караюць. А кнігі? Кнігі, аказваецца, можна здымаць з абароту тысячамі — і за гэта нічога чалавеку, гэта можна. Вядома, ёсць людзі, якія працуюць з кнігай, якім кніга трэба, як паветра. Такому мець бібліятэку ў хаце, патрэбную бібліятэку не грэх. Але колькі такіх? Астатнія ж... проста бяруць кнігу, бо модна мець яе ў хаце. Цяпер людзі пачалі добра жыць, маюць асобныя, прычым вялікія кватэры. Вось і застаўляюць, хто чым... Хто посудам, хто — кнігамі...» Але пра мае сустрэчы і размовы з Рыгорам Апанасавічам потым, пазней, не сёння. Сёння нешта пацягнула мяне ўспомніць дзяўчат, з якімі я быў... Ну, не

толькі знаёмы, а і... Мог з каторай і жаніцца. Бо я ж яшчэ і цяпер нежанаты, халасцяк. Ага, халасцяк. І жаніцца пакуль што... Не, не збіраюся.

## Чаму я халасцяк?

Калі б хто раней спытаў у мяне пра гэта, я ведаў, што адказаць: «Адчапіся, мне не да таго. Пражыць бы якнебудзь, звесці канцы з канцамі». Аднак жа я закончыў універсітэт, маю спецыяльнасць, працаваў у газеце. Ды і гадоў мне... Словам, не такі ўжо я малады, як быў некалі. Не-не дый чую я: «Ты чаму не жэнішся?» Скрыўлюся, няпэўна махну рукою, ат, маўляў, што тут казаць,— і ўсё. Але гэта... Не адказ. Ва ўсякім разе хоць для сябе, а павінна ж быць яснасць, павінен жа я ведаць, чаму не жанюся. Ну, рос я без бацькі, без маці, словам, не ў сям'і, не адчуваю нават, што такое сям'я. Але ж ці мала хто рос без бацькі, без маці, і большасць потым жэняцца, заводзяць свае сем'і. А я... Як быў адзін, так адзін і застаюся. Значыцца, справа не ў тым, што я сірата, рос не ў сям'і, без бацькі, без маці. Справа ў нечым іншым. А ў чым? У педвучылішчы, універсітэце я бяднячыў, не было ў што добрае апрануцца, не было за што білет у кіно купіць. Нястачы аддалялі мяне ад тых, хто быў багацейшы, хто меў у што лепшае апрануцца, у каго ў галаве, здавалася, іншых думак не было, апрача хіба — як пазбыцца адзіноты, куды б пайсці, дзе б весялей правесці час. Помню, на адным вечары пазнаёміўся я з дзяўчынаю, Міраю,— яна стаяла ля акна і пазяхала. Я падышоў да яе, загаварыў: «Чаго гэта вы так? Не выспаліся?» — «Не, ад суму. Такая маркота гэтыя танцы. Учора танцы, сёння танцы, заўтра танцы».— «Можна і без танцаў весяліцца»,— сказаў я. І дзяўчына пажвавела, крутнула крутымі клубамі. «Вядома, якая будзе прапанова?» Я збянтэжыўся — ніякай прапановы ў мяне не было. Дый што я мог прапанаваць дзяўчыне? Кватэру, рэстаран ці паехаць на сваёй машыне за горад?.. А то яшчэ — падабалася мне ва універсітэце хімічка, Валя. Сустрэну яе — ніякавеў увесь, у роце перасыхала, слова не мог вымавіць. А яна, бялявая, заўсёды прыгожа, з густам апранутая, праходзіла міма, бы пава. Колькі разоў я заварожана глядзеў на яе, вачэй не адрываў. А каб падысці, загаварыць — так і не асмеліўся. Хто быў я? Так, чарвяк не чарвяк, але... і не чалавек, не такі, як усе, ва ўсякім выпадку. Хлопцы-аднакурснікі, калі мы аставаліся адны,

хваліліся сваімі перамогамі. Расказвалі, як яны выпівалі з дзяўчатамі, танцавалі, а потым ішлі з імі ў парк ці ехалі за горад. І сам бачыў я — вопытныя некаторыя хлопцы былі. «Апрастаць дзяўчыну? Трошкі смеласці, трошкі нахабства, ды туману слоўнага пусціць, ачмурыць дзяўчыну прызнаннямі ў каханні... — хваліліся хлопцы.— Да любой падыдзі, пазнаёмся — і вядзі куды хочаш. Пойдзе, як авечка за ваўком». Я маўчаў, не было мне чым хваліцца. І першая жанчына, якая адкрывала мне свае чары, была жонка юрыста. Але там... З маёй нявопытнасцю, неспрактыкаванасцю, каб не праявіла яна знаходлівасці, наўрад ці асмеліўся б я на што-небудзь, наўрад ці было б што ў нас з ёю... Ну, ды пра тое... Словам, маўчок.

У мястэчку, дзе працаваў я ў газеце, пазнаёміўся быў з Тамараю. Ладная была дзяўчына, закончыла медыцынскае вучылішча. Там, у мястэчку, і бацькі яе жылі. Можна было б і прыжаніцца. Але ж одум мяне ўзяў — жаніцца ў мястэчку, гэта значыцца і жыць тут, нікуды не ехаць, завязаць сабе на ўсё жыццё вочы. А ехаць аднаму, пакідаць жонку? Таксама нядобра. Працаваць жа ў раённай газеце... Не, не мог я. І я... Расстаўся з Тамараю, паехаў назад у Мінск. І нават пісьма ні разу Тамары не паслаў. Не хацелася, правільней, патрэбы такой не было — пасылаць. А тут яшчэ жонка юрыста гэтая, з якою зноў я спаткаўся, вярнуўшыся ў Мінск... «Не жаніся, Міша. У цябе вельмі мяккі характар. Вяроўкі з такога жонка будзе віць. А сама... Палюбоўніка сабе знойдзе. Як я вось знайшла. Навошта жаніцца, калі можна і без жаніцьбы жыць...»

Равеснікі мае тым часам займелі сем'і, павыходзілі замуж і равесніцы. А тыя, каго ніхто не ўзяў замуж, і мне не трэба — няма на што глядзець. Людскае забралі, а... Пачаў я да маладзейшых за сябе прыглядацца, спрабаваў то да адной, то да другой заляцацца. Пагаворыш з ёю — і больш сустракацца не цягне. У галаве яшчэ — вецер, зусім уяўлення ніякага пра жыццё, нічога наогул не ведае. Іншае пакаленне, пакаленне, якое не бачыла вайны, голаду, нястач. Такой усё падавай, як кажуць часам, на талерачцы і толькі лепшых гатункаў. Падавай ты, а яна будзе браць, спажываць. Жаніцьба на такой — гэта аддаць апошняе, што ты маеш. Табе ж... Нічога ўзамен... Ад маладзейшых пераметнуўся я зноў да старэйшых. Аказалася, шчаслівых сем'яў мала. І з якой бы жанчынаю я ні пазнаёміўся, хутка выяўлялася: разводная альбо такая, якая жыве з мужам толькі таму, што трэба жыць, няма дзе падзецца.

А каб было... Хоць сёння пакінула б мужа, пайшла б жыць да другога. І ўсякая ахвота прапала ў мяне да жаніцьбы. Вольны вечар, пойдзеш да якой — і... пераначуеш у яе. Уранні кавы вып'еш — і бывай. А заўтра... Да другой. А там зноў успомніш ранейшую, зойдзеш... Што дзіўна — жанчыны рады: не забываеш, успамінаеш, заходзіш. Хоць і не так часта, як мог бы, а ўсё ж... Лепш хоць што мець, чым зусім нічога. Іх таксама адзінота даймае. У каторай дзіця ёсць. А ў каторай жа... І замужам быццам была, і нічога ад замужжа не асталося. Толькі хіба расчараванне, сум... Словам, стаў я нейкім сучасным донжуанам... Кватэрку мне далі, то надта і хадзіць нікуды цяпер не даводзіцца. Самі прыходзяць да мяне. Напіша запісачку — прыйду, маўляў, укіне ў паштовую скрынку. І прыйдзе.

Ёсць ва ўсім гэтым нядобрае штось. Адчуваю я гэта. Але і інакшым ужо стаць... Проста цяжка мне цяпер. Жаніцца, жыць з адной? А з якой? Жанчыны ж вельмі розныя, кожная з сваім характарам, сваімі патрабаваннямі. Адна прыйдзе — пастаў ёй на стол віно, цыгарэты падай, музыку ўключы. І ў ложак... Больш яе нішто не цікавіць. Другая прыйдзе — пакой памые, яду згатуе. Пасядзіць, паплача... І пайшла, нават начаваць не астанецца. А хоць і астанецца, то толькі так, каб душу сваю выліць, расказаць, як пакрыўдзіў яе нехта, як цяжка ёй жыць... Думаю іншы раз — людзям сказалі, што Бога няма, выгналі тых, каму спавядаліся. А ў чалавека бываюць хвіліны, калі хочацца душу сваю раскрыць, паспавядацца. Паспавядаецца чалавек — яму і лягчэй. Памогуць яму ці не — не так і важна. Важна, што ён выказаў тое, што яму балела, што з ім здарылася. І таго — даволі. Асабліва спавядацца хочацца людзям адзінокім, каму і пагаварыць часам няма з кім. Ага, дык паслухаеш-паслухаеш жанчын, вечар, ноч разам правядзеш — і сумна, не па сабе стане, одум возьме. І ў іх радасці, шчасця няма. Хоць і замужам некаторыя, сем'і маюць. А мо... шчаслівыя да мяне не ходзяць? Чаго ім, радасным ды шчаслівым, хадзіць да мяне?.. Не-не дый наваляцца, апануюць думкі: «Не маладзён ужо я... Так і не заўважыш, як жыццё пройдзе, міма пройдзе, паўз мяне, а я... Ні радасці нікому не прынёс, ні ўцехі, ні карысці. Нешта ж рабіць трэба, жыць пачынаць па-новаму. А з чаго пачынаць, як, як жыць?..»

## Рыгор Апанасавіч

Змалку, са школьнай парты, запомніў я: у здаровым целе — здаровы дух. Але гэта не зусім так. Я быццам не хворы, нішто ў мяне не баліць, а дух... нездаровы. А ў Рыгора Апанасавіча дух, дай бог кожнаму, хоць цела... Не пашанцавала яму са здароўем. Закончыў школу, паступіў ва універсітэт. І трэба ж... На другім курсе разбіў яго параліч. Ляжы цяпер, думай, чытай. Каб са мною такое здарылася, здаецца, даўно б не жыў. А ён... Жыве. Раней чытаў, думаў шмат, а цяпер і пісаць узяўся. Не паказвае таго, што піша, пакуль што нікому. «Хай адляжыцца, тады дурнота мая лепей мне самому відна будзе. А там... Пабачым, што рабіць. Не спадабаецца — падзяром. Спадабаецца — яшчэ каго-небудзь папросім пачытаць». Захацеў быў і я здзівіць Рыгора Апанасавіча, прызнаўся неяк яму, што ў аспірантуру надумаў падацца, вучоным стаць. «А што? Другія не лепей за мяне вучыліся, а кандыдаты даўно. Атрымліваюць па дзвесце — трыста рублёў у месяц — і анігадкі. Жывуць прыпяваючы ва ўсякім разе».— «Ну, у навуцы нашай усё ўжо ёсць, толькі цябе і не хапае там,— засмяяўся Рыгор Апанасавіч.— Канешне, чыёсь месца і ты там зоймеш, нейкага сапраўднага вучонага. Ёсць жа недзе такі, але пакольні будзеш ты, то яму... проста месца не знойдзецца. Ён чортведама чым займацца будзе, а ты тым часам будзеш атрымліваць па дзвесце — трыста рублёў і, як ты кажаш, жыць прыпяваючы. А карысць, карысць якая навуцы будзе з цябе? Колькі такіх ужо, як ты, там? Месца вучонага займае, зарплату палучае, а робіць што... Праядае, прапівае дзяржаўныя грошы. Карысьці ж... Як з казла малака». Паслухаў, паслухаў я Рыгора Апанасавіча — і нікуды, ні ў якую аспірантуру не падаваўся. Сапраўды, які з мяне вучоны, калі сам я не ведаю нават, на якую кафедру паступаць. Усе навукі здаюцца мне аднолькавымі, ні да якой асаблівай цягі ў мяне няма. Тысячы кніг праз рукі мае прайшло — і па філасофіі, і па эканоміцы, і па гісторыі, і па фальклоры, і па краязнаўству... А каб захацелася якую-небудзь сабе пакінуць? Пагартаеш, старонку-другую прачытаеш, і... цікавасці няма, думаеш пра тое, каму гэтую кнігу занесці, каму яна патрэбна, хто больш за яе заплаціць. Значыцца, па натуры сваёй я ніякі не вучоны, а збіральнік. Ездзіць, хадзіць, сустракацца з рознымі людзьмі, нешта ў іх выпрошваць, вытаргоўваць — гэта мне заўсёды цікава, гэта мне не надакучае, гэта мая стыхія.

Прызнаўся аднойчы ў гэтым я Рыгору Апанасавічу. А ён: «Дык і займайся тым. Толькі прыватны сектар, вядома, ліквідоўвай, інакш... Атрымаеш пазбаўленне волі, а там, брат, жыццё цябе закруціць. Падабаецца табе ездзіць, хадзіць, шукаць нейкія рэдкасці — то ў музей паступай які. Карысць там з цябе будзе». Падумаў я, падумаў — праўду Рыгор Апанасавіч кажа. Можа, і дрэмле ва мне недзе на сподзе душы музейшчык, няўрымслівы такі шукальнік, Шэрлак Холмс. Пахадзіў я па мінскіх музеях, папытаў, ці нельга дзе-небудзь уладкавацца. Месца, на шчасце, знайшлося. Праўда, зарплата ў музейных работнікаў... Ды што зробіш, абяцаюць, кажуць, павялічыць. Падаў я заяву з просьбай залічыць мяне на працу, спыніў свае вандроўкі па кніжных магазінах, па хатах. Праўда, напачатку вельмі ж мутарна было. Прывык я — як вечар, думаеш, да каго б завітаць. Зойдзеш у хату, пагаворыш з чалавекам, кнігу пакажаш. Глядзіш, вечар і пройдзе. Дый грошы ў кішэню пакладзеш. А дома астанешся, сумна аднаму, хоць вый. А ў галаве... У галаве думкі — дзе б я сёння мог быць, якая размова мяне займала б, колькі рублёў у кішэню палажыў бы. А тут жанчыны яшчэ гэтыя. Прыходзяць, звоняць. Яны адзінокія, а я — халасцяк. І думкі ў некаторых, мусіць,— можа б, як-небудзь прыжаніць мяне. Я не п'яніца, кватэру маю, заўсёды быццам пры грашах... Чым не муж? Церпіш-церпіш, не адчыняеш дзвярэй, дый не стрымаешся, адчыніш. Вечар, ноч пройдзе, а каб карыснае што зрабіў, дык... Паскардзіўся я неяк Рыгору Апанасавічу, расказаў, як жыву. «Нешта ты, хлопец, згубіў. Нітачку нейкую, узяўшыся за якую, мог бы ісці і ісці наперад. Кідаешся ты то туды, то сюды, блудзіш, не бачыш, куды табе трэба далей і што рабіць. Баюся казаць табе, што ты згубіў, дый не ведаю сам жыцця твайго. Адзіная рада — ніхто табе ў гэтым не паможа, памагчы можаш толькі сам сабе. Раю — падумай над многім, многае ўспомні. Прайдзіся па сваіх сцежках-дарожках, па якіх ты хадзіў ужо, падумай, успомні, дзе і што ты згубіў. Пакуль таго згубленага не знойдзеш, жыць табе цяжка будзе. Бо жыццё цябе гоніць па свеце, і ты не сам выбіраеш, куды ісці, а куды цябе штурхае жыццё, туды ты і ідзеш. А так нельга. Трэба мець сваю дарогу, ведаць, што ты робіш і куды ідзеш. І не толькі такі план на сёння мець, а на некалькі гадоў наперад. Інакш... І жыць няма чаго. Не жыццё гэта, а нейкае... непаразуменне. На хлеб ты зарабляеш у музеі, астатняе ўсё забудзь. І на баб таксама на

час забудзь. Збярыся з думкамі, засяродзься ў сабе, перадумай, добранька перадумай тое, што з табою ўжо здаралася, было ў жыцці. Паедзь куды-небудзь. Вырвіся са звыклага, знаёмага, схавайся ў цішыню, у лес». Паслухаўся я Рыгора Апанасавіча, паехаў вось. Хадзіў па лесе, думаў пра сябе, успамінаў многае з пражытага. А потым і запісваць пачаў успаміны свае. Шкадую, што Рыгора Апанасавіча пазнавата я сустрэў. Можа б, ён і памог мне, быў бы тою рукою, якая б вяла мяне па жыцці, паказала б, што рабіць, а чаго не рабіць. Бо аднаму мне... Адчуваю, не выбрацца з тых цянётаў, у якіх я апынуўся. Канешне, жыць так, як я жыў, далей... Але і інакш жыць?..

Трэба, мусіць, перачытаць тое, што пра сябе напісаў, яшчэ і яшчэ раз абдумаць кожны свой крок. Быць таго не можа, каб я не знайшоў сваіх памылак, не знайшоў хоць тых абрыўкаў нітачкі, за якую мне трэба было трымацца, не звязаў тых абрыўкаў зноў у адну нітку, не пайшоў далей роўна, самастойна, добра ведаючы куды я і чаго іду. Выпадковасцей не павінна быць, выпадковасці не павінны збіваць мяне з дарогі. А дарога, тая... Мусіць быць роўная і светлая. Як прамень сонца. Як біты, тораны шлях...

## *ВЕЛЬМІ ПАВАЖАНЫ, ШАНОЎНЫ ПЯТРО ІГНАТАВІЧ!*

*Дзякуй Вам, што не забыліся, помніце і мяне, і маю жонку, і дзетак — Святланку і Петрыка. Калі нішто не перашкодзіць, не затрымае ў Мінску, дык сёлета ўлетку мы прыедзем у ваш лясны край, адпачнём у гаючай цішы хвой, уволю пап'ём сырадойчыку. Жонка мая, Настася Рамана́йна, і дзеткі нізка кланяюцца Вам і Вашай клапатлівай гаспадыні Параскеі Сымонаўне.*

*Што ж да сшытка, які Вы даслалі мне, то я прачытаў усё, што ў ім напісана. Гэта запіскі чалавека, які згубіў галоўнае ў жыцці і хоча знайсці тое, што згубіў. Я паспрабаваў навесці сякія-такія даведкі пра аўтара запісак, Занядбайлу, але... Чалавека з такім прозвішчам няма ў Мінску, не працуе ён ні ў адным з нашых музеяў. Можа быць, што ніякага Занядбайлы і наогул няма і не было. Не, чалавек сам напэўна быў і ёсць, але прозвішча... Прозвішча ў яго іншае.*

*Я даў пачытаць сшытак некаторым сваім сябрам, літаратарам, і яны... Параілі здаць «Запіскі Занядбайлы», як мы ахрысцілі сшытак, у друк, бо тое, пра што ў сшытку напісана, не пазбаўлена цікавасці. Так што калі раптам аб'явіцца ў вашым краі той чалавек, які назваў сябе Занядбайлам, дайце яму мой адрас і папрасіце, каб завітаў да мяне.*

*На тым бывайце, да хуткай сустрэчы!*
*Ваш Дзям'ян Пархвіравіч Капач.*

*Мінск, май, 1974 г.*

# *Не на той вуліцы*

Ёсць людзі, якія вельмі лёгка могуць адмовіць каму б там ні было, хто б і чаго б у іх ні папрасіў, прычым ветліва, з усмешкаю і так, што, нават каб і хацеў — не пакрыўдзішся. Я заўсёды зайздросціў і зайздрошчу гэткім людзям. У мяне самога такога ўмення няма. Адмовіць чалавеку ў тым, што ён просіць, ды яшчэ калі можна тое зрабіць,— не ў маім характары. Гэта ведаюць, і, мусіць, таму маёй слабасцю карыстаюцца, бессаромна навязваюць даволі часта розныя непрыемныя клопаты, даручэнні. І я, замест таго каб карпець над нечым сваім, увесь час толькі тым і займаюся, што хаджу, уладкоўваю чужыя жаданні і просьбы. Здаецца: ну вось, зраблю гэта — і буду ўжо вольны, нікому больш нічога не вазьмуся памагаць. Але мінае дзень-два, знаходзіцца такі чалавек, якому я ніяк не магу адмовіць, і ён зноў узвальвае мне на плечы ношку сваіх клопатаў. З-за гэтага ў мяне з жонкай не-не дый успыхваюць спрэчкі; жыву я бедна, без лішняга рубля ў кішэні. Варта толькі дзе-небудзь атрымаць грошы — я ніколі не данясу іх да хаты — тут жа распазычу. Спаганяць даўгі ў мяне не хапае смеласці. Пра другіх людзей я мяркую па сабе: каб у чалавека было з чаго аддаваць, ён бы аддаў, сам прынёс пазычанае. Калі не аддае,— то, пэўна, няма з чаго аддаваць.

Ды што грошы! Пісьменніку — а я пісьменнік — трэба вольны час. Будзе ў пісьменніка час — будуць у яго творы, а значыцца, будуць і грошы. Калі, вядома, пісьменнік не гультай, не п'яніца. Пісаць, хвала Богу, у нас ёсць пра што. Пісьменнікаў паважаюць, і калі што-небудзь напішаш вартае, часопісы дый газеты ахвотна друкуюць. Так што быў бы толькі вольны час, а ўсё астатняе будзе, абавязкова будзе. У мяне ж праз розныя чужыя просьбы і клопаты якраз і бракуе, ніколі не стае вольнага часу.

Каб у сямейным бюджэце, як кажа мая жонка, было ўсё як мае быць, я змушаны працаваць у рэдакцыі аднаго з нашых літаратурных часопісаў — вяду там аддзел прозы. Праца ў рэдакцыі таксама забірае шмат часу. Трэба чы-

тацъ чужыя рукапісы, рыхтаваць іх да набору, гутарыць са старымі і маладымі аўтарамі, бываць на рэдакцыйных пасяджэннях, ездзіць у камандзіроўкі. А розныя абмеркаванні, вечары, сустрэчы з чытачамі! Ды яшчэ калі прызнацца, што чалавек я кампанейскі, маю многа сяброў і люблю таго наведаць дома, на кватэры, з тым прайсціся па парку ці па вуліцы і пагаманіць, з тым выпіць кубачак кавы ці чарачку каньяку, дык чаго-чаго, а часу ў мяне заўсёды вобмаль, іншы дзень і не прысяду за свой рабочы стол. А што да розных просьбаў, заданняў, то лепш і не ўспамінаць — іх з кожным днём не меншае, а большае.

Вось і сёння, ледзь толькі прыйшоў я ў рэдакцыю, сеў за стол, як да мяне, нясмела пастукаўшыся ў дзверы, не зайшла, а хутчэй, бы мышка, ушмыгнула невысокая ростам, сівенькая жанчынка, у якой я адразу ж пазнаў удаву пісьменніка Язэпа Тарасюка Вольгу Ігнатаўну.

Я вылез з-за стала, памог жанчыне зняць не вельмі новае, пашытае гадоў колькі таму назад яшчэ па той, даўнейшай модзе, з багатым чарнабуркавым каўняром і гузічкамі на рукавах занафталіненае паліто, запрасіў прысесці. Умасціўшыся зноў у сваё старое, рыпучае крэсла, асцярожна, ветліва спытаўся, які клопат змусіў жанчыну пакінуць дамоўку, зайсці да нас, у рэдакцыю.

— Ведаеце,— неяк ураз разгубілася, сумнавата ўсміхнулася тонкімі, сухімі вуснамі Вольга Ігнатаўна,— я даўно... Збіралася да вас...

— Праўда? То чаму ж не заходзілі?

— Ды ведаеце... Ніяк не асмельвалася. Словам, я асабіста да вас, Адам Іванавіч.

— Да мяне? — здзівіўся яшчэ больш, аж пацепнуў недаўменна плячыма я: што яшчэ за клопат мог быць у гэтай жанчыны, удавы асабіста да мяне?

— Ага, ага, да вас. І вось чаму. Пасля смерці майго мужа...— Вольга Ігнатаўна дастала з сумачкі хустачку, прыклала яе спярша да аднаго, потым да другога вока,— асталося шмат рукапісаў, лістоў, фатаграфій дый рознага іншага... Ёсць нават некалькі нідзе не надрукаваных твораў. І я... Хацела б, каб вы, Адам Іванавіч, зайшлі да мяне на кватэру, паглядзелі, што там ёсць, і далі хоць якую раду, што мне рабіць...

Я насцярожыўся: увага! зноў новы клопат! Вользе ж Ігнатаўне сказаў:

— А чаму менавіта да мяне вы надумалі звярнуцца з такою просьбаю?

— Бачыце,— пачала Вольга Ігнатаўна, зноў вельмі хвалюючыся, аж зніякавела, з твару змянілася, бедная,— па-першае, я вас ведаю. Дый, як мне здалося, Язэп Апанасавіч з усіх знаёмых пісьменнікаў таксама чамусьці вылучаў вас... Часта ўспамінаў, любіў, можа, больш, чым каго. З вамі яму заўсёды было лёгка, у вас з ім быў лад. Я не хацела б, каб у святое святых — яго кабінеце, рукапісах капаўся хто-небудзь чужы, той, хто не разумеў Язэпа Апанасавіча, не цаніў яго. Вы ўжо, калі ласка, Адам Іванавіч, не палічыцеся з часам, не адмоўце мне. Размова ідзе пра памяць чалавека, якім усе мы павінны ганарыцца...

Іншы на маім месцы, відаць, адразу закруціў бы галавою, адмовіўся б, сказаў бы Вользе Ігнатаўне, што разбіраць рукапісы нябожчыка пісьменніка, які б ён ні быў — вялікі ці малы,— не клопат аднаго чалавека, а клопат цэлай камісіі, якую стварае і зацвярджае кіраўніцтва Саюза пісьменнікаў. Аднаму чалавеку, маўляў, рабіць такое нельга; спаслаўся б, урэшце, на сваю занятасць, нейкую выдуманую хваробу, тым болей што сімпатыі да пісьменніка Язэпа Тарасюка і яго твораў я ніколі не меў, і толькі мая слабахарактарнасць, няўменне гаварыць шчыра ў вочы пра тое, што я думаю, давала яму, мабыць, нейкія падставы меркаваць, быццам я люблю яго, цаню. Памуляўшыся трохі, я, як і заўсёды ў такіх выпадках, калі ў мяне пра нешта прасілі, згадзіўся — згадзіўся прыйсці на кватэру да Тарасюкоў.

— Будзьце ласкавы, скажыце толькі, у які дзень і час лепей гэта зрабіць? — спытаў як мага далікатней у Вольгі Ігнатаўны.

— У любы дзень, у любы час,— адказала, прыкметна павесялеўшы, аж вочы на мяне падняла, Вольга Ігнатаўна.— Я дома, амаль нікуды не хаджу. Можаце папярэдне пазваніць. Вядома, лепш будзе, калі прыйдзеце зранку, бо паказаць у мяне ёсць што, на гэта трэба час. І добра было б, каб вы... Не адкладвалі, прыйшлі хутчэй. Сама я таксама нешта пахворваць пачала. Дзяцей у нас няма, таму хацела б даць лад спадчыне. Ці мала што можа здарыцца са мною. Хто тады разбярэцца ў паперах Язэпа Апанасавіча?

— Што вы! — кінуўся суцяшаць я Вольгу Ігнатаўну.— Не панікуйце. Усё будзе добра. Вось пабачыце — будзе добра.

— Каб жа вашы словы ды Богу ў вушка.

І Вольга Ігнатаўна ўстала, паглядзела на павешанае на вешалку сваё паліто, потым на мяне.

— Ну, то вялікае вам дзякуй, не буду забіраць у вас час,— сказала яна і нізка-нізка, неяк быццам нават трохі тэатральна, манерна пакланілася.

Правёўшы Вольгу Ігнатаўну аж на вуліцу, я вярнуўся ў свой кабінет, зноў сеў за стол, дастаў з шуфляды рукапіс аднаго рамана, з якім даўно меў намер пазнаёміцца, прачытаў сказ, другі, і — адвёў вочы ўбок,— мне раптам успомніўся, паўстаў, як жывы, сам п і с ь м е н н і к Язэп Тарасюк — каржакаваты, плячысты, нібыта груба высечаны тапаром з дрэва, акуратна адпрасаваны, зашпілены на ўсе гузікі. З ім, Язэпам Апанасавічам, я пазнаёміўся ўпершыню ў доме адпачынку, што стаіць у лесе кіламетраў за трыццаць ад сталіцы — у Камарышчавічах. Я паехаў туды ўлетку, пасля таго, як прынялі мяне ў члены Саюза пісьменнікаў. Паехаў, каб у цішы і спакоі закончыць аповесць, над якою маракаваў некалькі гадоў і на якую ўскладаў вялікія надзеі. Здавалася, што калі я на такім жа ўздыме, гэтак жа ўдала, як і пачаў, закончу аповесць, то яна прынясе мне імя і павагу. З пісьменнікаў тады я мала каго ведаў, мала хто ведаў і мяне. На знаёмствы са славутасцямі я і цяпер не надта падкі, а тады, у маладыя гады, і зусім іх пазбягаў. Знаёмствы з масцітымі, уплывовымі людзьмі можа памагчы напачатку, каб цябе заўважылі, прачыталі твае творы. Але яно ані не паможа табе ўвайсці ў літаратуру, асабліва калі ў цябе няма нічога за душой, калі ты не ўмееш ці не можаш нічога цікавага, патрэбнага сказаць людзям. Тваіх твораў ніхто за цябе не напіша, ты павінен напісаць іх сам, с а м. І запозненая слава заўсёды больш надзейная, трывалая, даўгавечная, чым ранняя. Ранняя слава звычайна вельмі хутка праходзіць, выпараецца, як выпараецца, скажам, эфір, адэкалон. Творца, які нічога фактычна яшчэ не зрабіў, атрымаўшы славу, як правіла, перастае сур'ёзна працаваць, дбаць пра сваё майстэрства, шукаць. І наадварот — той, да каго слава ніяк не горнецца, працуе, «акі вол», бо спадзяецца, заўсёды спадзяецца: калі не гэтая спроба, дык наступная — наступная! — нарэшце будзе чагосьці вартая. Сам я не мог скардзіцца на лёс. Мае самыя першыя апавяданні былі заўважаны і даволі высока ацэнены. Але тыя апавяданні былі нішто ў параўнанні з аповесцю, якая вынасілася ў мяне ў галаве і якая амаль напалову была ўжо напісана. Гэтая аповесць павінна была — я ў гэтым быў упэўнены —

паказаць усім, які спадзейны талент у маёй асобе прыйшоў у літаратуру, чаго ад яго, гэтага таленту — дакладней, мяне, можна ў бліжэйшыя гады чакаць.

У дом адпачынку я прыехаў перад абедам. Адпусціўшы таксі, стаяў нейкі час на абочыне асфальтаванай дарогі, з цікаўнасцю глядзеў на двухпавярховы драўляны дом, які ўвесь, нават некаторыя вокны, быў густа аплецены плюшчом. Вакол дома, пры самых сценах, раслі хвоі, елкі, дубы, бярозы, асіны. Цяпер, у паўдзённую спёку, яны паволі, ляніва гайдаліся сваімі пышнымі зялёнымі вяршалінамі і ціха, вусцішна шумелі, гулі. Пахла нейкімі не вядомымі мне кветкамі, сухім, нагрэтым дрэвам, прэллю, смалою.

«Нічога сабе мясцінку выбралі пісьменнікі,— падумаў я.— Працаваць тут, відаць, можна».

І спрытна, лёгка ўзбег на скрыпучыя драўляныя прыступкі ганка, адшукаў сястру-гаспадыню — маладую і аж занадта ветлівую,— і тая завяла мяне ў светлы, сонечны і даволі прасторны пакой, які быў на другім паверсе, папярэдзіўшы, каб я не бавіўся вельмі, а спяшаўся ў сталоўку абедаць.

— Гэта далёка? — спытаў я.

— Ды не, недалёчка. Хадземце, калі ласачка, я пакажу.

І я, паставіўшы на нядаўна памытую, дзе-нідзе яшчэ нават мокрую падлогу сумку-чамадан, прымкнуў дзверы і, як кажуць, з карабля на баль, заспяшаўся разам з сястрой-гаспадыняй у сталоўку.

Сталоўка і праўда была «недалёчка», праз лясок, на невялікай паляне. Сеўшы за той стол, на які мне паказалі, я даволі хутка справіўся з ядою, бо і першае — шчаўе, і другое — шырокая, што лапаць, адбіўная, былі смачныя, у меру пасоленыя. Выпіўшы шклянку халоднага, аж зубы нямелі, кампоту, я падзякаваў афіцыянтцы, якая падавала мне абед, і пакінуў сталоўку — звычайную сялянскую хату, толькі хіба што з прасторнай зашклёнай верандай. І спыніўся на ганку, пачаў глядзець, як пісьменніцкія дзеці кормяць сабак, што невядома адкуль — потым я даведаўся, сабакі прыблудныя, проста жывуць пры доме адпачынку — збегліся да сталоўкі. Сабакі былі гладкія, лянівыя, хлеба і бульбы не елі, нават не нюхалі, чакалі, калі ім вынесуць смажаную альбо вараную курыцу, катлетку, біфштэкс. І дзеці выносілі. Мяне, сына вёскі, які перажыў вайну і голад, гэткая распуста злавала. «Ыч ты,— думаў я,— выходзіць, можна спесціць не толькі чалавека, але і сабаку...»

Дзверы сталоўкі адчыніліся, выпусціўшы каржакаватага, плячыстага чалавека, апранутага ў белы — дарэчы, тады яшчэ трохі модны — палатняны гарнітур. У руках у чалавека быў сукаваты яловы кій.

— Што, малады чалавек, на сабачак любуецеся? — сказаў да мяне глухаватым, нейкім, як мне здалося, нутраным голасам чалавек.

— Ды не,— адмоўна хітнуў я галавою.— Проста гляджу, як дармаедаў кормяць...

— А-а! — зарагатаў чалавек.— Гэта праўда, хоць і жорстка. Вельмі жорсткая. Сабака і чалавек — вечныя сябры.

— Я не супраць, каб чалавек і сабака былі сябрамі. Але калі некаторыя песцяць жывёліну, калі гэтая жывёліна... Згадзіцеся — чалавеку такое... Ну, мякка кажучы, гонару не робіць...

— Ваша праўда. Але ж... Мы самі былі дзецьмі... А гэта не проста дзеці, а гарадскія. Што з іх возьмеш? Яны рады, бо бачаць жывых сабак, бо сабакі не кідаюцца на іх, не гаўкаюць, не гырчаць, а ляніва ядуць тое, што нехта не даеў. Вядома, нам гэта бачыць дзіўна, бо і ў вас, мусіць, і ў мяне было не такое маленства. Я некалі сам хадзіў з торбачкаю па хатах, прасіў у людзей хлеба... Ды што тое ўспамінаць! Хвала Богу, яно мінулася і ўжо не паўторыцца. Ніколі не паўторыцца! А вы... Хто самі будзеце? — спытаў мяне, гэты раз больш уважліва, зацікаўлена чалавек.— Пішаце?

— Ды быццам пішу...

— І друкаваліся?

— Кніжка апавяданняў выйшла.

— Выбачайце, прозвішча ваша?

— Калінка. Адам Калінка.

— А-а, вельмі прыемна,— падаў мне руку — мяккую, вялую, зусім не мужчынскую, а нейкую нібыта жаночую — чалавек.— Гэта вас нядаўна ў Саюз прынялі? Як жа, ведаю, кніжку вашу чытаў. Нават заўвагу хацеў бы вам зрабіць. У адным апавяданні вы пішаце, як ваш герой збірае баравікі, вырывае іх з коранем і толькі тады абразае. Трэба, каб герой не вырываў баравікоў, бо парушаецца грыбніца. Лепш зрэзаць грыб на корані...

Праўда, было ў мяне такое ў апавяданні.

— Бачыце,— пачаў я, адчуваючы, што чырванею, апраўдвацца.— У нас, на Палессі, адкуль я родам, у лесе вельмі багата грыбоў. І ніхто не задумваецца над тым, як

іх браць — вырываць грыбы з коранем ці лепш зразаць не вырываючы. Я ішоў за фактам, за жыццём...

— А нехта прачытае ваша апавяданне і таксама тое ж будзе рабіць. Кніжка выдадзена ў тысячах экземпляраў, яе будуць чытаць тысячы людзей. І гэта варта помніць. Трэба пісаць, каб людзі вучыліся. Вучыліся не благому, а добраму. Ды гэта я так, у парадку сяброўскай крытыкі. А наогул кніжка ваша мне... Гм-гм... З вас можа вырасці пісьменнік. Калі, вядома, будзеце менш увагі звяртаць на дробязі, так званыя дэталі, якія чамусьці надта ж падабаюцца крытыкам, а будзеце з жыцця браць значнае, вялікае. А мяне... Вы ведаеце? — паглядзеў, неяк часта плюскаючы вачыма, быццам ад сонца, мне ў твар чалавек.

Я паціснуў плячыма.

— Не, на жаль, не ведаю.

— Яно і не дзіўна,— сказаў, самаздаволена ўсміхаючыся, чалавек.— Апошнія два гады я праседзеў у Крыме. Нешта з горлам не зусім у парадку. Дый раман канчаў. Я — Язэп Тарасюк.

Што ёсць, жыве такі пісьменнік — Язэп Тарасюк,— я ведаў. Чытаў нават дзве ці тры яго кніжкі. Праўда, уражання на мяне ні адна з іх не зрабіла. Напісаны кнігі былі суха, нецікава, без усякага артыстызму, смеласці, чым я тады вельмі ж захапляўся. Адна кніжка была, помніцца, пра вайну, правільней, партызанскі атрад, другая — пра калгас, пра тое, як брыгадзір вывеў брыгаду з адсталай у перадавыя, потым зазнаўся, зблытаўся з удавою, пачаў піць... У Язэпа Тарасюка былі і п'есы, якія чамусьці не ставіў ні адзін тэатр, пісаў ён і вершы. Вершаў Тарасюковых я таксама не чытаў, толькі чуў, як маладыя паэты іншы раз пацяшаліся, кпілі адзін з аднаго: «Ну, брат, зусім, як у Тарасюка!» — што значыла: горш, каб і хацеў, не напішаш...

— Можа, пройдземся,— прапанаваў раптам Тарасюк, паказваючы кіем на дарожку, што ад сталоўкі вяла ў цёмны стары ельнік.

— Можна,— згадзіўся я.

Была самая гарачыня, сухі, бязветраны жнівеньскі поўдзень. Сонца стаяла проста над галавою і пякло, пякло — аж смаліла. Але ў засені хвой і елак, пад навіссю густога зялёнага голля спякота не так адчувалася, дыхалася лёгка. Прысыпаная спрэс рыжай шчаціністай іглічай дарожка, на якой то тут, то там выпірала вузламі абабітае, абадранае і ўжо засмоленае карэнне, бегла паволі ў глыб

ляснога абшару, спярэшчанага ўсюды лапінамі святла, ценямі дрэваў. І мы спакваля ішлі па гэтай дарожцы і, помніцца, гаварылі пра жыццё, літаратуру. Гаварыў, вядома, больш Язэп Апанасавіч, я ж слухаў, устаўляючы па слову-два.

— Дык вы, значыцца, захацелі стаць пісьменнікам! Што ж, гэта таксама прафесія. Хоць, праўда, і не такая прывабная, як некаторым уяўляецца. Прэміі, званні, ордэны, кнігі, слава! Гэта адзін бок, як кажуць, медаля. На другім жа — праца, барацьба. Адзін твор прызнаецца за шэдэўр, другі адразу ж, ледзь толькі надрукуеш, адрасуюць у Лету, пішуць на яго эпіграмы, пародыі. Потым, праз нейкі час, усе бачаць, што той твор, які аб'яўлялі шэдэўрам,— зусім не шэдэўр, а звычайная аднадзёнка. І наадварот, адрасаваны ў Лету твор раптам пачынаюць падымаць, раптам пачынаюць бачыць, што ў ім многа цікавых думак, што ён адлюстроўвае час і па форме таксама наватарскі. Наогул, сучаснікі ніколі правільна не ацэньвалі той ці іншай літаратурнай з'явы, таго ці іншага пісьменніка. Успомніце Пушкіна, таго ж Гогаля, Ляскова, Чэхава... Таму наша справа, справа сапраўдных пісьменнікаў — не ўнікаць у ацэнкі, не спрачацца з крытыкай, а пісаць. Пісаць штодзень, да змогі. Не прызнаюць, не ацэняць пры жыцці, ацэняць зробленае табою пасля смерці. Гэта як бы наказ вам, маладому...

Я не зусім згодзен быў з Язэпам Тарасюком.

— Не ўсіх пісьменнікаў крытыка недаацаніла пры жыцці. Многіх пераацаніла, а сяго-таго ацаніла і па-належнаму. Скажам, і пры жыцці Льва Талстога было вядома, што ён — геній, гэтак жа, як і пры жыцці Дастаеўскага, Тургенева, нашых Купалы і Коласа было вядома, што гэта — вялікія пісьменнікі.

— Не адмаўляю. Было, што крытыкі памыляліся, было, што і не памыляліся. Я кажу пра крытыкаў у тым сэнсе, што нам, пісьменнікам, трэба не зважаць на іх, на тое, што яны гавораць пра нашы кнігі, а працаваць, пісаць творы. Чым больш мы напішам, тым лепш. І нам, пісьменнікам, і чытачам.

Я пакруціў галавою, усміхнуўся.

— Што, вы не згодны?

— Што нам трэба пісаць больш — можа, і праўда. Але, як мне здаецца, трэба не забываць і яшчэ пра адно — пісаць як мага лепш. Добра напісаная адна кніга Грыбаедава, Гаршына і нашага Максіма Багдановіча асталіся

ў літаратуры, у той час, як дрэнна напісаныя дзесяткі раманаў Вярбіцкай, Патапенкі ды і іншых ім падобных памерлі раней за іх аўтараў.

— І тут я з вамі згодзен. Але назавіце мне пісьменніка, які можа пісаць добра, а піша знарок дрэнна? Кожны працуе ў меру свайго таленту, кожны хоча пісаць як найлепей. Зусім іншае — не заўсёды аднолькава ва ўсіх выходзіць. Добра напісанае адным другому здаецца не зусім добрым. Наогул, літаратура — вельмі складаная штука. Я ў ёй больш за трыццаць гадоў, а так і не разабраўся, чаму адны творы прызнаны класічнымі, чаму адных пісьменнікаў вывучаюць у школах, у інстытутах, а другіх лаюць ва ўсіх крытычных аглядах і рэцэнзіях. Асабістыя сімпатыі крытыкаў? Пасада, якую займае сам пісьменнік? Уменне таго ці іншага паставіць сябе, як кажуць, прадаць даражэй? Другі раз задумаюся над усім гэтым, і сумненне возьме — а мо не трэба было мне ісці ў літаратуру? Я ж быў некалі нядрэнны дырэктар рэстарана... Жыў — дай Бог усім так жыць. Качаўся, як сыр у масле. Любіў, канечне, кнігі. У рэстаран заходзілі часта пісьменнікі, чыталі свае вершы, крычалі аднаму: «Бездар!», другому: «Геній!» Я падсеў неяк да пісьменніцкай кампаніі, прачытаў ім свае вершы. Іх пахвалілі. І гэта вырашыла ўсё. Я перастаў займацца рэстараннай гаспадаркай — сядзеў цэлымі днямі і начамі і пісаў. Вершы, п'есы, апавяданні, раманы... Кілаграмы, пуды паперы спісаў... І ўсё ж выбіўся ў пісьменнікі. Некалькі маіх кніжак перакладзена на рускую мову, выдадзены тысячнымі тыражамі. Я сам пабываў у многіх бібліятэках, паглядзеў чытацкія фармуляры. Бяруць мае кнігі, чытаюць. Праўда, калі я аднойчы пра гэта сказаў з трыбуны пісьменніцкага сходу, адзін крытык кінуў рэпліку: «На жаль, у бібліятэчных фармулярах не пазначаюць, колькі чытачоў, беручы кнігі, вяртае іх, не дачытаўшы да канца». Але гэта ад злосці. Наогул, крытыка, хвалячы тэмы, якія я падымаю ў сваіх творах, рэдка піша пра майстэрства, пра мой талент. Але я ведаю: і майстэрства, і талент у мяне ёсць. Кнігі мае па-належнаму не ацэнены, іх ацэняць яшчэ. Я ў гэта веру. А таму, нягледзячы ні на што, пішу. Пішу штодзень. Дзесяць — дванаццаць гадзін сядзець за сталом — гэта мая норма. Іншыя сядзяць за сталом па менш. Але яны рана пачалі пісаць. Я пісаць пачаў пазнавата, калі мне было за трыццаць. Трэба наганяць страчанае. Асабліва цяпер, калі рука ходзіць цвёрда, ёсць яснасць думкі. Адчуваю: пайшла сапраўдная проза,

сапраўдная літаратура. Трэба паднапегчы, каб заткнуць сяму-таму рот, каб кожны пераканаўся, што ў адносінах да мяне крытыка была несправядлівая, памылялася. Але па гэтульк гадзін працаваць — трэба мець не абы-якое здароўе. Запомніце гэта і беражыце яго. Раніцою абавязкова гімнастыка. Прагулкі пасля снедання, абеду і вячэры. Не працаваць па начах. Кампаніі, гарэлка, каньяк — бывайце. Не злоўжываць і жанчынамі. Памятаць заўсёды трэба, што энергіі ў чалавеку не так і многа, яе можна растраціць на што заўгодна, а лепш — на што-небудзь карыснае, патрэбнае людзям. У нас адна ніва, дзе мы можам працаваць не шкадуючы сіл — гэта літаратура. Так, так, літаратура!

— Але ж, акрамя літаратуры, ёсць яшчэ і жыццё,— сказаў я, ніякавата пасміхаючыся, бо, прызнацца, не з усім мог пагадзіцца з Тарасюком; чуць яго думкі мне было хоць і цікава, але і прыкра, асабліва калі Тарасюк хваліў сябе, свае творы, спадзяваўся на пасмяротную славу, вінаваціў ледзь не ва ўсіх грахах зямных крытыкаў.— Жыццё! Яно ж, як хтосьці справядліва заўважыў, даецца чалавеку адзін, толькі адзін раз. Хочацца многа чаго і зведаць, і спазнаць, і ўбачыць. Інакш... І пісаць не будзе пра што, калі не акунешся з галавою ў жыццё, ведаць яго не будзеш. Дый, як пісаў Някрасаў — «поэтом можешь ты не быть, а гражданином быть обязан...».

— Вядома, жыццё трэба ведаць, вывучаць. Але гэта ўжо вам, маладым. Нам, старым, хопіць і таго, што мы ведаем. Назапашана столькі розных назіранняў, хопіць іх да канца дзён нашых! Мы жылі ў даволі складаны час. Рэвалюцыя, грамадзянская вайна, нэп, калектывізацыя, трыццаць сёмы, вайна... Каб апісаць усё гэта — жыцця мала.

— Яно, можа, і так,— быццам згадзіўся і разам з тым не згадзіўся я.— Але каб гаварыць, пісаць пра мінулае, не лішне ведаць і сённяшняе.

— А хто ж яго не ведае? Газеты чытаем, радыё слухаем...

— Газеты і радыё — гэта адно. Але калі я пабываю ў вёсцы, пахаджу па полі, па лузе, па лесе — гэта зусім іншае. Неяк па-новаму адчуеш тады і зямлю, і людзей, што ходзяць па ёй,— кожны са сваёй радасцю і адметным асаблівым клопатам.

— Гэта праўда, і ў калгасах, на заводах трэба бываць. Неяк, гады тры таму назад, быў я на адной чытацкай

канферэнцыі ў рабочым інтэрнаце. Прызнаюся вам: я здзівіўся. Якая адукаваная, таленавітая вырасла ў нас моладзь! І патрабавальная-патрабавальная! Нікому нічога даравадь не хоча. Рад, шчыра рад быў з ёю пазнаёміцца. І з вамі, як прадстаўніком гэтай моладзі, таксама,— спыніўшыся, нечакана працягнуў мне руку Тарасюк.— Вельмі было прыемна з вамі пагаварыць. Аднак жа прашу прабачыць — у мяне рэжым. Трэба абдумаць яшчэ адну сцэну. І — за стол. Так што... Бывайце...

Мы развіталіся з Тарасюком: ён пашыбаваў, размахваючы сукаватым кіем, некуды далей па дарозе, а я... Я павярнуўся і спакваля пакіраваўся назад, у дом адпачынку.

Там жа, у Камарышчавічах, у мяне было яшчэ некалькі прагулянак з Язэпам Тарасюком. І заўсёды, калі б мы ні сустракаліся, ён гаварыў пра літаратуру, пра тыя цяжкасці, якія чакаюць кожнага, хто ступае на пісьменніцкую дарогу, пра тую несправядлівасць у ацэнцы твораў, што пануе ў нашай крытыцы. Мусіць, непрызнанне яго як пісьменніка мучыла Тарасюка, не давала яму спакою, займала яго думкі. Я ўважліва, цярпліва слухаў, як тады мне здавалася, вопытнага літаратара, які дажываў свой век і многа чаго ведаў, помніў. Толькі зрэдку я па сваёй звычцы ўстаўляў у размовах па некалькі слоў, згаджаўся ці не згаджаўся з тым, што гаварыў гэты чалавек. Зноў жа, рабіў гэта я асцярожна, тактоўна, каб не пакрыўдзіць, не ўзлаваць Тарасюка. Нашым размовам пра літаратуру ніхто не замінаў, бо пісьменнікаў у доме адпачынку было мала. Кожны, хто мог, ехаў адпачываць на мора, бліжэй да вады, дзе можна не толькі папрацаваць, але і пакупацца, загарэць. У Камарышчавічы ж на лета ехалі ў асноўным сем'і пісьменнікаў — жонкі, дзеці, цешчы. Ды яшчэ такія пісьменнікі, як мы з Тарасюком. Тарасюку нельга было — не раілі дактары — ехаць за свет, на паўднёвую спёку, а я не ведаў, што можна без папярэдняга заказу набыць пуцёўку куды-небудзь у лепшае месца, чым Камарышчавічы. Помніцца, аднойчы Язэп Тарасюк настойліва пераконваў мяне, што пісаць апавяданні і наогул выступаць у малым жанры не салідна сталаму пісьменніку. З апавяданняў звычайна пачынаюць, але рэдка хто іх піша пад старасць. Раман — вось мара кожнага пісьменніка, вось стыхія сапраўднага мастака, гэтак жа, як мора — стыхія сапраўднага плыўца. У рамане можна многае сказаць, паказаць ва ўсёй паўнаце і велічы падзеі і герояў; раман любяць чытаць, раман ахвотна выдаюць і перавыдаюць.

Нават калі раман і не вельмі ўдаецца пісьменніку, ён не залежваецца ў магазінах і ў бібліятэках на кніжных паліцах. Таму Язэп Тарасюк раіў мне пісаць раманы і толькі раманы.

— А я за аповесць узяўся,— прызнаўся я.

— Аповесць, вядома, лепш за апавяданні, але вы расцягніце яе трохі, і — будзе ў вас раман. Адразу прымусіце паверыць усіх у сябе. Дый не ведаю я добрага пісьменніка, у якога б не было рамана.

— А Чэхаў?

— Чэхаў, вядома, пісьменнік, але паверце — і яму не шкодзіла б мець добры раман. А то ўсе гавораць — Чэхаў, Чэхаў... А што напісаў Чэхаў, не кожны і ведае. Зусім іншае — Дастаеўскі, Талстой, Чорны. Ды гэта класіка. А колькі пісьменнікаў, што не сталі, дакладней, крытыка не залічыла іх пакуль што ў ранг класікаў! І ў кожнага з іх ёсць раманы. Скажам, у мяне — іх ужо ажно тры. Пішу яшчэ. Прызнаюся вам, хачу злучыць свае апошнія раманы ў эпапею, якая будзе складацца з некалькіх тамоў і якая ахопіць увесь перажыты, пройдзены краінаю і мною час — ад рэвалюцыі да сённяшніх дзён. Задача нялёгкая, зойме шмат часу. Але затое і рэч будзе! Можаце падобнае нешта назваць у нашай літаратуры? То-та ж! Серыя раманаў — не адзін раман! Напішу — а тады хай крытыкі што хочуць, тое і гавораць. Я сваё, буду лічыць, зрабіў. Зноў жа — выдаваць эпапею... Спярша адзін раман выдасі, напішаш другі — заадно і першы перавыдасі. Разам з трэцім — зноў і першы і другі ў друк пойдзе. А што гэта значыць? Гэта значыць — залаты дождж, грошы. За апавяданне ці аповесць атрымаеш... Хіба на праезд на гарадскім транспарце ды на чай...— Тарасюк грэбліва зморшчыўся, засмяяўся,— неяк дробненька, хітранька — і хіжа.

— Але ж,— каб перавесці размову з грошай (страшэнна не люблю я, калі пісьменнік гаворыць не пра творы, не пра іх значэнне і якасць, а падлічвае, колькі яму за іх заплацяць) на што-небудзь іншае, пачаў я,— стварыць эпапею, ахапіць такі адрэзак часу — ад рэвалюцыі да нашых дзён,— ці пад сілу аднаму пісьменніку? Вунь некаторыя пра адзін дзень, адну ноч у жыцці чалавека пішуць раманы. А гэта ж — паўсотня гадоў!

— То не пісьменнікі, хто піша раман пра адну ноч ці адзін дзень. То сысуны, яны высмоктваюць раман з пальца. Псіхалагізацыя, унутраны свет, думкі... У маіх раманах на першым плане падзеі, жыццё. Жыццё не аднаго чалавека,

а ўсёй краіны. Пабачыце вось. Хваліцца не буду, але тое, што ўжо я напісаў,— скажу вам... Падабаецца яно мне. Адчуваецца ўплыў вялікай літаратуры!

— Я чытаў у нейкага крытыка, што кожны пісьменнік усё жыццё піша адзін раман. І толькі разбівае яго на некалькі — раманаў, аповесцей і часам апавяданняў.

— Не чытайце вы крытыкаў! Во! — І ён падняў сукаваты яловы кій, пагрозліва патрос ім у паветры.— Ведаеце, чаму я з кіем ніколі не расстаюся? Ды каб сабак і крытыкаў ад сябе адганяць...— І засмяяўся.— Гэта дзеля жарту, вядома. А калі па шчырасці гаварыць, дык апошні выдатны крытык жыў у мінулым стагоддзі. Помніце яго? Пісараў. Больш крытыкаў не было, былі балбатуны, людзі, якія жылі з літаратуры і не адчувалі, што такое літаратура. О, гэта вы малады, не ведаеце яшчэ, што такое нашы крытыкі! Пажывяце — убачыце! Яны з мухі могуць зрабіць слана, і са слана — муху. Словам, выпусцілі джына з бутэлькі, а загнаць назад у бутэльку няма як — бутэльку здалі п'яніцы ў магазін. Ха-ха-ха! — рагатаў Язэп Тарасюк.— Ад пісьменніка, калі ён памірае, хоць нешта, ды астаецца. А што астаецца ад крытыка? Неяк хацелі мы аднаго перавыдаць, нават камісію былі стварылі. Сабралі яго крытычныя працы, перачыталі — і рукамі развялі. Лухта. Устарэла ўсё. А некалі ж ледзь не першы крытык быў, да яго слова прыслухоўваліся. І не адзін прагноз крытыка не спраўдзіўся, ні адна думка не пацвердзілася. Вось так, малады чалавек. А вы гаворыце — крытыкі, крытыкі... Той, хто здатны сам пісаць прозу альбо паэзію, не пойдзе ў крытыкі. У крытыкі ідуць, як правіла, літаратурныя няўдачнікі. Папытайце ў кожнага крытыка: з чаго ён пачынаў? І выявіцца: той — з прозы, той — з вершаў, той — з драматургіі. Яму не ўдалося стаць ні паэтам, ні празаікам, ні драматургам, то ён гатовы любога, хто піша, у лыжцы вады ўтапіць. Не крытык, а зайздроснік, як правіла...

Не шкадаваў у сваіх размовах Язэп Тарасюк не толькі крытыкаў, але і тых, хто працаваў у рэдакцыях і па абавязку службы павінен быў выбіраць да друку лепшае, прымушаць пісьменнікаў дапрацоўваць свае творы, а часам — і зусім бракаваць.

— Іншы маладзён, матчына малако на губах, адкуль яму што ведаць, а патрабуе, патрабуе ад цябе, каб ты і тое, і тое паправіў. Герой, маўляў, не пераканаўчы, сцэна расцягнута, мова газетная, сухая. Дзіўныя, скажу вам,

гэта людзі! Яны чытаюць твор не каб асалоду мець, а каб нешта знайсці, да нечага прычапіцца. І тады, калі знойдуць, радуюцца, як дзеці. Я ж, прызнаюся вам, прымаю твор такім, як ён напісаны аўтарам, недахопаў даўно ўжо не шукаю. А хоць і бачу недахопы, рэдка каму пра гэта цяпер кажу. Навошта? Твор надрукаваны, а адносіны з чалавекам сапсуеш... А то і няма недахопаў, а іх знаходзяць, пальцам паказваюць — быццам знарок робяць, каб цябе зганьбіць, абразіць. Раней я слухаў трохі заўвагі, а цяпер... Маўчу і не бяру на дапрацоўку свае творы. Прынёс у рэдакцыю,— што хочаце, тое і рабіце. Усё адно прыйдзе час, адновяць тое, што скарачалі, надрукуюць мой твор так, як я яго напісаў. Я ў гэта веру! У рэдакцыі працуе, як правіла, па некалькі чалавек. Паспрабуй кожнаму дагадзі. А твор — гэта ж не касцюм. Дый я — пісьменнік, а не кравец, каб падганяць твор пад густ кожнаму. Мілае дзела некалі, у добрыя даўнія часы было — прынёс выдаўцу кнігу, ён купіў яе ў цябе і друкуе без усякіх дапрацовак, так, як яна напісана... А цяпер... Іншы раз так апануюць, так надакучаць, што і жыццю не рад...

Неяк, наслухаўшыся Язэпа Тарасюка, я не ўмоўчаў, сказаў:

— Няўжо пісьменніцкая праца толькі адны непрыемнасці прыносіць?

— Што вы! І радасць, вядома, ёсць. Многа-многа радасці! І калі творыш, пішаш гэтую самую кнігу, і калі бачыш яе выдадзеную, і калі ліст атрымаеш ад чытача, дзе ён цябе хваліць, дзякуе. Адчуваеш тады — недарэмна час змарнаваў, нешта карыснае, патрэбнае людзям зрабіў. Але, павер це мне, радасць была б у пісьменніка куды большая, каб не гэтыя шукальнікі недахопаў — рэдактары, крытыкі. Як авадні, уюцца яны вакол пісьменніка, ныдзьвяць і ныдзьвяць над вухам, а то і кусаюцца, балюча кусаюцца. Выступіць нейкі недацёпа ў друку, папракне ў нечым цябе, на недахопы ўкажа — глядзіш, кнігу тваю не спяшаюцца ў план у выдавецтве ставіць, і ганарар ужо не той, і тыраж... Словам, не было б гэтых шукальнікаў недахопаў — намнога шчаслівей, лягчэй жылося б нашаму брату-пісьменніку...

Успаміны пра Язэпа Тарасюка, пра той першы мой прыезд у дом адпачынку ў Камарышчавічы выбілі мяне са звыклай каляіны быцця і думак. Пасядзеўшы яшчэ трохі за

сталом і адчуўшы, што праца сёння ў мяне «не пойдзе», я схаваў назад у шуфляду рукапіс рамана, які пачаў быў чытаць,— паляжыць, пачакае! — зазірнуў у кабінет да галоўнага рэдактара, спытаў, ці трэба каму-небудзь я сёння. Не, пільна нікому я не быў патрэбен. І я, вярнуўшыся назад у свой аддзел, апрануўся і выйшаў на вуліцу. Была зіма, але не такая, якія звычайна бываюць у нас зімы,— з марозам, гурбамі снегу на кожным кроку, а мокрая, хлюпаткая, з нізкім густым туманам, гразёю на тратуарах — бы ўсё адно восень. Тралейбусы і аўтобусы, як і звычайна ў такія дні, ішлі перапоўненыя,— ніхто не хацеў шлёпаць па гразі, мачыць абутак і адзенне. На тратуарах скрозь стылі брудныя лужы. Ды я і ў такое надвор'е на працу і з працы хадзіў пешкі. Наседзішся дома і ў рэдакцыі за сталом, хоць спіну, ногі разамнеш у хадзе. Ды і паветрам свежым падыхаеш. Таму і цяпер, выкіраваўшыся на цішэйшую, менш людную вулічку, я паволі, апусціўшы галаву, як рабіў гэта зазвычай, пабрыў да свайго дома — ён на Камароўцы, у новым, яшчэ не дабудаваным раёне. Абуджаная ўспамінамі памяць вяртала мяне ў тыя гады, калі я ўпершыню сустракаўся, знаёміўся не толькі з Язэпам Тарасюком, але і з іншымі пісьменнікамі. Быў я тады малады, толькі што закончыў універсітэт. Рэдакцыя рэспубліканскай газеты прапанавала мне, каб я ўзначаліў аддзел культуры. Я з радасцю згадзіўся. Наняў на ўскраіне горада ў драўляным доме пакойчык, перабраўся са студэнцкага інтэрната туды жыць. Будучая мая жонка, Ліна, скончыла універсітэт на год раней за мяне і працавала ў адным з раёнаў на Віцебшчыне. Я сумаваў, нудзіўся па ёй, амаль штодзень пісаў доўгія-доўгія лісты, у якіх прызнаваўся ў каханні, і вазіў іх на паштамт — укінутыя на паштамце лісты даходзілі на суткі раней. Там, на паштамце, я і сустрэў аднаго вечара пісьменніка Пятра Шчарбачэню. Ён, мажны, разы ў два большы за мяне, стаяў у чарзе — пасылаў нейкі пакунак — ці не карэктуру новай сваёй кнігі ў Маскву. Пятра Шчарбачэню я трохі ведаў, сустракаўся разоў колькі з ім у рэдакцыях і на розных абмеркаваннях у Саюзе пісьменнікаў. Быў ён чалавек пажылы, з нялёгкім жыццёвым лёсам. Амаль дваццаць гадоў правёў у Сібіры — у сталінскіх лагерах, потым працаваў бухгалтарам, геолагам і яшчэ Бог ведае кім. Цяпер ён вярнуўся ў Мінск, загадваў аддзелам прозы ў нашым тоўстым літаратурным часопісе. Мы парукаліся са Шчарбачэнем, і ён, тут жа, з ходу, даведаўшыся, дзе я і як жыву,

прапанаваў мне перайсці на працу да яго ў аддзел.

— Зарплата ў нас невялікая,— гаварыў да мяне даверліва, амаль па-сяброўску, бы роўны з роўным, як і заўсёды, дзіўна расцягваючы асобныя словы — «невялі-ка-а-я!» — густым басам Пятро Шчарбачэня.— Але затое будзеце мець час сваё пісаць. Ды і школу добрую пройдзеце. У нас у рэдакцыі працуюць і выдатныя людзі, і пісьменнікі, і вам, маладому, карысна паварыцца ў такім калектыве. Кожны дзень — універсітэт! Да нас заходзяць розныя аўтары, прыносяць вершы, артыкулы, апавяданні, аповесці, раманы, дзеляцца думкамі пра надрукаванае, расказваюць, хто куды ездзіў, што бачыў, перажыў. Словам, у нас цікава. Што ні кажы — кухня, дзе робіцца літаратура...

— А ці спраўлюся? — нясмела папытаў я.

— А чаму ж — справіцеся! Я чытаў вашы апавяданні, вы любіце жывое, гаваркое слова, вока ў вас таксама ёсць, ёсць, пэўна, і разуменне, што такое літаратура. А калі ў чым і памыліцеся,— я ж побач. Заўсёды можна параіцца, узгадніць. Бо праца ў газеце маладому пісьменніку з аднаго боку памагае, а з другога і шкодзіць. Гэта добра, калі малады пісьменнік многа ездзіць, многа дзе бывае, многа чаго бачыць. Але пісьменніку трэба яшчэ і прывучаць сябе глыбока на ўсё глядзець, абдумваць тое, што бачыш, пісаць з павагаю да людзей, з клопатам пра кожнае слова. На жаль, жыццё газетчыка падганяе, трэба спяшацца здаць матэрыял у нумар, папрацаваць над ім як след не хапае часу. Зусім іншае — часопіс. Тут над словам можна і дзень, і два, і тры падумаць. І знайсці якраз тое, якое трэба. Так што вам карысна будзе папрацаваць у нашым калектыве. Падумайце над маёй прапановай і пазваніце мне. А лепш за ўсё зайдзіце ў рэдакцыю. Не адкладаючы на вельмі, мо́жа, нават заўтра ж. Месца ў нас толькі што вызвалілася, я не хацеў бы наладжваць конкурс...

— Дзякую вам, Пятро Пятровіч,— збіты зусім з панталыку такой нечаканай прапановай, сказаў я.— Я падумаю.

— Падумайце. І з розных, як кажуць, бакоў. Пісьменнік павінен пісаць. Лацвей нам, у каго за плячыма жыццё. Папера ёсць, чарніла таксама. Быў бы вольны час! У нас у часопісе вольны час выбраць можна, пачынаем працаваць мы з дванаццатай. Да дванаццаці можна напісацца, аж уваччу цёмна стане. А вы малады, вам не шкодзіла б і ў жыццё трохі акунуцца.

— Дык жыццё мяне, Пятро Пятровіч, быццам само

акунула. Я нарадзіўся на Палессі, перажыў акупацыю. У сорак трэцім годзе тую лясную вёску, дзе я жыў, спапялілі фашысты. Мяне разам з бацькамі пагналі на чужыну. Пабываў я ў лагерах за калючым дротам, зведаў шмат гора. А потым, пасля вайны,— голад, пасвіў кароў у заходніх абласцях Беларусі...

Пятро Шчарбачэня ажно хіснуўся, прысвіснуў.

— А я думаў, адкуль у вашых творах спачуванне да простага люду, такое, я сказаў бы, нават старэчае разуменне чалавечага гора, псіхалогіі. Баяўся, што гэта ўзята з чужых кніжак напракат... Ажно вунь яно што! Тады вам ёсць пра што пісаць! Падвучыцца толькі трэба — як! А ў нашай рэдакцыі гэта зрабіць вы зможаце. Дый надрукавацца будзе лягчэй. Маючы сад, яблык лягчэй з'есці, чым таму, хто гэтага саду не мае. Так што не думайце вельмі, пераходзьце на працу да нас. Мы з вамі пасябруем... Чалавек вы па натуры — гэта адчуваецца — лагодны, памяркоўны, а я... З рознымі людзьмі жыў і працаваў, і не было яшчэ, каб я з чалавекам, вядома, не свіннёй, не паладзіў.

Праз які тыдзень я працаваў ужо ў аддзеле прозы ў часопісе. І першы рукапіс, які трэба было мне прачытаць і ацаніць, варта яго друкаваць ці не варта, быў раман — трэцяя кніга эпапеі — Язэпа Тарасюка. Кладучы мне на стол даволі ёмкую папку, Пятро Пятровіч жартаваў, смяяўся:

— Чаго толькі не бывае! Як казаў Казьма Пруткоў: глядзі і здзіўляйся! Хто мог думаць, што з дырэктара рэстарана, у якім мы калісь у маладосці любілі бражнічаць, Тарасюка, вырасце раманіст. Бывала, калі хлопцы напіваліся да чорцікаў, клікалі да сябе дырэктара, пераконвалі яго, каб ён кідаў сваю работу, браўся пісаць,— маўляў, гэта не так і цяжка, варта толькі захацець стаць пісьменнікам — і станеш. Зерне ўпала не на камень! Мінуў час — і быў дырэктар рэстарана піша не апавяданні, не аповесці, а — падумаць толькі! — э п а п е ю! — Пятро Пятровіч зарагатаў, зарагатаў гучна, аж пасыпаліся з вачэй слёзы.— Як тут не паверыць, што зайца можна навучыць запальваць сернікі, а любога пісара — пісаць раманы...

— Нехта з пісьменнікаў заўважыў, што напісаць добрае апавяданне цяжэй, чым дрэнны раман,— сказаў я.

— Ліха яго ведае, што напісаць цяжэй, што лягчэй. Усё аднолькава цяжка, калі пісаць па-сапраўднаму. І ноч не

адну не паспіш, і з сябрам многія размовы недагаворыш, і лета, вясны іншы раз не ўбачыш. Бо пісанне — гэта работа, страшэнная, катаржная работа. Выціскаеш з сябе ўсё, што можна. Устанеш з-за стала — у бакі водзіць, бы п'янага. Нічога ні есці не хочаш, ні піць; сон не ідзе, гуляць таксама не цягне. Сам не ведаеш, за што ўзяцца. І ў галаве — пустата, туман. Потым хтось адзначыць, што «аўтару ўдаліся» тая ці іншая сцэна, той ці іншы вобраз. А ці зразумеюць, чаго тое каштавала? Паказваць што-небудзь, каб адчуў кожны, хто чытаць цябе будзе,— трэба самому перш за ўсё адчуць, перажыць тое. Гэта зусім не значыць, што трэба спазнаць яго ў жыцці. Пісьменнік — гэта чалавек, які здольны да... За гэтым «да» можна ставіць — каханне, забойства, крадзяжу і гэтак далей. Не тое што на самай справе пісьменнік можа гэта зрабіць, а адчуць тое ж, што адчувае закаханы, забойца, злодзей... Адчуць і паказаць гэта, перадаць словамі. А калі гэтага ў пісьменніка няма, то ён можа і не брацца пісаць. Усё адно нічога ў яго не выйдзе. Талент — гэта не проста прыгожае слоўка. Не, ой не! Талент, казаў Шолам-Алейхем,— як грошы: калі ёсць — дык ёсць, калі няма — дык няма. І нічым, нічым талент замяніць няможна. Працуй, хоць лопні, сотні тамоў напішы, а ўсё адно ў літаратуры цябе як не было, так і не будзе. Як пазнаць талент? У таленавітай кніжцы — гэта як на той пласцінцы, дзе запісана музыка ці песня. Пастаў на прайгральнік — і палілася музыка. Так і таленавіты твор. Быццам прабягаеш вачыма па словах — а ў душы адразу ж ажывае ўсё: бачыш тое, што пісьменнік апісвае, адчуваеш, што адчувае і герой, думаеш так, як думае аўтар. Ты ў палоне, пісьменнік цябе захапіў і вядзе. Далей, далей што?.. Праўда, не кожны чалавек можа адрозніваць таленавітае ад неталенавітага. Ёсць людзі і глухія да літаратуры. Як глухія і да музыкі. Нават выхаванне тут не заўсёды памагае. Быў у рускай літаратуры вядомы графаман граф Хвастоў. Друкуючы свае творы, ён плаціў выдаўцам, а не яны яму. Разарыўся чалавек, так хацеў астацца ў літаратуры. Пушкін адкрыта смяяўся з Хвастова, а той нават не разумеў, што з яго смяюцца. Графаманы і цяпер, вядома, ёсць у нас. Выпуск кніг — вытворчасць. Тысячы друкарскіх машын, ля іх — мільёны рабочых. Плануюцца прыбыткі. Патрэбен рукапіс, каб яго размножыць. Машынам, людзям патрэбна работа. І рукапіс знаходзіцца. Яго напісаў аўтар. Аўтар бывае таленавіты і неталенавіты. Папершае, не кожны адрознівае таленавітае ад неталенавіта-

га. Па-другое, рукапіс бывае ў нейкай ступені патрэбным, карысным грамадству. І ён ідзе ў вытворчасць... Так нараджаюцца неталенавітыя кнігі, пісьменнікі... Дзе ты іх дзенеш! З тым, што яны ёсць, трэба лічыцца. І тут задача вялікая крытыкаў: адрозніваць таленавітае ад неталенавітага, адно залічаць у літаратуру, другое не залічаць. На жаль, крытыка таксама не заўсёды аказваецца на ўзроўні. Глухія да таленавітага бываюць не толькі чытачы, але часам і крытыкі. Тут адукацыя не памагае, сляпога, як бы ты ні хацеў, не зробіш відушчым. Наша задача, задача рэдактараў,— адрозніваць таленавітае ад неталенавітага, ведаць, што мы друкуем. На тое мы тут і пастаўлены, за гэта нам плацяць грошы. Мы, як тыя дэгустатары, павінны адрозніваць маркі він... Праўда, і гэта я ведаю са свайго вопыту, іншы раз не варта паддавацца настрою, трэба не спяшацца з канчатковымі вывадамі. Перш чым нешта гаварыць аўтару, не шкодзіць добра самому падумаць. Аўтар працаваў над сваім творам гадамі, а мы чытаем яго ўсяго некалькі дзён. І, вядома ж, аўтар больш над творам думаў, чым мы. Вось так, Адаме, Вы можаце цяпер сказаць: сарвалі мяне з газеты, а цяпер палохаеце работай у часопісе... Не, я не палохаю, я проста хачу прывучыць глядзець на ўсё глыбака, шырака. І каб у нас не было нейкай асабістай да каго б там ні было прыдзірлівасці, сімпатый і антыпатый. Паверце мне: я буду ад душы рады, калі Язэп Тарасюк напісаў што-небудзь сапраўднае, вартае. Хоць прымірыцца з гэтым мне будзе цяжка, бо давядзецца паверыць: і неталенавіты чалавек можа напісаць добра. А такога я яшчэ не сустракаў. Ды што я гавару, зусім Вас замучыў. Чытайце раман, здыміце, як кажуць кухары, першую пробу...

«Зняць першую пробу? Адрозніць таленавітае ад неталенавітага?» Правільна ацаніць, чаго варты твор, разабрацца, што за раман напісаў Язэп Тарасюк, калі сам я не напісаў яшчэ ні аднаго рамана?»

У тыя першыя дні маёй працы ў часопісе я вёў дзённік. Занатоўваў у агульны сшытак свае і чужыя думкі, тое, чым я жыў, што мяне асабліва тады хвалявала.

І каб узнавіць хоць у нейкай ступені перажыванні, настрой тых не такіх ужо і блізкіх дзён, я, вярнуўшыся з рэдакцыі дадому, у сваю кватэру, дастаў даўні агульны сшытак у чорных дэрмацінавых вокладках, пачаў чытаць. Вось што было запісана там пра раман Язэпа Тарасюка...

...Другі дзень чытаю раман Язэпа Тарасюка з цыкла «Век». І другі дзень не знаходжу сабе месца. Мяне аж калоціць усяго. Як можна так пісаць? Мова газетная, мёртвая, сухая — не праглынуць, перасядае комам у горле. Нехта вучыў — каб праверыць, якая проза, трэба пачытаць яе ўголас. Дрэнную прозу ўголас чытаць нельга. Дзе там уголас, моўчкі чытаць нельга. Герояў няма. Усе людзі — схемы, прычым на адзін капыл, гаворацъ — не разбярэш, дзе хто. Героі толькі названы, але ні адзін з іх не паказаны, не раскрыты. Яны не запамінаюцца, бо не маюць адметных рыс, уласцівых таму ці іншаму чалавеку. Што ўжо ўспамінаць пра абагульненні нейкія, тыпы! Аўтар нічога нікому не даводзіць, проста піша. Кампазіцыі ў пэўным разуменні гэтага слова няма — сабраліся людзі ў адно месца, пагаварылі; сабраліся ў другое — таксама пагаварылі. Нішто не падпарадкавана задуме, логіцы развіцця вобразаў. Проста набор выпадковых сцэн, фактаў, эпізодаў. Аўтарскі тэкст — з газет, энцыклапедый, розных даведнікаў, успамінаў. Тэма адказная — калектывізацыя. Пра гэта напісаны творы Шолахава, Твардоўскага, Чорнага, Зарэцкага, Стэльмаха, Залыгіна, Мележа. Навошта пісаць яшчэ, калі не можаш сказаць новага, таго, чаго да цябе ніхто не бачыў і не гаварыў? У рамане — 459 старонак! Але іх магло быць і 100 і 1000! Матэрыял жа нескампанаваны, сюжэтных ліній ніякіх няма. Няма і падзей. Адны хочуць ісці ў калгас (беднякі), другія не хочуць (кулакі), трэція вагаюцца (серадпякі). Героі — не творцы часу, а прыдаткі. Яны не маюць свайго ўнутранага жыцця, думаюць толькі пра калгас і больш ні пра што. Не разабраць — дзе той ці іншы герой: у хаце, на двары ці ў полі. Усё, як у тумане. Мільгаюць прозвішчы, але ні аднаго героя я не ўяўляю, не бачу. Што мне сказаць загадчыку аддзела і самому аўтару? Раман друкаваць у такім выглядзе ніяк нельга. Вось мая думка.

...Каб не памыліцца ў ацэнцы трэцяй кнігі эпапеі, я прачытаў першую і другую. І — уга! — разгубіўся яшчэ больш. Бо тыя кнігі не лепшыя. Аднак жа надрукаваны! Надрукаваны ў нашым часопісе, выдадзены кожная асобна ў выдавецтве. Вось як! А я збіраюся бракаваць. Трэба сказаць пра ўсё Пятру Пятровічу, параіцца з ім. Наогул, лепш бы я не пераходзіў у часопіс. Ламай цяпер галаву, думай, як быць. Свайго, вядома, не пішу. Як пісаць, калі

думкі заняты зусім іншым. Каб хоць я багаж літаратурны меў, было б, можа, лягчэй. А то — хто я? Хіба той жа Язэп Тарасюк паверыць мне, хіба ведае, што я маю нейкі густ, разумею, што такое літаратура. «Маладзён, што ты мяне вучыш! Якое ты маеш маральнае права?» Гм, гм, ускочыў я, не раўнуючы як тая рыба ў нерат: ні назад, ні наперад.

...Сёння гаварыў пра раман Язэпа Тарасюка з загадчыкам аддзела Пятром Пятровічам Шчарбачэням. Шчыра, не таячыся выказаў яму свае меркаванні.

— Хе-хе! — дабрадушна засмяяўся Пятро Пятровіч.— І што ты думаеш далей рабіць?

— Не ведаю,— прызнаўся я.

— На добры лад, табе трэба было б усе свае заўвагі выказаць аўтару.

— Ці паслухае ён мяне?

— А гэта ўжо яго клопат. Не паслухае — мне давялося б умяшацца.

— Дый... Раман бракаваць трэба. Я не бачу, што там і як можна паправіць.

— Тэ-экс! — грузна, задуменна, без ранейшай весялосці паёрзаў на сваім загадчыцкім крэсле Пятро Пятровіч.— Выпадак не з лёгкіх! Няхай, дзе маё не прападала, прачытаю. Давай сюды рукапіс.

Рукапіс, вядома, я з радасцю аддаў...

...Я — ні жывы ні мёртвы. А што, калі памыліўся, не зразумеў, няправільна ацаніў раман Язэпа Тарасюка? Што, калі мая думка не супадзе з думкай Пятра Пятровіча? Даказваць яму сваё, пераконваць? Ці выслухаць загадчыка, згадзіцца з ім? Але ж тады трэба будзе рукапіс рыхтаваць да друку! А як я магу яго рыхтаваць? Гэта ж... Дый... Тыя, хто выпісвае наш часопіс, вераць: абы-чаго мы не надрукуем. Надрукаваць слабы твор — гэта падмануць чытача. Колькі людзей схопяцца яго чытаць і будуць расчараваны, будуць шкадаваць патрачанага часу. Пасля таго, як надрукуеш слабы твор, чытачы не будуць чытаць наступных, хоць яны будуць і лепшыя, нават выдатныя,— будуць баяцца зноў памыліцца, марна патраціць час. Час! Час! Яго таксама трэба берагчы, бо вольнага часу ў людзей мала. Ад нас, супрацоўнікаў часопіса, патрабуюць, каб мы правільна ацэньвалі творы, каб не падсоўвалі чытачам замест літаратуры халтуру. Аднак жа пакуль што не трэба

спяшацца з вывадамі. Трэба чакаць. Можа, якраз у Пятра Пятровіча будзе такая самая думка пра раман Язэпа Тарасюка, як і ў мяне.

...Ура! Я не памыліўся, магу адрозніць добрае ад дрэннага. Сёння Пятро Пятровіч — мой загадчык, прыйшоўшы ў аддзел, са злосцю шпурнуў на стол папку з «раманам»Язэпа Тарасюка.

— Такога г... я даўно не чытаў,— сказаў ён, грэбліва моршчачыся.

— Што, раман не спадабаўся і вам? — падбадзёраны словамі загадчыка, асцярожна запытаў я.

— Які раман? Гэта г... Самае звычайнае г... Пцьфу!

І ўжо да самага канца работы пляваўся, лаяў і лаяў Язэпа Тарасюка, яго, з дазволу сказаць, раман.

— Хапае ў людзей нахабства прыносіць такое ў рэдакцыю! Сказа напісаць не можа, а бярэцца за раман, эпапею! Падумаць толькі — э п а п е ю! Гігантаманія карлікаў! Бярэшся за такую тэму, дык ты хоць пачытай, што і як да цябе пісалі. А то... Вылупіць вочы — і піша, піша...

Загадчык хадзіў да Галоўнага, каб выказаць яму свае думкі пра «раман» Язэпа Тарасюка, атрымаць, як ён кажа, «ліцэнзію на адстрэл», інакш — дазвол забракаваць... На жаль, Галоўнага не было ў рэдакцыі — пайшоў на нейкае пасяджэнне ў Саюз пісьменнікаў.

...Сёння Галоўны быў на працы. І мы з Пятром Пятровічам гаварылі з ім гадзіны дзве пра «раман» Язэпа Тарасюка. Больш, вядома, гаварыў мой загадчык. Я ж, як чалавек новы і малады, слухаў і падтакваў. Пятро Пятровіч даволі падрабязна расказаў, пра што раман, як напісаны, што ён, загадчык аддзела, надумаў далей рабіць. Галоўны — чалавек ужо ў гадах, адзін з лепшых нашых паэтаў, чые творы перакладзены на многія мовы і ў нас, у Савецкім Саюзе, і за мяжою,— тактоўна, уважліва выслухаў Пятра Пятровіча, ні разу нават не перапыніў яго.

— Дык што, твая думка бракаваць? — падняў ён нарэшце на загадчыка аддзела вочы — блакітныя, ціхія — як у дзіцяці.

— Ды ўжо ж, давядзецца... Друкаваць такое нельга...

— Ну, што ж, бракуй... Язэп Тарасюк пісаць ніколі не ўмеў і не будзе ўмець. Шкада, але ніхто не сказаў яму пра гэта раней. І нам, людзям маладзейшым, вучыць цяпер яго

пісаць?.. Дык жа не навучыш... Адвучваць? Таксама, мусіць, пазнавата... Урэшце, дзяржава дае яму пенсію, жыві... Хочацца пісаць — пішы. Але не насі абы-чаго ў рэдакцыі. Не адрывай людзей сваёй пісанінай ад работы, не займай іхняга дарагога часу. Ну дык так, дамовіліся, значыцца. Выклікай яго ў рэдакцыю і...

Галоўны падміргнуў сваімі пышнымі, як пераспелы жытні колас, брывамі чамусьці мне. Усміхнуўся лагодна.

— У вас таксама такая думка?

— Ага, такая,— за мяне адказаў Пятро Пятровіч.— Хлопец...— загадчык аддзела не паскупіўся на словы, пахваліў мяне.

— Ну што ж, гэта прыемна,— падняўся з-за стала рэдактар.— Працуйце... Да слова, што ў вас там добрае, што рыхтуеце ў наступныя нумары?

Пятро Пятровіч таксама падняўся, развёў рукамі.

— Пакуль што хваліцца няма чым. Толькі два апавяданні зусім невядомага аўтара, студэнта...

— Гм...

Рэдактар стомлена апусціўся ў сваё рэдактарскае крэсла. Уздыхнуў, загаварыў хутка, горача:

— Здаецца, і Саюз пісьменнікаў вялікі, а запоўніць старонкі часопіса няма чым. Што мы толькі робім, на што марнуем час? Дзе нашыя Бальзакі, Дастаеўскія, Талстыя? Каторы ўжо год быццам жабракі, сядзім на галодным пайку. З рук у кожнага вырываем, давай, давай... Дзе там пра якасць дбаць! Не да жыру, быць бы жыву! Запоўніць бы старонкі!..

— Але,— згадзіўся з Галоўным мой загадчык.— Амаль усе нашы пісьменнікі на пасадах, вольных няма. Вольныя толькі пенсіянеры, такія, як Тарасюк. Пішам урыўкамі, па вечарах... Эх, каб мне вольны хоць год... Быў бы раман... А так чытаю вось, рэдагую такія э п а п е і!

— Ды каб было што друкаваць, чаго ж тут сядзець у рэдакцыі? Здаў нумар — і працуй дома, пішы сваё! Дык жа бачыце...— Рэдактар разгублена абвёў і Пятра Пятровіча і мяне сваімі блакітнымі, задуменнымі вачыма.

— Можа, перакласці што?

— Дык перакладалі ўжо! Адзін нумар пераклад, другі — пераклад. Не, на перакладных далёка не заедзеш! Чытачу хочацца што-небудзь і арыгінальнае, сваё пачытаць. Можа, пазвоніце сяму-таму? Раптам у каго-небудзь ляжыць гатовы раман ці аповесць?

Галоўны зноў падміргнуў брывамі. І зноў чамусьці мне.

Я, здаецца, разумеў Галоўнага, а таму — усміхнуўся.

— У вас, можа, у самога што ёсць? — спытаў Галоўны.

— Аповесць канчаю.

— Канчаеце ці закончылі ўжо?

— Не, не закончыў. Мову трэба правіць, асобныя эпізоды...

— А мы за вас гэта не зробім?

— Не.

— Баіцёся, што сапсуем?

— Не, але я не люблю, калі за мяне хто-небудзь робіць тое, што магу сам зрабіць. Дый... Я ведаю, што трэба і як папраўляць. А вы...

— Мы, вядома, людзі збоку,— засмяяўся весела Галоўны.— Правільна, між іншым, думаеце. Пішыце, працуйце. І не паддавайцеся ніколі ні на якія ўгаворы, не спяшайцеся несці ў рэдакцыю, калі самі адчуваеце, што твор не гатовы, што ў ім можна яшчэ сёе-тое скараціць ці паправіць. Хай вылежыцца, прачытайце яго вачыма староннягa чытача, не як свой, а як чужы... Гэта вельмі карысна, па вопыту ведаю. І пакуль малады, сілы маеце, на пасяджэнні розныя час не траціце — пішыце. Пішыце як найбольш. І, вядома, як найлепш. Не адкладвайце на заўтра тое, што можна зрабіць сёння. Ведайце: больш вольнага часу, як вы цяпер маеце, мець не будзеце.— І ўжо да нас двух — загадчыка і мяне: — Словам, хлопцы, пашукайце, каб было чым запоўніць часопіс, было што здаць у друк... А тады выклікайце Тарасюка, скажыце яму ўсё, што думаеце пра яго раман... Хоць раз, а трэба ж чалавеку праўду ў вочы сказаць...

...Трэці дзень Пятро Пятровіч «сядзіць на тэлефоне». Звоніць празаікам, пытае, можа, у каго што-небудзь ёсць гатовае, што можна было б здаць у друк. Суцяшальнага нічога няма. Сёй-той прынясе праз месяц, сёй-той абяцае закончыць сваю рэч праз два месяцы, тры... А часопіс чакаць не можа — першага мы павінны здаць у набор нумар.

...Зноў гаварылі з Галоўным. Галоўны не траціць пачуцця гумару.

— Шанцуе ж Тарасюкам,— смяецца ён.— І хацеў бы забракаваць, ды не забракуеш. Можа, паглядзіце, хлопцы,

яшчэ раз той опус? Ну назавём яго не раман, а, скажам, хроніка. Скароцім лухту, га?

— Што ты,— схапіўся за галаву Пятро Пятровіч,— такое друкаваць?

— А што тады друкаваць?

У голасе Галоўнага чуўся неспакой.

— Не мы вучылі пісаць Тарасюка, не нам яго адвучваць. Новых бы Тарасюкоў не напладзіць. А гэты... Я вам, хлопцы, яшчэ вось што скажу. Калі б мы і забракавалі Тарасюка, то набраліся б турбот. Тарасюк не з тых, хто свайго не дамагаецца. Гэта з выгляду ён такі... Ціхенькі, мякенькі, хоць да раны прыкладай. А як толькі што не па ім — пачне заявы пісаць. І куды? Ого! Потым ужо не ён, а зверху, тыя, што над намі, будуць патрабаваць склікаць рэдкалегію. Размовы розныя пойдуць... А я... Што тут хаваць... Хапаліся мы з ім... Ды хіба адзін я хапаўся з Тарасюком! Ён на многае прэтэндаваў, пакуль пыху не збілі. Асабліва як смак улады пачуў, у выдавецтве працаваў. А час... Час тады нялёгкі быў. Словам, трыццатыя гады. І Тарасюк спрабаваў скарыстаць яго. Такую дзейнасць разгарнуў, што хоць куды. Усіх, хто яго не лічыў за пісьменніка, не лічыў за пісьменнікаў і ён. Кнігі ў набор здаваў свае і толькі тыя, якія былі не лепшыя за яго пісаніну. Астатнія марынаваў, затрымліваў, даказваў, што іх нельга выдаваць. Чаму нельга? Ды з самых розных меркаванняў, найчасцей, вядома, палітычных. А калі хто не згаджаўся, супраціўляўся, апынаўся... Ды што казаць... А пра крытыку, дык і ўспамінаць не хочацца. За бытнасць Тарасюка ў выдавецтве так ні адна сапраўдная крытычная праца і не пабачыла свету. То крытык разбірае не тыя творы і не тых аўтараў, то дае няправільныя ацэнкі літаратурнаму працэсу... Ну, пацярпелі, пацярпелі такога выдаўца, а як час трохі змяніўся, вызвалілі яго ад пасады. З таго часу Тарасюк і вольны мастак. Пацішэў, палагаднеў, не такі ваяўнічы цяпер, вядома, як быў некалі. Але паспрабуй затрымаць яго твор,— адразу заяву настрочыць, маўляў, помсцяць яму, зводзяць рахункі... Зачапі толькі яго — чаго-чаго, а звягі не абярэшся. Дый задача наша — добрага, таленавітага не трымаць. А Тарасюковы опусы... Было б што друкаваць, няхай, паспрабавалі б зрабіць такое — правучылі б хоць раз Тарасюка. А так... Ну ў крайнім выпадку папракнуць нас, што, маўляў, сыры твор надрукавалі, не папрацавалі як след з аўтарам. Ці скажуць, як аднойчы адзін сказаў мне — маглі лепш адрэдагаваць, ды, мусіць,

паленаваліся. Нічога, хлопцы, не такое перажывалі, перажывём і гэта...

Чуць гэта ад Галоўнага мне было прыкра, хоць, прызнаюся, і цікава — што здарылася, хто паўплываў, чаму раптам ён памяняў сваю думку?..

— Дык жа калі гэты опус надрукуем, Тарасюк праз год прынясе працяг сваёй эпапеі! — усклікнуў Пятро Пятровіч.

— Праз год будзем бачыць, што рабіць. Як кажуць, дасць Бог дзень, дасць і хлеб. А гэты раз... Паклічце Тарасюка ў рэдакцыю, відаць, сёе-тое ён сам паправіць. Астатняе возьмем на сябе. Прапусцім праз свае алоўкі — можа, што-небудзь прыстойнае і будзе.

— Ды нельга, нельга нічога прыстойнага з непрыстойнага зрабіць! — узмаліўся Пятро Пятровіч — аж пабялеў, бедны.

— Сам ведаю, што нельга. Але скажы, што рабіць?

І зноў, цяпер ужо сумна, зніякавела падміргнуў мне.

— Цікавы выпадак. Рэдактар, які разумее, што такое літаратура, замест таго каб змагацца за якасць, прымушае загадчыка аддзела рыхтаваць у набор Бог ведае што, га?

І змоўк, падпёр вялікім, сялянскім кулаком шчаку, засяродзіўся ў сабе.

...Сёння гаварылі з Язэпам Тарасюком. Ніякіх заўваг ён не прымае. Ён напісаў твор і хоча яго надрукаваць без якіх бы там ні было паправак. Недахопаў у сваім творы ён не бачыць.

— Дык мы бачым, — не выцерпеў, раздражнёна выгукнуў Пятро Пятровіч.

— Вы недахопы ў сваіх творах шукайце, а не ў маіх. За свае недахопы я сам і адкажу,— парыраваў Тарасюк.— А потым... Я ж не Леў Талстой, хоць і ў таго таксама некаторыя знаходзяць недахопы... Я пішу — гэта неаднойчы я заяўляў — не для літаратурных снобаў, а для народа. І таму знарок іншы раз апрашчаю сёе-тое, каб мяне разумелі простыя людзі. Я пісьменнік-рэаліст, не цярплю ніякіх мадэрнісцкіх выкрунтасаў. І ясных палітычных поглядаў — падтрымліваю ўсё, што рабіла і робіць савецкая ўлада і партыя. Гэта пара зразумець. І прашу прымаць мяне такім, які я ёсць. Лепшым быць я не магу, дый не хачу. А што да стылю, дык ён у кожнага свой. У вас —

такі, у мяне — такі. Той жа Леў Талстой не прызнаваў Шэкспіра. Дык што, Шэкспіра на сметнік?

Словам, усе нашы довады, што раман сыры, яго трэба правіць, адляталі, як ад сцяны гарох. Ні з адной нашай заўвагай Язэп Тарасюк не згадзіўся, ні адну з іх не прыняў. Правіць, дапрацоўваць раман наадрэз адмовіўся.

— Я не маладзён, падганяць свае творы пад нейчы густ не збіраюся. Заўвагі вашы лічу не прынцыповымі, а гурманскімі, гастранамічнымі...

Пайшлі мы з Пятром Пятровічам зноў да Галоўнага. Той смяецца:

— А вы ж збіраліся бракаваць! Ого, паспрабуй забракаваць такога!..

І, паклікаўшы нас бліжэй, сказаў даверліва, ціха, каб нас ніхто не чуў:

— Як толькі вы пабылі ў мяне, сказалі некалькі слоў пра твор Тарасюка, спакою не маю. Звоняць і звоняць па тэлефоне... І так пры сустрэчах атакуюць. І хто? Каб назваў, прызнаўся вам — не паверылі б... Дык гэта ж толькі збіраліся забракаваць? А каб забракавалі!..

...Не маю часу нават занатаваць што-кольвечы. Сяджу, праўлю «раман» Язэпа Тарасюка. Божа мой, якая катарга! Пасля кожнай папраўленай старонкі ўскокваю з-за стала, аж калачуся ад злосці і гневу. Мала таго, што ніякіх адносін не мае «раман» да літаратуры, дык месцамі не хапае самай звычайнай пісьменнасці. Скарачаю, дапісваю, перарабляю, перастаўляю словы, сказы і сцэны. Пятро Пятровіч даў мне поўную волю — што палічыш патрэбным, тое і рабі...

...Хвала Богу, даправіў апошнюю старонку. Дзіўна, але не звар'яцеў. Моцныя пакуль што ў мяне нервы! Папку з рукапісам аддаў сёння свайму загадчыку. Той узяў яе моўчкі, не падымаючы на мяне вачэй.

...Пятро Пятровіч ходзіць на працу пануры, амаль не размаўляе. Я не пытаю — чаму: ведаю — чытае, правіць «раман» Язэпа Тарасюка. Штодзень прыносіць па некалькі старонак на перадрук машыністцы...

...З машынкі перадрукаваны тэкст чытае стыліст, за ім — сакратар. І ўсе правяць, правяць...

...З 459 старонак стала 216! Але і 216 старонак не Тарасюковы, а мае, Шчарбачэневы, стыліставы, сакратаровы...

...Перад тым як аддаць «раман» Галоўнаму, паклікалі Язэпа Тарасюка ў рэдакцыю, паказалі, што мы агульнымі сіламі зрабілі з яго твора. І Язэп Тарасюк, надзеўшы на вочы акуляры, доўга, уважліва гартаў старонку за старонкай, чытаў, моршчачы лоб, асобныя абзацы. Урэшце, падняўся з-за стала, самавіта сказаў:

— Што ж, як да часопіснай публікацыі можна згадзіцца. Праўда, тэкстолагам потым будзе работы. Давядзецца ўсё аднаўляць!

Божа мой, ён яшчэ спадзяваецца, што над яго «раманамі» будуць працаваць тэкстолагі, будуць нешта аднаўляць!

Язэп Тарасюк згадзіўся, каб твор — мы назвалі яго ўсё ж не раман, а хроніка — здавалі ў набор. Папрасіў толькі дапісаць — «друкуецца са скарачэннямі».

— А то ў выдавецтве цэлая марока потым будзе. Учэпіцца які хлюст за часопісны варыянт і не дасць ні на старонку пашырыць.

Мы не пярэчылі, дапісалі: «друкуецца са скарачэннямі».

...Клікаў Галоўны. Ён прачытаў «хроніку» Язэпа Тарасюка. Хваліў нас за мужнасць, самаахвярнасць, лаяў з апошніх слоў усіх паслядоўнікаў і вучняў графа Хвастова.

— Хроніку давядзецца развярстаць на два нумары,— вось якое яго рэзюме.— Бо калі надрукуем у адным — ні адзін чытач такі ком не праглыне. І наогул,— вёў сваю думку Галоўны,— з вопыту я ведаю: раманы з працягам не ўсе чытаюць. Атрымаўшы пачатак, большасць чакае канца. Прыходзіць канец — то часу няма чытаць пачатак, то часопіс, дзе надрукаваны пачатак, згубіўся... Будзем спадзявацца, што Язэпа Тарасюка помняць і чытаць яго чарговы опус ніхто вельмі не кінецца.

...Трэцяя кніга эпапеі Язэпа Тарасюка надрукавана. Сакратар выпісаў ганарар. Кругленькую, між іншым, су-

му. А яшчэ ж атрымае такую, а то і большую, з выдавецтва. І за што?..

...Сустрэў выпадкова ў парку Язэпа Тарасюка, павітаўся. Ён не хавае незадаволенасці, злосці на рэдакцыю.

— Мы ж стараліся, каб твор быў лепшы. Ночы не спалі, правілі,— апраўдваўся я.

— Можна было і не правіць. Я не малады, якога трэба вучыць. Я напісаў твор, і ён, нягледзячы ні на што, дойдзе да народа. Не адразу, вядома. Усе выдатныя творы не адразу да народа даходзілі. Я шкадую вас, вашага часу. Навошта вам было скарачаць, правіць? Усё адно ж тэкстолагі потым адновяць, што вы павыкідалі. Толькі работу лішнюю сабе і ім задалі...

Я так і не зразумеў — сур'ёзна ўсё гэта Язэп Тарасюк гаворыць ці жартуе. Мусіць, усё ж жартуе...

...Чакаю з нецярплівасцю, што скажа крытыка пра «хроніку» Язэпа Тарасюка. Ідзе час, а водгукаў пакуль што няма ніякіх...

...Знаёмы крытык, з якім мы разгаварыліся, лаяў пісаніну Язэпа Тарасюка, абураўся, як маглі такое прапусціць, надрукаваць у паважаным часопісе. Я спытаў у таго крытыка:

— Чаму вы не выкажаце сваіх думак у друку?

— Гэта ніжэй мяне,— грэбліва паморшчыўся крытык.— Я пішу толькі пра літаратуру. А паколькі Язэп Тарасюк не пісьменнік, то...

Крытык скрывіўся.

— Гэта вы ведаеце, што Язэп Тарасюк не пісьменнік. Чытач гэтага не ведае. Не кожны, ва ўсякім выпадку, гэта ведае. Чаму б не падказаць чытачу, не насцярожыць яго: стоп, не чытай! Гэта халтура!

— Хай гэта робяць іншыя,— махнуў абыякава рукою крытык.— Мне гэтым займацца... Не салідна. Дый... маё маўчанне — таксама пазіцыя, крытыка...

Ну і ну!

...У нашай літаратурнай газеце надрукавана інтэрв'ю з Язэпам Тарасюком. Па просьбе нейкага чытача Язэп

Тарасюк дзеліцца сваімі планамі, расказвае пра эпапею, над якой працуе. Маецца напісаць яшчэ некалькі кніг. Оё-ёй! Дурань усё ж я, што пайшоў на працу з газеты ў часопіс. Навошта гэта я зрабіў? Каб памагаць тарасюкам, з іх пісаніны рабіць нешта прыстойнае, прымальнае да друку? Словам, наводзіць глянц. Не рэдактар, а чысцільшчык. О-хо-хо!

У дзвярах забразгацеў ключ, шчоўкнуў замок — гэта вярталася з працы жонка, Ліна. Яна — настаўніца, выкладае матэматыку ў сярэдняй школе. Не здымаючы з сябе паліто, не разуваючыся, падышла да стала, за якім сядзеў я, чытаў дзённік, запусціла пальцы мне ў чупрыну, засмяялася.

— Кінь ты пра вечнасць думаць. Жыві як усе людзі. Высах ужо за гэтымі рукапісамі, свету божага не бачыш...

Я загарнуў сшытак, сунуў яго ў шуфляду стала.

— Каб жа я хоць пра вечнасць думаў. А то ж...

І вінавата, нібыта вучань, апусціў вочы.

— Што, зноў за некага штосьці трэба рабіць? Ану раскажы...

Ліна, вясёлая, усмешлівая, з ямачкамі на круглых, пунцовых шчоках і кропелькамі срэбра-дажджынак на брывах і на варсінках паліто, села на канапку, блазнуючы, роблена падрыхтавалася слухаць.

— Ты хоць бы распранулася, разулася,— аглядаючы з галавы да ног прывабную постаць Ліны, ціха, лагодна сказаў я.

— Дык ты ж збіраўся са мною ў кіно схадзіць!

— А-а,— толькі цяпер я ўспомніў, што і праўда ўчора ўвечары, калі мы прагульваліся з Лінай перад сном, я паабяцаў сёння схадзіць з ёю ў кіно, паглядзець фільм, пра які шмат гаварылі, пісалі ў газетах.

— Што, зноў нешта тэрміновае? — І ў блакітных Ліниных вачах успыхнула незадаволенасць.

— Ды не, Ліна. Тэрміновага нічога няма. Сёння ў рэдакцыю зайшла жонка Язэпа Тарасюка. Папрасіла, каб я неяк наведаўся да яе на кватэру. Хоча паказаць рукапісы, фатаграфіі, словам, усё, што асталося ад нябожчыка мужа...

— А навошта тое табе?

— Ну, калі просяць, дык як не схадзіць.

— Дурняў работа любіць. Ты ж заракаўся, што больш не будзеш згаджацца каму б там ні было памагаць.

— Бачыш, тут...

— Што тут?.. Наколькі я ведаю, ты Язэпа Тарасюка нават за пісьменніка не лічыў.

— Усё быццам так. Але... Пра гэта я нідзе не пісаў, не гаварыў. Пра гэта ведаеш ты ды некалькі маіх блізкіх сяброў. Не ведаў пра гэта і сам Язэп Тарасюк, не ведае і яго жонка. І калі яна звярнулася да мяне...

— Сказаў бы, хай звернецца да каго-небудзь іншага!

У словах Ліны была логіка. Недзе падсвядома, унутрана я быў згодзен з Лінаю, думаю тое самае, што і яна. Аднак і адмовіцца, не пайсці да Тарасюкоў таксама ўжо не мог. Паабяцаў Вользе Ігнатаўне — і не прыйсці? Не, гэта было не па мне. А таму, каб хоць трохі апраўдацца і перад Лінаю, і перад самім сабою, узяўся даказваць ёй:

— У цябе, Ліна, усё вельмі проста. Сказаў — і з плеч далоў. А я інакш падумаў. Усё ж жанчына, удава. Дый цікавасць нейкая, шчыра табе кажу, мяне бярэ. Што Язэп Тарасюк не талент — гэта ясна. Але як ён жыў? Як працаваў? Якія адносіны ў яго былі з жонкай, блізкімі? А галоўнае — што ён сам думаў пра сваю работу, пісаніну? Няўжо яго ніколі не мучыла ніякае сумненне? Язэп Тарасюк — гэта ж тып! Тып, народжаны пэўным часам. Чаму б, скажы, не пазнаёміцца з ім глыбей? А раптам калі-небудзь прыдасца? Заўваж — такія выпадковыя людзі былі і ёсць не толькі ў літаратуры, але і сярод мастакоў, музыкантаў, артыстаў, кіношнікаў, вучоных... На вёсцы я бываю не часта, на заводах таксама... А жыццё ж вывучаць дзесьці трэба...

— Знайшоў жыццё! Ты б да нас у школу прыйшоў, на педсавеце пасядзеў, пабываў бы на ўроках, на бацькоўскіх сходах. А то... Ты жартуеш, ці што? Колькі жыву з табою, ніяк зразумець не магу, калі ты з сур'ёзнага пераходзіш на жарт, а з жарту — на сур'ёзнае...

— Не, Ліна, я не жартую, я праўду кажу. Язэп Тарасюк — гэта... Таксама жыццё. І я... Хачу паспрабаваць паглядзець на Тарасюка з розных, як кажуць, бакоў, зазірнуць у яго душу, псіхалогію, думкі, разабрацца, чаму Тарасюкі ёсць, як яны і пры якіх умовах нараджаюцца, дзе тая глеба, якая іх жывіць, на якой яны растуць. Жывуць іншы раз не горш за таленавітых. Гэта ж цікава.

— Ну, калі табе цікава, то займайся, я не забараняю.— Ліна траціла цярплівасць, пачынала злавацца.— Толькі

скажы, пойдзем сёння мы ў кіно? Калі не пойдзем, то я буду распранацца, разувацца, гатаваць вячэру, мыць твае кашулі, прасаваць штаны...

— Не злуйся, Ліна. У кіно мы сходзім. Калі, вядома, возьмем білеты...

— Добрыя кавалеры загадзя бяруць білеты.

— Ну, я добрым кавалерам ніколі не быў. Ты гэта ведаеш, Ліна.

— Не, усё ж быў.

— Глядзі ты, гэта нешта новае. Цікава, калі ж тое было?

— Калі ты студэнтам быў. Пра літаратуру яшчэ не думаў.

— Няўжо такое было, калі я пра літаратуру не думаў? Як помню сябе, заўсёды думаў пра літаратуру. Кнігі чытаў, вершы складаў, ні аднаго літаратурнага вечара не прапускаў. Прыслухоўваўся, прыглядаўся да ўсяго: «А раптам спатрэбіцца?..»

— Пагаворыш з табою, дык аж дзіўна — як ты і ажаніўся? Жыў бы са сваёй літаратурай.

— Ліна, але ж ты мне ніколі не замінала займацца літаратурай. Наадварот, памагала.

— Дзякуй і за гэта. Толькі ж і ты не пра аднаго сябе, свае творы, рэдакцыю, але іншы раз і пра мяне думай.

— Ды кінь ты! У суботу мы хадзілі ў тэатр, у нядзелю — у філармонію. Потым былі на вечары ў Саюзе пісьменнікаў...

— Загаворваеш мне зубы. Я спацела ўжо. Скажы, пойдзем мы сёння ў кіно?

— Вядома, пойдзем. Толькі не цяпер, а на апошні сеанс. І білеты будуць, і прагуляемся заадно перад сном.

— Дык мне што — распранацца? — ужо цішэй, мірна сказала Ліна.

— Распраніся. Падрыхтуй сёе-тое на вячэру, а я трохі пасяджу яшчэ за сталом.

— Ды яно і мне не шкодзіла б пасядзець, у мяне сшыткі.

— Ну вось, бачыш,— разваліўся ў крэсле, блазнавата ўсміхнуўся я.— А то — кіно, кіно...

— Дык жа ж і кіно глядзець трэба, і сшыткі правяраць. Нельга жыць адной толькі працай!..

— Не будзем зноў пачынаць. Здаецца, мы дамовіліся пра ўсё.

— Ну, калі дамовіліся, то няхай!

Ліна падхапілася з канапкі, зняла паліто, павесіла яго ў шафу і, зачыніўшы за сабою ціхенька дзверы, пайшла на кухню...

...Ад Ліны я не хаваў, не таіў нічога, гаварыў, што ведаў сам, дзяліўся ўсімі сваімі думкамі і сакрэтамі. Гаварыў неаднойчы я ёй і пра Язэпа Тарасюка, яго творы, асабліва ў той год, калі мы з Лінай пажаніліся і ўпершыню паехалі адпачываць на Чорнае мора. Я надрукаваў тады, нарэшце, сваю аповесць і асмеліўся дазволіць сабе такое вясельнае падарожжа, тым больш, што ні я, ні Ліна дагэтуль на поўдні ні разу не былі, не бачылі зусім мора. І Ліне і мне хацелася трапіць у Ялту. Можа, таму, што пра гэты гарадок мы многа чыталі — там у свой час жылі і Чэхаў, і Горкі, і Бунін, і наш Максім Багдановіч. Але пуцёвак у Ялту не было, былі пуцёўкі у Кактэбель. І мы з Лінай паехалі ў Кактэбель.

Мы не былі расчараваны сваёй паездкай, бо, як хутка выявілася, Кактэбель — гэта вельмі ціхае, утульнае, аслоненае з поўначы гарамі невялікае курортнае паселішча ля самага мора, што яго, гэтае паселішча, таксама наведвалі тыя ж пісьменнікі, што і Ялту, нават больш — тут жыў і працаваў мастак і паэт Максіміліян Валошын, і ў яго доме-дачы перабывалі амаль усе, хто так ці інакш быў звязаны з літаратурай і мастацтвам. Выявілася і яшчэ адно, чаму мы з Лінай былі вельмі ж рады — па моры хадзілі розныя экскурсійныя параходы, так што мы з Лінай змаглі пабываць не толькі ў Ялце, але аб'ездзілі і ўсё Чарнаморскае ўзбярэжжа — пабывалі ў Гурзуфе, Алупцы, Севастопалі, Еўпаторыі...

Мы былі маладыя, прывыкалі адно да аднаго, многа купаліся, загаралі, а па вечарах, калі нейк надта ж хутка і густа цямнела,— хадзілі на танцы, што наладжваліся на адкрытай пляцоўцы ў суседнім з нашым домам адпачынку пансіянаце. Ліна мне падабалася з кожным днём усё больш і больш, я раўнаваў яе да ўсіх і да кожнага, але яна не крыўдавала, толькі смяялася з мяне, кпіла, пацяшалася:

— Ой-ёй! Каб ведала, што ты такі Атэла, замуж за цябе б не выходзіла. Гэта ж як я жыць буду? Ты ж мяне ніколі нікуды адну не пусціш!

— І правільна, між іншым, зраблю! — гаварыў зусім сур'ёзна я.

— Але ж гэтым нельга чалавека ля сябе ўтрымаць!

— А мы па-рознаму будзем трымацца. І так, і не так.

— Ой, баюся, ты мяне не ўпільнуеш. Як разлюблю — нішто не паможа...

— А я пастараюся, каб не разлюбіла!

Тады мы, у тое лета, там, на Чорным моры, шмат жартавалі, шмат смяяліся. Раніцою, ледзь толькі паказвалася сонца, белае, зіхатлівае, іскрыстае і яшчэ не вельмі спякотнае, беглі на пляж — купаліся ў колкай, халаднаватай, аж перасмыкала ўсё цела, салёнай вадзе. Потым, падставіўшы ўсяго сябе ласкавым промням сонца, ляжалі на беразе — загаралі. Загаралі і зноў купаліся... Разоў колькі, калі неба зацягвалася хмарамі, а мора раптам мутнела, білася злосна аб бераг пеністымі хвалямі, мы з Лінай бралі з сабою што паесці і кіраваліся ў горы — цікава было нам, дзецям зусім другога краю, паглядзецць і на зрывістыя стромы скал, і на дрэвы, кусты, траву, што раслі ў падножжы, і на многае-многае іншае, чаго мы не бачылі і не маглі ўбачыць у сябе дома, у Беларусі. З намі ў тое лета якраз адпачывалі ў Кактэбелі Язэп Тарасюк і яго жонка Вольга Ігнатаўна, і мы з Лінай зрэдку, асабліва надвячоркамі, на захадзе сонца, калі на мора апускаліся спакой і ціхата, прагульваліся разам па ўзбярэжжы — «дыхалі ёдам». Дзіўна, але Язэп Тарасюк пра літаратуру тады гаварыў мала. Больш гаварыў пра тое, як цяжка быць жонкай пісьменніка, як яна павінна разумець мужа, не гневацца на яго, быць заўсёды ласкавай, словам, паводзіць сябе з мужам, як з малым дзіцем.

— Пісьменнік — вельмі далікатная, адчувальная натура. Гэта згустак нерваў, аголеных нерваў. Параніць яго вельмі лёгка. Іншы на нейкую дробязь не звярнуў бы нават увагі. А пісьменнік зверне, запомніць. Фантазія галавы яго — бязмежная, ён можа дадумацца Бог ведае да чаго, дамаляваць ці ўявіць любую сцэну. Улічыце — з-за нейкай дробязі! А калі дадаць, што пісьменнік — натура яшчэ і глыбокая, то можаце падумаць, як лёгка і надоўга параніць пісьменніка! Потым гэты самы быт... «Схадзі ў магазін». «Падмяці хату». «Памый посуд». Пісьменнік павінен тварыць, павінен пісаць. Ён жыве ў сваім, выдуманым ім свеце, размаўляе часам з выдуманымі ім жа самім героямі, кахае, ненавідзіць... Ён — увесь ва ўяўным свеце. А тут прыходзяць і кажуць: «Схадзі ў магазін». Вы, Ліначка, гэта павінны разумець. Пісьменнік — ваш муж — належыць не толькі вам, ён належыць усім людзям, народу. Кожную яго хвіліну вы павінны берагчы. Ад таго, якая

ў пісьменніка жонка, залежыць не толькі, колькі пісьменнік напіша твораў, а наогул усё пісьменніцкае жыццё. Ведайце: у тым, што Пушкін загінуў на дуэлі, ёсць віна і яго жонкі, Ганчаровай. І ў тым, што Леў Талстой так многа жыў і так многа напісаў, таксама вялікая заслуга яго жонкі — Софіі... О, жонка для пісьменніка — гэта калі не ўсё, дык многае, вельмі многае! Вядома, пісьменнік і сам павінен разумець сваю жонку. Жонка, як правіла, жыве сённяшнім днём, пра вечнае яна думае мала. У яе — свой клопат, свае погляды на ўсё. Але іншы раз яна павінна ахвяраваць сабой дзеля яго, пісьменніка, дзеля таго, каб узбагацілася чалавецтва, каб на паліцах чытачоў з'явіўся яшчэ адзін твор, яшчэ адна кніга... Талент — рэдкасць, яго трэба ўсяляк аберагаць. І ад чаркі, і ад сваркі, і нават ад тых жа несправядлівых папрокаў крытыкаў. Пісьменнік павінен працаваць, заўсёды, у любых умовах працаваць. Калі ён працуе, ён жыве. І задача жонкі стварыць якраз такія ўмовы, каб пісьменнік, яе муж, працаваў... Вы, Адам Іванавіч, тут хоць трохі пішаце? — звярнуўся аднойчы да мяне Язэп Тарасюк.

— Што вы! — засмяяўся я.— Я ж прыехаў адпачываць...

— Дарэмна, дарэмна вы так,— пажурыў мяне Язэп Тарасюк.— Час вельмі хутка ляціць. Вам цяпер уяўляецца, што вечна будзеце малады і дужы. А гэта не так, далёка не так. Глядзіце, потым шкадаваць будзеце, што марна дні трацілі, не працавалі.

— А вы што, і тут працуеце? — спытаў, зацікаўлены, я.

— А як жа! — аж пакрыўдзіўся Язэп Апанасавіч.— Я ў любых умовах працую. Штодзень, што б ні здарылася, дзе б ні быў. Бо выбіцца з нормы вельмі лёгка, а ўваходзіць зноў у норму надта ж цяжка. Тыдзень, два сядзіш, пакуль пачнеш нешта пісаць. Здаецца, і словы не тыя, і логікі няма... У натуры ж кожнага з нас сядзіць гультай. Дасі яму волю — і ўсё. Загнаць гультая на сваё месца, ой, як іншы раз цяжка! А вы ж малады, вам трэба працаваць і працаваць. І імя каб было, і грошы. А тут такое прыдатнае месца для працы! Зразумейце мяне — загар ваш, дзеля якога вы пячэцеся на сонцы, праз два-тры месяцы сыдзе, ад яго і знаку не астанецца. А тыя дваццаць — трыццаць старонак, што вы напісалі б, асталіся б! Я пазнавата ўзяўся за творчасць, таму эканомлю кожную хвіліну. Задум багата, не ведаю, ці паспею іх усе здзейсніць...

Неяк, калі мы з Лінай кіраваліся на пляж, убачылі Язэпа Тарасюка — ён стаяў пад раскідзістай шаўкавіцай адзін і доўга, уважліва і, як мне здалося, з глыбокім сумам глядзеў на мора. Мы падышлі да Язэпа Апанасавіча, павіталіся.

— А ведаеце, я зайздрошчу вам,— прызнаўся Язэп Апанасавіч.— Такія маладыя, прыгожыя! У вас усё наперадзе! А калі будзе ў сям'і поўнае разуменне, злагада...

Язэп Апанасавіч прыцмокнуў языком.

— Ну наконт злагады вам зайздросціць быццам няма чаго,— сказала Ліна.— У вас з Вольгай Ігнатаўнай, памойму, заўсёды ва ўсім поўная згода.

— Гэта праўда, з Вольгай Ігнатаўнай у нас заўсёды поўная згода. Яна ва ўсім са мною згаджаецца, ніколі ні ў чым не пярэчыць.

— А дзе гэта яна сёння, чаму вы адзін? — палічыў патрэбным запытаць я.

— У Феадосію на рынак паехала. Там, кажуць, вяленая рыба прадаецца. А яна да такой рыбы вялікая ахвотніца. Чаму ж не захапіць кілаграмаў колькі? Яна, Вольга Ігнатаўна, наогул у мяне запаслівая, клапатлівая. І добрая. Я шкадую, што пазнавата сустрэў яе на сваім жыццёвым шляху.

— Вы што, хіба позна ажаніліся?

— З Вольгай Ігнатаўнай я ажаніўся пасля вайны...

— А да вайны жылі адзін?

— Усяк было. І адзін жыў, і з жанчынай... Толькі не з Вольгай Ігнатаўнай, з іншай...

Гэта было для мяне новае — Язэп Тарасюк, і раптам дзве жонкі!

— Што, характарамі не сышліся? Ці мо ў вайну?..

Язэп Апанасавіч пахітаў галавою.

— Мы былі проста розныя людзі. Першая жонка мне трапілася якраз з тых жанчын, якія ані не разумеюць, дакладней, не могуць зразумець, што такое пісьменнік, творца, як важна яго кахаць, аберагаць ад розных жыццёвых напасцяў і нягод. Яна сама прагнула жыць, нечым паскупіцца дзеля літаратуры не хацела, не магла. І мы развяліся з ёю.— Ён памаўчаў.— Яна была... Эх, ды што казаць? Я ўспамінаю яе часта. Калі б ёй хоць трошкі тых якасцяў, якія мае Вольга Ігнатаўна, я нічога б іншага не жадаў, я быў бы шчаслівы.

Язэп Апанасавіч шумна, са скрухай уздыхнуў. Потым дадаў:

— Нічога не паробіш, жыццё. Яго трэба прымаць такім, якое яно ёсць. Асабліва калі хочаш нешта стварыць, зрабіць, каб помнілі цябе, не забывалі людзі... Дзеля гэтага ахвяруеш іншы раз самым дарагім...

І Тарасюк неяк спешна і зусім недарэчы падаў мне і Ліне сваю кароткапалую, мяккую, усё адно што ў жанчыны, руку і, павярнуўшыся, паволі пабрыў да таго двухпавярховага, белага, як драбок рафінаду, корпуса, дзе быў яго пакой з акном на мора. Пабрыў нейкі надта ж адзінокі, сумны...

Як паспеў я пераканацца, многія людзі, нават часам даволі адукаваныя, не маюць ніякага ўяўлення пра жыццё і працу тых, хто валодае здольнасцю тварыць. Чаго толькі не пачуеш пра таго ці іншага вынаходніка, мастака, вучонага, пісьменніка за бяседным сталом, у аўтобусе ці ў купэ вагона! Як правіла, увага засяроджваецца перш за ўсё на розных дзівацтвах, прычым сёй-той забывае зусім, што творцы — гэта таксама людзі і нішто чалавечае ім, як кажуць, не чужое. І ўсё ж, будучы людзьмі звычайнымі, яны, творцы, разам з тым і незвычайныя — умеюць рабіць тое, што не кожны ўмее і чаму навучыцца не кожны можа. Гэта творцаў і вылучае, гэтым яны непадобныя на астатніх людзей. Што ж да дзівацтваў, дык яны абумоўлены таксама. Заняты чым-небудзь — разгадкай ці развязкай таго, што ніяк не разгадваецца ці не развязваецца,— творца іншы раз не помніць, дзе ён і што ў такіх выпадках павінен рабіць — ён увесь там, дзе яго думкі. Адсюль — і анармальнасці, дзівацтвы, на якія зважаюць усе, хто знаходзіцца ў тую хвіліну з творцам побач, бо і праўда ўсякі іншы чалавек на месцы тым і ў тых умовах паводзіў бы сябе інакш. Творца, як правіла, гэта чалавек, якому наканавана ніколі не быць вольным ад думак, думаць і думаць, думаць вечна і ўсюды, дзе б ні апынуўся, куды б ні закінуў яго лёс. І нават калі нешта адно быццам скончана, творцу не перастае хваляваць яго праца, бо яна — яго дзіця, народжанае ў пакутах. І яна, гэтая праца, цікавіць, хвалюе заўсёды, як цікавяць, хвалююць свае дзеці кожнага бацьку. Дый рэдка бывае так, каб думкі творцы заняты былі толькі адным, над нечым адным ён думаў. Звычайна творца заўсёды заняты некалькімі разгадкамі, і разгадка, вырашэнне аднаго не вызваляе яго ад астатняга. Добра, калі ў творцы ўладкаваны быт, калі ў яго чулая жонка, усё ў парадку ў сям'і.

Тады ён можа ў нейкай ступені кантраляваць сябе, працаваць не «запоямі», часам па начах, а раўнамерна, штодзень. Але ў большасці выпадкаў такое здараецца рэдка. Бо творца, як я і гаварыў ужо, таксама чалавек. Ён есць той самы, што і ўсе, хлеб, дыхае тым самым, што і ўсе, паветрам, яго клапоцяць і тыя самыя праблемы, што і ўсіх людзей. Але клапоцяць куды глыбей, мацней! На тую ці іншую праяву звычайны чалавек не зверне ніякай увагі, а творца зверне, яго тое ўсхвалюе, узрадуе ці ўзлуе. Мала таго, ён захоча адклікнуцца на ўбачанае ці пачутае, а то — і прапанаваць нешта сваё, што, на яго думку, лепшае. Апошняе асабліва ўласціва паэтам, пісьменнікам, тым, хто мае здольнасць ствараць с в о й свет, насяляць яго с в а і м і героямі. Але як бы пісьменнік ні ствараў с в о й свет, с в а і х герояў, ён усё ж часцей за ўсё ідзе ад жыцця, людзей, толькі бярэ ў жыцці, у людзях нешта характэрнае; астатняе прыглушае ці замоўчвае. Жыццё, як вядома, заўсёды багацейшае, цікавейшае, чым паказваецца яно ў кнігах. Чаму? Ды таму, што ўвагнаць жыццё ў нейкія рамкі надзвычай цяжка, бадай што немагчыма. А пісьменніку даводзіцца гэта рабіць, даводзіцца выбіраць з жыцця тое, што перадае сутнасць. Сутнасць жыцця, часу, пэўнай падзеі, характару, вобраза. І не проста перадае, але яшчэ чамусьці і вучыць, на штось кліча. З праўды жыцця пісьменніку трэба зрабіць мастацкую праўду. А гэта зноў жа нялёгка, як казаў паэт, «изводишь единого слова ради тысячи тонн словесной руды». Пошукі дакладнага, таго адзінага-адзінюсенькага слова — цяжкія, пакутлівыя. У слове ж не толькі сэнс, у ім — і колер, і гук; слова жывапісуе, нясе думку і музыку; слова — расхалоджвае і кліча, натхняе; яно — забаўка і зброя...

У творцы, як і ў кожнага чалавека, бываюць удачы і няўдачы. Удачы і няўдачы не толькі ў працы, але і ў жыцці. І хоць творца жыве як бы двайным жыццём — адно жыццё — яго творчасць, другое — гэта звычайнае, будзённае, тое, якім жывуць і ўсе людзі,— здараюцца часіны, калі творцу цалкам захапляе, бярэ ў палон жыццё будзённае. На творчасць ён калі можа і не зусім забывае, дык ва ўсякім разе працуе не на ўсю сваю сілу, талент — думкі яго, пачуцці заняты іншым. Якія прычыны гэтага? Ды розныя, вельмі часта не аб'ектыўныя, а суб'ектыўныя...

Каб яскравей уявіць тое, пра што я спрабую «філасофстваваць», раскажу трохі пра сябе, як складвалася маё жыццё, мая творчасць. Вярнуўшыся з Чорнага мора, я

амаль два месяцы хадзіў з Лінай па вуліцах Мінска — пытаў, хто б пусціў на кватэру, шукаў пакойчык, дзе можна было б жыць і працаваць. Пакойчыкі былі, гаспадары згаджаліся, вядома, за добрую плату, пусціць кватарантаў, але не сямейных.

— Вы муж і жонка? — пыталіся ў нас з Лінай.

— Ага,—ківалі мы згодна галовамі.

— Жыла ў нас адна сям'я... Дзіця, пялёнкі... Потым варадь есці сабе, варадь дзіцяці... Не, выгады ніякай няма трымаць сям'ю на кватэры. Клопат толькі...

— Мы добра заплацім!

— Што мне ваша плата! Пушчу ў пакойчык трычатыры студэнты — і тыя ж грошы! Затое спакой у хаце, нервы заўсёды ў парадку...

Як ні кахаў я Ліну, як ні жадаў быць з ёю разам, заўсёды, заўсёды разам, давялося ўсё ж нам некаторы час жыць паасобку...

Ліна паехала зноў у тую вёску, дзе яна настаўнічала і да замужжа,— у далёкія, ціхія Падазерцы...

Кватэра для пісьменніка — гэта не толькі месца, дзе ён жыве сам, жыве яго сям'я. Кватэра для пісьменніка — гэта яго і рабочае месца. Цэх, майстэрня — як хочаце, так і называйце. У мяне ў тыя гады не было свайго рабочага месца. На кватэры, якую я з вялікай цяжкасцю наняў, працаваць я не мог — гаспадыніна дачка займалася музыкай. Штораніцы на дом прыходзіла настаўніца і па дзве гадзіны, то разам з дзяўчынкай, то кожная паасобку спявалі, выводзілі гамы на піяніна. Я не вытрымліваў, пакідаў свой пакойчык, ішоў альбо на працу ў рэдакцыю, альбо проста гуляць на вуліцу. Па вечарах роў, аж, здаецца, калаціліся сцены, тэлевізар. Не тое што пісаць, чытаць, спаць было нельга. А ў выхадныя, як толькі яны надараліся, я спяшаўся на цягнік — ехаў да Ліны, у Падазерцы. Божа, і цяпер, як згадаю, аж млосна робіцца. Для ўсіх людзей свята як свята, а для мяне — пакута. Таўчыся ў чарзе, каб узяць білет, трасіся, пацей у перапоўненым аўтобусе ці ў вагоне цягніка, потым кіламетраў дванаццаць ад гарадка дабірайся як хочаш — на спадарожнай фурманцы, пеша. Пераначуеш у Ліны ноч, пабудзеш дзень — зноў збірайся ў дарогу. На вачах у Ліны слёзы, на сэрцы ў мяне — камень...

— Можа б, ты што-небудзь расстараўся, пашукаў?

Няўжо нельга ніяк знайсці пакойчык? — напамінала скрозь слёзы кожны раз Ліна.

І зноў, вярнуўшыся ў Мінск, я хадзіў па ўскраінах горада, зноў пытаў — можа, пусціць хто на кватэру нашу маленькую, ды ўсё ж сям'ю.

Праз два гады, нарэшце, Саюз пісьменнікаў выдзеліў мне аднапакаёвую кватэру. Якая то была радасць! Я адбіў тэлеграму Ліне, і яна, не дачакаўшыся канца навучальнага года, уцякла са сваіх Падазерцаў, пераехала ў Мінск. Месца настаўніцы ў школах сталіцы можна было, вядома, знайсці, ды мы не шукалі. Ліна была цяжарная, мы чакалі сына...

І сын у нас нарадзіўся. Дужанькі, круглашчоканькі, прыгожанькі, з вялікімі блакітнымі вачыма, белымі кучаравымі валасамі. «Увесь у маму».

Сына мы назвалі Вадзікам.

І хоць Ліна нідзе не працавала, не мог працаваць — пісаць — і я. То Ліне трэба схадзіць у магазін, купіць штокольвечы і сабе і сыну, то трэба памыць пялёнкі, то сын захварэе. І Ліна, і я носім яго на руках, гушкаем, забаўляем, выклікаем урачоў, бегаем з рэцэптамі па аптэках... Прачнецца сын уночы — ніхто — ні Ліна, ні я — не спім. Адзін пакой, як жа будзеш спаць, калі побач крычыць дзіця? Роднае дзіця! Вадзік!

А не выспішся ўночы, якая ж можа быць праца ўдзень. Каб нешта тварыць, трэба мець заўсёды ясную галаву, свежы, праніклівы розум...

Сын падрос, стаў на свае ножкі, навучыўся гаварыць. Прачнецца, бывала, раненька, вочкі свае расплюшчыць, а мы з Лінай ужо ля пасцелькі яго стаім.

— Сыночак, Вадзік?! Чаго сыночак хоча?

— Сіночак-Вацік хоця ам-ам! — праляпеча Вадзік.

І мы з Лінай самі дзяцінеем. Хапаем сына на рукі, бяжым на кухню — там, смеючыся, забаўляючыся, ядзім самі, кормім і Вадзіка з лыжачкі і зноў радуемся не нарадуемся, што ў нас расце не чыё-небудзь, а н а ш а, маё і Лініна, такое кемлівае, пацешнае дзіця...

На летні адпачынак мы паехалі ўсёю сваёю невялікаю сям'ёю ў вёску, да Лінінай маці.

У вёсцы Вадзіку спадабалася, ён вельмі хутка прывык

да бабы. Асабліва палюбіў ён бегаць па траве на лужку, што быў ля саменькага Нёмана, ганяўся за курамі, качкамі, лавіў конікаў, матылькоў.

— А што, калі мы пакінем тут сына? — аднойчы сказала мне Ліна.— Маці глядзела б яго, усё адно работы ніякай у яе няма. А мы б... Я пайшла б у школу працаваць. Дый ты быў бы вальнейшы...

— А маці як — згодзіцца?

— Што ты! Яна штодзень мяне просіць, каб мы пакінулі ёй Вадзіка...

Я падумаў, падумаў і згадзіўся пакінуць сына ў бабы, у вёсцы. Не толькі таму, што нам з Лінай вальней будзе жыць у горадзе, але яшчэ і таму, што самому сыну лепш, вядома, расці на свежым паветры, волі. Ды і не на магазінных, а вясковых харчах — чыстых, свежых, на якіх і мы з Лінай раслі.

Больш года наш Вадзік жыў у бабы. Мы ездзілі да яго штомесяц, пасылалі пасылачкі з рознымі прысмакамі і цацкамі; іншы раз баба сама прыязджала да нас, прывозіла на тыдзень-два ў горад Вадзіка. Але горад Вадзіку не падабаўся — не было таго прастору, волі, што былі там, у вёсцы.

— Баба, паехалі дадому,— напамінаў Вадзік бабе штодзень.

І баба зноў ехала з Вадзікам у сваю вёску, жыла з ім там.

Ліна ўладкавалася настаўніцай у школе, працаваў у рэдакцыі і я. Жыццё наша быццам наладжвалася, можна было пісаць. Я выношваў у галаве план першага свайго рамана. Рамана, у якім хацеў паказаць тое, што перажыў я, пабачыла маё пакаленне. Пакаленне, дзяцінства якога апаліла вайна, якому выпала зведаць і што такое голад, несправядлівасць, і якое, усё ж, нягледзячы ні на што, асталося верным высокім, чалавечым ідэалам, верным перамозе праўды над няпраўдай, справядлівасці над несправядлівасцю. І тут...

Сэрца маё абліваецца крывёю, калі я ўспамінаю, што было далей...

...Мы з Лінаю сядзелі дома, глядзелі па тэлевізары нейкую перадачу. У дзверы да нас раптам пазванілі. Я падняўся, выйшаў на пляцоўку. Ля нашай кватэры стаяла незнаёмая жанчына з тэлеграмай у руках.

— Распішыцеся,— патрабавальна сказала яна, тыцнуўшы мне квітанцыю.

Я распісаўся, жанчына адразу ж, быццам спалохаўшыся, пабегла па сходках уніз, а я не спяшаючыся, думаючы, што гэта нейкі чарговы заказ з газеты, разгарнуў тэлеграму.

«ПРЫЯЗДЖАЙЦЕ ВАДЗІК УТАПІЎСЯ».

Прачытаў раз, два, тры,— і толькі тады да мяне дайшла ўся жудасць напісаных на тэлеграмным бланку слоў...

Раніцою мы з Лінай былі ў вёсцы, там, дзе жыла Лініна мама, жыў наш Вадзік. І пачулі тое, у што доўга ніхто з нас не хацеў, не мог паверыць...

...Лініна мама — баба — выбралася з хаты карміць свіней. З Вадзікам, як і заўсёды. Пакуль яна выганяла з свінушніка свіней, пакуль вылівала з вядра яду, пакуль пільнавала, каб свінні не абярнулі карыта, Вадзік выбег за хлеў. І па неглыбокім пульхным сняжку, які толькі што выпаў уночы, памчаў да Нёмана.

Не ўбачыўшы ў двары Вадзіка, баба кінулася яго шукаць... Згледзела на снезе слядкі. Яны вялі за хлеў, на лужок. Слядкі добра відаць былі на свежым снезе, але не было відаць нідзе самога Вадзіка.

Баба пайшла па Вадзікавых слядах...

І дайшла да Нёмана, да той палонкі, што высеклі ў лёдзе, каб паласкаць бялізну, вяскоўцы...

Ля палонкі сляды прападалі, на вадзе плавала толькі Вадзікава шапачка...

Больш тыдня ўся вёска шукала Вадзіка,— узломвалі лёд, паролі дно бусакамі. Але нашага сына так і не знайшлі.

Не знайшлі Вадзіка і вясною, калі ўскрылася рака. Відаць, плынню занесла яго кудысь далёка...

Мы з Лінаю асталіся зноў адны. Вядома, пра тое, каб нешта пісаць, «ствараць», хіба мог я тады думаць! Думкі мае ды і Ліміны былі заняты Вадзікам. Па вечарах, сабраўшыся дома, мы не глядзелі тэлевізар, не чыталі газет, кніг. Мы плакалі, упікалі сябе тым, што былі неабачлівыя, даверылі сына бабе... Хай бы гінула ўсё, хай бы ні Ліна, ні я не працавалі, але рос бы ў нас сын, жыў бы Вадзік!

Мучыла, не давала спакою і тое, што сына мы не знайшлі, не пахавалі на могілках. А тут яшчэ — дзе коратка, там заўсёды рвецца,— новая бяда — памерла Лініна маці. Не перанесла, старая, смерці ўнука, надта ж блізка да сэрца ўзяла яна ягоную смерць — даверылі глядзець дзіця, а яна, нядошлая... Словам, у смерці Вадзіка Лініна маці вінавaціла сябе, толькі адну сябе...

А жыццё між тым ішло.

Нейк, быццам без усякіх намаганняў, хутка і лёгка некаторыя мае равеснікі сталі ледзь не класікамі — выдавалі кнігі ў Маскве і за мяжою, пра іх пісалі ў газетах і часопісах вялізныя артыкулы, спрабавалі падсумоўваць, што новага ўнеслі яны ў літаратуру. А я... Ці даводзілася каму-небудзь з вас бачыць табун коней, які імчыць, здаецца, на злом галавы, аддаляецца і аддаляецца ў клубах пылу? І недзе за гэтымі коньмі бяжыць, ганіцца, спрабуе з апошніх сіл дагнаць табун конік. Ён увесь у мыле, змакрэў, яму не хочацца адставаць, але... Што зробіш — ён не набліжаецца да табуна, а ўсё адстае, адстае...

Ды што шукаць якіх бы там ні было параўнанняў, што гаварыць...

Першая мая кніжка апавяданняў і аповесць, якую я надрукаваў у часопісе,— былі заяўкаю, візітоўкаю ў літаратуру, але яны патрабавалі працягу, пацверджання. Гэта я адчуваў, ведаў. Ды...

Мабыць, хопіць пра сябе. Вернемся да Язэпа Тарасюка. Ён, выдаўшы трэцюю кнігу сваёй эпапеі, прынёс аднаго дня — пад восень — нам у рэдакцыю чацвёртую кнігу. Пятра Пятровіча Шчарбачэні ў аддзеле ўжо не было. Ён, дачакаўшыся шасцідзесяці гадоў, пайшоў на пенсію.

— Хоць выпішуся,— казаў ён усім у рэдакцыі.— А то жыццё канчаецца, можа, апошні дзесятак гадоў жыву, а планы мае так і астаюцца планамі. Мітушуся, бегаю, раблю чортведама што і за каго. Стаміўся я чытаць, бракаваць, прымушаць перапрацоўваць, рэдагаваць чужыя ру-

капісы. Хопіць, до! З сённяшняга дня раблю толькі сваё. Настойліва, цягавіта, як вол.

На месца загадчыка аддзела Пятро Пятровіч раіў узяць мяне.

— Не бойцеся, што малады, справіцца...

І мяне прызначылі загадчыкам аддзела. Я ўзяў сабе памочніка — спакойнага, працавітага, трохі маладзейшага за сябе хлопца. І над новым рукапісам рамана Язэпа Тарасюка надта не мудравалі. Бракаваць? Але, як сказаў Галоўны, калі яму паведаміў пра новы рукапіс Язэпа Тарасюка, як жа бракаваць апошнюю кнігу, калі рэдакцыя надрукавала тры першыя? Пачалі ўжо, дык трэба канчаць. Тым больш пагоршаў час: вялася барацьба з «ачарніцелямі», «дысідэнтамі», і такія, як Язэп Тарасюк, зноў былі на кані. І я, не вельмі задумваючыся што раблю (было тады пра што мне думаць, Вадзік, сын, не выходзіў з галавы), аднаго дня занёс рукапіс Язэпа Тарасюка дадому,— і, ат, дзе наша не прападала! — закасаў рукавы і што выкінуў, што перапісаў... Пасля мяне рукапіс чыталі па чарзе ўсе, пачынаючы ад стыліста і канчаючы Галоўным, і тое, што пасля іх правак асталося, моўчкі, ні слова адзін аднаму не кажучы, здалі ў набор...

Язэп Тарасюк злаваўся на рэдакцыю, асабліва што твор яго зноў скарацілі, прычым значна, гэты раз больш як напалавіну.

— Дайце мне хоць аднойчы быць самім сабою, не крэмзайце гэтак, я ж не маладзён, вопыт сякі-такі маю! Дый тэмы ж, тэмы падымаю ў сваіх творах якія! Рэвалюцыя, калектывізацыя, індустрыялізацыя, вайна! — гаварыў ён у рэдакцыі.

— За мяжою часопісы наогул вялікіх твораў цалкам не друкуюць. Толькі фрагменты, урыўкі. Так што крыўдаваць вельмі на нас вам няма чаго,— апраўдваліся па чарзе то Галоўны, то сакратар, то я.

— Але ж раманы іншых аўтараў вы друкуеце цалкам, без скарачэнняў?

— Гледзячы каго. Каго і зусім не друкуем. Залежыць гэта ад многіх прычын. Тэма новая. Напісаны твор выдатна. У рэдакцыі ёсць што друкаваць ці няма. Ведаеце, на ўсё свае прычыны. Нясіце ў выдавецтва раман, у іх магчымасці большыя...

— Дык жа і ў выдавецтве просяць ваш, часопісны, варыянт. Кажуць: «Вы працавалі, палепшылі. Навошта ж нам яшчэ раз займацца тым жа самым?»

— А вы настойвайце, вы ж аўтар!

— Дык і настойваю! Эге, каб я не настойваў! Асталіся б рожкі ды ножкі. Рэдактары цяпер пайшлі: я вам скажу...

І Язэп Апанасавіч крывіўся, як ад зубнога болю.

Галоўны неяк не вытрымаў, сказаў з задзёрам:

— Што, хіба раней іншыя рэдактары былі?

— Раней... Вы ж ведаеце, я сам некаторы час працаваў у выдавецтве. Прыносіць раман Кузьма Чорны. Я чытаю, падкрэсліваю, што мне не падабаецца. Паказваю Кузьму Чорнаму. Ён моршчыцца, кажа: «Ведаеш, Язэп, пакідай так. Усё адно я лепш не напішу». І я... Пакідаў так, як напісаў Кузьма Чорны...

— Ну-у, гэтыя казкі расказвай каму-небудзь іншаму, не мне... Я-то добра помню тваё рэдактарства,— не без іроніі, з падкусам гаварыў Галоўны.— Скажы ў такім разе, будзь ласкавы, Цукар Цукаравіч, Мёд Мядовіч, чаму кнігі некаторых аўтараў марынаваліся ў выдавецтве па некалькі гадоў, ніяк дарогі да чытача знайсці не маглі?

— Бо...— Язэп Апанасавіч ніякавеў, мяняўся ў твары.— Час тады такі быў... Дый... Аўтары некаторыя пісалі абы-што... Абы толькі не пра нашу савецкую рэчаіснасць, не пра поступ часу наперад... А то... Слова не тое, сказ не зусім пісьменны, газетная мова, герой у такіх абставінах так не скажа... Прыдзірачкі! І я кажу словамі Кузьмы Чорнага: «Пакідайце так, усё адно я лепш не напішу».

— Га-га-га,— рагатаў Галоўны.— Задача ж рэдактара не толькі заўважаць недахопы, але і памагаць аўтару паправіць іх.

— Дык правіце ж, правіце ж вы мяне. Ды так, што іншы раз не пазнаю сябе,— бараніўся Тарасюк.

— Думаеш, нам вельмі цікава правіць? Мілае дзела, любата — прачытаў рукапіс і ў набор. Аўтару добра, а рэдактару яшчэ лепш.

— Дык чаго ж вы так не робіце? Лезеце ўсюды са сваімі алоўкамі, усё мяне пісаць навучыць хочаце. Тое не так, гэтае не так. Сваё пісалі б, сваё правілі б...

— А мы і сваё пішам, і іншых правім. Праўда, не так, як некалі ты ў выдавецтве...

— Што тое ўспамінаць...

І Язэп Апанасавіч, замахаўшы рукамі, маўляў, досыць-досыць, пераканалі, пакідаў нашу рэдакцыю. Але, паўтараю, асаблівай злосці і крыўды на нікога з нас быццам не таіў. А мо рабіў выгляд? Бо жыццё мянялася, не паспееш да аднаго прывыкнуць, як пачыналася новае. І ён цярпеў,

як церпім усе мы часам, не могучы настояць, зрабіць штосьці па-свойму.

Аднойчы мне выпала разам з Язэпам Тарасюком ісці ў Саюз пісьменнікаў. Мяне выклікалі на пасяджэнне секцыі прозы, трэба было чагосьці ў Саюз пісьменнікаў і яму. Была, помніцца, вясна, над Свіслаччу распускаліся вербы і былі яшчэ не зялёныя, а жаўтаватыя — здалёку здавалася, што над дрэвамі павіслі лёгкія аблачынкі. Прыпякала, грэла нязвыклае, нейкае нечакана зыркае пасля зімы веснавое сонца. І над усім блакітнела, аж, здаецца, ззяла, шырокае, светлае, быццам толькі што памытае, неба. І ці то пад уплывам цяпла, сонца, вясны, ці то так ад чаго, але Язэп Апанасавіч раптам расчырванеўся, загаварыў пра тое, што яго, мусіць, мучыла, хвалявала.

— Нешта адчуваю сябе апошнім часам блага. Амаль не сплю па начах.

— Да дактароў трэба схадзіць, праверыцца,— параіў я.

— Да гэтых эскулапаў як трапіш, то абавязкова нешта знойдуць. У бальніцу пакладуць, пачнуць таблеткамі карміць, уколы калоць...

— Нічога не паробіш, калі трэба, то трэба і ў бальніцы паляжаць, і ўколаў пакалоць, і таблетак паглытаць.

— Не хочацца. Дый эпапея мая незакончаная. Каб якнебудзь дацягнуць яе да канца, то тады ўжо нічога не страшна.

— Вы што, яшчэ працяг будзеце пісаць? — аж спалохаўся я.

— Трэба. І лёсы герояў варта неяк закругліць, дый пафіласофстваваць трохі хочацца. За жыццё накапілася і думак розных, і назіранняў. Падзялюся імі з чытачамі. Можа, не ўсе і згодзяцця са мною, але выказаць свае думкі хачу. Як выказаў іх у апошнім томе сваёй эпапеі Леў Талстой, як выказвалі іх іншыя пісьменнікі. Хто ў мастацкіх творах, хто ў крытычных артыкулах, хто ў мемуарах.

— Як я разумею, ваша эпапея будзе з пяці кніжак?

— Так, можа, з пяці, а можа, і з шасці. Усё будзе залежыць ад таго, колькі я пражыву. Дарэчы, над пятай кнігай я працую ўжо. Месяцы два, як пачаў...

Але закончыць пятую кнігу эпапеі Язэпу Тарасюку так і не ўдалося. Нешта тыдні праз два пасля той апошняй нашай размовы я пазваніў да яго на кватэру — прыйшла

карэктура рамана, і трэба было, каб ён яе вычытаў. Вольга Ігнатаўна са слязамі ў голасе паведаміла, што Язэпа Апанасавіча яна не можа паклікаць да тэлефона,— ён у бальніцы.

— Што з ім?

— Падазрэнне на самае горшае. Дактары раяць неадкладна рабіць аперацыю.

Я выказаў упэўненасць, што будзе ўсё добра, хай вельмі не хвалююцца, дактары, маўляў, у нас цяпер выдатныя, папрасіў перадаць Язэпу Апанасавічу прывітанне, паабяцаў нават наведацца да яго ў бальніцу і, развітаўшыся, паклаў трубку...

А яшчэ дзён праз колькі я даведаўся, што Язэп Тарасюк не перанёс аперацыі, памёр. Гэтая сумная вестка дагнала мяне на Палессі, куды я паехаў у камандзіроўку. Купіў у раённым цэнтры свежую газету і ўбачыў прозвішча Язэпа Тарасюка ў чорнай рамцы...

На пахаванні Язэпа Тарасюка я не мог быць, але расказвалі, што Язэп Апанасавіч і ў труне ляжаў як жывы — строгі, сабраны, зашпілены на ўсе гузікі. Такі, які звычайна ён быў заўсёды і ў жыцці.

Вядома, труна з яго целам стаяла ў доме Саюза пісьменнікаў. Грала жалобная музыка, гаварыліся добрыя, прачулыя словы. Адзін з прамоўцаў, разжалобіўшыся, назваў Язэпа Тарасюка нават «вялікім»...

Вось бадай што і ўсё, што было мне вядома пра чалавека і пісьменніка Язэпа Тарасюка...

Цяпер, калі я расказаў усё, што ведаў пра Язэпа Тарасюка, кожны мае права спытаць, чаму не да каго-небудзь іншага, а да мяне звярнулася яго жонка Вольга Ігнатаўна, менавіта мяне запрасіла да сябе на кватэру. Прызнаццца, я шмат над гэтым думаў і сам. І ў той дзень, калі Вольга Ігнатаўна наведалася ў рэдакцыю, і потым, калі пабываў у Тарасюкоў. І вось да якога вываду я прыйшоў. Вельмі можа быць, што Вольга Ігнатаўна мала каго з пісьменнікаў ведала. А тыя, каго ведала, не ўсялялі даверу. Я ж з Тарасюкамі адпачываў разоў колькі ў розных дамах творчасці, і Вольга Ігнатаўна, мусіць, пераканалася, што чалавек я па сваёй натуры мяккі, лагодны. Мой

апошні, перад самай смерцю Язэпа Тарасюка, званок на кватэру, заклапочаная, спачувальная гутарка маглі лішні раз пераканаць Вольгу Ігнатаўну, што яе мужа я цаніў і як чалавека і як пісьменніка, што ў нас з ім ледзь не сяброўскія адносіны. Можа, і сам Язэп Тарасюк добра адгукаўся аба мне, бо я так і не сказаў яму, што думаю пра яго творы. А можа... Можа, у Вольгі Ігнатаўны былі нейкія свае меркаванні, пра якія я нічога не ведаў і не ведаю. Дапускаю — Вольга Ігнатаўна не аднаго мяне запрашала да сябе на кватэру, каб паказаць тое, што асталося там пасля смерці мужа — Язэпа Апанасавіча Тарасюка...

Усе, хто не быў у нашым горадзе гадоў дзесяць — пятнаццаць, прыязджаючы зноў у Мінск, не могуць стрымацца, каб не ўсклікнуць, не сказаць: сталіцы Беларусі проста не пазнаць. Мы, мінчане, ведаем, бачым: горад наш мяняецца, расце, прыгажэе з кожным новым днём. Ці даўно па галоўнай магістралі — шырокім праспекце — грукатаў трамвай? А некаторыя, няйнакш, і забыліся, не помняць нават, што было такое. Ці тая ж плошча Якуба Коласа, дзе цяпер філармонія, Цэнтральны універмаг, Інстытут фізкультуры, паліграфічны камбінат, помнік таму, чыім імем названа сама плошча?.. Сёння плошча Якуба Коласа — адна з цікавейшых мясцін горада. А яшчэ ж на нашай памяці тут туліліся драўляныя хібаркі; замест сённяшніх шырокіх асфальтаваных вуліц былі вузенькія крывыя завулачкі, з граззю, вечнымі лужамі на кожным кроку. Вядомая, апісаная Кузьмой Чорным Камароўка... І вось няма ўжо старой Камароўкі, ёсць вялізная, як ахапіць вокам, плошча, пабудаваны па апошняму слову тэхнікі гожы архітэктурны ансамбль. Кажуць: нішто не стаіць на месцы, усё цячэ, мяняецца. Але, мабыць, нішто так імкліва не мяняецца, як наша беларуская сталіца. Новыя і новыя жылыя раёны, насаджаныя клапатлівымі рукамі старанных мінчан скверы і паркі, праспекты і вуліцы, якіх зусім нядаўна не было і, здавалася, не магло нават быць. Свіслач апранулася ў камень; над ёю ў спякотныя летнія дні лётаюць белакрылыя чайкі. Вуліцы — хай то шырокія праспекты ці вузенькія вулачкі — абсаджаны па абодва бакі купчастымі ліпамі, каштанамі, клёнамі. Вясною, калі распукнуцца, зазелянеюць дрэвы, адыдзіся надвячоркам па Свіслачы да Камсамольскага возера і хоць усю ноч слухай салаўёў. Аж не верыцца — бачыш агні вялікага горада,

а адчуваеш сябе быццам у глухім-глухім лесе, на беразе безыменнай рачулкі ці невялікага, зарослага алешнікам, лазняком, чаротам і асакой возера. А пайдзі ў той жа наш Мінскі батанічны сад. Зусім, здаецца, побач людны праспект з усім яго бясконцым шумным патокам тралейбусаў, аўтобусаў, грузавікоў, легкавушак. А ў батанічным садзе — ціхата, бы ўсё адно дзе-небудзь на Палессі. Пяюць, аж заліваюцца, на розныя галасы птушкі, ныдзьвяць камары, бзыкаюць авадні, пчолы, чмялі. А кветак, кветак колькі ў батанічным садзе! І якіх! Нашых — лугавых, палявых, балотных, і зусім невядомых — крымскіх, каўказскіх, амерыканскіх і яшчэ Бог ведае якіх! Як зацвітуць вясною — вочы разбягаюцца, п'янееш ад водару... У азярцы плаваюць белыя і чорныя лебедзі, плаваюць грацыёзна, велічна,— стой, любуйся. Аж вада бурліць,— ходзіць касякамі рыба. Укінь кавалак абаранка ці батона — наляціць клубком на яго рыба, уміг расшматае. Збоку азярца — бярэзнічак, саснячок, дубняк. Збочыш іншы раз на сцежку, зробіш крокаў колькі, спынішся, вачам сваім не паверыш: ля самай сцежачкі сядзіць, заламаўшы набакір шапку, глядзіць з-пад ліста на цябе баравік, дзівуецца, маўляў, адкуль ты ўзяўся тут, чалавеча... У засені, пад шатамі дрэў, нaліваюцца, спеюць арэхі, а ў гнёздах, у дуплах вылупліваюцца з яек, набіраюцца сіл і моцы птушаняты...

Вёска і горад. Горад і вёска. Мне здаецца, у Мінску спалучаны вёска з горадам і горад з вёскаю. Мо таму тысячы жыхароў, што перабраліся ў пасляваенны час з вёсак жыць у наш горад, і адчуваюць сябе тут, як у сваёй вёсцы. Пяць дзён кожны працуе на фабрыцы, заводзе ці ў якой-небудзь установе, а ў суботу і ў нядзелю — выязджае з горада. Хто на дачу, хто проста ў лес. Лясы каля Мінска вялікія і вельмі ж багатыя на ягады, грыбы і дзічыну. Хапае і транспарту. Едзь, куды захочаш, куды толькі душа твая пажадае... І тысячы мінчан едуць, вяртаючыся назад у горад — рыбакі з добрым уловам, грыбнікі — з грыбамі, ягаднікі — з ягадамі; і ўсе — з цудоўным настроем, адпачыўшы, памаладзеўшы.

Я таксама часта ў суботнія і ў нядзельныя дні выязджаю, як кажа мая Ліна, «на прыроду». Але не менш люблю аставацца і ў горадзе, блукаць проста так, без усялякай прычыны па вуліцах, скверах і парках. Выйдзеш з дому — і пайшоў, пайшоў, куды вядуць цябе твае ногі і вочы. Сядзеш на аўтобус ці трамвай, выедзеш на ўскраіну. Драўляныя домікі, агароджаныя штыкетнікам ці дашчанымі

плоцікамі сады, гароды. Вясною — аж белыя ад квецені вішні, яблыні, грушы. Улетку — зусім як у вёсцы, пахне гуркамі, бульбаю, кропам. Увосень — гразь на вуліцах, лужы. Узімку — гурбы снегу на кожным кроку, не пералезці. Гэта — даўні Мінск, той Мінск, які знікае, знікае імкліва, проста на вачах. Вось пракапана канава — яна перагарадзіла дарогу, ісці далей нельга. Значыцца, будаўнікі дабраліся ўжо і сюды. Пройдзе трохі часу — і знікнуць драўляныя домікі. Бульдозеры расчысцяць пляцоўку, экскаватары выкапаюць яму на падмурак, машыны падвязуць цэглу, цэмент — і вырасце яшчэ адзін гмах-прыгажун, можа, на пяць, а можа, на дзевяць ці дванаццаць паверхаў...

А то возьмеш сумку ці сетку і — на рынак. Той, што за плошчаю Якуба Коласа, на Камароўцы. Божа мой, чаго тут толькі няма, што не прадаецца! Бульба, агуркі, капуста... Яблыкі, грушы, ягады... Малако, тварог, масла... Яйкі, мяса, мёд... Кветкі, зяляніва, гарбузікі. І ўсё гэта і ўлетку, і ўвосень, і ўзімку — круглы год... Ходзіш між людзей, пытаеш, колькі што каштуе, і па тым, як табе адказваюць, здагадваешся, хто адкуль прыехаў — з Грузіі, з Малдавіі, з Украіны, ці аднекуль зблізку — з-пад Слуцка, з-пад Баранавіч ці з Ашмян... Па тым, што на рынку, па якой цане купляецца і прадаецца, можна меркаваць пра многае — пра ўраджаі, пра тое, як — бедна ці багата — жывуць людзі. І не толькі ў горадзе, але і ў вёсцы...

Цягне, вабіць заўсёды да сябе і стары Мінск — раён Нямігі. Можа, таму, што гэта быў першы раён, дзе мне давялося адразу ж па прыездзе ў сталіцу жыць. На вуліцы Няміга некалі стаяў чырвоны цагляны двухпавярховы дом, у якім размяшчаўся універсітэцкі інтэрнат. Інтэрнат, не лепшы — без паравога ацяплення, да таго ж нейкі сыры, змрочны. Сялілі ў гэтым інтэрнаце, як правіла, першакурснікаў. Гэта быў свайго роду санпрапускнік у студэнты — пажыві на Нямізе з год, тады адчуеш, зведаеш, што значыцца быць студэнтам. Жылі ў гэтым інтэрнаце многія, жыў і я. Падымаўся гадзін у сем з пасцелі, абдаваў у агульным — мужчынскім і жаночым — умывальніку ледзяною вадою твар і бег ва універсітэт на заняткі. Менавіта бег, бо сесці на трамвай было проста нельга — вагоны хадзілі заўсёды перапоўненыя, людзі чапляліся за поручні, ехалі на падножках. Назад, у інтэрнат, я вяртаўся ўвечары, калі добра змяркалася, пасля лекцый адседзеўшы астатак дня ў бібліятэцы. Галава кружыцца, хочацца есці, а ты

ідзеш па вузенькім тратуары міма былых яўрэйскіх крамак, і на душы ў цябе светла, радасна — збылася твая мара, ты ў сталіцы, стаў студэнтам, студэнтам таго факультэта, куды так ірвалася, так імкнулася твая душа... І кожны дзень у цябе — свята: слухаеш лекцыі, у якіх выкладчыкі паведамляюць столькі цікавага, патрэбнага, карыснага, што, вядома ж, згодзіцца некалі табе ў жыцці; у бібліятэцы ты бярэш, чытаеш кнігі, якія выдадзены ў розных краінах і гарадах, часам год, часам два, а то і пяцьдзесят, сто гадоў таму назад... І зноў жа — даведваешся пра тое, чаго ты не ведаў і не думаў, што такое было і нават магло быць...

Мінулі гады, а адчуванне радасці, святочнасці, нейкай як бы ўрачыстасці зноў і зноў агартае, перапаўняе мяне, калі я кірyюся на Нямігу. Праўда, і Няміга сёння ўжо змянілася, не тая, зусім не тая, што была. Знесены старыя, пабудаваныя яшчэ далёка да рэвалюцыі, домікі; замест шматлікіх вузенькіх, выбрукаваных дзікім каменем крывых завулачкаў і вуліц — просты, як струна, заліты асфальтам шырачэзны праспект. Няма ўжо і таго цаглянага двухпавярховага асабняка, дзе некалі мясціўся студэнцкі інтэрнат і дзе давялося жыць мне амаль год. Тая спрэчка, што вялася — трэба перабудоўваць стары раён Нямігі ці не трэба,— скончылася. Перамаглі ў спрэчцы людзі рашучыя. І ўсё ж, хай на мяне гэтыя людзі не крыўдуюць, сталіца наша са знікненнем старой Нямігі нешта страціла. Страціла дарагое, непаўторнае, тое што дасталося ад сівой мінуўшчыны, што давала права быць гораду новым і разам з тым — старым... Зноў жа — я не прыхільнік нешта кансерваваць, штучна затрымліваць. Час заўсёды дыктуе свае законы. І калі хочаш ісці ў нагу з часам — трэба яго слухацца. І цяпер ужо многія прыхільнікі старое Нямігі бачаць, што сталіца наша са знікненнем, перабудовай Нямігі не толькі нешта страціла, але і набыла. Набыла новую, так патрэбную Мінску магістраль, набыла новы, вельмі своеасаблівы раён. Відаць, будучае ўсё ж не за кансервацыяй старога ў гарадах, а ва ўмелым спалучэнні старога з новым, новага са старым. Сярэдневяковыя вулачкі і завулкі зусім непрыгодныя для сучаснага транспарту, а пабудаваныя колькі сот гадоў таму назад дамы таксама не тое, дзе хацеў бы жыць сучасны чалавек. А ўпарадкаваць, «абсучасіць» старыя дамы нялёгка. Вядома, прыехаўшы ў такія гарады, як, скажам, Львоў, Вільнюс, Рыга, Талін, бывае, прыемна пахадзіць па старым горадзе,

па тых завулачках і вуліцах, дзе ездзілі калісьці ў сярэднявеччы верхі на конях рыцары, паглядзець на пабудовы, якім па некалькі сотняў гадоў. Але тым, хто жыве цяпер у тых пабудовах, прыемнасці, шчыра скажам, мала...

Час! Час няўмольна дыктуе ўсяму свае законы. Дыктуе свае законы час і Мінску, гораду, у якога вялікае сённяшняе і будучае і не менш слаўнае мінулае. Будучае — у планах, мінулае — у помніках, сённяшняе — у новабудоўлях...

Суботнім ранкам, пазваніўшы Вользе Ігнатаўне, што маюся завітаць сёння да яе на кватэру, і атрымаўшы прыветнае «калі ласка», я апрануўся і выйшаў з дому. Надвор'е трохі перамянілася,—падшэрхла, падмарозіла; нават пачаў падаць снег. Не вокідзь—па лапцю, ці, як часам кажуць, «шапкамі», а з ветрам, дробненькі, рэдзенькі, усё адно што мука-пытляванка. Снег не затрымліваўся на слізкім абледзянелым асфальце вуліц і тратуараў, яго несла, гнала ветрам,— быццам курэла, слаўся пасмамі дым. Адкуль, з якога боку дзьмуў вецер, як і заўсёды ў горадзе, было не разабраць. Але адчувалася: усчынаецца завея. Завея, па якой — не ведаю, як хто, а я такі засумаваў. Наогул, я чамусьці вельмі люблю ў прыродзе ўсё незвычайнае — буры, навальніцы, ліўні, завеі. Неяк аж перараджаешся ўвесь, святлееш душою, пазбываешся непрыемных думак, якія гнялі, мучылі не адзін дзень, не адну ноч, калі здараецца нешта незвычайнае, стыхійнае ў прыродзе. І сёння, убачыўшы, што пачынаецца завея, я не пайшоў садзіцца на тралейбус, а накіраваўся да Тарасюкоў пеша. Жылі Тарасюкі — я гэта ведаў і раней, хоць дома бываць у іх і не даводзілася — на галоўным праспекце, побач з ГУМам. Дарога была недалёкая, звыклая. Некалькі хвілін — і вось ужо плошча Якуба Коласа — вялікая, прасторная, засаджаная маладымі бярозкамі, якія гнуліся ад ветру і вусцішна шумелі. Адлітыя навечна ў бронзе Дзед Талаш і яго сын Панас, сам народны пясняр, народжаныя яго геніем Сымон і Ганна... Здаецца, зусім нядаўна адкрывалі гэты помнік, а ўжо і не ўяўляецца наша сталіца без яго. З плошчы Якуба Коласа нават у такі, як сёння, снежны, завейны дзень відаць другі помнік — помнік-абеліск, што стаіць на плошчы Перамогі. І па меры таго як ідзеш, набліжаешся да гэтага помніка-абеліска, ён паступова вырастае ва ўсёй сваёй непаўторнай велічы. І колькі чаго нагадае табе і пра непакорны горад-герой Мінск у гады вайны, і пра змагарку-партызанку Беларусь,

і тое, што выпала пераржыць у тыя жудасныя дні ўсім нашым людзям. Іншы раз, пакуль пройдзеш гэты кавалак праспекта, у памяці паўстануць і Трасцянец, і Азарычы, і Хатынь, і неаднойчы бачаная ў кіно разбураная, уся ў руінах наша сталіца, папялішчы вёсак, расстраляныя, павешаныя людзі... Успомнішся і сам сабе — тады, у вайну, зусім дзіця, якое гоняць босае па пыльнай дарозе; ззаду ж, за табою, дымна гарыць, падпаленая фашыстамі, родная вёска... Вайна! Каго толькі не апаліла яна, на чыім сэрцы не пакінула шрамаў, крывавага болю. Колькі гадоў прайшло з тых дзён, як яна скончылася, а ўсё яшчэ не забываецца, ніяк не забываецца. Дый ці забудзецца хоць калі?

Ад плошчы Перамогі — усяго некалькі крокаў да таго драўлянага дамка па-над Свіслаччу, дзе некалі у першы дзень вясны ў далёкі 1898 год сабралася дзевяць пасланцоў рабочых арганізацый Расіі, каб на ўвесь свет абвясціць, што нарадзілася, пачала свой шлях новая партыя, партыя, якая бярэ на сябе абавязак вызваліць з-пад прыгнёту ўсіх працоўных, пабудаваць новае, без эксплуатацыі чалавека чалавекам грамадства...

Пяройдзеш Свіслач, апусцішся па цэментовых прыступках у сквер — і апынешся ля помніка другому нашаму песняру — Янку Купалу. Апіраючыся на сукаватую палку, паэт ідзе, быццам з прагулянкі,— спакойны, мудры, задаволены тым, што ўбачыў, пачуў ад людзей, тых людзей, у якіх добрае сёння і яшчэ лепшае заўтра. Міжволі схіліш галаву, пастаіш — ты ж таксама быццам пісьменнік, а робіш ты што, думаеш над чым, як пішаш і ці пра тое, пра што трэба было б пісаць? І пойдзеш, ахоплены новым роздумам, новым неспакоем...

Сёння я ішоў па тратуары праспекта, глядзеў на звілістыя пасмы снегу, што гнала ветрам па асфальце, і думкі мае былі заняты... Ага, думалася чамусьці пра недаўгавечнасць чалавечага жыцця, яго хуткаплыннасць. Пабываць бы ўсюды, дзе толькі можна, аб'ездзіць бы свет, паглядзець, дзе і як жывуць людзі, засвоіць бы тое, што зроблена да цябе іншымі — і тады б... Сказаць сваё слова, сказаць тое, што думаеш. Дый паназіраць бы над усім не некалькі дзесяткаў гадоў, а хоць бы некалькі вякоў. А то... Тут народзішся, толькі пачнеш разбірацца ў сім-тым і адразу ж збірайся ўжо на той свет, рыхтуйся паміраць. І тая ісціна, да якой часам дойдзеш, якую з такой цяжкасцю, пакутамі адкрыеш і якой падзелішся з людзьмі, як выявіцца, зусім не ісціна, а падобна толькі на ісціну, а калі

і ісціна, дык ужо даўно вядомая, адкрытая тымі, хто жыў да цябе. І не ты яе адкрыў, ты толькі паўтарыў... Дый... Добра было б самому зведаць і адчуць многае, каб потым расказаць пра зведанае людзям. Бо адна справа — уявіць, што пераўжывае і адчувае чалавек у пэўнай сітуацыі, і зусім іншае — намаляваць перажытае, зведанае, адчутае, фантазія, уява таксама бывае цікавая, але ж... Хіба можа быць што-небудзь цікавей за праўду, за жыццё! Яны, толькі яны крыніца натхнення творцы, толькі яны жывяць мастака. І нават фантазія — і тая нараджаецца жыццём; у фантазіі мастак выкладае тыя думкі і пачуцці, якія абудзіла ў яго душы і ў галаве тое, чым ён жыве. Жыццё! Дзіўна, але некаторыя людзі часам уяўляюць, быццам жыццё — гэта не тое, як ён жыве, а нешта зусім іншае. Адзін уяўляе, што сапраўднае жыццё — гэта жыццё ў калгасе ці на заводзе, жыццё брыгадзіра, дырэктара завода. Другі пад жыццём разумее жыццё матроса, які аб'ездзіў свет, шмат чаго пабачыў і зведаў. Трэці яшчэ нешта... «Цікавае жыццё пражыў...» А жыццё ў кожнага сваё і пасвойму ў кожнага цікавае. Цікавае яно і ў дырэктара завода, і ў старшыні калгаса; цікавае яно і ў звычайнага калгасніка, рабочага... Нават у таго ж Язэпа Тарасюка, у той жа Вольгі Ігнатаўны... І бяда саміх людзей, што яны не бачаць цікавага самі ў сваім жыцці, не могуць адрозніць цікавае ад нецікавага. «Я шчаслівы!..» «Я — нешчаслівы...» Зноў жа над гэтымі словамі трэба думаць. Што разумее чалавек над шчасцем ці няшчасцем? Бо, як я ўпэўніўся, у кожнага сваё разуменне, сваё паняцце, уяўленне пра шчасце і няшчасце. І наогул, калі добра падумаць, у жыцці чалавека шмат яшчэ неспазнанага, неразгаданага, таго, што не паддаецца аналізу, логіцы. Узяць хоць бы тое, дзеля чаго, скажам, ты ці я нарадзіліся на свет, што мы павінны тут зрабіць, які пакінуць след на зямлі? Ці — чаму нарадзіліся мы ў гэтым стагоддзі, а не на некалькі стагоддзяў раней ці пазней? У гэтай краіне, у гэтых бацькоў, а не ў іншай краіне, у іншых бацькоў? Чаму выбралі тую ці іншую прафесію, таго ці іншага спадарожніка ці спадарожніцу?.. Адказаць на ўсе нашы «чаму» ніхто не можа. А яны ж узнікаюць, патрабуюць адказу. Хацець — і не магчы... А то яшчэ — жыць, ведаючы, што памрэш, і нешта рабіць, думаць пра вечнае, тое, што не канчаецца тваёй смерцю, імкнуцца ўнесці сваё ў гэтае вечнае, быццам табе не ўсё адно, што будзе на зямлі пасля тваёй смерці. Больш таго — не жыць сваім жыццём

так, як жывуць усе людзі, не спаць іншы раз па начах, не гуляць, а карпець над рукапісам, пісаць. Дзеля чаго ўсё гэта? Каб помнілі цябе пасля смерці, згадвалі добрым словам? Але ж што табе да таго — цябе ж не будзе, ты ж будзеш мёртвы. Дый добра, калі яшчэ зробіш ты нешта вечнае, тое што не памрэ. А калі... Калі табе будзе здавацца, што робіш ты вечнае, а на справе выявіцца, што да вечнасці яно не мае ніякіх адносін. Як, скажам, тыя ж творы Язэпа Тарасюка... Што ён думаў, калі іх пісаў? Няўжо ніколі не сумняваўся ў сабе, у сваіх здольнасцях, у тым, што рабіў? Няўжо не верыў ніколі тым, хто спрабаваў гаварыць яму праўду? Ці ўсё ж іншы раз задумваўся і над сваім жыццём, і над тым, што і дзеля чаго робіць, піша? Але і сярод творцаў бываюць геніі і графаманы, людзі апантаныя, якія забываюць на ўсё, толькі твораць, твораць... Што твораць, дзеля чаго — часам не ведаюць самі. Тварыць — іх нармальны стан душы. Што гэта, адкуль такая апантанасць? І чаму аднаму чалавеку дадзены нейкі талент, а другому — не? А можа, талент дадзены кожнаму, ды не кожны яго адкрывае, знаходзіць у сабе? І хто, хто «дае» гэты талент? І не толькі талент, але і прыгажосць, мудрасць? У жыцці шмат самых розных выпадковасцей. Я нарадзіўся на гэты свет, але мог і не нарадзіцца, мог тысячу разоў памерці — і не памёр, жыву. Мог паступіць ва універсітэт, астацца жыць у горадзе, а мог і не паступіць, мог не астацца. Мог сустрэцца з Язэпам Тарасюком — мог і не сустрэцца. Вольга Ігнатаўна магла прыйсці да мяне, паклікаць да сябе на кватэру, а магла і не прыйсці, магла і не паклікаць. Выпадкова ўсё гэта ці не выпадкова? І чаму менавіта сёння я думаю пра ўсё гэта, а не думаў учора, пазаўчора, тыдзень ці месяц назад?..

Вецер парывамі дзьмуў мне ў твар, расхінаў, шкуматаў крысse паліто, сек, быццам шротам, снегам, а я ішоў па праспекце, ахоплены нечаканым роздумам пра жыццё, пра дзіўную, амаль непазнаную істоту — чалавека, які нараджаецца, прыходзіць на зямлю, жыве на ёй, не ведаючы дзеля чаго і навошта, што яму трэба рабіць, а чаго не трэба, колькі ён будзе жыць, з кім сустракацца, што гаварыць, рабіць і калі, дзе і як суцішыцца, памрэ...

Ля патрэбнага мне дома я спыніўся, абтрос з паліто і шапкі снег. І, патаптаўшыся на цэментаванай пляцоўцы, збочыў у пад'езд, пачаў паволі, з адчуваннем нейкай не то

сарамлівасці, не то няёмкасці падымацца па прыступках угору — на чацвёрты паверх,— там была кватэра Тарасюкоў.

Ля абабітых чорнай цыратай дзвярэй, на якіх значыўся нумар 43, я спыніўся, націснуў кнопку званка. У тую ж хвіліну мне адчынілі. Адчувалася: мяне даўно, нецярпліва чакалі.

— Няўжо такім надвор'ем пешкі ішлі? — клапатліва спытала Вольга Ігнатаўна, як толькі пераступіў я парог і зачыніў за сабою дзверы.

— Ведаеце, калі можна прайсціся, нішто асабліва не падганяе, я не езджу, а хаджу,— прызнаўся я.

— Гэтак і Язэп Апанасавіч рабіў. Як толькі была якая магчымасць — хадзіў. Ходзячы, ён абдумваў сцэны, новыя раздзелы. Прыбяжыць дадому, скажа, бывала: «Вольгачка, не чакай мяне, я абдумаў сёе-тое, хачу запісаць». Садзіцца за стол і гадзіну-другую піша...

Слухаючы мілае шчабятанне Вольгі Ігнатаўны, я зняў паліто, павесіў яго на вешалку, што была прыбіта пры ўваходзе да сцяны, разуў чаравікі, усунуў свае ногі ў шырокія, растаптаныя — відаць, Тарасюковы — пантоплі. І, дастаўшы з кішэні грабянец, каб расчасацца, застыў ад здзіўлення — увесь, даволі доўгі, прасторны, як і ва ўсіх старых кватэрах, калідор быў застаўлены зашклёнымі стэлажамі з кнігамі. Прычым кнігі былі не новыя, тыя, што выпускаюць нашы выдавецтвы цяпер, а ранейшых гадоў выдання — даваенныя, дарэвалюцыйныя. Што да кніг, дык гэта мая слабінка — я сам збіраю іх пакрысе, дзе толькі можна. Нават некалькі разоў дзеля таго, каб нешта купіць рэдкае, ездзіў у Ленінград, Маскву, абіваў парогі букіністычных магазінаў. Прага да кнігі ў мяне, мабыць, з таго, што мне ніколі ў жыцці не ўдавалася ўволю чытаць. Вайна разбурыла гарады, папаліла вёскі. Пазнішчала яна і кнігі. Ды так, што ў сваёй вёсцы, куды мы вярнуліся неўзабаве пасля перамогі з Нямеччыны, наогул не асталося ніякіх кніг. Каб нешта знайсці пачытаць, трэба было ехаць у раённы цэнтр. Але і там, у раённай бібліятэцы, цікавых кніг было мала — бібліятэка ў вайну была разрабавана. Ва універсітэце я не вылазіў з бібліятэкі, а як толькі займеў сякія-такія грошы, пачаў купляць кнігі сам. І не толькі новыя, але і старыя, тыя, што па розных прычынах не перавыдаюцца. І прага да кніг з гадамі ў мяне не праходзіць. Капацца ў кнігах, асабліва ў чужой бібліятэцы — у сваёй бібліятэцы ўсе кнігі перамацаны, перагледжаны,

перачытаны, некаторыя нават па некалькі разоў,— любімы мой занятак. І ўбачыўшы кнігі ў Тарасюковай бібліятэцы, я не мог, каб не папрасіць дазволу іх паглядзець.

— Калі ласка, калі ласка,— заўсміхалася Вольга Ігнатаўна.— Язэп Апанасавіч таксама любіў кнігі. Праўда, ён больш пісаў, чытаць не выстачала часу. Але кнігі любіў... І калі здымак прасілі ў газету ці часопіс, імкнуўся фатаграфавацца на фоне кніг, сваёй бібліятэкі...

Я прайшоўся ля стэлажоў, любуючыся і зайздросцячы — бо, як хутка я заўважыў, нават зборы твораў класікаў у Тарасюковай бібліятэцы былі не абы-якія, а найлепшыя, самыя поўныя. Прычым зборы твораў не толькі тых пісьменнікаў, што перавыдаюцца, але і тых, якія выходзілі толькі да рэвалюцыі — Сельмы Лагерлёф, Станіслава Пшыбышэўскага, Леаніда Андрэева, Канстанціна Бальмонта, Фёдара Салагуба, Дзмітрыя Меражкоўскага, Міхаіла Арцыбашава... Былі тут і зборы твораў, што выдаваліся ў дваццатых — трыццатых гадах,— Барыса Пільняка, Велеміра Хлебнікава, Андрэ Жыда, Анры дэ Рэнье, Шарля Луі Філіпа... Былі і зборнікі прозы, паэзіі, на цяперашні час, унікальныя — «Иверни» М. Валошына, «Камень» О. Мандэльштама, кніжкі А. Белага, А. Рэмізава... Я адсоўваў шкло, браў з паліц то тую, то іншую кнігу, гартаў яе пажоўклыя ад часу старонкі, чытаў, разглядаў — гэта было багацце, якога я не бачыў, нават не ўяўляў, што яно можа быць у Мінску — горадзе, які быў разбураны, амаль дашчэнту знішчаны ў гады вайны. Як, як магла ацалець, захавацца такая бібліятэка? Дый... Неяк не ўкладвалася ў галаве: Язэп Тарасюк — і раптам такія кнігі — мадэрністы, акмеісты, сімвалісты, футурысты і наогул Бог ведае хто...

— Вы і сюды, сюды зазірніце,— паслужліва адчыніла адну з дзверцаў стэлажа Вольга Ігнатаўна.— Паглядзіце, што за кнігі стаяць тут. Я сама ў іх не вельмі разбіраюся, а Язэп Апанасавіч тыя кнігі хаваў ад людскіх вачэй...

Сапраўды — кнігі, што там стаялі, былі такія, якія не кожны мог бачыць, а тым больш — трымаць у сваіх руках. Падшыўкі часопісаў «Аполлон», «Записки мечтателей», «Красная новь»... В. Розанаў, Ул. Салаўёў, М. Бердзяеў... Крапоткін, Ніцшэ, Шапенгаўэр... Трэба ж, я не ведаў пра гэтую бібліятэку раней! Мог жа сёе-тое калі не выпрасіць сабе, дык хоць узяць ды пачытаць... Тым болей — гэта кідалася ў вочы — ні гаспадар, ні гаспадыня толку ў кнігах добра не ведалі, бо кнігі стаялі ў стэлажах без усяля-

кай сістэмы, парадку. Сярод кніг рускіх пісьменнікаў сустракаліся кнігі замежных аўтараў, сярод паэзіі — проза, філасофія, крытыка.

— Скажыце, калі ласка, Вольга Ігнатаўна,— не вытерпеў урэшце я,— сабраць такую бібліятэку трэба час. Дый захаваць яе...

Вольга Ігнатаўна зноў усміхнулася. Міла, са шчырай дабрынёй.

— Язэпу Апанасавічу займацца гэтым, можаце паверыць, не было калі. Ён пісаў. Пісаў увесь вольны час. А кнігі... Гэтыя кнігі мы забралі.

— Як забралі?

— Звычайна. Чалавек адзін такі быў — кнігі надта любіў і збіраў. Ён памёр. А нашчадкаў у яго нікога не асталося. То тая гаспадыня, дзе ён жыў, паклікала неяк да сябе мяне — мы з ёю некалі разам працавалі — і Язэпа Апанасавіча і прапанавала нам забраць гэтыя кнігі, аслабаніць ёй кватэру. Так забіраць кнігі было няёмка, то мы ёй і грошай трохі далі... Ведаеце, Язэп Апанасавіч — пісьменнік і жыць у кватэры без кніг... З кнігамі яно, самі разумееце, неяк спрытней, салідней... А што, кнігі гэтыя цікавыя?

— Вельмі, вельмі цікавыя.

— Праўда? — шчыра падзівілася Вольга Ігнатаўна.— Гэта ж мы бібліятэку Пастушонка забралі. Дзівак чалавек! Хадзіў у рыззі, не еў, не піў — да капейкі аддаваў на кнігі...

Пра кніжніка Пастушонка я сёе-тое чуў. Мінскія кнігалюбы ведалі яго. Вядома, не маладыя, а пажылыя, тыя хто пачынаў збіраць свае бібліятэкі яшчэ да вайны. Быў, казалі яны, такі ў Мінску чалавек, які даражэй за ўсё цаніў кнігу. Любіў яе, ведаў, як мала хто. Працаваў ён у адным з музеяў, зарплату атрымліваў невялікую і амаль усю, да капейкі, заганяў на кнігі. У Пастушонка была жонка, нарадзілася нават дзіця. Але жонка не вытрымала мужавага захаплення кнігамі — уцякла ад яго. Ды Пастушонак не вельмі і шкадаваў, што так здарылася,— больш ён не жаніўся, увесь вольны ад працы час аддаваў пошукам кніг. На адпачынак ён ездзіў не на мора, не ў вёску — а ў Маскву, Ленінград. І цэлы месяц хадзіў з аднаго букіністычнага магазіна ў другі. Букіністы пакідалі Пастушонку тое, што ён прасіў. Калі ў Пастушонка не хапала грошай, ён адкладваў кнігі, прасіў прысланць іх пасылкай у пэўны месяц, калі, ён адчуваў, будзе ў яго лішні рубель.

Не спаў у шапку Пастушонак і ў самім Мінску — як толькі чуў, што ў кагосьці ёсць у хаце кнігі, імкнуўся ўсімі сіламі завесці знаёмства, пабываць у чалавека на кватэры — і пабачыць на свае вочы, што там за кнігі. І калі здаралася, што ў бібліятэцы таго чалавека была хоць адна кніга, якой не было ў Пастушонка і якую яму хацелася мець, бедны быў той чалавек! Пастушонак не адставаў ад яго — ездзіў, званіў па тэлефоне, «выпадкова» спатыкаў на вуліцы — і прасіў, маліў аддаць, прадаць, абмяняць тую кнігу. І рэдка хто вытрымліваў асаду Пастушонка, не аддаваў яму тое, што ён хацеў.

Калі пачалася вайна, Пастушонка на фронт не ўзялі — ён быў блізарукі. Баючыся, што немцы могуць яго збор рэквізаваць ці кнігі могуць згарэць разам з тым драўляным домам, дзе ён жыў, Пастушонак пазапакоўваў іх у мяшкі, скрынкі і пазакапваў проста ў двары. І кнігі перажылі вайну, асталіся цэлыя, некранутыя...

— Вольга Ігнатаўна, скажыце, калі ласка, а сам Язэп Апанасавіч быў знаёмы з Пастушонкам?

— Чаму ж не, быў. Нават разоў колькі выручаў яго — пазычаў грошы. Але Пастушонак быў чалавек вельмі акуратны — заўсёды аддаваў усё да капеечкі. Гэта не некаторыя пісьменнікі. Возьме сотню-другую і забудзе, што браў. Ды вы не стойце ў калідоры, праходзьце, калі ласка...

І Вольга Ігнатаўна — цяпер толькі я заўважыў, што яна не ў хатнім халаце, а ў новай, прыгожа пашытай светла-крэмавай сукні,— адчыніла шкляныя дзверы, прапусціла мяне ў пакой. У ім падлога была заслана тоўстым, з узорамі кілімам; на кіліме стаяў стол, ля яго — крэслы. А сцены... Не, я спачатку разгубіўся — куды трапіў? На сценах вывешаны былі здымкі. Здымкі, кнігі, лісткі нейкіх рукапісаў, ручкі, алоўкі ляжалі за шклом на знарок зробленых падстаўках... У куце, у зашклёнай шафцы,— пінжак, штаны, кашуля, туфлі... Гэта была не кватэра, а музей. Я акінуў вачыма ўсё гэта — і не ведаў, што мне рабіць: стаяць сярод пакоя ці праходзіць далей.

— Вы не чакалі ўбачыць на кватэры такое? — усміхалася, па ўсім відаць, радая, што змагла агаломшыць, здзівіць мяне, нейкая асабліва ўрачыстая, святочная Вольга Ігнатаўна.— Але я некалькі разоў хадзіла знарок у музеі Янкі Купалы і Якуба Коласа, каб паглядзець, як там. Ездзіла нават у Кіеў, у музей Тараса Шаўчэнкі. Скажу шчыра — тыя музеі, што бачыла я, бяднейшыя ў сім-тым. Людзі, што акружалі тых пісьменнікаў, не вельмі клапаці-

лiся, каб захаваць нашчадкам усё, што звязана з вялікімі імёнамі. А збіраць потым кожную дробязь цяжка. Я, як толькі стала жонкаю Язэпа Апанасавіча, пачала адразу ж думаць, каб зберагчы ўсё, што толькі можна. Напіша Язэп Апанасавіч які-небудзь твор, я куплю яму новую ручку, а тую, якою ён пісаў, хаваю. Не дазваляла я яму знішчаць — рваць ці паліць — ні аднаго рукапісу. Усе паперкі, дзе толькі нешта напісана рукою Язэпа Апанасавіча, у мяне ў чамаданах... Інакш нельга. Вялікія людзі самі не думаюць пра сябе, пра тое, што знішчыць, а што пакінуць нашчадкам. Яны пішуць, твораць. Захаваць усё, што іх акружала, гэта задача жонак, дзяцей... Як вы, згодны са мною?

— Вядома,— кіўнуў я галавою хутчэй механічна, чым асэнсавана, уражаны, збянтэжаны ўбачаным і пачутым. (Зноў, зноў гэтая мая згодлівасць, няўменне сказаць у вочы ўсё, што думаю, боязь абразіць, пакрыўдзіць чалавека!)

— І калі Язэп Апанасавіч памёр, я сама вырашыла паклапаціцца пра яго памяць. Перабралася ў адзін пакойчык, дзе была калісь наша спальня, а ў двух астатніх зрабіла музей. У гэтым пакоі, дзе мы з вамі, я сабрала ўсё, што звязана з жыццём Язэпа Апанасавіча. Бачыце, гэта хата, дзе нарадзіўся Язэп Апанасавіч,— падвяла мяне бліжэй да здымкаў Вольга Ігнатаўна,— гэта школа, у якой ён вучыўся, першая фатаграфія яго самога...

Я глядзеў то на адзін, то на другі здымак, і, прызнаюся шчыра, мне было цікава. Цікава бачыць хлапчука Язэпку Тарасюка — у лапцях, у штанах з лапінамі на каленях і ў палатнянай кашульцы, з кніжкамі пад пахай; бачыць яго ў салдацкім абмундзіраванні той, яшчэ царскай арміі, потым байца-чырвонаармейца, загадчыка нейкага склада, дырэктара рэстарана... На ўсіх здымках Язэп Тарасюк быў сур'ёзны, нідзе не ўсміхаўся, глядзеў упарта, проста на таго, хто фатаграфаваў. Нельга было не запомніць яго валявы падбародак, шырокі пакаты лоб, бровы, што зрасліся на пераноссі. На некалькіх здымках Язэп Тарасюк стаяў поплеч з мілавіднай, стройнай, я сказаў бы, нават прыгожай дзяўчынай — дзяўчына ўсміхалася, глядзела какетліва, з нейкім як бы падкусам. Я спытаўся ў Вольгі Ігнатаўны, што гэта за жанчына — ці не сястра Язэпа Апанасавіча?

— Не, не сястра,— адмоўна хітнула галавою Вольга Ігнатаўна і неяк ураз сцялася, пасуравела.— У Язэпа Апанасавіча не было сясцёр. Былі два браты, але адзін з іх

загінуў у імперыялістычную вайну, другі — у грамадзянскую. А жанчына гэтая... Так, з песні слова не выкінеш... Язэп Апанасавіч жыў з ёю нейкі час як з жонкаю... Жанчына легкадумная, яна не разумела Язэпа Апанасавіча, яго захаплення літаратурай... Давялося ім разысціся... Я доўга думала, выстаўляць гэтыя здымкі ці не. І ўсё ж выставіла — хай людзі бачаць маю аб'ектыўнасць, калі справа ідзе пра такога чалавека, як Язэп Апанасавіч... Была ў яго такая жанчына, хай яна будзе і на здымках. Што было, тое было...

Страшная гэта штука — цікаўнасць! Не ведаю, як у каго, а ў мяне яна... Словам, калі нехта пацягне нейкую нітку, я не магу стрымаць сябе, каб пры мне не разматалі да канца ўвесь клубок. А можа, і ва ўсіх пісьменнікаў такая цікаўнасць? І, пачуўшы тое, што расказала мне Вольга Ігнатаўна, я ўжо не мог, каб не спытаць:

— Выбачайце, Вольга Ігнатаўна, але я так мала ведаю і пра жыццё самога Язэпа Апанасавіча, і пра вас, і пра тую невядомую жанчыну...

— Язэп Апанасавіч быў чалавек сціплы. Ён мала калі гаварыў пра сябе, мала пра сябе пісаў. Гэта некаторыя пісьменнікі толькі тое і робяць, што трубяць пра сябе — дзе ён быў, што бачыў, што рабіў. З мухі часам слана робяць. А Язэп Апанасавіч пра сябе ўспамінаў рэдка. Яго больш цікавіў час, эпоха, тыя змены, што прынесла ў жыццё людзей савецкая ўлада. Таму не дзіўна, што не толькі вы, але і ўсе астатнія людзі мала яго ведаюць. Калі мы з ім пазнаёміліся... О, я не магу, каб не расказаць пра гэта больш падрабязна. Гэта былі такія светлыя, незабыўныя дні. Ды вы не стойце, прысядзьце, калі ласка...

І Вольга Ігнатаўна, распагоджаная, неяк амаль што летуценна паказала мне на крэсла — глыбокае, абцягнутае карычневым дэрмацінам (такія крэслы выпускалі нашы мэблевыя фабрыкі яшчэ гадоў дзесяць — пятнаццаць таму назад). Я сеў. Села насупраць да стала і Вольга Ігнатаўна.

— Бачыце,— загаварыла яна, як мне падалося, трохі нібыта саромеючыся,— Язэп Апанасавіч заўсёды быў культурны, вельмі тактоўны і, я сказала б, надта ціхі чалавек. Нікуды асабліва не лез, не вырываў сабе нічога. Таму, можа, адразу ж пасля перамогі пра яго і забыліся, не далі яму кватэры. І ён, тады ўжо даволі вядомы чалавек, змушаны быў хадзіць па горадзе, шукаць сабе жыллё. І аднаго дня натрапіў да мяне ў хату. Я жыла адна. Мой муж, з якім мы сышліся перад самай вайною, загінуў на

фронце. Скажу вам шчыра — пускаць да сябе ў хату адзінокага мужчыну я баялася. Але Язэп Апанасавіч быў такі чалавек... Мы з ім хутка пасябравалі, пачалі дзяліць і хлеб, і соль... Я працавала санітаркай у бальніцы, умела абыходзіцца з людзьмі. А Язэп Апанасавіч — чалавек быў ані не прыстасаваны, ён цэлымі днямі карпеў над рукапісамі, забываўся нават часам схадзіць у сталоўку, каб паабедаць. А можа, у яго тады не заўсёды і грошы былі на абед? Мужчыны неарганізаваныя ў быту. А Язэп Апанасавіч асабліва быў неарганізаваны... Вось я і ўзялася за ім даглядаць. Мыла яго кашулі, варыла яму есці. Аддзяжуру свае гадзіны ў бальніцы і — дадому, шукаю, што б яшчэ зрабіць у хаце, каб кватаранту было лепш. І гэтай клапатлівасцю спадабалася Язэпу Апанасавічу. Калі яму давалі кватэру — не гэтую, а спачатку маленькую, аднапакаёвую, ён прапанаваў і мне пераехаць туды таксама. «Будзем разам жыць»,— сказаў ён. Я падумала, падумала... і не згадзілася. Па-першае, адзін пакойчык... Потым... Раптам не спадабаюся я яму, знойдзе сабе лепшую. Я ж амаль без адукацыі, а ён — пісьменнік... Дзе я тады дзенуся? А так у мяне заўсёды свая хата, як хачу, так і жыву. Язэп Апанасавіч не пакрыўдзіўся на мяне. Пераехаў у свой пакойчык. Але жыць там адзін і працаваць не мог. Яму патрэбна была я. І ён хадзіў да мяне штодзень, пакуль, урэшце, я не згадзілася выйсці за яго замуж. Мы распісаліся, але хату тую на ўскраіне горада не спяшаліся збываць. Язэпу Апанасавічу там вельмі ж добра працавалася. Пакапаецца сабе ў гародзе, садзе — і за стол. Там, у той хаце, ён напісаў свае вядомыя творы — раман «Перад світаннем», аповесць «Рыштаванні». Калі гэтыя творы былі надрукаваны, Язэпу Апанасавічу прапанавалі пасаду ў адной з рэдакцый і новую кватэру. Ад пасады ён адмовіўся — не надта высокая яна была, а Язэп Апанасавіч... Словам, перарос ён даўно тую пасаду... А што да кватэры, то кватэру мы ўзялі. Яна нам спадабалася, у ёй можна было жыць і працаваць. Сваю хату мы прадалі, пераехалі вось сюды жыць. Я некаторы час яшчэ дзяжурыла ў бальніцы, потым пакінула працу. Ведаеце, хапала розных клопатаў дома. Трэба было і прыбраць у кватэры, і згатаваць што-небудзь паесці, і схадзіць у магазін, з'ездзіць на рынак... А то гэтыя перапісванні, перадрукоўванні... Язэп Апанасавіч бегаў то да адной, то да другой машыністкі, прасіў перадрукаваць. А за перадрук трэба плаціць грошы. Дый не заўсёды машыністку можна лёгка знайсці, машыністкі занятыя. А ад-

дасі нявопытнай — абы-што надрукуе. Почырк у Язэпа Апанасавіча не надта каб, не кожны яго разбярэ. Дый... Ім прыгодніцкія раманы давай перадрукоўваць, каб цікава было... А проза Язэпа Апанасавіча... Не, гэта не дэтэктыў... Ага, дык мы купілі сваю машынку, я пахадзіла на курсы машыністак, навучылася сама друкаваць. Хоць дзесяць, хоць дваццаць разоў магла, адну і тую ж старонку перадрукоўваць. І грошы не трэба плаціць, і машыністак шукаць. А вы,— звярнулася раптам да мяне, паглядзела проста ў вочы, Вольга Ігнатаўна,— самі сабе друкуеце?

— Ды не, машыністкам аддаю.

— Дарэмна. Купіце машынку, самі падвучыцеся ці хай жонка на курсы паходзіць. Гэта ж клопату ніколі потым мець не будзеце з машыністкамі. Трэба — дзень пасядзеў, два — і гатова, куды хочаш рукапіс нясі. І вычытваць не заўсёды абавязкова, бо гэта ж робіш не дзеля грошай, не каб зарабіць, а... Вы ж самі павінны ўсё разумець... Язэп Апанасавіч — працаўнік асаблівы, ніколі хвіліны без справы не сядзеў. У яго распарадак свой быў. Паднімаецца раненька — і ў парк. Прагулянка на гадзіну, потым філіжанка кавы — і за стол, гадзіны дзве працуе. За гэты час я схаджу ў магазін, згатую снеданне. Ён паесць і зноў — за стол, зноў за працу. Не рабіў нічога ён толькі гадзіны тры пасля абеду ды перад самым сном. На ўсё іншае часу ў яго ніколі не хапала. Ён думаў пра свае творы, нават калі мы гулялі разам дзе-небудзь у парку. Я прывыкла да яго маўклівасці, сама стала маўклівая. Неяк прачытала ў аднаго пісьменніка, што ўсе пісьменніцкія жонкі — невыносныя балаболкі. Можа, ёсць і такія. З мужам нагаварыцца ніколі не можа, бо ён маўчыць, думае і думае пра сваіх герояў. То хоць з чужым чалавекам душу адвядзе. Але я і з чужымі людзьмі надта не давала волі свайму языку. Дый пра што мне з кім гаварыць? Свайго жыцця ў мяне асаблівa не было. Я ўсё рабіла толькі дзеля Язэпа Апанасавіча, каб ён ні ў чым не адчуваў патрэбы, каб ён працаваў... Пісьменнікам не заўсёды шанцавала на жонак, многія загінулі раней часу, не напісалі таго, што маглі б напісаць. Жанчыны не хацелі марнець, яны хацелі жыць. У чым-небудзь сябе ўшчаміць, абдзяліць — не кожная на такое здатна. А я сябе ўсю аддавала Язэпу Апанасавічу, глядзела толькі аднаго яго. І тое, што ён так многа напісаў, што працаваў штодзень — у гэтым ёсць,— Вольга Ігнатаўна з гонарам падняла галаву,— і мая заслуга... Пра гэта неаднойчы казаў і сам Язэп Апанасавіч: «Вольгачка (ён

мяне заўсёды Вольгачкай зваў), без цябе я даўно б загінуў...»

— Адчуваецца, жылі вы душа ў душу, у згодзе поўнай, ніколі, мусіць, і не пасварыліся?

— Ой, што вы,— аж сумелася, сарамліва апусціла вочы долу Вольга Ігнатаўна.— За што ж нам было сварыцца? Язэп Апанасавіч не курыў, не піў гарэлкі, да чужых жанчын таксама не быў падкі. Ён бярог сілы, каб працаваць. Усё для твораў, толькі для твораў, нічога сабе. Нават дзетак не асмельваўся завесці, хоць я і прасіла яго. «Дзеці патрабуюць клопатаў. Хай дзяцей гадуюць тыя, хто іншага нічога не можа рабіць» — вось яго словы. Прызнаюся вам, я плакала, пачуўшы такое. Мне, як, відаць, і кожнай жанчыне, хацелася мець дзіцятка. Але потым я змірылася. Сапраўды, займацца дзецьмі Язэпу Апанасавічу не было калі. Ну, а мне... Вядома, каб я нарадзіла дзіцятка, было б весялей. Ды што зробіш — не кідаць жа з-за гэтага Язэпа Апанасавіча. Жывуць жа людзі без дзяцей, пражыву і я... Падумала так,і... Хацела, каб ён ні ў чым не меў патрэбы, каб думаў толькі пра творы і больш ні пра што... Яго спакой — гэта было для мяне святое. Калі ён адчыняў вось гэтыя дзверы,— паказала вачыма на пафарбаваныя белаю фарбаю глухія дзверы ў сцяне Вольга Ігнатаўна,— заходзіў у свой кабінет, я сядзела, як мышка, старалася, каб не скрыпнула, не грукнула. Нават да тэлефона, калі хто званіў, не клікала. «Яго няма дома»,— адказвала я кожнаму. І цяпер вось гаманю з вамі, а здаецца мне, што за дзвярыма сядзіць Язэп Апанасавіч, працуе...

Толькі цяпер я здагадаўся, чаму Вольга Ігнатаўна гаворыць са мною ціхенька, амаль пошапкам — прывыкла за жыццё, баіцца ў хаце гучна слова прамовіць.

— А ці можна было б зірнуць мне на кабінет Язэпа Апанасавіча, паглядзець, дзе ён пісаў свае творы? — спытаў я ў Вольгі Ігнатаўны.

— Вядома, можна,— паднялася лёгка, амаль па-дзявочы, хаця была яна даволі пажылая ўжо кабета, Вольга Ігнатаўна.— Я там нічога не мяняла, пакінула ўсё так, як было і пры жыцці Язэпа Апанасавіча. Хадземце, я вам пакажу...

Вольга Ігнатаўна падышла да тых дзвярэй, што глуха бялелі ў сцяне, адчыніла іх... І я ўбачыў зеленаватыя, без усялякіх узораў сцены, зацягнутае палатнянымі шторамі акно, а пры ім — масіўны, даўнейшай работы канцылярскі стол, які і цяпер яшчэ дзе-нідзе можна сустрэць у на-

шых рэдакцыях — з дзвюма тумбачкамі па баках, з шуфлядай, зверху абцягнуты чорным дэрмацінам. На стале стаяла звычайная шкляная чарніліца, ляжала драўляная, з пяром, ручка, стосік белай паперы. Ля стала, павернутае трохі ўбок, мясцілася вялікае, мяккае, абшытае скурай крэсла. Больш у пакоі не было нічога. Нават падлога не была нічым заслана.

Я, крыху расчараваны, паглядзеў на Вольгу Ігнатаўну: я чакаў убачыць усё, што хочаш, толькі не гэта.

— Сціпла, вельмі сціпла,— сказаў я, каб не маўчаць, што-небудзь сказаць.

— Язэп Апанасавіч не любіў, каб у яго кабінеце было што-небудзь лішняе. Яно замінала яму думаць, працаваць, адцягвала ўвагу. І мы павыносілі з пакоя ўсё, што толькі можна вынесці. Язэп Апанасавіч быў чалавек ледзь не прымхлівы. Ён не дапускаў у сваім быту ніякіх перамен. Неяк зайшоў да нас адзін пісьменнік, прозвішча яго я вам называць не буду, і пасмяяўся з Язэпа Апанасавіча, сказаў: «Ты хоць бы стол памяняў на больш сучасны. А то і ў гэтым старамодны...» Тыдняў колькі мы абмяркоўвалі з Язэпам Апанасавічам — варта мяняць стол на больш сучасны ці не варта. Абмяркоўвалі, абмяркоўвалі і пакінулі ўсё ж гэты. «За гэтым сталом я столькі напісаў, столькі перадумаў... І выкінуць? Каб хоць падарыць якому-небудзь маладому пісьменніку... А то выкінуць? Не! Дый ці за новым, мадэрновым сталом будзе так працавацца, як працавалася за гэтым? Я прывык да стала, і ён прывык да мяне. Як толькі саджуся за яго — адразу ж уключаюся ў працу. Бы электрачайнік у ток. У галаве ўзнікаюць думкі, словы кладуцца на паперу...» Так стол мы і не памянялі. Гэтак і з чарніліцай, ручкай... Пайшлі гэтыя самыя самапіскі, потым шарыкавыя. Спрабаваў і Язэп Апанасавіч прывыкнуць да іх — нічога ў яго так і не атрымалася. «Пушкін гусіным пяром пісаў, і то ў літаратуры астаўся,— жартаваў часам Язэп Апанасавіч.— А я якнебудзь свае творы напішу чарнілам, як і ў школе мяне вучылі пісаць». Адзінае, да чаго з цяжкасцю ўдалося яму ўсё ж прывыкнуць,— гэта папера. Раней ён пісаў толькі ў сшытках у клетачку. Але ў сшытку няма разгону, старонкі трэба прамакаць, перагортваць. І Язэп Апанасавіч пастулова прывык да звычайнай машынапіснай паперы... І ў ядзе ён гэтакі ж быў, і ў адзенні. Прывык, каб есці суп са свежай капусты ў абед — то і зімою і вясною вары. Дзе хочаш дастань капусты, а суп капусны падай на стол.

А з касцюмамі таксама цэлая бяда была! Прывык, каб пінжак быў двухбортны, каб ніякага разрэзу ззаду не было. А тут мода памянялася, пачалі шыць пінжакі аднабартовыя, то з двума, то з трыма гузікамі, з разрэзамі ззаду, то пакарочаныя, то падоўжаныя... Ходзіш, ходзіш па магазінах, не купіш нічога, толькі раззлуешся. Давялося заказваць касцюмы ў атэлье. А там — чэргі, прымеркі. А ў Язэпа Апанасавіча распарадак свой — не можа ён, як некаторыя, праседжваць гадзінамі ў чарзе, чакаць, пакуль яго прыме нейкі кравец...

— Каб вам напісаць успаміны пра Язэпа Апанасавіча, кажаце, было б пра што,— не вытрымаў, пажартаваў я.

— Вядома! — не зразумела майго жарту Вольга Ігнатаўна.— Пра ўспаміны я якраз думаю. Абавязкова трэба іх напісаць, каб людзі ведалі, які гэта быў цудоўны чалавек — Язэп Апанасавіч Тарасюк. Але з мяне які ж пісар? Я да вайны закончыла нейкіх класаў пяць. Думкі, назіранні ў мяне ёсць, а вось як іх аформіць?

— Пішыце ўсё, што ведаеце, помніце,— параіў я.

— Дык жа спрабавала... Здаецца, і помню ўсё добра, а вазьму ў рукі ручку, напішу слова — і з галавы ўсё вылятае. Тут было, і тут нічога няма. Таму і паклікала я да сябе вас. Можа б, параілі, як гэта лепш зрабіць?

— Што тут асабліва раіць. Калі самі не можаце, папрасіце, каб нехта за вас напісаў. Вы будзеце расказваць, а ён запісваць. Слова ў слова, а потым рэдактары адрэдагуюць.

— А хіба можна так?

— Чаму ж не, усяк можна. Такое часта робяць. Ёсць людзі, якія з гэтага ядзяць хлеб. Заключаюць дамову — і працуюць.

— Ага,— узрадавалася Вольга Ігнатаўна,— значыцца, такое можна будзе зрабіць. Мусіць, варта папрасіць і яшчэ сяго-таго, каб напісалі ўспаміны пра Язэпа Апанасавіча. З тым, каб выдаць кніжку... Але,— падумала яна.— Адных успамінаў мала. Язэп Апанасавіч быў такі чалавек! Дый матэрыялаў у мяне розных колькі! Не толькі фатаграфій, але і рукапісаў, рознага адзення, абутку Язэпа Апанасавіча. Што з усім гэтым рабіць? Можа, ставіць пытанне, каб стварылі музей, га, як вы думаеце?

— Музей?! Гм...

Я, чалавек вельмі спакойны, пачынаў траціць цярплівасць і, як звычайна ў такія хвіліны, злавацца.

— А што,— матэрыялаў на музей у мяне хопіць. А сёе-тое і сабраць яшчэ можна.

— Бачыце-е...

Не, тут ужо нельга было далей слухаць, падтакаваць і натхняць... Трэба было, я гэта адчуваў, неяк астудзіць Вольгу Ігнатаўну, стрымаць яе ініцыятыву. Але як, як?

— Бачыце,— на ўсякі выпадак сказаў я як мага разважліва, з роздумам.— Музей даецца не кожнаму пісьменніку. Патрэбны штаты, грошы, памяшканне... Гэта робіцца не само па сабе, а паводле рашэнняў адпаведных органаў.

— Дык я вас таму і паклікала, каб параіцца, куды звяртацца, якія патрэбны паперы і як іх афарміць. Я ўжо з сім-тым раілася, была ў Саюзе пісьменнікаў. Там скептычна аднесліся да маёй задумы, раяць, можа, напачатку спыніцца на кватэры-музеі. Але я нязгодна з тымі таварышамі, з якімі гаварыла. Язэп Апанасавіч быў вялікі чалавек, ён шмат працаваў, напісаў больш дзесятка кніг. І такому не арганізаваць музея?

— Усё гэта праўда,— зноў ухіліўся я ад прамога адказу.— Але ж што б вы ні рабілі дзеля памяці Язэпа Апанасавіча, вам не мінуць Саюза пісьменнікаў. Адна справа — прыватная асоба, зусім іншае — арганізацыя, ды яшчэ такая ўплывовая, як Саюз пісьменнікаў. Таму я параіў бы са свайго боку перш за ўсё стварыць камісію па літаратурнай спадчыне. Камісія агледзіць тое, што асталося пасля смерці Язэпа Апанасавіча, выкажа свае меркаванні. Пісьмова альбо вусна. Камісію заслухае Прэзідыум, Прэзідыум прыме рашэнне, пашле яго ў адпаведныя органы...

— Гэта зацягнецца,— расчаравана ўздыхнула Вольга Ігнатаўна.

— Што зробіш,— развёў я рукамі,— такі парадак. Ён заведзены не намі, не нам яго і парушаць.

Вольга Ігнатаўна задумалася.

— Яно можна было б і праз Саюз,— сказала яна праз некаторы час.— Але ж у Саюзе і пры жыцці Язэпа Апанасавіча было шмат... Ну, можа, не ворагаў, але людзей, якія непрыхільна ставіліся да яго творчасці. Язэп Апанасавіч неаднойчы мне пра гэта гаварыў. Розныя літаратурныя снобы, крытыкі, мадэрністы... Ім не зусім па нутры была творчасць Язэпа Апанасавіча. Як цяпер яны аднясуцца да маіх прапаноў?

— Як аднясуцца, так аднясуцца, але мінуць Саюз усё адно вам не ўдасца. Куды вы ні звернецеся, куды ні пойдзеце, першае, што ў вас спытаюць, ці абмяркоўваў гэтае пытанне Саюз, якая там думка. Таму пачынаць усю справу трэба, вядома, з Саюза...

Я пачынаў злавацца яшчэ больш. Замест таго каб сказаць Вользе Ігнатаўне проста ў вочы праўду, адкрыць ёй, што за пісьменнік быў той чалавек, з якім яна жыла, дзеля якога нічога не шкадавала, нават асталася без самага дарагога — дзяцей, я... звальваў гэты клопат на Саюз. Саюз я трохі ведаў. Там створаць камісію, камісія будзе тры гады збірацца і так і не збярэцца. А калі і збярэцца, рашэння ніякага яна не прыме, толькі падрыхтуе нейкія свае прапановы, падасць іх на прэзідыум... А можа... Можа, я раблю і правільна, што не кажу жанчыне вось так адразу, проста ў вочы ўсёй праўды пра яе мужа? Лепш зрабіць гэта паступова, падрыхтаваць... Бо так, адразу... Ды, прызнацца, мне шкада было, вельмі шкада і самой Вольгі Ігнатаўны, і той сізіфавай працы, якую яна паклала, каб сабраць усё, што толькі можна сабраць пра Язэпа Апанасавіча. «Сапраўды, такую б жонку, якому-небудзь таленту! Што б ён зрабіў, як бы зберагласяя для нашчадкаў уся яго спадчына! Хаця... Хто можа сказаць, як было б, каб ля класіка жыла такая жонка? Можа б, ён не стварыў і таго, што стварыў? Кажуць жа: кожны мае тое, што ён заслугоўвае.

Цікавасць да мяне як да дарадцы, чалавека, які ва ўсім паможа, у Вольгі Ігнатаўны — гэта я адчуваў — падала. І каб зусім не расчараваць Вольгу Ігнатаўну, я сказаў ёй:

— Якраз усё можа добра вырашыцца. Толькі вы не спяшайцеся, не падганяйце падзеі.

— Не спяшацца я не магу. Мне не дваццаць гадоў. У любы дзень са мною можа здарыцца тое ж, што здарылася з Язэпам Апанасавічам. Каму тады ўсё гэта астанецца, хто ўсяму гэтаму дасць лад? Я трохі ведала жонку Купалы, Уладзіславу Францаўну. Скажу вам — каб не яна, не яе энергія — ці быў бы такі Купалаўскі музей? Таму і я стараюся таксама. Я клікала вас, чалавека, які добра ведаў Язэпа Апанасавіча, каб вы памаглі мне, параілі, да каго звярнуцца.

— Я ёсць я, прыватная асоба. Гэтак жа, як і вы. І мая вам парада — зайдзіце да старшыні Саюза, пагаварыце з ім. Скажа ён падаць заяву вам на Прэзідыум — напішыце яе. А можа, ён і без заявы ўсё зробіць. Клопаты пра спадчыну — агульныя клопаты ўсіх пісьменнікаў, усёй пісьменніцкай арганізацыі. Што ж да мяне, дык я такая ж прыватная асоба, як і вы...

Я падняўся з крэсла, думаючы, што размова скончана,

мне пара дадому. Але Вольга Ігнатаўна затрымала мяне, не дала раней часу пайсці.

— Пачакайце,— папрасіла яна.— Пасля смерці Язэпа Апанасавіча, я казала ўжо вам, засталося шмат рукапісаў, нідзе не надрукаваных твораў. Язэп Апанасавіч думаў вярнуцца да іх, дапрацаваць. Але, на жаль, гэта яму зрабіць не ўдалося.— Яна дастала хусцінку, выцерла вочы.— У мяне ўсё ў чамаданах. Вось паглядзіце?

Адступаць, адмаўляцца не было як.

Вольга Ігнатаўна, а за ёю і я, выйшлі на калідор. У калідоры, у самым яго канцы, была ў сцяне шафа. Вольга Ігнатаўна адчыніла яе. На паліцах я ўбачыў — адзін, два, тры, чатыры, пяць, шэсць! — шэсць вялізных чамаданаў, дзесяткаў колькі акуратна абматаных, перавязаных шпагатам тоўстых папак.

— Гэта і ёсць рукапісы Язэпа Апанасавіча,— сказала Вольга Ігнатаўна.— У папках — творы, у чамаданах — лісты, запіскі, чарнавікі. Я хацела б, каб вы дапамаглі мне іх разабраць і, вядома ж, надрукаваць...

— Гм...

Я зноў разгубіўся.

— Каб разабраць усё гэта,— паказваў я вачыма на чамаданы і папкі,— трэба час. І не малы. Дый аднаму чалавеку гэта... Словам, дамагайцеся, каб стварылі камісію.

— Я згодна і на камісію. Абы рух нейкі быў, абы дбалі людзі пра памяць Язэпа Апанасавіча.

Не, больш я не вытрымліваў. Трэба было альбо адкрываць на ўсё вочы Вользе Ігнатаўне, альбо...

— На сёння, мабыць, хопіць,— сказаў я, урэшце, адчуваючы, як раптам мне стала душна, аж дыхаць няма чым.

— Добра, добра,— згодная была на ўсё Вольга Ігнатаўна.— Але ж, Адам Іванавіч, я хацела б, каб вы не былі ў баку ад усёй гэтай справы. Можа б, выбралі што-небудзь для свайго часопіса, надрукавалі б...

Гм, зноў клопат, зноў абавязак...

— Давайце... Заўтра пра ўсё пагаворым... Бо сёння...

— Сёння, я адчуваю, у вас няма часу,— выручыла мяне, здагадалася Вольга Ігнатаўна.— Што ж, я згодна.

— Ну вось і добра,— узрадаваўся я.— Толькі вы... Выберыце з усіх рукапісаў тыя, што нідзе не друкаваліся... А я прыйду і пачытаю. Бо браць рукапіс, несці ў рэдакцыю...

— Не, не,— рашуча замахала рукамі Вольга Ігнатаў-

на,— выносіць з хаты рукапісы... Усё можа здарыцца. Не, я лепш перадрукую.

Апранаючыся, абуваючы на ногі чаравікі, я не зводзіў вачэй з кніг, што звабліва стаялі на паліцах за шклом у калідоры: аддаць бы іх тым, каму яны трэба, хто іх шукае, вызваліць бы з гэтай зашклёнай турмы...

Калі я, вярнуўшыся дадому, расказаў Ліне, што ўбачыў і пачуў у Тарасюкоў, яна доўга смяялася.

— Цікава, а што ты спадзяваўся там убачыць і пачуць? — спытала, нібыта з падкусам, яна.

— Ну-у, усё, толькі не тое, што ўбачыў, пачуў...

— А мне здаецца, здзіўляцца асабліва не было чаму. Якія самі — такія і сані...

— Як гэта? Па-першае, бібліятэка. Ды яшчэ такая бібліятэка! Гэта адно. Другое — сама Вольга Ігнатаўна. Мне яе проста шкада. Карлік, якому здалося, што жыве з веліканам. Падумаць толькі: сабрала ўсё, што можна было сабраць пра мужа. Марыць пра кніжку ўспамінаў, музей!

— Між іншым, усе вы быццам павар'яцелі на вялікасці,— кпіла і кпіла з мяне Ліна.— З кім ні загаворыш — геній! Гэты не прызнае таго, той не прызнае гэтага, крытыкуеце Пушкіна, Талстога, Чэхава... Той мараліст, той не мастак, той газетчык. Паслухаеш вас — міжволі чортведама што здацца можа!

— Не, Ліна, не пра гэта размова. Можна кагось не прызнаваць, можна кагось крытыкаваць. Але каб збіраць кожны шматок паперы, на якім нешта накрамзоліў твой муж, хаваць ад яго ручку, якою напісаны той ці іншы опус?.. Абмяжоўваць сябе ва ўсім, толькі б жыў, тварыў Ён... Уяўляеш? — не пераставаў я здзіўляцца.

— Дык вам жа менавіта такія жонкі і падабаюцца. Нічога дзеля сябе, усё дзеля вас, творцаў. «Я сёння працую, пішу». Гэта значыць — не чапай, мяне сёння для цябе няма, не існуе...

— Бачыш, Ліна, ты павінна гэта таксама разумець. Калі жанчыне прыходзіць пара радзіць, яна кідае ўсё. Нешта накшталт родаў бывае і ў нас, тых, хто творыць. Калі «пайшло» — кідай усё, лаві момант. Інакш потым прасядзіш тыдзень, а то і месяц — і нічога не зробіш. Не «ідзе» — хоць лопні, хоць трэсні...

— Мы вас разумець павінны. А вы нас?

— І мы вас таксама, вядома.

Але Ліна не слухала ўжо мяне — гарачылася, як і заўсёды, калі закранalі балючае.

— У вас у галаве вечнае, у вас галоўнае — літаратура. А мы... Мы — звычайныя людзі і жывём звычайным жыццём. Пра вечнасць не думаем. Вось Вольга Ігнатаўна адмовілася ад усяго «свайго», падначаліла сябе «яму», толькі «яму», жыла дзеля яго. І што з таго? Ты, той, хто павінен быў яе зразумець, ацаніць, маліцца на яе — з яе ж кпіш, смяешся.

— Ды нельга з яе не смяяцца, хоць, як я казаў ужо, яна вартая жалю.

— А каб яна была іншая? Не ўпэўнена, што не вінавацілі б менавіта яе. «Яна ва ўсім вінавата...», «Яна не дала разгарнуцца таленту...», «Праз яе наша літаратура збяднела...» Што, не вінавацяць гэтак некаторыя крытыкі жонак пісьменнікаў?

— Я не люблю, калі нападаюць на крытыкаў, хоць некаторыя з іх таго і заслугоўваюць. Гэта раз. А па-другое, жонак, каханак пісьменнікаў не толькі крытыкуюць, лаюць, але і хваляць. Такая натхніла пісьменніка на верш, такой ён прысвяціў лепшую сваю паэму. Дарэчы, дзякуючы гэтаму вершу ці паэме мы і ведаем, што такая асоба жыла некалі на свеце.

— Як я заўважыла, вы занадта многа думаеце пра сябе, жывяце толькі сваім, сабой. Жыццё ж куды багацейшае! Людзі сеюць хлеб, будуюць дамы, электрастанцыі, асушаюць балоты, робяць трактары, машыны. І ведаць трэба не толькі сябе, а і іх, гэтых людзей. І не толькі ведаць, але і паказваць — як яны жывуць, пра што думаюць, у што вераць. А то... Я-Я-Я... Нельга на ўсё глядзець толькі праз «я»...

— Ты, Ліначка,— абняў я Ліну за плечы, прыгарнуў да сябе (мы сядзелі з ёю побач на канапе),— правільна разважаеш. Вельмі нават правільна! Але дазволь у сім-тым і не згадзіцца з табой. Язэп Тарасюк і Вольга Ігнатаўна — таксама ж людзі. Чаму нас, пісьменнікаў, павінны цікавіць толькі калгаснікі, рабочыя, інжынеры, настаўнікі? Нас павінна цікавіць усё і ўсе. «Ці не ўсё роўна пра каго гаварыць? Заслугоўвае таго кожны, хто жыў ці жыве на зямлі». Гэта сказаў Бунін. І Язэп Тарасюк таго заслугоўвае, і Вольга Ігнатаўна, і ты, і я... І яшчэ вось пра што я падумаў, калі вяртаўся ад Вольгі Ігнатаўны: Язэп Тарасюк не проста чалавек, а, калі хочаш, нават — тып. Як нараджа-

юцца такія, дзе тая глеба, якая іх жывіць, на якой яны растуць? Дый... Цікава, чым Тарасюк жыў, што было ў яго на душы, што хвалявала, якія думкі не давалі яму спакою? Ці не хацелася часам кінуць тое, чым ён займаўся столькі гадоў, кінуць і пачаць нейкае новае жыццё? Ці ён гэтак быў апантаны пісаннем, што нічога не бачыў, ні пра што іншае не думаў?

— Але ж Язэп Тарасюк мёртвы, у яго ты пра гэта не спытаеш?

— Бачыш, ён мёртвы. Але асталіся жыць падобныя на яго. У наш час, калі людзі ўсе пісьменныя, калі кожны можа пісаць, ёсць пэўная небяспека тарасюкоўшчыны. Не толькі ў літаратуры, але і ў навуцы, ва ўсім мастацтве. Вось размаўляю з табою пра яго і, адчуваю, ён усё больш і больш мяне цікавіць... Асталіся ж яго творы... Надрукаваныя і ненадрукаваныя. Цэлая шафа рукапісаў!

— Дык ты што, разбіраць будзеш тыя рукапісы, нешта сярод іх шукаць? — паглядзела на мяне як на дзівака Ліна.

— А чаму б і не! Ахвота ж горш няволі. Іншы пісьменнік ідзе на завод вывучаць жыццё ці едзе ў калгас. А я... Пайду на кватэру да Тарасюкоў...

— Дык ты ж быў ужо там!

— Мала што быў. І яшчэ пайду.

— Каб ведала, якія ненармальныя людзі вы, пісьменнікі, не выходзіла б за цябе замуж!

— Іншая б знайшлася. А не знайшлася б — адзін бы жыў! Бо ў сапраўднага пісьменніка ёсць жонка ўжо ад самага нараджэння — літаратура. Жанчына ж, з якою ён жыве,— гэта другая яго жонка.

— Ты заўсёды, калі многа гаворыш, дагаворваешся да глупства.

— Бо калі пісьменнік многа гаворыць, гэта тое самае, што многа піша. Ён п'янее ад слоў. Ды яшчэ калі... Скажам, «загарэўся», натрапіў на тэму, як вось я зараз. Гэта ўсё адно што дэтэктыў натрапіў на след. На след, які вядзе да адкрыцця таямніцы... І такой, што калі ён не адкрые яе, то яму не жыць. Тое самае адчуваю цяпер я. Я павінен разгадаць таямніцу Язэпа Тарасюка, уявіць не толькі яго жыццё, але і яго характар, яго думкі... Я павінен бачыць яго як в о б р а з, т ы п! Бо тарасюкоўшчына — не такая бяскрыўдная з'ява, як некаторым можа здацца. Колькі людзей, замест таго каб быць добрым сем'янінам, добрым работнікам, прыносіць карысць блізкім і дзяржаве, займаюцца чортведама чым. Пакутуюць самі і прымушаюць

пакутаваць іншых. Пасылаюць сваю пісаніну ў рэдакцыі. У рэдакцыях чытаюць тую пісаніну, маракуюць над адказамі. Аўтар, як правіла, адказам незадаволены (дзіва што! — твор жа не друкуюць, а бракуюць!), скардзіцца ў розныя ўстановы. Траціцца час, папера, грошы! Добра, як «твор» такога аўтара сапраўды нікуды, ні на што не прыдатны. А калі ў ім быццам штосьці ёсць? Калі ў аповесці ці ў рамане важная палітычная тэма? Ды і аўтар не абы-хто? Той жа, хто ацэньвае «творы», не заўсёды таксама разбярэцца, а то часамі і... пабаіцца забракаваць ці... такі ж самы... Тарасюк. Рукапіс рэдагуюць, рукапіс здаюць у набор, выходзіць кніжка. Людзі купляюць, чытаюць. І думаюць, што гэта сапраўдная літаратура. Не кожны чалавек можа ўспрымаць музыку. Не кожны чалавек можа ўспрымаць жывапіс. Але чамусьці лічыцца, што мастацкую літаратуру можа разумець і ўспрымаць кожны. І графаманскую пісаніну чытаюць, яе перавыдаюць. Чалавек, які піша, лічыць сябе творцам, пісьменнікам. Яму незразумела, чаму яго крытыкуюць, чаму некаторыя не лічаць яго за пісьменніка. Ён піша скаргі, ходзіць па розных установах, яго ўсюды прымаюць... Так, так, як пісьменніка... А ён ніякі не пісьменнік, ён выпадковы ў літаратуры чалавек... Замест таго каб прыносіць карысць, ён прыносіць шкоду... Тарасюкі — гэта як караеды ў дрэве. І калі з імі не змагацца, то... Можа наступіць такі час, калі нават не будзе каму адрозніць, дзе графаманская пісаніна, а дзе — літаратура, мастацтва...

— Не гіпербалізуй! Такога яшчэ не было, трэба спадзявацца, і не будзе.

— Не было толькі таму, што сапраўдныя мастакі вялі і вядуць з тарасюкамі барацьбу. Барацьбу жорсткую, бязлітасную...

— Ну павіаюй і ты!

— Трэба ваяваць. А то,чаго добрага — тарасюкі будуць ваяваць з літаратурай, выдаваць поўныя зборы сваіх «твораў», ім будуць адкрываць музеі!

І не вытрымаў — сам засмяяўся.

— Ты ўсё гэта ўсур'ёз? — паглядзела здзіўлена на мяне, аж зрэнкі расшырыліся, Ліна.

— Вядома!

— Цікава! Пагляджу, што ў цябе выйдзе!

— Нешта ж выйдзе. Тарасюкоўшчына — зло. І я не адступлюся ад свайго. Разбяру паперы Язэпа Тарасюка, сустрэнуся і пагавару з тымі людзьмі, хто яго блізка ведаў.

Словам, буду разгадваць тайну нашчадкаў графа Хвастова.

— Поспехаў табе! Толькі...

— Што толькі?

— ...не забывайся, што ў цябе ёсць жонка, хай сабе, як ты кажаш, і не першая — другая. На роль Вольгі Ігнатаўны я не згодна. Думаю, можна жыць па-чалавечы і тварыць, як, дарэчы, многія вядомыя людзі жылі і тварылі. І яшчэ адно — у сваёй кнізе ты не забудзься навучыць людзей адрозніваць, дзе сапраўдная літаратура, а дзе, як ты кажаш, графаманская пісаніна.

— Гэта не мая задача — вучыць адрозніваць сапраўдную літаратуру ад графаманства. На гэта ёсць школы, настаўнікі. І кніг многа самых розных... Дый... Не кожнага гэтаму, на жаль, можна навучыць. Ёсць людзі з прыроджаным густам, разуменнем, а ёсць... Словам, колькі яго ні вучы — не навучыш. Да таго ж, ад літаратуры кожны патрабуе свайго. Аднаму даволі вострага сюжэта, другому каб каханне ў кнізе было, трэцяму — каб кніга была пра вайну... Думка, вобраз, слова, як яно, гэтае слова, стаіць у сказе, адсвечвае, зіхаціць, не кожнага цікавіць, не кожны гэта бачыць. Помню, як мяне ўразіў сказ аднаго пісьменніка. «Стол быў чорны і доўгі, як дамавіна». Звычайны чалавек скажа што хочаш пра стол, але не параўнае яго з дамавінай. З дамавінай стол можа параўнаць толькі мастак. І чалавек, які прачытае гэты сказ, не толькі ўбачыць стол, але і адчуе яго, уявіць. У гэтым і мастацтва, у гэтым і майстэрства. Сказаць не толькі незвычайна пра звычайнае, але і так, каб убачылі, адчулі тое, пра што гаворыцца... А што да таго, што ты просіш не забываць пра цябе, пра тое, што ты ёсць, дык я, па-мойму, і не забываю...

Я зноў, гэты раз горача, парывіста абняў Ліну. Яна павярнулася да мяне тварам, паглядзела блакітнымі, нейкімі нечаканымі, гуллівымі вачыма. І я... Прыгарнуў яе яшчэ бліжэй да сябе, пачаў цалаваць...

Недарэмна ж кажуць: ахвота горш няволі. Менавіта ў такую паласу зусім нечакана для сябе я і трапіў, пабываўшы на кватэры ў Вольгі Ігнатаўны...

...І пацягнуліся, як тоўстая патрэнчатая нітка з верацяна, нецікавыя, сумныя дні. Раніцою, падняўшыся з пасцелі, я піў каву і... кіраваўся на кватэру да Тарасюкоў. Заўважыў, што зіма, так і не разгуляўшыся, не даўшы сабе

волі, мінаецца, праходзіць,— усё часцей і часцей агалялася ад хмар, празрыста блакітнела неба, паказвалася, грэла зусім па-вясноваму сонца. Са стрэх то там, то тут капала, перамаўляліся капяжы. Замёрзлыя за ноч сусолкі ад цяпла раставалі, падалі на тратуар, пагражальна барабанілі па трубах. Снег, і так брудны, зусім пачарнеў, пускаў усюды ручаі пацёкаў. Хаваўся ён, крупяністы, зледзянелы, хіба толькі дзе-нідзе ў цяні дамоў і дрэваў. Дворнікі дзяўблі яго ламамі, раскідвалі на прыгрэў сонца па тратуарах — каб хутчэй раставаў, сцякаў вадою. Але да таго, што ідзе, набліжаецца вясна, мне быццам не было клопату — я падазрона, з нянавісцю глядзеў на тыя чамаданы і папкі рукапісаў Язэпа Тарасюка, якія трэба было мне яшчэ перабраць, пераглядзець. Цікавага, таго, што спадзяваўся я сярод гэтых рукапісаў знайсці, не было, правільней, пакуль што не трапляла на вочы. Былі забракаваныя ў рэдакцыях і нікуды ні на што не вартыя аповесці, апавяданні, п'есы, вершы, былі варыянты асобных эпізодаў, былі пачаткі нейкіх задуманых, але так і незакончаных твораў, былі проста розныя накіды, планы... Праўда, чым болей я капаўся ў рукапісах, тым часцей спатыкаўся на адно і тое ж імя, якое чамусьці акуратненька, літара да літары, не-не дый выводзіў дзе-небудзь у ражку ці збоку старонкі Язэп Тарасюк — «Сабіна». «Значыцца, гэтая самая Сабіна яго цікавіла, не давала на сябе забыцца. Але хто, хто яна?» Наколькі я помніў творы Язэпа Тарасюка, сярод яго гераінь не сустракалася такое імя. Я, адклаўшы некалькі старонак рукапісу, дзе значылася гэта імя, паказаў Вользе Ігнатаўне.

— Што вы пра гэта скажаце? — спытаў я.

— Вы пра што? — у сваю чаргу спытала ў мяне Вольга Ігнатаўна — яна не адыходзіла ад мяне ўсе дні ні на крок, баялася, мусіць, каб я не згубіў ці, можа, нават не забраў сабе нейкі рукапіс.

— Ды пра гэтую самую «Сабіну»... Хто яна такая?

Вольга Ігнатаўна разгубілася, хвілін колькі маўчала.

— Бачыце,— сказала яна ціха, вельмі нават ціха.— Я гаварыла вам, што Язэп Апанасавіч жыў да вайны з адной жанчынай. Звалі яе Сабіна...

— А-а! — усклікнуў я.— Тады ўсё зразумела...

Пытаць што-небудзь яшчэ пра Сабіну было б жорстка, нетактоўна. Таму я схаваў лісткі рукапісу, дзе было выведзена імя першай жонкі Язэпа Тарасюка, як бы асабліва і не звярнуўшы, не засяродзіўшы на гэта ўвагі, хоць думкі

мае і замітусіліся, узвіліся роем. «Язэп Тарасюк не забываў, успамінаў сваю першую жонку, думаў пра яе. Значыцца, кахаў. Цікава, ці жыве яна цяпер? І чаму яны развяліся? Хто вінаваты ў гэтым — ён, сам Тарасюк, ці яна, Сабіна?.. І ў каго, у каго пра ўсё гэта можна распытаць? Вядома, Вольга Ігнатаўна сёе-тое ведае, не можа быць, каб не ведала. Але пытаць у яе... Не, не, хопіць і таго, што я і так даволі бестактоўна папытаў ужо — хто такая Сабіна. Дык то ж я не ведаў, можна і даравадь. А ведаючы... Не, не, трэба быць мужчынам, разумець жаночую псіхалогію...»

І не засяроджваў больш увагі Вольгі Ігнатаўны на Сабіне, нічога не гаварыў, не распытваў пра першую жонку Язэпа Тарасюка. Моўчкі, паглыбіўшыся ў сябе, гартаў рукапісы, сёе-тое прачытваў, але... Друкаваць тое, што так беражліва збірала, хавала Вольга Ігнатаўна, было нельга. Дый, калі шчыра прызнацца, не творы, не рукапісы мяне ўжо цікавілі, а сам Язэп Тарасюк, яго думкі, жыццё. І ўсё ж, каб не ўгнявіць Вольгу Ігнатаўну, я некалькі папак з творамі Язэпа Тарасюка адклаў убок — меркаваў вярнуцца, прачытаць больш уважліва, бо адно, калі з рукапісам толькі знаёмішся, і другое, калі яго рыхтуеш у набор. У першым выпадку цікавіць агульнае ўражанне, у другім — цікавіць усё — кожная літара, кожная коска і кропка: дзе, ці на месцы яны стаяць. Рыхтаваць у набор рукапісы Язэпа Тарасюка было для мяне не новым. Работа была нялёгкая, ды пры жывым аўтары кожную сваю праўку, кожнае скарачэнне можна паказаць яму, узгадніць — гэта значыць узаконіць. А цяпер, як быць цяпер, калі нават нешта вартае друку выявіцца?

Пра свае турботы я сказаў Вользе Ігнатаўне.

— Друкуйце, як напісана,— без ценю сумнення параіла яна.

— Э-э, каб жа гэта можна было! А то ж... Нельга,— сказаў я.

— Чаму нельга?

— Таму што... Ёсць зацягнутыя мясціны... Ёсць неверагоднасці... Ёсць проста непісьменнасць. Без праўкі мы і раней ні адзін твор Язэпа Апанасавіча не друкавалі...

— Між іншым, ён заўсёды крыўдаваў, што яго правяць. «Хоць бы раз мне дазволілі выйсці ў людзі так, як хачу»,— казаў ён. Праўда, пад канец ці то ён зміраўся, ці то проста не зважаў асабліва на праўку, неяк спакайней да яе адносіўся.

— Я таксама неаднойчы гаварыў з Язэпам Апанасавічам. У рэдактару не трэба бачыць дыктатара, які знарок хоча нешта навязаць аўтару. Можа, і бываюць такія рэдактары, але я хацеў бы быць не дыктатарам, а дарадчыкам. Калі рукапіс якасны, усё ў ім на месцы, радасна і рэдактару. Прачытаў і аддаў у набор. Дарэчы, некалі рэдактараў не было, рукапіс здаваўся ў набор так, як быў напісаны пісьменнікам. Чыталі яго толькі карэктары...

— Во, бачыце...— пажвавела Вольга Ігнатаўна, пачуўшы такое...— І кнігі ж выходзілі.

— Кнігі, вядома, выходзілі. Але перад тым як здаваць гэтыя кнігі ў набор, іх чытаў выдавец. Падабалася яму кніга — у набор. Не падабалася — ён не купляў яе ў аўтара, бракаваў. Ну, а калі ўвялі штат рэдактараў, аўтарам пачалі памагаць, выкрэсліваць, дапісваць, паляпшаць, пагаршаць... Вядома, лішняе вока нікому не пашкодзіць, нават вопытнаму пісьменніку. Але рэдактары прывучылі некаторых аўтараў да неахайнасці, безадказнасці. «Не выправіў усё я, выправіць рэдактар». І нават — рэдактары пачалі пісаць за некаторых...

— Што, хіба бывае і такое? — шчыра здзівілася Вольга Ігнатаўна.

— Усякае бывае,— не змог, каб не ўсміхнуцца, я.— Скажам, бываламу чалавеку, які многа чаго бачыў, які многа чаго ведае, але не можа сам пра ўсё напісаць, і памагчы можна. Але пісаць за пісьменнікаў...

— Вядома, калі ён пісьменнік, то хай сам за сябе піша.

Я засмяяўся.

— Піша кожны быццам сам... Толькі... Тое, што некаторыя пішуць, нельга здаваць у друк... Ну, ніяк, ніяк нельга.

— Вось гэтага я ніколі не разумела і, мабыць, так і не зразумею. Паказваў мне некаторыя рэдактарскія праўкі Язэп Апанасавіч... Правільней, я сама іх глядзела, калі перадрукоўвала рукапіс. Ну, адно слова заменена іншым... Ну адзін эпізод скарочаны... Але можна ж было і не скарачаць таго эпізоду, не мяняць таго слова. Сам Язэп Апанасавіч часта здзіўляўся, не разумеў, чаму папраўлена гэтак, а не пакінулі так, як ён напісаў.

— Бачыце,— хацеў я растлумачыць Вользе Ігнатаўне,— каб зразумець некаторыя праўкі, трэба мець мастацкае чуццё, густ. Адчуваць, дзе што лішняе, дзе можна без чаго абысціся, дзе слова не зусім дакладна перадае сэнс, дзе яшчэ нешта не зусім тое і яго трэба закасаваць. Рэ-

дактар, як справядліва называў яго адзін пісьменнік, гэта тое, ж, што цырульнік. Ён павінен ведаць, што пакідаць, а што трэба бязлітасна абрэзаць. Дарэчы, калі маеце час, паглядзіце, як працавалі над творамі, правілі самі сябе многія вядомыя майстры, скажам, той жа Пушкін, Гогаль, Дастаеўскі, Леў Талстой, Бунін... Выкідвалі цэлыя раздзелы, эпізоды, старонкі... І якія часам старонкі! Бяда наша ў тым, што мы мала працуем над сваімі творамі, мала самі сябе рэдагуем. Цікава, Язэп Апанасавіч часта перачытваў класікаў?

— Ён кнігі наогул любіў. Але чытаць іх не меў часу. Ён пісаў. Праўда, у апошнія гады я часта бачыла яго ля стэлажоў. Ён нешта падлічваў, гартаў то адну, то другую кнігу. Як потым я даведалася, яго хвалявала вось што — сваю творчасць, сваё жыццё ён параўноўваў з творчасцю, жыццём іншых пісьменнікаў. Падводзіў сякія-такія вынікі. Нават пачаў быў пісаць нешта накшталт дзённіка.

— Праўда? — узрадаваўся як немаведама чаму я — усё ж не памыліўся: не мог, не мог такі чалавек памерці і не адкрыцца, нічога нікому пра сябе не сказаць!

— Ага, амаль цэлы сшытак спісаў... Хаваючыся ад мяне. Я нават не ведала, што ёсць у яго той сшытак. Знайшла ў стале пасля ўжо яго смерці...

— Цікава, што ён там пісаў?

Вольга Ігнатаўна ніякавата апусціла ў падлогу вочы, потым сказала:

— Цікавага якраз там мала... Замест таго каб гаварыць пра сваю веліч, ён месцамі знішчае сябе як пісьменніка. Чалавек ён быў моцны і целам і духам. Але хвароба, мусіць, падкасіла яго здароўе, бо ён пачаў у многім сумнявацца... Сумняваўся нават у тым, ці трэба было яму быць пісьменнікам... Гэта хваравітае, і я не хацела б, каб тое друкавалі. Асабліва цяпер, калі я надумала ставіць пытанне пра музей, збор твораў, кнігу ўспамінаў.

— Можа, не так усё страшна? Пісьменнікі заўсёды былі незадаволеныя тым, што яны стварылі, бязлітасна крытыкавалі сябе. Гэта ў крыві кожнага — сказаць сваё слова пра тое, што ён рабіў, чаму аддаў сваё жыццё.

— Не, не. Я дам вам пачытаць той сшытак, і вы пераканаецеся самі, што Язэп Апанасавіч быў несправядлівы да сябе, да тых кніг, што ён напісаў...

— Калі гэта можна... То, вядома, я хацеў бы пачытаць...

— Нікому іншаму я не паказала б дзённік Язэпа Апанасавіча... А вам... Вы прачытайце...

І Вольга Ігнатаўна нагнулася, адамкнула шуфляду стала, дастала адтуль звычайны, якія прадаюцца ў кожным кіёску, агульны сшытак у мяккіх чорных вокладках, падала мне. Я з цікавасцю і, як заўважыў, не без хвалявання адгарнуў першую старонку, пачаў чытаць...

...Сёння аўторак, мне споўнілася 68 гадоў. Каму-каму, а мне, здаецца, наракаць на лёс няма чаго. Многія мае равеснікі даўно ляжаць у зямлі, а я жывы, здаровы, нават яшчэ працую — пішу апошнюю, пятую кнігу сваёй эпапеі. Прызнацца, я не думаў раней пісаць пятай кнігі, хацеў абмежавацца чатырма, як гэта зрабілі і Л. Талстой і М. Шолахаў. Але крытыкі эпапеі мае не заўважаюць ці робяць выгляд, што не заўважаюць. Нават не вылучыў яе ніхто на атрыманне рэспубліканскай прэміі. Таму я вырашыў напісаць яшчэ адну кнігу... Занятак хоць будзе, бо інакш... Што ж яшчэ мне рабіць? Пакуль жыву — пісаць. Ні дня без радка.

Наогул, пісанне кніг надзвычай цікавая штука. Адзін выдасць адну кнігу за жыццё і астаецца ў літаратуры, пра яго пішуць манаграфіі, успамінаюць ва ўсіх артыкулах, называюць таленавітым, выдатным, нават геніяльным... Другі напіша дзесяткі кніг, а крытыкі пра яго маўчаць, а калі ўспамінаюць, то моршчачыся, з нянавісцю, быццам чалавек адабраў нешта ў кагосьці, не даваў камусьці жыць. Што гэта — зайздрасць, няўвага ці жаданне знарок прынізіць чалавека, маўляў, колькі ты ні старайся, колькі ні пішы, усё адно ты ніхто?..

Калі гэтыя людзі хочуць раззлаваць мяне, то не дачакаюцца таго. Не разабраліся ў маёй творчасці пры жыцці, разбяруцца пасля смерці. Не могуць не разабрацца, бо факты, як кажуць, упартая рэч. Я і мае творы ёсць. Днямі я падлічыў, што напісаў не менш за Гогаля, Чорнага і іншых вядомых празаікаў. Па ахопу падзей ні ў кога няма такой эпапеі, як у мяне. Таму я і горды сабой, радуюся, што мне наканавана было і пажыць і сказаць пра час і сябе слова...

...Пісаў я для чытача. І не пра сябе, а пра іншых людзей. І вось пацягнула раптам напісаць сёе-тое і пра сябе.

Зноў жа — гэты раз не для чытача, а для сябе. Быццам пагаварыць з сабою. Правільней, думкі тыя, якія ўзнікалі і ўзнікаюць у мяне ў галаве, выкласці на паперу. Дзеля чаго? Сам не магу пакуль што сказаць. Адклаў пятую кнігу эпапеі ўбок і пішу вось гэта — не то дзённік, не то мемуары, не то запіскі. Купіў сшытак і пішу. Наогул — жаданне пісаць у мяне змалку. Як убачу, бывала, белую паперу, аж закалачуся, месца сабе не знаходжу, пакуль на ёй чаго-небудзь не напішу. У школе я спісваў палі кніжак, вокладкі, тытулы і г. д., за што мяне заўсёды лаялі настаўнікі. Потым прылаўчыўся пісаць вершы, п'есы, прозу. Спярша — у вольны час, пасля працы, урыўкамі, а як прынялі ў Саюз пісьменнікаў — узаконена, не хаваючыся ні ад каго. Я пісьменнік, і я павінен пісаць. Выдаў пятнаццаць кніжак. Ёсць вершы, нарысы, п'есы, апавяданні, аповесці, раманы, нават эпапея. Словам, авалодаў усімі жанрамі, у кожным жанры пакінуў свой след. Працую, як кажуць, «в поте лица», сяджу за рабочым сталом па дзесяць — дванаццаць гадзін штодзень. Іншы раз не бачу ні вясны, ні лета, ні восені. Пра тое, што прыйшла тая ці іншая пара года, часцей за ўсё даведваюся па тых таполях, што стаяць у мяне пад акном. Зазелянелі — вясна на двары; голыя — восень. Працую, бо што ж яшчэ мне астаецца рабіць. Быць без работы я не прывык. А так слова да слова — сказ. Сказ да сказа — абзац. Абзац да абзаца — раздзел. Раздзел да раздзела — раман. Раман да рамана — эпапея. З маленькага складаецца вялікае. «Цікава-а!» — як любіць паўтараць адзін мой знаёмы.

...Нешта сёння не зусім здаровіцца мне. Баліць галава, ламота ў руках і нагах, слабасць. Пра горла і гаварыць не хачу — яно баліць даўно! І думкі нейкія змрочныя, невясёлыя. А што, калі крытыкі казалі праўду пра мае творы, не памыляліся? Пішу-пішу, нічым другім не займаюся які ўжо год, не бачу ні вясны, ні лета, не адпачываю нават, і ўсё гэта дарэмна, нікому мая пісаніна не патрэбна. Яна памрэ з маёй смерцю, а можа, як гаварыў неяк адзін з іх на сходзе, памерла раней за аўтара. Тады — дзеля чаго я жыў, дзеля чаго патраціў столькі часу? Ды хіба толькі часу? Астаўся адзін, без дзяцей. Нават без жонкі, без Сабіны. А я ж кахаў яе, я хацеў з ёй жыць. І жыў бы, мабыць, каб не гэтая пісаніна. З дырэктара рэстарана мог вырасці, займець больш адказную пасаду, як гэта зрабілі

многія мае былыя сябры. Мог хадзіць на службу, сядзець у кіраўнічым крэсле, адпачываць штолета... І жыццё б ішло, як у добрых людзей, і галава заўсёды была б свабодная ад розных думак. А то — ніколі не вазьмі чаркі, інакш назаўтра прападзе дзень, пісаць нічога не зможаш. Ніколі не кладзіся позна спаць — інакш, зноў жа, не зможаш працаваць. Беражы сябе, беражы свой час. І ўсё дзеля таго ж — пісання. На дварэ — цудоўны сонечны дзень, людзі спаважна шпацыруюць па скверыках,едуць на прыроду — на возера, у лес... А ты сядзіш, абліваючыся потам, за сталом, ты пішаш, творыш. Творыш у будзень і ў свята, творыш і ўдзень і ўвечары. Нават калі ў пасцелі ляжыш, думаеш пра сваіх герояў, пра тое, як бы хітрэй падмануць чытача, каб ён паверыў табе. Сказаць, што робіш гэта толькі з-за грошай, дык быццам бы не. Грошы ў мяне ёсць, да таго ж і пенсія... Дзеля славы? Ліха яго ведае. Проста хочацца пісаць. Аж рукі свярбяць, як не пішаш. І няўжо ўся гэтая пісаніна кату пад хвост, сапраўды нікому не патрэбна?

Не, на сёння кончу. Думкі не тыя, не буду сам сабе расхалоджваць, знішчаць...

...Чытаю Гогаля. Смяюся, аж Вольгачка не выцерпела, зазірнула ў мой кабінет. Зрабіў ёй вымову — пакуль я ў кабінеце, мяне няма дома, ні для каго, нават для яе. Я — твару. А гэта свяшчэнна. Дык вось пра Гогаля. Напісаў ён, канечне, мала. Мог напісаць, ва ўсякім выпадку, больш. Падабаюцца мне некаторыя яго сцэнкі. Скажам, хоць бы тая, пра гараднічага ў «Аповесці пра тое, як пасварыўся Іван Іванавіч з Іванам Нічыпаравічам». Дзевятая «пуговица», што «как оторвалась во время процессии при освещении храма назад тому два года, так до сих пор десятские не могут отыскать, хотя городничий при ежедневных рапортах, которые отдают ему квартальные надзиратели, всегда спрашивает, нашлась ли пуговица». Ці тая ж «левая нога», якая была «у него прострелена в последней кампании, и потому он, прихрамывая, закидывал ею так далеко в сторону, что разрушал этим почти весь труд правой ноги...» У мяне такіх сцэнак няма. Я не звяртаў увагі на такія вось дробязі. Я заўсёды пісаў пра вялікае, значнае. Дый Гогаль гумарыст, сатырык. Ён — адзін. Такіх, як Гогаль, больш не было. І не будзе. Цяпер інакшае жыццё, інакшае і разуменне літаратуры. Тады, пры Гогалі,

у літаратуры былі свае задачы, цяпер — свае. Шкада, што гэтага не разумеюць некаторыя нашы крытыкі. Дый што, калі сур'ёзна падысці, напісаў Гогаль? П'еска, аповесць, раман... А эпапея ёсць у яго? Ага, то-та ж! Эпапея ёсць у Л. Талстога, М. Шолахава і ў... мяне!

...У жыцці, мабыць, кожнага чалавека бываюць моманты, якія ён успамінае асабліва часта. У мяне таксама ёсць такія моманты. Адзін з іх — гэта калі Сабіна сказала: «Я — ці твая пісаніна, выбірай!» Я выбраў літаратуру. І Сабіна пайшла ад мяне. Далейшае маё жыццё — гэта спроба даказаць Сабіне, што яна памылілася, дарэмна не верыла ў мае здольнасці. «Ты звычайны графаман, няўжо ты не разумееш?» Гэтыя яе крыўдныя словы я пранасіў у сваёй галаве ўсе гады і, мусіць, з імі памру. І калі мне намякалі і потым некаторыя, што я не пісьменнік, ніхто не ведаў, як мне было балюча. Я ўспамінаў тады Сабіну, думаў, а мо дарэмна я паверыў у свае сілы, дарэмна выбраў літаратуру, а не Сабіну. З Сабінаю я жыў бы, быў бы шчаслівы. З літаратураю ж... Пішаш, пішаш, пакутуеш, пакутуеш у адзіноце, а скончыш працу — пачынаюцца новыя турботы. Твой твор перарабляе на свой капыл кожны рэдактар, калечыць, сячэ яго. Надрукуеш — зляталюцца, як на якую падлу, груганы-крытыкі, дзяўбуць, ірвуць на кавалкі. Міжволі прыгадваецца анекдот-прытча. Адзін мастак пасля таго, як была выстаўлена на ўсеагульны агляд яго карціна, перакваліфікаваўся ў дактары. Калі ў яго спыталі, чаму ён гэтак зрабіў, ён адказаў: «Калі я на новай сваёй рабоце зраблю памылку, яе схавае зямля. А калі я памыліўся, будучы мастаком, мне на маю памылку ўсе паказвалі, тыцкалі пальцам, ды яшчэ і пасмейваліся, пацяшаліся». Сапраўды, у нашай рабоце памылкі кожнаму відаць. Чуць-чуць нешта недагледзіш — і ўсё, цябе абавязкова зловяць, скажуць, што ты памыліўся. Словам, я ў літаратуры колькі гадоў, а смаку ад яе... Не, не трэба гнявіць Бога. І радасць была, і смак быў. Каб не было радасці і смаку, наўрад ці хапіла б вытрымкі, сілы гэтак да самазабыцця працаваць. А то ж... Твор, напісаны табою, друкуюць у тысячах экземплярах, яго купляюць, чытаюць... Пра цябе гавораць: «Пісьменнік!» Ты чуеш пах фіміяму, чакаеш прызнання, славы, прэмій... Салодкае, салодкае гэта чаканне, аж сэрца іншы раз млее... І надзея, надзея на лепшае заўсёды астаецца, нават у самыя змроч-

ныя дні. І калі я цяпер кажу сабе, што Сабіна вінавата ў тым, што я стаў пісьменнікам, то... можа, і не зусім гэта праўда. Сабіна сваімі крыўднымі словамі дала штуршок, правільней, словы яе былі імпульсам... Пабыўшы ж, пажыўшы ж у літаратуры, я — ды і кожны, мусіць, на маім месцы — ужо не магу без літаратуры. Надта ж прыцягальная гэта штука — літаратура, і быць, астацца ў ёй... Ой, ой як хочацца! Усё б, здаецца, аддаў...

Колькі гадоў мінула, а я так і не ведаю, зрабіў я што ў літаратуры ці не, даказаў Сабіне, што яна памылялася, дарэмна не верыла ў мае здольнасці, ці так і не даказаў. Спытаць у Сабіны пра гэта не асмельваюся, хоць іншы раз і сустракаю яе, перакідваюся словам-другім. Па тым, як яна трымаецца, не відаць, каб яна шкадавала, што рассталася са мной. А можа, яна проста навучылася хаваць свае пачуцці, не гаварыць, што ў яе на душы? Трэба ж было мне сысціся некалі з ёю, спазнаць радасць, каб потым праз усё жыццё думаць, шкадаваць і мучыцца. Лепш бы мне ажаніцца з кім-небудзь іншым. Хаця... Можа, і не так доўга, як мне таго хацелася, але я меў таксама радасць, шчасце... Сабіна! Каб толькі ведала, кім была ты для мяне! І цяпер, як сустрэнуся, аж голас прападае, перасыхае ў горле, думкі блытаюцца — слова не магу сказаць. Хвалююся, як падлетак... Я па-ранейшаму кахаю цябе, Сабіна! І пра гэта ты так і не пачуеш ужо, ніколі не даведаешся. А шкада... Бо думаю — і я пакінуў таксама нейкі след у тваім сэрцы, і ты мяне таксама ўспамінаеш. Добрым ці дрэнным словам, але ўспамінаеш...

...Сёння з самага ранку неба зацягнулася хмарамі, цёмна, ідзе дождж. Дробны, надакучлівы. Зноў мне ані не працуецца. І я — які ўжо раз! — зноў дастаў свой сшытак, зноў вось пішу. Што пішу, дзеля каго і навошта? Сам пакуль што не магу сказаць. Проста запісваю ўсё, што прыходзіць у галаву. Не сядзець жа мне склаўшы рукі. А пісаць раманы абрыдзела. Нецікава і самому іх чытаць. Раней падганялі грошы — пішаш, каб было за што жыць. Цяпер ёсць пенсія, дый на ашчаднай кніжцы сёе-тое завялося. Іншым бы чым-небудзь заняцца. А чым? Хадзіць, швэндацца па вуліцах без дай прычыны, як гэта робяць усе пенсіянеры? Гэта не па мне, дый стамляюся я хутка, ногі пачынаюць балець... А тут яшчэ і надвор'е такое.

Наогул, нешта расклеіўся я. Ніколі раней са мною

такога не здаралася. Заўсёды я быў упэўнены ў сабе, у тым, што рабіў. І тады, як пачынаў пісаць, і тады, як працаваў у выдавецтве, бракаваў, не пускаў у друк кнігі некаторых «таленавітых» аўтараў і крытыкаў. І раптам... Абыякавасць нейкая да ўсіх і ўсяго, а галоўнае — ніякага жадання працаваць. Прачнешся — і з пасцелі падымацца не хочацца, не хочацца нават штаноў на сябе надзяваць. Успамінаецца чамусьці вёска, у якой я жыў, тыя старыя клёны, што стаялі паблізу нашае хаты, бацька... Вось у каго зайздроснае было жыццё! Увесь век свой араў поле, сеяў хлеб. І памёр на полі — лёг адпачыць у разору, заснуў і не прачнуўся... Мне б так памерці! Дзіўна, чаму гэта я пачаў думаць пра смерць? Хаця... Гады ўжо! Дый жыццё маё хіба было такое спакойнае, як у бацькі! Пакінула жонка, якую я кахаў... З пасады ў выдавецтве знялі, не даўшы разгарнуцца... Потым вайна, хаванне ад фронту ў нейкай задрыпанай камендатуры... Галодны, халодны пасляваенны час... Смерць Сталіна, рэабілітацыя тых, да лёсу каго быў і я прыклаў у свой час руку... Дый так... Адзін адно даказвае, другі другое... І ў якасці прыкладу бяруць не каго-небудзь, а мяне. Адны — каб паказаць, як не трэба пісаць, другія — каб паказаць адваротнае: як трэба пісаць. Ратавала тое, што пазіцыя мая была акрэсленая, ясная, партыйная, чысты сацрэалізм. Гэта і памагло мне выжыць, нават пасаду ў выдавецтве займець. Пацішэлі некаторыя «таленавітыя», а сёй-той і пахвальваць пачаў у рэцэнзіях, аглядах... І каб патрымаўся больш на пасадзе, маглі б і мае творы залічыць у «дасягненні», «здабыткі»... Што ж, дзякуй і за тое. А магло ж, магло... Дваццаць гадоў некаторыя былі адарваны ад літаратуры, згнілі даўно ў зямлі. І не без маёй дапамогі. Таму, можа, і злосць на мяне, гэтае непрызнанне. Каб прымелі, дык, здаецца б, з'елі. І, мусіць, з'елі б, каб не абаранялі мяне. Тыя, што зверху, каму, уласна, я і служыў усё сваё жыццё... Пайду, аднак, паляжу хіба трохі, нешта галава разбалелася...

Надвор'е тое самае, пахмурна, дажджліва. І настрой у мяне той самы, учарашні. Лежачы ў пасцелі, думаў пра крытыкаў. Што ні гаварылі яны пра мяне, як ні пацяшаліся! А за што? Няўжо помсцілі? Але ж... І ім трэба жыць, і мне: яны зарабляюць грошы, і я зарабляю. Я са свае галавы ўсё бяру, а яны... Каб не было мяне, пра каго б пісалі? Мы, пісьменнікі, кармілі і кормім крытыкаў. Крыты-

кі — паразіты: каб не было нас, пісьменнікаў, не было б і іх. Яны нічога не ствараюць, жывуць за кошт некім створанага. Бялінскі, Дабралюбаў, Пісараў — выключэнне, хаця і яны жылі за кошт створанага Пушкіным, Лермантавым, Тургеневым, Астроўскім, Дастаеўскім, Талстым... Што крытыка залежыць ад літаратуры, гаворыць хоць бы вось які факт. Няма сёння такіх вялікіх пісьменнікаў, як былі некалі, няма такіх і крытыкаў. Мне кажуць: ты не пісьменнік. А ты што, хіба крытык? Ты таксама не крытык. Кануць у Лету мае раманы. Але такі ж лёс чакае і цябе — твае рэцэнзійкі, твае артыкульчыкі таксама кануць у Лету. Раней нават за мае творы. Вось так! Ты і я — роўныя, хоць ты і прытвараешся, робіш выгляд, што разумнейшы за мяне, усяляк кожны раз мяне павучаеш. Нехта сказаў, што апошняя гэта справа — спрачацца з крытыкамі. Я і не спрачаўся ніколі з імі публічна, у друку. А ў душы... Вяду з імі спрэчку ўсё сваё жыццё. Нават з тымі, якія мяне хвалілі. Іншыя пісьменнікі, на думку крытыкаў, таленавітыя, самабытныя, майстры... А я... Я раблю «ўклад у тэму», папаўняю літаратуру «яшчэ адным творам...» і г. д. А чаму б не напісаць тое самае і пра мяне, што пра іншых? Быццам з яго кішэні, быццам збяднее, як напіша. Прынцыповасць, непадкупнасць! Зноў жа лухта ўсё гэта. Не пашанцавала мне — патрымаўся б той сталінскі час, не прыехаў бы сюды, у Беларусь, Панамарэнка, не вызвалілі б мяне ад пасады ў выдавецтве, пачалі б ставіць да майго прозвішча і тыя эпітэты, што ставяць да іншых. Падхалімаж? Хай сабе. Але ж чытач не ведае, чаму крытык напісаў тое пра пісьменніка ці гэтае. Ён верыць крытыку, нават калі той неаб'ектыўны. Праўда, я заўважыў дзіўную акалічнасць. Найбольш мае кнігі купляліся не тады, калі крытыка мяне хваліла, а тады, калі знішчала. Значыцца, не заўсёды чытачы вераць і крытыкам, думаюць: калі гэтую кнігу крытыкуюць, значыцца, нешта там ёсць... І самае страшнае, калі крытыка замоўчвае цябе, ні слова не гаворыць. Напішаш кнігу, чакаеш, чакаеш, каб нехта адгукнуўся, аж цярпенне лопне. А водкугу як не было, так і няма... Ды я прывык ужо да ўсяго. Мяне і хвалілі, і лаялі, і замоўчвалі. Колькі гадоў пішу, а сумненне як мучыла, так і мучыць — трэба было ісці мне ў пісьменнікі ці не трэба было. Некалі Сабіна раіла мне: «Не займайся, дурань, глупствам, не смяшы людзей...» І яе словы я ўспамінаю часта. «А што, калі і праўда я займаўся глупствам, смяшыў людзей?..»

Не, з такімі думкамі працаваць над раманам нельга. Пісаць нешта можна толькі тады, калі ўпэўнены ў тым, што робіш. Пайду лепш прагуляюся. І надвор'е, здаецца, мяняецца, распагоджваецца, святлее пакрысе...

...А між тым я хворы. І хворы сур'ёзна. Баліць горла, баліць у грудзях. І не ангіна гэта, а нешта іншае. Змераў сёння тэмпературу — 37,8. Трэба да дактароў схадзіць. У горле пабальвае ў мяне даўнавата, з зімы. А я ўсё маўчу, не іду да дактароў. З-за хваробы ў мяне, мусіць, і настрой такі, не працуецца. Капаюся ў сваіх думках, душы, перабіраю ўбачанае, пражытае. Здаецца, я жыў апошнія гады ціха, непрыкметна, асабліва нікуды не вылазіў, стараўся рабіць так, каб усім было добра, нікога не пакрыўдзіць. І ўсё адно сяброў у мяне няма, я адзін. Нават параіцца, душу адвесці і то... Сяброўства ўзнікае, як я заўважыў, сярод нашага брата-пісьменніка альбо за чаркай, альбо калі ёсць нейкая мэта — нешта трэба захапіць і ўтрымаць. Гарэлачнага сяброўства я не прызнаю, а што нешта захопліваць ці ўтрымліваць, дык гэта... Не ў мае ўжо гады. Пенсіянер я... Мне ўлада ніякая не трэба. Дый, як хтосьці казаў, для пісьменніка няма большае пасады за тую, якую ён займае. Пішы, заваёўвай любоў і павагу. Пасада толькі на нейкі час можа табе памагчы, але калі ты нічога вартага не створыш, пасада не паможа заняць месца на Парнасе. Наадварот, забярэ ў цябе час, спакой... І я пасад пасля выдавецтва не займаў, пісаў... «Не разбяруцца ў маіх творах цяпер, разбяруцца пасля маёй смерці». Гэтым я сябе цешыў, супакойваў. І пісаў, пісаў... Адгарадзіўся ад усіх і ўсяго. Нават да чытачоў перастаў выязджаць на заводы і ў калгасы. Час, час — я эканоміў час. Бо што значыцца пайсці да чытачоў? Гэта трэба перахвалявацца перад выступленнем, трэба перахваляваццца і пасля. Дня, а то і двух як і не было. І не зрабіў нічога, і дзён няма. Атрымаеш за гэта букет кветак. Цешся, радуйся, гледзячы на гэты букет... Ліха ведае, а мо і хадзіць хоць зрэдку да чытачоў трэба было? Усё ж жывое слова, хоць ведаеш, як цябе разумеюць, успрымаюць тыя, дзеля каго ты творыш. Некаторыя знарок арганізоўваюць сустрэчы, розныя абмеркаванні. Паведамляюць, распісваюць пра гэта ў газетах, ствараюць шуміху: глядзіце, маўляў, як мяне чытаюць, што пра мяне гаворацць, які я патрэбны народу. І калі твор свой канчаюць, адразу ж нясуць урыўкі ва ўсе газеты —

я закончыў твор, чакайце, каб яго набыць і прачытаць. Ёсць у нас майстры з нічога рабіць штосьі!.. Ды я ім ніколі не зайздросціў! Творы, творы — гэта аснова. Усе званні, пасады, якія ты займаў пры жыцці, забудуцца з часам, астануцца напісаныя табою кнігі. І зайздрошчу я тым, хто напісаў іх многа і добра. Добра? А што такое ў літаратуры добра?.. Шкада, але пра гэта я пачаў думаць зусім нядаўна, праўдзівей, я думаў пра гэта і раней, але не так упарта, як цяпер. Мо таму, што раней і крытыка на гэта не асабліва звяртала ўвагу. Не было кніг, бралі кожную, якую выпускала выдавецтва — людзям трэба было нешта чытаць. Дый у турмах, лагерах былі многія аўтары. А цяпер... Давай шэдэўры! І тыя, хто на мастацкі бок звяртаў больш увагі, апынуліся ў выйгрышы. Іх кнігі перавыдаюць, іх хваліць крытыка. А я пралічыўся. Напісаў бы менш, ды лепш. Хаця... Кожную кнігу пішаш у меру сваіх сіл, хочаш, каб была добрая. А якая яна выходзіць з-пад твайго пяра — вінаваты зноў жа сам ты. Таленавіты — таленавітая і твая кніга. Графаман — графаманскі і раман створыш... Гм! Нешта я разважаць пачаў, як тыя ж крытыкі. Думаў, нічаму яны не навучылі, аж, аказваецца, навучылі сяму-таму... Ці мо гэта хвароба вінавата? Скрабе і скрабе нешта ў горле, быццам забраўся туды жук які. Дыхаць цяжка, балюча. І жаданне такое — вырваць з нутра таго жука, адкінуць ад сябе прэч...

...Усё часцей і часцей пачынаю думаць пра Вольгу Ігнатаўну. І радуюся і шкадую. Радуюся, што яна ўзваліла на сябе ўвесь цяжар быту, дала мне магчымасць нічым іншым не займацца, а працаваць — пісаць. Шкадую, што я ёй радасці даў мала. У мяне хоць забаўка свая была — я пісаў, жыў сваімі творамі. А яна? Чым жыла ўсе гэтыя гады яна? Няшчасная кабета, нават пазбавіў яе радасці, якую не пазбаўляюць жанчын — мець дзяцей. Чаму я быў такі жорсткі? Баяўся, што дзіця адбярэ ў мяне Вольгачку, будзе патрабаваць клопату. І мне замест таго каб пісаць, давядзецца займацца чортведама чым — хадзіць па магазінах, катаць у калясачцы малое, вадзіць яго за ручку ў садзік, у школу... Каб я сапраўды напісаў што значнае, тое, што не памрэ пасля маёй смерці, можа б, і апраўданы былі мае паводзіны. А калі я нічога такога не стварыў, не напісаў? Тады... Дзеля чаго я адабраў радасць у Вольгі Ігнатаўны, ды і ў сябе? Я думаў пра сваю бессмяротнасць, а на

самай справе не зрабіў у жыцці таго, што робяць усе звычайныя людзі — не пакідаю пасля сябе нават дзяцей. Вось чаму я апошні час так многа думаю пра сваю творчасць. Было ў мяне такое жаданне — пад канец жыцця выдаць збор твораў. Дзеля чаго гэта мне? Каб прачытаць усё, што напісаў, сёе-тое паправіць, паглядзець больш уважліва, чаго яно варта. Падаў заяву на Прэзідыум. На жаль, мяне не падтрымалі... Што ж, «Бог не роўна дзеле»,— як пісаў Францішак Багушэвіч. Збор твораў адзін выдае ў сорак гадоў, а другі... ніколі. Калі быў маладзейшы, я верыў: пры жыцці не ацанілі, ацэняць пасля смерці. Цяпер і ў гэта я перастаю верыць. Звычайна, каго прызнавалі сучаснікі, прызнавалі і нашчадкі. Былі, праўда, адхіленні — не ўсімі тымі, кім захапляліся сучаснікі, захапляліся і нашчадкі. Аднымі захапляліся і захапляюцца, другімі... Другіх проста забылі. І рэдка, рэдка здаралася тое, што некага не прызнавалі пры жыцці і захапляліся яго творамі пасля смерці. Прыкладаў такіх не ведае ні беларуская, ні руская літаратуры. Гэта я нечакана для сябе ўстанавіў, калі чытаў нядаўна гісторыі літаратур — рускай і беларускай. Так што цешыць сябе тым, што прызнаюць мяне пасля смерці, мусіць, не варта...

Вось што значыцца хвароба! Думкі ідуць зусім у іншым кірунку. Міжволі згодзішся з тым, што пісаў Гогаль у сваім артыкульчыку «Значэнне хвароб»... «О! Как нужны нам недуги! Из множества польз, которые я уже извлек из них, скажу вам только одну: ныне каков я ни есть, но я все же стал лучше, нежели был прежде...»

...Уночы сніў я дзіўны сон. Быццам ішоў я разам з іншымі людзьмі не то на суботнік, не то на дэманстрацыю. Па праспекце. І вось калі дайшлі мы да таго моста, што праз Свіслач, мост раптам падняўся перад самым маім носам. Зірнуў я — аж усе людзі па той бок моста, пайшлі з песнямі, вясёлыя, радасныя, а я... застаўся. Застаўся адзін. Мне зрабілася страшна. Я закрычаў... І прачнуўся...

Звычайна я ніколі не запамінаю сны. Не звяртаю на іх ніякай увагі. Ці мала што можа сасніцца? А гэты сённяшні сон не забываецца, не выходзіць у мяне з галавы. Што значыць гэта — застацца аднаму, не перайсці ракі?

Ні пра што іншае думаць не магу, думаю толькі пра сон...

...Ноч амаль не спаў. Некалькі разоў падымаўся з пасцелі, хадзіў па кватэры. Не памагае. Адчуваю,— у мяне пал, тэмпература. Працаваць і не хачу і не магу. Мусіць, падамся ў бальніцу. Вось так — жывеш-жывеш, думаеш пра ўсё, толькі не пра хваробу. А як схопіць яна — ні пра што тады думаць не можаш, толькі пра яе. Добра, калі хвароба не страшная. А калі...

Сумна, горка на душы, хочацца плакаць...

. . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Я дачытаў дзённік Язэпа Тарасюка. На ўсякі выпадак перагарнуў яшчэ адзін лісток — запісаў болей не было.

— Ну, што вы скажаце? — спытала ў мяне Вольга Ігнатаўна — яна, пакуль я чытаў, увесь час моўчкі сядзела збоку на крэсле, якое знарок унесла ў кабінет, пра нешта думала.— Язэп Апанасавіч быў несправядлівы да сябе, дакараў, упікаў, у многім сумняваўся. Словам, хвароба паклала адбітак на ўсё, нават на яго думкі. Ні ён, ні я не ведалі тады, што ў яго такая страшная хвароба. З паліклінікі ён трапіў адразу ж у лечкамісію, потым...

Вольга Ігнатаўна ўсхліпнула.

— Што зробіш,— пачаў я супакойваць жанчыну.— Страшна, мабыць, паміраць маладому, нічога не зрабіўшы... Вядома, кожнаму хочацца жыць. Аднак жа... Будзем удзячны лёсу і за тое, што гэтулькі пражылі...

— Урачы толькі гавораць пра бессмяротнасць. А яна вунь як трэба! Асабліва такім людзям, якім быў Язэп Апанасавіч. Акрамя як працаваць — пісаць кнігі, ён не меў іншае радасці. І задавольваўся заўсёды самым малым — было б што есці, было б дзе спаць, было б у што апрануцца. Яго многія не разумелі, асабліва крытыкі. Не разумеюць і цяпер. Прайшло ўжо столькі часу пасля яго смерці, а ніхто пакуль не напісаў пра Язэпа Апанасавіча добрага артыкула. Быццам і не жыў, не было на свеце такога пісьменніка. Ніхто не клапоціцца ні пра збор твораў, ні пра музей. Я, адна пакуль што я...

— Адразу ўсё не робіцца,— каб хоць трохі суцешыць Вольгу Ігнатаўну, сказаў я.— Як кажуць, будзем спадзявацца...

— Нічога не астаецца, як спадзявацца. Спадзявацца і верыць.

Мы яшчэ пагаварылі з Вольгай Ігнатаўнай пра сёе-тое, і я развітаўся, пабраўся дадому. І дзіўна — ці то я вельмі стаміўся, ці то мне надакучыла гаварыць і думаць пра

Язэпа Апанасавіча, я не ўспамінаў яго больш, ідучы па горадзе, а думаў зусім пра іншае — пра вясну, якая так імкліва наступае, пра тое, што неяк надта ж хутка бяжыць час і я ўжо не такі і малады, пара ўзяцца за штосьці сур'ёзнае, узяцца па-сталаму, з улікам вопыту і ўбачанага, пражытага.

«А што,— думаў я,— хто скажа, колькі адмерана мне яшчэ жыць? Кожны дзень можа здарыцца нечаканасць, а не — схопіць якаясь хвароба. І ўсе мае планы рухнуць, панясу іх разам з сабою ў магілу. І ніхто ведаць не будзе, хто я такі, чаго жыў на гэтым свеце. Не такі я юны, каб усё адкладваць на будучае, суцяшаць сябе тым, што, маўляў, паспею яшчэ і нешта прачытаць, і нешта напісаць, і нешта зрабіць. І трэба дбаць больш пра сваё, менш займацца рознымі пабочнымі справамі. Можа, нават парадак нейкі завесці — дзве-тры гадзіны, скажам, абавязкова сядзець за рабочым сталом. Нават калі пісацца не будзе — усё адно сядзець. Прывучыць сябе да гэтага. Інакш... Пісьменніка з мяне не будзе...»

Ліна была дома. Сядзела, маркотна схіліўшыся, за сваім столікам, правярала сшыткі. І пакуль я распранаўся, мне, як ніколі яшчэ, зрабілася раптам шкада яе. «Я заўсёды заняты сваім, а яна адна і адна... Школа, сшыткі, магазін, кухня... Што яна думае, чым жыве?.. Успамінае Вадзіка, дакарае сябе, што паслухалася маці, пакінула ў вёсцы сына?.. Ах, жыццё, жыццё!»

— Ну? — адарвала вочы ад сшыткаў, паглядзела на мяне стомлена, з сумам Ліна, калі я зайшоў у пакой і ціха, зморана сеў на канапу.— Хутка ты разгадаеш таямніцу Тарасюка?

— А ведаеш, я яе амаль ужо разгадаў,— абыякава сказаў я.

— Чаму ж радасці няма на тваім твары?

— Мусіць, таму, што стаміўся. Дый...

— Што дый?..

— Пра сябе, ідучы дадому, многа думаў. Пра цябе. Словам, пра нас. Трэба неяк арганізавацца, па-другому нам жыць...

— Як — па-другому? — насцярожылася, са спалохам зірнула на мяне Ліна.

— Ды так. Шмат часу трачу я попусту, займаюся ліха ведае чым. А гады ідуць. Нельга так далей. Ну, быў у нас Вадзік... Але... Яго няма...

Пачуўшы пра Вадзіка, Ліна паднялася з-за стала, прайшлася па пакоі.

— Маці мая вінавата... І я...— сказала яна маркотна, з роспаччу.

— І я вінаваты... Ды... Не будзем, не будзем... Хто больш, хто менш вінаваты... Не пра тое, не пра тое...

Я таксама падняўся, падышоў да Ліны, прыгарнуў яе да сябе. Яна не супраціўлялася, пакорна паддалася маёй волі, і я, адчуўшы гэта, узяў яе, як малое дзіця, на рукі, панёс на канапу. Сеў, пакінуўшы Ліну на сваіх каленях.

— Пра дзіцятка нам пара падумаць. Не магу я больш так, адна,— прашаптала ледзь чутна Ліна.— А то... Гады ідуць, а мы... Ты сабе, я сабе. Ты ў рэдакцыі, я — у школе...

І не вытрымала — усхліпнула.

— Перастань,— я абняў Ліну за плечы, прытуліў да сябе.— І школьнымі, і рэдакцыйнымі справамі трэба, вядома, займацца. Але ж мы, па-мойму, займаемся імі аж занадта. Я ў нейкіх ці не ў сямі камісіях ў Саюзе, на цябе ў школе розныя нагрузкі валяць. Гэта я заўважыў — хто цягне, таму і падкладаюць.

— Нарэшце! Добра, што ты хоць гэта зразумеў...

Ліна перастала плакаць, са слязамі на вачах сказала задуменна як не на самае мне вуха:

— Жыццё ж ідзе! Іншы раз стаю на трамвайным прыпынку — і ўявіцца: жыццё — гэта той жа трамвай. Адзін сеў, паехаў. Другі не ўціснуўся ў трамвай — адстаў. Трэці думае: сядаць яму, ехаць, ці кіравацца на іншы транспарт — аўтобус, таксі, тралейбус...

— Не будзем многа разважаць,— пацалаваў я Ліну ў адно, потым у другое вока.— Павячэраем ды пойдзем паблукаем па горадзе. Тады і пагаворым... Пра ўсё пагаворым.

— У мяне сшыткі неправераныя,— уздыхнула Ліна.

— Давай я памагу табе.

— Вучні адразу ж пазнаюць, што почырк не мой.

— Ну і што?

Ліна пацiснула плячыма.

— Проста нязвыкла гэта. Але і праўда — што каму да таго? Абы правільна праверыў.

— Вось іменна...

Я завастрыў чырвоны аловак, сеў за свой стол, і мы з Лінай, перамаўляючыся, узяліся канчаць правяраць вучнёўскія сшыткі...

Вясна між тым уваходзіла, убіралася ў сілу. Неяк непрыкметна растаў, зусім знік з вуліц і тратуараў снег. Яны не макрэлі ўжо больш, калі паказвалася ў небе, пачынала прыграваць сонца, як гэта было, здаецца, нядаўна, дзень-два таму назад, а падсыхалі — над імі курэла, клубілася шызая пара. Пратупацеў, прашумеў надвячоркам ціхі, цёплы дожджык, і ўжо назаўтра ж то тут, то там з-пад платоў, на газонах і клумбах прабілася порсткая, нязвыкла зялёная пасля зімы трава. Пупышкі на дрэвах набухлі — запахла першай клейкай лістотай. І хоць не чуваць было спеваў вестуна вясны жаўранка, вясна ўсё ж развіналася, смялела. Людзі мылі вокны, высаджвалі на балконах кветкі. І на твары ў кожнага блукала радасць.

Кіруючыся неяк на працу ў рэдакцыю,— без шапкі, у расшпіленым на ўсе гузікі паліто (вельмі ж прыгравала сонца, аж парыла!), я дагнаў Пятра Пятровіча Шчарбачэню, майго былога начальніка, загадчыка аддзела. Ён таксама ішоў без капелюша, у расшпіленым, як і я, на ўсе гузікі, яшчэ цёплым зімовым паліто.

— Ну, як жывецца, пішацца? — спытаў я ў Пятра Пятровіча, як толькі мы параўняліся, падалі, пацiснулі адзін аднаму рукі.

— Помніш, што адказаў дзядзька Антось у «Новай зямлі» дзецям, калі ў яго спыталі пра клёцкі? — прыжмурыў хітра вочы Шчарбачэня.

— «Паскудства, брат, і не пытайся!» — прыгадаў я ўголас коласаўскія радкі.

Пятро Пятровіч зарагатаў — гучна, раскаціста, як умеў рагатаць толькі адзін ён.

— Дзе ты бачыў — пісаць у такія гады! Як кажуць, не наеўся, то і не наліжашся. Стамляюся хутка, няма той свежасці ўспрымання... Напішу старонку, перачытаю і падзяру. Суха, па-газетнаму, нецікава, усё адно што ў нябожчыка Тарасюка... Ха-ха-ха! — рагатаў Шчарбачэня.

— Ды ну вас! — не мог утрымацца, каб не ўсміхнуцца і я.

— Не, дальбог. Нешта пакуль што...

— Не пішацца?

— Пісацца-то пішацца. Але каб сказаць, што задаволены сабой... Дык не. Творчасцю займацца ўсё ж у маладыя гады трэба, калі і суткі, і двое з-за стала можаш не вылазіць. А ты як — пішаш?

— Таксама рэдка,— прызнаўся я.— Клопаты розныя...

— Канчай ты з гэтымі клопатамі. Усё кідай — пішы.

— Як скончыш, калі ў нумар кожны месяц здаваць трэба. А то з Тарасюком зноў звязаўся...

— Як гэта — «з Тарасюком зноў звязаўся»? — зацікавіўся, навастрыўся Пятро Пятровіч.

— Ды так... Удава прыйшла, папрасіла, каб зайшоў да яе.

— Што яна хоча?

— Ды яна многа чаго хоча... Кнігу ўспамінаў, збор твораў. І нават музей...

— Ха-ха-ха! — зарагатаў на ўвесь праспект Пятро Пятровіч.— Раскажы, раскажы, па парадку мне ўсё раскажы...

Я паглядзеў на гадзіннік.

— Што, у рэдакцыю рвешся? Кінь, пачакае, калі каму ты вельмі трэба. Хадзем па парку лепш пройдземся. Такі дзень! Дый, як казаў Ясенін, усё можа паўтарыцца, акрамя добрай кампаніі. Я табе сёе-тое таксама пра Язэпа Тарасюка раскажу. Гэта ж, лічы... Ды што казаць, і я... Грэшны. Па маладосці глупства зрабілі, збілі з тропу чалавека.

— Вы трохі неяк расказвалі. Дырэктар рэстарана, там збіраліся, замачвалі кніжкі, ганарары...

— Гэта раней было. А я табе пазнейшае раскажу. Калі Язэп Тарасюк ужо друкаваўся, у выдавецтве працаваў, быў, як тады казалі, ударнік у літаратуры. Ён жа не толькі вершы, апавяданні, аповесці, раманы пісаў, а і...

— Што, даносы?

— Пачакай, не падганяй, слухай...

З праспекта мы збочылі на набярэжную Свіслачы, прайшліся ў парк. Тут на залітых асфальтам дарожках было ўжо суха, снег параставаў, дзе-нідзе зелянела на абочынах трава. Але дрэвы стаялі яшчэ голыя, хоць і адчувалася — вось-вось лопнуць пупышкі, выкінуць зялёнае полымя.

— Дык вось,— гаварыў, як заўсёды, на ўвесь голас Пятро Пятровіч.— Неяк па пошце я атрымліваю запрашэнне на вечар да Язэпа Тарасюка. У запрашэнні, як цяпер помню, было напісана, што на вечары будзе прачытаны твор (чытае сам аўтар!) і будзе невялікая сяброўская вячэра. Твор Язэпа Тарасюка ні мяне, ні каго б там іншага, думаю, не цікавіў, а што да астатняга... Час тады быў не вельмі каб, а Язэп Тарасюк — ну, калі не бог, дык усё ж бажок у выдавецтве. Паспрабуй не пайдзі... А я... Эх, ды што казаць... Можа, хто і мог не пайсці, толькі не я. Адчу-

ваў жа — абкладаюць мяне, як ваўка таго на паляванні... А мне... У турму ці на той свет не хацелася, ой як не хацелася. Словам, у назначаны дзень, у назначаныя гадзіны я стаяў ля таго драўлянага доміка, дзе жыў Тарасюк. Мне адчыніў сам гаспадар, правёў у залу. Першае, што я ўбачыў,— стол, вялізны доўгі стол, сервіраваны, як кажуць, бы ў лепшых дамах Філадэльфіі. Ён аж гнуўся ад бутэлек каньяку, гарэлкі, віна, місак, талерак з living рознымі салатамі, чорнай і чырвонай ікрой, балыкамі, заліўнымі языкамі, асятрынкай... За сталом ужо сядзелі некаторыя мне знаёмыя пісьменнікі, супрацоўнікі газет, радыё, рэжысёры, артысты з тэатраў і кіно. Я прывітаўся з гасцямі, сеў на вольнае крэсла. Зайшло яшчэ некалькі чалавек, таксама селі за стол. Сярод апошніх быў вядомы ў тыя гады перакладчык з беларускае мовы на рускую. І я падумаў: ці не прыехаў ён знарок дзеля гэтага вечара з Масквы? (Так яно і было, як потым выявілася.) Месцы, здавалася, былі ўсе занятыя, а вечар не пачыналі — чакалі Кузьму Чорнага. Але ён не прыходзіў. Урэшце прыбег нейкі хлапчук і сказаў, што Чорны не зусім добра сябе пачувае, яго не будзе. Язэп Тарасюк — у белай накрухмаленай кашулі, пад гальштукам — яўна незадаволены, скрывіўся, заняў месца гаспадара за сталом, пачаў чытаць рукапіс. Рукапіс быў даволі ёмкі, вядома, цікавасці ніякай ні ў каго да таго, што чытаў Тарасюк, не было. Дый... Стаяла, зваблівала выпіўка, закуска... Пакуты Тантала ў параўнанні з пакутамі кожнага, хто сядзеў за тым сталом, былі нішто. А Язэп не спяшаўся, чытаў і чытаў... Старонку за старонкай, «с чувством, с толком, с расстановкой». Калі ён скончыў чытаць, усе аж уздыхнулі. Абмеркаванне пайшло жвавей, шпарчэй. Бо, калі Тарасюк скончыў чытаць, налілі, нарэшце, чаркі, паднялі тост за аўтара і яго твор. А далей... Пайшло ўсё як па масле. Адзін параўноўваў Язэпа Тарасюка з Львом Талстым, другі з Дастаеўскім, трэці называў яго «чыстым Чэхавым»... Перакладчык з беларускае мовы сказаў, што ён не ведае ў Расіі чалавека, які б здолеў перадаць усю прывабнасць і непаўторнасць твора Тарасюка на рускую мову. Хіба Лявонаў ці Шолахаў? Але як іх упрасіць? Рэжысёры глыбакадумна разважалі, як бы тая ці іншая сцэна глядзелася ў асвятленні рампы ці ў кіно, артысты марылі, каб ім выпала шчасце іграць тую ці іншую ролю... Словам, ці то настрой такі ва ўсіх быў, ці то ліха ведае што напала на людзей, але... Лгалі і не чырванелі нават, толькі пілі ды закусвалі, закусвалі ды пілі. І дага-

варыліся былі да таго, што беларуская літаратура дагэтуль не мела такога дасканалага ва ўсіх адносінах твора... І можаш паверыць, я таксама нейкае глупства там сказаў, ну, не ўтрымаўся, пахваліў Тарасюкоў твор. Не так, як іншыя, а ўсё ж... Усе хвалілі, а мне... Маўчаць? Пакідаць вячэру? Ну, не асмеліўся... Ды і тост жа далі... Каб ведаў ты, як праклінаў я той вечар, сябе і ўсіх тых, хто быў у гасцях у Язэпа Тарасюка, калі Язэп прынёс у рэдакцыю, дзе я тады загадваў прозаю, свой твор. Што было рабіць? Друкаваць? Ды я перастаў бы паважаць літаратуру, сябе... Уяві — я пратрымаў у рэдакцыі твор Язэпа Тарасюка з паўгода, а потым падшукаў сабе месца кансультанта ў газеце і пакінуў працу ў часопісе...

— І той твор быў надрукаваны? — спытаў я.

— Нават не ведаю. Мусіць, быў... Бо Язэп Тарасюк умеў уладкоўваць свае справы. І тады, калі загадваў рэстаранам, і пасля, як у выдавецтве працаваў. Пазнаёміцца, бывала, з патрэбным яму чалавекам, кліча да сябе ў хату. Чарка, скварка, ну і... Што і казаць, умеў Тарасюк спадабацца чалавеку, лізнуць акурат там, дзе свярбела. Нічога не шкадаваў, лістам слаўся. Дый жоначка ў яго была...

Шчарбачэня гмыкнуў, пакруціў галавою.

— Гэта каторая ж?

— Ды тая... Першая... Сабінка...

І Пятро Пятровіч аблізаўся, як памаўзлівы кот.

— Я не люблю расказваць нешта непрыстойнае пра жанчын, асабліва калі і сам грэшны... Але гэтая жанчына... Нават рэстаран тады маладых так не вабіў да сябе, як яна. Але, але, Сабіна была не толькі прыгожая, а яшчэ і такая, на якую ніхто не мог крыўдаваць. Каханне — гэта была яе стыхія. І вось што галоўнае — кахаючы ўсіх, хто да яе гарнуўся, яна ўмела кахаць у патрэбную хвіліну таго, хто быў у той момант побач. Ды так, што ты забываў на ўсё на свеце. Язэп Тарасюк ведаў, мусіць, пра Сабіну тое, што ведалі ў горадзе бадай што ўсе. Але зноў жа — крыўдаваць на яе яму не было як, бо калі аставалася яна наадзіне з кім-небудзь, нельга было не паверыць, што з усімі ў яе было проста так, не сапраўднае, а сапраўднае каханне з табою, толькі з табою. Гэта, відаць, і трымала Язэпа Тарасюка ля Сабіны. Чаму Сабіна жыла з Тарасюком, нас таксама нямала тады здзіўляла. Што праўда, то праўда — ён быў дырэктар рэстарана, мог у любы час дастаць усё, што душа пажадае. Дый сам Тарасюк быў

чалавек ціхі, цярплівы да выхадак жонкі. Ніхто, бадай, не згадзіўся б жыць з Сабінаю. А Тарасюк... жыў. Жыў, прынамсі, да таго дня, пакуль... Не знайшоўся чалавек, які забраў у яго Сабіну.

— І хто гэта зрабіў?

— Быў такі адзін смяльчак...

— Цікава, і таму таксама яна ставіла рожкі? — не мог, каб не спытаць я.

— Гэтага я не ведаю. Было мне не да таго... Жыццё ўкруціла так, што... Аж у Сібіры я апынуўся. Дзе мне было тады думаць пра нейкую Сабіну! — махаў рукою, усміхаўся Пятро Пятровіч.— Да слова, я нядаўна яе сустрэў...

— Праўда? — аж не паверыў я.— Яна жыве ў нашым горадзе?

— Але. Пастарэла, праўда, не тая ўжо. Разгаварыліся мы з ёю, успомнілі тыя гады, некаторых агульных знаёмых... Пра сябе яна расказала. Аказваецца, той чалавек, за якога яна выйшла другі раз замуж, заняў потым вельмі ўплывовую пасаду, стаў ледзь не міністрам... Пражыла яна з ім душа ў душу, нарадзіла і вырасціла трое дзяцей. Адзін сын інжынер, другі — кандыдат навук. Дачка замужам таксама за вядомым на ўсю краіну чалавекам...

— Пра Язэпа Тарасюка з ёю не гаварылі?

— А што пра яго гаварыць? Няшчасны чалавек! Трэба была яму тая літаратура, як...— Пятро Пятровіч ужыў такое параўнанне, якое я, паважаючы чытачоў, прывесці тут не магу.— З дырэктара рэстарана ён мог вырасці не ў абы-якога кіраўніка. А ў літаратуры... Памёр — і як бы не было яго.

Я пахітаў галавою.

— Тут я з вамі не згодзен. Усё ж Язэп Тарасюк быў. Калі не ў самой літаратуры, дык каля яе. Правільней, жыў у літаратуры. Я думаю, гісторыя такіх людзей у нечым павучальная для іншых. Бачыш, што з цябе нічога не выйдзе, не ацірайся там, дзе без цябе абыходзяцца, не замінай, займіся больш карысным справай.

— Дык каб жа ён адчуваў, што непатрэбен! У тым і бяда дурня, што яму здаецца, не ён замінае разумным, а разумныя яму. А потым... Прывыкае чалавек да ўсяго. І графаман прывыкае, што яму трэба пісаць. Іншыя пішуць і друкуюцца, то чаму б і яму не пісаць і не друкавацца?

— Я прачытаў дзённік Язэпа Тарасюка. Цікава, Тарасюк упершыню — заўважце, упершыню! — не канструя-

ваў сюжэта, нічога ані не выдумваў, а пісаў пра тое, што яго хвалявала, што было на душы, што думаў, чым жыў. І ведаеце... Мог жа, мусіць, і ён пры жаданні... Ну, калі не класічнае, дык прыстойнае пісаць. Бо, вы гэта ведаеце лепш за мяне, заўсёды былі і ёсць пісьменнікі вялікія і звычайныя, сярэднія. І самае важнае — каб кожны пісьменнік гаварыў сваім голасам. Гаварыў пра тое, што ён ведае. А Тарасюк... Выбачайце за параўнанне, але Тарасюк — гэта балонка, якая хацела выглядаць ваўкадавам... Ну, пісаў бы ён што-небудзь у газеты... Не, дык эпапею стварыць захацелася!.. Уразіла мяне ў тым дзённіку і яшчэ адно — пад канец жыцця Тарасюк усумніўся ва многім.

— Напрыклад?

— Ну, што не выбраў сябе іншай прафесіі. Што творы яго пасля смерці ніхто пераацэньваць не будзе. Што ён не такі вялікі, як некалі думаў...

— А ён усё ж думаў, што вялікі! Ай-я-яй! — як малое дзіця айкаў Пятро Пятровіч.— Не магу сабе дараваць, што і я прычыніўся да лёсу Тарасюка. Хай бы жыў, як жывуць сотні, тысячы людзей. А так... Сапсавалі чалавеку жыццё. Думаць, як думаць трэба пра кожнае слова, перш чым яго сказаць! І не трэба крывіць душою, не трэба баяцца пакрыўдзіць чалавека. Гаварыць праўду, толькі праўду. І не за вочы, а ў вочы. Нішто так не лечыць, не ставіць людзей на сваё месца, як праўда. Шчырая, хай сабе і горкая, але праўда. Дазволь, я нагадаю табе словы пісьменніка, якога я, нягледзячы ні на што, усё ж люблю. Ды і ты любіш таго пісьменніка — Максіма Горкага. У адной сваёй кнізе Горкі пісаў, што «...гаварыць праўду — гэта мастацтва, цяжэйшае з усіх мастацтваў, бо ў сваім «чыстым» выглядзе ...праўда амаль зусім «неудобна»,— але, але, Горкі так і піша — «неудобна» для карыстання абывацелю і непрымальна для яго». А Тарасюк і яму падобныя — абывацелі. Скажы ім, што ты пра іх думаеш, ведаеш, як усходзяцца! Бы вужы ці ўюны, калі на іх сыпанеш солі... Але ж... І не гаварыць праўды... Куды, куды мы дойдзем?..— Пятро Пятровіч развёў рукамі.— Гэта ж добра, што Тарасюка пагналі з выдавецтва. А каб не пагналі, каб ён заняў яшчэ большую пасаду? Колькі б бяды мог натварыць! А што да здольнасцей... Дык хіба мала хто ў наш час піша? Любы пісьменны чалавек можа напісаць тое, што пісаў Тарасюк. Адкрыццяў ніякіх ён не рабіў ні ў чым. Ведаеш, Адаме, чым можна зацікавіць чытача? Любым цікавым паведамленнем. Але каб зачараваць, захапіць, як кажуць, узяць за

жывое, трэба расказаць цікава і не пра цікавае, вядомае даўно ўсім. Ні першага, ні другога не было ў Тарасюка. Значыцца, і таленту не было.

— Калі я чытаў дзённік, здзіўляла мяне адно — чалавек нібыта жыў і не жыў, быў як у вакууме. Сярод людзей — і без людзей. Нідзе нават думкі ні адной, як і чым памагчы свайму бліжняму, грамадству, што зрабіць, каб быць карысным, патрэбным сённяшняму і заўтрашняму дню. Я, крытыкі, грошы, слава... Ды яшчэ жонкі — першая, другая...

— Тыповая філасофія абывацеля! Хіба ж абывацель глядзеў калі далей свайго носа, хіба ж думаў, каб было не толькі яму аднаму добра?

— Бадай што...— згадзіўся я з Пятром Пятровічам.— Сутнасць Тарасюка і тарасюкоўшчыны відаць не толькі ў гэтым... Іх нарадзіў час. Патрэбны былі Тарасюкі...

— Так, сапраўдных пісьменнікаў знішчалі, а на іх месцы з'яўляліся Тарасюкі. Гэтак званыя ўдарнікі ад літаратуры, іншая, звязаная з ахоўнымі органамі пошасць...

— Вам не здаецца, што, можа, каб жыла з ім Сабіна...—перапыніў я Пятра Пятровіча, хацеў выказаць тое, што я думаў.

— Не, Сабіна тут ні пры чым,— сказаў як адрэзаў Пятро Пятровіч.— Усё адно рана ці позна яны развяліся б. Ён бы не пакінуў пісаць... Не!.. Надта ж вялікая спакуса — быць літаратарам, пісьменнікам. А Тарасюк ужо і славы быў пакаштаваў... Дый... Не ён, дык іншы Тарасюк знайшоўся б. Помніце, здаецца ў Маркса сказана: «Эпоха патрабавала тытанаў, тытанаў яна і нарадзіла». А наша эпоха патрабавала пігмеяў, такіх вось Тарасюкоў. Яна іх і нарадзіла. Што ж да Сабіны... Вельмі ж яна была жывая, вольная ва ўсім. Што захочацца, тое і падавай.

— Але ж вы кажаце, выйшла другі раз замуж, дзяцей нарадзіла... Пэўна ж, і супакоілася.

— Яна мне пра гэта так сказала: «Муж хітры трапіўся. Адно дзіця я нарадзіла, а ён адразу ж — давай і другое. Я другое нарадзіла, а ён — радзі трэцяе...» А трое дзяцей нарадзіўшы, што ад жанчыны астаецца, нават калі яна самая прыгожая была? Дый дзяцей жа глядзець трэба. Не да любошчаў... Словам, знайшоўся чалавек, які змог і Сабіну прыручыць.

— Цікава было б пагаварыць з Сабінаю. А то я, між намі кажучы, сабраўся адну рэч напісаць,— прызнаўся я Пятру Пятровічу.— Сустрэцца б з Сабінаю...

— Што за рэч? — паглядзеў як бы з недаверам на мяне Пятро Пятровіч.— Артыкул?

— Не, хутчэй аповесць. Пра літаратараў, літаратуру... І Язэп Тарасюк раптам спатрэбіцца... Самі разумееце, дзеля паўнаты вобраза, сустрэцца з Сабінаю не пашкодзіла б.

— Калі трэба, дык зробім. Я пазваню ёй, выберам дзень... Да яе на кватэру сходзім ці ў кафэ дзе-небудзь пасядзім. А мо табе аднаму з ёю сустрэцца хочацца?

— Не, можам і разам. Нават з вамі будзе лепш. Вы ведаеце той час, самога Тарасюка.

— Што цябе цікавіць?

— Ды, можна сказаць, усё. Чым болей яна раскажа...

— Усё будзе ў ажуры! — І вочы ў Пятра Пятровіча загарэліся.— Бачыш, а ты не хацеў прайсціся са мною, пагаварыць...

— Чаму ж... З вамі заўсёды прыемна сустрэцца і пагаварыць. Вы пражылі жыццё, многа чаго бачылі, ведаеце.

— У кожнага чалавека сваё жыццё. І ў кожнага яно па-свойму цікавае. Вось ты заняўся Тарасюком... Ей-богу, не думаў, што чыё-чыё жыццё, а жыццё Тарасюка, ну... Цікавага ў ім быццам і няма нічога. А калі ты хочаш пра яго пісаць, то нешта ж убачыў...

— Калі напішу, будзеце маім першым чытачом. Згодны?

— Вядома!

Мы зрабілі яшчэ некалькі кругоў па асфальтаваных дарожках парку і развіталіся. Пятро Пятровіч падаўся ў Саюз — трэба было даведацца ці ёсць у Літфондзе пуцёўкі куды-небудзь у дом адпачынку, а я... Я накіраваўся ў рэдакцыю.

У канцы мая неяк увечары пазваніў мне Пятро Пятровіч Шчарбачэня.

— Адаме,— пачуў я ў тэлефоннай трубцы знаёмы голас.— Ці маеш заўтра час?

Заўтра была нядзеля, і мы з Лінай збіраліся выехаць куды-небудзь «на прыроду» — адпачыць.

— Гледзячы на што,— сказаў я.— Калі па нейкай пільнай патрэбе, то час заўсёды знайсці можна.

— Помніш, ты прасіў як-небудзь арганізаваць сустрэчу з першай Тарасюковай жонкай, Сабінай?

— Ага, было такое.

— Дык усё дамоўлена. Заўтра можам пад'ехаць да Сабіны.

— Яна ў Мінску?

— Не, на дачы, у Ждановічах. Да слова, дачу яна прадае, дык мы і пад'едзем, як на агледзіны. Між іншым, калі мне спадабаецца дача, паспрабую купіць. Горад горадам, а хочацца на прыродзе пажыць, у зямельцы пакапацца. Я сын земляроба, і пад старасць прачнулася ва мне нешта бацькава, дзедава. Так што, гаворачы пра дачу, мы можам і пра Тарасюка што-кольвек пачуць. Кабета яна разгаворлівая... Што цябе цікавіць — пытай. Ну, дык як, едзем?

Я заклапочана паглядзеў на Ліну — яна слала пасцель, збіралася класціся спаць — і сказаў:

— А калі я жонку з сабою вазьму — можна?

— А чаму ж не? Пабудзем на дачы ў Сабіны, а потым і пагуляем там па лесе. Можам і да мора схадзіць.

Ліна насцярожылася: «Што такое?»

— Хвіліначку,— сказаў я і, закрыўшы даланёю трубку, у двух-трох словах расказаў Ліне, куды мы заўтра паедзем. Ліна не пярэчыла — згадзілася.— Пятро Пятровіч, а як мы паедзем? — адняўшы руку, сказаў я зноў у трубку.

— Хочаш на аўтобусе, хочаш на таксі.

— Давайце на таксі. Я выклічу таксі да сябе, потым заеду да вас. А якой гадзіне лепш за ўсё гэта зрабіць?

— Мы не дамаўляліся з Сабінаю дакладна. Давай так,— Пятро Пятровіч памаўчаў.— Так гадзін у адзінаццаць і заязджай да мяне. Я выйду на вуліцу, буду чакаць ля свайго дома.

— Добра, дамовіліся...

Роўна ў адзінаццаць гадзін мы з Лінай пад'ехалі на таксі да таго дома, дзе жыў Пятро Пятровіч Шчарбачэня. Ён, у светла-жоўтай кашулі, з пінжаком, закінутым на руку, абапёршыся на кульбу, стаяў ля пад'езда, чакаў нас. Я адчыніў дзверцы таксі, запрасіў сядаць. Пятро Пятровіч жвава, умомант падбег да таксі, сеў побач з шафёрам. Адразу ж, апынуўшыся ў машыне, павярнуўся да нас — мы з Лінай сядзелі на заднім сядзенні,— пачаў знаёміцца.

— Мяне вы ведаеце,— сказаў ён да Ліны.— Я таксама ведаю, што вы такая ёсць. Але бачымся мы ўпершыню, таму дазвольце вашу ручку...

Ліна працягнула Пятру Пятровічу сваю белую прыгожую руку, і Пятро Пятровіч прыпаў да яе, пацалаваў — зусім як галантны кавалер.

Ліна пачырванела — не прывыкла яна, каб цалавалі ёй руку, прычым — людзі намнога старэйшыя за яе.

— Ведаю, завуць вас Ліна,— сказаў, усміхаючыся, Пятро Пятровіч.— А вось па-бацьку...

— Можаце зваць Лінаю,— усміхнулася і Ліна.

— Не, усё ж скажыце...

— Пятроўна.

— Выходзіць, мой бацька і ваш... Ды і я — цёзкі. Дзе ён?

— Я яго амаль не помню. З фронту не вярнуўся,— сумна сказала Ліна.

— А-а,— задумліва паківаў галавою Пятро Пятровіч.— А ў мяне ў вайну жонка загінула,— прызнаўся ён у тым, чаго і я не ведаў.

— Дзе?

— Ды тут, у Мінску. Бомба трапіла ў дом. Разам з жонкаю загінулі і дзеці — сынок і дачушка. І пра гэта пачуў я няскора, пасля вайны ўжо. Вярнуўся ў Мінск, то і цяпер не магу падысці да таго месца, дзе дом некалі стаяў, жылі мы... Ногі падкошваюцца, сэрца сціскаецца...

— Што зробіш, вайна,— уздыхнуўшы, сказаў я.— Кожнага яна апаліла, усюды пакінула раны.

Мы ўсе трое памаўчалі.

— Не разумею іншы раз тых людзей,— першы парушыў маўчанне Пятро Пятровіч,— якія адмахваюцца ад твораў пра вайну, патрабуюць, каб усе пісьменнікі пісалі толькі пра сённяшні дзень. Вядома, трэба пісаць, чым жыве чалавек сёння. Але нельга гэта рабіць, калі душа не баліць, калі хочацца пісаць пра нешта іншае. Пісаць трэба толькі пра тое і тады, калі не можаш не пісаць. І пра людзей, чалавека!

— Каго-каго, а гаваруноў у нас напладзілася!

— А ты, Адаме, менш іх слухай. Кожны ганчар хваліць свае гаршкі. І хоча даражэй іх прадаць. Калі нехта сам піша пра сённяшні дзень, дык набівае цану свайму твору. Пра што ён піша — сам ведае, а таму перш чым выносіць на суд іншым, трубіць, робіць нейкія «філасофскія абгрунтаванні». Ведаю я такіх. Пачне пісаць сам пра жанчын — трубіць, што ў літаратуры даўно ніхто не стварaў вобразаў жанчын. Пачне пісаць пра рабочых — трубіць, што ў нас няма твораў пра рабочы клас... А ў літаратуры

ўсё было і ўсё ёсць. Хочаш пра сялян прачытаць — бяры Рэйманта, бяры Шолахава, бяры нашага Чорнага, Мележа... Ёсць і пра рабочы клас шмат выдатных твораў. Ёсць і пра інтэлігенцыю. І сунуцца з сваімі паробкамі ў літаратуру нечага. Пакрычыць, пакрычыць такі з трыбун, потым выдасць на-гара сваю аднадзёнку — і ўсё. Таму, Адаме, не слухай гэткіх, а слухай сваё сэрца. Не хочацца табе пра што пісаць — не пішы, хочацца — пішы. Але мы зноў пра літаратуру. Ліне ж сумна. Вы, Ліначка, што выкладаеце ў школе?

— Матэматыку.

— І за пісьменніка выйшлі замуж? — зрабіў кіслы, здзіўлены выраз на твары Пятро Пятровіч.— Няўжо ніхто другі замуж не браў?

— Можа б, і ўзялі, каб Адам не ўзяў,— зрэагавала на жарт Пятра Пятровіча Ліна.— Але я не вельмі перажываю, што замуж выйшла за пісьменніка. Наадварот, радуюся. Я заўсёды ў курсе ўсіх літаратурных падзей, новых твораў.

— Дык вам не сумна, калі мы пра літаратуру гаворым?

— Вядома, не. Я слухаю ўвесь час мужа, і мне здаецца, што ён не заўсёды правільна разважае. Таму паслухаць цікава і вас.

— А ў літаратуры — што галава, то і свой розум. І гэта, між іншым, добра. Уявіце сабе — калі б усе разважалі і пісалі так, як, скажам... Ну Маякоўскі? Маякоўскі — выдатны паэт. Але настрой у нас штодзень, кожную хвіліну мяняецца. То хочацца пачытаць Маякоўскага, то Ясеніна, то Пушкіна, то Блока... У тым і багацце літаратуры, што яна розная, кожны пісьменнік гаворыць, піша пра сваё і так, як ён лічыць патрэбным гаварыць і пісаць. А патрабаваць, каб усе пісалі пра адно і аднолькава... Смешна! Мне, напрыклад, пасля добрага твора пра наш сённяшні дзень хочацца пачытаць нешта і пра ўчарашняе, даўно мінулае. Куды важней, здаецца, было б часцей гаварыць пра якасць. Чаму творы класікаў мы чытаем і перачытваем? Ды таму, што яны напісаны выдатна, таму што ў іх шмат хвалявання і думак. Дзесяць разоў чытай і кожны раз будзеш знаходзіць нешта патрэбнае, цікавае для сябе, тое, чаго раней не заўважаў. Іншы раз няважна нават, пра што кніга, важна тое, што ў кнізе, як яна напісана. Майстэрства, само майстэрства важна! І яшчэ адно: пра што б ні пісаў пісьменнік — пра сённяшні дзень ці пра даўно мінулае,— усё адно ён нікуды не ўцячэ ад сучаснас-

ці, ён — хоча таго ці не хоча — будзе пісьменнікам сённяшняга дня. Ад часу, ад таго, што бачыш і адчуваеш, ад думак і праблем дня, таго дня, у якім жывеш, нідзе не дзенешся.

— Ухітраюцца ж неяк пісьменнікі, пішучы нават пра сучаснасць, быць старамоднымі, не сучаснымі,— усміхнуўся я.

— Гэта не пісьменнікі, гэта прыжывалы каля літаратуры, прыліпалы. Іх, на жаль, нямала, многіх парадзіў наш час. Але ёсць, заўсёды ёсць — на шчасце! — і сапраўдныя пісьменнікі, сапраўдная літаратура. Не ўсё друкуецца, што пішацца. І якраз таму, што яно сучаснае, кранае тое, што хвалюе людзей, баліць. Як — гэта ўжо іншае. Адзін піша творы пра сённяшні дзень, другі — пра мінулае, укладваючы ў мінулае свае сённяшнія погляды і думкі, трэці фантазіруе, стварае розныя ўтопіі, светы, якіх няма, насяляючы іх героямі, зноў жа, з думкамі і праблемамі, якія характэрны таму часу, у які ён жыў. Так што, Адаме, менш за ўсё слухай розных гаваруноў, пішы пра тое, пра што хочацца табе пісаць, што ты ведаеш, пра што — калі не напішаш — ніхто за цябе не напіша...

Машына наша выехала з горада, і мы замоўклі раптам, завароржаныя вабнасцю краявіда, што адкрыўся вачам: абсаджаная зялёнымі, яшчэ не запыленымі дрэвамі шаша, што бегла, паблісkваючы асфальтам, удалеч, зялёныя абпушаныя ўжо маладымі ўсходамі палі, роўныя, белыя ад кураслепу пералескі на адхоне. Свяціла сонца, неба было высокае, блакітнае, без аніводнай хмурынкі.

— Які сёння прыгожы дзень! — сказала, ледзь не ўсклікнула Ліна.

— Дзянёк што трэба,— падтакнуў Пятро Пятровіч.— І наогул, тут, пад Мінскам, прыгожа! Я сам з-пад Слуцка, там таксама мясціны прыгожыя. Але і тут ёсць на што паглядзець. Поле, лес, пагоркі... Жыву ў горадзе колькі год і ніяк не прывыкну да яго. Куды ні пайдзі — пыл, шум, цесната... Таму і пра дачу пачаў думаць. Можна было б хатку дзе-небудзь на Случчыне купіць. Але далекавата. Лепш, канечне, мець пад Мінскам што-небудзь. Гэта ж выдатна — у зямельцы пакапаўся трохі, потым за стол сеў, папісаў. Што яшчэ трэба пенсіянеру? Вы пра дачу не думалі? — звярнуўся да абаіх нас — Ліны і мяне — Пятро Пятровіч.

Мы паглядзелі — Ліна на мяне, а я — на яе. Усміхнуліся.

— Хто ў нас ёю будзе займацца? — сказаў я.— Ліна ў школе, а мне і пісаць часу няма. Усё розныя грамадскія даручэнні, праца ў рэдакцыі...

— Канечне, калі мець дачу, трэба быць вольным хоць трохі. І пасеяць жа нешта трэба, і дагледзець, каб расло... А што да часу, дык яго ніколі не хапала і хапаць не будзе. Я во колькі жыву, а вольнага часу так і не меў. Цяпер на пенсіі — і то часу няма. То ў бальніцы ў чарзе сядзіш, то ў магазіне ў чарзе стаіш, то яшчэ што-небудзь... Пазвоняць з Саюза, пазвоняць з рэдакцыі, выступіць дзе-небудзь папросяць... Радыё, тэлебачанне... Іншы адмовіцца можа, а я...

Ліна ўсміхнулася.

— У гэтым вы, мусіць, на Адама майго падобны,— сказала яна Пятру Пятровічу.— Ён толькі тое і робіць, што ўсім дагаджае. Усё баіцца: нехта пакрыўдзіцца, нехта не зразумее яго ці не так, як трэба, падумае. Свайго нічога не робіць, а толькі чужымі клопатамі заняты.

— Пісьменніку трэба мець характар. Калі працуецца — гэта святая справа. Нішто не павінна тады яго цікавіць. Пра гэта я чытаў шмат, помню заўсёды... А пазвоняць, скажуць... Адчуваеш, трэба... Кідаеш усё — і займешся тым, чым мог з поспехам займацца нехта іншы. Кнут Гамсун, калі пісаў, то хаваўся ад усіх, нават есці ў сталоўку не хадзіў. Наймаў чалавека, той прыносіў яму яду. Заканчваў твор — тады гуляў, піў, сустракаўся з сябрамі.

— Я так не магу,— прызнаўся я.— У мяне нехта нешта просіць,— я ўсё кідаю, бягу. Калі чалавек просіць — значыцца, трэба яму...

— О не! — рашуча пакруціў галавою Пятро Пятровіч.— Розныя людзі ёсць. У мяне адзін усё грошы пазычаў. Пазвоніць — не хапае яму то дваццаць, то трыццаць рублёў. Адмовіцца, сказаць — няма ў мяне такой сумы — не паверыць. Бяру сваю ашчадную кніжку, бягу ў касу, стаю ў чарзе, трачу час. Пазычаю яму дваццаць — трыццаць рублёў. Потым аднойчы высвятляецца, што ў таго майго знаёмага таксама ляжаць на ашчаднай кніжцы грошы, толькі ён іх не бярэ, бо, як ён мне прызнаўся, дваццаць — трыццаць рублёў тых ён узяць з кніжкі возьме, але не пакладзе ўжо назад. Дый ехаць у касу, стаяць у чарзе. Куды прасцей прыйсці да мяне і ўзяць грошы... А мне можна і час траціць, і ў чарзе стаяць...— Пятро Пятровіч засмяяўся.— Аб людзях мы мяркуем па сабе. Ты не хочаш

звальваць свой клопат на чужую галаву — думаеш, і іншы гэтак жа робіць. Аж не! Я за жыццё шмат у чым расчараваўся. І ў многіх людзях таксама...

Шафёр, зусім малады, амаль хлапчук — ён увесь час маўчаў, не зводзіў вачэй з дарогі — раптам павярнуўся да нас, спытаў, дзе спыніцца. Аказваецца, мы і не заўважылі, як прыехалі ў Ждановічы.

— А вось тут і спыняйцеся,— сказаў, зірнуўшы па баках, Пятро Пятровіч.— Далей мы пойдзем. Бо ездзіць і шукаць, дзе Сабініна дача... Пешкі зручней... Так хоць папытаць у кожнага сустрэчнага можна. А седзячы ў машыне...

Мы расплаціліся, вылезлі з таксі.

У поўдзень мы, стомленыя, трохі п'яныя ад маладога, свежага паветра і цішыні, дабраліся нарэшце да Сабінінай дачы. Адчынілі ржавыя жалезныя варотцы, зайшлі ў двор, з цікавасцю аглядаючы пафарбаваны ў зялёны колер даволі вялікі двухпавярховы драўляны дом, прасторную, зашклёную веранду пры ім, пасаджаныя па ўсім двары купчастыя яблынькі, грушы, слівы, вішні, кусцікі агрэсту, парэчак, маліны...

Сама Сабіна была ў агародзе, нешта акопвала. Убачыўшы нас, адразу ж падалася насустрач. Што гэта не хто іншы, а Сабіна, я здагадаўся па Пятру Пятровічу, па тым, як раптам ён заўсміхаўся, зусім забыў, што побач ідзём мы, пабег насустрач жанчыне.

— Добры дзянёк табе, Сабіна,— сказаў Пятро Пятровіч, і калі тая працягнула сваю даволі ўжо загарэлую руку, прыпаў да яе, пацалаваў.

Сабіна — рослая, не па гадах стройная, з падрэзанымі коратка сівымі валасамі — усміхнулася.

— Глядзі, які кавалер,— сказала яна.— І дзе ты ўсяму гэтаму навучыўся?

— Жанчыны нас, мужчын, і не таму навучаць,— засмяяўся Пятро Пятровіч.— Дзеля прыемнасці жанчыне мужчына на ўсё ідзе. Дазволь, Сабінка, пазнаёміць цябе з маладым нашым пісьменнікам Адамам Калінкам і яго жонкай Лінай Пятроўнай...

Сабіна падышла да нас, падала Ліне, а потым і мне сваю халодную, мяккую руку.

— Што, прагулянца надумалі? — спытала яна ў нас.

— Ага,— адказаў я.— Пятро Пятровіч агледзець хоча вашу дачу, дык і мы з ім за кампанію...

Сабіна зірнула на Пятра Пятровіча, зноў усміхнулася.

— Агледзець дачу можна. Але прадаваць яе я перадумала...

— Чаму? — насцярожыўся Пятро Пятровіч.

— Бачыш, Пецся,— звярнулася да яго неяк зусім пахатняму Сабіна.— Дача, акрамя ўсяго іншага, патрабуе догляду. Дзеці ў мяне павырасталі, Ленка жыве ў Маскве, Хведзька ў Хабараўску, Іван — аж на Сахаліне... Ім не толькі да дачы, але і да мяне няма клопату. У кожнага сваё, кожны заняты... Я адна. Падумала, падумала, навошта мне гэтая дача, і дала аб'яву. І вось учора прыехаў сюды пакупец. Не стары яшчэ, яму гадоў пяцьдзесят пяць. Разгаварыліся, ён адзінокі... Грошы ў яго ёсць, машына свая... Ён мне спадабаўся. І калі развітваліся, я зразумела, што дачы мне прадаваць не варта. А яму купляць таксама яе не варта...

— Што, у цане не сышліся?

— Не, і дача яму спадабалася, і я... Дамовіліся яшчэ спаткацца і... Будзем жыць разам...

— Хе-хе-хе! — зарагатаў Пятро Пятровіч.— А ты астаешся сама сабою.

— А што рабіць? Мне таксама абрыдла жыць адной. Сумна.

— Дык твой жа, здаецца, зусім нядаўна памёр?

— Як нядаўна? Два гады ўжо... Пара і мне пра сябе паклапаціцца. Час ідзе, мы ў такім узросце, калі жыццё наша вымяраецца не гадамі, а днямі. Чалавек хоча дачу — будзе ў яго дача. Мне трэба грошы — будуць у мяне грошы. Так мы дамовіліся. Хай ён жыве тут, і я буду жыць тут.

— А дзеці як на гэта паглядзяць?

— А што дзеці? У іх сваё жыццё, у нас — сваё.

— Не губляешся ты, Сабіна. А я ўжо марыў пра дачу...

— Дык прадаюцца тут дачы... Калі ты хочаш...

— Каб жа я сам ведаў, чаго я хачу,— сказаў, смеючыся, Пятро Пятровіч.— Думаў, пад старасць нічога ўжо хацецца не будзе. Аж не, хочацца. Усяго на свеце хочацца. Як і ў маладыя гады!

— Глядзі ты! — заўсміхалася і Сабіна.— А мне іншы раз ужо нічога не хочацца. Спакою толькі хіба.

— Бо жыццё ў цябе было трошкі іншае. У мяне колькі гадоў ні за што ні пра што прапала.

— Прапала і ў мяне трохі гадоў...

— Гэта ж калі?

— Ды ў самую лепшую пару, лічы. Калі замуж выйшла за Тарасюка...

— Вось чаго я ўжо ніколі не сказаў бы. Чалавек ён быў ціхі, памяркоўны, ніколі не аблаяў цябе, ніколі грубага слова не сказаў...

— Хіба жанчыне страшна грубае слова ці лаянка? Жанчыне трэба іншае, зусім іншае. Ды не стойце вы тут, давайце зойдзем у хату...

У хаце — дакладней, на верандзе, сеўшы за круглы стол на плеценыя крэслы, Пятро Пятровіч і Сабіна доўга гаварылі, успаміналі свае маладыя гады, як і ў што тады апраналіся, што елі, дзе гулялі... Не-не, дый скіроўвалася гаворка на Язэпа Тарасюка — мо таму, што я прасіў Пятра Пятровіча, каб ён сёе-тое выпытаў пра яго ў Сабіны. Сабіна не саромелася расказваць пра свайго першага мужа, жартавала, смяялася.

— Які ж гэта быў муж? — гаварыла яна.— Смех адзін, як успомню. Усё эканоміў сілы, каб тварыць. Кроку лішняга не зробіць. Я ўжо не кажу пра іншае. Цярпела я цярпела, ды хіба свет клінам сышоўся?..

— І не шкадуеш, што ўцякла ад яго? — дапытваўся Пятро Пятровіч.

— Чаго шкадаваць? Прамарнела б за ім... А так я пражыла жыццё, як хацела. Мой муж мяне кахаў, даваў мне ўсё, што мог. Я яму ўдзячная. А то, бывала, пра дзяцей пачну гаварыць, а Язэп: «Замінаць будуць дзеці пісаць мне». Я яму: «Што пісаць? Ты ж графаман. Няўжо ты гэтага не разумееш?» Пакрыўдзіцца, тыдзень са мной не размаўляе...

— Але ён кахаў вас,— палічыў патрэбным сказаць я Сабіне.— Я чытаў яго дзённік, дык часта пра гэта гаворыць, вас успамінае...

— Можа, і кахаў. Але ж кахаць — гэта мала. Трэба, каб і я кахала, каб не толькі яму са мною, але і мне з ім было добра. Ён гэтага не разумеў.

— Як не разумеў і таго,— умяшаўся Пятро Пятровіч,— што яму не трэба было брацца за пяро, пісаць.

— Ліха ведае, можа, і так... Хаця потым я чытала некаторыя яго кнігі і мне здавалася, што я памылялася: у Язэпа нешта было ад пісьменніка...

— Ты, Сабінка, чытала яго кнігі пасля таго, як яны праходзілі праз рэдактараў... А ты б пачытала хоць раз тое, што ён пісаў, так сказаць, у натуры.

— Дык жа ж чытала... Чытала! Чытала тады, калі ніхто з вас яшчэ не чытаў. Таму і гаварыла: «Дзеля такой лухты сілы эканоміць?»

Сабіна засмяялася.

— Аднак жа ты выйшла неяк за яго замуж?

— Пецл, усе ў маладосці робяць памылкі. Зрабіла і я. Ён быў дырэктарам рэстарана, узяў мяне на працу. У мяне было трое сястрычак, маці памерла. Трэба было іх карміць. А Язэп чалавек быў не брыдкі з твару, культурны. Прапанаваў ён мне выйсці за яго замуж, я і пайшла. Хіба ведала тады я, што такое каханне?..

— Колькі ж ты з ім пражыла?

— Ды гадоў, мусіць, з пяць.

— А потым ні разу і не сустракаліся?

— Чаму ж, сустракаліся. Нават гаварылі. Але толькі так, не сур'ёзна... Не было пра што. Ён аставаўся пры сваіх думках, я — пры сваіх.

— Усё жыццё,— зноў сказаў я,— ён намагаўся даказаць вам, што вы памыліліся, недаацанілі яго. І толькі пад канец пачаў думаць зноў, што, можа, дарэмна ён вам тады не паверыў, можа, і сапраўды ў яго не было таленту...

— Ну, пад старасць многія разумнеюць. Можа, паразумнеў трохі і ён...

Сабіна зноў засмяялася.

Дзіўна, але чым болей Сабіна ўспамінала Язэпа Тарасюка, чым болей гаварыў пра яго Пятро Пятровіч, тым мне рабілася ўсё менш і менш цікава слухаць. Чалавек усё ж мёртвы, а гаварыць пра нябожчыкаў... Дый хто, урэшце, той Язэп Тарасюк? Ну быў такі чалавек, ну хацеў стаць пісьменнікам, нічога дзеля гэтага не шкадаваў, на ўсё ішоў. І ці мала такіх было і ёсць!

Гаворка траціла цікавасць, і гэта адчувалі ўсе. І калі Пятро Пятровіч раптам падняўся, пачаў дзякаваць Сабіне, я ды і Ліна з палёгкай уздыхнулі, падняліся таксама...

Потым мы — Ліна, Пятро Пятровіч і я — хадзілі па дачным пасёлку, глядзелі, як жывуць тут людзі; незаўважна выкіраваліся да мора — не бяскрайняга, сапраўднага, а штучна зробленага людзьмі, аблямаванага кустамі

і лесам, нейкага ненатуральнага, маршчыністага ад хваль, прагуляліся па яго амаль бязлюдным — яшчэ не купаліся — беразе. Убачыўшы веранду кафэ, зайшлі туды, заказалі сабе абед. І пакуль нам яго падавалі, Пятро Пятровіч гаварыў:

— А ведаеце, перадумаў я купляць дачу. І так сядзіш у горадзе адгароджаны ад усяго на свеце. А яшчэ гэтая дача... Людзі сеюць хлеб, жнуць, малоцяць, робяць трактары, самалёты, турбіны... А мы...

— Гэта даўно я свайму Адаму казала,— не ўтрымалася, узрадавалася Ліна.

— Малайчына тады Вы! — пахваліў Ліну Пятро Пятровіч.— І ведаеце, што я надумаў зрабіць? — неяк загадкава паглядзеў на нас Пятро Пятровіч.— Кіну ўсё і паеду ў вёску. На лета ўсё паеду... Хоць пагляджу, як сонца ўзыходзіць, раса на траве блішчыць... Як кароў на пашу і з пашы гоняць... Пагляджу, як людзі жывуць, паслухаю, пра што яны гавораць, што думаюць... Навошта мне тая дача? І чаму думкі пра яе маглі прыйсці мне ў галаву? Замест таго каб бачыць свет, я яго раптам завязваю сабе, адгароджваюся дачным плотам... Не, дача для пісьменніка — гэта яго смерць. На дачы ён закопвае ў зямлю свае творы. Пісьменніку трэба ездзіць, бачыць, як жывуць людзі... А тады... Толькі тады пісаць!

Я ўсміхнуўся — рады быў, што такія думкі прыйшлі ў галаву Пятру Пятровічу. Прызнацца, такія думкі былі і ў мяне таксама ў галаве. Даўно былі. Я толькі не асмельваўся выказваць іх уголас, не хацеў расчароўваць Пятра Пятровіча, разбураць яго мару. Аж...

Падалі на стол гарачую капусту з сасіскамі, і мы пачалі есці...

«Ліначка!

Я нібыта нарадзіўся нанова на свет. Вёска, у якой я пасяліўся, глухая, кіламетраў дваццаць ад райцэнтра. І многае захавалася ад ранейшых, яшчэ тых, аднаасобных, часоў. А людзі, якія тут людзі! Не, я не буду апісваць іх табе, не буду нічога гаварыць. Прыедзь, паглядзі на ўсё сама. Дый карысна табе пажыць на свежым паветры. І табе, і нашаму... Не, не, не трэба рабіць прагнозаў ніякіх, пачакаем.

Цэлымі днямі я ў полі, то са старшынёй калгаса, то з брыгадзірамі, то з калгаснікамі. Загарэў, абветрыўся, не пазнаеш нават. Па вечарах трохі пішу. Пішу пра Язэпа

Тарасюка. Тут, сярод людзей працы, жыццё яго асабліва здаецца смешным, недарэчным. Не тым, не тым жыве часта наш брат-пісьменнік. Хаця... Які Язэп Тарасюк пісьменнік? Выпадковы чалавек, чалавек, які пражыў не там, дзе яму трэба было жыць, як кажуць часам, не на той вуліцы, і займаўся не тым, чым яму трэба было займацца. Кнігу гэтую я ўсё ж хачу скончыць, хай чытаюць яе людзі, хай думаюць, каму і кім трэба быць. І калі хто памыліўся, пасяліўся не на той вуліцы, хай не саромеецца, не баіцца перасяляцца на сваю вуліцу, і пачынае жыць па-другому. Такое, мне здаецца, рабіць хоць, можа, і непрыемна, але... Варта!

Як там Пятро Пятровіч? Ён паехаў на Случчыну, у перадавы калгас. Можа, ён мае рацыю. У перадавым ёсць на што паглядзець, а галоўнае зазірнуць можна, якою вёска наша будзе ў будучым, як, у якім кірунку будзе яна развівацца, якія адносіны будуць у бліжэйшы час між людзьмі. Але я не шкадую таксама. Я бачу, сустракаюся з тым, што, можа, мала хто ўжо бачыць, мала хто сустракае. І будучае вёскі якраз, мусіць, менавіта за гэтым — спалучэннем сучаснага з тым, што было і што яшчэ дзенідзе, дзякуй Богу, не загінула, жыве, ёсць...

Так што, Ліна, прыязджай, я чакаю цябе.

Твой Адам».

*1974 г.*

# Дарога ў Хатынь

Антон Шатуневіч звычайна працаваў з раніцы. З раніцы працуюць і ўсе тыя, хто ніколі не разумеў і так, мусіць, і не зразумее, што значыць для пісьменніка гэты цудадзейны час,— і пачыналі званіць, надакучаць бясконцымі тэлефоннымі размовамі. І таму Антон пасля кожнай такой размовы казаў сабе: «Не, больш нізашто не падыму тэлефоннай трубкі, годзе!» І кожны раз, калі раздаваўся новы званок, Антон не вытрымліваў — ці мала што, можа, і праўда я камусьці вельмі пільна трэба? — і рука, здаецца, сама міжвольна цягнулася да тэлефона, несла да вуха трубку. Так было і ў гэты ясны жнівеньскі дзень. Ледзь толькі Антон скончыў амаль паўгадзінную размову з адным настырным графаманам, які чамусьці захацеў сёння як мага раней падзяліцца менавіта з ім, Антонам Шатуневічам, сваімі няўдачамі ў жыцці і творчасці, і сеў за стол, схіліўся над рукапісам, як пачуўся новы тэлефонны званок.

Хвіліну-другую Антон яшчэ раздумваў: падымаць ці не падымаць тэлефонную трубку? І ўсё ж, вылаяўшыся — усё адно дзень пачаўся не так, як павінен быў пачацца,— падняў.

— Алё-ё! — амаль крыкнуў злосна, раздражнёна.

— Антоне, вітаю! — пачуў ён знаёмы ласкавы голас добрага свайго сябра, паэта Юрася Сокала — аднаго з кіраўнікоў Саюза пісьменнікаў.— Выбачай, што вырваў цябе з абдымкаў музы. Што зробіш, справы...

— Я думаў сёння хоць гадзінку папрацаваць...

— Хо-о! — засмяяўся Юрась.— Я думаю — дзе там думаю,— мару пра гэта каторы ўжо год. І нічога не выходзіць. Адно на адно набягае, хоць разарвіся. Мітусня нейкая, ліха ведае як і ратавацца. Вось і табе званю — выручай!..

— Што такое?

— Ды нічога быццам незвычайнага. Прыехала група пісьменнікаў... З Заходняй Германіі... Трэба звазіць іх у калгас і ў Хатынь...

— Хіба няма каму?

— Пачакай, не спяшайся, выслухай. Немцы трапіліся, скажу табе, яшчэ тыя... Да нас зваліліся бы снег на галаву пасля Ленінграда. Там яны адмовіліся ад прапанаванай ім праграмы. Учора была з імі гутарка. Пра што ні скажаш — прапаганда... Папрасілі, каб ім паказалі адзін з калгасаў... І Хатынь... Адмовіць? Не, трэба задаволіць іхнія жаданні. Калі прыехалі да нас як ворагі, то мы павінны зрабіць усё, каб паехалі ад нас... Ну, калі не сябрамі, дык хоць... Няхай адчуюць, што мы людзі, што мы нацярпеліся ў вайну, але... Людзьмі былі, людзьмі і асталіся. Мы не хочам, каб была новая вайна, было тое, што перажылі ўсе мы, увесь наш народ... На свае вочы няхай убачаць, якія раны нам пакінулі фашысты... Праўда, колькі ваўка ні кармі, ён усё адно ў лес глядзіць. Але ж... Словам, я сам згадзіўся паехаць з імі і ў калгас, і ў Хатынь. А тут званок — неадкладна быць у адным высокім доме, вырашаецца вельмі важная для ўсяго нашага пісьменніцкага племя справа. Таму і званю — выручы.

— Гм-м.

— Ведаю, што не хочацца. Але... Павер — трэба, я рэдка цябе прашу. А тут... Яны — пісьменнікі, паедуць у сваю краіну... Кожнае іхняе слова пра нас... Не хацелася б, каб там, дзе мы можам выбіць казыры... Разумееш? А ты ж... Сам у вайну... У Нямеччыне быў... Табе, як кажуць, і карты ў рукі... Каго ж яшчэ, як не цябе, і прасіць?

— Колькі іх, тых немцаў?

— Трое. Два мужчыны, адна жанчына. Жанчына маладая, паэтэса. Ну, а што да мужчын... Адзін празаік, у гадах, па ўсім відаць, ваяваў... Другі — маладзейшы, трохі, можа, старэй за цябе і мяне, піша для дзяцей... Знешне прыстойныя людзі, трымаюцца падкрэслена ветліва, культурна. А думаюць?.. Мяркуючы па ўчарашняй гаворцы ў Саюзе пісьменнікаў, думаюць не так, як мы. Пытанні задавалі такія, што не ведаеш, як і адказваць. Праўда, і нашы некаторыя лішне гарачыліся, занадта хваліліся, і часам тым, чым не трэба хваліцца. Інфармаваны пра наша жыццё яны... Ды яшчэ з пэўным ухілам, пад пэўным соусам... Словам, прыязджай у «Планету», я чакаю цябе...

— Дык я ж... У мяне на сёння свае планы былі...

— Касуй. Думаю, табе цікава будзе пазнаёміцца з гэтымі немцамі... Параўнаеш з тымі, якіх ужо сустракаў, бачыў, пагаворыш, паспрачаешся... Павер — гэта няблага, што да нас прыязджаюць. Кантакты нейкія, дый ведаць

будуць, як мы жывём... А то... Нават гэтыя, інфармаваныя, пісьменнікі некалькі разоў... Зададуць пытанне, а мы смяёмся... Адсталі... Жыццё наша наперад ірванула. Ды што я агітую? Машына да цябе пайшла, так што апранайся і выходзь...

— Дык я ж яшчэ згоды не даў. Навучыўся ты, кіруючы ў Саюзе...

— Антоне, не кпі. На наступным з'ездзе цябе выберам на маё месца. Паглядзім, як ты ўпраўляцца будзеш... А за тое, што выручаеш — дзякуй!

Пачуліся гудкі — Юрась Сокал, палічыўшы, што размова скончана, паклаў трубку. Антон жа Шатуневіч нейкую хвіліну яшчэ стаяў, разгублена слухаючы гэтыя недарэчныя гудкі, потым і сам паклаў на тэлефонны апарат трубку. «Ну вось, напрацаваўся,— паглядзеў ён са скрухай на рукапіс.— Казаў жа, не падыходзь да тэлефона, не бяры трубкі, не адклікайся на званкі. І...»

Бездапаможна ўздыхнуўшы, пачаў расшпільваць піжаму — трэба было галіцца, пераапранацца, выходзіць з дому...

Не, адрывацца ад рукапісу, пакідаць раней часу дамоўку ў Антона Шатуневіча ніякай ахвоты не было. Тым больш сустракацца з нейкімі незнаёмымі чужымі пісьменнікамі, суправаджаць іх... І каб званіў хто-небудзь іншы з кіраўнікоў Саюза пісьменнікаў, а не Юрась Сокал, якога Антон паважаў і як чалавека, і як паэта, ён, вядома, адмовіўся б. Шкада было часу — ні за што ні пра што дзень прападзе... Колькі іх прапала ўжо. Вось і яшчэ адзін кане ў вечнасць! А ён жа, Антон, не малады ўжо чалавек, пара думаць сур'ёзна пра творчасць. І сур'ёзна працаваць. Няхай раней ён усё запашваў матэрыял, не асмельваўся брацца за некаторыя тэмы. Дый тады асабліва не было як — праца ў газеце ганяла як Марку па пекле з калгаса ў калгас, з раёна ў раён... Для творчасці — сапраўднай, якой Антон лічыў мастацкую літаратуру! — заставаліся выхадныя дні ды ночы. Цяпер хутка ўжо два гады, як Антон перайшоў на працу ў выдавецтва. Вольнага часу пабольшала, і Антон імкнуўся яго скарыстаць, што называецца, напоўніцу — выпіўшы філіжанку кавы, сядаў адразу ж з раніцы за рабочы стол. Напісаў некалькі апавяданняў, аповесць і ўзяўся... Ух, аж прызнацца боязна!— за раман... І раман хоць і паволі, не так, як таго хацелася

Антону, а ўсё ж пісаўся, рухаўся, як некаторыя кажуць, наперад. І, магчыма, калі не ў гэтым годзе, дык у наступным Антон і скончыў бы яго, каб не бясконцыя тэлефонныя званкі, нечаканыя выклікі ды розныя грамадскія абавязкі, даручэнні. На ўсё не хапала часу, а яго, час, якраз і пачынаў цаніць і ашчаджаць усё больш і больш Антон Шатуневіч. Асабліва ранішні час, калі галава свежая, калі яна яшчэ нічым не затлумленая, калі пісалася лёгка і — гэта Антон адчуваў! — з настроем. Таму і падумваў, каб зусім не падыходзіць да тэлефона. Хай звоняць, хай шукаюць тыя, каму ён трэба, а ён у гэты час... Будзе пісаць! Ды адно — намерыцца так рабіць, і зусім іншае — зрабіць. Не хапала нейкай ці то рашучасці, ці то нахабства, каб не падысці да тэлефона, калі звоніць. «Нядобра ўсё ж гэта,— мучыла, ела сумленне.— Ты некаму трэба, хтосьці цябе шукае, а ты... Бы маленькі хлапчук, схаваўся, не адклікаешся на чалавечы голас... А калі табе нехта спатрэбіцца і ты будзеш каго шукаць, а ён... Схаваецца... Не-е! Дый, па шчырасці, размовы тыя, нават самыя нікчэмныя, пустыя, нешта даюць. Бясследна, ва ўсякім выпадку, не праходзяць. Менш напісана на паперы, затое больш астанецца ў душы». І Антон прадчуваў — і гэтая паездка з пісьменнікамі з Заходняй Германіі таксама пакіне нейкі след. Цікава ж — і пра што яны, тыя пісьменнікі, будуць пытаць, на чым засяроджваць сваю ўвагу і як будуць паводзіць сябе і ў калгасе, і ў Хатыні... Давядзецца ж увесь час разам быць, можна і паназіраць, і словам перакінуцца... А што нічога не напішацца сёння... Што ж, можа, варта ахвяраваць старонкай-другой дзеля жывой, патрэбнай справы — паездкі, сустрэч і размоў...

Так думаў, супакойваў сябе Антон Шатуневіч, голячыся, пераапранаючыся і збіраючыся ў дарогу. Вядома, з гэтымі заходненямецкімі пісьменнікамі не толькі можна будзе, але, відаць, і варта пра многае пагаварыць. Юрась невыпадкова ж успомніў, што ён, Антон, быў у Германіі, сёе-тое ведае і пра гэтую краіну, і пра тых, хто там жыў і жыве. Гэта ж, лічы, аж два гады прамучыўся на чужыне. І калі — у вайну. Дый мову нямецкую ведае, гаварыць можна з вока на вока, не баяцца, што цябе не зразумеюць ці няправільна перакладуць. Інстытут жа замежных моў скончыў...

Апрануўшы свой дарожны вельветавы касцюм, Антон лёгка збег з чацвёртага паверха, дзе была яго аднапакаёвая халасцяцкая кватэра, выйшаў з пад'езда. Ля дома стаяла

ўжо чорная «Волга». Шафёр быў знаёмы, і Антон, павітаўшыся, не марудзячы, кінуўся на пярэдняе сядзенне.

— Што, будзем вазіць сёння немцаў? — сказаў да шафёра па-прыяцельску.

— А мне ўсё адно, каго вазіць,— махнуў рукою шафёр, шыракатвары, густабровы, намнога старэйшы за Антона, у былым — партызан, потым франтавік, і ў наступную хвіліну націснуў на стартэр, падаў машыну назад, выруліваючы на вуліцу.

— Не скажы, Сцяпан Кандратавіч. Адно, калі са сваімі людзьмі едзеш, і зусім іншае, калі з чужымі. Свой чалавек нават калі маўчыць, можна здагадацца, што ён думае. А чужы... Нават калі гаворыць, не бярыся казаць, што ён думае так, як гаворыць. А тут жа... І распісаць могуць... Ды так, што аж чытаць будзе брыдка...

— Пляваць я хацеў на тое, як яны там і што пра нас напішуць. Мне падабаецца наша зямля, нашы парадкі... За ўсё гэта я ваяваў. А што ім нешта ў нас здасца не так, не тым... Мне ад гэтага ні холадна ні горача...

Шафёр казаў праўду, Антон не мог не згадзіцца з ім. Мы жывём, як можам, будуем грамадства, якое самі хочам, і так, як хочам, і што нам да таго, што пра нас хто і дзе напіша, як аббрэша... Хай піша, хай аббрэхвае... Калі што — і ў іх пра сёе-тое можна спытаць. Тым больш што быў я там, у іх, ведаю трохі, як яны жылі. «Цікава, як адносяцца яны да Гітлера, да вайны, да таго, што прынёс усім народам, усім краінам фашызм? Ды і самі тыя пісьменнікі хто? За што і супраць чаго выступаюць, каму спачуваюць, пра што пішуць? А то, бачыш, «пытанні задавалі такія, што не ведаеш, як і адказваць»,— згадаў словы Юрася Сокала Антон. І, павярнуўшыся да шафёра, сказаў, як толькі выехалі на шырокую вуліцу, памчалі да гасцініцы:

— Сцяпан Кандратавіч, а як яны, гэтыя немцы, на тваё спрактыкаванае вока, га?

— Ведаеш, і сказаць цяжка,— памаўчаўшы, звёў на пераноссі густыя бровы шафёр.— Шмат пра што пытаюць, шмат запісваюць. Зойдуць у магазін, цэны запішуць на хлеб, крупы розныя, мяса... Потым папытаюць, колькі звычайны чалавек, рабочы, атрымлівае зарплаты. Пасядзяць, палічаць... Нямецкая дакладнасць, бухгалтэрыя,— усміхнуўся шафёр.— А то павезлі іх у рэстаран карміць. «Стандарт». І пытаюць, дзе б незвычайнае штосьці, нестандартнае паесці. Павезлі іх у нашу «Мядуху». Спадаба-

ліся... Вядома, яны ўжо не тыя немцы, што ў вайну тут былі. Тых да нас ніхто не біў па-належнаму. Давялося нам павучыць, каб на чужое не ласы былі, рот не разяўлялі вельмі. Тыя на сілу сваю спадзяваліся, фанабэрыліся... А гэтыя... Пабітыя ўжо. Да таго ж пісьменнікі, культурныя людзі...

— А лад наш як ім, нашы парадкі?

— Хто іх ведае, я ў размовы асабліва не ўдаюся. Пытаюць што — адказваю, не пытаюць — маўчу. Ды і розныя яны людзі. Паэтэса ўсміхаецца, стары маўчыць, сваё нешта думае. Самаўпэўнена, ганарыста паводзіць сябе хіба барадаты, Генрых Штоль. Але і то не так, каб хацелася даць па мордзе,— рагатнуў шафёр.

Яны, нарыхтаваныя ў дарогу, ужо стаялі пры ўваходзе ў гасцініцу, чакалі, па ўсім відаць, яго, Антона: Юрась Сокал — у светлым, амаль што майскім, касцюме — нешта гаварыў, па звычцы шырока размахваючы рукамі, яго паўкругам абступалі госці — пісьменнікі з Заходняй Германіі: рослы, у замшавым пінжачку і джынсах, з рыжаватай мефістофельскай бародкай здаравяк; прысадзісты, апрануты зусім па-іншаму — белая кашуля, гальштук і лёгкая дарожная куртачка — амаль дзядок; дзве жанчыны прыкладна аднаго ўзросту — адна ў вішнёвай сукні, другая ў белых штоніках і жоўтай вязанай кофтачцы. Тая, што ў штоніках, была светлавалосая, стройная, у сукні — чарнявая і грудастая. Каторая з іх перакладчыца, а каторая паэтэса, Антон пазнаць па знешнасці не змог, таму, калі пад'ехалі да гасцініцы і спыніліся, не спяшаўся адчыняць дзверцы машыны і выходзіць, а спытаўся ў шафёра:

— Сцяпан Кандратавіч, каторая з іх паэтэса — брунетка ці бландзінка?

— Бландзінка. Яна ў штоніках,— адказаў шафёр.

Антон вылез з машыны, наблізіўся да кампаніі, якая яго чакала.

— Добры дзень,— сказаў ён і стрымана кіўнуў галавою.

— Дзень добры,— адказаў за ўсіх Юрась Сокал і падаў яму руку.— Маша, перакладзі нашым гасцям,— звярнуўся ён у наступную хвіліну да чарнявай, грудастай, зблізку вельмі мілавіднай, сімпатычнай.— Гэта наш таленавіты празаік Антон Змітравіч Шатуневіч. Ён будзе суправаджаць вас у калгас і ў Хатынь.

Немцы паглядзелі на Антона і, заўсміхаўшыся, пачалі падыходзіць да яго, падаваць свае рукі: шорсткую, але нейкую вялікую — старэйшы, чыста паголены, падкрэслена ветлівы; дужую, жылістую, як у спартсмена,— барадаты; маленькую, халаднаватую — паэтэса. Кожны пры гэтым называў сваё імя і прозвішча:

— Паўль Загс...

— Генрых Штоль...

— Элізабет Айх...

— Ну, а мяне завіце Маша,— падала апошняя руку, знаёмячыся і ўсміхаючыся, паказваючы роўныя белыя зубы, перакладчыца.— А наогул я Марыя Іванаўна Літвінка, жыву ў Маскве. Дагэтуль жыла ў Мазыры, так што ваша зямлячка...

— Вядома, вы не першы раз ездзіце з замежнымі гасцямі па нашай краіне,— паглядзеў — вочы ў вочы — Антон.— Так што, калі што якое... Вы самі разумееце...

— Што вы, Антон Змітравіч,— усміхнулася, паказала зноў свае белыя прыгожыя зубы Марыя Іванаўна.— Я... Мая праца такая...

І тут жа пераклала тое, пра што прасіў яе Антон Шатуневіч. І звычна, гарэзліва засмяялася.

Антон збянтэжыўся. Але ўсё выратаваў Юрась Сокал.

— Паважаныя госці,— замахаў ён зноў рукамі.— Я думаю, вы зразумелі, што Антон Змітравіч жартуе. Ён гэта ўмее...

І таксама засмяяўся. Засмяяліся ўслед за ім і немцы.

— А калі гаварыць сур'ёзна,— прадаўжаў, як ні ў чым не бывала, Юрась Сокал,— дык пытайце ў Антона Змітравіча ўсё, што вас цікавіць. Я, вядома, вельмі шкадую, што не магу быць з вамі. Але, спадзяюся, мяне з поспехам заменіць мой сябра, Антон. Дарэчы, ён пэўны час жыў у Германіі...

— О! — усклікнуў, падняў вышэй вялікую, амаль лысую галаву, барадач.— І дзе ж вы жылі там?

— Горад Хальберштат,— перайшоў на нямецкую мову і Антон.— Але не ў самім горадзе, а непадалёку ад яго.

— А больш дакладна?

— Больш дакладна,— памяўся, ніяк не мог падабраць належнага тону Антон.— Там, дзе перакрыжоўваюцца дзве дарогі — ад Хальберштата і Ашарслебена,— ёсць ферма пана Хандке... Там я і жыў.

— Дык гэта ж... Можна сказаць, радзіма мая! — кі-

нуўся ледзь не абдымацца да Антона барадач — Генрых Штоль.— Я нарадзіўся і жыў у Ашарслебене.

— Праўда?

— Ну, вядома ж! — І вочы, вялікія, шэрыя, здаецца, пацяплелі, засвяціліся.— Скажыце, як апынуліся вы ў Германіі? І калі?

— Пра гэта доўга расказваць...

— А ўсё ж? — настойваў Генрых Штоль.

— Усё ж,— прыйшоў зноў на выручку Антону Юрась.— Сядайце ў машыны, дарогай і пагаворыце.

— Калі можна, дык я сеў бы з Антонам... Антонам Змітравічам,— папрасіўся Генрых Штоль.

— Калі ласка,— адчыніў дзверцы «Волгі» Юрась Сокал.— А вы, Марыя Іванаўна,— звярнуўся ён да перакладчыцы,— сядайце ў другую машыну. Займайце нашых гасцей, адказвайце на іх пытанні. Калі вы наша зямлячка, то, пэўна ж, ведаеце Беларусь...

— Мае бацькі і цяпер жывуць тут. Я ў іх бываю часта. Так што...

— Ну, то лепш, каб і хацеў, не прыдумаеш.— І ўжо да шафёра: — Сцяпан Кандратавіч, вы едзьце першы, вы дарогу ведаеце.

— А куды ехаць? — спытаў дзелавіта шафёр.

— Едзьце ў вёску Панажы. Там вас сустрэнуць, я сазваніўся. Ну, а адтуль — у Хатынь...

Шафёр уключыў матор. І Антон, паглядзеўшы на Юрася,— маўляў, якія будуць яшчэ ўказанні? — таксама памкнуўся быў сесці ў машыну. Але Юрась запыніў яго. Шапнуў ціха, так, каб толькі ён адзін чуў:

— Галава, думай, што гаворыш. Сярод іх можа быць чалавек, які ведае рускую мову. Ва ўсякім разе, ёсць такія меркаванні ў перакладчыцы, Марыі Іванаўны...— І ўжо так, каб яго ўсе чулі: — Ну, бывайце, шчаслівага вам падарожжа!..

Ужо ў машыне, седзячы каля барадача — Генрыха Штоля — і бачачы, як аддаляюцца, астаюцца стаяць на адным месцы Юрась Сокал, гасцініца, маладыя, кучаравыя ліпкі, Антон Шатуневіч яшчэ раз пашкадаваў, што падняў тэлефонную трубку, згадзіўся суправаджаць пісьменнікаў з Заходняй Германіі. «Мала таго што дзень ні за што ні пра што прападзе, дык яшчэ і ў «гісторыю» трапіш. Бач, як апраставалосіўся... Трэба было мне казаць тое перакладчыцы... Ды і яна ж... Зямлячка, называецца...» Аж злосць

пачала разбіраць. І на сябе, што змарозіў глупства, ды і на пісьменнікаў гэтых — калі сапраўды хто-небудзь ведае рускую мову, дык навошта ўтойваць? Мы шчыра да вас, з усёй душой, а вы... Што, шпіёніць прыехалі?

Павярнуўся тварам да суседа свайго, Генрыха Штоля,— хто ён усё ж, можна верыць яму ці... Штоль, аказваецца, таксама глядзеў, не зводзіў з яго, Антона, вачэй, быццам вывучаў, хацеў здагадацца, ведаць, што за чалавек сядзіць побач з ім.

— Выбачайце,— урэшце прамовіў ён.— Нас перапынілі на самым, як мне здаецца, цікавым. Як вы апынуліся ў Германіі?

— Як? — заплюшчыў вочы, нібы ад стомы, Антон.— Я жыў у вёсцы. На Палессі. У вайну тое было. Ну, а немцы... фашысты,— паправіўся ён праз хвіліну.— Знішчылі яе... Нас жа, тых, хто жыў у вёсцы, каго не спалілі, не павесілі, не застрэлілі,— пагналі ў Германію. Каб там працавалі...

— А-а, разумею,— адвёў свае вочы ад Антона, паківаў галавою Генрых Штоль.— Колькі вам было тады гадоў?

— Восем.

— А мне ў вайну было трынаццаць. Вось, паглядзіце, які я быў...

І Генрых Штоль дастаў з кішэні пінжака некалькі здымкаў, пачаў паказваць іх, тлумачыць:

— Гэта Ашарслебен... Мяне толькі што прынялі ў «гітлерюгенд». І я, радасны, узнёслы, маршырую...

Антон паглядзеў на здымак, і ў вачах... Божа, што гэта? Быццам і не прайшло, не мінула сорак гадоў...

...Шырокая гарадская вуліца, паабапал якой стаяць дамы — нязвыкла вялікія і высокія — на чатыры, пяць, шэсць, сем і нават дзесяць, дванаццаць паверхаў! Па вуліцы туды-сюды снуюць машыны-легкавушкі, рознакаляровыя аўтобусы, імчаць, пазваньваючы, трамваі, бягуць людзі — усе гожа апранутыя, мужчыны і жанчыны, хто з сумкаю, хто з папкаю, хто з партфелем. У гэтым стракатым, рухомым гарадскім натоўпе і ён, Антон,— маленькі васьмігадовы хлапчук, чужы ўсім, да таго ж босы, у палапленай палатнянай кашульцы і такіх жа палапленых на каленях палатняных штоніках... Вось ён, стомлены, аглушаны шумам і гамам гарадской вуліцы, стаіць, прыпёршыся плечуком

да камля нейкага дрэва, і глядзіць, не зводзіць вачэй з плошчы — там, пад фашысцкімі знакамі, сцягамі, рознымі надпісамі, роўнымі, стройнымі радамі застылі ў чаканні каманды,апранутыя ў навюткую уніформу — пілоткі, карычневыя рубашкі, чорныя — па калені — бархатныя штонікі, спаднічкі,— хлапчукі і дзяўчынкі. Раздаецца дробны пошчак барабанаў, гучны гарласты крык — і стройныя рады зрушваюцца з месца, ідуць прама, потым паварочваюцца налева, направа, кругом... Ён, Антон, як і многія, хто прыпыніўся, глядзіць на маршыроўку, міжвольна любуецца — гэта ж так прыгожа! І хоць бы хто збіўся з нагі, павярнуўся не так, як трэба — не дзеці, не жывыя людзі, а натрэніраваная, добра адладжаная машына...

...— Гэта я ў акопе,— кажа Генрых Штоль, падаючы чарговы здымак.— Чакаю наступлення амерыканцаў...

«Няўжо ён?..»

...Яго, Антона, паслалі ў той ранак на ферму як бы ў разведку — другі тыдзень ніхто з нявольнікаў не жыў там, хаваліся, хто дзе і як мог, бо стала вядома — Гітлер аддаў загад: ні адзін вывезены з Усходу чалавек не павінен дачакацца вызвалення, усіх трэба пастраляць, умярцвіць. Выбег ён, Антон, на шашу і аж скалануўся, аглушаны ўладным вокрыкам:

— Цурык!

Не зразумеў спярша, хто і адкуль крычыць. Потым, спагадзя, убачыў ля дарогі пад яблыняй акоп («Калі і хто яго тут выкапаў?»), а ў ім — зусім дзіцячы твар у касцы.

— Прэч адсюль, руская свіння! — закрычаў у наступную хвіліну гэты хлапчук-салдат і наставіў на яго, Антона, аўтамат...

...— А гэта я ў разбураным Ашарслебене... Пасля вайны ўжо... Як Гітлера не стала...

...Разбураны Ашарслебен... У яго Антон трапіў у першы ж дзень пасля вызвалення — хадзіў з бацькам шукаць доктара. Той хлапчук-салдат усё ж не стрымаўся, даў па ім, Антону, чаргу з аўтама-

та, прастрэліў руку. Рана загнаілася, трэба было лячыць. Не паверыў тады ён, Антон, увайшоўшы ў Ашарслебен, што гэта той прыгажун горад, які ён бачыў, у якім, здаецца, аж кіпела зусім нядаўна жыццё. Нідзе ж ні вуліц, ні дамоў. Усюды, куды ні паглядзі,— груды цэглы, пакарабачанае, пагнутае жалязяччa, бітае шкло. І людзі — хто з перавязанаю рукою, хто кульгаючы — сноўдаюцца, як непрыкаяныя, сюды-туды, штосьці адкапваюць, шукаюць, кагосьці кудысьці нясуць...

...— Я помню разбураны Ашарслебен...— прамовіў, быццам у задуменні, Антон.— І помню, як яго бамбілі...

...Самалёты прылятaлі звычайна ў другой палове дня. Спярша некалькі, два-тры, кружылі, робячы дымавую завесу — цэлую хмару над горадам. І тады туды, за тую хмару, хвілін праз колькі, чарада за чарадой, залятaлі бамбавозы. І сыпалі, сыпалі бомбы — яны з жудасным свістам падалі, разразаючы паветра, і калі датыкаліся зямлі ці дамоў,— бліскаў агонь, уздымаліся аж у самае неба чорныя слупы, і толькі потым ужо чуліся выбухі: адзін за адным, аж трасло, калаціла, дзе б ні быў, дзе б ні хаваўся...

...— Бамбёжкі тыя таксама добра помню. Жах, аж цяпер трасе ўсяго,— пацепнуўся, увабраў галаву ў плечы, быццам ад холаду, Генрых Штоль.— Асабліва апошнія дні, перад самым прыходам амерыканцаў...

...Тыя дні запомніліся і яму, Антону. Якраз тады і ўзяліся былі эсэсаўцы выконваць той страшны загад Гітлера — ні адзін чалавек, вывезены з Усходу, не павінен дачакацца вызвалення, усіх трэба пазабіваць, умярцвіць. І нявольнікаў сотнямі, тысячамі выганялі з канцлагераў, шахтаў, каменяломняў — і проста на полі расстрэльвалі. Ставілі кулямёты і страчылі, страчылі цэлымі днямі з ранку да позняга вечара. Поле аж паласацела ад трупаў. І каб астацца жыць, іхняя сям'я — бацька, маці і дзеці — сышла з фермы. Хаваліся ў сціртах леташняй саломы, у пералесках і лазняках, што былі каля азёр, у падвалах разбураных дамоў...

Пра яду, сон ніхто не думаў — астацца б толькі жыць...

...— Мы, хоць і дзеці былі, але заядла абараняліся,— усміхаўся сам сабе, сваім думкам, успамінаў Генрых Штоль.— Мы да канца верылі Гітлеру, у непераможнасць нашай арміі і рэйха...

...Не, тыя, каго бачыў ён, Антон, заядла не абараняліся. І нікому, ні ў што ўжо не верылі. Хто са зброяй, хто без зброі, яны паўцякалі з акопаў і хаваліся гэтак жа, як і яны, тыя, хто хацеў выжыць,— у сціртах саломы, у пералесках і лазняках, у падвалах дамоў і каналізацыйных трубах. І на першым часе надта ж баяліся, палохаліся: немцы — каб іх не выдалі, яны — не немцы,— каб іх не пазабівалі. Здаралася, што і памагалі — яны немцам, а немцы ім — дзяліліся ядою ці падказвалі, куды не ісці, дзе жандармерыя і эсэсаўцы...

...— Як вы апынуліся ў Заходняй Германіі? — спытаў Антон, аддаючы Генрыху Штолю здымкі.— Ашарслебен жа ў ГДР...

— О, гэта звычайная гісторыя. Я трапіў у палон да амерыканцаў...

...Так, гэта сапраўды звычайная гісторыя, бо здавацца савецкім многія баяліся. І яшчэ задоўга да вызвалення ішлі, ехалі, цягнучы за сабою — у калясачках, каламажках, чамаданах, клунках — няхітры хатні скарб. Ды і салдаты-дэзерціры, што пакідалі фронт, таксама краліся па начах, каб здацца ў палон амерыканцам. Калі ж тыя прыйшлі, усё адно што пацукі, выходзілі, выпаўзалі адусюль і з паднятымі ўгору рукамі валакліся цэлымі шайкамі здавацца. Амерыканцы заганялі іх у кузавы грузавікоў і некуды вязлі, вязлі, машына за машынай...

...— Давялося і мне за калючым дротам пабыць, баланды паесці. Потым... Ашарслебен увайшоў у англійскую зону...

...І гэта так, праўда. Амерыканцы вызвалілі тую мясцовасць, дзе была ферма пана Хандке, пятага мая, пад вечар. Цэлы дзень было ціха-ціха, нават не гналі па дарогах, не стралялі на полі канцлагернікаў. І раптам у небе з'явіўся самалёт. Ён нізка-нізка праляцеў над шашою, потым вярнуўся. І тады праехала невялікая, крытая брызентам, машына. За ёю — танкетка, потым танк. Вядома, на першым часе ніхто нават не звярнуў увагі на белую пяцікутную зорку, што была намалявана і на машыне, і на танкетцы, і на танку, падумалі, што гэта адступаюць гітлераўцы. Аж не — гэта прыйшло вызваленне.

...Англічане з'явіліся нечакана. Ніхто нават не ведаў, што яны з'явяцца. Ляглі спаць пры амерыканцах, а раніцою раптам убачылі: тых салдат, што былі, ужо няма, ёсць новыя, рослыя, апранутыя ў адзежу нейкага тытунёвага колеру, абутыя не то ў боты, не то ў чаравікі. І ўсе, як адзін, гарластыя, крыклівыя і злосныя-злосныя. Зноў пазаганялі нявольнікаў у казармы, пачалі прымушаць працаваць на панскай ферме, як і пры Гітлеру... Нехта быў не паслухаўся, дык яго ў турму забралі...

...— Ну, а пасля, як вам вядома, там стала савецкая зона. Але я таго не чакаў...

...Ён, Антон, таксама не дачакаў тых дзён, калі прыйдуць савецкія. Ніхто з іх, нявольнікаў з Усходу, не супакоіўся, пакуль не пераправілі на другі бок Эльбы, у савецкую зону. Нават былі, калі пачалі ўгаворваць, каб не вярталіся на Радзіму — там, маўляў, усіх чакае Сібір і турма,— паслалі кагось за Эльбу, каб расказваў пра ўсё сваім, савецкім,— і як зноў прымушаюць працаваць на пана, і што ўгаворваюць не вяртацца, не ехаць на Радзіму...

...— Чаму вы не чакалі? Баяліся савецкіх? — спытаў Антон.

— Так, і гэта было. Я ж, няхай вам будзе вядома, вырас пры Гітлеру, іншай улады не ведаў. І рускіх... Шчыра скажу вам, за людзей не лічыў. Рускіх трэба знішчаць — і толькі. Я гэта ведаў, мяне гэтаму вучылі...

...Тыя, хто паліў вёскі, разбураў гарады, таксама, мабыць, гэта ведалі, іх гэтаму вучылі. Прыязджалі на світанні, каб заспець людзей дома, акружалі вёску і ўсіх, хто спрабаваў ратавацца, уцякаць, стралялі. А потым адных гналі на катаржныя работы на чужыну, а другіх — у свіран ці ў школу і палілі. Так карнікі рабілі ў многіх вёсках, тое зрабілі і ў роднай Антонавай вёсцы — Заброддзі...

У вачах паўстаў той сонечны чэрвеньскі ранак, калі яго, Антона, паднялі з пасцелі, выгналі на вуліцу, як ішоў, цягнуўся разам з іншымі, акружаны нямецкімі салдатамі, якія вялі за шворкі ваўкадаваў-аўчарак, на грэблю, а з грэблі — невядома куды, у свет...

...Добра ведалі, што «рускіх» трэба знішчаць, і тыя, хто працаваў у розных камендатурах, турмах, лагерах смерці... На сабе гэта Антон спазнаў — там, у лагеры, калі быў адзін, без бацькі і маці... Стаяў крокаў за колькі ад калючага дроту і глядзеў, прагна глядзеў у поле, усё чакаў, што вось-вось прыйдзе па яго, каб забраць, маці ці бацька. Набліжацца ж да дроту баяўся — бачыў сам на свае вочы, як стралялі ў тых, хто не слухаўся, падыходзіў, як падалі яны забітыя, ссечаныя кулямі... Ведалі, напэўна ж, добра, што «рускіх» трэба знішчаць, і тыя, хто заганяў іх у печы Дахау, Бухенвальда, Трасцянца... Такіх, хто выпадкова ацалеў, астаўся жыць, Антон таксама бачыў — як прыйшло вызваленне, беглі, не верачы шчасцю, хто адкуль, вырваўшыся з-за калючага дроту. Адзін нават з крука сарваўся, на які яго вешалі, і бег так, заціскаючы крывавую рану на шыі...

...— І вы, мусіць, баяліся помсты, баяліся, што нашы савецкія салдаты з вамі будуць рабіць тое самае, што і вы, вашы нямецкія салдаты рабілі? У Расіі... Беларусі... Польшчы...

— Так, і гэта было. Гітлер і яго памагатыя папрацавалі над намі як трэба. Вы ўявіць сабе не можаце, што расказвалі, пісалі пра рускіх, пра тое, што яны робяць, прыйшоўшы ў нашы гарады і вёскі...

...Уявіць... Усё, вядома, уявіць нельга. Але сёе-тое можна — сам неяк чытаў тую газету, што выходзіла ў гады вайны ў Мінску. Чаго толькі ні выдумлялі тыя, хто баяўся расплаты за свае злачынствы, хто хацеў пераламаць ход барацьбы на сваю карысць. Знаходзілі рознага роду адшчапенцаў — здраднікаў, правакатараў, якія быццам перабягалі да немцаў і «выдавалі» планы Сталіна... На якія падманы, пагрозы не ішоў Гітлер!

...— Мы баяліся рускіх і ўцякалі, хто як мог і куды мог. Цэлымі вёскамі, цэлымі гарадамі...

— Я гэта бачыў. Нават вёскі і гарады, дзе ні аднаго жыхара не аставалася. Як вайна скончылася, дадому, на радзіму, вяртаўся...

...Першы такі горад трапіўся адразу ж за Эльбай. Пустыя вуліцы, пустыя дамы... Нідзе нікога, нават катоў, сабак і то няма. І на дамах, на платах, здаецца, усюды, куды ні паглядзі,— толькі напісаныя белай фарбай словы: «Отравлено! Не трогать!»...

...— Але,— прадаўжаў Антон,— Гітлер і яго памагатыя маўчалі, што рабілі самі ў нашых гарадах і вёсках. І ў тых лагерах смерці, што набудавалі па ўсёй Еўропе...

— Я пачуў пра гэта толькі пасля вайны.

— Паверылі хоць, што гэта — праўда?

— Так, але не адразу. Вядома, і цяпер мне здаецца, што многае перабольшана.

— У якім сэнсе?

— Ну, ваша прапаганда таксама не дрэмле, працуе. Каб сёе-тое ўражвала, яго перабольшваюць...

— Што-о? — аж прыўзняўся, паглядзеў на Генрыха Штоля, як на дзівака, Антон.— Мы перабольшваем? Ды мы... мы,— пачаў ён гарачыцца.— Мы не расказалі пра злачынствы, зверствы фашыстаў і маленькай частачкі таго, што было. Каб я сам не бачыў. А то ж... Вы, вы не ўяўляеце, што рабілі вашы салдаты ў нас...

— Не толькі нашы салдаты, а і вы самі.

— Як гэта?

— Ну, вашы паліцаі, старасты... «Здраднікі», як вы называеце іх. Прадаўжалася ж, фактычна, грамадзянская вайна...

— Усё рабілася пад кіраўніцтвам Гітлера і яго спадручных. Каб Гітлер і яго армія не прыйшлі сюды, да нас, не было б усяго таго, што было. І спісаць свае грахі... Не, не думайце, што я апраўдваю розную погань — здраднікаў. Але галоўны натхняльнік і злачынца — Гітлер і фашысты. Ён, яны прынеслі гора на нашу зямлю. У той вёсцы, дзе я жыў, забілі больш за дзвесце чалавек! Уяўляеце — у адной вёсцы больш за дзвесце чалавек! І ніякія не здраднікі гэта зрабілі! Самі вашы сародзічы — немцы! Паехалі ў лес, злавілі адну сям'ю. Хавалася маці з чатырма дзецьмі, жонка старшыні калгаса. Дык яны... Нажамі, цесакамі парэзалі дзяцей і іх маці... І як, як!..

Антон аж вочы закрыў, ухапіўся рукамі за галаву — успомнілася, уявілася тое...

> ...Спякотны, нават быццам трохі парны летні поўдзень. Іх, усіх жыхароў вёскі, і старых і малых, павыганялі з хат. І яны стаяць, кожны ля свайго двара, і глядзяць, як міма іх па вуліцы едзе падвода, запрэжаная ў парку коней, і на ёй, той падводзе, вязуць парэзаных нажамі і цесакамі Гаварушак... Рукі, ногі, галовы... Усё асобна, складзена, як пасечаныя дровы. І кроў... Кроў капае, сцякае на колы, і тыя, абціраючыся аб пясок, пакідаюць за сабой мокрыя чырвоныя палосы...

...— А то... Сто шэсцьдзесят тры чалавекі загналі ў школу і падпалілі. Жывых! Мяне ж... Ды што мяне — усіх астатніх, лічы, вёску ўсю, спякотаю аж трыццаць кіламетраў пеша...

Зноў закрыў вочы — уявілася тая пыльная, бясконца доўгая дарога — са сляпучым, спякотным сонцам над галавою, што, здаецца, аж папяліла ўсё наўкруг, натоўп вяскоўцаў — жанчыны, мужчыны, дзеці,— акружаны карнікамі — яны з закасанымі па локаць рукавамі, з аўтаматамі, ваўкадавамі-аўчаркамі ззаду, па баках...

— А потым, без вады і яды, у таварных вагонах... Лагер у полі за калючым дротам... Ды што вам! Вы ўсё адно скажаце — перабольшваем! — махнуў рукою Антон.

— Не будзем гарачыцца! — спакойна, нават, як падалося, з насмешкай паглядзеў на Антона Генрых Штоль.— Вы былі ў Германіі, бачылі, што прынесла і нам вайна...

...Так, ён, Антон, хоць і малы быў, але многае бачыў. Ва ўсякім разе, сам перажыў тыя жудасныя бамбёжкі, што былі ўдзень і ўночы, хадзіў і праязджаў па многіх гарадах, што зруйнаваны былі гэтымі бамбёжкамі. Ды і забітых бачыў — жанчын, дзяцей... Іх адкопвалі, выцягвалі з падвалаў, з-пад цэглы і арматуры... Яшчэ цёплых і пачарнелых ужо, амаль гнілых...

...— Але ж вайну не мы пачыналі, не мы на вас нападалі, а вы!

— І не мы, не я, а Гітлер, фашысты!

— Для нас тады, у вайну, усе вы, немцы, былі гітлераўцы, фашысты. Гэта потым пачалі ўжо адрозніваць, што ёсць немцы і ёсць гітлераўцы, фашысты, што адных трэба баяцца, а з другімі... Можна смялейшымі быць...

— Так, не адразу і да мяне многае дайшло. Я верыў, як тысячы, мільёны, таксама Гітлеру, фашыстам...

— Чаму вы кажаце — верыў?.. А цяпер...

— Цяпер я нікому не веру. Толькі сабе. Хачу сам ва ўсім разабрацца. Таму і прыехаў у вашу краіну. Вы — камуніст?

— А што?

— Нічога. Толькі... Я баюся людзей, якія належаць да пэўных партый. Яны робяць многае, калі не ўсё, не па сваім перакананні, а таму, што рабіць так патрабуе іх партыя. Я не ўступаю ні ў якую партыю. Наогул партыйнасць шкодзіць усяму. Мы, пісьменнікі, павінны думаць пра агульначалавечае. Не пра рускіх ці немцаў, а быць вышэй, падняцца і над партыйнасцю, і над нацыянальнасцю, і нават над рэлігіяй, над усім тым, што нас раздзяляе, і шукаць таго, што нас аб'ядноўвае. Урэшце, усе мы людзі... І гэта патрэбна асабліва цяпер, калі новая вайна пагражае ўсім нам, усяму чалавецтву. Прычым атамная, вадародная. Вы згодны са мной?

— Не зусім,— пакруціў галавою Антон.— Няма нічога такога, што было б агульначалавечае без канкрэтнай праявы. Звышчалавек, якога выдумаў Ніцшэ і ў якога паверыў Гітлер,— не існаваў і існаваць не можа. Усюды, і ў Германіі, і ў нас, у Савецкім Саюзе, і ва ўсім свеце, жывуць вельмі канкрэтныя людзі, са сваімі радасцямі, турботамі і праблемамі. Вы ў адным не памыляецеся — усе яны, гэтыя людзі, хочуць міру, каб не было вайны. Асабліва ў нас, дзе вайна прайшла вогненным смерчам, пакінула

балючыя, незагойныя раны. І мы — тут я згодзен з вамі! — павінны зрабіць усё, каб не было больш вайны. Асабліва тыя, хто перажыў яе, бачыў на свае вочы, бо да нашага слова прыслухоўваюцца, нам вераць. Гаварыць людзям трэба праўду.

— Я згодзен з вамі — «гаварыць людзям трэба праўду». А самі вы... Вы... Гаворыце людзям праўду?.. Ну хоць бы пра тую самую вайну?

— Усю праўду нельга аднаму расказаць. Я расказваю тую праўду, якую ведаю.

— Цікава было б пачытаць — што вы пра нас, немцаў, пішаце?

— Пішу тое, што бачыў. Бо сярод немцаў... Розныя нават у вайну былі... Такія, што рэзалі дзяцей нажамі, цесакамі... А былі... Першы раз я аж не паверыў... Уявіце сабе — нас гоняць невядома куды, я падбіўся так у дарозе, на спякоце, што з ног зваліўся, упаў...

...Здаецца, закружылася, як і тады, галава і паехала, паехала кудысьці з-пад ног дарога — з людзьмі, абчаплянымі клункамі, жоўтым жаўтком сонца над галавою, небам...

...— І можаце паверыць — ачуўся я на руках у немца! Ён, як потым я даведаўся, падняў мяне з зямлі, даў вады і панёс, усё адно як сваё дзіця... Ну, а потым, ужо ў Германіі...

...Ферма, дзе жылі яны, вывезеныя з родных мясцін нявольнікі, была невялікая. Акрамя казармы — стадолы, дзе іх пасялілі, стаяла і некалькі крытых чарапіцаю цагляных домікаў — там гаравалі немцы, што таксама працавалі ў пана: стары Карл з тоўстаю Мартаю; хваравіты Фрыдрых з такою ж худою, як і сам, Эльзаю і дзвюма маленькімі дочкамі; маладая, рухавая Гертруда і яе сын Ганс... З Гансам ён, Антон, гуляў у «класы», «караглі» ды і іншыя гульні, у якія гулялі і ў сваёй вёсцы. Гансава маці, фраў Гертруда, калі выносіла сыну што-небудзь смачнае — лустачку хлеба, памазанага шмальцам, кухан ці яблыкі,— то і на яго, Антона, ніколі не забывала, пораўну ўсё дзяліла... І адзежу Гансаву старую аддавала, значыцца, спачувала...

...— Цікава было б пачытаць вашы кнігі.

— Я магу вам іх падарыць.

— На жаль, я не чытаю на той мове, на якой вы пішаце.

— Тады падарыце вы мне свае кнігі. Таксама цікава было б ведаць, што пішаце вы.

— Я вельмі люблю дзяцей.

І Генрых Штоль засунуў руку ў кішэню свайго замшавага пінжака, зноў дастаў здымкі.

— Паглядзіце вось, колькі іх у мяне. Ужо шасцёра. І яшчэ, спадзяюся, будуць. А ў вас?

Антон узяў у рукі здымак, паглядзеў на шчаслівых дачок і сыноў, што сядзелі на каленях, на плячах і нават на шыі ў шчаслівага бацькі — Генрыха Штоля,— і ўздыхнуў.

— Што, у вас няма дзяцей?

— Няма,— праглынуў Антон даўкі камяк, што раптам здавіў горла, не даваў гаварыць.

— Як гэта? Чаму?

— Так, таму... Думаеце, тое, што мы пераЖылі... Перажыў я... У канцлагеры ж вопыты розныя над намі, дзецьмі, праводзіліся... Бясследна тое ўсё не прайшло...

> ...Белая бальнічная палата, ложак, на якім ляжыць ён, Антон, і доктар — з сівою, кліночкам бародкаю, такімі ж сівымі, чысценькімі вусамі,— ён сядзіць на табурэціку і чамусьці баіцца падняць на яго, Антона, вочы, хавае іх у падлогу.
>
> — Мы зрабілі ўсё, што маглі,— як прысуд, гаворыць доктар.— На жаль, мы не багі.
>
> — Вы лічыце, ва ўсім вінавата ўсё ж вайна?
>
> — Так. Голад у дзяцінстве, тыя жахі, што перажылі і ўбачылі... І вопыты, вопыты ў гітлераўскім канцлагеры...

...— Разумею,— перастаў усміхацца, забраў у Антона здымак, схаваў разам з іншымі ў кішэню Генрых Штоль.— І для нас, немцаў, вайна таксама бясследна не прайшла. Мы паразумнелі, мы не хочам, каб паўтарылася тое, што было. Рускія і немцы, наогул усе людзі павінны жыць у міры.

— І мы таго самага хочам. І хацелі... Ага, дык вы не адказалі на маё пытанне — што і пра што вы пішаце? — узяў зноў сябе ў рукі Антон Шатуневіч.

— Я пішу казкі.

— Казкі?

— Так, казкі. Гэта самы любімы мой жанр. І ведаеце — чаму? Тая рэальнасць, тое жыццё, што бачыў я — страшныя. Пісаць пра іх... Не хочацца. А галоўнае, у казцы заўсёды можна зрабіць вясёлы і шчаслівы канец. У жыцці так бывае рэдка.

— Але ж жыццё... Яно вучыць!

— І казка таксама. Толькі ў казкі свае сродкі, яны вельмі ж дапамагаюць мне быць агульначалавечым, падняцца над тымі праблемамі, якія існуюць часова, быць наднацыянальным, надпартыйным, над усім тым, што нас раздзяляе...

— Але ж, я казаў ужо вам, мы жывём у рэальны час, у рэальных краінах, нас мучаць і хвалююць вельмі ж рэальныя праблемы. І адна з найгалоўнейшых — праблема вайны і міру. І гэтая праблема, калі мы яе не вырашым... Павернецца для чалавецтва ведаеце чым? Нават не тымі праблемамі, што нарадзіла папярэдняя вайна. Чытаць вашы казачкі не будзе каму, разумееце? А вы ж любіце дзяцей, пішаце для іх, маеце сваіх.

— Таму я і прыехаў да вас. Немцы павінны ведаць усю праўду пра мінулую вайну. Быць новай вайне ці не быць, у многім залежыць і ад нас.

— Добра, што вы гэта разумееце.

— Не можам не разумець. Мы, немцы, вінаваты ў дзвюх самых вялікіх войнах, што былі ў Еўропе. Не хацелася б, каб нас вінавацілі і ў трэцяй. Груз, што пакінулі нам нашы бацькі, дзяды і прадзеды, давіць на нас. Вядома, не на ўсіх. Ёсць у нас і такія, каго тыя, ранейшыя, войны нічаму не навучылі. Усе ж астатнія... Аб'ядноўваюцца, робяць усё магчымае, каб быў мір, не было вайны.

— Што ж, гэта пахвальна. Але,— спахапіўся раптам, паглядзеў у акно Антон,— мы так загаварыліся, што і не заўважылі, як прыехалі ў калгас. Ці не так, Сцяпан Кандратавіч? — сказаў па-свойму ўжо, па-беларуску, да шафёра Антон.

— Ды ўжо ж,— прабурчаў, быццам трохі незадаволены Антонам, шафёр.— Лапочаце і лапочаце сабе па-нямецку... Як усё адно цецерукі... Хоць бы палі, лясы, вёскі нашы паказалі... А то...

— Нічога, пакажам яшчэ,— супакоіў шафёра Антон.— Пагаварыць, высветліць сёе-тое таксама трэба.

— Куды вас везці?

— Да канторы, там нас павінны чакаць...

У калгаснай канторы — вялікім, цагляным двухпавярховым будынку, што стаяў пасярэдзіне вёскі крыху ў баку ад галоўнай вуліцы,— іх і праўда чакалі: пажылы, аднарукі, са слядамі воспы на твары старшыня калгаса Іван Лявонавіч Каберац, сакратар партыйнай арганізацыі, зусім малады зухаваты хлопец з прыгожым, амаль дзявочым тварам Васіль Харытонавіч Адамейка і брыгадзір паляводчай брыгады, прысадзісты, з пышнымі вусамі і вельмі ж дабрадушнай — аж да вушэй — усмешкай Патап Патапавіч Ларывончык. Як толькі павіталіся і пазнаёміліся, старшыня запрасіў усіх у свой кабінет, які быў на другім паверсе.

У кабінеце, калі расселіся вакол доўгага паліраванага стала, падняўся, першы ўзяў слова старшыня.

— Пакуль вы будзеце думаць, пра што пытаць і што паглядзець у нашым калгасе,— пачаў ён глухаватым голасам,— я хацеў бы караценька ўсіх вас пазнаёміць з нашай гаспадаркай. Калгас наш не перадавы, але і не адсталы. Словам, ёсць у раёне і горшыя, і лепшыя, не гаворачы ўжо пра вобласць ці рэспубліку. Але сяго-таго і мы дамагліся. Ва ўсякім разе, людзі зараз маюць добры заробак, добрае жыллё, свае прысядзібныя ўчасткі і свае прыхатнія гаспадаркі. Жывуць не горш, як у горадзе. Што ж да лічбаў... Я іх магу назваць, калі яны каго цікавяць. Ураджай збожжавых сёлета ў нас каля трыццаці цэнтнераў, бульбы мяркуем накапаць больш за дзвесце з гектара. Але гэты год не паказальны, бо былі гады, калі ўраджай збожжавых у нас падымаўся да трыццаці пяці цэнтнераў. Вельмі добра родзіць і лён. Лён — асноўная крыніца нашых грашовых прыбыткаў. Маем сякія-такія поспехі і ў жывёлагадоўлі. Ганарымся, што некалькі гадоў будуем самі, калгасам, жыллё, перабудоўваем вёску на новы лад. Як вы заўважылі, у нас пракладзены асфальт, ёсць водаправод, каналізацыя, тэлефоны ў кожнай кватэры, газ. Маем мы і свой дзіцячы сад, школу, клуб, два магазіны... І гэта не толькі ў Панажах, цэнтральнай вёсцы, а ва ўсіх вёсках калгаса. А іх у нас — шэсць...

— А можна будзе нам усё гэта паглядзець? — перапыніў старшыню калгаса, спытаў Генрых Штоль.

— А чаму ж не! — здзівіўся старшыня, як толькі пераклалі яму пытанне.— Вы ж дзеля гэтага, я думаю, і прыехалі. Дарэчы, адкуль вы і хто будзеце?

— Гэта пісьменнікі, з Федэратыўнай Рэспублікі Германіі,— не ўстаючы з месца, сказаў Антон Шатуневіч.

— З ФРГ? — вырачыў вочы парторг.— А чаму нас не папярэдзілі?

— Нічога,— супакоіў парторга больш вопытны старшыня калгаса.— Сярод немцаў таксама ёсць розныя людзі. Бачылі мы іх, сустракаліся, калі я партызаніў...

— Вы ў партызанах былі? — зноў не вытрымаў, запытаў Генрых Штоль.

— Быў. А што? — падняў вочы, паглядзеў на Генрыха Штоля старшыня.

— Ды нічога. Проста ўпершыню так блізка бачу партызана.

— І што, не страшна? — не спускаў вачэй з Генрыха Штоля, як бы вывучаў яго старшыня.

— Не,— адмоўна захітаў галавою, усміхнуўся Генрых Штоль.

— А мяне баяліся ў вайну. За маю галаву — мёртвага ці жывога — дзвесце тысяч марак абяцалі.

— І — цікава — дзе вы партызанілі?

— Цяпер гэта не ваенная тайна, лічыце, што тут. А калі быць зусім дакладным, дык у тутэйшых лясах.

— А пасля вайны дзе вы жылі і што рабілі?

— І да вайны, і ў вайну, і пасля вайны... Увесь час тут, у Панажах. Выбралі мяне людзі за старшыню, даверылі кіраваць гаспадаркай. І вось кірую...

— Цяжка гэта?

— Як вам сказаць... І цяжка, і лёгка. Лёгка, бо людзі ў нас слухмяныя, працавітыя, падганяць нікога не трэба, самі шукаюць работы. А цяжка... Цяжка было з нічога ўсё пачынаць. Прагналі мы немцаў, а ў нас — ні адной каровы, ні аднаго каня, вёсак наогул не было. Адступаючы, карнікі іх папалілі...

— З людзьмі? — аж пачырванела ўся, веямі заклепала Элізабет Айх.

— Не, не ўсе вёскі з людзьмі палілі. Было, што і без людзей. Адных на работы ў Германію выганялі, другіх яшчэ куды. Панажы, напрыклад, спалілі, як я казаў ужо, перад самым вызваленнем. І каго захапілі дома — пагналі па дарозе на захад. Куды — ніхто не ведаў. Савецкія войскі тады наступалі імкліва, вызвалілі панажоўцаў... Ну, а рэшта таксама павярталіся — хто з партызанаў, хто, скалечаны, паранены, з фронту. Не ўсе, вядома, некаторыя,— апусціў у стол вочы старшыня,— так і не вярнуліся. Больш за сотню чалавек загінула, словам, кожны чацвёрты...

«А ў нашай вёсцы — кожны трэці!» — чамусьці падумаў, ледзь уголас не сказаў Антон.

— Ну, значыцца, выбралі мяне за старшыню,— прадаўжаў расказваць Іван Лявонавіч Каберац.— Пачалі мы гуртам, што называецца, на папялішчах абжывацца, абзаводзіцца ўсім неабходным, будавацца, поле да жыцця вяртаць, словам, усё з нуля пачынаць...

«Усё тое ж, што і ў Заброддзі, у іншых нашых беларускіх вёсках,— падумаў Антон.— Нідзе ж нічога немцы не пакінулі, ні кала ні двара... Папялішчы ды поле. Як з чужыны ў вёску сваю вярнуліся — не пазнаць было Заброддзя. Толькі абгарэлыя платы, ссохлыя грушы, яблыні... Ды яшчэ бур'ян — высокі, бучны ён парос на месцы былых хат, асабліва печышчах...»

— Ну, а цяпер нічога, паглядзіце, што нам далі мір, праца без вайны, як мы жывём і што маем,— гаварыў старшыня.

«І там, у Заброддзі, таксама ёсць на што паглядзець,— думаў Антон.— Балоты асушылі, замест калгаса — саўгас. Дамы цагляныя, асфальт, тратуары... Але не рвуцца вельмі ісці ў новыя цагляныя дамы жыць, вясковая хата, выяўляецца, лепшая. «Чаму?» — пытаў, будучы ў вёсцы, ён, Антон, у людзей. «Бо печы няма».— «А навошта вам тая печ?» — «О, без печы цяжка жыць. Гэта ж прапаліў уранні — і сабе, і свінням зварыцца. Выграб жар, заставіў зноў жа на абед, і сабе, і свінням. Прыйшоў з работы — усё зварана, цёплае, аж гарачае. А ўвечары, калі змерзнеш ці намокнеш... І адзежу прасушыш, і сам пагрэешся. Не, без печы як нам жыць. Бо газавая пліта тая... Ніякага развароту, удобства ніякага».

— Скажыце толькі, што вы хочаце паглядзець, што вас цікавіць? — пытаў тым часам старшыня.

Падняўся Генрых Штоль.

— Выбачайце, мы начыталіся шмат пра вашы калгасы. І рознага. Некаторыя параўноўваюць іх... Не буду нават казаць з чым... Таму мы ўсё б, усё б хацелі пабачыць, на ўсё паглядзець. Мы ж упершыню ў Савецкім Саюзе, упершыню ў калгасе...

— Прыязджайце да нас пажыць,— запрасіў Генрыха Штоля старшыня.— Хочаце на месяц, хочаце на два, а то і на ўсё жыццё...

Калі Марыя Іванаўна пераклала запрашэнне старшыні, усе, нават самы маўклівы і старэйшы Паўль Закс, засмяяліся.

— Я праўду кажу, сур'ёзна,— паўтарыў старшыня.— Прыязджайце, не пашкадуеце. Дарэчы, можаце і тых захапіць, хто параўноўвае нашы калгасы з чым папала... Вядома, не ўсё ў нас ідэальна, ідзе так, як хацелася б. Ёсць нявырашаныя праблемы і пытанні...

— Напрыклад? — быццам устрапянуўся, пажвавеў Паўль Закс.— Хоць адно з іх, адну з праблем назавіце.

— Не адно і не адну, а магу назваць добры дзесятак. Скажам, рэкамендацыі нашых вучоных, што дзе сеяць ці разводзіць. Яны надта ж агульныя, да адной мясцовасці правільныя, а да другой ніяк не падыходзяць. Ці тыя ж нашы адносіны з іншымі арганізацыямі, што завозяць угнаенні, дапамагаюць апрацоўваць зямлю. Ім аддай заробленае, заплаці — і ўсё, як кажуць, з плеч далоў. А будзе які толк, вынік ад дапамогі — іх не цікавіць. Ды і цэны, па якіх мы здаём ці прадаём дзяржаве прадукты. Не заўсёды яны яшчэ адпавядаюць затратам. Ды і ў калектыве не ўсе хочуць працаваць. Ім бы аднаасобна... А то яшчэ — п'янства...

«А старшыня з галавой,— падумаў Антон.— Ведае, усё ведае. Ды каб не ведаў, ніхто б столькі год не трымаў яго за старшыню. І ў Заброддзі, калі сустракаўся і гаварыў з дырэктарам саўгаса, той таксама не прамінуў сказаць пра п'янства. Гонімся за рублём, за тым прыбыткам, што дае алкаголь, забываючы: выводзім жа са строю рабочую сілу. Ды не толькі сілу — няшчаснымі робім сем'і, дзяцей, саміх тых, хто п'е. Прымаем розныя грозныя пастановы — і самі ж іх не выконваем, парушаем. Хітранькую ідэйку хтось падкінуў — не забараняць трэба, а вучыць піць. Хе-хе...»

— Ды і дзяцей у апошні час мала раджаем, хоць ты план на кожную сям'ю даводзь...

«І ў Заброддзі тое самае. Школу збіраюцца зачыняць — вучняў ва ўсіх класах не хапае».

— Так што,— прадаўжаў, пасміхаючыся, старшыня,— калі б прыехалі да нас пажыць, многае б убачылі, пачулі. Свежаму чалавеку яно куды відней. І нам бы што-кольвечы падказалі. А то мы прывыклі, так, здаецца, ужо і трэба, нічога новага не прыдумаеш. Прыехаў быў нядаўна адзін у нас з Аргенціны, у магазін гандляваць пайшоў. Праз тыдзень-другі, паглядзеўшы, што купляюць, а што не, цэны па-свойму, на свой лад перакроіў. «Навошта ж,— кажа,— каб адно залежвалася, а другога не хапала?» Толькі ў нас цэнамі дзяржава кіруе, у нас гэта не пры-

ватная ўласнасць: як хачу, так і раблю. У нас сацыялізм. Вось на гэта і вас прашу не забываць. У нас бясплатная медыцына, бясплатная адукацыя і гэтак далей, і гэтак далей, як кажуць некаторыя.

Парторг, які ўвесь час не спускаў вачэй з гадзінніка, раптам падняў чупрыністую, акуратна падстрыжаную галаву, паглядзеў на старшыню.

— Аднак я загаварыўся, прашу прабачыць. Дык што ўсё ж вы хацелі б паглядзець у нашым калгасе?

— Можа, так зробім,— кінуўся на выручку і гасцям, і старшыні Антон Шатуневіч.— Праедземся па палях, вёсках, што нашым гасцям захочацца паглядзець, тое і пакажам.

З гэтым усе дружна згадзіліся, заківалі галовамі, пачалі падымацца з наседжаных месцаў. Але старшыня зноў узяў рэй у свае рукі.

— Вось што,— сказаў ён.— Нас з парторгам выклікаюць у раён, так што на гэтым мы развітаемся, пакінем вас. Што ж да праваднiка і тлумачэнняў... Гэта зробіць наш паважаны Патап Патапавіч Ларывончык,— і старшыня паказаў на брыгадзіра паляводчай брыгады, які сядзеў увесь час моўчкі.— Ён чалавек тутэйшы, нарадзіўся тут, тут і жыве, усё ведае... Ну што ж, бывайце,— памахаў на адвітанне старшыня рукою.

І хуценька пайшоў, ледзь не пабег са свайго кабінета ўслед за намнога маладзейшым, прытчэйшым парторгам.

Панажы, ды і іншыя вёскі, палі, лугі гасцям — пісьменнікам з Заходняй Германіі — спадабаліся, спадабаўся наогул увесь калгас. Дзе б ні спыняліся, што б ні паказвалі, чулася ўхвальнае: «Гут, гут». Адчувалася, спадабаўся і Патап Патапавіч Ларывончык. Ды і не мог ён не спадабацца, бо быў, акрамя ўсяго іншага, надзелены яшчэ здаровым народным гумарам, любіў у сваю гаворку ўставіць ёмкае жывое слоўца.

— Дзе вы ў вайну былі? — улучыўшы момант, спытаў у яго Генрых Штоль.

— Я? — пакруціў кончык левага, потым правага вуса Патап Патапавіч.— У нямецкіх паслугачах... Старастам быў.

— Старастам? — аж шыю выцягнуў, не паверыў Генрых Штоль.— І вас не пасадзілі ў турму, у Сібір не выслалі?

— Не,— смяяўся Патап Патапавіч.— Бо старастам я быў быццам нямецкім, а служыў сваім. Разумееце, фарштэйн?

— Я, я,—ківалі галовамі немцы.

— Па сакрэту цяпер вам скажу,— перайшоў амаль на шэпт Патам Патапавіч.— Падпольшчык я быў.

— І вас ніхто не выкрыў? — здзіўляўся Генрых Штоль.

— Што ж за падпольшчык, якога выкрываюць? Сваю работу, тое, што табе даручаюць, трэба ўмець рабіць. І ў мірны, а тым больш у ваенны час. Вядома, не ўсё гладка і ў мяне ішло. Давялося аднаму майму месцу не раз разплачвацца за памылкі галавы. І шомпалаў перападала, і ў турме пасядзець давялося. Ды, як у нас кажуць, усё добра, што добра канчаецца. Я жывы, здаровы, працую быццам нічога таго ўсяго і не было. Зноў па сваёй зямлі хаджу... Айн, цвай, драй...

Калі пабывалі ў клубе, дзіцячым садзе, школе, магазінах, на фермах, заехалі на ток — там якраз самая гарачая пара была, сушылі, ачышчалі зерне,— захацелася пісьменнікам хоць на хвілінку зазірнуць у якую-небудзь хату, паглядзець, як уладкаваны быт, як наогул жывуць калгаснікі.

— Дзела гэта такое,— пацісnуў плячыма Патап Патапавіч.— Інтымнае, сямейнае. Могуць і чапялою па спіне агрэць, калі не ў час дзверы ў хату адчыніш. Не просяць, дык не хадзі... Але раз вам так хочацца... У якую хату вас павесці — цагляную ці драўляную?

Выявілася — і тую, і другую госці не супраць каб паглядзець.

— Што ж,— развёў рукамі Патап Патапавіч.— Ахвота горш за няволю. Хадземце. Людзі ў нас добрыя, памяркоўныя, але калі хто ў хату не пусціць — не крыўдуйце. Дзела гэта, як я казаў, інтымнае, сямейнае. У нас нават у Канстытуцыі запісана, маўляў, ніхто не мае права без законнае падставы на тое ўвайсці ў жыллё супраць волі асоб, якія там пражываюць.

Гэта было новае, раней не чутае для пісьменнікаў з Заходняй Германіі. Яны пачалі ўспамінаць, ці ёсць такое права, ці гарантавана гэта іхняй канстытуцыяй.

— Лягчэй любое права запісаць, чым забяспечыць,— выказаў сваё меркаванне Паўль Закс.

— О не,— закруціў галавою, не згадзіўся Патап Патапавіч.— Можа, дзе і так, толькі не ў нас. У нас калі ўжо запісана што, то паспрабуй не забяспеч. Людзі граматныя,

чытаць і пісаць умеюць. Да Масквы дойдуць, а свайго дамогуцца. Было такое ў нас аднойчы — пад час уборкі ўраджаю, каб зрываў ніякіх у рабоце не было, парашылі мы на праўленні ў магазін гарэлкі і віна не завозіць. Ну-у, каб менш гэтае самае... трынкен... пілі. І вы ведаеце — аказваецца, мы парушэнне зрабілі, ледзь па вымове нам не закацілі. Хоць і кажуць: закон, што дышла, як павернеш, так і выйшла, але ж... Тая прымаўка ад старых часоў. Цяпер лепш закон не парушаць. Я таго ўсё жыццё прытрымліваюся і іншым тое самае рабіць раю... Ну, паказвайце, у якую хату вы хацелі б зайсці? — спытаў ён, вывеўшы пісьменнікаў на заасфальтаваную, крываватую вуліцу Панажоў.

Выбралі пісьменнікі хату з выгляду не лепшую, а калі сказаць шчыра, дык самую горшую — старую, крытую саломай, да таго ж скасабочаную, з вывернутай сцяной, ды і дашчаны плот, якім абгароджаны быў двор, месцамі аб'ехаў, ледзь не паваліўся.

— Пры ўсім вашым жаданні,— усміхнуўся хітравата ў свае пышныя вусы Патап Патапавіч,— сюды, у гэтую хату, зайсці мы не можам.

— Чаму? — насцярожыўся, аж кепачку-венгерку з галавы зняў, агаліўшы сівы вожык валасоў, Паўль Закс.

— Таму што ў ёй ніхто не жыве. Да леташняга года жыла тут адна ўдава наша, Ганна. Муж яе з вайны не вярнуўся. А дзеці... Двое... На міне падарваліся. Ужо ў мірны час. Пайшлі па ягады — і не вярнуліся... Ведаеце, на партызан немцы міны ставілі... А сама Ганна перабірацца нікуды не хацела, век дажывала ў гэтай развалюсе. Памерла, небарака, увосень... Што з хатаю рабіць — не ведаем, усё чакаем, можа, родзіч які аб'явіцца, на дровы забярэ. А так бы знеслі даўно, каб вачэй не муляла, выгляд вёскі не псавала... Дый чаго вы з усіх хат гэтую выбралі? — паглядзеў нават быццам трохі здзіўлена Патап Патапавіч.— Калі ў вайну да нас, бывала, немцы прыязджалі, дык выбіралі заўсёды хату самую лепшую, вядзі, маўляў, туды. Людзей з хаты «вэк» — і самі пасяляліся. А вы... Чым, скажам, не падабаецца вам тая хата, што стаіць насупраць? Ці вунь — злева, справа?

Павярнуліся, паглядзелі пісьменнікі на тыя хаты, на якія паказваў Патап Патапавіч. Усе яны вялікія, на некалькі вокан, з пафарбаванымі аканіцамі, зрубленыя з добрага, смалістага дрэва. Ды і накрыта адна бляхаю, а дзве іншыя — шыферам.

— Ну, дык у каторую з іх зойдзем? — пытаў Патап Патапавіч.

— Вядзіце ў любую,— махнуў кепачкою-венгеркаю Паўль Закс.

— Што ж вы так,— пажурыў пісьменніка Патап Патапавіч.— Як у горшую, дык вы з ахвотаю ішлі. А як у лепшую, дык і ахвота ўсякая прапала.

— Не, не,— заклепала вейкамі, пачырванела Элізабет Айх.— Мне, наадварот, лепшае паглядзець хочацца. Бо горшага... І ў нас, у Германіі, хапае.

— Я, я,— пацвердзіў думку Элізабет Айх Генрых Штоль.— Мне ў любую хату зайсці хочацца. Я проста ніколі ні ў якой вашай хаце не быў. І як там што — не ведаю. А што лепшая хата ці горшая... Мне ўсё адно.

— І нам таксама,— павесялеў, зноў заўсміхаўся на ўвесь свой рот Патап Патапавіч.— Мы гэна... Жывём, як дазваляюць нашы сродкі, як нам падабаецца. Урэшце, мы жывём не для паказу, не для другіх, а для сябе. Адны горш, другія лепш. Усё залежыць, колькі хто зарабляе, у каго якая сям'я, хто як умее траціць капейку. Скажам, вось у гэным доме,— паказаў ён на дом, што стаяў, красаваўся ў зеляніне саду насупраць праз вуліцу,— жыве адна з перадавых нашых даярак. Мужа ў яе няма, таксама з фронту не вярнуўся, дзеці дарослыя, пажаніліся, павыходзілі замуж, жывуць у горадзе. Але да маці наведваюцца, не цураюцца вёскі. Ды і маці яшчэ ў добрым здароўі, на ферме кароў доіць, зарабляе нядрэнна. А вось у гэнай хаце,— паказаў ён на хату, што стаяла злева ад Ганнінай хаты — пад дзвюма высознымі, кучаравымі ліпамі,— жыве наш калгасны каваль. У яго трое малых дзетак, жонка часта хварэе, ды і чарачку ён куляе, выпіць і па прычыне, і без прычыны любіць. То ён жыве, хоць і зарабляе быццам добра, але ўжо не так. А ў той хаце, што справа,— стаяў на вуліцы, паказваў Патап Патапавіч,— і муж, і жонка маладыя, і ён, і яна ў полі працуюць. Дома гаспадарку глядзіць мужава маці, Параска. Яна якраз дома, можам і зайсці да яе...

Параска сапраўды была дома, падмятала хату, калі Патап Патапавіч адчыніў дзверы, спытаў, ці можна зайсці.

— Заходзь, заходзь, Патапка,— кінула мясці хату, узяла венік пад паху Параска.

— Я не адзін, цётка Параска. Тут са мною пісьменнікі. І не нашы, а з Германіі.

— Во-ёй! — выпусціла венік, схапілася рукамі за гала-

ву, ледзь не загаласіла Параска.— А ў хаце ж яшчэ не падмецена, дый чым частаваць вас...

— Не трэба, цётка Параска, нам ніякага пачастунку. Тут людзі здалёку прыехалі. У нашых хатах ніколі не бывалі, не ведаюць, як мы жывём...

— Ды жывём мы, хвала Богу, добра,— пачала спахапліва папраўляць на галаве хустачку, абцягваць на сабе шытую, крамную кофтачку, чорную, у зборкі, спадніцу цётка Параска.— Зусім не так, як даўней жылі. Во каб толькі мір быў, вайны не было!

— І мы тое самае нашым гасцям кажам — каб толькі мір быў, вайны не было! — згадзіўся з Параскаю, праходзячы сам і праводзячы пісьменнікаў на хату, Патап Патапавіч.— Глядзіце, пытайце, што вас цікавіць.

Уважліва, амаль прыдзірліва агледзелі заходненямецкія пісьменнікі і стол, на якім ляжаў, накрыты вышываным палатняным ручніком, бохан хлеба, і шафу, поўную ўсякага дабра, якую, як гэта прынята ў вёсках, паказала, гасцінна адчыніла Параска, ложкі, што, аж, здаецца, гнуліся ад падушак, тэлевізар, халадзільнік, магнітафон, пральную машыну. Усеагульнае захапленне выклікала печ. Генрых Штоль аж нават злазіў на яе.

— Глядзеце, глядзеце,— паказвала, дазваляла Параска.— Толькі выбачайце, што не ўсюды чыста, не падмецена нават. Са свіннямі я забавілася, дый дзеці ў грыбы захацелі, то пакуль гэна я сабрала...

— Нічога, нічога,— супакоіў цётку Параску, а заадно і Патапа Патапавіча Антон Шатуневіч.— І так дзякуй за ўсё вам. Нарабілі столькі клопату.

— Ды які тут клопат? — падхапіла Антонавы словы цётка Параска.— Каб папярэдзілі, дык мы б падрыхтаваліся. І паўлітра на стале стаяла б, і закуска...

— О не-не,— весела засмяяўся Генрых Штоль, калі пераклала Марыя Іванаўна тое, што сказала цётка Параска.— Мы не ў госці прыйшлі, мы паглядзець. Хоць... Вельмі хочацца пабачыць, як гэта ў вас сустракаюць хлебам-соллю. Чулі мы пра гэта, чыталі, а каб бачыць...

— Хлебам-соллю ў нас сустракаюць толькі шаноўных гасцей,— патлумачыў Генрыху Штолю Патап Патапавіч.— А не ўсіх, хто да нас прыязджае. У вайну было — патрабавалі, каб акупантаў хлебам-соллю сустракалі. Айн, цвай, драй... Але людзі... На смерць ішлі, а звычаю не парушалі...

— Разумеем,— паківаў бародкаю Генрых Штоль.

— Калі хочаце, каб вас хлебам-соллю сустракалі... Прыязджайце наступны раз, прыязджайце, як нашы сябры. Мы рады будзем вас сустрэць хлебам-соллю. І не толькі вас, а ўсіх, хто камень за пазухай не трымае, хто з чыстай душой, шчыра... Фарштэйн?

— Я, я,— разумеў Патапа Патапавіча, згодліва ківаў бародкаю Генрых Штоль.

Пабывалі, зайшлі ўсім гуртам і ў цагляную — «гарадскую» — кватэру. І хоць яна размяшчалася на двух паверхах (ніжні прыхожая, кухня, пакой для рознай хатняй неабходнасці, другі — спальні, дзіцячая, зала) і ўсё ў гэтай кватэры аж зіхацела, прыбрана было, заслана дарожкамі і дыванамі,— яна не зрабіла асаблівага ўражання на пісьменнікаў, мо таму, што калі не такія кватэры, дык падобныя яны ўжо бачылі.

— Гэта трэба паказваць нашым людзям. Тым, хто яшчэ такога жылля не мае і не будуе,— сказаў Патапу Патапавічу Антон Шатуневіч.

— Чаго ж? — не згадзіўся з Антонам Патап Патапавіч.— І яны, нашы госці, няхай паглядзяць. Што маем, тое маем. Каб не задаваліся надта, быццам у іх усё лепшае. Сёе-тое і ў нас ёсць, не зломкі мы. І будавацца навучыліся, і жыць па-людску. Вядома, у нас усё куды б яшчэ лепей было, каб не вайна. З папялішчаў жа пачыналі. І не толькі калгас наш, а край цэлы. Усё ж было стоптана, знішчана... Успомніш — жудасць бярэ... Як не стараўся я сёе-тое ўратаваць, як ні юліў перад начальствам фашысцкім — нічога не выйшла. Немцы — людзі акуратныя, загады начальства не парушалі, выконвалі. Дый, калі шчыра казаць, не шанавалі яны нас, глядзелі як на «унтэрменшаў», нешта ніжэйшае. Менш нас — лепш ім. Нават, як потым мы даведаліся, зусім зжыць са свету нас, беларусаў, збіраліся, загад такі ў Гітлера быў — частку знішчыць, частку анямечыць, у рабоў сваіх, значыцца, ператварыць. Ды вы гэта ведаеце, «генуг»...

Выявілася — гэтага госці якраз і не ведалі.

— Як? — здзівіўся, аж кончыкі вусоў рукамі пакратаў Патап Патапавіч.— У нас усё гэта надрукавана. А ў вас чаму пра гэта маўчаць? Увесь свет ведаць павінен, хто такі быў Гітлер і фашысты, каб не паўтарылася ніколі больш тое. А праўду ад людзей хаваць... Гэта ж... Злачынства.

— Нявыгадна некаторым у нас ведаць усю праўду пра Гітлера і фашызм,— сказала ціха, быццам баючыся, Элізабет Айх і неяк дзіўна паглядзела на Паўля Закса.

— Выгадна ці нявыгадна, а знаць праўду ўсё адно трэба. Як у нас кажуць, хлеб, мякіну еш, а праўду ў вочы рэж...

З Панажоў выехалі ў добрага паўдня, паабедаўшы, праўда, насуха, без гарэлкі, у калгаснай сталовай, якая таксама вельмі ж спадабалася пісьменнікам з Заходняй Германіі: усё так чыста, танна і, галоўнае, ніякога ні ў чым стандарту — і ў афармленні залы, і асабліва ў самой ядзе, бо падалі надта ж смачны, наварысты чырвоны боршч з буракоў, кручэнікі з дранае бульбы з мясам і сырадой. І ехалі не так, як у калгас, а расселіся па-іншаму: Генрых Штоль сеў у тую машыну, дзе дагэтуль сядзелі Паўль Закс і Элізабет Айх, а Паўль Закс і Элізабет Айх пераселі ў машыну да Антона Шатуневіча. Каб Генрыху Штолю не было зусім сумна, пакінулі яму перакладчыцу Марыю Іванаўну Літвінка, якая, як выявілася, нядаўна вярнулася з Германіі — з ГДР, дзе служыў яе муж, і надта ж цікава расказала пра тыя змены, што адбыліся за апошнія гады там. Зрабіць так, перасесці настаяла Элізабет Айх, калі даведалася, што Антон Шатуневіч ведае нямецкую мову.

— Мне пагаварыць з вамі трэба,— сказала шчыра, даверліва Элізабет.— Дзеля гэтага, можна сказаць, я і прыехала сюды, акрамя таго, што Савецкі Саюз паглядзець хочацца.

І калі рушылі з Панажоў, выехалі на шырокую асфальтавую дарогу, што вяла ў Хатынь, Антон Шатуневіч, павярнуўшыся тварам да Элізабет Айх — ён сядзеў побач з шафёрам, Сцяпанам Кандратавічам,— спытаў:

— Пра што вы хацелі са мною пагаварыць?

— Ды пра рознае,— ажывілася Элізабет, нагнулася бліжэй да Антона.— Я хацела сказаць вам, каб ведалі, што ў нас, у Заходняй Германіі, ідзе вялікая пераацэнка каштоўнасцей. І не толькі ў тых людзей, што ваявалі, перажылі ліхалецце, але і ў тых, хто нарадзіўся потым, у моладзі. Асабліва калі ўзнікла рэальная пагроза новай вайны, атамнай. Паміраць ніхто не хоча. Таму такі моцны ў нас цяпер антываенны рух. Мне здаецца: вы сёе-тое выдаеце пра яго.

— Так, чуў,— кіўнуў галавою Антон.— Розныя антываенныя арганізацыі, дэманстрацыі, партыя «зялёных»... Мяне, прызнацца, дзівіць, што гэта за партыя, мэта якой — захаванне прыроды і жыцця?

— Гэта не партыя,— горача загаварыла Элізабет.— Гэта рух, які аб'ядноўвае ўсіх людзей, незалежна ад іх прыналежнасці да партый. І не толькі ў Заходняй Германіі — рух гэты пашыраецца па ўсім свеце. Зялёны колер — колер жыцця. А ў наш час, калі не толькі над жыццём людзей, а наогул над жыццём, над планетай узнікла пагроза знішчэння... Мы, людзі, павінны забыць, што нас раздзяляе, і аб'яднацца ў імя захавання жыцця, у імя захавання планеты. Толькі аб'яднаўшыся, мы зможам спыніць гонку ўзбраенняў, спыніць вайну.

— Вядома. Але,— не зусім падзяляў погляды Элізабет Айх Антон Шатуневіч.— Як на мой розум, трэба сядаць за стол перагавораў, дамаўляцца знішчыць атамную і вадародную зброю.

— Мы таксама за гэта. Ды,— заўсміхалася Элізабет,— рашаюць усе пытанні, у тым ліку і пытанні вайны, міру і раззбраення, урады. Наша задача — прымусіць урады сесці за стол перагавораў, прымусіць не шукаць розных прычын, каб перапыняць перагаворы, а каб дамаўляцца, прымаць патрэбныя ўсяму чалавецтву рашэнні. Мы выбралі сваіх людзей у дэпутаты, а калі ўдасца, увойдзем і ва ўрад, каб яшчэ больш уплываць...

— Гэта ваша справа.

— І ваша. Вы таксама павінны ўплываць на свой урад, каб ён быў больш згаворлівы. Рух «зялёных» павінен узнікнуць і ў вас, у вашай краіне. Бо сам гэты рух значна шырэйшы, чым толькі супраць вайны. Мы супраць знішчэння лясоў, забруджвання рэк, адстрэлаў розных дзікіх звяроў і птушак. Ні для каго не сакрэт — кладоўкі прыроды надта ж пабяднелі, асабліва за апошні час. Дый паветра забруджваецца, забруджваюцца грунтовыя і паверхневыя воды, забруджваецца заогул уся зямля. Розныя хімічныя ўгнаенні, адыходы ад прамысловасці і будаўніцтва... Мы павінны думаць, каб не толькі самім прыжыць на зямлі, але каб пакінуць яе прыгоднай для жыцця і іншым пакаленням людзей, што прыйдуць потым.

— Усё, пра што вы гаворыце, сапраўды вельмі важна,— згадзіўся з Элізабет Антон Шатуневіч.— Гэтыя пытанні — вы, мусіць, ведаеце, чулі — па прапанове савецкай дэлегацыі вынесены на абмеркаванне нават Арганізацыі Аб'яднаных Нацый... Наш друк таксама нямала піша і пра забруджванне рэк, азёр, пра не зусім разумнае асушэнне балот, пра розныя іншыя экалагічныя парушэнні. Там, дзе гаспадарнікі бяруцца за справу, не думаючы ні

пра што, а толькі пра выгаду, прычым тымчасовую, і ў нас і ў вас — бяда...

— Вось-вось, добра што вы гэта разумееце. «Зялёным» і ў вас хапіла б чым заняцца,— павесялела Элізабет.— Кажу гэта вам не як вораг. Я сама з працоўнай сям'і, у вайну і дзед мой, і баба ды і бацька спачувалі вашаму народу, вашай краіне, ненавідзелі фашыстаў і Гітлера, за што жорстка паплаціліся. Дзед і баба не вярнуліся, загінулі ў канцлагерах... А бацька... Камуніст...

— Чаму ж вы, дачка, не пайшлі дарогай бацькі? — паглядзеў больш уважліва на Элізабет Антон.— Збаяліся?

— Не, зусім не,— адмоўна пахітала галавою Элізабет.— Праграма «зялёных» мне адпавядае больш. Я жанчына, я каб усё жывое жыло. Жыло так, як хоча.

— І фашысты, неафашысты ці як яны там у вас называюцца?

— На іх трэба ўплываць, уздзейнічаць. Самі сабой яны не знікнуць. У іх цяпер няма той падтрымкі, якая была некалі. Рэванш, пра які яны мараць, узяць ім ужо ніколі не ўдасца. Ну, а што яны ў нас ёсць... У нас свабода для ўтварэння і дзейнасці любых арганізацый і партый...

— Я нічога не маю супраць вашых свабод. Няхай карыстаецца імі як хто можа і ўмее. А вось што да фашысцкіх, неафашысцкіх і розных іншых рэваншысцкіх арганізацый... Іх забараніць трэба, паставіць па-за законам. Тыя, хто прынёс іншым народам і свайму столькі гора, па чыёй віне загінулі мільёны людзей, не маюць права на існаванне, якую б там ні было дзейнасць. Праўду я кажу? — звярнуўся Антон да Паўля Закса, які сядзеў увесь час моўчкі, не ўмешваўся ў размову, быццам не чуў яе, толькі глядзеў, прагна глядзеў на дарогу, на палі, пералескі, лясы, што мільгалі паўзбоч.

Але Паўль Закс не адказаў, нават не павярнуў твару да Антона — усё гэтак жа пільна, уважліва глядзеў то наперад, то ў бакавое шкло і штосьці засяроджана думаў.

Змоўкла, адкінуўшыся на сядзенне, задумалася пра нешта сваё, нават вочы заплюшчыла, і Элізабет Айх.

«Змарылася, мусіць. А можа, да дарог нашых не прывыкла — закалыхала яе,— падумаў Антон і яшчэ раз паглядзеў асцярожна, бачком на Паўля Закса.— Хто ён? І чаму маўчыць — не ўдаецца ў размовы? Калі меркаваць па гадах, дык... Цікава, дзе, кім ён быў у вайну? Ну, мог быць?.. Ага, ага, кім ён мог быць? Салдатам?..»

Заплюшчыў вочы, успомнілася...

...Калючы дрот у полі. Там, за калючым дротам,— рослае, амаль ужо спелае жыта; яшчэ далей — лес. Зубчасты, зялёны і ў летнім затуманеным марыве ўдае нават быццам сіняваты. Воля! А тут, дзе ён, Антон, дзе іншыя дзеці — хто босы, у падраных, палапленых кашульках і штоніках, хто абуты — у чаравікі, туфлі, боцікі, апрануты ў крамную кашульку і нават касцюмчык,— плач, крык, галас. «Мама! М-мама! Мамачка!» — толькі і чуваць адусюль — здаецца, аж вісіць у паветры.

Паўз агароджу — у некалькі столак нацягнуты калючы дрот — ходзяць, шпацыруюць нямецкія салдаты. З аўтаматамі, сабакамі-ваўкадавамі на шворках. Гэта ахова. Набліжацца да дроту нельга, нельга ўступаць ні ў якія размовы з аховай. Пра гэта іх, дзяцей, папярэдзілі. Але хто хоча быць за калючым дротам, хто не імкнецца вырвацца зноў на волю, быць са сваёй мамай!

Не праходзіць і некалькі хвілін, каб нехта з хлапчукоў ці дзяўчынак не паспрабаваў свайго шчасця, не наблізіўся да агароджы. І тады чуецца кулямётная ці аўтаматная чарга. Дррр... І дзіця падае. Каторае адразу, каторае ж прабяжыць яшчэ некалькі крокаў і тады ўпадзе. Акрываўленых нежывых дзяцей не зносяць — яны, распластаныя, раскінуўшы ногі і рукі ці скурчыўшыся, ляжаць там, дзе дагнала смерць... Хто бліжэй да агароджы, хто далей... Ля іх, над імі — рояцца мухі...

У нецярплівым, аднастайным чаканні ён, Антон, не адразу здагадваецца, што адбылося нешта незвычайнае, бо ўсе раптам паварочваюцца, глядзяць кудысьці ў адзін бок, быццам пазастывалі, нават на сваіх «мам» забыліся. Ён, Антон, таксама павярнуўся, паглядзеў у той бок, куды ўсе глядзелі. І вачам сваім не паверыў — крадучыся між нежывых дзяцей, паўзком, то застываючы, быццам і сам нежывы, то зноў крадучыся, набліжаецца да агароджы яго равеснік. Ён босы, да пояса голы, без кашулькі, у палатняных штоніках, белагаловы, даўно не стрыжаны. Вось ён дабраўся да калючага дроту, падлез пад яго, пачаў хутка-хутка грэбацца... І... На волі!

Аж дых перахапіла Антону: «Няўжо так лёгка! А ён...»

...Тое, што адбылося далей,— вечная незагойная рана, балючы ўспамін...

...Немец-ахоўнік спускае са шворкі сабаку. Сабака кідаецца ззаду на хлапчука, валіць яго. Хвіліна-другая — і ад жывога белагаловага хлапчука астаецца на полі крывавая пляма...

...«Няўжо той салдат і быў Паўль Закс?»

Павярнуў галаву, зноў паглядзеў на спадарожніка, нават прымераў быў, уявіў, як бы сядзела на ім каска, як глядзеўся б з тым сабакам-ваўкадавам, што разарваў уцекача-хлапчука...

«Не, відаць больш да твару яму была б круглая, выгнутая шапка з какардаю. Шапка афіцэра...»

...Яны — і дзеці, і дарослыя,— акружаныя з усіх бакоў немцамі-карнікамі, стаяць у сваёй вёсцы, каля сельсавета, які з прыходам немцаў стаў называцца воласцю. Чакаюць. Чаго — ніхто не ведае. Божкаюць, уздыхаюць, хрысцяцца... Дзеці, як заўсёды,— румзаюць, плачуць... Раптам на ганак сельсавета-воласці выходзіць нямецкі афіцэр, за ім — цэлая світа немцаў. Афіцэр, ружовашчокі, паўнаваты, каверкаючы рускія словы, блытаючы іх з нямецкімі, аб'яўляе, што вёска Заброддзе, будзе спалена...

— А як жа мы? — не вытрымлівае нехта, выдыхае з сябе, пытае.

І тады афіцэр тлумачыць, што яны, немцы,— гуманныя людзі, што людзей яны выведуць з вёскі ў бяспечнае месца. Тыя, хто можа ісці,— пойдуць самі. Тыя ж, хто хворы, стары ці ў каго малыя дзеці — могуць астацца, сабрацца ля школы, іх забяруць, падвязуць на машынах...

Чамусьці яго, Антонавай, маці здаецца, што будзе лепш, калі яны ўсёй сваёй сям'ёй паедуць на машынах.

— А то куды ж мы з малымі дзецьмі дойдзем? Ніхто ж не ведае, колькі кіламетраў давядзецца ісці. Можа, дзесяць, а можа, і ўсе сто? — кажа яна бацьку, пераконвае яго, бо і сам ён ледзь на нагах стаіць — вярнуўся толькі што згаладалы і стомлены з палону — уцёк.

Бацька не верыць немцам, ён спазнаў, добра спазнаў іх дабрыню. Але, хоць і неахвотна, слухаецца маці — бярэ самых меншых дваіх на рукі і ідзе, кіруецца да школы. Антон з маці спяшаюцца ўслед за ім.

Ля школы ўжо сабраліся старыя, дзяды і бабы, хто з малымі дзецьмі — унукамі і ўнучкамі, хто з рознымі вузламі — пасцелямі, падушкамі, торбамі. Там і аднаногі Тадэвуш, там і амаль сляпая Сахвейка, там і Кандрат, што зваліўся з дуба, калі лазіў браць слепет, і разбіўся, іншыя бацькавы, матчыны знаёмыя...

Афіцэр — той, што стаяў на ганку сельсаветаволасці, прыдзірліва ўсіх аглядае, правярае, каго можна пакідаць ехаць на машынах, а каго — не. Чарга даходзіць і да іхняй сям'і.

— А ты куды? — пытае афіцэр у бацькі.

Бацька нешта спрабуе тлумачыць.

Афіцэр слухае бацьку, потым раптам ні з таго ні з сяго падымае арапнік-бізун і пачынае ім хвастаць бацьку. Па чым папала — плячах, галаве, руках...

— А пешкі, а пешкі! — крычыць ён, і з рота ў яго скача пена.

— А мне з дзецьмі, можна-а? — пытае скрозь плач, галашэнне маці.

— Дзяцей як хочаце, а самі пешкі, пешкі! — крычыць маці немец у чорным, што чагосьці стаіць разам з іншымі тут жа, ля школы.

Але ні маці, ні бацька адных дзяцей пакідаць на машыны не хочуць. Ды і дзеці аставацца таксама без бацькоў... Нізашто!..

І хоць бацьку давялося яшчэ атрымаць з дзесятак лішніх арапнікаў-бізуноў, ён усё ж забірае дзяцей, кідаецца даганяць тых аднавяскоўцаў, каго пагналі ўжо немцы на грэблю...

...Многа-многа разоў бачыў Антон бацьку, і добрага, ласкавага, і змрочнага, разгневанага, але таго, якога бачыў там, ля школы,— ніколі не забудзе... Бо быў бацька тады ўзбуджаны, злосны, як, можа, ніколі, і на маці, якая збіла яго з панталыку, паверыла немцам, і на немца-афіцэра, што хвастаў яго арапнікам-бізуном. Вочы ў бацькі гарэлі, а твар... Твар быў у крывавых падцёках і сіняках, пасеча-

ны ўвесь, толькі вочы цэлыя,— іх закрываў бацька рукамі, калі немец-афіцэр хвастаў арапнікам-бізуном...

...Усё жыццё ўспамінаў бацька немца-афіцэра...

Людзі ж, што паверылі карнікам, асталіся чакаць машын,— згарэлі ў школе. Іх, як потым даведаліся, упіхнулі ў дзверы і жывых падпалілі...

«А можа, і не афіцэрам у вайну Паўль Закс быў, а... паліцэйскім? — вёў свае думкі-здагадкі Антон Шатуневіч.— І служыў ён не ў арміі, а ў паліцыі? Каска паліцэйскага яму б...— паглядваў на Паўля Закса Антон непрыкметна, крадком, як бы прымяраў,— да твару была б, падышла б, мабыць, куды лепш, чым кепачка-венгерка. У ёй ён быў бы, бадай што, рыхтык той бамбіза-паліцэйскі, што неяк прыязджаў нечага шукаць на панскую ферму, капаўся ў матрацах і падушках... Здаецца, тое ў нядзелю было, бо чамусьці мама дома была, не на рабоце. А можа, яна хварэла?..»

...Прыехаў паліцэйскі на веласіпедзе. У касцыстаўбуне, абцягнуты, пераплецены ўвесь рознымі папругамі і рамянямі, з пісталетам у блішчастай чорнай кабуры, у высокіх, з абцасамі, ботах. Веласіпед прыткнуў да сцяны, а сам, нешта мармычучы, напяваючы сабе пад нос, паволі пайшоў, падаўся ў барак.

Яны, дзеці, усе, хто гуляў тады ў двары, насцярожаныя, напалоханыя прыездам паліцэйскага, таксама падаліся ўслед за ім у барак. Стаялі збоку і глядзелі, як ён дужы, рослы, усё гэтак жа мармычучы, напяваючы нешта сабе пад нос, шукаў нечага, пераварочваючы матрацы і падушкі, вытрасаючы ўсё, што толькі было ў чамаданах і тумбачках, на падлогу. Вось ён дайшоў да таго ложка, дзе ляжала, мусіць, спала маці, і гаркнуў так, што тая ўсхапілася з пасцелі, стала босая на падлогу, з жахам паглядзела на незнаёмага мужчыну-паліцэйскага. І, быццам пра нешта здагадаўшыся, успомніўшы, выхапіла з-пад падушкі палатняны мяшэчак. Немец-паліцэйскі працягнуў руку, хацеў забраць, вырваць мяшэчак з рук, але маці не давала. Немец, раззлаваўшыся, піхнуў маці. Яна ўпала

і, ударыўшыся аб ножку ложка, разбіла сабе лоб. Лінула кроў...

Але маці не разгубілася — падхапіўшыся на ногі, кінулася, не выпускаючы з рук мяшэчка, уцякаць. За ёю кінуліся ўцякаць, бегчы і яны, дзеці. Хто куды, хто ў сад, хто ў хлявы...

...У мяшэчку, як потым Антон даведаўся, было некалькі прыгаршчаў пшаніцы, якія маці ўкрала, прынесла, каб падкарміць іх, дзяцей, калі працавала ў полі, на малацьбе.

...Крадком, адным краёчкам вачэй Антон яшчэ раз паглядзеў на Паўля Закса — ён гэта тады быў ці не ён?

«Відаць, усё ж не ён... У таго нос быў з гарбінкай і вочы нейкія як у жабы — навыкаце. І ростам той быў куды большы. Дый чаму я ўвесь час так дрэнна думаю пра Паўля Закса? Ён жа пісьменнік. А пісьменнікі... Хіба б бываюць пісьменнікі дрэнныя людзі?»

«Пісьменнікам ён і потым мог стаць. Пасля вайны ўжо... Дый... Сярод пісьменнікаў таксама розныя людзі ёсць. Былі ж і такія, хто з Гітлерам, фашыстамі супрацоўнічаў... Цікава было б пачытаць ці хоць бы даведацца, што ён, гэты Паўль Закс, і пра каго піша? Хіба, можа... Спытаць?»

«У каго спытаць?»

«У яго самога. А не — у Элізабет Айх ці... у Генрыха Штоля. Бо сам ён... Можа, не сказаць. Ды і неразгаворлівы ён нейкі. Маўчыць і маўчыць. А можа, і перакладчыца, Марыя Іванаўна, што-кольвечы пра яго ведае? Як-ніяк, яна ж разам з усімі імі правяла ўжо некалькі дзён. І ў Ленінградзе была, і тут у нас, у Беларусі, другі ўжо дзень. Трэба будзе спытаць у яе. Бо як жа гэта... Быць з чалавекам і не ведаць, хто ён. Вось як спынімся дзе-небудзь, выйдзем, дык і спытаю. Не прывык быць я побач з людзьмі, якія нічога не гавораць, маўчаць. Маўчальнікі — не лепшыя людзі, асабліва ў дарозе. Хоць, бывае, калі і балбатун трапіцца...»

Павярнуўся да шафёра, сказаў:

— Сцяпан Кандратавіч, можа б, спыніцца нам дзе? А то едзем і едзем? Ногі хоць разамнём...

— Давайце спынімся,— лёгка згадзіўся Сцяпан Кандратавіч.— Але, як на маю галаву, дык найлепей спыніцца ля «Партызанскага бору». Можа, хто што вып'е ці перакусіць. Да «Партызанскага бору» асталося якіх пяць-сем хвілін язды...

— А што такое «Партызанскі бор»? — адарваўся ад акна, спытыў раптам' Паўль Закс.

— Гэта рэстаран,— сказаў, патлумачыў яму Антон Шатуневіч, нямала здзівіўшыся: «Не перакладаў жа ніхто нашай размовы з Сцяпанам Кандратавічам. Адкуль ён, немец, даведаўся, пра што мы гаварылі? Няўжо мову нашу ведае?»

— Наогул, не люблю я, калі ў такіх месцах, як Хатынь, ставяць нешта падобнае на кафэ ці рэстараны,— сказаў Антон Шатуневіч па-нямецку.

— І я не люблю,— расплюшчыла вочы, ачуўшыся ад думак ці дрымоты, згадзілася з Антонам Элізабет Айх.

— Але гаспадарнікі глядзяць на ўсё па-свойму. Дый перакусіць чалавеку ці што-небудзь выпіць.

— Тут можна выпіць? — ажывіўся, спытаў зноў Паўль Закс.

— Вядома. А вы што б хацелі? Калі вады...— пачаў дапытвацца Антон, бо вада была ў іх у машыне — мінеральная «Мінская» і баржом.

— Не, я хацеў бы выпіць пяцьдзесят грам рускай гарэлкі,— сказаў, адчаканіў Паўль Закс.

— То гэта можна,— рады, што нарэшце загаварыў маўчальнік-спадарожнік, сказаў Антон.

І калі наперадзе мільганула памяшканне рэстарана, загадаў шаферу спыніцца.

— Хто яшчэ хоча чаго-небудзь выпіць ці перакусіць? — спытаў Антон у Генрыха Штоля і ў Марыі Іванаўны, калі спынілася іх машына і яны выйшлі на абочыну дарогі, далучыліся да кампаніі.

Але ні Генрых Штоль, ні Марыя Іванаўна не хацелі ісці ў рэстаран, адмовіліся.

— Тады хіба я вас правяду,— паглядзеў на Паўля Закса Антон Шатуневіч.

— Не, не трэба. Я сам,— сказаў Паўль Закс і паволі пайшоў да «Партызанскага бору», быццам нават трохі накульгваючы, на што толькі цяпер звярнуў увагу Антон.

— Ён што, кульгае? — спытаў Антон, гледзячы, як ідзе, прыпадае на левую нагу, падымаючыся па сходках, кіруецца да ўвахода ў рэстаран Паўль Закс.

— Так,— кіўнуў Генрых Штоль.— У яго пратэз.

— Пратэз? — здзівіўся Антон.— Дык ён што, ваяваў?

— Ваяваў,— пацвердзіў Генрых Штоль.

— І дзе — вы не ведаеце? На Усходнім ці Заходнім фронце?

— Ён кажа, на Заходнім. Але мне думаецца, што не, не на Заходнім. Дапускаю, што прыехаў ён сюды нагу сваю шукаць...— хіхікнуў Генрых Штоль.

— Чакайце! — апомніўся нарэшце Антон і паглядзеў на Марыю Іванаўну.— Як жа мы яго аднаго пусцілі?..

— А што? — ускінула непаразумела свае чорныя бровы на Антона Марыя Іванаўна.

— Ён...— быццам толькі цяпер успомніўшы размову з шафёрам, якую без перакладу зразумеў Паўль Закс, аж запнуўся Антон Шатуневіч.— Рускую мову хіба ведае?

— Ведае,— заўсміхалася, паказала свае надзіва белыя і роўныя зубы Марыя Іванаўна.

— Чаму ж ён маўчыць, не прызнаецца?

— ? — паціснула плячыма Марыя Іванаўна.— Калі ён так робіць, значыцца, ведае чаму. Яму відней.

— Што такое? — паглядзеў разгублена на Антона і Марыю Іванаўну Генрых Штоль.

— Нічога,— супакоіла яго Марыя Іванаўна.— Проста мы высвятляем з Антонам Змітравічам некаторыя дэталі.

— А-а,— кіўнуў бародкаю Генрых Штоль.— Бывае. А што да Паўля Закса... Учора, пасля сустрэчы ў Саюзе пісьменнікаў, у мяне з ім не вельмі прыемная размова была. Нельга так, як ён, навязваць усім свае погляды. Але не звяртайце на яго ўвагі. Ён старэйшы, ён ваяваў. Мы таксама былі падпалі пад яго ўплыў. І ў Ленінградзе, і спярша тут... Але паглядзелі — людзі да нас усюды ставяцца шчыра, вы такія ж, як і мы. І вы, і мы хочам міру, хочам ведаць лепш адзін аднаго. І няхай не з усім мы можам згаджацца, няхай розныя ў нас погляды на некаторыя рэчы і падзеі, у адным мы сходзімся цалкам — вайна ні вам, ні нам не трэба. І давайце рабіць усё, каб яе не было.

— І я так думаю,— зноў заклепала вейкамі, пачырванела, заўсміхалася Элізабет Айх.— У нас у Германіі не кожны падзяляе нашы погляды. У кожнага чалавека свая галава і свой розум. Нават з бацькам, з маці і то бываюць непаразуменні, разыходжанні. А мы ж... Жывём у краінах з рознай палітычнай сістэмай, кожны з нас рознае бачыў і ведае. Ды мы ж яшчэ і пісьменнікі...

— Дарэчы, што піша Паўль Закс, наогул, што за пісьменнік ён? — спытаў Антон Шатуневіч.

— Адносны,— паморшчыўся, скрывіўся Генрых Штоль.— Ён мае сваю ферму, ну і... піша. У нас можна выдаваць усё, што хочаш. Добрым, цікавым пісьменнікам

выдаўцы плацяць грошы, астатнія выдаюць свае творы самі за свае грошы. Паўль Закс з апошніх. А піша... Пра рознае ён піша. Але, відаць, не пра тое, чым жыве, што ў яго на душы. Хутчэй за ўсё — каб схаваць, што яго мучыць.

— А як ён — да пагрозы новай вайны?

— Мне здаецца, што яго гэтае пытанне хвалюе. Нешта ў яго было такое, што не дае яму спакою. Баюся гаварыць, бо і сам ён нічога не гаворыць, не прызнаецца.

А Элізабет Айх дадала:

— Мяркуючы па яго паводзінах, ён сёе-тое зразумеў, прыехаўшы сюды. Во ўсякім разе, ён не навязвае сёння нікому сваіх поглядаў. Маўчыць... Хоць... Хто ведае, што ў яго ў галаве...

З «Партызанскага бору» выйшаў сам Паўль Закс, і размова пра яго сціхла. Моўчкі, здаецца, яшчэ больш засяроджаны, як быў дагэтуль, ён, насунуўшы на самыя вочы казырок кепачкі-венгеркі, папраставаў да машыны, адчыніў дзверцы і зноў сеў на сваё месца.

— Ну, што ж, і мы будзем сядаць... Паедзем,— сказаў да сваіх спадарожнікаў Антон Шатуневіч і таксама пайшоў да машыны.

Ад «Партызанскага бору» да Хатыні — пяць кіламетраў. І заўсёды, калі б ні праязджаў іх Антон Шатуневіч, ён думаў пра вёскі і людзей, што былі знішчаны, спалены ў вайну. А іх, тых вёсак, тых людзей... Хто лічыў, дый нават каб хацеў, ці злічыў бы, ці злічыш... Толькі ў адной Беларусі іх...

Звычайна Антон Шатуневіч гэтыя лічбы паўтараў у памяці сам сабе, моўчкі. Але сёння, можа, таму, што разам з ім у машыне былі госці, пісьменнікі, чамусьці захацелася назваць гэтыя лічбы ўголас.

«Няхай ведаюць!» — падумаў Антон.

Павярнуўшыся тварам да Элізабет Айх, ён сказаў, але так, каб кожнае яго слова чуў і Паўль Закс:

— Усяго за гады вайны ў Беларусі было разбурана і спалена больш за дзевяць тысяч вёсак...

— З людзьмі? — спытала з жахам у голасе Элізабет Айх.

— Цалкам з людзьмі было спалена шэсцьсот дваццаць сем. З часткай насельніцтва — чатыры тысячы дзвесце пяцьдзесят восем. Некаторыя вёскі так і не адноўлены, не вернуты да жыцця і сёння...

— А людзей колькі? Колькі людзей загінула?

— Людзей... У Беларусі загінуў кожны чацвёрты яе жыхар. У лічбах — гэта два мільёны дзвесце трыццаць тысяч чалавек. З іх мірнага, ні ў чым не вінаватага насельніцтва — каля паўтара мільёна. Прыкладна чатырыста тысяч чалавек было вывезена з родных мясцін у фашысцкае рабства, у Германію. І Хатынь у нас не проста вёска, якую спалілі разам з яе жыхарамі карнікі, а помнік усім спаленым, знішчаным у Беларусі вёскам і жыхарам. Для нас гэта — сімвал, жывая памяць, напамінак пра тое, што рабілі фашысты, акупіраваўшы нашу рэспубліку...

Антон Шатуневіч памаўчаў, як бы перадыхнуў:

— Я магу назваць вам і іншыя лічбы,— сказаў ён праз хвіліну.— Напрыклад, было разбурана, спалена больш за адзін мільён дзвесце тысяч пабудоў, дзвесце дзевяць гарадоў і раённых цэнтраў, дзесяць тысяч прамысловых прадпрыемстваў, разбураны і абрабаваны ўсе навуковыя ўстановы, бібліятэкі, музеі... Была амаль сцёрта з зямлі сталіца нашай рэспублікі — горад Мінск... Ды і ўсе абласныя цэнтры... Так што... Што такое вайна, Гітлер, фашызм — мы ведаем! Добра ведаем! І не забудзем. Ніколі не забудзем!

Апусціў галаву, і ў вачах зноў тая грэбля, па якой гналі яго, хлапчука, у фашысцкае рабства карнікі, чорны слуп дыму і агню, што падняўся, зашугаў над роднаю вёскаю, закрыў неба і сонца... Не, не, перш чым слуп дыму і агню, былі насцярожаныя, нясмелыя крыкі, уздыхі:

— Азірніся, глянь!..

— Ах!

— Сяло наша гарыць!

І спыніліся ўсе, застыў натоўп. Пачуліся божканне, галашэнне. Аж падалі, валіліся некаторыя з ног, раўлі, прычыталі, як па нябожчыку, быццам хавалі каго, не ўяўлялі, як жыць далей...

Карнікі наляцелі знянацку, пачалі хвастаць, біць людзей бізунамі, прыкладамі, страляць... Але гэта не памагло — людзі як ураслі ў зямлю: не зрушваліся з месца. І тады карнікі спусцілі са шворак сабак...

...Падняў галаву, страсянуў ёю, каб прагнаць страшны прывід, той успамін, уяву. Сказаў, пазіраючы наперад, на надпіс, што раптам вынырнуў з-за павароту:

— Вось і Хатынь. Мы прыехалі, куды цяпер прыязджаюць і прыходзяць тысячы, мільёны людзей...

Хатынь... Звоняць і звоняць, быццам перамаўляюцца між сабою, званы, што пастаўлены на месцы былых селішчаў. Ідуць і ідуць бясконцым суцэльным патокам людзі. Старыя, маладыя, дзеці — тыя, хто бачыў, перажыў вайну, і тыя, хто пра яе ведае толькі з кінафільмаў, кніг, успамінаў бацькоў, дзядоў і бабуль. Хто з кветкамі ў руках, хто проста так, схіліўшы ў паклоне журботную, сумную галаву. І ў кожнага ажывае сваё, тое, што бачыў, перажыў ці пачуў, што ведае пра вайну.

Ажыло тое ўсё зноў — каторы ўжо раз! — і ў памяці Антона Шатуневіча. Ды так, што спярша і не заўважыў, хто ідзе поплеч з ім пакланіцца светлай памяці тых, хто ніколі ўжо не падымецца, не ўбачыць ні высокага, светлага неба, ні зеляніны лесу, якую дзе-нідзе прыхапіла ўжо жаўталістая восень, ні свайго поля, ні сваёй вёскі — згарэў у пякельным полымі вайны. А калі апомніўся — убачыў: ідуць, не адстаюць ні на крок, уважліва да ўсяго прыглядаючыся, чытаючы і перакладаючы надпісы. Марыя Літвінка, Генрых Штоль, Элізабет Айх.

— А дзе Паўль Закс? — як бы спахапіўся Антон Шатуневіч.

— Ён там, астаўся ў машыне,— кіўнуў, паказаў галавою на стаянку, дзе асталіся стаяць машыны, Генрых Штоль.

— Як? — здзівіўся Антон.— Яму не захацелася пабыць тут разам з усімі намі?

— Што вы! Ён намагаўся, каб не ехаць зусім сюды. Ды мы настоялі. Я думаю, ці не паліў ён сам у вайну людзей. І, можа, іх крыкі, іх боль ажылі ў яго памяці... Бачыце, гарэлкі выпіў, няйнакш меркаваў — лягчэй будзе. Аж яно, відаць, наадварот,— выказала сваё меркаванне Элізабет Айх.

— Гэта, урэшце, яго справа,— сказаў, зноў узяўшы сябе, наколькі мог, у рукі, Антон Шатуневіч і, апусціўшы яшчэ ніжэй галаву, пайшоў і пайшоў далей па свяшчэннай зямлі Хатыні. І ўяўлялася яму: гэта ідзе ён не па Хатыні, а па сваім Заброддзі, па ўсёй сваёй шматпакутнай беларускай зямлі,— як вярталіся з чужыны на Радзіму, то ўсюды, куды ні кінь вокам, куды ні паглядзі — гэтак жа на месцы вёсак, людскіх селішчаў і хат тырчалі каміны напаўразбураных печышчаў...

Марыя Літвінка, Генрых Штоль і Элізабет Айх не адставалі ад Антона Шатуневіча, ішлі і ішлі, толькі прыпыняючыся зрэдку, каб прачытаць тыя надпісы, што, здаецца, аж білі ў вочы, гаварылі больш, чым можа сказаць звычайная чалавечая мова.

Званілі і званілі, аддаючыся болем у сэрцы, званы Хатыні, напаміналі ўсім жывым пра тую жахлівую трагедыю, што адбывалася ў гады фашызму і не толькі тут, а па ўсёй беларускай зямлі, па ўсёй Еўропе...

Вяртацца з Хатыні назад у Мінск разам з пісьменнікамі з Заходняй Германіі Антон Шатуневіч не захацеў. Надта ж развярэдзіў былыя раны, рупіла пабыць аднаму, многае згадаць, яшчэ і яшчэ перабраць у памяці. Таму, пасадзіўшы гасцей у адну машыну, ён, нават не паглядзеўшы на Паўля Закса, каб не падаваць, не ціснуць рук, сказаў усім агульнае: «Аўфвідэрзэен» — і пайшоў, сеў у сваю машыну.

— Ну, як яны, немцы? — спытаў у Антона Шатуневіча шафёр, Сцяпан Кандратавіч.— Ці не казалі, што Хатынь — гэта таксама прапаганда?

— Не,— адмоўна пакруціў галавою Антон.— Ды што нам яны, гэтыя немцы... У нас свае рахункі з вайною, у кожнага сваё гора, свае раны... Ды і Хатынь мы пакінулі... Для сябе, для ўсіх сумленных людзей свету — помніце пра фашызм, не рабіце таго, што тыя рабілі...

— Тут, са мной, немчык гэты, Паўль Закс, аставаўся. Аказваецца, ён мову нашу ведае. Разгаварыўся, прызнаўся, што ваяваў у нас. Я спытаў: ці не паліў і ён людзей, як гэта рабілі яго сародзічы? Ну, не тут, у Хатыні, дык, скажам, у іншым месцы? «Не,— кажа,— людзей не паліў, а вось у лес на партызан хадзіў». І ведаеш, лепш бы ён маўчаў, не гаварыў пра тое. Бо ўспомніў я,як на нас напалі аднойчы... Вясною, снег ужо раставаў. Кажушок мой намок, дык я, каб лягчэй было ўцякаць, кінуў яго. А яны з гармат, мінамётаў па нас... Лёньку Хадасейчыка, лепшага сябра майго, забіла. Ды як — галаву адарвала. І я поўз, цягнучы нежывога Лёньку... У адной руцэ ён сам, вінтоўка. А ў другой — галава...

І, сціснуўшы кулак, Сцяпан Кандратавіч затрос раптам ім у паветры:

— Дзе ім, прыблудам, зразумець нас, нашы раны, боль!

І паваліўся грудзьмі на руль. Заплакаў, зарыдаў...

*1983 г.*

# Забытыя селішчы

Яны, гэтыя забытыя, пакінутыя людзьмі селішчы, пэўна, ёсць у кожнай вёсцы. Ёсць яны і там, дзе я нарадзіўся, жыў. Адно — у лесе, яно зарасло ўжо кустамі, дрэвамі; другое — на астраўку балота (балота тое даўно асушана, разворана, на ім буяюць бульба, каноплі, авёс); астатнія — ля невялікай рачулкі па дарозе ў вёску і ў самой вёсцы — там яшчэ і цяпер дзе-нідзе знаць сляды колішняга людскога жытла: рачкаватая груша-дзічка, касабокая, хілая сліва, камень, які, можа быць, вельмі ж патрэбны быў чалавеку, бо служыў гаспадару і гаспадыні, памагаў ім жыць, кавалак бітае цэглы, пачарнелы трухлявы аскабалак бервяна... І я, калі б і з якіх бы — блізкіх ці далёкіх — дарог ні вяртаўся дадому, у сваю вёску, не магу, каб не спыніцца, не пастаяць ля гэтых забытых, пакінутых людзьмі селішчаў, не ўспомніць, не згадаць таго, што чуў, бачыў сам у маленстве...

## Япрукі

З Рудзенькай — калісьці невялікай, хат на дваццаць, вёсачкай — надта ж многае мяне звязвае. Пачну хоць бы з таго, што ў Рудзеньцы прайшлі дзяцінства і юнацтва маёй маці. Вунь там, дзе зелянее, чупрыніцца расахатая, абсмаленая з камля прысадзістая груша-дзічка, не так, здаецца, і даўно, яшчэ на маёй памяці, стаяла, прыпадаючы нізкаю чаратоваю страхою ледзь не да самай зямлі, хата, у якую прывёз жыць маю маці разам з яе мамаю — новаю сваёй жонкай удавец Міхей Кудрыцкі. У Міхея Кудрыцкага было шэсцера дзяцей, ён доўга шукаў жанчыну, якая б згадзілася іх дагледзець. І знайшоў аж у Бабчыне — далёкай палявой вёсцы — маці маёй маці, якая перад гэтым нечакана аўдавела і не ведала, да каго прыхінуць галаву. Тады тут, у Рудзеньцы, камандаваў усім і ўсімі Антон Япрук. Яму належалі лепшае поле, лепшыя лугі і пашы, вадзяны млын і вялізная, на некалькі сот вуллёў, пасека. Пра кароў, коней, авечак, свіней, гусей, качак,

курэй і цяпер мая маці як згадае — жахаецца: навошта адной сям'і ўсяго столькі — чароды, поўныя хлявы, кашары!.. Многія рвалі жылле на Япрука, гнуў на яго спіну, хоць лічыўся лесніком, і Міхей Кудрыцкі. Працавала на яго падлеткам — танканогай былінкаю-дзяўчынкаю — і мая маці. Праўда, нядоўга, бо новае, савецкае жыццё ішло, наступала і ў гэты глухі балотны край. Калі навокал усюды ў вёсках пачалі ўтварацца калгасы, пра калектывізацыю загаварылі і ў Рудзеньцы. Вядома, загаварылі беднякі, тыя, хто гадамі гнуў спіну, ірваў жылле на Антона Япрука, а найперш Міхей Кудрыцкі. Больш таго — Міхей Кудрыцкі неўзабаве стаў як бы завадатарам, адным з арганізатараў беднаты. Склікалі сход... Выступілі тыя, хто хацеў калгаса, выступілі і тыя, хто калгаса не хацеў. Сярод апошніх быў Антон Япрук і яшчэ два-тры чалавекі, якіх ён, няйнакш, нечым падкупіў ці нешта ім паабяцаў. Прадстаўнік з раёна, які быў на сходзе, патлумачыў, што такое калектывізацыя і што значыць жыць і працаваць калектыўна, напомніў пра раскулачванне і што робіць Савецкая ўлада з такімі, хто супраціўляецца, спрабуе пагражаць... Пайшоўшы назаўтра, як заўсёды, на агляд абходу, не вярнуўся дадому, у сваю хату, ляснік Міхей Кудрыцкі. Яго знайшлі дні праз тры мёртвага. Знайшлі ў лесе мёртвымі і яшчэ двух мужчын, якія надта ж рашуча выступалі за калектывізацыю... Прыехала міліцыя, пачалося следства, допыты. Падазрэнне падала на аднаго чалавека — Антона Япрука. Пайшлі да яго ў хату. Але, як ні шукалі, не знайшлі. Прыязджала міліцыя і назаўтра, і паслязаўтра, і яшчэ некалькі разоў, каб заарыштаваць, забраць з сабою Антона Япрука. Але кожны раз ён паспяваў схавацца, знікнуць, усё адно як скрозь зямлю праваліцца. Быў, хадзіў па вёсцы, па сваім двары, распараджаўся, а як толькі з'яўлялася міліцыя, дзе і дзяваўся. Пра калгас ніхто ўжо не заводзіў і размовы, ведалі, што будзе з тымі, хто асмеліцца ўступіць у яго.

Бачачы, што так проста Антона Япрука заарыштаваць не ўдасца, міліцыя пачала хітраваць. Прыедзе ў вёску, зойдзе на падворак, у хату да Антона і, не знайшоўшы таго, хто ёй трэба, паедзе. І праз гадзіну вернецца. А то разоў колькі аблаву ноччу наладжвалі. Дзіўна проста было — пасцель паслана, спаў дома Антон. Ці за сталом сядзеў — вячэраў. А ўрываліся ў двор, у хату — не было Антона. І на гарышча лазілі, і ў склеп, і пад печ — нідзе яго не знаходзілі...

Гады ці не тры лавіла міліцыя Антона Япрука. Але так і не злавіла. Праўда, і ён «ласку» міліцыі нарэшце зрабіў — сышоў недзе з тутэйшых мясцін, пакінуўшы дома жонку з сынам...

З'явіўся Антон зноў у вёсцы ўжо ў вайну, а дакладней, ён нікуда і не сыходзіў, проста хаваўся, перастаў на вочы людзям паказвацца. Прыйшлі ў вёску немцы — ён і вылез са сваёй схованкі, зноў зажыў так, як хацеў. Ну і паплакалі ж, папамучыліся тыя, хто хадзіў раскулачваць Япрукоў, хто хоць што-небудзь забіраў з яго двара! Ды і не толькі яны, бо Антон Япрук стаў начальнікам паліцыі, у якую ўцягнуў і сына свайго Пятра. Ускінуўшы на плечы вінтоўкі, шныпарылі яны ўдвух з ранку да вечара па вёсцы, у каго чагосьці шукалі, у каго штосьці забіралі, з кім за штосьці зводзілі рахункі — здзекаваліся: білі шампаламі, паролі штыкамі...

Разбой Япрукоў стаў вядомы тым, хто быў у лесе. Некалькі разоў рабілі яны напады ўночы на добраахвотных памагатых акупантаў, але зноў жа — злавіць іх ніяк не маглі...

Недзе ў сорак трэцім годзе, пад восень, немцы спапялілі вёску, дзе я нарадзіўся і жыў; спапялілі яны і многія іншыя вёскі, сярод іх і самую блізкую ад нас Рудзеньку. З усіх пабудоў, як пасля стала вядома, у Рудзеньцы ацалела хіба толькі сядзіба верных служак фашыстаў Япрукоў...

Калі мы вярнуліся з выгнання — з Нямеччыны, не пазнаць было ні нашай, ні іншых вёсак. Помню, прыйшоў я ў Рудзеньку і не паверыў, што тут калісьці вёска была, людзі жылі. Нідзе ж нічога! Няма той каланчы, што падымалася на пагорку каля дарогі і з якой назіралі, ці не здарыўся, не ўкінуўся дзе-небудзь пажар; няма таго драўлянага, пасланага з тонкіх бярвенцаў моста, з якога заўсёды, калі праязджала падвода, чуўся вясёлы, дробны перастук колаў — быццам бульбу ссыпалі на памост; не было і затравелай, парослай муравой вуліцы, усцяж якой стаялі, настаўленыя ўгору, жураўлі калодзежаў, платы, хаты, не было і саміх калодзежаў, платоў, хат... Сіратліва тырчалі толькі дзе-нідзе абкуродымленыя, напаўразваленыя, з разбуранымі камінамі печы ды зелянелі абгарэлыя, здзічэлыя рэшткі калісьці раскошных, багатых садоў. Гэтыя рэшткі былога людскога дастатку і прыцягнулі ў Рудзеньку мяне ды і іншых людзей. Мы рвалі і насілі дадому яблыкі, слівы, грушы, а потым, калі заасянела, пачалі і выкопваць маладзейшыя дрэўцы, перасаджваць іх у свае сады, бо ў Ру-

дзеньцы ніхто не сяліўся, ніхто не снаваў новых хат. Быццам змовіліся людзі між сабою, адцураліся гэтай вёскі... Стаяла далёка ад дарогі, ля самага лесу, толькі хата Япрукоў. Абгароджаная па-старадаўняму шчыльным высокім парканам, яна нагадвала непрыступную крэпасць. Жыла ў той хаце адна-адзінюсенькая Хвядора — жонка Антона і маці Пятра. На людзі яна не паказвалася, ды і людзі да яе таксама не заходзілі, ні пра што ў яе не пыталі... Жыве старая, ну і няхай жыве... Дзе ж падзеліся самі Япрукі, што з імі здарылася, калі прагналі з нашых мясцін немцаў, ніхто не ведаў. Адны казалі, што яны адступілі разам з акупантамі, другія нешта яшчэ спрабавалі дадаваць, быццам пры адступленні іх дагналі і расстралялі нашы, але дакладна ніхто нічога, можна сказаць, не ведаў. А шкада, бо мінула трохі часу — і ў нашым раёне пачалі спярша пошапкам, як бы баючыся, потым і ўголас гаварыць пра банду, што раптам аб'явілася ў наваколлі. Дзесьці абрабавалі ўночы магазін, забіўшы пры гэтым вартаўніка, дзесьці быў учынены налёт на кашару і былі забраны каровы, а ў Навасёлках, дзе жыў былы камандзір тутэйшага партызанскага атрада, які ў вайну не даваў спакою ні аднаму прыслужніку фашысцкага парадку, быў зроблены напад на яго хату, праўда, самога партызанскага камандзіра дома ў тую ноч не аказалася, начаваў, як потым выявілася, у гасцініцы — быў на нейкай раённай двухдзённай нарадзе...

Міліцыя збілася з ног, імкнучыся вылавіць і абясшкодзіць парушальнікаў людскога спакою. Мабілізавалі грамадскасць — леснікоў, былых партызан і салдат, школьнікаў... На ўсякі выпадак сяму-таму выдалі вінтоўкі, бо бандыты былі ўзброены, і не абы-як. Але, як ні шчыравала міліцыя, вынікі былі не суцяшальныя, каб не сказаць, што іх зусім не было. Удзень бандыты дзесьці спалі, адпачывалі, працу сваю пачыналі, як правіла, уночы. А што ўночы ўбачыш? Ды і не ведаеш жа, дзе бандыты будуць, які новы аб'ект выбралі яны для свайго чарговага разбою? У самыя дзікія, таемныя нетры лесу прабіраліся тыя, хто высочваў бандытаў, намагаючыся знайсці іх стаянку, абшарылі балоты, лазнякі — нідзе нічога ніякага. Выказвалася думка — банда не свая, мясцовая, а прыблудная. Забрыдала аднекуль, рабіла што хацела, і знікала. Звязваліся з абласным начальствам, пыталі, дзе яшчэ пакідала банда хоць якія сляды. Выяўлялася: нідзе, акрамя як у нашым раёне. Значыцца, банда была свая, мясцовая... Тады нехта і

ўспомніў пра Япрукоў — ці не яны гэта «ажылі» раптам?

Зрабілі на ўсякі выпадак налёт у Рудзеньку, на хату Япрукоў. Удзень, калі бандыты, набадзяўшыся за ноч,— перад гэтым быў абрабаваны яшчэ адзін магазін, гэты раз у самім раённым цэнтры, пад бокам у міліцыі,— і... Доўга потым рукамі разводзілі, спрачаліся, хто вінаваты, бо маглі забраць парушальнікаў людскога спакою, што называецца, цёпленькіх... Спалі яны проста ў хаце... І ў тым, што іх не арыштавалі, вінавата была Хвядора — убачыўшы ля двара міліцыю, яна закрычала як рэзаная і кінулася не весніцы адчыняць, а ў сенцы...

Калі міліцыянеры, хто праз паркан, хто, выламаўшы засоў, праз весніцы ўварваліся ў хату, на стале стаялі бутэлькі з-пад выпітай гарэлкі, ляжала недаедзеная закуска, паслана была на падлозе і салома, у якой няйнакш валяліся, спалі бандыты... Усё чысценька агледзелі ў хаце міліцыянеры, пабывалі ў склепе і на гарышчы, але бандытаў не знайшлі. Дапыталі Хвядору — хто быў у хаце, дзе пахаваліся?

Хвядора маўчала, толькі спалохана, злосна зыркала на тых, хто нечакана ўварваўся ў жытло, парушыў звыклы лад жыцця...

Потым, праз некалькі гадоў, калі працаваў у раённай газеце, я сустрэўся з начальнікам міліцыі, які тады кіраваў гэтай ды і іншымі падобнымі аперацыямі па лоўлі бандытаў...

## *РАСКАЗ НАЧАЛЬНІКА МІЛІЦЫІ*

— Так, гэта праўда, я кіраваў аперацыяй па лоўлі бандытаў, на мне ляжалі абавязкі прымаць розныя рашэнні. І вось, уяўляеце, калі мы ўварваліся ў хату і ўбачылі нядаўнія, можна сказаць, свежыя сляды банды, розныя былі думкі, асабліва калі Хвядора адмовілася адказваць на пытанні, наогул гаварыць з намі. Прымяніць сілу, зрабіць усё, каб Хвядора загаварыла? Забраць Хвядору ў райцэнтр, трымаць яе як заложніцу, а тым часам па-належнаму і дапытаць? Я прыняў іншае, нечаканае для многіх, рашэнне. «Ну што ж,— сказаў я Хвядоры,— не хочаце нам нічога гаварыць, не гаварыце! І без вас абыдземся!» І загадаў міліцыянерам пакінуць хату, пакінуць Япрукоў падворак. Вы спытаецеся — чаму? Ды таму, што баяўся — калі забяром старую, банда яшчэ больш жорстка пачне помсціцца, забіваць то аднаго, то другога. Дый Хвядора

быццам прыманка была для банды. А так, без яе, банда і сысці магла куды-небудзь у іншае месца... А гэта... Было непажадана.

Пакінуўшы для нагляду за Рудзенькай некалькі чалавек, я паехаў у раённы цэнтр, звязаўся з вобласцю, папрасіў падмогі. У вобласці мяне зразумелі, відаць, таксама адчувалі, колькі бяды могуць натварыць бандыты, калі іх своечасова не высачыць і не абясшкодзіць. Асаду сядзібы Япрукоў мы трымалі з месяц, з месяц вартавалі ўсе падыходы і адыходы да яе. Чаго мы дамагаліся? Нічога. Больш таго — банда за гэты час зрабіла некалькі нападаў на магазіны. Давялося зняць асаду, зноў паспрабаваць лавіць бандытаў па ўсім раёне. Толькі на гэты раз бандыты аказаліся разумнейшыя за нас — яны не абмежаваліся граніцамі нашага раёна, але пачалі забрыдаць і ў іншыя, суседнія з нашым, словам, поле іх дзейнасці пашырылася. Захвалявалася ўжо і абласное начальства — трэба было прымаць нейкія больш рашучыя захады. Але і бандыты ведалі, што рабіць. Як толькі мы пачыналі варушыцца, падымаць на ногі грамадскасць, яны знікалі, усё адно як у ваду. Было ясна — у бандытаў ёсць надзейная база, ёсць схованка, дзе яны, не баючыся нікога і нічога, адлежваюцца. Няўжо гэтае месца, гэтая схованка Рудзенька, сядзіба Япрукоў?

Зноў і зноў і я сам, ды і іншыя, больш вопытныя за мяне таварышы з вобласці наведваліся ў Рудзеньку. То быццам выпадкова, то заходзілі папіць вады ў хату да Хвядоры, то, аблюбаваўшы патайное месца і замаскіраваўшыся, назіралі за гэтай небяспечнай сядзібай. Некалькі разоў падсылалі пад выглядам выпадковых прахожых сваіх надзейных людзей — жанчын, дзяцей. Хвядора, мабыць, здагадваючыся, чаму раптам да яе пачалі заходзіць людзі — раней жа яе ніхто не турбаваў, ніхто не заходзіў! — паводзіла сябе не зусім ветліва, каго пускала ў двор, каго проста выганяла, асабліва дзяцей, жанчын. Было ясна — банда калі не ў хаце, дык недзе зусім блізка і павінна восьвось наведацца. Акружыўшы з усіх бакоў непрыкметна сядзібу, мы рабілі налёты. І аднойчы зноў ледзь не захапілі банду ў хаце — нават бульбу са стала, лыжкі, міскі не паспела схаваць Хвядора. «Ну, а цяпер што вы нам скажаце?» — запытаў я ў Хвядоры і так паглядзеў ёй у вочы, што яна зніякавела. «Дзе бандыты, куды яны ўцяклі? — дастаў я пісталет.— Ну?»

Але з мае пагрозы зноў жа нічога не выйшла. Не сказала, ні слова не сказала Хвядора.

Хоць і не хацелася мне гэтага рабіць, а ўсё ж давялося забраць Хвядору ў міліцыю. Нават прыстрашыць — маўляў, калі яна не прызнаецца, дзе хаваюцца муж і сын, то і яна будзе прыцягнута да адказнасці як саўдзельніца. Толькі Хвядора, як выявілася, была не жанчына, а крэмень. Нішто на яе не дзейнічала — ні пагрозы, ні добрыя, ласкавыя ўгаворы, ні ўсё іншае, што мы спрабавалі ўжыць. Слова, ні аднаго слова не прамовіла! Толькі злосна, як затраўлены звер, вачыма зыркала, няйнакш гатова была на кожнага, хто з ёю спрабаваў хоць які кантакт навесці, каршуном накінуцца, душыць яго, рукамі, зубамі рваць. Прызнаюся, такіх злосных, дзікіх і апантаных людзей я не бачыў, не сустракаў. Ні да яе, ні пасля. Нават паесці з нашых рук нічога не брала, галадала. Што было рабіць? Параіўшыся з начальствам, мы накіравалі яе ў Мазыр — цэнтр Палескай вобласці, у якую тады ўваходзіў наш раён. «Як жа банда?» Дзіўна, але знікла, і след яе прапаў. Праўда, даходзілі чуткі, што не ўсюды, не ва ўсіх раёнах спакойна, што то ў адной вёсцы, то ў другой рабіліся напады на магазіны і фермы, учыняўся рабунак. Але сказаць з упэўненасцю, што арудуе там тая банда, што дагэтуль арудавала ў нас, у нашым раёне, ніхто не мог. Час быў пасляваенны, неспакойны. Ці мала хто мог рабаваць? Дый паліцаяў не ўсіх тады яшчэ вылавілі, розных прыслужнікаў фашыстаў. Дэзерціры, тыя, хто баяўся фронту, бадзяліся па лясах... Словам, нас не вельмі трывожыла, што недзе за сотню ці дзве кіламетраў ад нашых мясцін абрабавалі магазін ці ферму. Гэта быў клопат тых таварышаў, што працавалі там.

Аднак, як неўзабаве мы пераканаліся, дарэмна мы сябе заспакойвалі. Не мінула і двух месяцаў, як банда зноў аб'явілася ў нашай мясцовасці. І першы, хто мог пацярпець, быў я. Неяк уночы ў акно кватэры, дзе я жыў, пастукалі. Я, прачнуўшыся, выхапіў з-пад падушкі пісталет — а я яго трымаў заўсёды там, калі клаўся спаць! — ціхенька, на пальчыках пакраўся да акна. Было не цёмна, свяціў месяц, якраз поўня, і ў яго святле я ўбачыў трох чалавек, што стаялі ля плота. За плячыма ў іх былі вінтоўкі. Прызнацца, я трохі здзівіўся, не падумаў, што гэта бандыты. Але, на ўсякі выпадак, захінуўся за вушак. І гэта мяне выратавала. Бо, як толькі я спытаў, крыкнуў у акно: «Што трэба?» — грымнуў стрэл. Я не разгубіўся, таксама стрэліў у адказ. Прычым не ў таго чалавека, што хаваўся за сцяною і страляў у мяне, а ў тых траіх, што былі ля плота.

Пасыпалася шкло, у хаце пачаўся пярэпалах. Падхапіліся з пасцелі жонка, дзеці. Закрычалі, заплакалі...

«На падлогу, падайце на падлогу!» — закамандаваў я і ў наступную хвіліну кінуўся ў сенцы. Не-не, не ўцякаць. Наадварот, гнацца, даганяць нечаканых начных прышэльцаў. Бо, хоць было іх чалавек чатыры-пяць, яны, выявілася, былі палахліўцы і пасля майго стрэлу пусціліся наўцёкі. Прычым урассыпную, хто куды. Няйнакш нікому з іх не хацелася атрымаць кулю.

Жыў тады я непадалёку ад міліцыі, у звычайнай драўлянай хаце, абнесенай ад вуліцы дашчанай агароджай. І, выскачыўшы на ганак, я даў яшчэ два-тры стрэлы. І каб напалохаць, паддаць больш пуду тым, хто так нечакана завітаў уночы на падворак, і каб мяне пачуў дзяжурны. Сам жа, збегшы з ганка, кінуўся ў незачыненыя весніцы, на вуліцу.

Не, на вуліцы нікога не было. Не ўбачыў нікога я, вярнуўшыся, і на падворку. Начных гасцей як ветрам здзьмула — разбегліся, уцяклі...

Хвілін праз колькі ў двор ускочыла некалькі міліцыянераў, паднятых па трывозе дзяжурным. Убачыўшы мяне з пісталетам у руках і пабітае ў хаце акно, яны здагадаліся, што здарылася. Запалілі ліхтар, пачалі шукаць слядоў. Але я спыніў гэтую актыўнасць, загадаў спяшацца ўсім у міліцыю. Прызнаюся вам — у мяне ў галаве ўзнікла ідэя, якую я захацеў здзейсніць: сесці на машыну і памчаць у Рудзеньку; і там, зрабіўшы засаду, сустрэць бандытаў.

Зборы ў дарогу занялі менш як паўгадзіны. Дарога таксама не заняла шмат часу, хоць ехалі мы і не запальваючы святла, каб не выдаваць, хто і куды едзе. Ва ўсякім выпадку, мы былі ў Рудзеньцы яшчэ далёка да світання. Залёгшы вакол сядзібы Япрукоў, пачалі чакаць, што будзе далей.

Не буду расказваць вам, як насцярожана, напружваючы слых і зрок, мы там ляжалі і гадзіну, і другую. Раптам у хаце ўспыхнула святло. Мы спярша не паверылі, аж спалохаліся. «Як? Няўжо там хто жыве? А мо... Бандыты там? Але як, кудою яны трапілі ў хату? Мы ж, міліцыя, тут?»

Загадаўшы акружыць з усіх бакоў хату, я, трохі пачакаўшы, рынуўся ў дзверы. Яны былі на замку.

«Эй, хто там! — крыкнуў я.— Адчыняй!»

У хаце пачулася мітусня, святло пагасла.

Да мяне падбеглі яшчэ два міліцыянеры, мы падналеглі

на дзверы, узламалі прабой. Але, калі мы ўварваліся ў хату, там не было ўжо нікога. Хаця сляды прысутнасці людзей былі відаць — на стале стаяла адкаркаваная бутэлька гарэлкі, ляжалі ўспоратыя нажом бляшанкі кансерваў, нарэзаны тоўстымі скібкамі хлеб. Запаліўшы ліхтар, мы пачалі шукаць, як, кудою ўцяклі з хаты людзі. Значыцца, у хату ёсць нейкі патаемны ход. Вось чаму Япрукоў і нельга было злавіць. Ні цяпер, ні ў вайну, ні тады, як праходзіла калектывізацыя. Але дзе, дзе ён, той ход?

І самі мы, і потым вопытныя следчыя не адзін дзень правялі ў Япруковай хаце, шукаючы той патаемны ход. Поўзалі, лазілі пад печ, узрывалі падлогу, выстуквалі, аглядалі сцены. І — проста аж сорамна прызнацца! — нідзе нічога не знаходзілі. Некаторыя з маіх падначаленых тады і пачалі прапаноўваць — спаліць сядзібу Япрукоў і тым самым, маўляў, пакончыць з прысутнасцю банды ў нашым раёне. Быццам логіка і была ў гэтых прапановах. Не будзе ў Япрукоў хаты, не будзе і базы. Сыдзе з раёна банда. Але... Падумаўшы, параіўшыся з сім-тым, мы вырашылі не паліць пакуль што сядзібы. Дый не ў сядзібе справа. Справа ў бандзе. І яе трэба было зліквідаваць — вось галоўная задача.

І мы пачалі шукаць розныя шляхі, як гэта зрабіць. Прапаноў было шмат. Але прынялі адну, самую, як нам здалося, пэўную — заслаць у банду свайго чалавека, які і выдаў бы банду, дапамог бы яе злавіць. Але каго?

Зноў мы пачалі раіцца, шукаць, перабіраць асабовыя справы. І, ведаеце, знайшлі. Быў адзін такі чалавек, які ведаў Япрукоў і якога яны таксама трохі ведалі. Служыў ён у час нямецкай акупацыі ў паліцыі. Вядома, не па сваёй волі, а, калі шчыра прызнацца, па нашым заданні. Яго не судзілі, не арыштоўвалі, як іншых паліцаяў, калі прыйшло вызваленне. Але людзі ёсць людзі. Не маглі многія дараваць яму, што ён быў у паліцыі. Пачалі пісаць у вобласць, у Мінск, Маскву, пагражаць, што заб'юць. Вось і вырашана было — арыштаваць яго. Нават судзіць. А потым ужо зрабіць так, каб з-пад варты ён уцёк... І, вядома ж, трапіў у банду. Не буду ўсяго, як там і што было, расказваць, няхай сам той чалавек раскажа. Ён, той чалавек, цяпер мой намеснік, вядомы вам Іван Архіпавіч Канапелька. Зайдзіце да яго, ён вам лепш за мяне ўсё, што было далей, раскажа...

## *РАСКАЗ ІВАНА АРХІПАВІЧА КАНАПЕЛЬКІ*

— О, што вы ўспомнілі! Даўно тое было, але не, не забылася. Ды і не забудзецца, мусіць. Дзіва што — такое не забываецца, помніцца, ды яшчэ як помніцца! Іншы раз... Э, што казаць... Здаецца ж, нямала ўсяго ўсякага здаралася, перажылося, і раней, калі ў паліцыі я быў, служыў быццам немцам, а на самай справе сваім, тым, хто ў лесе, але тое, апошняе, можна сказаць, урэзалася ў памяць асабліва. Можа, таму, што вайна ўжо скончылася, расслабіўся я, радаваўся, жыць жа астаўся, будучы аж два гады ў пашчы звера. А тут зноў рызыкаваць, ды яшчэ як, як рызыкаваць! Яны ж, гады, ні аднаму майму слову не верылі, сачылі за мною, каб я нікуды без іх не ішоў, нават кроку не зрабіў. А перадаць жа трэба было, што я разведаў, як можна банду захапіць і абяззброіць, прычым каб ніхто з нашых не загінуў. Дый, калі шчыра прызнацца, не хацелася, ой як не хацелася мне трапляць у тую банду... Адмаўляўся, як мог. Але... Разумеў, што калі не пералавіць бандытаў, шмат шкоды нарабіць могуць. Бо ім усё адно ўжо было, ведалі, што іх чакае. Дык вось, паклікалі мяне, сказалі, што і як я павінен зрабіць. І я... Хоць і не хацелася вельмі ж, хоць і адмаўляўся, але... Усё ж згадзіўся. Ноччу, адразу ж пасля суда, як было і ўмоўлена, выдраў акно з рашоткаю і кінуўся ўцякаць. Міліцыя пярэпалаху на ўсё мястэчка нарабіла — страляла, бегала па вуліцах, на машыне, уключыўшы фары, гойсала сюды-туды, мусіць, усіх на ногі падняла, пабудзіла, быццам шукаючы мяне, былога паліцая, што з турмы, з-пад варты, уцёк. Разлік быў такі — каб чутка пра мае ўцёкі па раёне пашыралася і да бандытаў дайшла, каб, калі я да іх траплю, паверылі мне. Без кавалка хлеба, рубля ў кішэні, у адной, можна сказаць, кашулі, ды і той падранай — рабілася ўсё, каб праўдападобна было,— апынуўся я ўночы адзін у лесе. А ўжо жнівень месяц быў, па начах зябка, росна, халаднавата. Куды ісці, дзе тыя сцежкі-дарожкі, па якіх блукаюць бандыты? Ды і хавацца, туляцца дзе, каб людзі не ўбачылі, не ўзяліся добраахвотна памагаць міліцыі злавіць мяне? А я ж казаў вам — жнівень месяц быў, самая што ні ёсць грыбная пара. І лес у гэты час аж кішыць ад людзей. Куды толькі ні забрыдаюць, каб баравіка, апеньку ці абабка знайсці, у кош забраць. Ды ўсё неяк абышлося. І ў першы дзень, і ў другі, і ў трэці... А на чацвёрты дзень, згаладалы, ледзь, можна сказаць, жывы — прастудзіўся быў я да таго

ж, пал у мяне пачаўся, ды такі, што дрыжыкі білі,— трапіў я на след банды. Надвячоркам, калі ляжаў непадалёку ад Рудзенькі, за старым, аброслым мохам вываратнем, пачуў раптам сцішаную мужчынскую гаману. А праз нейкі час убачыў, як з-пад вываратня пачалі вылазіць адзін за адным людзі. Амаль на карачках, з вінтоўкамі, торбамі ў руках. Стары, з чорнаю, пабітаю ўжо сівізной, барадою, Антон Япрук. Такі самы, каратканогі і плячысты, толькі без барады і значна маладзейшы яго сын Пятро. І тры рослыя, у армейскага крою адзенні, быццам салдаты — адзін са шрамам на шчацэ, другі васпаваты, а трэці... Я аж не паверыў — Сцёпка Хапун, з якім я служыў у паліцыі. Жыў Сцёпка ў суседняй з маёй вёсцы, адзіны быў у мамкі сынок. І я заўсёды дзіваваўся, чаму ён паступіў у паліцыю. Неяк нават размову пра гэта з ім пачаў. Але Сцёпка не адказаў тады мне на маё пытанне, буркнуў толькі: «Многа знаць будзеш, састарышся хутка». Падазраваць быў пасля таго пачаў, ці не з партызанамі ён, як і я, звязаны. Аж, выходзіць, не, калі ў бандзе цяпер... Бандыты мяне не бачылі, я ляжаў з другога боку, акрыты мохам, бо мяне калаціла ўсяго, то ў холад, то ў гарачыню кідала, і я меркаваў тут пралежаць ноч, можна сказаць, ужо і ўладкаваўся. Аж... Нейкі час я думаў, што мне рабіць. Аклікнуць Сцёпку, папрасіць, каб ён мне памог? А можа... Змоўчаць, пачакаць, калі бандыты адыдуць, ды махнуць у мястэчка. І хворы я, дый... Нару, па якой лазяць у хату, я разведаў. Але ж... Нор можа быць і некалькі. Ды і паспрабуй улезь у нару... А што, калі там астаўся хто-небудзь вартаваць? Прыстрэліць жа... Ды і... Колькі іх, бандытаў, у бандзе? Дзе іх база? І куды яны ідуць, куды сабраліся? На разбой чарговы? А можа, сыдуць адсюль? На час ці назусім? І колькі ляжаць тут давядзецца, чакаць іх? Словам, думкі праносіліся ў галаве ў мяне маланкава. Здаецца, адну, адну толькі хвіліну я глядзеў на бандытаў, якія атрахаліся ад пяску, закладвалі мохам сваю нару, а колькі думак у галаве прабегла. І ўсё ж не ведаю, што мне падказала гэта, азваўся я, папрасіў: «Памажыце!»

Маё слова, якое нагадвала хутчэй стогн, спалохала бандытаў. Не чакалі яны, што іх нехта бачыць. Пахапаліся за вінтоўкі, што было пазакідвалі ўжо на плечы, усе як адзін наставілі іх на мяне. Я аж вочы заплюшчыў — страх ёсць страх, ён міжволі ахапляе чалавека. А тут быў не проста страх. Тут магло што хочаш адбыцца. І, відаць, адбылося б, каб не Сцёпка Хапун.

«Не страляйце,— раптам закамандаваў ён.— Здаецца, я гэтага чалавека ведаю».

І падышоў да мяне, паглядзеў у твар.

«Так і ёсць, Канапелька, я не памыліўся...— хутчэй выдыхнуў, чым сказаў ён. І ўжо да мяне: — Як ты тут апынуўся?»

«З турмы ўцёк»,— прастагнаў я.

Выявілася, чулі бандыты пра чалавека, які ўночы з турмы ўцёк, дайшло гэта да іх.

«А адкуль ты даведаўся, што мы ў Рудзеньцы, нара дзе, па якой мы лазім?» — спытаў раптам Антон Япрук.

«Нічога я ніадкуль не даведаўся. Выпадкова прыбіўся сюды. У мяне пал. Вось я і залёг у мох, каб сагрэцца»,— адказаў я як можна абыякава.

Доўга стаялі, шапталіся між сабою, не ведаючы, што рабіць са мною, бандыты. Калі хто мяне і выратаваў, дык Сцёпка.

«Не бойцеся, я ручаюся, свой у дошку чалавек... Ды і ў паліцыі, як і ўсе мы, служыў...»

Як потым выявілася, бандытам надта ж хацелася ведаць, як я з-пад варты ўцёк, з турмы,— няйнакш кожны думаў пра сябе: раптам трапіць у рукі міліцыі і можна будзе скарыстаць мой вопыт для ўцёкаў. Словам, бандыты мяне не застрэлілі там, ля вываратня. Наадварот, дапамаглі залезці ў нару. А нара, як выявілася, вяла ў даволі прасторнае падзямелле, дзе зроблены былі з дошак нары, стол, табурэты. Ды і само падзямелле было абкладзена з бакоў плашкамі. Плашкамі была абкладзена і столь, наслана падлога. Не падзямелле, а зямлянка, хата.

Пакінуўшы мяне аднаго, бандыты пайшлі, куды і збіраліся ісці. Хоць у мяне быў і пал, трасло і калаціла, я ўсё ж, счакаўшы нейкі час і пераканаўшыся, што я сапраўды адзін, ніхто за мною не сочыць, узяў ліхтар, які стаяў на стале і які запалілі бандыты, калі ўцягнулі мяне ў падзямелле, пачаў аглядаць падлогу і сцены. «Калі зловяць за гэтым заняткам,— прыкінуў для сябе апраўданне,— скажу, што туалет шукаў» І ўбачыў я, што сцены, падлога ў многіх месцах як бы сточаны. Калі я піхаў рукою сточкі, у сценах і падлозе ўтвараліся чорныя дзіркі нор. Сточкі, як выявілася, былі на завесах. Больш таго — на сточках прыроблены зашчапкі, і калі іх замкнуць з нары, дык адчыніць з падзямелля ўжо немагчыма. Ды і пазнаць, што сточка ёсць, таксама нялёгка, бо плашкі падагнаны надта ж шчыльна...

«Дык вось чаму нельга ніяк злавіць бандытаў,— падумаў я.— Вядома ж, і ў хаце тое самае зроблена. Там і падлога, і сцены таксама, мусіць, з «сакрэтам».

Лазіць па норах, аглядаць іх я не асмеліўся. Падумаў — яшчэ заблуджуся. Дый бандыты маглі вярнуцца і заспець мяне, што называецца, на месцы злачынства.

Патушыўшы ліхтар, я лёг на нары — як бы тапчан — і пачаў думаць, прыкідваць, як і што мне рабіць. Было ясна адно — будзе нялёгка. Забягаючы наперад, скажу, што тады я нават не ўяўляў, куды я трапіў. Па-першае, бандыцкае логава было так хітра змайстравана, што, не ведаючы яго ўсіх ходаў, арыштаваць бандытаў было немагчыма. Іх, гэтых нор-ходаў, было больш за дзесяць, і кожная са сваімі сакрэтамі — своеасаблівымі «кішэнямі», у якія можна было лёгка схавацца і з якіх можна было, не вельмі рызыкуючы сваім жыццём, адстрэльвацца ці нажом, тапаром забіць таго, хто будзе паўзці па нары. Па-другое, перадаць тое, што ты ведаеш, адлучыцца ад банды было нельга нават на пяць хвілін. Няйнакш мне не давяралі. Дый не толькі мне — адзін аднаму не давяралі бандыты, адзін за адным сачылі.

У бандзе мне давялося пражыць амаль паўгода, кожны дзень рызыкуючы жыццём. Не буду вам пра ўсё апавядаць падрабязна, бо гэта заняло б шмат часу. Але заданне я выканаў — банда была арыштавана. Прычым без адзінага стрэлу. І арыштавана тады, калі ў бандытаў выспеў план — кіравацца да мяжы і адтуль паспрабаваць вырвацца ў якую-небудзь капіталістычную краіну. На апошнім асабліва настойвалі два чалавекі — васпаваты Петрачэнка і Цяжкаступ. Гэта, як потым, калі банда была ўжо арыштавана, выявілася, былі прафесійныя рэцыдывісты, яны ў вайну ўцяклі з турмы і прымкнулі, як і многія, да паліцыі, служылі не так немцам, як самім сабе. Што ж да астатніх... Дзесьці мне нават трохі шкада было Сцёпку Хапуна — ён ніякі нікому не вораг быў, проста любіў лёгка, бесклапотна жыць. І ў паліцыю пайшоў, каб нідзе не працаваць. Ды і ў бандзе апынуўся выпадкова — баяўся, што не даруюць яму таго, што ён у паліцыі служыў. А Япрукі... Такіх злосных ворагаў нашай улады я сустрэў упершыню. Мала таго, што яны не прынялі яе, не маглі дараваць, што Савецкая ўлада разгарнуцца ім не дала, забрала тое, што яны нажылі, дык яшчэ і помсціць уладзе, усім тым, хто праводзіў яе лінію ў жыццё, спрабавалі. Жывучы ўвесь час у падзямеллі, Антон і з сына свайго, Пятра, ворага зрабіў,

збіў яго, можна сказаць, з малалецтва з тропу, да падзямелля, нялюдскасці прывучыў і тым самым загубіў яму жыццё...

### *РАСКАЗ МАЦІ*

— Чаму ж не, ведала, добра ведала я Япрукоў... І Антона, і сына яго Пятра. Антона менш, бо старэйшы ён быў за мяне, а Пятра... Пятра больш. Нехарошыя гэта былі людзі, ніцыя. Сквапнасць, прагавітасць іх і загубіла. Здавалася б, навошта столькі ўсяго мець, усё адно ж з сабою на той свет нічога не забярэш. Не, са скуры вылузваецца, іншых з торбамі па свеце пусціць, каб толькі завалодаць чужым. І з выгляду ён, Антон, як каршун быў. Нос сагнуты, дзюбаю, як у драпежніка, губы тонкія, а зубы... Вострыя, моцныя, як у ваўка. Бровы пазрасталіся на пераноссі, вочкі маленькія, тхарыныя і злосныя-злосныя. Рукі заграбастыя і доўгія, ніжэй каленяў, ногі ж кароткія — нібы не чалавек, а абрубак які. Сынок, Пятро, таксама ў бацьку ўдаўся, і крошачкі пабраў. Ад маці хіба толькі колер валасоў дастаўся — быў не чорны, а нейкі руды. А так ва ўсім — выліты бацька. І паганенны-паганенны быў. Сабакі ні аднаго не прапусціць, каб камень ці палку не запусціць. Малы гнёзды ўсё птушыныя пароў, яйкі, птушанят забіраў. Падросшы ж, дзяцей крыўдзіў: то паб'е нізашто, то гразёю абкідае, пяску ў валасы насыпле. Білі яго. Зловіць дзе хто на паскудстве, то ўжо не шкадавалі. Праўда, калі немцы прыйшлі, і ён нікога ані на шкадаваў. Я не жыла ўжо тады ў Рудзеньцы, але ад людзей чула, як ён жорстка, не па-чалавечы помсціўся. Дня таго не было, каб не плакалі людзі. Дзіўна, як і вырастаюць такія, як іх зямля носіць. Бывала — у лес ідзеш і баішся Япрукам на вочы трапіць. Яшчэ блізка ля вёскі, то хоць закрычыш, людзі, калі што, збягуцца, уратуюць. А далёка ў лесе... Што там рабіць?

Помню, узяла неяк маці мяне з сабою, калі ішла свіней да Япрукоў карміць. А Япрукі тады сабак-ваўкадаваў трымалі на прывязі. Трох ці чатырох. Вялізных, з добрае цяля. І вось, калі мы з маці ў двор увайшлі, сарваўся адзін з ланцуга. І проста на нас кінуўся. Я — у крык, да маці. А сабака, ашчэрыўшы пашчу, аж вочы крывёю наліліся, сліна з рота — на мяне. Я ад страху вочы заплюшчыла, думала капут, разарве сабака на мэтлахі. І, мусіць, разарваў бы, каб не маці. Схапіла яна вілы, што, прыткнутыя да плота, стаялі, і... «Што ты робіш, сабаку скалечыш!» —

раптам пачуўся страшны крык. Крычаў гаспадар, Антон Япрук,— ён, выявілася, стаяў за вуглом хаты, назіраў за сабакам і намі і голасу не падаваў, пакуль маці вілы не схапіла, абараняцца не пачала. Але маці мая была з норавам. «І яго, і цябе віламі прапару, калі з дзіцем ці са мною што здарыцца! — закрычала яна.— Гад, ірад ты! Бачыш і не бароніш!»

І не выпусціла з рук вілаў, пакуль не выйшла з двара, не вывела мяне на вуліцу.

Больш і нагі нашай не было ў двары ў Япрукоў, хоць Антон і Хвядора некалькі разоў і прыбягалі, каб памагла маці тое ці іншае ім у пару зрабіць, заплаціць добра абяцалі...

А то яшчэ, значна пазней ужо, было. З лесу я ішла, з чарніц. Помню, каробку поўную набрала. А ўжо надвячорак быў — пазнавата ў лес я ў той дзень выбралася, нешта дома мяне затрымала. Іду я паўз мох, каб на дарогу патрапіць, а насустрач Антон Япрук. Спыніўся, паглядзеў неяк дзіўна і раптам, бы звер, як рынецца на мяне. Я спярша нічога не разумела, чаго ён хоча, што ад мяне яму трэба, а калі зразумела, закрычала на ўвесь лес, каробку з ягадамі кінула, пабегла...

І потым яшчэ некалькі разоў у самых розных месцах чакаў, пільнаваў Антон Япрук, як цень, след у след сноўдаўся, жыцця проста не даваў, аж пакуль замуж не выйшла, з Рудзенькі не паехала. Я неяк уратавалася, а іншыя дзяўчаты і жанчыны... Скардзіліся, плакалі...

Сынок, Пятро, як вырас, яшчэ больш за бацьку памаўзлівы стаў. Праходу проста дзяўчатам і жанчынам не даваў. Асабліва ў вайну, калі вінтоўку займеў, калі мог не толькі паздзекавацца, але і прыстрэліць. Баяліся людзі не толькі жыць у Рудзеньцы, але і хадзіць праз яе. Гуртам збіраліся, чалавек па пяць — дзесяць. А каб адзін хто пайшоў — ні-ні. З-за Япрукоў, можна сказаць, з'ехала адтуль і маці мая, зноў жыць у свой Бабчын перабралася, забраўшы, вядома, з сабою і дзяцей Міхея Кудрыцкага — баялася, каб і з ёю, і з імі таго ж не зрабіў помслівы Антон, што зрабіў у гады калектывізацыі з Міхеем Кудрыцкім... Хвядора таксама цаца добрая. Ніколі ні за каго не заступілася, ніколі не абурылася паводзінамі ні мужа, ні сына. Што б яны ні рабілі, маўчала, згаджалася. За ўсё гэта і пакараў Бог — і мужа, і сына да смерці прысудзілі, а яе выслалі з нашых мясцін. Там, дзесьці далёка ў чужых краях, яна, кажуць, неўзабаве і памерла...

...Стаю ля зарослай алешнікам і вербалозам старыцы — былой рачулкі — побач з ёю выкапана роўная, як струна, канава, і вада збягае з балот па ёй ужо, а не па рачулцы,— гляджу на тое, што асталося ад вёскі Рудзенькі: старыя, каржакаватыя грушы-дзічкі, голае, парослае травой дзе густа, а дзе і зусім рэдка поле, кавалкі бітай цэглы, трухлявыя, абгарэлыя ашкабалкі дрэва, што вытыркаюцца то тут, то там з зямлі... Восень, і глухая скрухлівая цішыня навяваюць сумоту — я думаю пра недаўгавечнасць чалавечага жыцця, пра тое, як сёй-той не шануе яго, замест шчасця, радасці прыносіць прыкрасць, гора...

## З аўтабіяграфіі аднаго майго земляка

...Мой бацька, каб не ісці ў калгас, калі пачалася калектывізацыя, узяў сабе ў жонкі маладую, прыгожую цыганку і паехаў з табарам...

Усяго таго я не памятаю, бо тады мяне і на свеце яшчэ не было. Пра гэта я даведаўся пасля. І не ад бацькі — ад маці. Маці... Вось заплюшчу вочы і бачу яе — ціхую, маркотную, вечна заплаканую, сумную. Задумаўшыся, яна сядзіць са мною, трымае мяне на цёплых каленях і спявае нейкую даўнюю, як, мусіць, само цыганскае жыццё, песню. Слоў песні я амаль не разбіраю, але мне ўсё адно добра, і, каб можна было, я слухаў бы, слухаў бы бясконца ласкавы, чысты матчын голас, што так непрымушана, быццам ручаёк, льецца, бруіцца з яе грудзей. І я, утаропіўшыся ў далёкае зорнае неба, якое плыве і плыве нада мною, пад мернае пакалыхванне воза і нягучны перастук колаў — яны коцяцца, бягуць па мяккай палявой дарозе — слухаю і слухаю яго, убіраю ў сябе, імкнуся нічога ані не прапусціць, нібыта ведаю, што ніколі больш ужо яго не пачую. На хвіліну мне нават здаецца — мы нікуды не едзем, а стаім, едзе ж, плыве насустрач нам увесь свет — з вялізным — не ахапіць паглядам — небам, палямі, лясамі, вёскамі, што дзіўна, як у карагодзе, мяняюцца, узнікаюць зноў і зноў...

Спыняемся, як і заўсёды, на лузе ў маладым беластволым бярэзніку. Бацька выпрагае коней, путае іх і вядзе кудысьці ў туман, дзе чуваць, як іржуць, тупацяць капытамі коні тых цыганоў, што прыехалі, атабарыліся раней. Тут і там ужо гараць, успыхваюць агні, і маці, пасадзіўшы

мяне на мяккую пярыну, злазіць з воза, лупіць бульбу, што выпрасіла, зарабіла варажбой у вёсках. Неўзабаве вяртаецца, прыходзіць бацька. Ён змрочны і злосны. Бярэ сякеру, і чуваць, як гучна сапе, валячы і збіраючы сушняк, а потым, пазносіўшы яго ў адно месца, раскладваючы вогнішча. Калі сушняк угараецца, бацька кіруецца да воза, моўчкі, ні слова не кажучы, ссаджвае мяне на зямлю. Сам жа, паўбіваўшы колікі, проста на траве расстаўляе палатку-будан. Гэтак жа моўчкі, ні слова нікому не кажучы, носіць туды, у будан, пярыны, коўдры, абмацвае, аглядае вупраж, колы, атосы...

Тым часам маці налупіла бульбы, памыла яе, паставіла на агонь у чорным, задымленым сагане. Бульба закіпае хутка. Дзіва што — такі агонь! Маці здымае саган з сошак, на якіх варылася бульба, адцэджвае і высыпае на разасланы на траве абрус. Рэжа тоўстымі лустамі хлеб, што таксама запрацавала варажбой у людскіх хатах, аднекуль прыносіць некалькі чырвоных памідораў, зялёныя гуркі, слоік малака.

— Адам,— кліча яна бацьку,— ідзі вячэраць!

Бацька не прымушае сябе доўга чакаць — моўчкі, падагнуўшы пад сябе ногі, прысаджваецца да яды.

Мы з маці таксама апускаемся на траву...

Я не памятаю таго дня, каб хоць раз мы павячэралі ціха, без сваркі. Сварка, я гэта ведаю пэўна, будзе і сёння, вось толькі калі яна пачнецца. Адразу ж ці трохі спагадзя. І таму не зводжу, ні на хвіліну не зводжу з бацькі вачэй. Ён бярэ ў рукі бульбіну, гурок, кусае то адно, то другое, потым паволі і цяжка варушыць сківіцамі, жуе. Але вось раптам ён паварочваецца да маці, і ў вачах яго бліскае шалёны агонь. Ніжняя губа дрыжыць, калоціцца. Маці падхопліваецца на ногі — няйнакш нарыхтавалася ўцякаць. Я шморгаю носам, пачынаю румзаць.

— Змоўкні, не плач,— цэдзіць скрозь зубы ў мой бок бацька.— Ты мужчына і некалі ўведаеш, што значыць мець за жонку такую маці, як у цябе.

— Не вярзі глупства дзіцяці,— як не просіць маці.— Грэх.

— А гуляць, быць няверная мужу — не грэх! — крычыць бацька і таксама ўстае, падхопліваецца на ногі.

— Пабойся Бога. Сядзь ды еш, а то бульба астыне.

Але бацьку ўжо нічым, нічым не ўняць. Ён бегае, мітусіцца, скача каля вогнішча, хоча злавіць маці, якая ад яго ўцякае, не дае яму наблізіцца да сябе. Нарэшце ён, злаў-

чыўшыся, хапае маці за косы, цягне ў будан, прымаўляючы:

— Я шкадую, што не забіў цябе, калі першы раз злавіў з Мікалаем! І я не мучыўся б, і ты...

Я ўжо не плачу, а крычу, галашу...

На мой крык, маё галашэнне збягаюцца цыганы, цыганкі. Сярод іх я пазнаю матчынага бацьку Марфея, яе брата Ларывона, іншых цыганоў і цыганак. Яны горача, наўзахапкі нешта гавораць адно аднаму, перамаўляюцца на сваёй, не зусім зразумелай мне мове, потым ідуць у будан, адцягваюць ад маці бацьку і пачынаюць біць. Б'юць не шкадуючы, зацята, злосна — рукамі, нагамі. Бацька ўсё ж вырываецца, крычыць:

— Я ведаю, што вы ненавідзіце мяне, бо я не такі, як вы, не цыган. Але ж я таксама чалавек!..

Бацьку ніхто нічога не адказвае. І ён ці то ад слабасці, ці то так ад чаго падае на зямлю і, уткнуўшыся тварам у траву, пачынае плакаць. Плача горка і крыўдна.

Мне робіцца шкада бацькі. Але чым, чым я магу яму памагчы?

Цыганы, пастаяўшы яшчэ трохі, забіраюць з сабою маю маці, некуды ідуць, знікаюць у цемры.

Я некаторы час гляджу на бацьку, на яго ўскудлачаную галаву, на яго рукі, ногі, з якіх звісаюць ашмоццем падраныя сарочка і штаны, і, шморгаючы носам, плачучы, іду, іду далей ад вогнішча, іду туды, куды вядуць мяне мае ногі.

Слёзы засцілаюць мне вочы, крыўда і злосць — на каго і за што? — душаць, давяць горла, не даюць ні пра што думаць. Адно мне ясна: я ніколі больш не вярнуся ў табар. Пайду куды заўгодна, абы толькі не быць тут, не чуць, не бачыць таго, што чую, бачу як не штовечар...

Халодная раса студзіць босыя ногі, калашыны палатняных штаноў абшматаліся, намоклі і непрыемна хвастаюць па лытках. Я дрогну і сцінаюся — на мне лёгенькая паркалёвая сарочка і яна ані не грэе.

Спыняюся каля кустоў нізкай, ніцай лазы. Там, далей за імі,— рака: шырокім шызым паскам яна развінулася ля самых канцавых хат вёскі, перагарадзіла мне дарогу. З таго, другога, берага плывуць па рацэ — відны толькі рагатыя галовы — не то быкі, не то каровы. Дзядзька ў лодцы перавозіць казлянят і казу: і каза, і казляняты стаяць ля бартоў і думна глядзяць на ваду. Нейкая жанчына маніць свіней. «Гуцё, гуцё, гуцё!» — крычыць яна, і рэха, як бы

перадражніваючы, пасміхаючыся, паўтарае ўслед за жанчынай слова ў слова. Прыпадаючы да вады, паўзе, сунецца адусюль, густы, рухавы туман.

«А што, калі пайсці ў вёску, там астацца жыць?» — думаю я.

Але ў вёску я не іду, а кіруюся чамусьці ў лес, што цямнее ўдалечы...

Спыняюся я няскора, гэты раз пад густою навіссю голля дрэў.

«Куды я іду?»

У вёсцы грае гармонік — залівіста, з пераборамі. І я слухаю яго і зноў думаю — ці не пайсці жыць мне ў вёску? А што?.. Наймуся да каго-небудзь, буду пасвіць кароў ці авечак... Зноў і зноў успамінаю, што адбывалася і адбываецца штовечар у цыганскім табары, і мне робіцца шкада бацькі, шкада маці, шкада самога сябе. І я, сеўшы на камель старадрэвіны, зноў плачу...

...Ачынаюся я ад сцішанай гаманы. Гавораць, я гэта хутка пазнаю, цыганы. Марфей, Ларывон і яшчэ нехта трэці — ці не той Мікалай, якога ўвесь час успамінае ў сваіх сварках з маці бацька.

— Я заб'ю яго, я не магу больш бачыць, як ён здзекуецца з яе,— кажа з надрывам той, невядомы мне чалавек.

— Не трэба, цябе за гэта пакараюць,— астуджвае яго старэчы бас Марфея.

— Не, не пакараюць. Я прыдумаў такое, што ніхто і не скажа, што я яго забіў.

— Усё адно — грэх! Ды і хлопчык у яе ад яго...

— Але ж і цярпець такое штовечар?..

— Цярпець таксама нельга, я згодзен...

— А што, калі мы...

Пачуўся ціхі, стоены шэпт Ларывона.

— А гэта... Бадай, тое, што і трэба...— зноў чуецца старэчы бас Марфея.

Цыганы пайшлі некуды далей — ці не ў вёску. А я, пачакаўшы, калі яны знікнуць, схаваюцца ў цемры, кідаюся, бягу з усіх ног назад у табар.

Бацька ляжыць на траве, там, дзе я яго і пакінуў.

— Тата, тата,— раскатурхваю, буджу бацьку.— Уставай, уцякай адсюль. Цябе забіць хочуць!

— Хто мяне хоча забіць?

— Марфей, Ларывон і яшчэ нехта трэці... Я сам чуў, як яны шапталіся, гаварылі.

— Дзе шапталіся, дзе гаварылі? — ачынаецца бацька.
— У лесе.
— А чаго ты там быў?
— Сышоў з табара, думаў, не вярнуся больш сюды.
Бацька нейкі час маўчыць.
— Ты мяне любіш? — пытае раптам ён у мяне.
— Не ведаю. Мне шкада...
— Каго табе шкада?
— І цябе, і мамы...

Бацька паволі падымаецца, устае на ногі. Бярэ мяне на рукі, некуды нясе...

...Прачынаюся я ў вагоне цягніка. Тады, вядома, я не ведаў, што гэта вагон, што мы з бацькам кудысьці едзем. Я толькі спытаўся:

— Тата, дзе мы?

— Спі, сынок,— пагладзіў мяне рукою па галаве бацька.— Мы вяртаемся, едзем дадому.

— Куды гэта дадому? — дапытваюся я.
— У вёску, туды, дзе некалі я жыў.
— А мама?
— Мама? Яна таксама вернецца, прыедзе. Спі...

Але маці не вярнулася, не прыехала. Горш таго — праз нейкі час знік, як усё адно ў ваду кануў, і бацька. Пайшоў чагосьці ў мястэчка і... Колькі ні шукалі яго, так і не знайшлі — ні жывога, ні мёртвага — нідзе ніякіх слядоў...

Рос, выхоўваўся я там жа, у вёсцы, у бацькавых бацькоў — дзеда і бабы...

Бацькава ж — аблюбаванае ім некалі, яшчэ да калгасаў, і амаль абжытае — селішча так і асталося пуставаць...

## Золата

Калісьці тут, на астраўку сярод балота, была панская сабакарня. Пан надта ж любіў паляванне, а жонка, пані Гелена, ані не магла прывыкнуць да сабачага брэху — прачыналася па начах і ўжо да самай раніцы не спала. І таму пан, каб не рабіць прыкрасці жонцы, якую кахаў, змушаны быў трымаць сабак далёка ад сядзібы. Збудаваў на астраўку сярод балота хлявы, кухню, хату, у якой жылі даглядчыкі і ахова, праклаў туды дарогу, па якой можна было ў любую пару года наведацца да сваіх чатырохногіх любімцаў, не асабліва рызыкуючы выкупацца ў багне,— і на тым, што называецца, пазбыўся непатрэбных клопатаў і турбот.

У рэвалюцыю, калі палілі панскі маёнтак, спалілі і сабакарню. Але астравок зямлі быў як бы трохі ўжо абжыты і павабны на вока. І калі пачалі дзяліць панскую зямлю, папрасіла, каб аддалі ёй гэты астравок, удава Мархута. Муж яе загінуў у часе вайны ці то на германскім, ці то на аўстрыйскім фронце, у Мархуты было трое дзяцей, усе дзяўчаты, і тыя, хто дзяліў зямлю, уважылі — аддалі жанчыне тое, што прасіла. Мархута, пажыўшы некаторы час яшчэ ў вёсцы, у старой хаце, надумала раптам паставіць сабе новую, і не дзе-небудзь, а там, на астраўку, дзе некалі была панская сабакарня.

— А што,— казала яна тым, хто спрабаваў яе адгаворваць ці смяяцца.— Ад вёскі зусім недалёчка, дарога туды добрая... Ды і зямля там, луг... Ні вазіць нічога не трэба на сядзібу, ні насіць. Усё там, на месцы...

Якраз тады неўзабаве пачалася хутарызацыя, і многія, услед за Мархутаю, пачалі сабе новыя хаты стаўляць зводдалеку ад вёскі, асабліва калі ўбачылі, як запамаглася раптам Мархута — пару коней-біцюгоў купіла, дзве пары валоў, кароў аж шэсцера. Нават парабка — нямка Пархвена — наняла, каб рабіў усё на лузе і ў полі. А калі дзяўчаты павырасталі, пааддавала іх замуж і кожнай пасаг такі дала, што і не сніўся нікому ў тутэйшых мясцінах — па пары валоў, па дзве каровы, ды і новыя хаты кожнай паставіла. Дзіваваліся толькі людзі, адкуль у Мархуты багацце такое. Каб поле вельмі ўжо радзіла, луг прыбытак даваў — не скажаш. Ды і сама яна надта не шчыравала, больш палежвала, быццам пані, у цянёчку ды парабкам Пархвенам камандавала — ён араў, і сеяў, і касіў, і за жывёлай у хлявах глядзеў.

— От баба,— зайздросцілі многія Мархуце.— Трэба ж так... Жыве, як пані. Усё, што хоча, мае. Ды і дзеўкамі сваімі пагандлявала, не раўнуючы, бы перцам. І ўсё таксама ж пры дастатку...

Ды, як кажуць, няма нічога тайнага, што б не стала яўным. Неяк прыехала ў вёску міліцыя, заарыштавала Мархуту. А потым, праз дзень-два, і ўсіх яе трох дачок. Тады ў вёсцы і загаварылі пра нейкае золата, якое быццам знайшла на новым селішчы — былой панскай сабакарні — Мархута і не аддала дзяржаве, як таго патрабуе закон, а прысвоіла сабе...

Але перш чым здарылася тое, пра што ніхто ў вёсцы не ведаў, нават не здагадваўся, Мархуце давялося нямала пахваляваца, не паспаць не адну ноч. А ўсё пачалося

з вечара, калі Мархута, натаміўшыся ўволю ў пасцелі з Пархвенам, які з некаторага часу стаў ёй і як бы за мужа, засынала ўжо. Тады вось і пачуўся раптам асцярожны стук у акно. «Хто б ета можа быць? — насцярожылася Мархута.— З вёскі хто? А мо...»

Паднялася з пасцелі, накінула на плечы світку, пайшла адчыняць дзверы. Убачыўшы ж на парозе незнаёмага чалавека — пры барадзе, пышных вусах,— зніякавела, разгубілася, хацела Пархвена бегчы клікаць — ён спаў у пуні. І, відаць, пабегла б, паклікала б, але чалавек апярэдзіў яе, сказаў:

— Не палохайцеся, я да вас.

— Хто ты, што табе? — сказала Мархута, адчуваючы, як раптам бяруць, ахопліваюць усю яе, з ног да галавы, дрыжыкі.

— Вось зойдзем у хату, я і скажу,— далікатна, ветліва гаварыў чалавек.

Што было рабіць? Упусціла Мархута, хоць і не хацелася ёй, чалавека ў хату. А чалавек як зайшоў, дзверы за сабою зачыніў, дык адразу і бухнуў, што яму трэба.

— Хату хачу ў вас купіць,— сказаў ён.

— Хату? — здзівілася Мархута.— Але ж я хаты не прадаю.

— Я добра заплачу,— пачаў угаворваць чалавек.

— Не, і не прасеце,— замахала рукамі Мархута.— Хата мне самой трэба.

— А вы падумайце,— стаяў на сваім чалавек.— Вам ніхто столькі грошай не дасць, колькі дам я.

— Не, хаты я не прадам,— наадрэз адмовілася Мархута.

— Тады запаліце святло! — ледзь не загадаў незнаёмец.

Запаліла лучыну Мархута. І калі ў хаце стала відна, сарваў з твару чалавек вусы, бараду — яны, выявілася, прыклееныя былі.

— Пазнаеш, хто я? — спытаў, цяпер ужо даволі сурова, чалавек.

— Пазнаю,— прызналася Мархута, бо ўбачыла перад сабою былога свайго пана Арсенція Яўстрахавіча Бахрамеева.

— Дык вось,— прадаўжаў, не зводзячы вачэй з жанчыны, пан.— Тут, на гэтым месцы, дзе ты паставіла хату, я ў свой час закапаў золата. Скажы, прызнайся, знайшла ты яго?

Не, не адразу прызналася Мархута, што, капаючы пограб, знайшла панскае золата. Доўга не гаварыла ні «так», ні «не», цямніла, выкручвалася, потым пачала і зусім адмаўляцца. Але пан ведаў месца, дзе схаваў золата. І паабяцаў Мархуце — калі яна не прызнаецца, не скажа праўды, ён спаліць хату і сам пашукае, ці на месцы золата, ці яго там ужо няма. Гэта ў лепшым выпадку. У горшым — заявіць на Мархуту ў міліцыю.

— Мне няма чаго губляць,— скрозь зубы працадзіў пан.

— А мне што губляць? — як бы задумалася Мархута.

— Табе? — змераў вачыма Мархуту пан, быццам упершыню яе бачыў.— Ты ўсё, што маеш, згубіш.

— Як ета? — непаразумела глядзела на пана Мархута.

— А так,— патлумачыў пан.— Паводле новых законаў, золата, дзе б і калі хто ні знайшоў, трэба аддаваць дзяржаве. А ты не аддала, прысвоіла сабе. І таму адказваць будзеш перад законам. Больш таго, і хату тваю прададуць, і ўсё, што маеш, што набыла, нажыла...

Не паверыла пану Мархута.

— Страшыш,— сказала.

— Не страшу,— аж згорбіўся, зрабіўся быццам меншы пан.— Бальшавікі пра ўсё гэта надрукавалі ў газетах, я сам чытаў. І не толькі чытаў, я ведаю, колькіх яны пакаралі ўжо. Краіна развальваецца, голад у гарадах, за мяжой бальшавікоў не хочуць прызнаваць. І трэба золата. Таму такія і законы надрукавалі. Калі ты прызнаешся, што знайшла маё золата, няхай, падзелімся. Табе частка будзе і мне... Калі ж не прызнаешся... І таго, што маеш, мець не будзеш.

Думала, доўга думала Мархута — прызнавацца ва ўсім пану ці не. Урэшце, калі ён пачаў пагражаць, і не на жарты, аб усім прызналася — знайшла яна панскае золата.

— Я пограб капала. І жалязняк раптам у нешта ўваткнуўся. Нагнулася я... Мяшок. А ў мяшку... Я спярша разгубілася, не ведала нават, што ета. Ажно... Грошы... Золата.

— І што ты зрабіла? — падляцеў бліжэй, быццам каршун, да Мархуты пан.

— Забрала. Схавала.

— І нікому не прызналася, не паказала?

— Чаму ж... Нават прадала трохі...

— Каму? — аж закалаціўся пан.

— Анучніку аднаму. Ён нeяк па вёсцы праязджаў, я і... Грошы трэба былі мне. І на хату, і потым... Кароў, коней, валоў купіла. Ды і дачок трэба было замуж пааддаваць, справіць ім сёе-тое...

— Дык у цябе... Што ў цябе асталося? — ледзь не на ўсю хату закрычаў пан.

— Мала... Вельмі мала,— сама яшчэ добра не цямячы чаму, пачала хітраваць, маніць Мархута.

— Пакажы, пакажы, што асталося,— затупаў нагамі, забегаў па хаце пан.

Мархута палезла на печ, дастала з-за бэлькі залатыя манеты, што былі загорнуты ў анучку, падала пану.

— І гэта ўсё?! — накінуўся ледзь не з кулакамі на Мархуту пан.— Хамка, грабежніца! Як ты магла такое глупства зрабіць — аддаць анучніку, лічы, нізавошта золата! Столькі золата! Хто той анучнік, дзе ён жыве?

Мархута, падумаўшы, сказала, хто анучнік і дзе жыве. І пан, запхнуўшы залатыя манеты ў сакваяж, з якім прыйшоў да Мархуты, у тую ж хвіліну знік з хаты, нават не падзяліўся золатам, як абяцаў перад гэтым. Але Мархута задаволеная і так была, што пан паверыў ёй, не стаў дамагацца больш залатых манет. Бо, вядома ж, манеты былі яшчэ ў яе. І схаваны не ў адным месцы, а ў некалькіх. Тыя ж, што былі за бэлькаю на печы, яна падрыхтавала занесці анучніку, каб памяняць на звычайныя грошы.

«І так добра ўсё абышлося,— супакойвала сама сябе Мархута.— Паверыў мне пан. Бо каб не паверыў... Невядома, што б і зрабіў. І так быў раз'юшыўся... Дзіва што! Грошы яго знайшла і ў ход пусціла...»

Але супакаенне падманлівае было. Бо назаўтра, па абедзе, прыехаў да Мархуты на хутар анучнік. Злосны, як чорт.

— Што ты нарабіла! — закрычаў ён на Мархуту, як толькі зайшоў у хату.— Навошта ты прызналася, што золата мне прадавала? Цяпер гэты гіцаль жыцця не дасць, са свету зжыве! Гэта ж трэба дадумацца! Прыходзіць, ні сват ні брат, і золата патрабуе! Калі я пачаў упірацца, сказаў, што ў міліцыю заявіць...

— То і ў мяне тое самае,— прызналася, пачала расказваць Мархута.

— Трэба было не прызнавацца, не казаць, што ты знайшла золата. Хто цябе за язык цягнуў? — аж скакаў па хаце, быццам яго кусала штосьці, анучнік — сам хілы і дробны, як блыха.

— Дык ён жа хату гразіўся спаліць, у міліцыю заявіць!
— Хай бы паліў, хай бы заяўляў!
— Ого, а жыць дзе мне? Ды і ў міліцыі што б я сказала?
— Хату новую збудавала б! А ў міліцыі... Не пойдзе ён у міліцыю.
— Чаму не пойдзе?
— Збаіцца. Яго, калі толькі заявіцца туды, адразу ж за чэрці возьмуць — заарыштуюць. Ён... Пан...
Разумела Мархута: дала яна маху, не трэба было прызнавацца пану, што знайшла золата.
— Можа, ён здаволіцца тым, што я дала яму, не будзе больш патрабаваць,— схапілася, як за саломінку, Мархута.
— Ого, занадта добра ты пра гэтага шыбеніка думаеш! Не адстане ён, гізунты выцягне. І з цябе, і з мяне. Пабачыш вось!
— Што ж нам рабіць? — задумалася Мархута.
— Не ведаю, не ведаю,— скакаў, бегаў анучнік.
Але, відаць было, ведаў, добра ведаў, што рабіць, анучнік. З тым і прыехаў на хутар да Мархуты.
— У цябе багата асталося гэтых самых залатых манет? — спытаў ён праз некаторы час.
— Ды...— марудзіла, не ведала, што адказаць, Мархута.— Трохі е.
— Пакажы! — падбег да Мархуты анучнік.
— Навошта? — зіркнула на анучніка, нібыта пра штосьці здагадваючыся, Мархута.
— Я пагляджу колькі і скажу, што далей рабіць.
Але Мархута скрытная была, неахвочая паказваць тое, што мела.
— А так, не паглядзеўшы, не скажаш?
— Не, не скажу!
— І не трэба,— адказала нейк аж занадта спакойна Мархута.
— А калі да цябе пан зноў прыйдзе ці ў міліцыю паклічуць? — паглядзеў трохі здзіўлена на Мархуту анучнік.
— Скажу, што няма ў мяне больш манет, няма золата.
— Дык жа ведае пан, што было. І колькі — таксама ведае!
— А я скажу, што пааддавала.
— Каму?
— Табе!
Зноў забегаў па хаце, заскакаў па падлозе, як па гарачай бляссе, анучнік.
— Ты мяне не чапай, не ўблытвай! — закрычаў, аж

сліна з рота пырснула, анучнік.— Я думаў, як памагчы табе. А ты... Ты...

— Як ты мне паможаш?

— А так. Я паглядзеў бы, колькі ў цябе золата,і, можа б, паспрабавалі адкупіцца. У мяне ў міліцыі знаёмыя ёсць!

Задумалася, зноў задумалася Мархута.

— Але ж,— сказала яна праз хвіліну,— а калі не адкупішся? Золата мне ніхто не верне. Ні ты, ні той, твой знаёмы. Не, не дам, не пакажу, што маю. І не толькі табе, а нікому не дам і не пакажу.

— Калі прыедуць шукаць, то знойдуць! Ды і загавараць, сказаць прымусяць! — прыстрашыў анучнік.

— Як не захочаш сказаць, то не скажаш, што б з табою ні рабілі!

— Ты так думаеш? — паглядзеў як бы з недаверам, здзекліва на Мархуту анучнік.

— Ну, калі ўжо...— зноў задумалася Мархута.— То... Міліцыі аддам. А табе і пану больш ні капелькі не дам!

— Дурная, дык дурное і вярзеш!

Але, як ні намагаўся, як ні шчыраваў, не выманіў, не выпрасіў праўдамі і няпраўдамі анучнік у Мархуты золата. Паехаў з хутара так, ні з чым. І як у ваду кануў. Дзе ён падзеўся, куды знік — ніхто не ведаў. Ды Мархуту гэта не вельмі і абыходзіла, не хвалявала, наадварот, супакойвала: калі што якое, можна на анучніка зваліць, у яго, маўляў, золата, яму аддала яго. Ды яна і казала пра гэта пану, які наведваўся, прыходзіў — і не адзін раз! — да яе зноў па начах.

— У анучніка золата! Шукайце яго і патрабуйце! А да мяне нечага хадзіць, няма ў мяне больш ні капейкі! Усё, што было, аддала!

Невядома, паверыў Мархуце ці не паверыў пан, але таксама знік, не стукаўся, не прыходзіў больш па начах да яе ў хату.

Ды цешылася Мархута спакоем нядоўга. Здарылася тое, непапраўнае — аднойчы, калі яна ў полі была, палола лён, прыехала да яе на хутар міліцыя. І многа, чалавек шэсць. Усю сядзібу агледзелі, перапаролі. І не толькі яе сядзібу, але і сядзібы дачок. Урэшце, не знайшоўшы таго, чаго шукалі, заарыштавалі Мархуту, а потым, неўзабаве, і ўсіх трох яе дачок, павезлі ў горад...

Што там і як далей было — у вёсцы мала ведалі. Але бачылі людзі, як некалькі разоў на сядзібу да Мархуты наязджала міліцыя, нешта забірала. А яшчэ праз нейкі час

хаты Мархуты і яе дачок прадалі, прадалі і кароў, коней, словам, усё, што было нажыта за золата. Тады ў вёсцы ўпершыню і загаварылі пра схаваныя панскія грошы, якія знайшла на былой сабакарні Мархута... І быццам выдаў Мархуту не хто іншы, як пан — ён уцякаў, пераходзіў мяжу, і яго злавілі. А ў яго золата было — тое, што дала Мархута, калі ён наведаўся да яе ўночы...

— Во, цяпер ясна, адкуль у Мархуты багацце,— загаварылі ў вёсцы.— А то ні з сяго ні з таго, ні села ні ўпала — і запанела...

Усіх трох Мархуціных дачок, патрымаўшы ці не з месяц, адпусцілі, а самую Мархуту пакінулі ў міліцыі. Казалі, яе змушалі, каб прызналася, дзе яна падзела астатняе золата. Але Мархута ўпарцілася, не прызнавалася, паўтарала адно і тое ж: золата яна аддала анучніку. Міліцыя шукала анучніка, а пакуль што трымала Мархуту, час ад часу водзячы на допыты і спрабуючы выманіць у жанчыны прызнанне, забраць золата... Сёе-тое міліцыі ўдавалася. Мінала трохі часу, і Мархута выдавала то адну, то другую схованаь, кленучыся, божачыся, што больш няма, усё, да капеечкі, аддала...

Можа б, Мархуце і паверылі, адпусцілі дадому. Але, на яе бяду, знайшоўся анучнік — яго злавілі ці то ў Грузіі, ці то ў Арменіі. Жыў там, гандляваў у нейкім магазіне. І анучнік прызнаўся, колькі ён узяў у Мархуты золата. Назваў, колькі золата закапаў, схаваў у зямлю, і пан. Складвалі, падлічвалі і... Выходзіла, не ўсё золата знайшлося, нехта прысвоіў частку, прычым немалую, сабе. Хто? Пан? Анучнік? Ці Мархута?.. Вось міліцыя і спрабавала высветліць, дамагаючыся, каб золата было вернута дзяржаве...

Там, у міліцыі, Мархута і пачатку вайны дачакалася. З'явіўшыся тады зноў у вёсцы і пажыўшы некаторы час у дачок — то ў адной, то ў другой, то ў трэцяй, якія к гэтаму часу абжыліся ўжо трохі, новыя, хоць і не такія вялікія, як раней у іх былі, хаты сабе збудавалі, пачала раптам зноў хату сабе стаўляць на былой панскай сабакарні. І плаціла людзям за работу, ужо нікога не баючыся, залатымі царскімі рублямі.

— Прыжымістая баба,— казалі пра Мархуту ў вёсцы.— Гэта ж трэба столькі сядзець у міліцыі і не прызнацца, што ёсць у яе золата...

Ды пажыць так, як хацелася, Мархуце ў новай хаце не ўдалося. У першую ж ноч, як перасялілася, на яе напалі

невядомыя людзі. З вінтоўкамі, нажамі, пачалі патрабаваць, каб аддала золата. І білі Мархуту, і босую, голую ў мароз па снезе ганялі, так што прастудзілася Мархута і ўсю зіму прахварэла, лежачы на печы то ў адной, то ў другой, то ў трэцяй дачкі...

А вясною паліцыя наехала, забрала Мархуту. І завезлі яе ў камендатуру, аддалі немцам, якія таксама пачалі патрабаваць золата...

— Загубіла Мархуту тое золата,— круцілі галовамі людзі.— Жыла б, як усе. А то... Спакою жанчыне няма... Не, недарэмна кажуць: не руш чужога і не бойся нікога... Бокам яно, не сваім мазалём нажытае, вылазіць...

Аднак ні паліцаі, ні немцы вельмі не пажывіліся. Як ні катавалі, што ні рабілі, адно цвердзіла Мархута: няма ў яе больш золата. Было, ды сплыло — пааддавала яна яго то анучніку, то пану, то міліцыі, то за будоўлю хат.

Немцы не любілі доўга важдацца з кім бы там ні было. Патрымаўшы ў камендатуры Мархуту тыдняў колькі, накіравалі яе на прымусовыя работы ў Нямеччыну. А яшчэ праз нейкі час спапялілі немцы і тую вёску, у якой я нарадзіўся і жыў, а разам з ёю і новую Мархуціну хату, што тая паспела збудаваць у вайну. Нас жа, насельнікаў вёскі, каго не забілі, не павесілі, не спалілі,— таксама пагналі ў Нямеччыну.

Вярнуліся з чужыны мы праз два гады. На месцы вёскі — папялішчы, абгарэлыя сады, закуродымленыя, напаўразбураныя печы... Але людзі ёсць людзі. Не мінула і года, як на папялішчах паўсталі новыя хаты, двары...

І адной з першых збудавала сабе хату Мархута. Там жа, на месцы былой панскай сабакарні. Не меншыя, а большыя, чым у маці, збудавалі хаты і Мархуціны дочкі...

І зноў папаўзлі чуткі пра золата, якое быццам збывала дзесьці ў горадзе Мархута. Зноў прыехала міліцыя, забрала Мархуту і яе дачок... Хаты ж і ўсё нажытае зноў канфіскавалі — прадалі...

Гэты раз Мархуту не трымалі доўга ў міліцыі, бо, казалі, аддала яна золата ўсё, да капеечкі, што толькі было, асталося ў яе. І ў гэта можна было паверыць, бо больш не стаўляла сабе новай хаты Мархута, перайшла жыць да дачок...

Якраз тады пачалося ў нас асушэнне балот. І той пагорак, дзе была калісьці панская сабакарня, зааралі, далучылі да калгаснага поля...

Мархута ж дажывала свой век непрыкметна, як і ўсе

старыя людзі. Праўда, калі трэба было каму стаўляць зубы, прыходзілі да яе, прасілі прадаць золата.

І, кажуць, не ўсім, а сяму-таму, каго ведала, хто ўмеў трымаць язык, не брахлівы быў, яна аж да самай сваёй смерці прадавала залатыя царскія манеты.

Вось якая была яна, гэтая Мархута, што спрабавала абжыцца на новым селішчы, былой сабакарні, і знайшла схаванае панскае золата.

## Хама

Хаму, пра якога і цяпер яшчэ расказваюць шмат дзіўнага і неверагоднага, бачыў мой бацька.

— Я з лесу ішоў, барыла гарэлкі нёс,— успамінаў ён.— А ўжо на вечар хіліла, змяркалася, і я, вядома, спяшаўся, каб дома барзджэй быць. Мінуў Нахаеву паляну, расцяробы, брод Мікалушкаў — гляджу: незнаёмы чалавек наперадзе стаіць. У кажусе, шапцы-зімоўцы. На нагах — боты. Я... Не тое каб спалохаўся, а разгубіўся... Не ведаў, што і рабіць — ісці, як ішоў сваёй дарогай, ці... Прыпусціць з усіх ног назад, да апарата, дзе бацька самагонку гнаў. Толькі пакуль я гэтак думаў, чалавек падняў на мяне вочы, спытаў:

«Чый ты будзеш, нябож?»

Я назваў.

«А што ты нясеш?»

«Барыла»,— мармытнуў я.

«А ў барыле — гарэлка?»

«Гарэлка»,— пацвердзіў я.

«Ой, як добра! — зацмокаў языком, пакруціў галавою чалавек.— Не бойся, я — Хама!»

Як сказаў, прызнаўся чалавек, хто ён, у мяне і мова аднялася, валасы на галаве дыбка ўсталі. Хама! Падумаць толькі — сам Хама! Той Хама, што туляецца па лесе і ўлетку, і ўзімку каторы ўжо год — перастракае на дарогах людзей, прымушае рабіць розныя глупствы — кідацца з кулакамі на дрэвы, плаваць па сухім... І злавіць Хаму ніхто не можа — ні салдаты, ні стражнікі... Хамы я баяўся, думаў, што гэта і не чалавек зусім. А тут стаіць перада мною гэты самы Хама ды яшчэ і ўсміхаецца, падміргвае, кажа:

«Ну дык чаго ж ты? Нясі барыла, я пасмакаваць хачу, якая гарэлка».

Зрабіў я крок, другі... Толькі што гэта — перабіраю

нагамі, здаецца, іду, а пагляджу — на адным месцы стаю, ані не набліжаюся да Хамы. Што за ліха?.. Злосць мяне ўзяла.

«Што вы са мною, дзядзька, робіце? Я іду, іду, а з месца скрануцца не магу...»

«А ты плыві...» — падказвае, смяецца Хама.

Толькі гэта ён сказаў, на мяне і хлынула цэлаю ракою вада. Халодная, як лёд. Заліла ногі, дайшла да жывата, да пах, шыі... Я замахаў рукамі, забултыхаўся, закрычаў:

«Дзядзечка, я плаваць не ўмею!»

Аж зарагатаў Хама.

«Не бойся, не ўтопішся...»

І сам да мяне падышоў. Вада і знікла. Зноў убачыў я сябе на сцежцы, там, дзе і дагэтуль стаяў. Памацаў пальцамі сарочку, штаны — сухенькія.

«Што гэта вы са мною рабілі?» — спытаў я ў Хамы, бо чуў ужо, што Хама валодае нейкай таямнічаю сілаю, можа, як захоча, прымусіць чортведама што рабіць.

«А ты спалохаўся?»

«Ага»,— прызнаўся я.

«Ха-ха-ха,— смяяўся, рагатаў Хама.— Давай сюды барыла».

Падаў я Хаме барыла. Адаткнуў ён затычку, губамі да дзіркі прыпаў.

«Ого! — усклікнуў ён праз хвіліну.— Аж дух займае. Не гарэлка, а спірт!»

Заткнуў барыла зноў затычкаю, за плечы яго сабе закінуў.

«Ты дадому ідзі,— сказаў ён мне.— І глядзі — нікому нідзе ні слова, што мяне бачыў. Калі каму-небудзь скажаш — зраблю з табою не тое, што кагадзе рабіў. Я ета ўмею... Бацьку ж пакарэдзь — барыла і грошы за гарэлку аддам. Хай заўтра на Нахаеву паляну прыйдзе, то пад дубам тым, што пярун пашчапаў, і будзе ўсё ляжаць. Толькі і яму перадай, каб нідзе ні гу-гу...»

Сказаў гэтыя словы і збочыў са сцежкі, пашастаў некуды ў гушчар лесу. Ну а я, пастаяўшы трохі, прыпусціў з усіх ног дадому...

Вярнуўся апоўначы ад апарата бацька. Я яму і расказаў пра сустрэчу з Хамой. Бацька пагладзіў мяне па галаве, супакоіў:

«Спі. Хама не паганы, калі яму нічога паганага не зробіш. А грошы за гарэлку ён аддасць, я ведаю. Вось пойдзем заўтра з табою ў лес — пабачыш...»

І праўда — пайшлі мы назаўтра з бацькам на Нахаеву паляну, да дуба таго, што пярун пашчапаў. Бачым — барыла наша ля камля стаіць. Падняў бацька барыла, а пад ім і грошы, загорнутыя ў палатняную анучку, ляжаць...

...Не, не ведаў Хама, выпраўляючыся з торбаю ў лес, што вярнуцца зноў дадому, да ранейшага жыцця, будзе так цяжка, лічы, немагчыма. Ды каб, мусіць, і ведаў, усё адно не зрабіў бы інакш. Гэта ж не жартачкі — не даццa, каб забралі ў салдаты. І за што? Што з панам пасварыўся, з хаты, з леснічоўкі, таго выгнаў, калі ён, памаўзлівы кот, да жонкі, Тэклі, заляцацца пачаў. Не сцярпеў Хама, швырнуў пана так з хаты, што той і капыты задраў. І за гэта... У салдаты! А ён, пан, астанецца, будзе зноў да Тэклі клінні падбіваць... О не, дудкі! Думка ў Хамы была такая — перабуду, пераседжу ў лесе, пакуль набор у салдаты ідзе, а тады назад, у леснічоўку, вярнуся...

І зрабіў так, як намысліў. Пераседзеў у лесе, перахаваўся, не паказваючыся на паляну, дзе леснічоўка стаяла, пакуль не паехалі стражнікі, а потым вярнуўся як ні ў чым не бывала, зноў пачаў панскі лес вартаваць, са стрэльбай хадзіць. Словам, так жыць, як жыў дагэтуль.

Толькі ж пан — ёсць пан. Не дараваў ён Хаме крыўды, помсціць пачаў. І хоць набор у салдаты скончыўся, выклікаў пан стражнікаў, каб забралі, заарыштавалі Хаму. Бадай, і не ўратаваўся б Хама, каб не яго здольнасць, уменне «гіпнатызаваць» людзей, якім ён валодаў з маленства. А так, калі яго заарыштавалі, у брычку пасадзілі, каб кудысьці павезці, нарабіў Хама такога, што стражнікі пападалі раптам на зямлю і паснулі. А Хама саскочыў з брычкі і ў лес пыльнуў, толькі яго і бачылі. І ўжо з таго дня рэдка калі на паляну, у леснічоўку, удзень прыходзіў — баяўся, што стражнікі калі не заарыштуюць, з сабою не забяруць, дык застрэляць. Часцей па начах у леснічоўку наведваўся. Прыйдзе, торбу наладуе, распытае ў Тэклі, хто прыязджаў ці прыходзіў, хто шукаў яго, і, ноч пераспаўшы, як заяц, на адно вока, раніцою, а то і на світанні знікаў зноў на ўвесь дзень у лес...

Нешта гады ці не два ганяліся стражнікі за Хамой, лавілі яго. Здаралася, нават ужо за рукі трымалі, наручнікі спрабавалі надзець. Але раптам ці то сонныя, як мухі, падалі, ці пачыналі ўцякаць, разбягацца з крыкам хто куды. Бачачы, што з Хамой паквітацца так лёгка не

ўдасца, загадаў пан спаліць леснічоўку, што неўзабаве было і зроблена. Акружыўшы паляну мужыкамі — каб не перакінуўся агонь на лес! — леснічоўку падпалілі, папярэдне падклаўшы пад кожны вугал па добрай капе сена...

Дзень быў сухі, ціхі, не ветраны, і леснічоўка згарэла хутка, на вачах у людзей, як свечка...

А ўжо назаўтра ўночы загарэліся панскія хлявы, стайні. Загарэліся пад самую раніцу, калі людзі, напрацаваўшыся за дзень, сáма спяць. Пакуль прачнуліся, збегліся — тушыць не было чаго. Нават каровы, коні, валы пагарэлі, не гаворачы ўжо пра авечак і свіней. Сонца ўзышло, дзень пачаўся, а людзі не разыходзіліся ад пажарышча, хадзілі, глядзелі, абмяркоўвалі, выказвалі свае здагадкі, хто пеўня падпусціў — ці не Хама гэтак жорстка адпомсціў пану?

Зноў наехалі ў вёску стражнікі, па лесе разбрыліся, хацелі няйнакш Хаму злавіць. Толькі ж Хама не такі дурань быў, як здавалася пану. Забраўшы з сабою Тэклю, ён знік, схаваўся так, што лягчэй было іголку ў стозе сена знайсці, чым яго. Паблукаўшы па лясных нетрах і непралазях і дзень, і два, і тры — паехалі з вёскі стражнікі. Але не ўсе — некалькі чалавек асталося, каб панскую сядзібу вартаваць: баяліся, што і яе падпаліць раззлаваны Хама.

А Хама з Тэкляю так і асталіся жыць у лесе. І леталі там, і зімавалі. І нават калі нарадзілася ў іх дзіця, а потым і другое, не прасіліся ні да каго ў хату, неяк абыходзіліся. Без хаты, але не без людзей. Бо людзі спачувалі Хаме, памагалі, чым маглі. Да таго ж у вёсцы жылі бацькі і самога Хамы, і Тэклі. І яны, калі што якое, і папярэджвалі пра небяспеку, і з ядою, адзеннем стараліся — прыходзілі ва ўмоўленае месца, прыносілі. Тыя, хто сустракаў у лесе гэтую сям'ю, расказваюць — усё іхняе багацце заўсёды было з сабою ў мяшках, торбах. Куды ішлі самі, туды неслі за плячыма і ўсё, што мелі. Начавалі ж у стагах сена, у зямлянках, амаль норах, якіх Хама разам з Тэкляю нарабілі па ўсім лесе. Елі ж — харчаваліся ягадамі, грыбамі, арэхамі ці тым, што з вёскі сваякі прыносілі...

Так Хама з Тэкляю пражылі ў лесе амаль пятнаццаць гадоў, пакуль рэвалюцыя не адбылася, не прагналі з вёскі пана...

Але і пасля гэтага Хама не вельмі паверыў у тыя змены, што адбыліся, доўга яшчэ не вяртаўся ў вёску. Толькі калі аціхла грамадзянская вайна, новыя, савецкія парадкі прыйшлі на Палессе, вярнуўся Хама з Тэкляю да людзей,

пачаў жыць асела, на адным месцы. Казалі, ён за час бадзяжніцтва амаль развучыўся гаварыць, больш налягаў на рухі, свіст... Гэтакая ж бязмоўная, дзікая была і Тэкля.

Што ж да дзяцей — сына Паўла і дачкі Вольгі,— дык яны так і не прывыклі да вёскі. І дзень пры дні прападалі ў лесе — то ягады збіралі, то грыбы, то арэхі, то жалуды. Дадому, у вёску, прыходзілі хіба толькі начаваць. А ледзь світала, развідняла — кіраваліся, спяшаліся ў лес. З людзьмі ніякіх агульных спраў не мелі, бачылі каго — уцякалі. Нават па дарозе выпадкова калі з кім-небудзь сустракаліся, зварочвалі ўбок, адыходзілі...

Так адзінокія — Павел не жаніўся, Вольга не выходзіла замуж — яны і памерлі, не дажыўшы і да сарака год... Памерлі нават раней за сваіх бацькоў...

Селішча ж у лесе, дзе некалі стаяла леснічоўка, так ніхто і не займаў. Пастунова яно зарасло кустамі, дрэвамі. Цяпер і пазнаць ужо цяжка, што калісьці тут, на месцы, дзе раскашуецца, шугае, гамоніць з небам дубняк, бярэзнік, асіннік, была паляна, на якой стаяла хата і дзе спрабаваў снаваць сваё шчасце дзівак чалавек Хама...

## Заклятае месца

Яно, гэтае месца, амаль у самым цэнтры вёскі. Вось як ідзеш, падымаешся з грэблі на горку, сажалку мінеш, грушы Панасюковы — яны пры дарозе, голле з-за плота звісае, ды так, што каб гузак на лобе не набіць, прыгінацца трэба,— то адразу ж налева і зеўрае, бы выбіты ў роце зуб, дзірка — па абодва бакі вуліцы хаты, платы, сады, а тут — нічога ніякага няма, нават поле і тое не сеяна. Як на старонняга, прыезджага чалавека, дык чым бы не пляц — і пад хату, і пад гарод. Але... Вяскоўцы, асабліва старыя, калі даводзіцца міма ісці, нават шыі не павернуць, не паглядзяць туды — вочы ў зямлю апускаюць, а некаторыя, набожныя, хрысцяцца, шэпчуць: «Божа, не карай жорстка!» І непрыкметна хаду прыспешваюць, ледзь не бягом бягуць, каб далей, як мага далей быць. Сёй-жа той і зусім на другі бок вуліцы пераходзіць — навошта сябе спакушаць, злы дух злаваць, калі можна і без гэтага абысціся. Што, хіба другой дарогі няма, конча ля Панасюковых груш галаву згінаць, набліжацца да заклятага месца. Даўно ўжо новы, савецкі час, ніхто асабліва не верыць ні ў Бога, ні ў чорта, нічога ніякага не баіцца, а вось жа... Убачыць гэтае, запушчанае, пакінутае людзьмі

селішча, і быццам локцем хто яго таўхане — схамянецца: надта ж няўтульна тут, дзікасцю вее. Ды і тое, што ведае, чуў — цьфу, цьфу ты, нячыстая сіла! — міжволі — хочаш не хочаш — згадаецца, успомніцца... І дырэктар школы — малады, вясёлы, з чорнаю густою чупрынаю і белазубаю ўсмешкаю, што не паслухаўся нікога, хоць яго і папярэджвалі, паставіў на гэтым месцы раскошную пяцісценку, а тая нешта ці не праз год — раз! — і згарэла: маланка ў час навальніцы ўдарыла... І бухгалтарша — пажылая, кульгавая, з дзецьмі — хлопчыкам і дзяўчынкаю, што прыехала працаваць у калгас і пасялілася тут, на гэтым селішчы,— пайшла яна неяк, у печы выпаліўшы і дзяцей спаць паклаўшы, у кіно. А вярнулася — дзеці нежывыя: пачадзелі... І кінамеханік, адзінокі, трохі дзівакаваты хлопец, што пачаў быў жыць у хаце бухгалтаршы, нечакана для ўсіх аднойчы падхапіўся ўночы з пасцелі і зусім голы, як маці нарадзіла, па вёсцы з галёканнем бегаў, пакуль не злавілі яго ды ў бальніцу не завезлі... І шмат, шмат яшчэ чаго. Бясконца можна расказваць, што было з тымі, хто сяліўся тут. І ўсе, рана ці позна, адцураліся селішча. Не па сваёй ахвоце — здаралася тое, пасля чаго, каб і хацеў, нельга было, ніяк нельга жыць не толькі на гэтым селішчы, а і ў вёсцы...

І селішча паступова запусцела. Ды так, што цяпер нават сказаць цяжка, што тут, на гэтым зарослым быльнягом, крапівою і рознай іншай травяной нечысцю месцы, было селішча, стаяла хата, жылі людзі. Нідзе ж і знаку ніякага не асталося. Ні дрэўца, ні разоры, ні сцежкі. Трэскі — і то не ўбачыш, не знойдзеш. Пра чые-небудзь сляды ўспамінаць не варта. Нашто ўжо неразумная скаціна, а і тая не заходзіць сюды — ні каровы, ні коні, ні свінні. Хіба птушкі — вераб'і, шпакі, вароны — зрэдку залятаюць. Але і яны доўга не бавяцца — нешта надта ж хутка ўспырхваюць, даюць драла хто куды, няйнакш і ім няўтульна, ці мо што іх пужае... Словам, заклятае месца, дый годзе. Зноў жа, хто, калі і чаму яго закляў? Пра гэта таксама ў вёсцы асабліва ніхто не любіць расказваць. Дый хто пэўна што ведае? Можа, пачатак усяго трэба шукаць у сівой мінуўшчыне, калі, як гаворыць паданне, шацёр нейкі вельмі важны князь на гэтым месцы раскінуў, спаць на пуховых падушках лёг. І не прачнуўся — задушыў яго хтосьці ўночы, праз варту пракраўшыся цішком. А можа, у пазнейшых часах, калі, расказваюць, родныя браты тут за поле біліся — аднаму здалося, што другі захапіў у яго

некалькі лішніх баразён. І бойка тая скончылася крывава — у злосці брат брата віламі прапароў... А мо — пазней? Жыў, як зноў жа расказваюць, некалі на гэтым селішчы Трахім Воўк — з багацеяў ці не самы першы на вёсцы. Парабкаў адных меў больш за дзесяць. Тыя парабкі, змовіўшыся, забілі Трахіма. Самі ж, забраўшы, што каму хацелася, разбегліся, і іх лавілі стражнікі ці не з год, пакуль усіх да аднаго не пералавілі. Пасля Трахіма Ваўка пасяліўся на гэтым селішчы Іван — сын другога багацея з вёскі, Крэкатня. Але таксама шчасця не меў у час грамадзянскай вайны сям'ю яго — жонку і чацвёра дзяцей — тыф выкаціў, а самога яго, ужо ў калектывізацыю, раскулачылі, выслалі з вёскі. Хату ж Івана Крэкатня аддалі бежанцам, што, ратуючыся ад голаду, з Украіны да нас на Палессе паўцякалі. Бежанцы хто праз год, хто праз два павярталіся ў родныя мясціны, у хаце ж Івана Крэкатня асталася жыць удава Гарпіна з двума сынамі — чарнявымі, рослымі — Сцяпанам і Кузьмой. Сцяпан і Кузьма быццам зусім і не родныя былі, бо ані не ладзілі між сабою — сварыліся, біліся.

Калі пачалася вайна, і Сцяпан, і Кузьма на фронт разам з усімі мужчынамі пайшлі. Але доўга не паваявалі — Сцяпан першы дадому вярнуўся. І неўзабаве, як толькі немцы ў вёску прыехалі, начальнікам паліцыі стаў. Ну і люты ж ён быў, нікога ані не шанаваў, не шкадаваў. І цяпер, як успомняць яго, жахаюцца. І каб жа не любіў ён толькі некаторых, а то ж усіх людзей — нібыта папярок дарогі яны стаялі, жыць так, як яму хацелася, не давалі, замінаді. Ды што людзей — катоў, сабак, свіней, курэй, гусей ненавідзеў... Як ідзе па вуліцы — усё жывое хавайся, куды хто можа, бо інакш... Ці нагой, ці шомпалам ударыць, а то і з вінтоўкі стрэліць... І калі нешта ён загадваў рабіць, то ўжо ніякай патолі не чакай — кроў з носа, а зрабі, выканай. Адмаўляцца ці прасіць нават не спрабуй — лішнія турботы.

Кузьма зусім інакшы быў, поўная супрацьлегласць брату. І душэўны, і шчыры, і мяккі, згаворлівы. Увесь час нешта ці дома рабіў, ці людзям памагаў. А смяяўся як шчыра, ды і песні надта ж хораша спяваў, асабліва ўкраінскія. І калі ён вярнуўся з палону — а гэта было недзе перад Калядамі ў першы ж год вайны,— сёй-той павесялеў, абнадзеіўся: можа, Кузьма паўплывае на брата, не будзе той такі люты. Але дзе там! Наадварот, Сцяпан яшчэ люцейшы зрабіўся. Раней хоць дома, з маці ў хаце, часцей

сядзеў, а цяпер цэлымі днямі, нібы гіз яго кусаў, з канца ў канец па вёсцы, як шаленец, гойсаў, усё нечага патрабаваў, крычаў, загадваў, пагражаў... І нават калі дадому, у хату, да сваіх вяртаўся, то крык яго — прарэзлівы, піскрявы — адтуль чуўся. Як потым погалас па вёсцы пайшоў — Сцяпан з Кузьмой сварыўся, хацеў, каб той у паліцыю, служыць немцам ішоў. Кузьма ж, наадварот, угаворваў старэйшага брата апамятацца і, пакуль не позна, у лес, у партызаны, падавацца.

— Падумай, садовая галава твая, што з табою будзе, калі Саветы вернуцца? — казаў Кузьма брату.— Цябе ж на першай перакладзіне павесяць, у першай падваротні прыстрэляць. Ганьба якая! Брат — начальнік паліцыі, ворагу, акупантам служыць!

— Калі ты не паслухаешся мяне,— крычаў, тупаў нагамі на Кузьму Сцяпан,— не пойдзеш у паліцыю, я першы цябе застрэлю. Каб у мяне быў брат — абаронца Савецкай улады? Не дапушчу!..

Маці мірыла, супакойвала братоў — гэта былі яе дзеці, і ёй не хацелася, каб яны сварыліся.

Кузьма, вядома, у паліцыю не пайшоў, а, дачакаўшыся вясны, як толькі пацяплела трохі, у лес уцёк, у партызаны.

І Сцяпан яшчэ больш зацяўся. Ён перастаў нават спаць па начах — чакаў, калі вернецца, прыйдзе праведаць маці з лесу брат.

— Я не выпушчу яго з двара! — казаў ён маці.— Гэта ж трэба дадумацца! У лес, у партызаны, пайсці! Мне ж ніякага цяпер нідзе даверу! Я ў паліцыі, а брат... У лесе, у партызанах.

— Не будзь такі, Кузьма ж брат табе. Родны брат! — угаворвала маці.

— Калі ён кінуў дом, у лес, у партызаны, пайшоў,— ён вораг мне, не брат! — трос кулаком Сцяпан.

І Сцяпан дачакаўся, што Кузьма і праўда прыйшоў праведаць маці. Бадай, ён застрэліў бы брата, не даў бы таму і ў двор зайсці, калі б першая не згледзела, не ўбачыла малодшага сына маці і не кінулася да яго, не прыкрыла сабою.

— Страляй! — сказала яна Сцяпану.— У брата свайго і ў мяне заадно!

Нешта, мусіць, яшчэ было чалавечае ў Сцяпана, не ўсё выпетрылася, вытравілася, бо не стаў ён страляць, пусціў і Кузьму, і маці ў хату. А можа, нейкія іншыя планы ў га-

лаве ўзніклі, бо, як толькі схаваліся ў хаце брат з маці, ён замкнуў іх на замок.

— Цяпер не выпушчу, ніхто з вас не выйдзе з хаты! — крыкнуў ён зларадна з-за дзвярэй.— Заўтра раніцою аддам у рукі немцам! Няхай што хочуць з вамі робяць!

Пра што гаварыў Кузьма з маці, пра што гаварыла маці з Кузьмой, седзячы ў той замкнутой Сцяпанам хаце... Гэтага, на жаль, ніхто ў вёсцы не ведае. Расказваюць толькі: недзе пад раніцу, калі світанне ўжо недалёка было, маці пачала прасіцца, каб Сцяпан пусціў яе па пільнай патрэбе за хлеў. Сцяпан, кажуць, доўга ўпіраўся, але ўсё ж паддаўся на ўгаворы — адамкнуў дзверы, выпусціў маці. І, як толькі тая схавалася за хлявом, кінуўся ў хату... І ўбачыў на лаўцы... Маці.

— Як? — не паверыў, разгубіўся ён.— Ты дома, у хаце?..

І тады толькі здагадаўся, дайшло да яго, што яго падманулі, што не маці пайшла за хлеў, а, у хустцы, пераапранены ў матчынае адзенне, брат, Кузьма. І, сарваўшы з пляча вінтоўку, кінуўся з усіх ног як апантаны з хаты, пабег таксама за хлеў... Але... Кузьмы і след прастыў, бо адразу ж за хлявом пачыналіся кусты, а там, далей, і лес. Патыкацца, бегчы туды Сцяпан збаяўся — раптам засада, на партызанскія штыкі ці кулі напарашся...

Вярнуўшыся ў хату, дачакаўся Сцяпан світання, а тады падняўся з лавы, на якой, як вартавы, сядзеў побач з маці, і загадаў ёй збірацца — хацеў весці ў паліцэйскую ўправу.

— Не пайду, нікуды з хаты не пайду,— сказала маці.— Тут мяне страляй, няхай людзі ведаюць, які ў мяне сын!

Усё ж смеласці страляць у маці ў Сцяпана не хапіла. І сілаю выганяць з хаты, цягнуць за валасы па вёсцы, як цягаў ён іншых жанчын... І ад гэтага таксама нешта яго стрымала. І ён, пагардліва, злосна акінуўшы вачыма маці, выйшаў з хаты...

Тое, што не зрабіў сын, зрабілі немцы. У поўдзень яны прыехалі з мястэчка ў вёску і... застрэлілі Гарпіну. Застрэлілі ў хаце, бо выходзіць на падворак, ісці ці ехаць кудынебудзь яна рашуча, наадрэз адмовілася...

Людзі завезлі Гарпіну на могілкі, пахавалі яе...

Сцяпан у той жа дзень знік з вёскі, бы ўсё адно і не жыў тут. Больш яго ніхто нідзе не бачыў. Адны казалі: слўжыць немцам недзе ў бліжэйшым горадзе, другія — што завербаваўся і паехаў у Нямеччыну.

Кузьма ж партызаніў, ваяваў. І, кажуць, храбра, адчайна. І толькі перад самым вызваленнем загінуў у адным з баёў...

Яго пахавалі на нашых вясковых могілках побач з маці...

Гарпініну ж, правільней, хату Івана Крэкатня, у якой ніхто не сяліўся, ніхто не жыў, спалілі тады ж, як палілі ўсю нашу вёску,— немцы...

Быў зусім нядаўна я зноў у сваёй вёсцы. І парадаваўся, што заклятае месца ў бліжэйшы час знікне — там, дзе яно, з асушэннем балот і будаўніцтвам саўгаса, пройдзе асфальтаванка, якая злучыць вёску з іншымі дарогамі, што вядуць у вялікі і шырокі свет...

*1984 г.*

# Горкая радасць вяртання

## I

Шасцідзесяцігоддзе Івана Кузьміча Адамейкі спраўлялі ў рэстаране. І па тым, хто прыйшоў на юбілей і што гаварылася ў тостах, можна было меркаваць — становішча ў Івана Кузьміча цвёрдае і непахіснае, быць яму доўга яшчэ на сваёй пасадзе.

Аднак і сам Іван Кузьміч, ды і многія з тых, каму выпаў гонар сядзець у той вечар за сталом у рэстаране ў надта ж шаноўнай кампаніі і хто па-сапраўднаму шчыра зайздросціў юбіляру — які ён уплывовы, аўтарытэтны і зусім не стары, рухавы — не скажаш, што яму шэсцьдзесят! — памыліліся. Нешта ці не праз тыдзень пасля трыумфу — а інакш і нельга было назваць гэты юбілей — Івана Кузьміча выклікаў непасрэдны яго начальнік і з нейкай ненатуральнай саладжавай усмешкай і вельмі празрыстымі намёкамі пачаў размову пра здароўе, пра тое, як неабходна яго берагчы, асабліва ў паважаным узросце, і як добра наогул нідзе не працаваць, жыць без усякіх лішніх клопатаў, а потым раптам, павярнуўшыся тварам да Івана Кузьміча, прапанаваў, каб не марудзіў, афармляў як мага хутчэй паперы на пенсію. Апошняе было поўнай нечаканасцю для Івана Кузьміча, ён аж не вытрымаў, падняўся з крэсла, у якім сядзеў насупраць непасрэднага свайго начальніка.

— А там,— паказаў ён рукою ўгору,— як на гэта паглядзяць?

— На што — «на гэта»? — спытаў непасрэдны начальнік — чалавек увогуле мяккі, памяркоўны.

— Ну, што на пенсію я...— ледзь вымавіў ад хвалявання Іван Кузьміч.

— Ухвальна, станоўча.

І, перагнуўшыся праз шырокі паліраваны стол, які быў спрэс завалены паперамі, даверліва, нібыта па-сяброўску, зашаптаў:

— Дарэчы, каб ты ведаў, адтуль і каманда паступіла... Ну, сам разумееш, вызваліць цябе ад пасады, на пенсію паслаць... Можа, кагосьці трэба ўладкаваць... Так што...

Іван Кузьміч больш не садзіўся ў крэсла, а пастаяўшы, быццам у одуме, угнуў у плечы галаву і, ні слова не кажучы, моўчкі падаўся прэч з кабінета. Было як ніколі, крыўдна, аж у вушах зазвінела, слёзы, здаецца, з вачэй пырснулі... Так шчыраваў, працаваў, як вол, нічога ані не шкадаваў, ні здароўя, ні часу, дбаў толькі пра справу... І вось, бачыш,— ацанілі, аддзячылі...

Не помніў, як і да сябе ў кабінет вярнуўся, зноў у крэсла, звыклае, наседжанае гадамі, апусціўся. Паглядзеў на паперы, што акуратна ляжалі і злева, і справа на стале і патрабавалі то ўзгаднення, то проста подпісу, і адсунуў іх далей. «Няхай іншы ўжо ўзгадняе, падпісвае. А я...»

Падняўся з-за стала, паволі прайшоўся па кабінеце. Усё тут было знаёмае, сваё. Вокны, што выходзілі ва ўтульны ґарадскі скверык; стол, за якім працаваў, і стол, за якім сядзелі тыя, каго выклікаў на розныя нарады і пасяджэнні; паркетная падлога, засланая зялёнай, з чырвонымі палосамі па краях, мяккай варсістай дарожкай; шафы — яны стаялі ўзбоч сцен — там бялелі, жаўцелі папкі з рознымі дакументамі; падстаўкі з тэлефоннымі апаратамі і шклянкамі, вадою ў графінчыку; тэлевізар, радыёпрыёмнік... Усё патрэбнае, нічога лішняга... На працягу многіх гадоў яно верна, надзейна служыла яму... А цяпер... Будзе служыць іншаму, хто прыйдзе сюды, зойме яго месца... Можа, нават таму, хто ніколі не прыяў, вёў розныя падкопы...

Аж сцехануўся — не па сабе зрабілася.

«Трэба ж, каб так... А я марыў... Пра што толькі не марыў! І пра пасаду новую, вышэйшую, і пра кабінет прастарнейшы, і пра магчымасці больш уплываць на ход розных спраў і падзей... А яно вунь як павярнулася! І тое, што меў, адбіраюць...»

На хвіліну ўявілася — ён бяжыць, бяжыць, а яму — пута на нагі, і ён... падае, ляціць потырч носам у пясок.

«За што, за што? І каб жа сілы не было, здароўе не дазваляла... А то ж... Можа, кагосьці трэба ўладкаваць... Дык... Толькі з-за таго, што кагосьці трэба ўладкаваць... мяне, вопытнага, з такой практыкай і ведамі, у каршэнь?..»

«Табе ж шэсцьдзесят...» — падказала нейкая быццам палахлівая думка.

«Ну дык і што?»

«На пенсію пара. Стары ты!»

«Стары... Няўжо і праўда я стары?»

Стаяў нейкі час як сам не свой, думаў над тым, што

хтосьці быццам падказаў, напомніў, сіліўся зразумець, усвядоміць тое.

«Ну, вядома ж, не малады... Але стары?..»

«Шэсцьдзесят ёсць шэсцьдзесят»,— напамінаў, аглавушваў хтосьці нябачны.

«Таксама нібыта праўда. Шэсцьдзесят — гэта не трыццаць, не сорак і нават не пяцьдзесят...»

Зрабіў крок, другі — і зноў спыніўся. Глыбокі, як вечнасць, одум ахапіў раптам.

«І калі, калі мінулі тыя гады? Здаецца ж, і не жыў яшчэ, збіраўся толькі жыць... Усё праца і праца. Адно не паспее скончыцца, новае пачынаецца. Паездкі розныя, нарады... Не жыццё, а быццам адзін суцэльны бясконцы дзень. Асабліва як на пасаду вылучылі... Ды і раней, таксама... А цяпер... На пенсію... А на пенсіі што? Есці, спаць? О не, гэта не мне... Што заўгодна, толькі не гэта...»

Кінуўся як апантаны да тэлефона, трубку зняў... І застыў у нерашучасці...

«Званіць?.. Але каму?.. Хто абароніць, заступіцца, хто не дасць, каб мяне вызвалілі ад пасады, хто паможа?.. Васіль Пятровіч?.. Але ж і ён ужо — лічы — пенсіянер... Пятро Адамавіч?.. Не, гэты не паможа, хутчэй парадуецца, пасмяецца... Трахім Трахімавіч?.. Ён сам ужо даўно без улады, хоць быццам яшчэ і пры пасадзе... Антон Мікалаевіч?.. Не, гэты пра сябе толькі дбае, сабе б толькі добра было. А астатнім... Што яму да ўсіх астатніх... Нават пальцам не паварушыць...»

Сядзеў, перабіраў у думках усіх сваіх уплывовых знаёмых Іван Кузьміч і не ведаў, не знаходзіў тых, хто б памог, хто б за яго заступіўся. Ды і прызнавацца, што вызваляюць ад пасады, прапаноўваюць пайсці на пенсію... Не хацелася, ой як не хацелася. Толькі прызнайся, скажы каму аднаму — назаўтра ўвесь горад ведаць будзе...

«Можа, не па тэлефоне... Машыну выклікаць ды паехаць... Але да каго, да каго ехаць, хто зразумее мяне, як сябе, хто маё гора прыме, як сваё?.. Ды нават калі і знойдзецца такі, хто зразумее мяне, як сябе, хто маё гора прыме, як сваё, ці асмеліцца ён з кім-небудзь гаварыць, абараняць, заступацца, асабліва калі даведаецца, што каманда зверху паступіла, месца трэба вызваліць, каб некага ўладкаваць?.. Хто той, каго трэба ўладкаваць?.. Можа, паніжаюць... А можа, павышаюць?.. І ў яго... Такая сіла, такія сувязі, што любы здасца, любы спасуе — не абароніць, нават каб і хацеў...»

Палажыў тэлефонную трубку на апарат, зноў падняўся з крэсла, захадзіў сюд-туд па кабінеце.

## II

Так і не пазваніў у той дзень каму б там ні было Іван Кузьміч, так ні да каго і не паехаў, нікому ні ў чым не прызнаўся, не папрасіў памагчы. Тое ж было і назаўтра, паслязаўтра... Знешне ні ў паводзінах Івана Кузьміча, ні ў ладзе жыцця быццам нічога не змянілася. Раніцою, як і заўсёды, як гэта было гадамі, прыязджала да самага пад'езда блакітная «Волга», забірала, вязла ў тую ўстанову, дзе працаваў, увечары прывозіла зноў дадому. Дома Іван Кузьміч чытаў газеты, глядзеў тэлевізар — праграму «Час» (цікава было ведаць, дзе што дзеецца на свеце, дый каго ўзнагародзілі ці на якую новую пасаду прызначылі), потым піў чай, клаўся спаць. На працы таксама ён, як і раней, падпісваў розныя паперы, званіў па тэлефонах, узгадняў, даваў распараджэнні — словам, кіраваў. Але саслужбоўцы нібыта пра штосьці ўжо ведалі, здагадваліся, бо былі ці занадта ласкавыя з ім, ці то кпліва-смяшлівыя і ўсё пра нешта між сабою шапталіся, няйнакш абмяркоўвалі, паведамлялі тым, хто яшчэ не ведаў, што Іван Кузьміч... Словам, нядоўга яму быць на пасадзе, апошнія, можна сказаць, дзянёчкі кіруе, апошнія аддае распараджэнні, апошнія падпісвае паперы, усё апошняе тут, ва ўстанове, робіць. Бачыў аднойчы Іван Кузьміч, як ляцела, падаючы, падстрэленая птушка — качка. Здаецца, і крыламі яшчэ махала, і кудысьці быццам імкнулася, ляцела, а ўжо і сама яна, і лёт былі не тыя, не тыя...

Такой падстрэленай птушкай адчуваў сябе ўсе гэтыя дні Іван Кузьміч. Ляцеў, падаў і — галоўнае — не ведаў, што яму рабіць далей, як спыніць свой лёт, сваё падзенне. Усе рухі, воля былі як паралізаваны.

«Ну, на месяц, ну, няхай у лепшым выпадку на год мяне затрымаюць на пасадзе, абароняць,— думаў Іван Кузьміч.— А там, там... Усё адно пакідаць жа службу давядзецца, вечна на ёй не будзеш... Рана ці позна трэба на пенсію ісці. І, можа, лепш не супраціўляцца, а адразу ж, як прапанавалі, і выправіцца. Калі я дужы яшчэ, не хварэю...»

«Але што, што на той пенсіі рабіць?» — спыняла кожны раз яго думка.

У тыя дні і ўспомніў Іван Кузьміч сваё мінулае, дзяцінства сваё басаногае, вясковае ўспомніў. Як прачынаўся

сярод ночы ад крыку пеўняў, як ляжаў у пасцелі і слухаў пераліўы самых розных галасоў — і свайго рослага, з высокай шыяй і доўгім жарым хвастом пеюна, і іншых, суседскіх, усёй вёскі... А потым, ужо на світанні, трубіла пастухова труба, рыкалі каровы... Бразгалі, плюхалі на дно калодзежаў цяжкія, акутыя меддзю, драўляныя вёдры, брахалі, аж заліваліся, сабакі... Вішчалі галодныя пасля ночы свінні, гагаталі гусі і качкі, кудахталі куры... Шчабяталі ластаўкі, ціўкалі, здаецца, пад самымі вокнамі, вераб'і... А то чамусьці ўспаміналася, як касілі на балоце сена. У лапцях, па калена ў вадзе. Бацька з касою паперадзе, а ён, Іван, трохі збоку, след у след за бацькам. Каса-літоўка брала траву добра, аж выядала. Жжык-жжык-жжык... Спыняліся, мянташкай па лязе касы — шах-шах! — і зноў — жжык-жжык-жжык... Праз дзень-два пракосы пераварочвалі і, калі яны падсыхалі, ссоўвалі, зграбалі ў копы. Адзёнак з лазняку бацька масціў, і зносілі да яго копы, складвалі стог... Сенакос канчаўся, жніво надыходзіла. Першы звычайна паспяваў ячмень. За ім — жыта, проса, авёс. Жалі, касілі ўсёю вёскаю, гуртам. Круцілі тугія перавяслы, вязалі снапы. Снапы зносілі, ставілі ў бабкі. Потым вазілі вазамі на ток. Што адразу ж малацілі, а што пакідалі і на пасля, калі зіма прыйдзе, рабіць не будзе чаго. Бо ўлетку, да самай глыбокай восені,— няўпраўка. Не паспееш з жнівом скончыць — лён трэба браць, каноплі. А там, глядзіш, і на бульбе гіч пачарнела, зжоўкла — капаць трэба бульбу. Каня ў плуг — і... І падворваць, і выбіраць, і на воз грузіць, і вазіць, і сушыць... Важданіны з бульбай да самых халадоў хапала, бо яе трэба і перабраць, і ў капцы закапаць. Ды так, каб і не згніла, і не змерзла. За бульбаю — буракі, капуста... Капусту зразалі ўжо ў маразы, і яна аж рыпела і сакаўная-сакаўная была. Прывозілі качаны, скідвалі ў камору, у сенцы. І тады збіралася жаночая талака, пачыналася шаткаванне. Скраблі моркву, рэзалі, крышылі на дробныя кавалачкі, сыпалі ўкроп, соль, таптал і ў бочкі. І, разгарачаныя працаю, вясёлыя маладзіцы, быццам пахваляючыся адна перад адною, хрупасцелі тугімі, крохкімі храпкамі, смяяліся, жартавалі — давольныя жыццём, сваім лёсам, усім тым, што лета дало, а найбольш — ураджаем. А потым, неўзабаве, пара і кабана свежаваць надыходзіла. Швайкай яму пад левую лапатку, і, калі ён знемагаў, падсцілалі салому, клалі на яе кабана, саломай — залацістай, шапаткой — накрывалі яго і падпальвалі, раскладва-

лі цэлае вогнішча — смалілі. І ўжо жоўценькага, абскрэбенага нажамі, мылі на двары — аж пара з яго валам валіла. Ну, а пасля... Уносілі, як бога, на руках у хату, браліся разбіраць. Сала — доўгія белыя палосы — складвалі ў адно месца, мяса — у другое. Асобна клаліся і галава, ногі, вушы, хвост... А тым часам палілася ў печы, ставілася поўная патэльня свежыны, і ўжо сквірчэлі, напаўняючы хату самымі размаітымі смачнымі пахамі, аж у носе казытала, слінкі цяклі,— шкваркі... Ці на гарышча хто-небудзь лазіў, прыносіў адтуль — такіх увосень кіслых, аж у рот не ўзяць, а цяпер, у мароз, смачных — за вушы не адцягнеш — журавін ці ле́скавых яблык...

Згадваліся і тыя балоты, што распасціраліся, век векавалі навокал вёскі. Вясною іх залівала вада. Ды так, што з вёскі выйсці нікуды нельга. Хіба толькі на чоўне можна было пераправіцца на сухое. Дзікія качкі, кнігаўкі, буслы, жураўы... А камароў, аваднёў, машкары — цэлыя хмары! І паратунку ад іх нідзе нікому — ні жывёле, ні чалавеку. Раскладвалі куродым, укрывалі цела чым толькі можна. Ды камары, авадні, мошкі знаходзяць усё адно, дзе ўкусіць, і кусалі, кусалі... А жаб колькі! Па вечарах такія, бывала, канцэрты наладжвалі, што аж у вушах глухла. А ўжо што да вужоў, гадзюк, чарапах, мядзянак розных... Кроку не ступіш, каб на іх не патрапіць. І ўюноў, рыбы... Вось як спадзе трохі вада, бяры комлю — і гайда лавіць... Лотаць зацвіце — аж жаўцеюць балоты. А потым іншыя краскі — люцікі, зязюлькі, пеўнікі, галкі... К восені балоты жухлі і рыжэлі. Падаў снег, але ў балоты ўсё адно не ўлезці — рэдка калі яны замярзалі. Часцей жа багна аставалася багнай на ўсю зіму. У сухія ж гады, калі вада спадала, балоты гарэлі. Дым аж вочы выядаў, засцілаў усё навокал густою павалокаю, асядаў у горле. І тушыць балоты ніхто нават не спрабаваў — не атушыш. Ямы па некалькі метраў углыбіню выгаралі, дрэвы — бярозы, вольхі, сосны — усё адно што ў прорву падалі. Іскры толькі ўгору фантанам пыхнуць — і ўсё. Тут стаяла купка дрэў — тут яе няма. Людзі, жывёла аж знебываліся, месца сабе нідзе не знаходзілі...

«Цікава, што цяпер там? Я ж, як паехаў з вёскі, так і не наведваўся. Ды і што мне там было рабіць?»

«Як гэта што? — не згадзілася з ім нейкая ўпартая думка.— Хоць на могілках пабываць, пастаяць ля магілы бацькі і маці, пакланіцца... Можа ж, не праз каго ж небудзь, а праз цябе пайшлі яны раней часу на той свет...»

Згадалася, згадался і тое. Ён, Іван, камсамолец быў. І заядлы. Школу, дзевяты клас, канчаў, пра інстытут марыў. А тут... Немцы прыйшлі. Ні дня не стаў чакаць — у лес, у партызаны, падаўся. Відаць, хтосьці з вяскоўцаў яго бачыў, калі ён уночы да бацькоў з лесу прыходзіў, торбу з харчамі браў. І выдаў немцам. Тыя і ўзялі бацьку, маці. Патрымалі нешта ці не з тыдзень у мястэчку ў камендатуры, а потым прывезлі назад у вёску і...

«Трэба было хоць помнікі на магілах паставіць,— папракнуў сябе Іван Кузьміч.— А то... Сын, называецца... Ды і сястра ж родная, Агапа, у вёсцы жыве...»

Быццам да раны дакранаўся Іван Кузьміч, калі ўспамінаў Агапу. Жыла яна ў той самай вёсцы, Ліпаўцы, дзе і нарадзілася, дзе і ён, Іван Кузьміч, некалі жыў. Жыла адна, бо дзеці — сын і дачка — паехалі з вёскі. Завербаваліся і паехалі. Сын ажаніўся, дачка выйшла замуж. І жылі далёка, аж на Сахаліне. Агапа ж асталася дома, у вёсцы. Рабіла ў калгасе, ела хлеб з працы рук сваіх. Зрэдку яму, брату, пісьмы пісала. А то і пасылачку іншы раз прысылала, найчасцей, калі кабана біла — некалькі штыглікаў сала, каўбаску дамашнюю, кавалачак крывянкі і каўбушка. А збоку, у мяшэчак асобны,— гарбузікаў насыпле...

«Свая, родная,— думаў у такія хвіліны ён, Іван,— І недый успамяне брата...»

І расчульваўся тады, на крыўду, што насіў, быццам камень, на сястру, забываўся — папракнула яна некалі, сцебанула, бы трапкачом па вачах, што ён, Іван, вінаваты ў смерці бацькі і маці: каб, маўляў, не ён, не яго партызанства, жылі б бацька і маці, не расстралялі б іх немцы...

І ў тым, што не наведваўся ў вёску ён, Іван, вінавата была, вядома ж, і яна, Агапа. Не хацелася сустракацца з ёю, чуць папрокі...

«Але цяпер... І Агапа, і я не тыя ўжо... Дый боль... Не той... Задаўніўся, прытупіўся... — падумаў Іван Кузьміч. — І мне... Паехаць трэба ў вёску... Паглядзець, што там... У Агапы пабываць, на магілах бацькі і маці... Ды, можа... Калі што якое... І пажыць. Няхай тут выслужваюцца, адзін перад адным шчыруюць, паперы розныя пішуць, засядаюць, а я... Пажыву, як некалі, даўным-даўно ў маленстве, у дзяцінстве жыў... І мяне ніхто бачыць не будзе, і я таксама нікога бачыць не буду. Вось як афармлю, атрымаю пенсію, дык і паеду, ні дня ў горадзе не буду»,— сказаў сабе, вырашыў Іван Кузьміч.

## III

Пенсію афармілі хутка, праз які месяц. І ўжо ў першай палове мая, перад самым Днём Перамогі, арганізавалі Івану Кузьмічу афіцыйныя провады — паставілі на стол кветкі, адкаркавалі бутэльку шампанскага, сказалі на развітанне некалькі прамоў («як усе яго любілі і як яго ўсім не будзе хапаць»), падарылі чыгуннага каня і транзістарны радыёпрыёмнік («каб здаровы і дужы быў, як конь; і каб надта не сумаваў — калі што, слухаў радыё») — і... апошні раз завезла Івана Кузьміча службовая «Волга» дахаты.

Нялёгка ўсё гэта было перажыць Івану Кузьмічу. Суцяшала хіба толькі адно — у кішэні ляжаў білет на звычайны рэйсавы міжгародні аўтобус — ён, гэты аўтобус, павінен быў давезці Івана Кузьміча да мястэчка, ад якога было кіламетраў васемнаццаць да роднай Ліпаўкі.

«Паеду пагляджу, што там і як,— думаў Іван Кузьміч.— Калі ўмовы нішто сабе, то вярнуся, захаплю самае неабходнае ды і жыць астануся ў Ліпаўцы. Вясною, улетку буду памагаць сеяць, касіць, убіраць, малаціць, а зімою — дровы сячы, на паляванне хадзіць... Са знаёмымі сустрэнуся, хоць нагаваруся. Жылі ж неяк людзі там, у вёсцы, поле ўраблялі, хлеб сеялі, дзяцей гадавалі. Цікава, хто чаго дамогся, да старасці з чым прыйшоў? Ды і вёска, Ліпаўка, як цяпер выглядае, што там змянілася? Не адзін жа дзесятак гадоў мінуў з таго дня, як быў я там...»

Згадвалася — і неаднойчы — паездка тая... Ён, Іван, звольнены ў запас, яшчэ ў афіцэрскай форме, пры пагонах, падацца не ведаў куды — толькі што закончылася вайна, амаль чатыры гады ён праваяваў, то ў партызанах, то ў рэгулярнай арміі, аж да Германіі, Берліна, дайшоў. Спецыяльнасці ніякай не меў, тое, што вучыў некалі ў школе, амаль забылася, выветрылася. Праўда, нешта і набылося, што можна, відаць, назваць жыццёвым вопытам. Куды ж тады было яму ехаць, як не ў сваю родную вёску, да свайго кубла. Да мястэчка, Ельнікаў, сяк-так дабраўся дзе цягнікам, дзе на спадарожных машынах, фурманках. А з Ельнікаў да Ліпаўкі ўжо дабіраўся пешкі. Ды хадзіць яму было не прывыкаць — не такія адлегласці перамерваў нагамі, асабліва як у партызанах быў, на розныя заданні аж у суседнія вобласці забрыдаў. Ішоў ён, Іван, тады па дарозе ў родную вёску і аж не верыў, што ўсюды цішыня тут стаіць, вайна скончылася. А цішыня сапраўды была

рэдкая, гаючая. Толькі птушкі спявалі ды дрэвы, што скрозь паўз дарогу густа, сцяною, стаялі — дубы, бярозы, ясені, сосны,— шумелі. І... грыбы — баравікі — то тут, то там сядзелі. Усе як на падбор, моцныя, тугія — ні чарвяточынкі нідзе. Споднюю кашулю з сябе зняў і поўную назбіраў баравікоў. Не хочучы, бо нават з дарогі нідзе не звaрачаў, а браў толькі тыя, што паўзбоч сядзелі і якіх проста грэх было не ўзяць...

Вёска сустрэла Івана радасна. У бацькоўскую хату, дзе жыла сястра, Агапа, і куды ён завітаў — дзверы проста не зачыняліся, ішлі і ішлі людзі. Усіх цікавіла — і дзе ён быў, як ваяваў, і ці не паранены, а найперш, што больш за ўсё клапаціла кожнага — гэта ці знаёмых каго сустракаў, ці ведае што-небудзь пра каго з іх.

Агапа таксама была рада, што брат жывы, здаровы з вайны вярнуўся. Грыбоў насмажыла, нават бутэльку самагонкі знайшла, на стол паставіла. І ўсё расказвала, расказвала, як яна хавалася, баялася, каб і яе немцы гэтак жа не застрэлілі, як і бацьку, маці...

Схадзіў тады ён, Іван, і на могілкі, ля крыжоў, што на магілах бацькі і маці яшчэ не зусім пачарнелі, галаву апусціўшы, пастаяў. Не ўтрымаўся, нават слязу скупую, мужчынскую, пусціў, заплакаў...

— Раней трэба было пра бацькоў думаць,— сказала, кінула як папрок тады сястра, Агапа.— А цяпер... З таго свету іх не вернеш...

Разумеў, усё разумеў Іван. І ўсё ж... Пакрыўдзілі яго, за жывое кранулі тыя словы. Падумаў: лепш не жыць, не быць у вёсцы, з'ехаць адсюль куды-небудзь... Бо і магілы гэтыя... І Агапа... Хочаш не хочаш, а напамінаць, заўсёды будуць напамінаць пра бацьку і маці, іх такую раннюю і недарэчную смерць...

І з'ехаў. Якраз тады ішло будаўніцтва двух вялікіх заводаў у Мінску, ён, Іван, прачытаў пра гэта ў газетах і...

Уладкаваўся на будоўлю, у вячэрнюю школу, каб веды ўзнавіць, паступіў. Потым, завочна,— і ў інстытут. Працаваў і вучыўся. А там неўзабаве і на іншую працу, па спецыяльнасці, перайшоў. Жаніўся. І хоць пісала сястра, Агапа, з вёскі пісьмы, прасіла, каб прыехаў — не ехаў Іван. І часу не вельмі было, ды і не цягнула дамоўка. Не хацелася раны вярэдзіць, тое, што некалі здарылася, зноў успамінаць... Сястра, Агапа, праўда, сама разы два-тры да яго прыязджала. І калі замуж выйшла, і яшчэ неяк. Але і ў яе жыццё не лепшым чынам пайшло — муж, Стась,

пажыўшы гадоў з сем, пакінуў яе з двума дзецьмі, сам некуды з'ехаў. А потым і дзеці павырасталі і таксама паз'язджалі з вёскі. Адна зноў Агапа асталася. Пісала неяк, што жыве не горш ад астатніх людзей. І прасіла, прасіла, каб ён, брат, прыехаў пабачыцца, пагаварыць...

Але ён, Іван, не ехаў...

«Здзівіцца Агапа, калі ў хату да яе як снег на галаву звалюся,— думаў Іван.— Вачам сваім не паверыць...»

## IV

Зборы ў дарогу занялі няшмат часу. За якога паўдня Іван Кузьміч і купіў, што трэба, і чамадан спакаваў. Ды так, што нават жонка ні пра што не здагадалася. Падумала няйнакш,— муж у нейкую чарговую камандзіроўку едзе. Гаварыць жа, што ён, Іван Кузьміч, ужо не працуе, на пенсіі, не хацелася.

«Няхай, само сабой усё стане вядома,— падумаў Іван Кузьміч.— Бо інакш...»

Не, не было ў Івана Кузьміча тых адносін з жонкаю, якія ў іншых бываюць, не была жонка яму сябрам і самым блізкім, дарагім чалавекам, даўно не гарнулася ў яго да яе душа. Можа, таму так і аддаваўся ўвесь без астатку ён працы, бо шчасця, радасці дома не меў. А пачыналася ж усё быццам добра, лепш і не трэба... Потым ужо, калі дачка, Іна, у іх нарадзілася, даведаўся Іван Кузьміч, што жонка яго, Надзя... жыла ўжо з мужчынам. І не з кім-небудзь — з прыслужнікам фашысцкіх акупацыйных улад... Нібыта баялася, каб на работы ў Нямеччыну не вывезлі. А тым часам... Хто ведае, як там і што было... Хацеў адразу ж кінуць яе, развесціся. Але дзіця, дачушка Іна, стрымала. Надта ж маленькая, кволенькая была яна і да бацькі лесцілася, з рук не злазіла. «Ладна,— падумаў тады Іван Кузьміч,— падгадую трохі малую, тады Надзю кіну». Але... Так і не кінуў. Сынок, Паўлік, нарадзіўся, і зноў, ужо да сына, прыкіпела ў Івана Кузьміча душа. Пагадаваў, паставіў на ногі, усё, што трэба, здаецца, дзецям даў. Дачка замуж выйшла, сын жаніўся. Але радасці, шчасця ў хату не прынеслі. Сын амаль спіўся, ні жонкі, ні дзяцей не глядзеў. І хоць ён, Іван Кузьміч, памог сыну займець асобную кватэру, не ўжыўся той з сям'ёю, да бацькі назад вярнуўся. І дачка не ўжылася са сваім мужам. Нарадзіла малое, а потым і яшчэ адно... Ад каго другое — не сказала. Так і жывуць усе ў яго кватэры. Сын

п'е, дачка... Прыводзіць да сябе мужчын, начуе з імі... І слова супраць не скажы — жонка на абарону сына, дачкі зверам кідаецца... І раней, з тых дзён, як даведаўся ён, Іван Кузьміч, што Надзя жыла да яго з некім, ды яшчэ з прыслужнікам акупацыйных улад, і, выходзячы замуж, не прызналася яму ў гэтым, не было асаблівай блізкасці, быццам уракнуў яго хто, чужая, зусім чужая яна яму стала. А цяпер — і пагатоў. Не, не, знешне нібыта ўсё прыстойна было. Сям'я як сям'я. Толькі Іван Кузьміч усё больш і больш замыкаўся ў сабе, у працу з галавою закопваўся. І аддаляўся, аддаляўся ад Надзі. А потым, калі ўбачыў, што і дзеці не ў яго ўдаліся, не па яго слядах пайшлі,— і ад дзяцей. Не цягнула, не вабіла Івана Кузьміча сям'я. Таму і заседжваўся на працы пазней за іншых. Вернецца дадому, тэлевізар паглядзіць, чай пап'е — і спаць. А ледзь раніца — зноў на працу. Адпачываць таксама Іван Кузьміч ніколі разам з жонкаю, а тым больш з дзецьмі, не ездзіў. Ім асобна пуцёўку прасіў, сабе — асобна. Бо жонка, дзеці раздражнялі яго, надакучалі. А так, адзін, ён сапраўды адпачываў, гаіўся душою...

«Хто яго ведае,— думаў іншы раз Іван Кузьміч.— Каб Надзя не падманула мяне, не было ў яе таго прыслужніка... Можа б, па-іншаму ўсё ў сям'і склалася. А так... Ды што шкадаваць таго, чаго няма і што, як бы ні хацеў, ужо не паправіш, не вернеш. Ніколі, ніколі не вернеш...»

І цяпер, збіраючыся да сястры ў вёску, зноў пашкадаваў Іван Кузьміч, што ў яго дома, у сям'і, ладу, шчырасці, даверу няма. Гаварыць, што на пенсію выправілі, куды ехаць сабраўся, і то... Быццам чужыя мы людзі. Ды дзе там чужыя... І сярод чужых шчырасць, давер бываюць, а то... Нібыта варожасць якая, злосць. Сказанае нават мімаходзь слова раздражняе. Добра, што кватэра вялікая. Кожны пакой свой мае. Прабяжыць па калідоры, куды трэба — на кухню, у ванну ці ў туалет,— і хаваецца, як у нару, у свой пакой. І калі хто на калідоры ці на кухні — другі не спяшаецца ісці, чакае, каб не сустракацца.

«Ну і сямейка,— не-не дый круціў галавою Іван Кузьміч.— Няхай ужо са мною ні ў каго злагады няма, але ж і між імі самімі — жонкаю, дачкою, сынам... Бы каты з сабакамі жывуць. Гыр ды гыр...»

Шкадаваў, неаднойчы шкадаваў Іван Кузьміч, што ў свой час не развёўся з Надзяю. І яна не мучылася б, ды і ён сам... І дзеці... Іх, дзяцей, найбольш шкада было. «У нас з Надзяю хоць бачнасць сям'і ёсць, а ў іх... і таго няма».

Спрабаваў ушчуваць і дачку, і сына Іван Кузьміч, гаварыць, што не так, як трэба, яны жывуць.

— А вы... Нібы вы з мамаю жывяце так, як трэба? — кідалі папрок яму і сын, Павел, і дачка, Іна.

Угінаў галаву ў плечы Іван Кузьміч і хаваўся ў сваім пакоі. Праўда, усё праўда...

І рабіць што далей — не ведаў, ані не ведаў Іван Кузьміч. Так і да пенсіі, бачыш, дажыў... А цяпер... Што цяпер?..

## V

Увечары, на заходзе сонца, выклікаў Іван Кузьміч таксі, паехаў на вакзал. Аўтобус, нарыхтаваны ў дарогу, ужо стаяў на пляцоўцы. І Іван Кузьміч, пагрузіўшы чамадан у багажны адсек, зайшоў у салон, знайшоў сваё месца — яно было якраз усярэдзіне, ля акна,— сеў. І стомлена зажмурыў вочы — чамусьці ўспомнілася, як ездзіў аўтобусамі, калі закончыў інстытут, у розныя камандзіроўкі — амаль штотыдзень. І часцей за ўсё на Палессе — у Лунінец, Пінск, Давыд-Гарадок... Бо тыя, з кім ён працаваў, не рупіліся надта ездзіць, часцей выпраўлялі ў дарогу яго, маладога спецыяліста. Ён не адмаўляўся, асабліва калі з жонкаю нелады пайшлі. Новыя мясціны, новыя ўражанні... Яны неяк па-іншаму настройвалі, прымушалі больш аптымістычна глядзець на жыццё, нават на адносіны ў сям'і... Сустрэчы з людзьмі, прынамсі, пераконвалі Івана Кузьміча ў адным — кожны жыве не так, як хоча, а як у яго атрымліваецца, складваецца. А што ўжо да сем'яў... Рэдка можна сустрэць тых, хто задаволены — муж жонкаю, а жонка мужам. І не ўсе спяшаюцца разводзіцца, большасць жывуць. Сварацца, не гавораць адно з адным па тыдню-два, нават, здараецца, б'юцца, а ўсё ж трымаюцца адно аднаго. То дзеці, то кватэра, то яшчэ што-небудзь не даюць сям'і распадацца...

«І ў мяне тое самае,— думаў тады Іван Кузьміч.— Каб раней я пра Надзю праўду ведаў... А цяпер, калі дзеці, кватэра... Ды і ці лепшая новая жонка трапіцца? А раптам гуляць з іншымі пачне ці яшчэ што-небудзь зробіць такое, што...»

І не кідаў Іван Кузьміч Надзю, жыў з ёю.

«А можа, трэба было не шкадаваць нікога — ні дзяцей, ні Надзі,— падумаў цяпер, седзячы ў аўтобусе, Іван Кузьміч.— Можа б, з новаю жонкаю інакш у мяне ўсё склала-

ся? Не чужыя б мы былі. Пайшоў бы на пенсію і жыў бы як чалавек. А так...»

Расплюшчыў вочы — аўтобус быў ужо амаль запоўнены. Знайшоўся і той, хто павінен сядзець побач — ім аказаўся малады рослы хлопец, з выгляду спартсмен — у не новых, паношаных, выцертых да белага на каленях і ззаду джынсах, моднай вельветавай куртачцы. Ён, відаць, быў стомлены, здарожаны, бо, як толькі апусціўся на сваё месца, так і адкінуў спінку крэсла, смачна разявіў рот — няйнакш задрамаў ці заснуў.

Аўтобус скрануўся, вырулiў на шырокі праспект і, набіраючы хуткасць, памчаў па асветленым ужо электрычнымі агнямі горадзе, кіруючыся на Магілёўскую шашу.

Іван Кузьміч паглядзеў на пасажыра, што, разявіўшы рот, мерна пасапваў носам, спаў побач, і сам адкінуў спінку крэсла.

«І мне, мабыць, трэба падрамаць,— падумаў.— Дарога ж няблізкая. Ноч усю ехаць давядзецца».

Заплюшчыў вочы... І... убачыў сябе ў маленькім чысценькім і вельмі ўтульным пакойчыку, у ложку, на мяккіх пуховых падушках. Побач жа, прыпаўшы да яго ўсім сваім гарачым целам, ляжыць...

«Чакай, дзе гэта я? І хто, хто са мною?» — быццам імкнуўся затрымаць сон, сіліўся нешта яшчэ зразумець Іван Кузьміч.

«Ды гэта ж... Надзя... Навальніца надышла...»

«А-а!» — здагадаўся, успомніў пра ўсё Іван Кузьміч.

Было, было такое — праводзіў ён Надзю да яе хаты на Старажоўку. А навальніца і нахапіла іх знянацку. Такі лівень лінуў, што схавацца не было дзе. І Надзя запрасіла яго зайсці ў хату, перачакаць навальніцу. Ускочылі ў сенечкі, нырнулі ў цемры ў нейкі пакойчык, як потым высветлілася, Надзін. І сядзелі там, мілаваліся, цалаваліся. А потым Надзя і пасцель паслала, бо навальніца і не збіралася аціхаць — ліў як з вядра дождж, бліскалі раз-пораз, асвятляючы ўсё навокал, маланкі, бухаў, грымеў, аж неба расколвалася, гром. І яны з Надзяю ляжалі ў ложку, упершыню разам у пасцелі, і было як ніколі добра... Асабліва калі Надзя прыхінулася ўсім сваім гарачым целам, пачала прагна, жадобна цалаваць...

Паплыло, паплыло, бы ў тумане, усё перад вачыма...

## VI

Дарожны сон, ды яшчэ ў аўтобусе,— неспакойны. І Іван Кузьміч разоў колькі прачынаўся, то пры святле, у нейкіх гарадах, то проста цёмначы дзе-небудзь у полі ці ў лесе. Спахапліва расплюшчваў вочы, непаразумела лыпаў, сілячыся даўмецца: дзе ён і што з ім? — і зноў паступова супакойваўся, сцішваўся і засынаў. Канчаткова ж абудзіўся, пазбыўся ліпкай павалокі сну ўжо на світанні, калі, адагнаўшы суцінкі, пачало паказвацца з-за лесу сонца — маладое і зыркае. Ехалі якраз па полі, зялёным, укрытым густою — аж шызаю ад расы — азімінаю. Дзесьці ўдалечы мільганула вёска — з настаўбурчанымі ў неба жураўлямі калодзежаў, антэнамі тэлевізараў, чырвонымі камінамі і стрэхамі хат. Было ўжо, мусіць, Палессе, бо вынырнула раптам нешта зусім нечаканае — сталёвая вышка, а каля яе штосьці таксама сталёвае — быццам вялізныя вагі: нешта там то падымалася, то апускалася. «Ды гэта ж нафту тут здабываюць!» — успомніў Іван Кузьміч і прыпаў бліжэй да запацелага акна, каб лепш разгледзець. Але не паспеў — аўтобус ускочыў у дарожную абсаду, а потым неўзабаве і ў лес. Замільгалі дубы, ясені, клёны, сосны, бярозы, асіннік, грабняк, арэшнік... Такіх змешаных, густых лясоў няма ў Беларусі нідзе, толькі хіба на Палессі. І Іван Кузьміч згадаў, што і вырас ён у такім лесе — хадзіў і па ягады, і па грыбы, і па арэхі... Ды і партызаніў таксама ў такіх вось лясах. Зімою халаднавата, галаднавата было. Затое летам, увосень і яды хапала, ды і не баяліся куды б там ні было хадзіць. Нават у вёскі. Ды і на дарогах ні немцам, ні паліцаям патолі не давалі. Як толькі хто-небудзь едзе ці ідзе — затрымлівалі ці агонь адкрывалі. І калі блакада пачыналася ці аблога — не хваляваліся вельмі: ведалі, што не зловяць, уцякуць. Раз, праўда, і ім не пашанцавала — самі на нямецкую засаду напароліся. Проста пры выхадзе з лесу. Шэсць партызан не вярнуліся з задання... І сярод іх Коля Дзямідчык, лепшы сябра. З ім і ў школе за адной партай сядзеў, з ім і ў камсамол уступаў, і ў партызаны ў лес пайшоў...

«Я вунь колькі гадоў яшчэ жыву, жаніўся, дзяцей выгадаваў, а ён... У зямлі... Даўно, даўно ў зямлі,— падумаў Іван Кузьміч.— І нават не ведаю, дзе пахаваны. Казалі, быццам забралі немцы тады забітых, кудысьці павезлі з сабою. А куды — ніхто так і не даведаўся. Не да таго было — блакада пачалася. Кінулі тады на партызан немцы

і танкі, і самалёты. З мінамётаў, гармат абстрэльвалі. Давялося аж у суседнюю вобласць адступаць...»

Уявілася тое — як ішлі, абчапляныя рознай амуніцыяй, амаль без прывалаў, і днём і ноччу па дарогах, а найчасцей — без дарог, па лясах і балотах. Ён, Іван, тады, як на бяду, прастудзіўся, пал пачаўся. Ды такі, што на нагах стаяць не мог, падаў. Асабліва ўвечары і пад раніцу. Давялося на падводу прасіцца, ехаць разам з параненымі...

«Малады быў,— успомніў сябе таго, ранейшага, Іван Кузьміч.— Ні пра што іншае не думаў, толькі пра адно — немцаў бы, фашысцкую погань з зямлі сваёй прагнаць...»

Калі вызваленне прыйшло, разгубіўся, рабіць не ведаў што. І ад радасці, што немцаў прагналі, жыць астаўся, і так... Адвык жа за вайну што б там ні было рабіць. Ды доўга пагуляць не давялося — у армію, на фронт забралі. Не, перш чым на фронт, вучылішча скончыў, афіцэрам стаў. Артылерыстам. І ўжо з баямі, па Беларусі, Польшчы аж да Германіі, Берліна...

«Некаторым бы з цяперашніх маладых ды ранніх тое перажыць, што мне, ды і ўсім з майго пакалення,— думаў неаднойчы ён, Іван Кузьміч, гледзячы і на сына свайго, Паўла, ды і на іншых.— Можа б, цанілі тое, што маюць, што мы, не шкадуючы сябе, здабылі, не марнавалі б гэтак, як марнуюць, сваё жыццё. Хто ў гарэлцы топіцца, а хто кар'еру цярэбіць. І дзе толькі навучыліся такому — ведаюць, каму пакланіцца, услужыць, каго пры кім аблаяць, дзе як выступіць, а на каго і ананімку напісаць... Глядзіш — дарога і свабодная, можна імчаць наперад. Вось і мяне,— дакрануўся да свайго, балючага, Іван Кузьміч.— І не агледзеўся, як сапхнулі. Быццам пыл, непатрэбшчыну якую змялі...»

Зноў — які ўжо раз! — калі ўспамінаў, што з ім зрабілі, гарачынёю, быццам, варам, абдало — скруха, крыўда агарнулі.

«Мог жа яшчэ гадоў колькі папрацаваць! А так... І заняцца чым — не ведаю. Быццам і тады, як партызанка скончылася, на фронт не бралі... Дык тады вайна ішла, ворага трэба было дабіваць. І я ведаў — не сёння, дык заўтра паклічуць, зноў зброю ў рукі дадуць. А цяпер... Што чакае мяне цяпер?»

Павёў вачыма вакол сябе. Пасажыры ў большасці папрачыналіся. Хто пазяхаў, хто праціраў рукою вочы. Сусед па сядзенні таксама ўжо не спаў. Дастаўшы з кішэні кашалёк, непрыкметна пералічваў грошы — пяцёркі, траячкі, рублі.

— З самай Варкуты еду,— павярнуўшыся раптам да Івана Кузьміча, сказаў хлопец.

— З Варкуты? — здзівіўся, і непадробна, Іван Кузьміч.

— Ага. А яшчэ раней у Казахстане на цаліне быў я, на БАМе,— ахвотна расказваў, быццам знаёмаму, хлопец.

— Чаго гэта цябе так па свеце носіць? — не мог, каб не запытаць, Іван Кузьміч.— Што, доўгага рубля шукаеш?

— Маці мне тое самае кажа,— засмяяўся дабрадушна, шчыра на ўсе свае роўныя, белыя зубы хлопец.— Але ў мяне ўсё іначай. На свет хацеў паглядзець, пападарожнічаць. А што да грошай, дык іх проста так, за прыгожыя вочкі, нідзе не даюць. Мазалём, гарбом зарабляць іх трэба!

— І куды ж ты цяпер едзеш?

— Дадому, у вёску сваю. Напісала маці пісьмо, што ў нас ужо не калгас, а саўгас... Дый... Калі шчыра казаць, абрыдла валачыцца па свеце... Час пра аселасць, сям'ю падумаць... Карані свае, дзе зазямліцца...

— А сам адкуль ты, дзе нарадзіўся?

— Ды я... З Ліпаўкі. Вёска такая ёсць у Ельніцкім раёне.

— З Ліпаўкі? — зноў непадробна здзівіўся Іван Кузьміч.— Чый жа ты будзеш?

— Наталлі Расамахавай. А вы што? Хіба Ліпаўку ведаеце? — паглядзеў больш уважліва на Івана Кузьміча хлопец.

— Не толькі ведаю — я сам родам адтуль,— прызнаўся Іван Кузьміч.

— Нешта я вас не помню,— не спускаў вачэй з Івана Кузьміча хлопец.

— Не помніш, кажаш? — сумна пахітаў галавою Іван Кузьміч.— І я, брат, таксама многага не помню. Нават калі ты сказаў, чый ты, не магу ўявіць, хто такая Наталля Расамахава, дзе яна жыла, хто яе бацька.

— Даўно, мусіць, не былі ў Ліпаўцы?

— Даўно. Лічы, з самай вайны.

— Так далёка жылі, што нельга было прыехаць?

— Ды не, блізка я жыў, у Мінску.

— А-а, дык вы, мусіць, Адамейкаў Іван. Так-так, цяпер ясна,— усё не спускаў і не спускаў вачэй з Івана Кузьміча, глядзеў і глядзеў яму ў твар хлопец.— А ведаеце, чаму я здагадаўся?

— Ну?

— Я ў сястры вашай Агапы некалькі разоў быў. Як у школе яшчэ вучыўся. Мы музей захацелі арганізаваць.

Ага, пра самых вядомых людзей нашай вёскі. Хто калгас пачынаў, хто ваяваў, партызаніў, хто ў начальства якое выбіўся. Дык я да сястры вашай хадзіў, каб яна здымак ваш дала, расказала што-кольвек пра вас. А потым і пісьмо вам пісаў...

Успомніў, згадаў Іван Кузьміч — і праўда было такое пісьмо яму. І падпісаў яго — «вучань шостага класа Васіль Караед».

— Дык гэта ты і будзеш той Васіль Караед?

— Ага, а па-вулічнаму нас яшчэ Расамахі завуць...

Не, як ні сіліў сваю памяць Іван Кузьміч, не мог, ніяк не мог успомніць, хто такая Наталля Расамахава, бо было гэтых самых Караедаў-Расамах амаль палова Ліпаўкі.

— А як там сястра мая, Агапа, жыве? — спытаў урэшце Іван Кузьміч.

— Цяпер-то і я не вельмі ведаю. Больш як тры гады дома не быў! А раней... Соткі сеяла, гаспадарку глядзела. А ўсё астатняе... Словам, жыла...

Аўтобус павярнуў направа, і Іван Кузьміч убачыў, што ўязджаюць яны, мяркуючы па надпісу, што мільгануў каля дарогі,— у мястэчка Ельнікі. Толькі ж з якога гэта боку?.. Цагляныя, на тры, чатыры паверхі дамы, шырокая асфальтаванка, плітачныя тратуары, узбоч якіх раскашуюцца зялёныя рослыя таполі... Не, усяго гэтага не было раней у Ельніках. Няўжо тут усё так змянілася?

— Не пазнаць — Ельнікі гэта ці не Ельнікі? — не то спытаў, не то ўсклікнуў Іван Кузьміч.

— І Ліпаўкі нашай не пазнаеце,— засмяяўся Васіль Караед.— Там жа таксама — пісала маці мне — камяніцы пабудавалі. І балоты паасушалі...

Зноў прынік да акна Іван Кузьміч, хацеў хоць штонебудзь пазнаць з тых ранейшых драўляных Ельнікаў, якія ведаў з даваенных і пасляваенных гадоў. І як ні сіліўся, як ні глядзеў, нічога ані не пазнаваў. Ні тых ранейшых крывых, вузкіх, з драўлянымі тратуарамі паўзбоч вуліц і вулачак, ні крытых гонтаю і саломаю хат, што, здавалася, аж паўрасталі ў зямлю, ні гразі, лужын вады, што былі ледзь не на кожным кроку. Усюды чысціня, акуратныя, гожыя цагляныя домікі, плітачныя тратуары, асфальт...

«Глядзі, як усё тут змянілася!»

І быццам неспакой пачаў ахапляць Івана Кузьміча, калі ўсплылі раптам у памяці словы аднавяскоўца-спадарожніка, Васіля Караеда, якія ён так, нібы між іншым,

сказаў: «І Ліпаўкі нашай не пазнаеце... Там жа таксама камяніцы пабудавалі...»

## VII

Так, Васіль Караед казаў праўду — не пазнаў Іван Кузьміч сваёй Ліпаўкі. Ды і не толькі Ліпаўкі — лясоў, балот, палёў не пазнаваў. Быццам не ў родны, а зусім у незнаёмы край прыехаў. Дарогі і то, здаецца, ляжалі не там, дзе раней.

Шырока адкрытымі вачыма глядзеў Іван Кузьміч яшчэ з аўтобуса — не таго, на якім з Мінска ехаў, а ўжо новага, мясцовага, на асушаныя прасторы балот, што перасякаліся то тут, то там прамымі, як стрэлы, каналамі, на шлюзы, што былі збудаваны, каб затрымліваць, калі трэба, ваду, на рэдкія чубкі лесу — пералескі, што дзе-нідзе зелянелі і ў якія на нейкі час уязджалі аўтобусам, каб неўзабаве зноў выскачыць на асушаныя прасторы балот.

Дарога, асфальтаваная, таксама прамая, як струна, рассякала балоты і лясы па нейкіх раней няходжаных, нават невядомых мясцінах. А можа, ён, Іван Кузьміч, проста іх не пазнаваў? Бо, здаецца ж, не было ў лесе тых мясцін, дзе ні хадзіў бы ён, дзе ні таптаў бы сваімі нагамі сцежак. І ў дзяцінстве, ды і ў партызанах. Бывала, забрыдаў у такія нетры, у такую заглуш, што выбрацца не ведаў як. І ўсё ж выбіраўся, калі і блудзіў, то нядоўга. Нешта заўсёды пазнаваў — ці дарогу, ці дрэва, ці брод. І здагадваўся, дзе ён, куды ісці далей, каб трапіць дадому ці ў тое месца, куды наважыўся, куды трэба было. Лес жа быў свой, вядомы змалку.

«А цяпер... Быццам чужы, усё тут мне чужое,— думаў са страхам Іван Кузьміч.— А я ж еду сюды, як дадому, каб тут жыць, забыцца на ўсё, што звязана з горадам, з маёй службай, жыццём там...»

У вёсцы, калі вылез з аўтобуса, таксама зусім разгубіўся Іван Кузьміч, проста ісці не ведаў куды. Бо і тут усё было не так, як ён пакінуў. Замест былой вуліцы, у якой грузлі ў пяску па калені ногі,— асфальт, плітачныя тратуары паўзбоч. І дамы цагляныя, двухпавярховыя. З шырокімі, светлымі вокнамі, балконамі. Удалечы, бы ўсё адно мінарэты, блішчэлі на сонцы сянажныя вежы. Толькі недзе збоку, у лагчынцы, стаяла некалькі драўляных хатак — там няйнакш старая вёска была, танула ў зеляніне садоў.

Выручылі Івана Кузьміча людзі, што тоўпіліся на аўто-

бусным прыпынку, а найперш — Васіль Караед. Бачачы, як разгубіўся Іван Кузьміч, ён першы і запытаў у людзей, дзе зараз жыве Адамейкава Агапа. Выявілася — у новым цагляным доме, у новай кватэры. Нумар дома і кватэры людзі назвалі.

Ён, Васіль Караед, і правёў Івана Кузьміча да таго дома, той кватэры, дзе жыла Агапа. Нават чамадан паднёс.

Агапа адразу ж адчыніла дзверы, як толькі ў іх пастукаліся. І не пазнала брата. Ды і ён, Іван Кузьміч, не пазнаў сястры. Стаялі нейкі час адно супраць аднаго і глядзелі ва ўсе вочы — ён на яе, яна — на яго, і...

— Не пазнаеш? — першы сказаў Іван Кузьміч.

— Іван? — ускрыкнула Агапа.

І ў наступную хвіліну кінулася да яго, прыпала да грудзей, заплакала.

— А я думала, ужо і не пабачу цябе,— пачала яна ледзь не галасіць, выціраючы хусткаю слёзы.— Аж ты сам прыехаў. Ды яшчэ ў такі дзень...

— А які сёння дзень? — непаразумела глядзеў на Агапу Іван Кузьміч.

— Як ета які? Сёння ж Радаўніца...

Успомніў Іван Кузьміч — было некалі такое свята, калі людзі ўсёю вёскаю хадзілі на могілкі, і старыя, і маладыя, продкаў сваіх наведаць. З гарэлкаю-медавухаю — сытою, з фарбаванымі яйкамі, іншай, якая толькі была ў хаце, ядою. Рассцілалі проста на магілах абрусы, выкладвалі на іх яду, рассаджваліся наўкруг — як зручней — самі. І пачыналіся памінкі. Налівалі кожнаму, хто быў на тым свеце, па чарцы. Не забывалі пры гэтым і на сябе — выпівалі за супакой душы. Закусвалі самі, клалі закуску і таму, за чый супакой душы выпілі. І свята тое называлася Радаўніца. Але каб спраўлялася яно і цяпер...

— А што, гэтую самую Радаўніцу ўсё яшчэ спраўляюць? — спытаў Іван Кузьміч у Агапы, ніяк не могучы паверыць, Агапа гэта перад ім ці не Агапа — надта ж яна старая, маршчакаватая, чужая, ані не падобная на тую Агапу, якую ён ведаў, з якою некалі рос у адной хаце, еў з адной міскі...

— А як жа! Адусюль, дзе б хто ні быў, дадому прыязджаюць. Некаторыя на дзень-два раней, каб магілкі паправіць, агароджу пафарбаваць. Кветкі, вянкі прывозяць. Вось пойдзем паглядзіш.

— Але ж я... — разгубіўся Іван Кузьміч.— Не ведаў... Не збіраўся...

— Нічога,— супакоіла яго Агапа.— Сходзіш сёння, заўтра не трэба будзе ісці. Ды ў парозе не стой, праходзь...

Ступіў Іван Кузьміч крок-два наперад і ўбачыў, што асабліва праходзіць няма куды: кватэра — звычайная аднапакаёўка. Калідорчык невялікі, вузенькі: злева — куханька, справа — туалет. Пакой, праўда, немалы і светлы, з двума вокнамі, пафарбаванай у чырвоны колер падлогай — ён прама, за шклянымі дзвярыма.

— Не цесна тут табе? — спытаў Іван Кузьміч у сястры.

— Не, я ж адна, месца хапае,— адказала Агапа, праводзячы брата далей на хату.

— І што, усе ў вас у новыя, цагляныя, кватэры перабіраюцца?

— Хто не хоча, той у сваіх хатах жыве,— патлумачыла брату сястра.— Але я... Пакуль карову, свіней трымала, то ў сваёй хаце жыла. А цяпер... На ўсім гатовым, як і ў горадзе. Ні пра дровы, ні пра ваду клапаціцца не трэба. Ды і сена, пракорм свінням...

— І сотак не сееш?

— Не, чаму ж. Сёе-тое сею. І гарод, і бульбу саджу... А ты... Як ты жывеш?

— Ды нічога,— не стаў удавацца ў падрабязнасці Іван Кузьміч.— На пенсію вось выйшаў,— прызнаўся ён сястры.

— І добрую ж табе хоць пенсію далі? — зацікавілася Агапа.

— Ніштаватую, жыць можна.

— Ну і хвала Богу. Ды не стой, сядай дзе-небудзь.

Іван Кузьміч прайшоў у пакой, уважліва агледзеў яго. У пакоі стаяў вялікі самаробны стол, засланы белым палатняным абрусам. На ім — тэлевізар, праўда, нейкай застарэлай маркі, з маленькім, быццам цацачным, экранам. Быў у пакоі і ложак, было і некалькі табурэтаў, таксама самаробных. Вокны, завешаныя белымі фіранкамі, выходзілі ў гарод, дзе на градах паўзыходзілі ўжо, зелянелі роўнымі радочкамі цыбуля, часнок, морква...

Сеўшы на табурэт, Іван Кузьміч пачаў распакоўваць чамадан, даставаць адтуль тое, што купіў сястры,— цёплую ваўняную хустку, матэрыял, з якога можна пашыць сукню, ды і харчы розныя — кансервы, цукеркі, сухарыкі, сушкі, пячэнне. Убачыўшы ўсё гэта, Агапа ўсклікнула:

— Навошта ты ета купляў? Толькі грошы выкінуў.

— Не з голымі ж рукамі ехаць,— сказаў Іван Кузьміч.— Ды і грошы тыя... Усё адно разыдуцца...

— Яно-то так. Але калі іх няма...

— Дык табе ж, можа, дзеці трохі памагаюць? — паглядзеў на сястру, ніяк не могучы супакоіцца, прывыкнуць да яе, такой, якой яна стала, Іван Кузьміч.

— Дзеці? Ого, відаць, не дачакаемся мы таго, каб дзеці памагалі. Наадварот, чакаюць, каб ты ім памог. Бывала, як свіней трымала яшчэ, заб'ю ды ў пасылачкі ўсё і запакую, сабе крошачкі не пакіну. Атрымаюць, з'ядзяць і хоць бы дзякуй сказалі. А ў цябе як дзеці?

— Хваліцца таксама няма чым,— прызнаўся Іван Кузьміч.

— Нешта і ты, значыцца, недагледзеў. Хай то мае, дык яны ў вёсцы раслі, без бацькі... Хаця... Вунь у іншых і без бацькі, а такія ж дабрэнныя павырасталі, бацькоў сваіх глядзяць, вёскі не цураюцца. І самі сюды прыязджаюць, і грошы бацькам шлюць. Жывуць, як і ў даўнія часы, адной сям'ёй. Што ў каго ёсць, тым і дзеляцца. Дык твае ж хоць дома, разам з табою. А мае ж... Заехалі аж на край свету. Ні да іх не дабрацца, ні яны вось каторы год носа не кажуць. Нават якія яны ўжо — забывацца пачынаю...

Агапа скрывілася, пусціла слязу.

— Прыедуць, то і не пазнаю, як во цябе не пазнала... Трэба ж, каб зусім на дамоўку забыў — не ехаў.

— Усё часу не было,— вінавата апусціў у падлогу вочы Іван Кузьміч.

— Часу, кажуць, і памерці не будзе. Але іншыя людзі і час знаходзяць, каб пабачыцца, у госці адзін да аднаго з'ездзіць. А ў нас усё не так, як у добрых людзей.

— Дык ты б прыехала калі да мяне,— папракнуў сястру Іван Кузьміч.

— Я прыязджала. Але што мне ў цябе ў горадзе рабіць? Ты на працы, а я сядзі, як дурань, цэлы дзень у сценах. Ды і дзеці ў мяне. Думаеш, лёгка было іх на ногі паставіць? Ды адной, ніхто ж ніадкуль нічым не памагаў... І часы былі... Робіш, робіш, а давядзецца атрымліваць за працу сваю, то і няма чаго. Ета не цяпер... Хаця...

Пастаяла, уздыхнула і сказала раптам:

— Ведаеш, Іван, што я думаю... Можа б, каб жылі нашы маці і бацька, не застрэлілі іх немцы, і ў цябе, і ў мяне дзеці не такія б павырасталі, радасць, шчасце і сабе, і нам бы, і людзям прыносілі.

— Чаму ты так думаеш? — насцярожыўся, падняў вышэй галаву Іван Кузьміч.

— Ды таму, што дзеці бачылі б, як мы сваімі бацькамі апякуемся, вучыліся б у нас. А так...

— Дык маглі ж добраму і ў іншых навучыцца. Не абавязкова ў сваёй сям'і,— быццам запярэчыў, праўда, нясмела Іван Кузьміч...

— У іншых — ета ў іншых. А ў сваіх — ета ў сваіх. Ды і мы з табою не лепшы прыклад дзецям падавалі. Родныя брат з сястрою, а жывём, як чужыя. Ні ў госці адно да аднаго, ні пісем... Твае дзеці не ведаюць маіх, а мае — тваіх...

Праўду, горкую праўду казала Агапа. Хоць, можа, і перабольшвала. Хаця... Хто ведае, можа, і не перабольшвала. Жылі б бацька і маці, не пазабівалі б іх немцы, відаць, па-іншаму і ў яго, Івана, жыццё б склалася, і ў яе, Агапы. Была б бацькоўская хата, быў бы абавязак перад бацькамі. Ды і не паехаў бы, мусіць, ён, Іван, з вёскі пасля вайны, жыў бы тут. А калі і паехаў бы, вяртаўся б час ад часу дадому, у родны куток. І раны не было б у душы, не балела б, не напаміналa б — гэта ж праз цябе, цябе бацька і маці не жывуць, раней часу ў магілу леглі... І сястра, Агапа... Не сыпала б соль на раны, не папракала б... А то... Праз столькі гадоў сустрэліся — і зноў, зноў не стрымалася, напомніла... Гэтак жа, як і тады, калі з вайны, з фронту, вярнуўся... Не зажывае, бачыш, і ў яе рана, крывавіць...

— Але ж ты гэта ведаеш,— зажмурыўшы вочы, як ад болю, пакруціў галавою Іван Кузьміч,— я не хацеў, каб немцы бацьку і маці застрэлілі...

— Я ета ведаю. Ды і... Цяжка мне пра тое меркаваць. І ўсё ж... Здаецца іншы раз — трэба было табе быць больш асцярожным, абачлівым, каб меней хто ведаў, што ў лесе ты, у партызанах.

— Лёгка сёння гаварыць,— ужо быццам са злосцю сказаў Іван Кузьміч.— А тады... Калі ў лесе... Па тыдню, а то і пабольш галодны, макавага зерня ў роце не было...

— Не трэба было ісці ў лес.

— Як гэта не трэба было ісці ў лес? Ды яны, немцы, мяне б забілі. Ды нават калі б і не забілі... Не мог, не мог я не ісці ў лес. Погань фашысцкая зямлю топча, рознае ахвосце зброю ў рукі пабрала, з людзей здзекуюцца — і цярпець?..

Нейкі час і Агапа, і ён, Іван Кузьміч, маўчалі.

— Не вернеш таго,— першая парушыла маўчанне Агапа.— Няхай, як было, так было. Добра, што не забыў на мяне, прыехаў. Давай перакусім, што я на снеданне зварыла, ды на магілкі пойдзем.

— Але ж я...— зноў завагаўся Іван Кузьміч.— Не збі-

раўся сёння вось так з дарогі... Ды і... Ці ёмка мне?

— Як ета — «ці ёмка»? Пабываць на магілах сваіх бацькоў, дзе не быў столькі гадоў?.. А ўрэшце, як сам ведаеш...

— Не, чаго ж,— здаўся Іван Кузьміч.— Сходзім. Толькі як магілы там? Ці хоць дагледжаны?

— Во пойдзем, то ўсё на свае вочы пабачыш. Давай снедаць,— ужо ледзь не падагнала Агапа Івана Кузьміча.

Падняўся з табурэта Іван Кузьміч, пайшоў услед за Агапай на кухню.

## VIII

Напамінак пра бацьку і маці зноў балюча кранаў Івана Кузьміча, крамсануў па самым сэрцы. Аказваецца, не забылася, нічога не забылася. І Агапа ўсё помніць, ды і людзі ж, напэўна, таксама... І што не ён, Іван, вінаваты ў смерці бацькоў, а немцы, чужынцы, тыя, хто прыйшоў сюды, каб пакарыць, заваяваць край, пра гэта... Быццам і гаварыць няёмка, няёмка даказваць, пераконваць каго б там ні было, бо гэта ж і так ясна як божы дзень, хоць прычынай для расстрэлу быў і ён, Іван... Не пайшоў бы ён у лес, у партызаны, не бачылі б яго, як ён краўся з лесу ці ў лес,— і, можа б, па-іншаму ўсё склалася, жылі б бацька і маці, не расстралялі б іх... Шмат, шмат разоў пра ўсё гэта думаў Іван Кузьміч. І тады, у лесе, як немцы расстралялі бацьку і маці, і потым, ужо на фронце, ды і жывучы ў горадзе... І адна з прычын, чаму не ехаў так доўга ў вёску, былі тыя ж бацька і маці. Ведаў — не вытрымае сястра, Агапа, зноў пра ўсё скажа, папракне... Цяпер ужо нават нібыта і ў тым, што дзеці выраслі не такія, як у людзей, зноў жа вайна вінавата, гэта значыцца ён, Іван. А ён жа думаў, што ў сястры жыць астанецца, тут, у вёсцы, знойдзе сабе прытулак і занятак пасля выхаду на пенсію. Аж... І вёскі ўжо той, ранейшай, да якой змалку прывык, няма, і палёў, лясоў, балот тых... Ды і бацька, маці зноў... Бы ўсё адно пракляў яго хто, наканаванне якое. Там, у горадзе, хоць не ведае пра гэта ніхто, не напамінае пра балючае. А тут... Трэба ж падгадаць так, якраз на Радаўніцу сюды прыехаць... І не пайсці на могілкі, і пайсці...

І пакуль снедаў Іван Кузьміч — сёрбаў, не чуючы вельмі смаку, звараны на газавай пліце, засквараны салам з цыбуляй, картапляны булён, піў чай,— а потым, узяўшы з рук у сястры палатняную торбачку з бутэлькай фруктова-

га віна і рознымі пачастункамі (сярод іх былі і тыя, што прывёз ён з горада), ішоў, браўся па палявой дарозе да могілак — яны былі на пясчанай, парослай хвойнікам высупе,— маўчаў, толькі думаў, перабіраў у памяці тое, што адбылося больш за сорак гадоў таму назад...

... Тады, у тую ноч, ён, Іван, прыйшоў у вёску рана, як толькі патухлі ў вокнах агні. Прыйшоў адзін, як і заўсёды, як і ўсе рабілі, бо паказвацца на вочы чужым ніхто не хацеў — усе хлопцы былі свае, з адной вёскі, і зайсці ў хату да каго б там ні было — гэта значыла выдаць сябе. А выдаваць сябе баяліся — ведалі, што ў такіх выпадках робяць немцы. Таму хадзілі ў вёску па адным і па чарзе. Якраз у тую ноч выпала ісці па харчы яму, Івану. І ён пайшоў, праўдзівей, папоўз, пагрэбаўся па снезе, гурбах, што панамятала ледзь не па самыя пахі, асабліва ў полі. Сяк-так дабраўся да бацькоўскае хаты, пастукаў у акно. Тры разы, як было і ўмоўлена.

Сенцы адчыніў сам бацька. Ён тыдняў колькі перад гэтым вярнуўся з палону. Неяк пашанцавала ўцячы. І цяпер ён адсыпаўся, ад'ядаўся.

— Што ў вас? — спытаў па звычцы ён, Іван, у бацькі, як толькі пераступіў парог сенцаў.— Немцаў няма?

— Немцаў няма, але паліцыі наехала,— ціха, таямніча шапнуў бацька.— Прасіліся і да нас у хату начаваць.

— А вы?

— Што мы? Ведалі ж: не сёння-заўтра ты павінен з лесу прыйсці.

— І дзе яны спыніліся?

— У воласці, у школе. А чалавек колькі і па хатах.

Ён, Іван, разгубіўся, не ведаў, што яму рабіць.

— Можа, мне... Не рызыкаваць? Пакуль нічога ніякага, дык назад, у лес? — спытаў не то сам у сябе, не то ў бацькі.

— Хто яго ведае, як яно лепш. На ўсякі выпадак торбу мы з маці табе сабралі.

— То я, можа, вазьму яе — і назад, у лес?

— А адзежу памяняць, пераадзецца? Ды і капусты гарачай пасярбаў бы...

— Няхай, іншым разам...

Ён, Іван, быццам нешта прадчуваў. Бо нават калі, пачуўшы ў сенцах сцішаную размову, злезла з печы маці — яна хварэла, адагравалася на чаране — і выбегла, нізашто не згадзіўся заходзіць у хату. Узваліў на плечы торбу і як не бягом кінуўся за хлеў, а потым, па снезе, па гурбах — і ў лес.

І, як пасля выявілася, добра зрабіў, што ў час селішча пакінуў, не бавіўся там вельмі. Бо не паспеў бацька і распрануцца, спаць легчы, як у хату ўваліліся паліцаі. Ператрэслі ўсё чысценька, нават у пограб, запаліўшы ліхтар, злазілі, на гарышча, схадзілі ў камору і ў хлеў. І, не знайшоўшы, каго шукалі, бацьку, маці арыштавалі, павялі з сабою...

Не думаў тады ён, Іван, што яго наведанне тым скончыцца...

«Немцы застрашыць людзей хацелі, каб ніхто ні прытулку, ні харчоў, ні адзення не даваў партызанам. Таму і лютавалі... І памагчы бацьку, маці? Як можна было памагчы, калі партызан жменька адна ў лесе была, ды і не ў кожнага ж вінтоўка...— думаў цяпер, кіруючыся да могілак, Іван Кузьміч.— І трэба ж, якраз мне ў тую ноч у вёску ісці выпала. Каб хто-небудзь іншы...»

«З іншым, з яго бацькамі, тое было б...»

«А можа, і не было б, можа, абышлося б як-небудзь...»

«Не, не магло так абысціся... Калі наехалі ў вёску паліцаі, то... Прычына ж была... Проста так ні немцы, ні паліцаі не ездзілі...»

«Гм, цікава, выдаў мяне тады хто-небудзь ці выпадкова? А можа, даўно сачылі... За мною, маімі бацькамі? Э, ды што ўспамінаць... Прывезлі ў вёску, сабралі людзей да сельсавета-валасці, аб'явілі, што бацька і маці памагалі партызанам, ды і сын-партызан у іх — і расстралялі... Там жа, ля сельсавета-валасці...»

...— Ты была на пляцы, калі бацьку і маці стралялі? — спытаў Іван Кузьміч, павярнуўшыся тварам да сястры, якая,паволі перастаўляючы ногі, грэбалася па пяску побач з ім, намагаючыся не адстаць, і ад таго задыхалася.

Сястра, Агапа, спалохана ўскінула на брата вочы, спынілася.

— Не, не была,— ледзь чутна вымавіла яна.— А чаму раптам ты ўспомніў тое, чаму пытаеш?

— Нічога,— апусціў долу вочы Іван Кузьміч.

— Я, як бацьку і маці забралі, сышла з дому. У стагах сена, на лузе, хавалася,— расказвала Агапа.— Амаль зіму ўсю. А потым ужо к вясне ў вёску прыбілася, зноў пачала ў хаце сваёй жыць. І то — напачатку — начавала толькі. А ледзь днела — уцякала... Баялася, што, калі мяне зловяць, таксама застрэляць... Як і бацьку, маці, як і ўсіх стралялі, хто з партызанамі сувязь меў...

Іх дагналі нейкія незнаёмыя людзі, цэлая, відаць,

сям'я — стары з сівою, як не да пояса, акуратна расчасанаю, раскошнаю барадою; старая з кіёчкам — пры белым вышываным фартушку, у андараку і ў лутовых лапцях; маладзейшыя, мужчыны і жанчыны, дзеці. Усе па-святочнаму прыбраныя, паднядзеленыя, з сумачкамі, карзінкамі, вузельчыкамі, з якіх вытыркаліся рыльцы бутэлек,— няйнакш яны таксама, як і Агапа, як і Іван Кузьміч, як і іншыя, што відаць былі тут і там па дарозе, кіраваліся да могілак. Параўняўшыся з Агапаю і з Іванам Кузьмічом, стары і старая як бы сумеліся. Але хутка ўзялі сябе ў рукі, павіталіся. На іх «дабрыдзень» Агапа і Іван Кузьміч адказалі сваім: «Дзень добры!»

— Хто гэта такія? — спытаў Іван Кузьміч у Агапы, калі людзі трохі адышліся.

— Няўжо не пазнаў? — здзівілася Агапа.— Ета ж Царукі. Сам стары Антон з Антоніхаю і іхнія сыны, нявесткі, унукі...

Царукі калісьці, да вайны, жылі ў суседзях з імі, Адамейкамі. Жылі не сказаць каб дружна. Сварыліся часта і па дробязях — то куры ў гарод уб'юцца, то за мяжу — чамусьці кожнаму здавалася, што хтосьці лішнюю баразну захапіў у суседа. Царукі ні пры Саветах, ні пры немцах нікуды наперад вельмі не лезлі, сядзелі ціха, як мыш пад венікам. Але ўладу паважалі — выконвалі яе распараджэнні. І жылі не горш за іншых, ва ўсякім выпадку, у няміласць ніколі не пападалі. І Іван Кузьміч, думаючы, хто высачыў яго тады, калі прыходзіў з лесу дадому па харчы, хто выдаў бацьку і маці немцам, чамусьці не-не дый успамінаў, засяроджваўся на Царуках.

— Табе не здаецца, што гэта яны высачылі, калі я з лесу прыходзіў, паліцаям перадалі? — спытаў у сястры, Агапы, Іван Кузьміч.

— Хто ведае,— паціснула плячыма Агапа.— Можа, і яны. Але... Не злавіў за руку — не кажы злодзей.

— Ды яно быццам так. І ўсё ж... Не дае мне гэта спакою. Колькі жыву, усё думаю і думаю, хто мяне ў тую ноч ці яшчэ раней мог бачыць. І чамусьці кожны раз, калі думаю пра гэта, на памяць Царукі прыходзяць. Больш, здаецца, ніхто выдаць не мог...

— Можа, так, а можа, і не,— уздыхнула Агапа.— Таго, што было, не вернеш. Ды і не праверыш нідзе. Забывацца на тое ўжо трэба. Хутка самім на той свет...

Пайшлі далей ужо моўчкі, кожны думаючы пра сваё...

## IX

На могілках было ўжо даволі людна, калі прыйшлі туды Агапа і Іван Кузьміч. Тут і там чулася гамана, сцішаная і нібыта насцярожаная, якая зрэдку перапынялася, заглушалася плачам, галашэннем. Усюды між соснаў і сасонак снавалі мужчыны, жанчыны, дзеці — усе паднядзеленыя, прыбраныя, як на свята. Іван Кузьміч заўважыў — могілкі за час, што ён не быў, выраслі амаль удвая. Крыжы стаялі ўжо не толькі на выспе, але і наўкруг яе, там, дзе калісьці было поле, а цяпер зелянеў малады, густы хвойнік. Прычым у хвойніку дзе-нідзе замест крыжоў бялелі, шарэлі, зробленыя з цэменту і каменя, помнікі. Некаторыя магілы былі агароджаны — дзе дошкамі, штакетам, а дзе і прантамі з жалеза. Кідаліся ў вочы і партрэты, надпісы — прозвішчы, імёны, гады нараджэння і смерці нябожчыкаў. Раней, можа, таму, што большасць людзей у вёсцы не ўмелі ні чытаць, ні пісаць, ніхто не рабіў на крыжах ніякіх надпісаў, запаміналі тых, хто ляжаў у магілах, і так. Не было ніякіх надпісаў і на груба — тапаром — абчасаных дубовых крыжах, што былі калісьці ў вайну пастаўлены на магілах бацькі і маці Івана Кузьміча і Агапы. І цяпер, калі б не Агапа, Іван Кузьміч нізашто не знайшоў бы, не адшукаў бы іх магіл. Помніў толькі — пахаваны бацька і маці на ўскрайку могілак, пад невысокаю калматаю сасонкаю. Але дзе гэта — пазнаць, здагадацца цяпер ніяк, ніяк не мог. І таму, пакорна апусціўшы галаву, паволі ішоў за Агапаю. А яна, мусіць, на могілках бывала нярэдка, бо дарогу да сваіх бацькоў ведала, бралася некуды ўсярэдзіну, у стары сасоннік, дзе і людзей было менш, і, здаецца, крыжоў, помнікаў не так багата. Агапа была засяроджаная ў сабе, нейкая быццам нават урачыстая, ні пра што ні з кім не гаварыла, толькі, праўда, калі бачыла, сустракала знаёмыя твары, ківала галавою, віталася. Ківаў галавою, вітаўся з сім-тым, хоць і не ведаў, не мог сказаць, з кім, бо не пазнаваў, і ён, Іван Кузьміч.

«А ўсё ж нядрэнны гэта звычай — хадзіць на могілкі, наведваць продкаў,— думаў Іван Кузьміч.— Хоць нябожчыкам нібыта і ўсё адно, ходзіць да іх хто ці не ходзіць, а ўсё ж... Быццам і не забыты яны, помняць пра іх... Сваякі ж, некалі адна сям'я была... І хоць раз у год зноў пабыць разам, многае ўспомніць, нагадаць... Падумаць, што і ты не вечны, прыйдзе час, калі і цябе не будзе, памрэш, далучышся да тых, хто даўно ўжо там, у зямлі... З чым ты туды

прыйдзеш, як паглядзіш у вочы тым, з кім сустракаўся і, магчыма, сустрэнешся зноў там, на тым свеце?..»

Адчуў — аж перасмыкнула ўсяго, дрыжыкі ахапілі.

«Не думаў я пра гэта, ніколі не думаў. Жыў, быццам у паветры на крылах ляцеў. Праца, паездкі розныя, жонка, дзеці... А пра бацьку, маці, што мёртвыя яны, у магілах ляжаць... Не думалася неяк... Ды і пра сястру, Агапу, тых людзей, разам з якімі вырас, жыў... Пра вёску сваю, той куточак зямлі, адкуль пайшоў у свет, таксама... Нібыта і не было іх у мяне... А яны ж, усё тое... Было! Ёсць!»

Агапа, а разам з ёю і ён, Іван Кузьміч, дайшлі да двух гарбячкоў зямлі, што ледзь-ледзь прыпадымаліся, нічым не агароджаныя, затравелыя, з падгнілымі, парослымі ўжо мохам крыжамі, якія былі перавязаны новымі вышыванымі палатнянымі ручнікамі. Агапа пачала нешта шаптаць, махаць перад сабою рукою,— няйнакш хрысціцца. Вычакаўшы якую хвіліну, Іван Кузьміч спытаўся:

— Гэта магілы бацькі і маці?

— Умгу,— кіўнула, скончыўшы хрысціцца, Агапа.— Трэба было б і крыжы новыя паставіць, і агарадзіць... Ды я адна, няма мне каму памагчы. Думала, дзеці памогуць. Дык не — з’ехалі...

— Добра, я сам гэта зраблю,— сказаў Іван Кузьміч.— Вось паеду ў горад, помнікі закажу. І агароджу.

— Даўно трэба было ета зрабіць. А то перад людзьмі сорамна. Быццам бацькі нашы горшыя за ўсіх людзей...

Зноў праўду, горкую праўду казала сястра. І Іван Кузьміч, апусціўшы галаву, глядзеў то на адзін, то на другі гарбячок і думаў, чаму ён раней, некалькі гадоў таму назад, не прыехаў сюды, не пабываў у вёсцы і на могілках, не паглядзеў, што тут і як. Гэта ж... Не, не, няма, няма і не можа быць — ніякага апраўдання! Бацькі з-за яго... А ён...

Сціснула сэрца, стала як ніколі сорамна, аж, здаецца, гарачыня да твару зноў прыліла.

«Іншы на маім месцы даўно б помнікі паставіў, ды такія, што... А я... Баяўся, нехта мяне ў нечым папракне, віну мне прыпіша. А віна... Як бы я ні апраўдваўся, чым бы ні прыкрываўся, а ўсё ж... Не наведваўся б тады з лесу дадому, яны б... І цяпер, напэўна, яшчэ жылі б... Як жывуць тыя ж Царукі...»

Аж сцехануўся, успомніўшы зноў былых суседзяў.

«Няўжо яны выдалі бацьку і маці? — падумаў Іван Кузьміч.— Хоць ні бацьку, ні маці з таго свету не вернеш, а ўсё ж... Ведаць гэта не шкодзіла б, трэба было б...»

Агапа між тым моўчкі, ні слова не кажучы, узяла з рук у Івана Кузьміча торбачку, дастала з яе абрус, паслала на магілы. Не спяшаючыся пачала выкладваць прыпасы — загорнутыя ў палатняны ручнічок, яшчэ цёплыя, аладкі, яечню, пафарбаваныя ў чырвоны колер яйкі, сала, каўбасу, хлеб... Выняла з торбачкі, паставіла проста на траву і бутэльку фруктовага, купленага ў магазіне, віна, дзве гранёныя шклянкі. Села сама і паказала рукою, каб сядаў насупраць бліжэй да абруса і ён, Іван.

— Хоць раз ды разам, як людзі, ля магіл бацькоў пасядзім,— прамовіла яна.— Можа, болей і не давядзецца.

— Гэта чаму ж не давядзецца? — падняў вочы на сястру, паглядзеў Іван Кузьміч.

— Паедзеш ты... А ці прыедзеш яшчэ калі... Ды і не маладыя мы самі ўжо... Не ведаю, як у вас у горадзе, а ў нас нешта паміраць сталі часта людзі. Бач,— паказала яна рукою на крыжы, што былі ў маладым хвойніку,— колькі памерла. Уся, лічы, даўняя вёска сюды перабралася... І нам пара...

— Не варта спяшацца, пажыць яшчэ трэба,— не згадзіўся з Агапаю Іван Кузьміч.— Не ўсё ж, здаецца, яшчэ зроблена.

— Ніколі ўсяго не зробіш, як бы ні хацеў. Ды і на той свет з сабою нічога не забярэш. Ты думаеш, бацьку, маці пажыць не хацелася? А ўжо бачыш колькі гадоў, як на тым свеце!

— Тады вайна была. А цяпер... Не тое.

— Вядома, бальніцы, лечаць людзей... Але калі прычэпіцца якая напасць... Ды няхай, не будзем пра ета. Адкаркоўвай бутэльку, ды бацьку, маці нальем віна... І самі вып'ем... За супакой іх душы. Ды і за прыезд твой... Дзякуй, што не забыў, наведаўся...

Іван Кузьміч узяў бутэльку, адкаркаваў яе. Наліў віна трохі ў адну шлянку, трохі — у другую. Агапа, зноў папаштаўшы нейкую малітву, нагнулася над магілай, выліла з шклянкі віно проста на траву, пад крыж.

— Ета бацьку,— сказала яна.— А цяпер маці...

І прарабіла ўсё тое самае, толькі ўжо над магілай маці.

Потым не спяшаючыся палажыла на магілы бацьку і маці па чырвонаму яйку, па лустачцы хлеба, скрыліку сала. І па сушцы, сухарыку, цукерцы, якія прывёз як гасцінцы Іван Кузьміч з горада сястры. І толькі пасля ўсяго гэтага зноў павярнулася да Івана Кузьміча, сказала:

— А цяпер давай і самі...

Іван Кузьміч паслухмяна наліў зноў у шклянкі віна, падаў адну сястры, другую ўзяў сабе.

— Ну што ж, браток,— паглядзела Агапа на брата тужлівымі вачыма.— І за супакой душы бацькі і маці, і за твой прыезд!..

І паднесла да рота шклянку, адпіла з яе як не палову. Іван Кузьміч таксама паднёс да рота шклянку, паспрабаваў на смак фруктовага віна, якога дагэтуль ніколі не піў. Яно было салодкае, прытарна пахла яблыкамі. Але, перасіліўшы сябе, Іван Кузьміч глытнуў разоў колькі. Скрывіўся, адставіў недапітую шклянку.

— Чаму ж ты так? — папракнула Івана Кузьміча Агапа.— Што, хіба ты не п'еш?

— Не, не п'ю,— адмоўна захітаў галавою Іван Кузьміч.— Хіба што на святы. Ды і то не такое віно...

— А ў нас ета самае лепшае пітво. Як прывязуць у магазін, скрынкамі бяруць. І п'юць больш за самагонку. А што — віно салодкае... Бяры што-небудзь, закусвай...

Іван Кузьміч нагнуўся, узяў з абруса лустачку хлеба, скрылік сала. Укусіўшы таго і другога, пачаў жаваць, з цікавасцю разглядаючы, што робіцца навокал на могілках. Хоць і не быў яшчэ час абедаць, але ўсюды ля магіл утвараліся кампаніі — рассцілалі ручнікі, абрусы, выкладвалі з торбачак, сумак, вузельчыкаў, хто што захапіў, прынёс з дому, рассаджваліся каля яды. Разлівалі ў чаркі, шклянкі гарэлку, віно, частавалі нябожчыкаў, частаваліся і самі. Плач, галашэнне паступова сціхалі. Чуліся ўжо тут і там смех, нейкія не зусім зразумелыя выкрыкі.

— Раней, бывала, поп каля магіл хадзіў, свянціў,— успомніла чамусьці Агапа.— А цяпер як хто... Адны раней, другія — пазней...

— А ты што, у Бога верыш? — спытаў у Агапы Іван Кузьміч.

— Ды яно як табе і сказаць,— памялася Агапа.— Ведаеш, адна я жыву. І пагаварыць іншы раз няма з кім... А Бог... Як бы ўвесь час са мною... У любы час і пагаварыць можна, і паспавядацца, і пажаліцца, папрасіць... Не, без Бога цяжка. Калі вера ў Бога была, менш паскудства рознага рабілася. А цяпер... Матчына малако на губах не абсохла, а ён мацюкаецца. Не паважае ні старых, ні малых... Ніхто нікога не баіцца, што хоча, тое і робіць. А віно, самагонка етыя... Не, такога раней у нас не было. Дзе ж ета відана, каб дзеці бацькоў адцурваліся, гадамі жылі

і не ўспаміналі?.. Пры жывых бацьках жывыя дзеці... Не, раней кары божай людзі баяліся...

— І раней усякае было, толькі мы пра тое не ведаем,— не згадзіўся з Агапаю Іван Кузьміч.

— Не, такога, як цяпер, не было! — рашуча захітала галавою Агапа.— Раней вёска жыла сама сабою, усе свае тут былі, ведалі адзін аднаго. А цяпер панаехала розных з усяго белага свету. Ні іх ніхто не ведае, ні яны нікога. Бывала, што такое замок, у нас не чулі. А цяпер не замкні толькі хату... А ўжо пра разводы, дык і не чулі... А то... Сыдуцца — і разбегліся... Зноў сыходзяцца і зноў разбягаюцца... Дзяцей абы ад каго раджаюць, аборты робяць... Цьфу, як падумаеш! У горадзе і то, мусіць, няма таго.

— Match Рознае і ў горадзе ёсць,— задумаўся над тым, што пачуў, Іван Кузьміч.— І было.

— Можа, у горадзе і было. А ў вёсцы не, не было таго, што ёсць. Асушэнне ета... Поля больш стала, ураджаі лепшыя, машыны, дарогі... А што да ўсяго астатняга... Дзе ета відана, каб бабы нароўні з мужчынамі пілі. Нап'ецца ды дзень у разоры і праспіць. Раней і на Радаўніцу ніхто не напіваўся. Пілі так, па прычыне... І то — чарачку, дзве... А цяпер... І сюды, на могілкі, прыходзяць, каб напіцца, быццам на свята якое... Во паглядзі, паглядзі, што робіцца...

Іван Кузьміч не ахвотнік быў назіраць за людзьмі, за тым, дзе хто і што робіць. Але тут, на могілках, усё на вачах было, нідзе нішто не схавана, і хочаш не хочаш, а відаць было, як людзі і сядзелі, і елі, і пілі. Калі б не магілы, не крыжы, не помнікі, дык можна было б падумаць, што гэта ніякая не Радаўніца, не памінкі нябожчыкаў, а звычайная маёўка, выезд на нейкае свята на прыроду, бо тут і там сядзелі кампаніі, рагаталі, смяяліся. І ў руках кожны трымаў то чарку, то закуску.

— Ета ж толькі пачатак... А праз гадзіну-дзве што тут будзе рабіцца! Свае яшчэ як свае, а прыезджыя...

— Адкуль яны ў вас? — пацікавіўся Іван Кузьміч.

— Ды з усяго, можна сказаць,свету. Як выганяць каго адкуль, дык і шукае, дзе б нічога не рабіць, а грошы палучаць, жыць лёгка, на дурнічку. Пачулі, што саўгас у нас, што рабочыя рукі трэба,— і едуць. Толькі ж і тут вельмі такія не затрымліваюцца, раскусваюць іх, бачаць, хто яны. І таксама праганяюць, у іншае месца яны некуды едуць.

— Можа, гэта часовае? Усталюецца ўсё — і не будзе такога.

— Дай Бог. Бо ета ж аж жыць не хочацца, калі такое бачыш. Ды ты еш, еш... І выпі. Усё адно з могілак дадому нічога несці нельга.

— Чаму гэта?

— Хто яго ведае. Звычай такі. Не мы яго прыдумалі, не нам і парушаць.

Агапа зноў узяла ў рукі сваю шклянку, прыгубіла яе. Выпіў глыток віна яшчэ і Іван Кузьміч. Узяў зноў кавалачак хлеба, каўбасы, пачаў закусваць.

— Яешню, яйкі бяры. Ды і аладкі,— сказала да брата Агапа.— Не саромейся, еш... Ці хоць надоўга прыехаў?

— І сам не ведаю,— пацiснуў плячыма Іван Кузьміч.— Ехаў, дык быццам надоўга. А пабыў вось, на вёску паглядзеў, з табою пагаварыў...

— І што? — падняла вочы, паглядзела на брата Агапа.

— Бачыш,— пачаў паволі, разважліва Іван Кузьміч.— Я даўнюю нашу вёску ведаю. Успомніў, як некалі было... І захацелася зноў усяго таго. А прыехаў — няма старой нашай Ліпаўкі, нічога таго даўняга, звыклага няма. Ні самой вёскі, ні балот, ні лясоў, ні палёў... Ды і людзей. Я нікога ўжо не ведаю, не пазнаю, і мяне таксама. Чужы я тут чалавек...

— Трэба было часцей прыязджаць, то не быў бы чужы. А што да людзей... Многіх і я ўжо не пазнаю. Вёска вялікая, моладзь расце. Жэняцца, дзяцей нараджаюць. А чые яны, тыя дзеці,— не ведаеш, каб і хацеў. Ды і чужых з усяго свету панаехала...

— У аўтобусе ў Ліпаўку я ехаў з Васілём Караедам, сынам Наталлі Расамахавай. Як я ні намагаўся ўспомніць, чый гэта хлопец, дзе жылі Расамахі... І не ўспомніў.

— Цю,— пахітала галавою Агапа.— Расамахі да вайны жылі насупраць нас, праз вуліцу. І Наталля... Таварышкавала з Лідаю... А Ліду ты ж некалі з пагулянак праводзіў...

Успомніў, цяпер успомніў Іван Кузьміч... Ды і як такое забыць! Гэта ж была неразлучная чацвёрка — Наталля і Коля Дзямідчык, Ліда і ён, Іван. Усюды, асабліва на пагулянках, былі разам. Ні ён, Іван, без Ліды, ні Коля Дзямідчык без Наталлі не ўяўлялі свайго жыцця. Ды пэўна ж і яны — Ліда без яго, Івана, а Наталля без Колі...

— Як жыццё склалася ў іх... У Наталлі, Ліды? — спытаў, паслабляючы на шыі гальштук — горача, душна стала раптам яму.

— Наталля замуж за нейкага прыезджага выйшла... Кінуў ён яе. Ну а Ліда... Увесь век адна жыве...

— Чаму ж гэта яна так?

— Хто яе ведае. Выходзіць замуж абы за каго не захацела. Ды і раджаць абы ад каго таксама... Цябе яна, мусіць, кахала...

«І каб выйшла за мяне замуж, каб я з ёй жаніўся... Можа б, і яна, і я шчаслівыя былі»,— падумаў Іван Кузьміч, успамінаючы, уяўляючы Ліду — стройную, светлавалосую, з вялікімі блакітнымі вачыма і вясёлаю, радаснаю ўсмешкаю на твары... Тую, якую ён ведаў...

— Дзе цяпер Ліда жыве?

— Ды тут, у Ліпаўцы. На старым сваім селішчы. Карову, свіней трымае. Калі ні ўбачыць мяне, пра цябе ўсё распытвае...

«Трэба з ёй сустрэцца, пагаварыць,— сказаў сабе, як не загадаў, Іван Кузьміч.— Гэта ж... Каб не паехаў я з вёскі... А так... І яна, і я...»

На могілках між тым рабілася ўсё больш гармідарна, тлумна. Адусюль чуліся п'яныя выкрыкі, смех, рогат. Хтосьці нават зацягнуў песню...

— Пачынаецца,— уздыхнула Агапа.— Сябе не паважаюць, дык хоць бы месца, нябожчыкаў паважалі. Дык не ж... Абы да гарэлкі дарвецца — нап'ецца. А тады... Брыдка і глядзець, і слухаць...

— Можа, хопіць нам тут сядзець, пойдзем? — паглядзеў на сястру Іван Кузьміч.

— Рана яшчэ. Ды і няёмка ж першым могілкі пакідаць. А табе... Столькі гадоў не быў тут — і бягом бегчы?.. Не спяшайся. Тут жа людзі. І мёртвыя, і жывыя... Ета ж тут амаль Ліпаўка ўся наша. І тая, што некалі была, і новая, цяперашняя... Можаш прайсціся, паглядзець. Хто на етым яшчэ свеце, хто на тым ужо...

— Каб жа я помніў каго, пазнаў! А то ж... Прозвішча, нават твар быццам знаёмы, а сказаць, хто гэта... Не бяруся.

— І ў мяне такое бывае. Старасць — не радасць... Раскажы, як ты там, у горадзе, жывеш?

— Ды быццам расказваць няма асабліва чаго. Я на пенсію, казаў ужо табе, пайшоў... Жонка... яна нідзе і не працавала, дома ўвесь час. А дзеці... Таксама... Словам, хваліцца вельмі няма чым...

— І ўсе дома, у адной хаце разам з табою жывуць?

— А дзе ім дзецца? Плошча дазваляе. Ды і дзеці не чужыя, а свае.

— Нясоладка табе,— пашкадавала брата Агапа.— Мне таксама нясоладка, бо адна. А табе — што ўсе разам...

Некаторыя ўжо не сядзелі ля магіл, а ўставалі, хадзілі. І па адным, і па двое, па трое. Глядзелі, дзе хто пахаваны, які пастаўлены каму помнік ці крыж, як абгароджана, дагледжана чыя магіла. Далучаліся да той ці іншай кампаніі, віталіся, выпівалі чарку, ішлі далей. І да Агапы, Івана Кузьміча некалькі чалавек наблізіліся, але, пастаяўшы збоку, падысці не асмельваліся — ці то бачылі, што выпіць асабліва няма чаго, ці то Івана Кузьміча саромеліся, не пазнавалі. І ўсё ж адзін — плячысты, нізкарослы, як корч, і быццам не п'яны,— асмеліўся, не падышоў, а нібыта падкраўся.

— Не пазнаеш мяне? — спытаў ён, гледзячы проста ў вочы Івану Кузьмічу.

— Міхась?

— Ну, вядома ж!

Падняўся Іван Кузьміч, абняў Міхася за плечы. І праўда, як можна забыцца, не пазнаць! З ім, Міхасём, ды яшчэ Колем Дзямідчыкам некалі ён, Іван, і ў школу разам хадзіў, і ў лес па грыбы і ягады, разам і партызаніў...

— Як ты жывеш? — спытаў Іван Кузьміч.— Раскажы.

— Лепш за ўсіх,— весела адказаў Міхась.— Усё жыццё за плугам, за бараною прахадзіў. Парадак дома, парадак і за домам... І ў дастатку — адных пчол і то вуллёў з семдзесят. Так што заходзь, госцем будзеш...

— Абавязкова зайду,— паабяцаў Іван Кузьміч.

Падышло і яшчэ некалькі чалавек. Хоць Іван Кузьміч напачатку іх і не пазнаваў, але потым быццам павалока з вачэй спадала, успамінаў былых сваіх аднавяскоўцаў, а то і сяброў. І гаварыў з імі, распытваў пра іх жыццё-быццё, сам пра сябе тое-сёе расказваў. На радасці, што сустрэліся, выпівалі, хадзілі гуртам ад кампаніі да кампаніі, набліжаліся да магіл былых сваіх таварышаў, стаялі, успаміналі... І хоць Іван Кузьміч і не ахвотнік да выпіўкі быў, а ўсё ж назбіраўся, прыгубляючы то тут, то там чарку, то за сустрэчу, то за супакой душы. І бачыў, адчуваў Іван Кузьміч, што яго не забылі ў Ліпаўцы, помняць. І рады, шчыра рады, што прыехаў, прыйшоў сёння разам з усімі на могілкі. І ён, Іван Кузьміч, таксама быў рады, забыўся на ўсе свае нялёгкія думкі і крыўды. Не, не ўсё яшчэ страчана! Іван Кузьміч зноў быццам стаў тым, кім і быў,— звычайным чалавекам, такім, якімі былі на могілках у той дзень усе людзі.

*1985 г.*

# Еўка

«Не, хопіць. Чакаць больш нельга. Ды і няма чаго. Трэба скарыцца долі. Інакш...»

Заплюшчыла вочы, паспрабавала ўявіць, што можа быць, калі яна, Еўка, не паслухае разумнае рады, не пакіне дамоўку, не паедзе з вёскі.

«Памерці няйнакш давядзецца».

«Ну дык і што? Усе ж паміраюць. Вечна жыць не будзеш. Падумаеш, розніца вялікая — на год раней, на год пазней? Каб толькі не хварэць, не мучыцца. Абузай ні сабе, ні людзям не быць. Бо, калі сама на свае ногі не ўстанеш, ні вады, ні дроў не прынясеш, яды не зварыш... Ды і не агледзіш сябе, за сабой не прыбярэш... А то, не дай Бог, яшчэ і глузды, розум адбярэ... Не, як так жыць, лепш памерці...»

«Але ж... Смерці не загадаеш. Калі яна прыйдзе?.. І якая?.. Хто скажа, хто ведае?» — вынырнула аднекуль, абдало з ног да галавы ліпкім, зябкім холадам — аж сцеханула.

«І ўсё ж... Лепей, каб да апошніх хвілін на нагах, пры здароўі, у сваім розуме... Ды і ля пасцелі каб хтосьці быў, вады падаў. І каб пахавалі як чалавека... На могілках, дзе ўсе, з кім жыла, каго ведала... А калі паедзеш адсюль...»

«Не да чужых жа, можа, а да сына. А ён...»

«Што ён? З ранку да позняга вечара на рабоце. Прыйдзе, павячэрае, тэлевізар паглядзіць — і спаць. А я... Адна. Увесь час адна. Са сваімі думкамі-развагамі. Тут, у вёсцы, хоць выйдзеш, нуду на людзі вынесеш, пагаворыш. Ды і хата, гарод, поле тут. А там... Хадзі, сноўдайся па кватэры з кута ў кут, як сама не свая...»

«І там, у горадзе, жывуць жа людзі...»

«Нібыта так. Але... Людзі — ды не тыя. Там ні я нікога, ні мяне ніхто не ведае. Заняты кожны сваім. Хто работаю, хто дзецьмі, хто яшчэ чым. Тыдзень, бывала, і то ледзь вытрымлівала, калі да сына прыязджала. Дык то ж у госці. А цяпер... Жыць...»

«Але і тут аставацца...»

«Ведаю, ведаю... Таму і дратую сябе, мучуся, пакутую каторы ўжо дзень, каторую ноч...»

Звыклым рухам рукі скінула з сябе, як бы адгарнула, коўдру, павярнулася, спусціла з ложка ногі. Знайшла, намацала на падлозе старыя, растаптаныя пантоплі, прайшлася па хаце.

«Каб параіцца... Але з кім?.. Дый... Райся не райся... Што з таго... Божа, гэта ж трэба такой бяды нарабіцца! Аварыя гэтая ў Чарнобылі, радыяцыя нейкая. Вунь з іншых вёсак павывозілі людзей. На аўтобусах, абцягнутых брызентам машынах... Эвакуацыя... Як усё адно ў вайну... Не, не, тады, у вайну, на аўтобусах, машынах людзей не везлі, а гналі пеша... Натоўпам... Як кароў, коней, авечак... Ды яшчэ пад вартаю, пад рулямі аўтаматаў, пад назіркам галаварэзаў-канваіраў. Сабак-ваўкадаваў, што вялі на шворках, гатовы былі кожную хвіліну спусціць, нацкаваць...»

Помніла, добра помніла, не забыла таго Еўка. Ды і як, як такое забудзеш! Наляцелі, прыехалі чуж-чужаніцы, калі людзі яшчэ спалі,— на досвітку. На машынах, матацыклах. Вёску як бач акружылі, пачалі з хат усіх, хто дома быў, выганяць. Нават ватоўку, світку на плечы накінуць не давалі. І пагналі, пагналі... Куды — ніхто не ведаў. Хутка, ледзь не подбегам. Яна, Еўка, аж задыхалася, ісці не магла, нават была, за штосьці зачапіўшыся, упала, паваліласся ў пясок. І яе ботамі, бізунамі білі, пакуль зноў на ногі не ўстала, не пайшла хістаючыся, нічога перад сабою не бачачы, як у тумане, быццам п'яная,— так вадзіла яе ў бакі. Але не, не, дзяцей — Мікітку і Надзейку — нават тады, у хвіліны памутнення, моцна за рукі трымала, не выпускала...

«Дык то ж маладая была я, дужая. І надзея на лепшае ў самыя змрочныя, цяжкія хвіліны не пакідала мяне. А цяпер, калі састарылася, знасілася... Дый... Чакаць, спадзявацца...»

Вярнулася да ложка, упала на пасцель. Проста тварам у падушку. І заплакала, залілася слязьмі, загаласіла ледзь не на ўсю хату...

Уранні, калі развіднела, узышло сонца, Еўку можна было бачыць на двары. Яна то брала з паленніцы, насіла абярэмкам у хату дровы, то ачэрпвала вядром, выцягвала з калодзежа ваду, то, стоячы на ганку, склікала курэй,

сыпала ім ячмень — карміла. Потым паліла ў печы, варыла есці. Словам, рабіла ўсё, што і заўсёды, што прывыкла рабіць за доўгія гады жыцця — і тады, калі яшчэ жывы быў муж, Адам, і дома, у хаце былі малыя дзеці, і тады, калі нечакана для сябе асталася зусім-зусім адна... Праўда, было штосьці і новае ў яе рухах і паводзінах, ва ўсім, куды б ні ішла, што б ні рабіла. І гэта заўважалася, кідалася ў вочы, бо яна ж, Еўка, рабіла ўсё апошні раз, развітвалася з тым, што яе акружала, да чаго прывыкла, без чаго, здавалася, жыць не магла. Яна гаварыла, шаптала:

— Ну, гарыце, гарыце, дровы, варыце яду... Заўтра такою парою не ведаю, дзе я ўжо буду... І ты, печ, не злуйся, што пакідаю цябе. Жылі з табою душа ў душу, у поўнай згодзе. Не падводзілі адна адну. Добрая, прызнаюся табе я, была ты, печ. Колькі гадоў мінула, як зляпіў цябе Кецка, а ты нідзе не пакалолася, цагліна ніадкуль не выпала. Праўда, я добра заплаціла — усю бульбу ўвосень выкапала і ў двор кашалём перанесла. Ды няхай — чалавек ён быў непаганы, багата каму памагаў. І печ, бачыш, па шчырасці, на славу зрабіў. Не ведаю, як ты мяне, а я любіла цябе, печ. Ды і цяпер люблю. Бяліла часцей, чым, можа, трэба было. Усё хацела, каб выглядала ты найлепей — свежа, чыста. І дровы акуратна клала, каб нідзе ні за што не зачапіць, нічога не пашкодзіць, болю табе не прычыніць, сачыла, каб ты не пераграваласся, не чадзела. І жар чысценька выграбала, і нічым под не залівала, і комін чысціла... Цяжка мне будзе жыць без цябе, печ. Ды і табе, мабыць, без мяне. Але што зробіш? Думала, толькі смерць нас з табою разлучыць. Аж, бачыш, не заўсёды выходзіць так, як хочаш. Ты да гэтага, можа, і не прывыкла, а я... Не тое што прывыкла, а ведаю — рэдка, ой як рэдка бывае так, як хочаш, сплануеш... Часцей за ўсё зробіцца наадварот. Хіба ж думала я, што адна ў хаце астануся дні свае дажываць? А давялося, даводзіцца. Дык то ж хоць хата свая была, ды і ты, печ. І ўсё-ўсё, што ў хаце, ды і за хатаю. А цяпер... Зусім адна буду. Нават без вас. Муж, Адам, на могілках. Даўно, даўно на могілках. Даканала яго вайна. Абгарэў быў у танку. Ды і пакалечыла надта ж — нагу адарвала, рукі паперабівала. Вярнуўся — не пазнала я яго, думала, і не муж мой гэта, не Адам. Голас, толькі голас ранейшы. Як загаварыў, здагадалася, пазнала — Адам. Вато і пажыў — якое пажыў, памучыўся гадоў з восем пасля звароту з вайны. Двойню, Лёніка і Кузю, ад яго нарадзіла. Але і яны не на радасць мне на свет прыйшлі. То і ўцехі, што ў сабе іх насіла, на

руках маленькіх песціла, спавівала, грудзі свае ім ссаць давала. А як сталі на ногі... Ды ты, печ, ведаеш, ты бачыла ўсё, чула... І як сварылася я, не пускала іх нікуды з дому ехаць, і як потым плакала, галасіла, калі іх, нежывых, дадому ў цынкавых дамавінах прывозілі, на покуць, на лаўку ставілі. Маладыя, прыгожыя! Ім бы жыць да жыць, радавацца б, а яны... У сырой зямельцы каторы год ляжаць. Во, яда зварыцца, пасёрбаю ды схаджу да іх на могілкі. Пераведаю. А заадно і развітаюся з сынкамі сваімі. Ды і з Адамам. Мусіць, сумнавата яму там аднаму было ляжаць, таму і забраў да сябе дзетак. Паехаць адсюль так, не развітаўшыся? Калі яшчэ прыеду? Ды і ці прыеду? Бачыш жа, гора якое нарабілася. Дамоўку, родны абжыты кут пакідаць трэба. І, відаць, надоўга, можа, і назаўсёды. Маладзейшыя вярнуцца. А я... Невядома. Каб нават не аварыя гэтая, усё адно расстацца давялося б. Так што не крыўдуй на мяне, печ, не таі зла. Па-добраму мы жылі, па-добраму давай і расстанемся. Вось выпалю цябе, нагрэю, яду сабе апошні раз звару — і бывай, не памінай ліхам...

Качаргу ўзяла, паправіла ў печы дровы, прыгарнула бліжэй да чыгунка агонь.

— І ты, кавяня, таксама добра служыла, не падводзіла. Ды і вы, вілы, ёмка,— паглядзела Еўка ў кут, у качарэжнік,— таксама. Вось пакарыстаюся вамі сёння, з печы жар выграбу — і ўсё, бывайце. Адслужылі вы мне сваё. Памаглі і сям'ю гадаваць, і на той свет мужа, Адама, ды і дзетак, Лёніка і Кузю, правесці. Ні разу ні гаршчок я не абярнула, ні чыгунок не выліла, ні скавараду не спаліла. І ў часе ўсё з печы даставала, не прыгарала ніколі нішто, не пераварвалася. І дзяржанняў не мяняла. Як асадзілі тады, як печ зляпілі, у хату жыць перабраліся, так з таго ўсё і асталося...

Успомнілася, уявілася, у вачах раптам паўстала — печ тая, не беленая, сырая, толькі што складзеная з цэглы чырвонай... Ля печы, нешта на хаду папраўляючы, абгладжваючы, з кельмаю ў руках, увесь замурзаны, выпацканы ў гліну, яшчэ завіхаецца Кецка. А збоку, абапёршыся на мыліцу, стаіць муж, Адам... Усміхаецца ў сваю шчылінку-рот — абгарэлы, без губ — рады няйнакш, што печы дачакаўся. Ды, лічы, і новае хаты, замест той, што да вайны была і якую немцы спалілі...

— А печ ніштаватая будзе,— кажа Адам.— Кеб толькі дым не на хату, а ў комін ішоў...

— А дзе ж бо яму дзецца? — паварочвае галаву да

Адама, паказвае свае моцныя белыя зубы — каржакаваты, плячысты — Кецка.— Пойдзе, як міленькі пойдзе. Во хай Еўка не стаіць, дроў прынясе. То і запалім, паглядзім...

І яна, Еўка, тады яшчэ маладая, рухавая, выбягае з хаты, хапатліва збірае трэскі, сухія, сасновыя, счэсаныя з бярвенняў, што ў сцены ўжо даўно пакладзены,— уносіць у хату. Кідае іх ля парога і, не затрымліваючыся ні на хвіліну, зноў хуценька выбягае на падворак, прыносіць яшчэ і яшчэ абярэмак. Асцярожна, быццам баючыся, складвае іх у печ, запальвае. І дым... Дым, нібы сляпы, нейкі час тыцкаецца, шукае, куды яму ісці, імкне то ў адзін, то ў другі бок, паўзе нізам... Ну, а потым... Падымаецца ўгору, валіць у комін.

— Ура-а! — крычыць Адам.— Наша перамагло!

— Я ж бо казаў, ге-ге,— смяецца, рагоча Кецка.— Дзе ж бо яму, таму дыму, дзецца, як не ў комін ісці. Можа ж — я спец у гэтым дзеле, не першую печ ляплю...

І, павярнуўшыся да яе, Еўкі, Кецка ўжо не кажа, а як бы загадвае:

— Давай, маладзіца, на стол стаўляй, што ты там прыпасла... Інакш, калі не замочым, разваліцца печ, стаяць доўга не будзе...

І яна, Еўка,— лёгкая, рухавая,— ног пад сабою тады яшчэ не чула — зноў зрываецца з месца, бяжыць з хаты. Бяжыць у зямлянку, дзе раней, да хаты, жылі. Пасля ж, як перабраліся ў хату, зямлянка як бы за камору, пограб служыла. Там, у зямлянцы, яна, Еўка, хутка і без цяжкасці — сама ж ставіла, хавала! — знайшла паўлітэрку мутнаватай самагонкі, што знарок купіла, берагла дзеля такога важнага ў жыцці выпадку. Узяла загорнуты ў кавалак палатна і штыглік сала, паўбохана хлеба, некалькі цыбулін. І калі прынесла ўсё гэта ў хату, паставіла, палажыла на стол — аж ахнулі мужчыны — і Кецка, і Адам.

— Ух ты! Ну і Еўка, ну і малайчына!..

Здаецца, Кецка сказаў гэта. А можа, і Адам. Ён заўсёды такі быў, любіў пахваліць Еўку, здзівіцца яе спрыту, гаспадарлівасці, уменню пачаставаць, прывеціць гасцей.

Ужо седзячы за сталом, выпіўшы па чарцы і закусіўшы, мужчыны, як і ўсе, мабыць, у тыя гады, узяліся ўспамінаць вайну, дзе хто быў, што перажыў.

— Яно, вядома, у кожнага па-свойму ўсё складвалася,— казаў, аблізваючы тоўстыя, тлустыя губы, Кецка.— Адны ваявалі, кроў пралівалі, а іншыя... Э, у партызанах наглядзеўся... Я ж... Печы налаўчыўся быў ляпіць, вупраж

ладзіць, хамуты падшываць. Ды і зямлянкі рабіць, плашкі часаць, падлогу слаць, нары ставіць. Так, лічы, усю акупацыю і праваждаўся з гэтым, аж пакуль вызваленне не прыйшло. Потым мяне ў армію забралі, у сапёры папаў. Масты, пераправы праз рэкі ладзіў. Пад бамбёжкамі, пад абстрэлам. Але, бачыш, выжыў, нават сур'ёзна ні разу не параніла. Так, чыркнула куля па спіне ды разоў колькі хваляю скідвала. Выкупаешся ў халоднай як лёд вадзе, спірту ці гарэлкі шклянку хапянеш і зноў у строй...

— А мяне...— уздыхаў, крактаў Адам,— пяць разоў падбівалі. Але нічога, неяк выбаўляўся. Толькі апошні, шосты раз не пашанцавала. Доўга выбрацца з танка не мог...

— Хіба не было каму памагчы? — гудзеў, быццам чмель, сваім густым пракураным басам Кецка.

— Не было,— ківаў сумна галавою Адам.— Усе мёртвыя былі. Я адзін з усяго экіпажа жыць і астаўся...

— І дзе гэта цябе так?

— Ды, лічы, пад самым Берлінам. Вёсачка ці, можа, гарадок невялікі... У іх там не разбярэш. І ў гарадах і ў вёсках камяніцы, вуліцы брукаваныя. І гародзікі, сады... Я першы ў калоне ішоў. А яны, гады, канец ужо, можна сказаць, вайны, рукі ўгору пара падымаць, у палон здавацца. Дык не ж, да апошняй хвіліны адстрэльваліся, ваявалі. Згледзеўшы акопы, разварнуліся мы, у наступ пайшлі... Гармата там была... То я проста на яе і папёр... Не помню, сцёр гусеніцамі, растаптаў ці... Словам, у шпіталі толькі да памяці прыйшоў... Вайна скончылася, а я дадому ехаць не магу, раны лячу. Да восені праваляўся на ложках шпітальных. Дый цяпер... Эх, давай хіба яшчэ па чарцы нальём ды вып'ем...

Налілі, выпілі. Ужо без яе, Еўкі, нават не запрасіўшы чокнуцца, прыгубіць чарку. Смылела, балела ў кожнага з іх сваё. І яна, Еўка, гэта разумела. Адышоўшыся ад стала, бульбу пачала лупіць, слухаючы, пра што мужчыны там, за сталом гавораць.

— Кеб не вайна, не немец пракляты,— гудзеў Кецка,— жылі б. А так... Бачыш, ты без нагі ды і рукі... І абгарэў. А я... Жонку, дзетак — Мар'ю сваю, Клаву і Міцю страціў. Пазабівалі іх, гады, як пачулі, што ў лесе я...

— І ты... Нічым памагчы не мог? — пытаў, спрабаваў неяк суцешыць суседа Адам.

— Як ты паможаш? Прыехалі, забралі ў мястэчка,

у камендатуру павезлі... Патрымалі тыдзень... І... я даведаўся пра ўсё потым, ужо ад людзей...

— Мая таксама нацярпелася на чужыне...— уздыхаў, як бы шкадаваў яе, Еўку, Адам.— За парабчанку, лічы, была, мучылася аж два гады...

— Ды няхай бы... Абы жывая, здаровая. А то ж...

— Жаніся, новую бабу бяры,— раіў Адам.

— Новую кажаш. Э-э, каб жа гэта лёгка было!.. Мар'я з галавы не выходзіць. Можа, як падумаю іншы раз, і не трэба было мне ў тыя партызаны ісці, перабылося б, перацярпелася б усё як-небудзь. І сам бы, і яны, сям'я мая, жывыя б былі, не пілаваў бы сябе я гэтак штодзень, штохвіліны, як цяпер пілую...

— Хто яго ведае, як яно лепей, а як горай. Я сам іншы раз думаю — кеб не развярнуў танк, не папёр проста на гармату, што па нас страляць пачала, можа б, таксама нічога са мною не здарылася, не паранены, здаровы б з вайны вярнуўся. Ды што ўспамінаць? Таго, што зрабілася, не пераробіш, назад не вернеш...

— Ды яно так. І ўсё ж... Неяк не па-людску абышлося з намі жыццё...

— Не жыццё, а вайна!

— Не, брат, вайна вайною, а жыццё жыццём. Прасам гарачым прасуе яно нас, кладзе раней часу ў магілы. Ды і не дае таго, чаго мы хочам, пра што марым. З адным сяктак, з горам папалам, управішся, новая бяда ў парозе стаіць, чакае. Паўзеш, як тая мурашка з ношаю... А куды, чаго?

— Але ж і прыемныя, радасныя хвіліны бываюць, не ўвесь жа час гора.

— Мала, мала іх. Ды і нядоўгія, надта ж кароткія тыя хвіліны...

Не манілі мужчыны, праўду, чыстую, як ёсць, праўду казалі. І яна, Еўка, згаджалася з імі і тады, ды і цяпер — мала, вельмі мала чалавеку даецца радасці і нядоўгая, кароткая яна. Як сонца ў непагодлівы асенні дзень — вынырне з-за хмар, усміхнецца і тут жа знікне, схаваецца. І пакуль даставала з печы чыгунок са звараным картапляным булёнам, налівала ў міску, потым студзіла і сёрбала, успамінала тыя самыя прыемныя, радасныя хвіліны ў сваім жыцці — хвіліны вялікіх надзей, узрушэнняў і хваляванняў. І, вядома ж, шчасця. І звязаны гэтыя хвіліны былі

ў яе, Еўкі, з Адамам, усім тым, што прыйшло разам з ім у яе жыццё. Да гэтага ж хоць і маладая была, дужая, а радасці, шчасця як бы і не ведала. Ды і не магла ведаць, бо, акрамя работы, свету божага не бачыла. І ў маленстве, калі жылі ў роднай вёсцы — Карчах, у дзеда, які ўсю сям'ю проста поедам еў, не даючы нікому і хвіліны пасядзець — працаваць гнаў, ды і потым, калі бацька — дзедаў сын, падарваўся, нагружаючы на воз бервяно, і, некалькі тыдняў прамучыўшыся, памёр і маці выйшла замуж у суседнюю вёску Сабалі, за ўдаўца, на чацвёра дзяцей, то ўжо і ў айчыма. І дзяцей глядзела, і ў полі, гародзе ўсё рабіла, і ў лес па ягады, грыбы бегала, і кудзелю прала, кросны ткала... І так, пакуль за Адама замуж не выйшла. Пазнаёміліся яны выпадкова. Ён конюхам быў, коней калгасных пасвіў. І прыгнаў табун аж пад Сабалі, на луг. І там яе, Еўку, убачыў, калі яна позна ўвечары з сенажаці з граблямі ішла — забавілася, упраўляючыся з сенам,— хмарыць было пачало, і яна спяшалася, не хацела пракосы сухія, не згрэбеныя на ноч пакідаць. І загарэліся ў Адама вочы, пасвятлеў ён нейк ураз. І з таго вечара пачаў як не штодзень пад самыя Сабалі табун на начлег прыганяць. Не спала, амаль не спала па начах больш у тое лета яна, Еўка. Спярша ад няўцямнага, але такога салодкага, мляўкага хвалявання, быццам прадчування чагось незвычайнага, добрага. Ну, а потым, калі пазнаёміліся, калі пачалі, хаваючыся ад бацькоў, сустракацца і ад усяго астатняга, што прыйшло, нечакана нахлынула. У цёплыя ночы яна штолета спала на сенавале, і таму ўцячы з дому няцяжка было. Улягуцца спаць, сцішыцца вёска, дык яна, Еўка, і злазіць з вышак, гародамі па расе крадзецца на луг. Адам быў не з беднай сям'і, і ў торбе ў яго заўсёды ляжаў добры кавал хлеба, сала дый пляшка малака была. А то, калі не паляну-ецца, і бульбы набярэ, пячонікаў напячэ. І яны з Еўкаю і елі разам, і, дурэючы, бегалі, бы дзеці, па лузе, хаваліся адно ад аднаго па кустах, і спалі, драмалі, паслаўшы пад бакі кажух ці гуньку. І, вядома ж, мілаваліся, цалаваліся... Толькі пад раніцу, калі на світанне бралася, вярталася да дому, на сенавал... І хоць амаль не спала па начах, стомы не адчувала. Праўда, з ног іншы раз валілася, засынала хутка. Як прысядуць палуднаваць, дык яна і засне.

— Што гэта з табою, Еўка? — першая заўважыла перамену, спытала ў яе аднойчы маці.

— А што? — насцярожылася яна, Еўка: ці не даведалася пра што, не прачула маці?

— Ды спіш ты на хаду. Што, не высыпаешся хіба?

— Гэта, мусіць, ад стомы...

А як улягаліся ўвечары спаць, цішэла вёска — зноў злазіла з вышак, кралася на луг, дзе Адам коней пасвіў, чакаў яе...

Так ні пра што і не даведалася маці, ды і айчым, да восені самай, той пары, калі неяк пад вечар Адам са сватамі ў хату завітаў. Бо Адам слоў на вецер не кідаў. Сказаў Еўцы, што замуж яе забярэ — і...

Айчым замуж аддаваць Еўку не хацеў. Яна ж дармовая работніца ў хаце была. Прычым не абы-якая, а добрая, талковая. І доўга не згаджаўся, упарціўся, не казаў сватам свайго слова. Угаварыла яго маці — бяруць, то няхай ідзе. Бо дзеўка ж — гэта не хлопец, што заўсёды пару сабе падбярэ, знойдзе...

Вяселле згулялі на Пакровы. І адразу ж пераехала Еўка жыць да Адама. У яго хату, у яго вёску.

Адам ласкавы быў, кахаў, шанаваў Еўку. І ад цяжкай працы aберагаў. Як толькі трэба што зрабіць — сам на выручку ёй кідаўся, шчыраваў. І дроў у печ прынясе, і вядро, каб вады набраць, з рук выхапіць. Ды і маці яго, Адарка, таксама як да роднай дачкі адносілася, асабліва як зацяжарала, ды і потым, калі дзеткі пайшлі — сынка Мікіту і дачушку Надзейку нарадзіла.

— Ты, донька, сябе глядзі, дзетак сваіх, а з астатнім усім мы з Адамам і самі ўправімся,— казала яна.

Але Еўка не прывыкла без працы быць. І ў новай сям'і паводзіла сябе так, як і раней,— і дома, і ў айчыма. І ў полі рабіла, і ў гародзе, і на лузе, і ў лес па ягады, па грыбы бегала. І ў хаце прыбірала — мяла, мыла, бяліла... А па начах... Божа, як добра было ляжаць у пасцелі побач з Адамам, гарнуцца да яго, адчуваць сілу і ўладу. Ды і ласку. А потым засынаць, паклаўшы галаву яму на руку і прытуліўшыся ўсім сваім целам да яго цела. Здавалася, канца радасці, шчасцю ніколі не будзе. І, відаць, не было б, каб не вайна...

Заўсёды, калі Еўка ўспамінала вайну, то хрысцілася, гаварыла сама сабе, шаптала:

— Божа, не дай, каб паўтарылася тое!..

Гэтак і цяпер зрабіла — перастала есці, палажыла на

стол лыжку, падняла вочы на абраз, што, завешаны вышываным ручніком, вісеў у чыстым куце, сказала:

— Божа, не дай, каб паўтарылася тое!..

...Адама яна, Еўка, правяла на вайну ў той дзень, калі аб'явілі мабілізацыю. Правяла не адна, а разам з яго маці і дзецьмі — Мікіткам і Надзейкаю. Аж за вёску, дзе стаяў крыж, абчапляны белымі ручнікамі. І заплакала, загаласіла,— ведала, што Адама больш можа не ўбачыць...

І пачалося ў яе, Еўкі, жыццё, як, мабыць, і ва ўсіх, хто тады мужа на фронт правёў,— сумнае, беспрасветнае. Здаецца, і работу тую ж, што і раней, рабіла, а спрыту, ахвоты не было ніякай — з рук усё падала, валілася. І адна, адна думка была, з галавы не выходзіла: «Дзе Адам, што з ім?» Па начах амаль не спала. Ды і як спаць, калі ім, Адамам, яшчэ пасцель пахла, калі пра яго ў хаце і на двары ўсё-ўсё, куды ні пойдзеш, на што ні паглядзіш, напаміналa,— самога ж яго не было... А тут яшчэ суседкі, у гурт сабраўшыся, якіх жахаў ні расказваюць, пуду адна адной паддаюць — і пра мужчын сваіх, каго на фронт правялі, і пра ворагаў-акупантаў, што наступаюць, не сёння-заўтра тут, у іхніх Валоках, будуць... Не тое што сон не ішоў — яда ў рот не лезла...

...Немцы ў Валокі прыйшлі пад восень. Бульбу пачыналі ўжо капаць. Сагналі людзей да сельсавета, выбралі старасту, назначылі начальніка паліцыі — і паехалі. Нават падумалася было тады — не такія яны страшныя, як малявалі. Аж не — хутка ўбачылі, даведаліся, што такое немцы — акупанты, фашысты. Спярша падаткамі ціснулі, абкладвалі — то сала, масла, яйкі здай, то кажухі, валёнкі. А калі ў лесе аб'явіліся партызаны, то і зусім спакою не стала. Амаль штодзень наязджалі ў вёску, па хатах, хлявах, паграбах шныпарылі, да сельсавета, які цяпер пачаў называцца валасцю, людзей зганялі. І ўсё страшылі, страшылі — турмою, расстрэламі, павешаннем. І не толькі страшылі, а і арыштоўваць, браць людзей пачалі. То аднаго, то другога. І не чуваць было, каб хто-небудзь з арыштаваных назад, дадому, у вёску сваю вяртаўся. Часцей чуткі іншыя даходзілі — таго павесілі, таго расстралялі, таго ў Нямеччыну, на катаржныя работы, павезлі. І да іх, Аляксейчыкаў, у хату гора прыйшло — Адарку, Адамаву

маці, яе, Еўкі, свякруху, немцы заарыштавалі. За што — ніхто толкам не ведаў. Нехта быццам штосьці напісаў ці данёс на яе. Яна, Еўка, назаўтра ж у мястэчка, куды старую павезлі, пайшла, каб ратаваць. Ды і яды якой занесці, перадаць. Дома дзяцей адных пакінула, загадаўшы з хаты нікуды на двор не выходзіць, на печы сядзець, яе чакаць. Васемнаццаць кіламетраў, можа, за гадзіну прабегла, хоць дарога і нялёгкая была, закіданая, замеценая снегам. І камендатуру нямецкую знайшла, дапыталася чалавека, які гаварыў па-нашаму і выслухаў яе. Нават перадачу ўзяўся перадаць свякрусе. Але за што і на колькі забралі, пасадзілі за краты старую — ён не ведаў. І ніхто гэтага не ведаў, сказаць не мог. Толькі пасля, мо праз тыдзень, калі яна, Еўка, уволю набегалася, то ў мястэчка, то з мястэчка, дзяцей адных дома пакідаючы, даведалася, за што старую ўзялі — быццам звязана яна з партызанамі была, ведала, дзе іх атрад. І старую мучылі, на допыты вадзілі, патрабавалі, каб расказала яна ўсё, што сама ведала — і дзе цяпер атрад стаіць і хто ў вёсцы з партызанамі мае сувязь. Вядома ж, старая мала што ведала пра партызан і сказаць нічога пэўнага не магла. Яе білі, катавалі, дамагаліся прызнацца. І аднойчы, калі яна, Еўка, зноў прыйшла ў мястэчка, ёй паведамілі: свякрухі няма жывой — памерла яна. А можа, і не памерла, а забілі яе. На допыце ці яшчэ як... Перадачы ў Еўкі не ўзялі, сказалі, каб не хадзіла больш у камендатуру.

— А пахаваць у вёсцы забраць яе можна? — спытала яна, Еўка.

— Не, тых, хто памірае ў турме, хаваць не дазваляецца на могілках. Іх самі новыя ўлады хаваюць...— быў адказ.

...Бяда, кажуць, адна не ходзіць, за сабою другую водзіць. У той жа дзень, вяртаючыся дадому, да дзяцей, зайшла яна, Еўка, як і заўсёды, калі ў мястэчка ці з мястэчка кіравалася, да маці — балазе па дарозе гэта было. І даведалася яшчэ пра адну страшную смерць — немцы айчыма яе застрэлілі. Проста ў хаце: не паслухаўся ён загаду нейкага нямецкага прыхвасня, што ў хату забег, агрызнуўся. І той прыхвасцень, раззлаваўшыся, прыкладам айчыма ўдарыў, а потым, калі айчым здачы хацеў даць, стрэліў у яго...

Адна маці асталася, з дзецьмі айчымавымі... Ды і яна, Еўка, таксама асталася адна, з дзецьмі... У чужых, лічы, вёсках, сярод чужых людзей...

«...Трэба было, мусіць, з маці з'ехацца, аб'яднацца, жыць адною сям'ёю, разам лягчэй, можа б, было»,— думала неаднойчы Еўка. Праўда, потым ужо, апасля. Тады ж, у вайну, такое неяк і ў галаву не прыходзіла. Дый хто ж ведаў, што каго чакае наперадзе...

Цяжка-цяжка ўздыхнула, паднялася з-за стала, узяла ў рукі міску, лыжку, пайшла мыць.

«Хіба і іх з сабою ў горад забяру,— падумала Еўка пра міску і лыжку.— Хоць што сваё будзе, дамоўку напамінацьме... Хату, вёску, ранейшае жыццё тут...»

Міска была не бог ведае якая, гліняная, купленая даўным-даўно, на базары. Нават беражок у адным месцы быў адбіты, вышчарблены, ды і паліва паздзіралася ўжо, пазлазіла. Лыжка таксама была не новая — драўляная, выразаная з сухой грушы, і таксама калісьці даўным-даўно купленая на базары. Але яны былі звыклыя, служылі ёй, Еўцы, столькі год. Служылі надзейна, верна. І пакідаць іх, не браць з сабою... Не, гэта было б жорстка. І да іх і да сябе. Дый месца не так шмат яны патрабавалі. І вага невялікая. Вось чыгунок... І яго, вядома, шкада пакідаць. Але... Усяго з сабою не возьмеш, не забярэш. Дый варыць у чыгунку там, у горадзе, нічога ж не будзеш. Без патрэбы ён там, у горадзе. Там жа газ, пліта. А чыгунок — для печы... Так што...

«Наогул, падумаць, добранька падумаць трэба, што з сабою браць, а што не браць. І з посуду, і з адзежы. Ды і з усяго. А астатняе... Суседзям хіба пааддаваць. Хаця... Што каму трэба? Жылі ж і так не пагана людзі, усяго хапала... А цяпер, калі гэтая радыяцыя, калі не ведае ніхто, што будзе, няпэўнасць ва ўсіх і ва ўсім... З іншых вёсак вунь павывозілі людзей. То і сваё, кажуць, што ўзяць трэба было б, не бралі...»

«Але ж людзі тыя вернуцца яшчэ дадому, у сваю вёску. А я...»

«Можа, і я вярнуся. Не вечна ж будзе гэтая радыяцыя...»

«О не, старая я на паездкі сюды-туды, здароўя няма. І гэта правільна сын піша, каб ехала да яго, жыла там, у горадзе. Нават калі яшчэ радыяцыі не было, гаварыў, пісаў, прасіў... А цяпер... Дзяцей вунь, жанчын цяжарных павывозілі. Значыцца, небяспечна жыць тут...»

«А можа, не спяшацца, пачакаць?»

«Чаго чакаць?»

«Ну, каб разам з усімі... Як усе, так і я...»

«Не, не ва ўсіх ёсцека куды ехаць... А ў мяне... Сын, Васілёк, у горадзе. Кватэра ў яго, два пакоі. І вада цёплая і халодная ў хаце, і туалет, і ванна, і кухня... Жыві ды радуйся...»

«Але ж свая хата, свая печ, ды і ўсё сваё. Сама сабе гаспадыня — калі хочаш, тады лёг, калі хочаш,тады ўстаў. І зварыць чаго захацеў — зварыш. І куды захацеў — пойдзеш. Ды і магілы ж тут — Адама, дзетак...»

Успомніла пра магілы — і заспяшалася, замітусілася. «Пайду хіба, праведаю. Бо, можа, і не давядзецца больш».

Кіёк арэшкавы сухі ў рукі ўзяла, што ў качарэжніку разам з ёмачнікамі стаяў і з якім не расставалася ўжо, калі хату пакідала, кіравалася куды-небудзь далей свайго двара. Да дзвярэй падышла. Але апомнілася, спахапілася ў час.

«Як жа гэта я так, не пераапрануўшыся, адзежы не памяняўшы? Не куды ж небудзь, а можа, на могілкі іду».

Вярнулася ў другую, светлую палавіну хаты, спынілася ля куфра, што, засланы льняным абрусам, у куце стаяў, адчыніла яго. І застыла зноў у одуме.

«Куфра таксама не забярэш з сабою... Давядзецца пакінуць. А ён жа адзінае, што ад маці асталося... Як бы спадчына, памяць...»

Успомніла, згадала — куфар гэты вязлі яны з маці з Карчоў, калі перабіраліся жыць у Сабалі, да айчыма. Куфар гэты вязлі з Адамам, калі вяселле было, пераязджала яна, Еўка, жыць у Валокі. Не купляла маці ёй новага куфра, не было вельмі за што — свой аддала. Заслала, накрыла яго абрусам, бо не новы, а ўжо даволі абабіты, абшарпаны ён быў, перахрысціла і... Слязьмі залілася, заплакала. Не, не куфра шкада было ёй, хутчэй, мабыць, успомніла, як сама замуж выходзіла. А мо яе, Еўкі, не хацелася ад сябе адпускаць, аддаваць у чужую вёску...

«А куфар яшчэ моцны. Хоць і вайну амаль усю ў зямлі прастаяў».

Здагадалася яна, Еўка, тады, як немцы ў Валокі прыйшлі, яго ў зямлю закапаць. Дбайна бяростаю, саломаю аблажыла. Можа б, і не закопвала, але надта ж паліцаі панадзіліся ў яго лазіць. Як прыедуць у вёску, дык і ну шныпарыць, браць, што дзе ні ляжала. Вось яна, Еўка, і надумала схаваць куфар, у зямлю закапаць ад вачэй прагных, сквапных да чужога дабра... І куфар аж тры гады

прастояў у зямлі. А прыехала, вярнулася з Нямеччыны — адкапала...

Вядома, то была радасная хвіліна ў яе, Еўкі, вельмі радасная — сустрэцца зноў са сваім, ды нават не сваім, а матчыным, куфрам!

Аж не па сабе, млосна рабілася Еўцы, калі ўспаміналa Нямеччыну, тое, што там перажыла. Ды і не толькі там, але і па дарозе туды і назад...

«Маладая тады была, усё вытрымала. А каб давялося цяпер...»

Уваччу пацямнела, у галаве закружылася, павяло, калі раптам паўстала тая шэрая, пыльная дарога, натоўп людзей... Жанчыны, дзеці... З клункамі, гладышкамі, вёдрамі... І яна, Еўка, у натоўпе тым... Баліць, ці то ад спёкі, што аж душыць, ці то так ад чаго, здаецца, разламваецца, галава. Дваіцца, траіцца... Не разабраць ужо, дзе свае людзі, а дзе ахоўнікі-немцы... Кавалачкі, частачкі... То рука, то нага, то твар...

«А потым я ўпала... Зноў ішла... Перапоўнены таварны вагон... Казармы нейкія... Лагер за калючым дротам... У полі... І там...»

Як да даўняй балючай і незагойнай раны дакранулася Еўка, успомніўшы, што гэта ж там, у лагеры тым, за калючым дротам, Надзейка памерла. Відаць, прастудзілася ў дарозе, скразняком прахапіла. А можа, і іншае што прыкінулася. Не спала па начах, плакала, крычала і ўсё чэзла, чэзла проста на вачах. У лагеры ж і зусім згасла. Як свечачка. Тут была, тут няма. На руках у яе, маці. Вочкі расплюшчыла, паглядзела як бы са здзіўленнем, усміхнулася. Пацягнулася ўсім сваім худым цельцам, і...

У той жа дзень Надзейку забралі. І дзе падзелі — хто скажа, хто ведае. Можа, нават і не пахавалі, у зямлю не закапалі...

Яе ж, Еўку, тыдні праз два перавялі на ферму да баўэра. Не адну, а з Мікіткам. З ім, Мікіткам, яна ўжо нідзе не расставалася — разам і кароў даілі, і гной з хлявоў выкідалі, і буракі, бульбу мылі, корм жывёле давалі. І ўсё, што толькі ні загадвалі рабілі...

...Ферма была ў полі. Пры ёй стаяла некалькі цагляных домікаў — у іх жылі парабкі. Сярод парабкаў — паляк Стэфан — грузны, заўсёды ўсім незадаволены, буркліві, чэшка Мілана — маладая, мілавідная, і яна, Еўка. Сам

баўэр — тоўсты, брухаты, пры пышных вусах, жыў непадалёку, у гарадку. Але на ферму прыязджаў часта — то на веласіпедзе, то ў брычцы, запрэжанай паркай коней. І надта ж сачыў, каб парадак усюды і ва ўсім быў. Не дазваляў і сянінцы не на сваім месцы ляжаць. Усюды каб і падмецена было, і памыта. Рабочы дзень цягнуўся, пакуль светла было. Адно зробіш — другое чакае. Ды ёй, Еўцы, да работы было не прывыкаць. Навучылася і касілкай упраўляць, і жняяркай. І арала, і баранавала, і скародзіла. Ды і ў хлявах парадак належны трымала. Так што калі баўэр па ферме хадзіў, правяраў, дзе што і як зроблена, бывала, і хваліў яе:

— Гут-гут, Ева!

Але гэта здаралася рэдка. Часцей жа баўэр — яго звалі Паўль Зейлер — сварыўся. Асабліва на паляка Стэфана, які абыякавы да работы быў, лянівы, нават самога сябе і то як след дагледзець не мог — вечна хадзіў непаголены, у нямытай, нялатанай, без гузікаў апратцы. І чакаў, чакаў, калі пакіне ферму, паедзе баўэр. Тады Стэфан завальваўся спаць.

— Ат,— махаў ён рукою, апраўдваўся іншы раз перад ёю, Еўкаю,— ласкі панскай не заслужыш, работы не пераробіш...

Свае, асаблівыя, былі ў баўэра адносіны да чэшкі Міланы. Пра іх Еўка здагадвалася. Бо і работы вельмі не загадваў ёй рабіць, і ў поле, на луг рэдка пасылаў. Часцей яна дома сядзела, нешта вязала, шыла. І заўсёды, калі б ні прыязджаў на ферму баўэр, не мінаў Міланы, у домік да яе заглядваў. Праверыць, як ранейшыя яго распараджэнні выкананы, аддасць новыя — і кіруецца да Міланы. Хадзіла Мілана ва ўсім чысценькім, акуратненькая і гожая, быццам сама немка была, паня... Але не, не зайздросціла Еўка Мілане, ведала: у кожнага чалавека сваё жыццё і з ім трэба мірыцца, прывыкаць да яго і не жадаць іншага. Тым больш не зайздросціць. Наадварот, асуджала Мілану. Ды каб ёй, Еўцы, нешта падобнае прапанавалі... Не, яна памерці гатова была, толькі б вернай мужу быць, Адаму. Што і ён, Адам, такі, што ён не загінуў, жыве — яна верыла, нават упэўнена была... Вось толькі баялася, трывожылася — што скажа, калі даведаецца, што яна, Еўка, Надзейкі не ўберагла, памерла тая. І гэта мучыла, спакою, жыць не давала... Ды і шкада ж, шкада Надзейкі было. Не пажыла ж, радасці ніякай не спазнала, так рана на той свет пайшла... Не дагледзела яна, Еўка, яе, вось дзіця і захварэла, памерла...

Калі вайна на нямецкую зямлю прыйшла, бамбёжкі пачаліся — не за сябе, каб жыць астацца, хвалявалася яна, Еўка, а за сынка, Мікітку. Ні на крок ад сябе нікуды яго не адпускала. Як толькі самалёты ў небе з'яўляліся — чые, усё адно — яна работу, якая б тэрміновая ні была, кідала і хавацца ў поле, у разоры, бегла. А потым, калі баі паветраныя пачаліся, страляніна ў небе,— у трубу цэментовую, што непадалёку ад фермы пад дарогай была, залазіла з Мікіткам і сядзела там па гадзіне, а то і больш, пакуль не аціхала, самалёты не знікалі.

І ўберагла Мікітку, дадому, як вайна скончылася, з ім прыехала. Толькі адзін раз ад сябе адпусціла, і то... Божа, што, што магло здарыцца!

...Яна тады да каменданта пайшла, ужо савецкага,— даведацца, пачуць хоць што-кольвек пра мужа свайго, Адама. А яму, Мікітку, наказала — ад клункаў ні на крок не адыходзіць. Ён, праўда, слухмяны хлопчык быў, не адыходзіў нікуды. Іншыя хлапчукі, равеснікі, да яго падышлі. А ў іх напакаваны былі пазухі, кішэні порахам. І яму, Мікітку, пораху не пашкадавалі — поўную шапку насыпалі. Бо хапала яго — капцы, кучы ляжалі, склады нямецкія непадалёку ад гарадка таго, дзе спыніліся, яны, тыя, хто з чужыны дадому, на радзіму вяртаўся і чакаў машын, каб пагрузіцца ды далей ехаць. Хлапчукі пачалі паліць той порах. Адну доўгую, быццам макароніну, парашыну запаляць, потым другую... У пясок укінуць, нагою на яе наступяць — парашына задыміць ды як скочыць... Хлапчукам весела, смех... Запаліў адзін, Хведзька, гэткую парашыну, яму ў пальцы ўпякло. Ён аб пазуху цярнуў, а ў пальцах — парашына тая, агонь. І ўспыхнула пазуха, потым і кішэня, напакаваная порахам. Хлапчук уцякаць кінуўся,— агонь яшчэ больш разгарэўся. Не хлапчук ужо — суцэльнае полымя... Крокаў мо дзесяць-пятнаццаць зрабіў і паваліўся...

Калі падбеглі да яго, ён жывы яшчэ быў, дыхаў. Але абгарэў увесь, жывога нідзе месца на ім не засталося...

...Яна, Еўка, калі вярнулася ад каменданта і даведалася пра ўсё, што з хлапчуком тым, Хведзем, здарылася, месца сабе не знаходзіла, супакоіцца не магла. Тое, што з хлапчуком тым, і з Мікіткам магло быць. Порах з шапкі высыпа-

ла, плескачоў па мяккім месцы надавала. І насварылася, накрычала. Ды... Хоць і кажуць, беражонага і Бог беражэ, аднак як ні берагла яна Мікітку, усё адно не ўберагла. Мусіць, і праўда: што каму наканавана, на раду напісана — таму і быць, не мінаваць. Няма Мікіткі. І даўно, даўно няма. У лес, па суніцы, пайшоў. І не вярнуўся. Пастухі яго на другі дзень толькі знайшлі. Нежывога. На міне нямецкай, што на партызан у лесе ставілі, падарваўся, бедны...

Страсянула галавою, нібы хацела ўспамін страшны, крывавы прагнаць, не бачыць зноў таго, што, прыбегшы тады ў лес, убачыла... Хутка-хутка, быццам спяшаючыся, пачала перабіраць рэчы, што ў куфры ляжалі,— што з сабою ў горад забраць, калі да сына паедзе, а што пакінуць. Нічога асаблівага, здавалася, і не было, а шкада, усяго шкада... Бо лішняе і не ляжала. Кофта, спадніца, кашуля, хустачка... Гэта — у асобным вузельчыку, на смерць. Чысценькае, свежанькае. На смерць ляжаў і сувойчык палатна — каб дамавіну было чым абабіць, ды і самую засланць, накрыць. І туфлі, панчохі там жа, загорнутыя ў газету, ляжалі. Няхай будзе ўсё гатовае, каб тады, калі смерць прыйдзе, нікому клопату не мець, не шукаць. Ды і не купляць, не надзяваць абы-чаго, выпадковага. А так усё сама сабе падабрала, прымерала. Нават суседкам паказала, дзе што ляжыць на выпадак чаго. І грошы тут жа, у прыскрынку, каб было за што гарэлкі купіць, памінкі справіць... Па-рознаму цяпер хаваюць людзей, але яна, Еўка, хоча, каб пахавалі па-даўняму — з дубовым крыжам на магіле, памінкамі ў яе дома, за сталом. І каб не на машыне дамавіну на могілкі везлі, а на конях...

«І жыла б, не ехала б нікуды адсюль з вёскі, то, пэўна, так бы і пахавалі. А там, у горадзе... Не, не будзе таго...»

Зноў задумалася, глыбока задумалася Еўка.

«А можа, усё ж нікуды не ехаць, тут астацца?»

Не было, не было пэўнасці, рашучасці ў Еўкі. І быццам ехаць, пакінуць вёску трэба, і... Не хацелася, ой як не хацелася гэта рабіць. Усё ж, куды ні паглядзі, за што ні вазьміся, быццам рукамі трымае, не ахвоціць, не пускае адсюль...

Выняла з куфра кофту, спадніцу, якія заўсёды надзявала, калі куды-небудзь на людзі ішла, пераапранулася. І фартушок белы, вышываны падвязала.

«Як будзе, так будзе, а на могілкі схаджу... Пагавару, параюся з усімі сваімі...»

Узяла зноў у рукі сухі арэшкавы кіёк, дзверы адчыніла, пайшла, апіраючыся на яго...

На могілкі можна было ісці па вёсцы. А можна было і гародамі, па сцежцы, міма людскіх хат і хлявоў. Гэта і карацей, і не так пяску, пылу багата. Ды па сцежцы і людзей менш сустрэнеш. А то, калі па вёсцы пойдзеш, убачыш каго, спыняйся, стой, тлумач, куды і чаго кіруешся. А гэта не хацелася. Дый, калі шчырую праўду казаць, і сустракацца вельмі ні з кім жадання не было. Хутчэй наадварот — адной бы пабыць, сёе-тое ўспомніць, перажыць яшчэ раз, перабраць у памяці. Як і заўсёды, калі на могілкі ішла...

І цяпер, узбіўшыся на сцежку, што па полі, месцамі яшчэ не араным, вілася, успомніла Еўка дачушку сваю, Надзейку.

«Далёка, далёка адсюль яна. Адна, на чужыне. Ніхто ніколі не наведае яе. Магілкі і то, мабыць, няма. Палілі ж людзей, гады. Жывых. А мёртвых і пагатоў. Трэба ж, каб не ўберагла я яе, дачушку сваю адзіную, маленькую...»

Ад Надзейкі думкі да маці перакінуліся — дзе, дзе яна? Як пагналі яе, Еўку, немцы тады з Валок, так пра маці нічога і не ведае. Сабалі — вёску, дзе жыла маці з айчымавымі дзецьмі,— немцы таксама ж спалілі. І людзей, гэтак жа, як і з Валок, пагналі на чужыну — у Нямеччыну. Усіх. І маці з імі. А дзе там яна падзелася — ніхто нічога пэўнага сказаць не можа, бо і не ведае. Маглі забіць ці ў лагеры голадам замарыць, у печах спаліць. Маглі ў бамбёжку загінуць. А можа, яшчэ далей на чужыну хто звёз — у Амерыку ці ў іншую якую краіну...

«Трэба было з'ехацца нам, жыць разам, адною сям'ёю... Ці ў Сабалях,ці ў Валоках... А так... Састарылася я ўжо, на той свет самой пара, а пра маці так нічога і не ведаю... Ды і пра дзяцей айчымавых... Што з імі, дзе яны? Няўжо ўсе да аднаго загінулі, што ніхто не абзываецца, не абазваўся нават? Як у ваду канулі. Жылі, былі — і няма...»

Не асуджала яна, Еўка, маці, што тая другі раз замуж пайшла. За ўдаўца, на чацвёра дзяцей. Хаця іншы раз і здавалася — паспяшалася маці. Магла і за лепшага выйсці, не трэба было за першага, хто пасватаўся, і бегчы, пачакаць трэба было.

«Хаця хто яго ведае, як там і што... Чужую бяду, кажуць, пальцам развяду. А сваю... Паспрабуй сваю развесці, саўладаць, справіцца з ёю! Дый хіба ж ведаеш, што каго дзе чакае?.. І маці ж, пэўна, не ведала, што новага мужа так хутка ў яе не стане, заб'юць яго паліцаі. А той, раейшы, бацька Еўкі...»

Добры ён быў чалавек, ласкавы, вясёлы. Каб характар трохі яму іншы, каб бацькі свайго менш слухаўся, сябе бярог. А то... і не пажыў, лічы. Падарваўся, і... яна, Еўка, сіратой расла, ды і маці таксама аўдавела. Не так, не так жыццё склалася, як магло скласціся...

«Вось на чыю магілу з'ездзіць варта было — на бацькаву. Ды я так і не пабыла там. Перабраліся ў Сабалі... Замуж выйшла... Вайна... А пасля вайны ўжо... Не да таго было мне, каб на бацькаву магілку ездзіць. Сваіх магіл вунь колькі... Надзейка... Мікітка... А там, вельмі ж хутка, і Адам...»

...Не такі, як быў раней, да вайны, вярнуўся Адам з фронту. Задумлівы, скрытны зрабіўся. І душу сваю нават ёй, жонцы, не раскрываў — насіў нейкі цяжар у сабе. А каб сказаць — не казаў. І нікому, нікому ні ў чым вельмі не прызнаваўся. Часцей за ўсё маўчаў. Ды сумна ківаў сам сабе галавою, нейкім патаемным думкам сваім. Не, ён не шкадаваў, што на гармату тую танк павёў. Але нешта было ў тым баі, што не задаволіла яго, крыўду на кагосьці быццам затаіў — той, на каго ён спадзяваўся, павінен быў зрабіць не так, як зрабіў. А ў выніку — сябры загінулі, ды і сам ён, Адам, паранены астаўся, скалечаны на ўсё жыццё...

«Ды няхай, не вернеш таго,— шаптаў іншы раз Адам.— Як зрабілася, так зрабілася — не пераробіш...»

І ў новым, мірным жыцці надта ж хацеў зачапіцца, месца сабе знайсці. Але так і не зачапіўся, не знайшоў. Араць і сеяць не мог, не мог сякеры, рыдлёўкі ў руках трымаць, не мог і іншае хоць што-небудзь рабіць. Каб граматы больш меў, то ў канцылярыі якой бы сядзеў. Але ж Адам быў амаль непісьменным, распісацца толькі ўмеў. І засумаваў вельмі ж хутка ён. Сядзіць-сядзіць на лавачцы ля хаты ці на прызбе ў двары — і галаву нізка ў скрусе апусціць. Падыдзе да яго яна, Еўка, спытае, што раптам ён так, а ён і скажа:

— Падзець сябе не ведаю дзе... Кеб работа якая...

Работы хапала. Але як, як ён, Адам, мог яе рабіць? Без нагі ды, лічы, і без рук...

І Адам пачаў выпіваць. Пенсію атрымае і не тое каб ёй, Еўцы, аддаць, а па вёсцы на мыліцах скача, гарэлкі шукае. І ўшчувала яго Еўка, і прасіла не піць, угаворвала ласкава, па-добраму, і сварылася, крычала, плакала. Быццам і пакаецца, паабяцае не піць больш. Асабліва назаўтра, калі на душы мутарна, галава баліць. І не стрымаецца — зноў, як пенсію прынясуць, ухопіць недзе чарку, а то і дзве...

Дзеці — двайняткі, Лёнік і Кузя,— нарадзіліся, то быццам палагаднеў, піць перастаў. Усё з імі, дзецьмі, важдаўся, ад калыскі ні на крок не адыходзіў. А потым, калі Мікітка з лесу не вярнуўся, нежывога прывязлі яго — зусім запіў, няйнакш гора хацеў гарэлкай заліць... І ўжо не апратаўся, не вярнуўся да таго, ранейшага жыцця. Грубіць быў ёй, Еўцы, пачаў, а то і сварыцца на яе, біць. Як прыйдзе, вернецца ў хату адкуль п'яны, а яна не вытрымае, паўшчувае яго, слова проці скажа, ён мыліцу і запусціць. А то і абзаве, слова непрыстойнае, брыдкае — «падсцілка нямецкая» — кіне, быццам камяк гразі, у твар.

Цярпела Еўка, усё цярпела. Ведала — нялёгка яму, Адаму. Думала, спадзявалася — часовае ў яго гэта, адумаецца чалавек, за галаву, розум возьмецца. Можа, так яно і было б, калі б адзін ён быў, сябрукі не знайшліся. Дык жа... Не адзін ён такі тады ў вёсцы паранены ды скалечаны быў. І як раніца, дзень надыходзіў — выпаўзалі са сваіх хат, ішлі адзін да аднаго, збіраліся там, дзе ніхто перашкодзіць не мог, пакалечаныя вайною — інваліды. А ўвечары, перад змяркканнем, разбрыдаліся, распаўзаліся хто як, па хатах сваіх ды дварах. А то і ў сельсавет ці да старшыні калгаса ішлі — лаялі на чым свет стаіць усіх і ўсё, што яны, маўляў, кроў пралівалі, а іх ніхто не глядзіць, пакінулі на волю лёсу. І так, здаралася, самі сябе разжалоблівалі, распякалі, што магло здацца, з усіх няшчасных — самыя няшчасныя яны.

А няшчасце ж не ў адных іх тады было. Няшчасце было ва ўсіх. У кожнай хаце, у кожнай сям'і. Ды і ў кожнага чалавека, хто жыць астаўся, у вайне той праклятай ацалеў, мірных дзён дачакаўся. І ў яе, Еўкі, няшчасце было. І Надзейку, дачушку маленькую, не зберагла, і Мікітку, з якім вайну перажыла, у зямельку закапала, і не ведала, дзе маці падзелася. Ды і на Адама, мужа, з болем глядзела, паверыць ніяк не магла, што гэта ён, той Адам, якога яна кахала, без якога проста жыць не магла, якога вайну ўсю чака-

ла, думала, жыць без яго не зможа. А ён, замест таго каб памагчы ёй гора разам перажыць, зусім абнялюдзеў, быццам чужы зрабіўся. Нават чуць, слухаць яе не заўсёды хацеў, асабліва калі яна ўшчуваць пачынала.

— Табе што? Ты здаровая, прыгожая. Сто гадоў пражывеш. А я, я...— і б'ецца галавою аб падлогу, плача. Вядома, п'яны...

Не магло, не магло ўсё гэта дабром скончыцца. Асабліва як пачаў Адам так напівацца, што дадому, у сваю хату, прыйсці сам не ў сілах быў. І вадзіла, ледзь не на сабе насіла яна, Ёўка, яго, і, калі снег нападаў, на саматужках прывозіла. Як скажуць, перададуць, што Адам п'яны, дадому дайсці не можа, у раўчуку ці на абочыне дарогі ляжыць, дык яна ўсё кідае, мужа спяшаецца ратаваць.

...Не ўратавала — застудзіўся ён. Ды так, што́ ні рабілі — і банькі ставілі, і парашкі, таблеткі давалі, нават былі ў бальніцу палажылі — папраўкі не было, не лепшала. Памёр Адам...

...Смерці, смерці... Чаму яны так апанавалі яе, Еўку, проста жыць не давалі?

Думала тады яна, пахаваўшы Адама,— ну ўсё, цяпер нікога хаваць не давядзецца ёй са сваіх, сама ўжо хіба памрэ. Дый усе ранейшыя смерці з вайною так ці інакш былі звязаны. І Надзейчына, і Мікіткава, ды і Адамава. А паколькі вайны няма, то і смярцей больш не будзе. Ва ўсякім выпадку ў яе хаце, у яе дома. Так яна, Еўка, хацела, так думала, нават верыла...

...Двайнятак сваіх — Лёніка і Кузю — яна глядзела, вачэй з іх не спускала. Усё дзеля іх рабіла, сябе ўсю ім аддавала. І яны раслі — прыгожыя, вясёлыя, здаровыя. У школу пайшлі, вучыліся добра. І ёй, маці,ва ўсім памагалі. І ў лес па ягады, па грыбы бегалі, і ў хаце, у гаспадарцы парадак трымалі, і ў гародзе, у полі ўсё чысценька рабілі. Працавітыя, акуратныя былі. І спагадлівыя. І яе, маці, любілі, у крыўду не давалі. Здавалася, пражыве яна з імі астатак свайго жыцця і гора ніякага ведаць не будзе.

Але... Адно думаеш, а зусім іншае здараецца...

Па сем класаў Лёнік і Кузя скончылі. І заманулася ім з вёскі паехаць — вучыцца.

І так і гэтак угаворвала Еўка сыноў нікуды з дому не ехаць, тут жыць.

— Не, мама, цяпер іншы час,— пераконвалі і адзін і другі маці.— Усе з вёскі едуць. Ды і што тут, у вёсцы, рабіць?

— Поле сеяць, хлеб расціць,— наіўна спрабавала стрымліваць сыноў маці.

— Гэта і непісьменныя людзі рабіць могуць. А мы ж вучыліся, па сем класаў скончылі! Хопіць і таго, што ты ўсё сваё жыццё з бацькам у калгасе працавала. І за што — за палачкі?

Што праўда, то праўда — плацілі ў калгасе слаба, запісвалі, ставілі ў працоўную кніжку ды і ў табелі хіба што працадні — «палачкі».

— Але ж не заўсёды так будзе. Вось разбагацеем...

— Гэта мы даўно чуем. І не ад адной цябе. Не век жа нам тут, у вёсцы, сядзець, калі свет усюды адкрыты. «Молодым везде у нас дорога...»

Доўга выбіралі сыны, куды ім паехаць, куды паступіць вучыцца. І выбралі вучылішча, дзе і кормяць, і адзежу даюць, бо ведалі: маці нічым, калі будуць вучыцца, не паможа. Праўда, вучылішча гэтае было далёка, нават не ў Беларусі, і вучылі там на шахтах працаваць. Як даведалася пра гэта Еўка, галасіць пачала. Але сыны супакоілі яе:

— Можна будзе і на іншую работу перайсці потым. Галоўнае — вывучыцца...

Дзіўна — што адзін скажа, тое другі паўторыць. Быццам і не двое іх, а адзін. Праўда, у Лёніка дабраты болей, не такі рэзкі, упарты ён. А Кузя што скажа, дык як адрэжа, нічым, нічым яго не пераканаеш, у свой бок не павернеш.

Сабрала Еўка грошай на білет на дарогу, пеўня закруціла ды ў печы ў чыгунку сасмажыла, хлеба два боханы спякла — і правяла сыноў, як некалі на вайну мужа, Адама, аж за вёску, да крыжа...

Вярнуўшыся ж з провадаў, упала на пасцель галавою ў падушку і ўсю ноч праплакала, прагаласіла.

...Лёнік і Кузя лісты часта ёй пісалі, расказвалі, як жывуць там, у вучылішчы, як вучацца. Разы два на канікулы дадому прыязджалі. Рослыя, дагледжаныя, у адзенні форменным. Проста заглядзенне, любата! Выходзіла — дарэмна яна, маці, хвалявалася, людзі з яе дзяцей будуць.

Але сэрца... Не, не было ў спакоі, быццам прадчувала нядобрае, што павінна вось-вось здарыцца. І яно... Здарылася... Спярша тэлеграма прыйшла, што Кузя загінуў... Потым, дзён праз колькі, яго ў вёску прывезлі, каб пахаваць. І Лёнік, разам з іншымі сваімі сябрамі, таксама прыехаў. Расказаў маці, што ў шахце няшчасны выпадак здарыўся і некалькі чалавек, у тым ліку і Кузя, загінулі...

...Лёнік больш не паехаў вучыцца, астаўся жыць у вёсцы, у маці. Але месца сабе нідзе не знаходзіў — ні ў хаце, ні ў полі, ні ў лесе. Быццам сам не свой быў. Усё хадзіў то сюды, то туды і пра нешта думаў. Неяк прызнаўся ёй, маці:

— Я ж ні дня без Кузі нідзе ніколі не быў. Прывык адчуваць яго заўсёды побач. Чуць яго голас, дыханне, бачыць каля сябе. Дзе я, там і ён, дзе ён — там і я... А цяпер... Быццам часткі мяне самога няма...

Усё лета мучыўся Лёнік дома, нічога не робячы, нават не беручыся рабіць. А як задажджыла, восень прыйшла,— не вытрымаў.

— Хіба з дому з'еду куды,— сказаў ён маці.

— Куды з'едзеш? — паглядзела на сына ўмольна праз слёзы яна, Еўка.

— Куды-небудзь. Бо тут... Можа, таму мне так цяжка, што Кузя на могілках, зусім побач...

Стрымаць, не пусціць з дому сына... Але як, як ты яго стрымаеш, не пусціш? Не прывяжаш жа... Дый падумалася было ёй, Еўцы, тады, можа, і праўда супакоіцца Лёнік, забудзецца на Кузю, калі з дому з'едзе, не будзе тут. Бо гэта ж таксама не жыццё, калі бачыш, як на тваіх вачах мучыцца, марнее чалавек, сын... А яму ж жыць, жыць трэба, радавацца, шчасця сабе шукаць.

...Паехаў Лёнік. Але падобна было, што і там, куды паехаў, спакою не займеў, шчасця не знаходзіў. І пра гэта яна меркавала па тых лістах, што прысылаў ён з розных гарадоў. Кім толькі і дзе Лёнік не працаваў, дзе не жыў! Пальцаў на руках і нагах не хапіла б, каб пералічыць гарады, адкуль лісты ад яго прыходзілі. Урэшце, у флот падаўся, па морах, акіянах розных плаваў. І дадому ні на дзень не прыязджаў. Пісаў толькі, што баіцца сюды ехаць, баіцца месцы тыя бачыць, дзе ён рос, дзе разам з братам Кузем сцежкі таптаў. Грошы ёй, маці, прысылаў, прасіў,

каб яна да яго як-небудзь прыехала. Але яна... Не магла, не магла паехаць да сына, бо... Эй! І асуджала сябе яна, Еўка, за гэта, і... Сама не ведала, што яна такое на старасць зрабіла, сораму людскога не пабаяўшыся,— яшчэ адно дзіцятка прыдбала, сынка Васілька. Ды ад каго... Ах, хай таго людзі не ведаюць. Ды яны і не ведаюць, можа, хіба толькі здагадваюцца. І сыну, Лёніку, не пісала яна, не паведамляла нават, што ў яго брацік знайшоўся, што паехаць нікуды не можа, бо дзіцятка, крывінка яе, трымае...

Так Лёнік ні пра што і не даведаўся... Мёртвага яго прывезлі сябры пахаваць там, дзе ён і хацеў,— на радзіме, на вясковых могілках, побач з братам сваім, Кузем, без якога ён усюды нудзіўся, проста жыць не мог. Сказалі сябры Лёнікавы, што ўтапіўся ён. Сам ці пры выпадку якім — яна, Еўка, нават не спытала. Ведала: не мог Лёнік адзін без Кузі жыць. І ўдзячна сябрам яго была, што не пакінулі Лёніка мёртвага далёка ад дому, споўнілі яго волю, дадому, у вёску, прывезлі пахаваць.

Могілкі ў Валоках на пагорку, у хвойніку. І па меры таго як набліжалася да іх Еўка, запавольвала, запавольвала хаду — спірала, аж гарэла ў грудзях, быццам паветра не хапала. І так заўсёды. Іншы раз нават спынялася, каб перадыхнуць, перш чым браму адчыніць, зайсці туды, дзе адпачывалі ад зямных турбот, спалі вечным сном усе тыя, хто жыў да яе і разам з ёю. І цяпер, падышоўшы да брамы — двух тоўстых, ачэсаных з чатырох бакоў дубовых шулаў,— таксама спынілася. Надта ж сэрца чамусьці забілася. Вось-вось, здавалася, разарвецца, а то і выскачыць з грудзей.

«Старая я,— падумала пра сябе Еўка.— Колькі дарогі той, а прайшлася, і бачыш... А мо гэта так ад чаго?»

«Ага, ага, апошні ж раз я сюды прыйшла. Развітацца»,— згадала раптам.

Павяла вачыма, аглядзелася навокал. Нідзе нікога. Толькі сосны, хвойкі стаяць, жаўцеюць камлямі, голлем зялёным хістаюць, памахваюць, быццам галовамі, вершалінамі, няйнакш ад ветру. І шумяць, гудуць. Нявесела, вусцішна, сумна. І птушачка нейкая скача ля агароджы, папісквае, з цікавасцю пазірае на яе, адзінокую жывую істоту, што раптам з'явілася, прыйшла аднекуль сюды. Успомніла — чула ад дзеда, маці яшчэ там, у Карчах.

Душа ў чалавека, калі ён памірае, у неба ляціць. Гэта ў тых, хто праведна жыў. А ў астатніх у іншыя жывыя істоты пераходзіць. Чыя ў сабаку, чыя ў ката, чыя ў карову, вала ці ў каня, у птушачку. А можа, і па чарзе... Спярша ў аднаго, потым у другога...

«Цікава, дзе Адамава душа? Ды і дзетак — Надзейкі, Мікіткі, Кузі, Лёніка? Ды і мая душа дзе будзе? Во каб з усімі імі разам, га? Хоць бы нагаварылася, налюбавалася...»

Адчула — не па сабе зрабілася. Успомніла — няверная яна жонка свайму мужу, Адаму. І сорамна ж будзе на вочы яму паказацца, ой як сорамна... Ды і дзецям... Вайну ўсю нікому ніколі нідзе нават не ўсміхнулася. І...

«Адна я жыла. Усё ж, што даў, пакінуў Адам... На той свет пайшло. Значыцца, семя яго... Не мне, не для майго жывата... Відаць, пракляў хтосьці... А мо... Адам ці я Бога прагнявілі... І ён... Радасці, шчасця нам не даваў... На тым свеце ўсё, што ад Адама пачатак брала... І сам ён там, разам з усім сваім...»

Як бы адпусціла Еўку, лёгка раптам на сэрцы стала. Можа, таму, што нарэшце дадумалася: Адам не пара ёй быў, не з ім трэба было звязваць свой лёс.

«Можа, каб з іншым я жыла, замуж не за Адама пайшла, то... І дзеткі мае жылі б так, як Васілёк вунь у горадзе жыве, ды і сам муж жыў бы... І ў вайну... Ды і пасля вайны... Не нацярпелася б я, не ведала б усяго таго, што перажыла...»

«Але ж я кахала Адама. Ды і ён мяне таксама. Жылі душа ў душу, пакуль вайна гэтая, калатэча не ўсчалася...»

«Яно-то так... І ўсё ж, усё ж... Не, не, невыпадкова, невыпадкова, мабыць, усё гэта, што дзетак, прыжытых з Адамам, я ўсіх да аднаго пахавала...»

«Пракляў нас хтосьці...»

«Але за што? Што мы каму, зло якое зрабілі?»

Ціха, вусцішна было на могілках. І думкі неяк самі сабой віліся ў галаве, плылі, плылі...

«Не, нешта я не тое, не тое думаю. Я ж ніякай радасці, шчасця не ведала, пакуль Адама не сустрэла. І жыла з ім... Лепей і не трэба, не хацелася...»

«А з іншым, можа б, яшчэ і лепей жылося. Адкуль ты ведаеш? Ты ж да Адама ды і пасля яго, лічы, нікога з мужчын не ведала...»

«Не, не, не трэба грашыць Богу. Адам быў чалавек,

лепшага за яго няма і не было. А што дзеці ад яго памерлі, не жывуць... То ён, Адам, не вінаваты...»

«А хто ж вінаваты? Ты?»

«І я, відаць, не вінавата. І ніхто, ніхто не вінаваты. Так склалася. І мне... Не суджана, мабыць, разам з імі, з сынамі маімі, якіх я ў сваім жываце вынасіла, сваімі грудзямі выкарміла, ляжаць побач... У горад паеду, і там... Адна буду ляжаць недзе на могілках сярод чужых... Як і Надзейка мая... Як і маці... Так, мабыць, наканавана нам... І нічога не пераробіш... Як бы ні імкнулася я, як бы ні хацела... І асуджаць, папракаць, шкадаваць, што не гэтак, а так жыццё пражылося... Таксама, мусіць, не варта... Дзякаваць трэба за тое, што было...»

«А што, што было?»

«Што было, тое было. Не пераробіш, назад не вернеш. Гэта праўду гаварылі мужчыны. Тады, як печ ляпіць скончылі... Здаецца, Адам гэта сказаў. А можа, і Кецка...»

Успомніла — і Кецка даўно ўжо на могілкі перабраўся. Хоць і не паранены быў, здаровы з вайны вярнуўся.

«З-за дзетак, жонкі вельмі нудзіўся... І не жаніўся — так адзін і жыў. У кожнага, мабыць, свая доля, сваё жыццё. Кецка так пражыў, Адам гэтак, а я... Небагата мне асталося... Дажыву свае дні. Не тут, дык у горадзе, у сына...»

Працягнула руку да брамкі — непафарбаванай, збітай з новых, яшчэ не пачарнелых дошак — адчыніла яе. Пайшла, апіраючыся на кіёк і ўздыхаючы, да магіл...

Так, мабыць, ужо спрадвеку, з незапомных часоў, павялося: па-рознаму, кожны па-свойму, адносяцца людзі да мёртвых, да тых мясцін, дзе яны пахаваны. Адны часта ходзяць на магілы, даглядаюць іх, ставяць помнікі дарагія, крыжы. Ды і агароджваюць платамі — з дошак, штыкету, а то і з жалеза. Другія ж, пахаваўшы нябожчыка, так ніколі і не адведваюць яго, на могілкі не заглядваюць. Нават, здараецца, баяцца могілак, у той бок, дзе яны, галавы не паварочваюць. Яна, Еўка, не тое што любіла могілкі, але і не цуралася іх. Як толькі міма куды-небудзь ідзе, так і збочыць з дарогі, брамку адчыніць, зойдзе, ля магілак дзетак сваіх, мужа, Адама, пастаіць. І паплача, успомніць многае, ім — мужу, Адаму, і дзеткам, і паскардзіцца, і раскажа, што ў яе на душы. І быццам лягчэй стане, пасвятлее. І на Радаўніцу на могілкі заўсёды хадзіла. Ды і на іншыя святы. А то і ў буднія дні, асабліва калі пастарэла, на працу ў калгас не рвалася. І магілкі ўсіх

дзетак ды і Адамава дагледжаны былі. Праўда, не так, як у некаторых. Не было на магілках ні дарагіх помнікаў, ні пафарбаванай, зробленай з жалеза агароджы, ні яшчэ чаго-небудзь незвычайнага — прывезеных з горада вянкоў, кветак, што стаяць улетку і ўзімку і не вянуць, не лiняюць. Але магілы былі дагледжаны — з крыжамі, з падвязанымі да іх ручнікамі свежымі, з кветкамі, што так разрасталіся ўлетку, што аж гарбячкоў зямлі не відаць было. Як снег раставаў, так і кіравалася на могілкі Еўка, кветкі на магілах сеяла, садзіла. І цяпер, падышоўшы да магіл — яны ўсе разам былі, непадалёку ад увахода, як бы ў зацішку, пад старою, карыстаю сасною,— першае, пра што была падумала, гэта:

«Хто ж іх, гэтыя магілы, дагледзіць, кветкі пасее ці пасадзіць, калі мяне тут, у вёсцы, не будзе — паеду ці памру я? Ды і на маёй магіле... Хто што пасадзіць, хто яе дагледзіць?»

«Але ж тут, у вёсцы, можа, і жыць ніхто не будзе, выселяць людзей, як з іншых вёсак вунь павысялялі»,— успомніла раптам Еўка.

«Дык гэта ж не навечна. Вернуцца людзі. А я... Калі і вярнуся, дык ненадоўга. Бо старая... І як бы ні шчыравала, будзе, будзе тое, што сюды, на могілкі, не прыйдзе ніхто, не дагледзіць магілкі... Як і на маю магілу дзесьці там, у горадзе... Ды нават калі б я пахавана была і тут...»

«Сын жа, Васілёк, ёсцека...»

«Ён далёка... Ды і з'ехаў жа адсюль... Байстручком яго ўсе называлі... І ён мучыўся... Перажываў...»

Успомніла Еўка, як зацяжарала нечакана для сябе яна... Ноч тая летняя надта ж душная была, ані не спалася. І той чалавек, што папрасіўся ў хату пераначаваць — у камандзіроўку ў вёску прыязджаў — і якому паслала яна на ложку ў другой, чыстай палавіне хаты — таксама не спаў. То курыў, то хадзіў сюды-туды, паскрыпваючы маснічынамі. А яна ж, Еўка, адвыкла была ўжо, каб нехта ў хаце ўночы быў. Таму, мусіць, і не спала, заснуць ніяк не магла.

У прыезджага — камандзіровачнага нейкія няйнакш свае клопаты былі, спаць не давалі. Мабыць, за поўнач гэта цягнулася. Потым, відаць, пачуўшы, што гаспадыня таксама не спіць, ён выйшаў да яе, загаварыў. Аказалася, з жонкай нелады ў яго, жыццё не склейвалася. Яна, Еўка, пра сябе расказала, аж заплакала, разжалобіўшыся. Ён, той камандзіровачны, пачаў суцяшаць яе, потым нават гладзіць сваёю рукою яе рукі, плечы...

Уранні чалавек той паехаў і больш у вёску не прыязджаў. А яна, Еўка, зацяжарала. Божа, што яна перажыла тады! На вуліцу, на людзі баялася, саромелася выходзіць. Пра што толькі не думала. Трэба ж каб на старасць такое... І разам з тым... Нібы і супакаенне, радасць прыходзілі — ці не Бог гэта мне за мукі мае дзіцятка паслаў... Каб не адна я век дажывала, галаву было да каго прыхінуць...

Усё ж не рашылася жывое ў сабе забіваць, нарадзіла сынка, Васілька...

Але ад сораму, няёмкасці так і не пазбылася. На могілкі і то, мабыць, гадоў з пяць не хадзіла, з Адамам, хоць і мёртвы ён быў, сустракацца не ведала як: асудзіў бы ён яе, нявернасць убачыўшы. Ды і потым, калі прыходзіла,— і адна, ды і з Васільком, кожны раз у зямлю вочы патуплівала, даравання прасіла, каб не караў яе муж, Адам, жорстка. «Ты ж бачыш, ведаеш, як тое ўсё адбылося... І то не здрада табе, не...» — плакала, шаптала яна.

І цяпер дайшоўшы да магіл — той, што была трохі як бы збоку, бліжэй да ўвахода, пад крыжам дубовым,— Адамавай і трохі меншымі, таксама з крыжамі дубовымі, на якіх матляліся свежыя яшчэ не пачарнелыя ручнікі,— Еўка спынілася, як бы засаромелася, зашаптала:

— Зноў я прыйшла да вас, дзеткі... І да цябе, Адам... Бачыце, як усё складваецца... Ехаць адсюль мне трэба... І, можа быць, навечна, назусім... Не хачу я гэтага... Аднак... Самі ведаеце, што ў нас... Аварыя гэтая ў Чарнобылі... Васілёк піша, каб не была я тут, да яго ехала... А я... Да вас душою прыкіпела, да поля, гарода свайго, хаты, усяго-ўсяго, з чым і з кім век пражыла... Ведаю, цяжка мне будзе без усяго свайго там, у сына. А найбольш, найцяжэй без вас... Не прыйдзеш жа, калі захочацца, душу сваю не адвядзеш, думкі не развееш, не раскажаш усяго вам, не паспавядаешся. Так, ад мяне і вы ведалі ўсё, што ў вёсцы робіцца, ды і што ў мяне на душы... А цяпер... Можа, больш і не пабачымся. Старая я ўжо зусім... Калі паеду, то ці вярнуся ўжо сюды... Даруйце мне. Асабліва ў цябе, Адам, даравання прашу... Вінавата я перад табою... Як ні перад кім іншым... Даруй, даруй мне, неразумнай галаве маёй...

На калені ўпала Еўка, нібыта ў царкве перад абразамі, рукі склала:

— Не хацела я нікому болю прычыняць, а тым больш табе, Адамка, і бачыш, прычыніла... А цяпер... Не было б Васілька, то і ехаць нікуды не трэба было б, тут бы,

у вёсцы, я асталася... І калі б памерла, то з вамі б побач ляжала, на могілках адных... А так...

Заплакала Еўка, загаласіла. Не, не ўголас, як звычайна галосяць жанчыны, а ціха, прыглушана, але глыбока, шчыра, так, што аж цяжка ёй зрабілася, грудзі схлупіла.

— Дзеткі мае... Я ж нікога так не любіла, як вас... Нагледзецца, наслухацца не магла ніколі... І вы... Так рана ад мяне пайшлі, адну мяне жыць пакінулі... А я ж... Толькі вамі і жыла... Ды яшчэ табою, Адам... Ніхто ж мне радасці больш не даў, як вы... Не думала я, што смерць нас так хутка разлучыць... Рукі неаднойчы налажыць на сябе хацела... Як так жыць, то лепш не жыць... І бачыце, жыву... Сама ж на той свет не пойдзеш, у магілу не ляжаш. Жыць трэба так, як жывецца. Усё выцерпець, што Бог пашле... І я цярплю... Сорам выцерпела, калі зацяжарала, Васілька нарадзіла... А што яшчэ выцерплю?.. Васілёк, вы ведаеце, добры... Але... Ён не вы... З вёскі ўцёк, каб са мною не быць, каб не кпілі з яго, не сарамацілі... І я гэта ведаю, адчуваю... Таму і не ехала жыць да яго ў горад, хоць ён і прасіў... Ён мой, але... Не вы, не вы... Дый жоначка ў яго, Люся... Не, не, каб не гора гэта, не аварыя, не паехала б я адсюль у горад... З вамі б была. Заўсёды, да самай смерці сваёй... Ды і пасля смерці... На могілках, побач з вамі, ляжала б... А так... Адзін Бог ведае, што мяне чакае. Жыла, жыла і, бачыце, да чаго дажылася. І ніхто не пашкадуе. Няма каму. Хіба Васілёк. Але... Хоць ён і свой, і разам з тым... Чужы... Не ад таго я нарадзіла яго, ад каго хацела. І таму... Як бы і родны ён і няродны. Вы ўсе, ва ўсякім разе, радней. Вам усё, усё чысценька я магу расказаць, ва ўсім прызнацца, хоць вы і мёртвыя. А яму... Не... Хоць ён і жывы...

Доўга яшчэ стаяла на каленях Еўка, доўга гаварыла, ва ўсім, ва ўсім шчыра прызнавалася, прасіла падказаць, параіць, што ёй і як рабіць — пакідаць дамоўку, ехаць да сына ў горад ці ўсё ж не ехаць нікуды, аставацца тут, у вёсцы.

— Дзетачкі мае родныя... Адамка...— шаптала яна.— Вам там, на тым свеце, мусібыць, нялёгка, не пажыўшы, не парадаваўшыся, але і мне на гэтым, вас пахаваўшы і адной астаўшыся, таксама нялёгка. Ды гэта ж хоць і мёртвыя, а былі вы ў мяне побач, было да каго хадзіць, каму скардзіцца, расказваць, што на душы... А там, у горадзе, калі адна буду... Э-э, эх!..

Паднялася на ногі, пайшла, не падымаючы вачэй, ні на што не гледзячы, з могілак...

У той дзень Еўку можна было бачыць на полі, дзе яна развітвалася з зямлёю, якая яе і карміла і паіла, на гародзе, які яна і капала і ўгнойвала, рабіла грады, усё сеяла, садзіла, палола, акопвала, і ля свайго хлява, платоў, ля калодзежа і шмат яшчэ дзе. І ўсюды яна падоўгу стаяла, шаптала сама сабе — з усім развітвалася, прасіла даравадь, што пакідае, едзе ў горад. Доўга сядзела яна і ў сваёй хаце, на лаве, ля стала, на пасцелі і асабліва — ля куфра — каторы раз перабірала ўсе свае рэчы, што адкладвала ўбок, а што звязвала ў вузялкі, каб забраць з сабою, павезці ў горад. І ўсё яе жыццё праходзіла перад вачыма, успаміналася нават тое, што было даўным-даўно, ніколі дагэтуль не згадвалася і, здавалася, забылася...

Аж не — выявілася — помнілася...

...Як яна, зусім яшчэ маленькая, падрала, лезучы на плот, сукенку і плакала, баялася ісці дадому, паказвацца на вочы маці — думала: тая адлупцуе, паб'е...

...Як сцябаў, біў пугаю аднойчы дзед — яе дома пакінулі, каб пільнавала куранят, а коршак, заляцеўшы ў двор, пахапаў, пазносіў аж штук, мусіць, пяць з двара. І ёй надта ж балелі пасечаныя пугай ногі і крыўдна было, бо яна з двара нікуды не выходзіла, куранят пільнавала. А коршак? Што яна магла зрабіць коршаку, калі ён у двор заляцеў? Ён і на яе, Еўку, накінуўся, ледзь кіпцюрамі ў галаву не ўчапіўся...

...Як падлеткам, жывучы ў Сабалях, па грыбы раненька ў лес ішла, а дарогу воўк перабег. Худы, перахлябісты і мокры-мокры — відаць, ад расы. І яна, стаіўшыся, стаяла за камлём дрэва, баялася дыхнуць, чым-небудзь выдаць сябе. І толькі калі воўк схаваўся ў гушчары, пайшла далей у лес. Але і там, пакуль хадзіла, усё азіралася, аглядвалася — ці не бяжыць, не крадзецца ўслед за ёю воўк. З лесу ў той дзень рана яна дадому вярнулся і грыбоў амаль не набрала...

...Як, пазнаёміўшыся з Адамам, бегала да яго па начах, драмала разам з ім на гуньцы і неяк прахапілася, вочы расплюшчыла і спалохалася — дзень займаўся. А яна... Не дома, не на сенавале, і маці, новы бацька могуць пра ўсё здагадацца. І, каб абхітрыць іх, у мох пайшла, бабоўніку цэлую вязанку нарвала. І калі дадому, у двор прыйшла,

нямала здзівіліся ўсе, што яна, Еўка, так рана ўстала і па бабоўнік схадзіла...

...Як хацела спадабацца Адамавай маці, калі Адам забраў яе замуж, прывёз да сябе ў хату, і ўсё прыглядалася да ўсяго, што тая рабіла — ці так яна ўсё робіць, як вучылі яе, Еўку, як у іх дома рабілі. І калі спаць клалася ў пасцель да Адама, то імкнулася, каб пазней за ўсіх легчы і раней за ўсіх — першай — падняцца, даёнку ўзяць, карову збегаць падаіць — хай бачыць, ведае Адамава маці, што не гультайку Адам у дом узяў, а стараннную руплівую дзяўчыну. Адамава маці нояк не стрывала, сказала:

— Ты б, донька, не спяшалася так рана ўставаць, паспала б лішнюю гадзінку. А з каровай я і адна ўпраўлюся, як раней упраўлялася... Бо калі ж і паспаць, як не цяпер... Глядзіш, дзеткі народзяцца, то яны ой спаць не дадуць...

...Дзеткі якраз спаць давалі. Адна Надзейка хіба хварэла. Дый то, калі ў Нямеччыну гналі, у лагеры трымалі, пакуль не памёрла. А астатнія... І спалі добра, і елі, і гулялі. Так што толькі і клопату было, што накарміць, адзенне пашыць, памыць ды пасцелі заслаць. А ўсё астатняе самі рабілі. Спаць дзеці не сталі даваць, калі мерці, гінуць адно за адным пачалі, калі хата апусцела, адна Еўка асталася. І ночы адразу ж падаўжэлі — цэлай вечнасцю кожная ноч пачала здавацца. То і сну было, што, стаміўшыся, звечара на хвіліну вочы замгнеш. А потым прачнешся і да самага світання праляжыш, вочы колам у столь уставіўшы. Чаго толькі не рабіла яна, Еўка, каб заснуць. І па хаце сюд-туд снавала, тупала, і на вуліцу, на двор выходзіла... Галава, здаецца, аж пухла ад думак. А ўранні — не падняцца, усё цела цяжэла, ногі, рукі быццам свінцом наліваліся. І рабіць... Нічога ані не хацелася... Мо таму і жывое ў сабе забіць не рашылася, Васілька нарадзіла...

«Але і Васілёк радасці не прынёс... Я саромелася, што нарадзіла яго, усё вінавацілася... І перад людзьмі, і перад Адамам, хоць ён і мёртвы... Ды і Васілёк... Усё, бедненькі, пытаў, хто бацька яго, дзе ён... Асабліва як малы быў... Калі ж падрос і даведаўся, што той, чыё прозвішча ён носіць, памёр да нараджэння яго самога, зусім звяў... Людзі, мабыць, пра сёе-тое яму сказалі... Сем класаў закончыў — і з вёскі паехаў. І не часта наведваўся пасля таго, ды і наведваецца. Вучыўся, працаваў, цяпер жаніўся. Дай

Бог і дзеткі пойдуць. Няхай жыве. Але яна, Еўка, душою, думкамі не з ім, Васільком, хоць ён і жывы, апошненькі яе, а з імі, усімі тымі, хто памёр, хто на могілках... Там, там яе ўся сям'я... І ёй бы даўно там, з імі быць... Ды, бачыш, нехта трымае, не пускае на той свет. Нават адарваць хоча ад сям'і, вывезці адсюль. Не толькі каб жывая разам з усімі сваімі не была, але і мёртвая. І яна... Паддалася на гэта... Збіраецца вось, каб не быць тут, ехаць...»

«Куды, чаго ехаць?»

«Як куды, чаго ехаць? У горад да сына, каб там жыць. Бо тут... Кажуць, захварэць цяжка можна...»

«Ну дык і што? Не вечна ж жыць?»

«А хто паможа, хто дагледзіць, як захварэю? Ды надоўга — не адразу памру?»

Пакінула перабіраць у куфры, выпрасталася, па хаце прайшлася, паглядзела на вокны, завешаныя нібы павуцінай — цюлем, на печ, пасцель сваю, засланую коўдраю, яшчэ самою калісьці тканаю...

І так шкада ўсяго таго, з чым звыклася, без чаго не ўяўляла свайго жыцця, ёй стала, што грудзі схлупіла — не прадыхнуць.

«Каб заплакаць хіба, можа б, палягчэла»,— падумала.

Але слёз не было.

Выплакала яна, мабыць, усе свае слёзы за жыццё...

Сашчапіўшы рукі ў кулачкі і прыцiснуўшы іх да грудзей, Еўка прысела на лаву, паклала галаву на стол.

«Не паеду я адсюль... Нікуды не паеду... Што будзе, тое будзе... А я... Тут, дома, дзе ўсе мае, усё маё, астануся...»— падумала, прашаптала яна.

Там, на лаве, з апушчанай на стол галавою і прыцiснутымі да грудзей ручкамі-кулачкамі, і знайшлі Еўку людзі. Спярша думалі: яна задрамала, спіць. Аж не — памерла. Нават ахалодала, задзеравянела ўжо ўся...

*1986 г.*

# Родны кут

## Сон у руку

### 1

Ён заехаў да яе на кватэру па дарозе дадому пасля нейкага чарговага пасяджэння, якое, надзіва, скончылася раней, чым меркавалася. Іра — і гэта адчувалася, відаць было — яго чакала, бо, як толькі пазваніў, адразу ж адчыніла дзверы і кінулася на шыю, абняла, абвіла рукамі — вусны іх у той жа момант зліліся ў гарачым, доўгім і страсным пацалунку.

— Я думала, ты не заедзеш,— прашаптала нарэшце яна, і з вачэй у яе пырснулі слёзы.

— Што ты? Я ж сказаў...

— Пасяджэнне магло зацягнуцца. Ды і... Ці мала што...

— З таго часу, як пазнаёміўся я з табою, у мяне... Ты, адна ты...

— Толькі кажаш так. А калі напраўду...

Ён больш не слухаў, што яна гаварыла. Зняў з плячэй плашч, разуў туфлі і папраставаў па вузкім калідорчыку далей — кватэра ў Іры была невялікая, аднапакаёвая, але з густам абстаўленая, чыста прыбраная. Згледзеў, што шырокая, з бакавымі падушкамі тахта разабрана, на ёй паслана пасцель; падсунуты бліжэй да тахты, пад самы таршэр, і невялікі нізкі столік — на ім стаялі неадкаркаваная бутэлька яго любімага марачнага малдаўскага каньяку, дзве высокія, на тонкіх ножках чарачкі, ляжала на сподачках нарыхтаваная закуска — хлеб, сыр, масла, памідоры, агуркі, тонка парэзаная скрылікамі вяндліна, каўбаса... Сама Іра была ў лёгкім шаўковым халаціку, які надта ж зваблівa аблягаў яе маладое, пругкае цела. І як бы нечым узрушаная, усхваляваная.

— Любы, дарагі мой,— летуценна шаптала яна, нібыта ўсё яшчэ не верачы, што бачыць яго, Андрэя, у сябе на кватэры.— Як я рада, што ты зноў са мною, у мяне...

І не адыходзіла ад яго ні на крок, ласкава, пяшчотна гарнулася, тулілася ўсім сваім целам, шчыра, аддана глядзела ў вочы, шукала поўнымі, сакаўнымі вуснамі яго вуснаў.

Ён не вытрымаў, абняў яе, яшчэ цясней прытуліў да

сябе. І яна раптам быццам абмякла, звяла. Упасці на падлогу ён ёй не даў — падхапіў на рукі, панёс на тахту...

...Апомніўся, спахапіўся толькі тады, калі ўбачыў жонку, Алу — яна стаяла ў дзвярах пры ўваходзе ў кватэру, здзіўлена, спалохана глядзела на яго, свайго мужа, які ляжаў голы ў чужым ложку з чужою, такою ж, як сам, голай жанчынай, і ад неспадзяванасці аж рот разявіла, слова не магла вымавіць.

— Андрэй? — нарэшце вырвалася ў яе з грудзей, і яна, успляснуўшы рукамі, няйнакш трацячы прытомнасць, павалілася, асунулася на падлогу.

Ён, як быў, голы, выскачыў з пасцелі, кінуўся да жонкі. І... з жахам расплюшчыў вочы, прачнуўся.

«Ы-ым! — пакруціў галавою, чуючы, як тахкае, б'ецца ў грудзях сэрца.— Трэба ж такому прысніцца!»

Выцер пот, што раптам густа выступіў на лобе, павярнуўся, яшчэ і яшчэ пераконваючыся, што ляжыць не ў чужой пасцелі, а дома, на канапе. І адзін — без Іры, Алы.

«Што значыць гэты сон?»

Успомніў, недзе ці то чытаў, ці то чуў — бачыць голую жанчыну ў сне — непрыемнасць.

«А сябе?»

«Сябе таксама ж, пэўна, не на радасць».

І хоць ніколі не верыў у сны, ды і ў іншыя прымхі і забабоны, падумаў чамусьці:

«Няйнакш нехта мяне раздзене нагала. Не ў прамым, вядома, сэнсе, а ў пераносным...»

Не засыналася, не спалася больш — апанавалі думкі. Цэлы рой, быццам пчолы, калі іх хто-небудзь патрывожыць. Разумеў, адчуваў Андрэй: так, як жыў, далей жыць нельга, ды і не зможа ён. І справа не толькі ў тым, пра што раптам усе і ўсюды дружна, быццам па камандзе, загаварылі. Справа ў іншым — перабудовы, абнаўлення патрабаваў ён сам, патрабавала яго душа. І даўно. Але ён... Жылі многія так, і ён жыў. Звыклае, будзённае брала верх, і плыў разам з плынню — куды яна, туды і ён. А трэба было схамянуцца, апомніцца. І не чакаць, калі нехта скажа, а самому пачаць перабудову, з сябе, жыць інакш, як жыў, не ківаць, не паказваць пальцам, як некаторыя, на тых, хто вышэй па службе і пасадзе,— ты, маўляў, ты прыклад пакажы. Святых, вядома, нідзе няма. Але... Калі ў самога рыльца ў пушку...

Не, не ўсё, далёка не ўсё падабалася Андрэю пакуль што ў гэтым, увогуле правільным, своечасовым і вельмі

ж патрэбным працэсе перабудовы, абнаўлення і галоснасці, што пачаўся так шырока і глыбока. Было тое, што выклікала нязгоду, а то і пратэст. Надта ж высока паднялі галовы рознага роду дэмагогі, крыкуны, кар'ерысты, тыя, хто лічыў сябе абдзеленым, абыдзенным увагай. Не сядзелі ціха, актыўнічалі, і хто баяўся страціць пасаду, хацеў любымі праўдамі і няпраўдамі ўтрымацца на аднойчы заваяваным, а сёй-той падняцца і вышэй. І хоць не зусім разумелі сутнасць таго, што адбывалася, аднак мітусіліся, крычалі грамчэй за іншых. Каб жа была бачнасць, што яны зрабілі вывады, не асталіся ўбаку, ліхаманкава, спешна перастаўлялі з месца на месца, з пасады на пасаду, а то і скарачалі, выпраўлялі на пенсію падначаленых. І гэта трывожыла — баяўся Андрэй, каб пад гарачую руку не было выкінута лепшае, заменена на горшае. І тады... Перабудова, абнаўленне ды і галоснасць, дэмакратызацыя не дадуць жаданых вынікаў. А яны ж патрэбны. Як, як патрэбны! Знікла ж ці зацямнілася тое вялікае і светлае, што аб'ядноўвала, згуртоўвала людзей, вяло наперад, прымушала думаць не пра сябе, а пра ўсіх. Адсюль і застой, п'янства, хцівасць, жаданне кожнага жыць лепш, як жывуць астатнія, урваць найбольшы і найсмачнейшы кус менавіта сабе. А не гаварыць нідзе і нікому праўды? А цэлыя кланы, сямейнасць у начальстве, навуцы? А пратэкцыянізм, кампанейшчына, рознага роду зямляцтвы?..

«Не, так далей быць не можа,— думаў, лежачы ў пасцелі і не могучы заснуць, Андрэй.— Гэта ж... Ліха ведае што. Назначаць ці выберуць каго на пасаду — і прасядзіць увесь свой век. Акружыць сябе падхалімамі, бюракратамі, хапугамі. Ніхто праз іх не пралезе. Народ — гэта адно, а кіраўнікі — быццам зусім іншае. Кіраўнікам усё дазволена, усё можна. Ніякай справаздачнасці. Ды якой справаздачнасці — адказнасці няма. Адзіная магчымасць нешта падказаць ці дабіцца рэагавання — гэта ананімка. Але ж ананімкі выхоўваюць не барацьбітоў, а тхароў, смярдзючых клапоў. Ды і не заўсёды ў ананімках праўду пішуць. Часцей за ўсё сумленнага чалавека абылгуць, збіваюць з ног. Бо сумленны чалавек — перашкода несумленным. І яны... Гатовы з ім расправіцца, знішчыць, каб не замінаў рабіць брудную справу. А правяральшчыкі ананімак таксама ж... Іншы раз ідуць не да сумленных людзей, а якраз да тых, хто і пісаў гэтую ананімку. Ды і ўказанні ж пэўныя атрымліваюць — каго абараніць, а каго... Нават калі невінаваты, фактаў адмоўных няма, знайсці і ўтапіць. Ды

і калі ананімкі няма — арганізуюць яе... А вылучэнне на пасады... Не дзелавыя якасці бяруцца ў разлік, а іншае, часам зусім пабочнае... Вось і мяне былі ў свой час вылучылі...»

«А чаму, чаму не каго-небудзь, а менавіта мяне вылучылі? — ухапіўся, быццам тапелец за саломінку, за гэтую думку раптам Андрэй.— Сказаць, каб я... Быў, вядома, у чымсьці лепшы, у чымсьці горшы. Як і кожны, як і ўсе. Ды не на гэта глядзелі. Я быў зяць Арцёма Гаўрылавіча... А Арцём Гаўрылавіч... Шышка! Ого, дай Бог, як кажуць, кожнаму. Без яго ні адна важная падзея ў горадзе не праходзіла. У прэзідыумах сядзеў, лысінаю свяціў. Многія ведалі, хто такі Арцём Гаўрылавіч. І нейкі падхалім няйнакш прыемнае хацеў зрабіць Арцёму Гаўрылавічу, выслужыцца. Вось і надумаў падняць, вылучыць мяне... А можа... І сам Арцём Гаўрылавіч падказаў... Ці жонка яго, Эльвіра Барысаўна. О, яна ўмела і ўмее гэта рабіць... Як жа — калі зяць на пасадзе — і дачцэ гонар, ды і жыць лягчэй. Зарплата большая, машына... Ды і да зарплаты, машыны яшчэ сёе-тое...»

А ён жа, Андрэй, калі жаніўся, не думаў ні пра якія выгоды — проста падабалася яму Аліна, тады Алачка, Ала, і ўсё. Незвычайнасцю сваёй падабалася, бо была яна лёгкая, проста паветраная, не хадзіла, а быццам лятала і надта ж весела, бесклапотна смяялася, рагатала. Ён жа, нехлямяжы, сарамлівы, у нядаўнім вясковы хлопец, быў як заварожаны — вачэй не зводзіў з Аліны, любаваўся ёю. Іншыя хлопцы таксама паглядвалі на Алачку, але каб захапіцца сур'ёзна... Не асмельваліся, пабойваліся. Сёй-той жа не хацеў, каб яго за кар'ерыста лічылі. А ён, Андрэй, нічога і нікога не пабаяўся. Маўляў, гаварыце што хочаце, а я... Не ўпушчу, хто мне падабаецца. Алачка, як неўзабаве даведаўся Андрэй, мучылася ад адзіноты. І Андрэю радая была, ужо з другой ці трэцяй сустрэчы душу сваю раскрыла, амаль паспавядалася. І яе шчырасць уразіла, упала, што называецца, не на камень. І хоць з яго, Андрэя, пачалі пасмейвацца, маўляў, губа ў цябе не дура, ведае, куды мецiць, аднак ён не зважаў ні на якія кепікі, смяшкі. Ды і чаго было зважаць? Ала яму падабалася. А што да бацькоў... Дык ці мала якія ў каго бацькі? Не з імі ж яму жыць. І ён хадзіў з Алай у кіно, на танцы, праводзіў дадому. Праўда, здараліся, асабліва напачатку, прыкрыя, а то і непрыемныя моманты, як, напрыклад, калі аднойчы Але захацелася марожанага. А ў яго, як на тое, грошай на дзве

порцыі не хапіла. Добра, што хоць на адну капеек у кішэні наскроб. Давялося сказаць, што ў самога горла пабольвае, таму ён устрымаецца, не будзе сёння есці марожанага. Прыкладна тое самае было і калі ў кафэ ці ў рэстаран Але іншы раз хацелася зайсці. Не скажаш жа, не прызнаешся, што грошай на гэта няма. Ала, вядома, яго не зразумела б. Ды і няёмка ж было прызнавацца ў сваёй беднасці. Таму ён кожны раз, калі Ала патрабавала таго, чаго ён не мог даць ці зрабіць, шукаў выйсця, выкручваўся. Але гэта былі дробязі, ды і то на пачатку іхняга знаёмства. Калі ж Ала зразумела ўсё ці, можа, здагадалася, праблем больш не ўзнікала — у Алы заўсёды былі пры сабе грошы і на ўсё, чаго душа жадала. Прыкра было за дзявочыя грошы хадзіць куды б там ні было, плаціць... Але... Ала супакоіла — якая розніца, чые грошы? Ды і што такое грошы? Так, дробязь... Паперкі... Галоўнае не яны...

Ён, Андрэй, цалкам згодзен быў з Алаю. Вядома, галоўнае не грошы... Было б жаданне заўсёды быць разам, бачыць, чуць адно аднаго... А ўсё астатняе... І праўда — дробязі...

Так, не вельмі заўважыўшы, прахадзіў ён, Андрэй, з Алачкай, амаль не расстаючыся, аж пакуль нарэшце не ажаніўся. Было гэта на пятым курсе. Набліжалася размеркаванне. Ала не хацела, каб яе куды-небудзь пасылалі з дому, з горада. Ды, прызнацца, і сам ён, Андрэй, не вельмі хацеў ехаць куды б там ні было, асабліва ў вёску. Можа, таму, што ведаў, якое ў вёсцы жыццё. Усё ж, як паспеў ён пераканацца, у горадзе жыць куды лягчэй. Вяселле гулялі ў шыкоўным, самым лепшым у горадзе рэстаране. Два дні. Гасцей было, мусіць, чалавек трыста. У асноўным, вядома, Аліны сваякі, знаёмыя яе маці і бацькі. З яго ж, Андрэевага, боку на вяселлі былі маці, бацька ды некалькі дружбакоў, студэнтаў-аднакурснікаў. Усе клопаты па наладжванні і аплаце вяселля ўзяў на сябе Арцём Гаўрылавіч. Ён быў багаты, не раўня Андрэевым бацькам. Ды і ўплывовы. Варта было яму пазваніць куды-небудзь, як з'яўлялася ўсё, што ён хацеў. На вяселлі ўпершыню і адчуў Андрэй сваю беднасць, няроўнасць і як бы непамыснасць. Закралася была нават думка: «Ці тое ён робіць, што жэніцца з Алай? Ці па́ра яна яму? Правільней, ці ён па́ра Але?» Ды вяселле ёсць вяселле. Гаварыліся вельмі ж добрыя, прачулыя словы і на яго, Андрэеў, адрас, і на адрас Алы, былі — і не абы-якія! — чарка, закуска, танцы, словам, весела было. І ў тым вясельным тлуме

забыліся хутка прыкрыя думкі пра няроўнасць, беднасць, пра тое, ці па́ра ён Але і Ала яму...

Пасля вяселля ён, Андрэй, з інтэрната перабраўся жыць на кватэру да Арцёма Гаўрылавіча, у якой і раней бываў ужо разоў колькі, але тады як госць. Нясмелы, баязлівы госць. І ўсёй кватэры фактычна не бачыў. Бачыў тое, што паказвалі. Цяпер жа, перабраўшыся, разглядзеў кватэру як мае быць. Была яна не толькі вялікая, але і дагледжаная. Правільней, гэта былі дзве кватэры, злучаныя ў адну,— з дзвюма кухнямі, двума туалетамі, дзвюма ваннамі. І абстаўлена кватэра была па апошнім, што называецца, піску моды. У кожным пакоі ляжалі, віселі дываны. За шклом у сервантах зіхацеў, пераліваўся ўсімі колерамі крышталь. Адзёжныя шафы былі ўманціраваны ў сцены, расфарбаваны пад арэх... І чаго толькі ў іх не было! Футры, дублёнкі, паліто, шапкі, касцюмы, боты, туфлі... І ўсяго па некалькі штук, па некалькі пар — на самае markознае надвор'е і самы розны абыходак... Не горш абжыта і абстаўлена была і дача, куды неўзабаве завезлі яго цесць і цешча разам з Алаю — каб сёе-тое памог ды і пажыў, адпачыў ад гарадскога тлуму. Словам, пачалося новае жыццё. Не трэба было думаць ні пра яду, ні яшчэ пра што б там ні было. Нават куды працаваць ісці, бо яго, Андрэя, пакінулі ў аспірантуры. Рабілася ўсё быццам па ўзмаху чарадзейнай палачкі-выручалачкі. Варта было чагосьці пажадаць, выказаць гэта ўголас — і яно з'яўлялася. Цесць і цешча, адчувалася, былі задаволены зяцем. Ён быў сціплы, нічога ніякага не патрабаваў, здавальняўся тым, што яму давалі. Здаволена была і Алачка. Яна расцвіла, бы ўсё адно кветачка. На шчоках з'явіўся румянец, яна папаўнела, пахарашэла яшчэ больш. І не адыходзіла ад Андрэя, не пакідала яго ні на хвіліну аднаго, усё лесцілася, мурлыкала, бы кошачка,— садзілася яму на калені, абдымалася, цалавалася. Іншы раз гаварыла:

— Недарэмна ж называюць жонку палавінаю. Я нават адчуваю, што без цябе я не ўся. Вось як разам, дык тады, і праўда, адно цэлае...

Яму, Андрэю, таксама добра было. Усё ж ёсць, ні пра што дбаць не трэба. Хочаш паесці — халадзільнік усяго ўсякага, смакаты повен; хочаш з Алачкай наадзіне пабыць — яна побач, заўсёды цёпленькая, ласкавая, у любы пакой вядзі. А то і на дачу можна паехаць ці ў лес. Варта толькі да тэлефона руку працягнуць, нумар патрэбны набраць, машыну выклікаць...

Але паступова, праз які месяц-другі Андрэй адчуў нейкую як бы непамыснасць, пустату такога жыцця. Ён змалку прывучаны быў да працы. Як помніў сябе — увесь час працаваў. Вясною памагаў гарод капаць, сеяць. Потым палоць, акопваць, касіць, жаць. Ды і ў лес па ягады, грыбы бегаў. Увосень — бульба, арэхі, жалуды. Нават зімою рэдка калі без працы быў — то па дровы ездзіў, то гэтыя дровы рэзаў, калоў. Ды і ў хату ж іх прынесці трэба, па ваду збегаць. Любіў ён, Андрэй, і кнігі чытаць. Іншы раз на сон забываўся, ноч усю над кнігаю праседжваў. А тут, у цесця і цешчы, быццам час марнаваўся. Снеданне, потым музыка, тэлевізар, абед, зноў музыка, тэлевізар... Валянне на канапе ці ў пасцелі... Алачка да такога жыцця прывучана была, а вось ён, Андрэй... Адчуваў як бы дакор сумлення. Малады, дужы, а... Хоць і не адпускала яго ад сябе ні на крок Ала, усюды за ім, як цень, хадзіла, але ўсё ж кандыдацкую сяк-так зрабіў, абараніўся... Можна было б і за доктарскую ўзяцца. Але...

Бянтэжыла, здзіўляла і яшчэ адно: чым далей жыў на кватэры ў Арцёма Гаўрылавіча — у прымах, як пасмейваліся некаторыя, тым больш бачыў — Арцём Гаўрылавіч быццам і не гаспадар у сябе дома. Усім кіравала цешча — Эльвіра Барысаўна. Яна нідзе не працавала, была дзябёлая, рухавая і надта ж дзейная. Цэлы дзень то кудысьці званіла, то ездзіла, хадзіла, то прымала самых розных наведвальнікаў. Камусьці штосьці раіла, камусьці ў нечым памагала ці абяцала памагчы. Увечары ж, калі вяртаўся дадому Арцём Гаўрылавіч — а вяртаўся ён іншы раз позна, стомлены і вялы,— Эльвіра Барысаўна пачынала дыктаваць яму, што ён павінен зрабіць дзеля таго ці іншага чалавека, ці напаміналa, што трэба было зрабіць, а ён не зрабіў. І Арцём Гаўрылавіч маўкліва згаджаўся з жонкаю, а то, калі быў не ў гуморы, і апраўдваўся, абараняўся:

— Ды не магу, не магу я гэта зрабіць...

— Можаш! — павышала голас жонка.— А не можаш сам, Пятру Іванавічу пазвані. Ці — Мікалаю Сяргеевічу...

— Ды званіў, званіў я... І яны не могуць.

— Няпраўда! — раздражнялася Эльвіра Барысаўна.— Калі так... Я сама іхнім жонкам пазваню!

— Рабі што хочаш, толькі адстань, адчапіся ад мяне, дай хоць хвіліну адпачыць!

І, стукнуўшы дзвярыма, Арцём Гаўрылавіч хаваўся, як не бег у свой кабінет. Іншы раз, не паказваючыся на вочы жонцы, і начаваў там адзін.

Няйнакш яна, Эльвіра Барысаўна, і яму, зяцю, Андрэю, месца знайшла, куды яго пасля заканчэння аспірантуры накіравалі на працу, яна, відаць, пастаралася, і каб яго заўважылі, вылучылі як здольнага і ініцыятыўнага таварыша на адказную пасаду.

«І, мабыць, далей бы я... Правільней, мяне рухалі б наперад, падымалі б,— вёў свае думкі-развагі Андрэй, лежачы на канапе і не могучы ніяк заснуць.— Калі б перабудова, абнаўленне не пачаліся, калі б Арцёма Гаўрылавіча на пенсію не выправілі... Арцёму ж Гаўрылавічу, як на тое, за шэсцьдзесят... Хоць і шчыравала Эльвіра Барысаўна, у Маскву нават ездзіла, каб затрымаць на пасадзе мужа, ды і тут, дома, каму толькі не званіла, аднак... Гады ёсць гады, нікуды не папрэш. Цяпер, як яна сказала, «уся надзея на цябе, Андрэй»... Але... Ён, Андрэй,— не Арцём Гаўрылавіч. І пасада не тая, і абсяг, магчымасці не тыя. Ды і... Ён сам, Андрэй... Неахвотна, «са скрыпам» рабіў усё, што ні прасіла, ні загадвала Эльвіра Барысаўна. Надта ж апетыты ў яе вялікія, неўтаймоўныя. А рабіць, што загадвае, просіць цешча, з кожным днём цяжэй і цяжэй. То праверкі розныя, кантроль, то ананімшчыкі спакою не даюць — сігналяць не ў тую, дык у іншую арганізацыю. А цяпер яшчэ і галоснасць... Але што да таго Эльвіры Барысаўне? Ёй рабі, што яна сказала, загадала... На гэтай глебе і канфлікты пачаліся. Ужо з месяц нават не размаўляюць. Ала таксама ўбаку не асталася, падтрымала маці. Спаць у адным ложку не захацела. Ды што спаць — чужая зусім ва ўсім стала. Нейкі мужчына спартыўнага выгляду ў доме бывае. Няйнакш пагульвае з ім Ала. Ды і ён, Андрэй... З Ірай звязаўся. Асуджаў за гэта, упікаў, дакараў, іншы раз, здаралася, аж ненавідзеў сам сябе. Нядобра ж гэта — жыць быццам двайным жыццём. І разам з тым... Адчуваў — трэба яму Іра... Як глыток свежага паветра. Ды і ўцячы ад работы, ад клопатаў, ад такога, як у яго, жыцця іншы раз хоць на край свету хацелася.

«Мабыць, і сон гэты... Не проста так. Цяпер да кіраўніка ўга якія патрабаванні. А я... Арцём Гаўрылавіч не на пасадзе, на пенсію яго выправілі. І абараніць мяне... Хто абароніць?»

Устаў, саскочыў з канапы, на якой спаў з таго часу, як нелады з Алай пачаліся, па пакоі сюды-туды прайшоўся.

«Наіўны я чалавек, калі думаю, што ніхто не ведае пра мае адносіны з Ірай. І шафёр жа падвозіць. Ды і Ірыны

суседзі... І сама Іра... Не можа быць, каб яна не пахвалілася каму-небудзь. І сон гэты... Не, невыпадкова».

Адцягнуў сашмаргнуў з акна занавескі-шторы — у вочы ўдарыла, асляпіла зыркая раніца — сонца, святло.

«На працу пара збірацца. А я... Быццам ісці нікуды не трэба, адпачынак у мяне...»

І, каб пазбыцца нялёгкіх начных думак і трывог, Андрэй рашуча накіраваўся ў ванную — чысціць зубы, прымаць душ, галіцца.

## 2

Установа, куды быў вылучаны на кіраўнічую пасаду Андрэй Лобач, была навуковая, дакладней, навукова-даследчая. І, як кожная падобная ўстанова, яна мела, вядома, свае асаблівасці. Па-першае, большасць з тых, хто ў ёй працаваў, ва ўсякім выпадку, атрымліваў зарплату, былі «пазваночнікі» — дзеці і ўнукі розных начальнікаў і іх знаёмых, уладкаваныя па тэлефонных званках, па-другое, яна ўвесь час была як бы ў стадыі эсперыменту, рэарганізацыі — ствараліся новыя лабараторыі і аддзелы, касаваліся ранейшыя, колькасць работнікаў то скарачалася, то пашыралася. Але пры ўсім непастаянстве было тут і пэўнае пастаянства — усе без выключэння супрацоўнікі былі заўсёды вельмі ж занятыя, усе нешта рабілі, прычым заўзята. Ініцыятыва, як кажуць, біла цераз край. Пісаліся паперы, склікаліся нарады, прымаліся пастановы, пасылаліся ва ўсе канцы рэспублікі і краіны ганцы то нешта вывучаць, даследаваць, то прабіваць, падштурхоўваць, укараняць у вытворчасць, то проста ніхто і сказаць не мог чаго. Словам, установа працавала... Працавала так, што, нават калі здараўся недзе нейкі аўрал і большасць супрацоўнікаў пасылалася ў калгасы і саўгасы на сельгасработы, на нейкую будоўлю, на базу перабіраць памідоры, капусту ці моркву, перабояў не адчувалася. Хіба што меншала колькасць нарад ды папер. Але гэта былі часовыя, «сезонныя» з'явы. Увесь астатні ж час установа працавала ў роўным нармальным рытме — у восем сорак пяць людзі займалі свае рабочыя месцы — сталы і крэслы, у дванаццаць трыццаць дружна ішлі на абед; пасля абеду, хто трохі раней,хто пазней, зноў займалі свае месцы, зноў працавалі, пакуль паступова не знікалі — спяшаліся: хто забраць з садзіка дзіця, хто дадому, хто яшчэ куды — вольны ад працы час кожны скарыстоўваў па-свойму, як хацеў. Ды і ў часе

працы ніхто вельмі, вядома, на пуп не браў, не надрываўся — хадзілі то пакурыць, то новыя, свежыя анекдоты расказвалі і пераказвалі, то проста пляткарылі. Прагульваліся па калідоры, а то і па вуліцы, бегалі, асабліва жанчыны, у магазіны, стаялі ў чэргах, некаторыя, найбольш увішныя, уцякалі і ў кіно, у цырульню; у летнія ж гарачыя дні — і на возера пакупацца, пазагараць...

Андрэй, вядома, ведаў, што рабілася ў падначаленай яму ўстанове, але навесці належную дысцыпліну і парадак было проста немагчыма, хоць ён, асабліва напачатку, і спрабаваў гэта зрабіць. Бо парушалі ж дысцыпліну і парадак, як выявілася, найперш і найбольш «пазваночнікі» — дзеці і ўнукі розных начальнікаў. Прымаць супраць іх нейкія меры пакарання — гэта выклікаць агонь на сябе. А калі іх не чапаць, глядзець на гэта скрозь пальцы, то як жа быць з тымі, у каго не было заступнікаў? Яны ж таксама людзі і бачаць, адкуль, як кажуць, псуецца рыба. Адным можна, а другім... Ды і што з таго, будзе строгая дысцыпліна ва ўстанове ці не будзе? Нічога ж і так і гэтак не мянялася. Справы ішлі, за сёе-тое ўстанову хвалілі, за тое-сёе крытыкавалі. Таму Андрэй асабліва «гаек не завінчваў», даручаў сачыць за дысцыплінай партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай дый іншым грамадскім арганізацыям. Урэшце, калі пытанне аб дысцыпліне ставілася востра, рубам, то заклікаў супрацоўнікаў да сумлення — кожны ж рэгулярна распісваецца ў ведамасці па атрыманні зарплаты, то кожны ж і на працы быць павінен...

Сам Андрэй імкнуўся паказваць прыклад, не парушаць працоўнай дысцыпліны. Роўна ў восем сорак пяць, а то, здаралася, і раней заходзіў у свой кабінет, роўна ў пяць сорак пяць пакідаў яго. Гэта калі не было ніякіх нарад, пасяджэнняў. Але, як вядома, такіх дзён у кіраўнікоў амаль не бывае — пастаянна хтосьці кудысьці выклікае: то трэба сядзець у прэзідыуме, то ў зале, слухаць, хто што гаворыць, то самому гаварыць — трымаць справаздачу, выступаць у спрэчках. І, зайшоўшы ў кабінет і аддаўшы неабходныя распараджэнні — каму па тэлефоне, каму яшчэ як — як дазваляў час,— Андрэй выклікаў машыну і ехаў. Іншы раз да абеду, іншы раз на ўвесь дзень.

На сёння ніякіх нарад і пасяджэнняў быццам не планавалася. І Андрэй падумаў, ці не звязацца яму з сім-тым, пагаварыць па тэлефоне, а то і сустрэцца. Выхад на пенсію Арцёма Гаўрылавіча, змены, што адбываліся ў верхніх і ў нізавых эшалонах улады, ды і нечаканы начны сон

усхвалявалі яго, пасеялі нейкую як бы няўпэўненасць, трывогу. «Раптам сёе-тое хтосьці ведае і скажа? Ці хоць намякне? Бо жыць так, нічога наперад не ведаючы... Нават не здагадваючыся... Гэта ж... Нібы ў яме...» Хвалявала і яшчэ адно — у апошні час надта ж нежк аж нахабна, з выклікам глядзела на яго цешча, Эльвіра Барысаўна. На твары ў яе было быццам напісана: «Не дарую, атрымаеш сваё». І Андрэй ведаў — Эльвіра Барысаўна нікому яшчэ нічога не даравала, жорстка і злосна помсціла.

«Можа, і мне яна...»

«За што?»

«Ды за ўсё. За непаслухмянасць, за няўдзячнасць... Як захоча, знойдзе, за што адпомсціць...»

«Але ж цяпер Арцём Гаўрылавіч на пенсіі».

«Сувязі ж ранейшыя асталіся. Яна памагала, і ёй памогуць».

Зноў — які ўжо раз! — пашкадаваў Андрэй, што зрабіў памылку, не падумаўшы, ажаніўся з Алай.

«Падабалася яна мне. І я... Трапіў, як муха ў мёд».

Дратаваў, дакараў сябе — ды як, як! — Андрэй. Варта было астацца аднаму, апаноўвалі думкі, браў одум — не так, не так у яго выйшла, як хацелася. «А ўсё таму, што Алу замуж узяў. Трэба было роўную сабе жонку шукаць. Закончыў бы універсітэт, паехаў бы разам з ёю кудынебудзь далей ад сталіцы і жыў бы, як іншыя жывуць. Карысць бы людзям прыносіў, многага з таго, што цяпер ведаю, не ведаў бы і быў бы шчаслівы. Дзяцей расціў бы... А то... Змарнаваў, лічы, ні за што ні пра што столькі гадоў. Ды якіх гадоў!.. Можа быць, самых лепшых, калі малады, дужы, галава, думкі светлыя...»

Знешне ўсё было быццам нармальна. Сёй-той нават зайздросціў. У яго, Андрэя, пасада, і даволі высокая, ёсць навуковая ступень, жонка. У жонкі, правільней, у цесця і цешчы, неблагая — дзе неблагая, можна сказаць, шыкоўная кватэра, дача. Але... Гэта знешне. Унутры ж ніякай радасці, пустата. Нават дзяцей і то няма. І не таму, што ён, Андрэй, не хоча іх мець. Алачка сваю фігуру беражэ. Баіцца, што цяжарнасць, роды... Словам, не такая прывабная будзе, калі дзіця народзіць. «А можа, не спяшаецца лёс свой са мной звязваць, вывучае, ці той я чалавек, з якім жыць варта? — прыйшло раптам у галаву, калі, намыліўшыся, узяў у руку брытву, каб галіцца.— Бо звязваць свой лёс не з тым...»

Аж скаланула Андрэя ад гэтае нечаканае здагадкі.

«Выходзіць, мяне вывучаюць, прыглядваюцца, што я за чалавек... Бо інакш... Фігура фігурай, а дзіця... Якая ж жанчына не хоча мець дзіцяці? Фігура — гэта адгаворка. Іншае, іншае хаваецца за гэтым. І каб я папіхачом быў, рабіў, што мне загадваюць і кажуць, як Арцём Гаўрылавіч, тады б... І дзеці даўно былі б, і нацягнутых, напружаных адносін з цешчаю, жонкаю не было б. Жылі б душа ў душу, у злагадзе і дабры...»

І пакуль галіўся, ужо думаў:

«А можа, і не варта шкадаваць, што не паспелі абзавесціся дзецьмі? Бо дзеці... Былі б яны... Куды б цяжэй было разводзіцца. А так, калі што якое... Нішто ніякае не звязвае... Ага, ага. Відаць, Алачка і пра гэта падумала. А правільней — падумала пра ўсё за яе мамачка, Эльвіра Барысаўна. О, Алачка і кроку не зробіць, каб не параіцца з мамай. Ва ўсім, ва ўсім мамачку слухае. А Эльвіра Барысаўна... Далёка наперад глядзіць. І бачыць тое, чаго ніхто не бачыць. І я... Не ўсё ёй ва мне падабаецца, не такі я слухмяны і лагодны... І таму...— вёў свае думкі-развагі Андрэй, водзячы па шчоках і падбародку брытваю і зразаючы густую калючую шчэць.— Так, так, мусіць, яно і ёсць. А я... Дурань, як раней пра гэта не падумаў, не здагадаўся. Даўно вывады зрабіў бы...»

«Якія вывады?»

«Ды такія, якія ў такіх выпадках усе робяць. Ці жыць, як людзі жывуць, ці...»

«Гэта не позна і цяпер зрабіць...»

«Вядома, не позна. Але ж нядобра неяк. Быў цесць, Арцём Гаўрылавіч, на пасадзе — жыў я з Алачкай, не кідаў яе. А цяпер, калі ён без пасады... Дый... Калі разведуся з Алачкай... З кватэры трэба ісці, з пасады. Які ж я кіраўнік, калі з жонкай не ўжыўся... Не супакоіцца ж Эльвіра Барысаўна, пакуль мяне... Ну, ці папросяць з пасады, ці вытураць, што, урэшце, у канчатковым выніку тое самае... І куды мне тады дзявацца, дзе жыць, працаваць?»

«Жывуць жа, працуюць. Не ўсім жа кіраваць. А я ж — кандыдат навук, біяхімік... Што ж да таго, дзе жыць... Дык... Можна да Іры перабрацца...»

Успомніўшы Іру, засяродзіў думкі на ёй.

«Жыць у Іры, ажаніцца...»

Не, не думаў пра гэта Андрэй. Адна справа наязджаць, пабыць гадзіну-другую... І зусім іншае дзяліць хлеб-соль, ды і ўсё астатняе...

«А калі не жаніцца, дык перабірацца да яе жыць...

Таксама ж... Яна спадзявацца на нешта будзе, а тым часам... Ды і ў яе, у Іры, спытаць трэба, ці захоча яна, каб я да яе перабіраўся, жыў разам... Можа, у яе свае нейкія планы ёсць...»

Хоць і сустракаўся з Іраю, бываў у яе Андрэй быццам і часта, аднак пагаварыць, што называецца, шчыра, па душах, так ні разу і не пагаварыў. Усё часу не хапала. Прыедзе, у пасцелі з ёю пабудзе, чарку вып’е, закусіць — і паехаў. Ды і не ў часе прычына. Прычына ў іншым — баяўся гэтай размовы Андрэй, адкладваў яе як мага на далей, на пасля. І сама Іра таксама... Нешта было ў яе такое, што таксама стрымлівала, не давала да канца быць з ім шчырай. І размова пра ўзаемаадносіны, пра ўсё тое, што было ў думках і на душы, адкладвалася, адкладвалася...

«А ўсё таму, што ні ў мяне, ні, мабыць, у яе пэўнасці няма. Быццам зладзеі мы, крадзём у кагосьці штосьці. І баімся, каб нас не выкрылі, не зславілі...»

«А што ж рабіць? Ці зусім нічога не мець, ці мець хоць тое, што маем».

«Яно-то так. Але ж... Да пары́, кажуць, жбан ваду носіць».

«Вось пара́ тая і надышла. Пагаварыць трэба з Іраі. Пра ўсё пагаварыць. Шчыра, без утайкі. І калі што... Перабрацца да яе жыць?»

«Ці прыме яна мяне? Ды і мне... Апёкшыся адзін раз, яшчэ рызыкаваць?.. Можа, лепш пачакаць?»

«Чаго чакаць?»

«Ну хоць з думкамі сабрацца, узважыць усё. Бо адно, калі з Іраі сустракаешся як з палюбоўніцай, і зусім іншае, калі яна стане жонкаю. І Ала была калісьці... Лепшай, здавалася, нідзе на белым свеце няма. А бачыш жа...»

«У Алы маці, Эльвіра Барысаўна...»

«І ў Іры ж маці ёсць. І бацька. У вёсцы жывуць, настаўнічаюць. Дый... Замужам Іра, не развялася. І муж... Таксама яшчэ не жаніўся другі раз... І што ў Іры ў галаве? Хто ведае?»

«Можа, сёння заехаць да яе і пагаварыць?»

«А што? Хоць пэўнасць будзе. А то і з Алачкай пэўнасці няма, і з Іраі тое самае. Ды і з працай...»

Даўно, з самага пачатку, не падабалася Андрэю тая праца, на якую яго вылучылі, паднялі. Думаў — нічога, сцерпіцца, прывыкнецца. Аж не. Чым далей сядзеў у кіраўнічым крэсле, тым больш мулкае яно яму здавалася.

І не толькі таму, што Эльвіра Барысаўна імкнулася кіраваць, камандаваць. Але і таму, што не ляжала душа ў яго да гэтай працы, не яго яна была. Ды і якая ж гэта праца? Хутчэй — мітусня, бачнасць працы. Бо назваць працай нарады, пасяджэнні, выступленні, узгадненні... А ён жа, Андрэй, навукай марыў займацца. І загубіць сябе, свой талент на прыслужніцтва, прыслужніцтве?!.

«Не! І трэба было не паддавацца ні на якія ўгаворы. Цвёрдасць характару праявіць. Адразу, з першага дня. І не толькі з працай, а ва ўсім. Алу трэба было з сям'і вырваць. Не ісці ў прымы да цесця і цешчы, а прыдбаць сваю кватэру. І жыць як чалавек, як гаспадар. І Алачцы сказаць — хочаш, каб я з табою жыў, перабірайся да мяне. А то я пагнаўся...»

«Ды быццам ні за чым і не гнаўся. Проста не думаў ні пра што. У Алачкі кватэра, правільней, у яе бацькоў, дастатак ва ўсім... Лёгка, добра, дбаць ні пра што не трэба... А выявілася...»

«А як жа ты думаў! За ўсё трэба плаціць, дарма нічога нікому не даецца. І плата... Яна розная бывае...»

Прачнулася, шмыганула са свайго пакоя ў туалет Алачка. Ціхенька, каб, мабыць, ён, муж, не пачуў. Уключыў ваду, пачаў мыцца — здаецца, пагаліўся сёння няблага, нават не парэзаўся ні разу. Але, на ўсякі выпадак, правёў даланёю па шчоках, па падбародку, шыі — ці не засталася дзе-небудзь непаголеная лапінка. Усё, здаецца, нармальна, у парадку. Праўда, як адзначыў сам сабе, за апошнія дні быццам пахудзеў — шчокі запалі, пад вачамі цёмныя кругі, мяшкі.

«Гэта, мусіць, бо дрэнна ўночы спаў... Сон гэты... Ды і думкі...»

Пачуў — Ала, зрабіўшы, што ёй трэба было, прабегла, шмыганула назад у свой пакой.

«Няйнакш сустракацца са мной не хоча. Дзіўны ўсё ж яна чалавек. Скончыла універсітэт — і хоць бы падумала аб працы. Нідзе і не спрабавала ўладкавацца. Жыве, як і яе маці. Трутні. На мужавай, бацькавай шыі... Вядома, сядзець так, нічога ніякага не рабіўшы... Вось і занятак знайшлі — мужыкам шыі круціць-вярцець, камандаваць... Але не, хопіць! Больш не будзе таго. Вось ваш хамут і сані, рабіце ўсё самі. Ці іншага пашукайце, папіхача. А я... Куды заўгодна, што заўгодна, толькі не тое, што жонка, цешча хочуць...»

Аж плюнуў ад злосці.

«Трэба ж... Як загадваць, што і дзеля каго зрабіць, дык умеюць. А яду зварыць, нават чай згатаваць... І то... Сам...»

Не пайшоў на кухню. Адзеўся і, не выклікаючы машыны, што здаралася апошні час усё часцей і часцей, накіраваўся на працу, як любіў ён казаць, «на сваіх дваіх».

## 3

Хоць быў і красавік месяц, яго сярэдзіна, але надвор'е стаяла зусім не вясновае, а нібыта летняе. Парна, цёпла было нават раніцою. Праўда, дрэвы яшчэ не распусціліся — быццам разгубіліся, не ведалі, што рабіць,— не пара́ яшчэ, каб лісце выкідваць і разам з тым... Хіба толькі кусцікі смуродзіны, агрэсту ды крапіва, касачы зелянелі дзе-нідзе каля дамоў. І на гэтую зеляніну, якая надта ж ярка сама кідалася ў вочы, Андрэй глядзеў як бы з надзеяй — засумаваў па ёй за зіму, дый вясна — ведаў гэта па сабе — заўсёды ж нясе абнаўленне, надзеі. Чамусьці падумаў: «Маці, пэўна, расаду ўжо сее, гной на гарод выносіць. Калі тут так цёпла, то там, на Палессі, і пагатоў...»

Заўсёды, калі Андрэй успамінаў маці, сэрца заходзілася шчымлівым болем.

«Як яна там, бедная, адна?»

Далекавата жыла ад горада, дзе займеў сабе прытулак Андрэй, яго маці. Аж чатырыста кіламетраў з гакам. І не заўсёды знаходзіў ён час, каб з'ездзіць да маці, праведацца. Замінаялі розныя клопаты. А месяц адпачынку, то не ведаеш, як яго і скарыстаць. Адпачыць хочацца, на моры пабыць, пагрэцца. Дый дарога ж да вёскі няблізкая. Ехаць на цягніку ці аўтобусам — і нязручна, і цяжкавата. А на службовай машыне... Таксама ж... Не падтрымліваецца гэта, наадварот, караецца... І Андрэй рэдка бываў у маці. Раз-два на год. І то — прыедзе, пераначуе — і назад.

«А яна ж, гарапашніца, заўсёды так чакае майго прыезду! І ў пісьмах піша, просіць-моліць, каб прыехаў. Год чакае і... Прыехаў — і паехаў. Каб па-людску ў горадзе жыў, то забраць бы яе да сябе, няхай бы не мучылася, пазбавілася вечных клопатаў пра дровы, сена, ды і ўсё астатняе. Хоць бы на старасць пажыла як чалавек. Але я... Сказаць, каб пра сябе вельмі думаў, дык не ж. А пра яе... Тым больш не думаў. Як ідзецца, так і няхай. А трэба было падумаць. На тое ж яна і маці. Дараж́эй за мяне ў яе няма нікога, нічога. Ды і яна мне... Хоць што мне дарага? Нясе мяне жыццё, быццам ветрам... А куды, чаго?»

Насустрач, побач, ззаду, з бакоў ішлі людзі. Мужчыны, жанчыны, дзеці... З сумкамі, партфелямі, папкамі і проста так, з голымі рукамі. Кожны кудысьці спяшаўся, кожнага гнаў з дому свой клопат. І, уліваючыся ў вірлівы ранішні людскі паток, Андрэй адчуваў сябе такім жа чалавекам, як і ўсе.

«Проста дзіўна — адно адчуванне, калі імчыш на машыне, і зусім іншае, калі ідзеш па вуліцы разам з усімі, пеша,— не першы раз злавіў сябе на думцы Андрэй.— І было б, мусіць, правільна, каб начальства, як і ўсе, на працу і з працы хадзіла пешкі, ездзіла на гарадскім транспарце. Тады б і транспарт куды б лепей працаваў, ды і начальства сябе па-іншаму адчувала б. А то... Яно, начальства, быццам спяшаецца, часу яму няма. А куды, чаго спяшаецца? На чарговае пасяджэнне, на чарговую гаварыльню? Гэта ж не да станка... А калі спяшаешся, дык раней з пасцелі падымайся. Ну, на працу яшчэ можна апраўданне знайсці. А дадому чаму на дзяржаўных машынах ездзяць, куды так спяшаюцца, чаго? Проста распуста, адказнасці няма. Ні перад народам, ні перад сумленнем...»

Хоць і сам быў начальнік Андрэй, і сам часта ездзіў на працу і з працы на машыне, а ўсё ж закіпела ў душы не ўпершыню абурэнне. Можа, таму, што ведаў, як кожны імкнуўся завалодаць гэтай машынай. А каб завалодаць ёю, трэба была пасада... І за тую пасаду з бясплатнай машынай — а разам з ёю і размеркавальнік, атэлье, а то і дача — вялося змаганне. Ды якое, якое! І не толькі тых, хто пакаштаваў слодыч улады, але і тых, хто імкнуўся трапіць у верхнія слаі — моладзі. Іншаму б на заводзе ля станка ўкалваць ці ў калгасе, а ён пасля інстытута, не пазнаўшы смаку працы, жыцця, імкнуўся заняць цёплае, утульнае кіраўнічае крэсла. І так некаторы хутка прывыкае да яго, да ўсіх тых даброт, што дадаюцца да гэтага крэсла, што быццам і нарадзіўся ў ім, не скалупнуць, не выманіць нічым.

«Як і я,— з горкай іроніяй падумаў пра сябе Андрэй.— А на добры лад у начальства варта было б вылучаць толькі тых, хто праявіў сябе, паказаў, што ён здольны працаўнік, арганізатар. І не глядзець асабліва, колькі каму гадоў. А то мода пайшла — то рана, то позна... Падымуць ззамаладу некаторага, потым усё жыццё перасаджваюць з крэсла ў крэсла. Аднаго вышэй, другога ніжэй... І лёс чалавека залежыць не заўсёды ад яго дзелавых і чалавечых якасцей.

Часцей за ўсё якраз ад іншага. Хто як пра каго далажыў, якую ацэнку каму даў, хто гэтым вылучэннем займаецца. А трэба было б не тайна такое рабіць. Каб сам народ, калектыў на пасады кіраўнікоў вылучалі. Бо хто ж лепей чалавека ведае, як кажуць, з усіх бакоў, як не людзі, не той калектыў, у якім чалавек працуе. І перш за ўсё думку гэтага калектыву трэба ведаць. Тады б... Менш бы памылак было... А то... Улада быццам народная, а народ... Хто пра што пытае ў народа? Іншы смаркач, малако матчына на губах не абсохла, а бярэцца, імкнецца камандаваць людзьмі. Ці наадварот... Ні сілы, ні здароўя няма, забывае, не помніць чалавек, што робіць, а сядзіць на пасадзе, некаму ён трэба, трымаюць... Не, гэта правільна, што за перабудову, абнаўленне ўзяліся. А то дажыліся, што на пасады вылучалі цешчы, жонкі... А потым і кіравалі гэтымі начальнікамі... І паспрабуй не паслухайся... Маці мая вунь усё жыццё не разгінаецца, дзень і ноч у зямлі, у гнаі... А тут, лярвы, паадкормліваліся, палец аб палец ніколі не ўдарылі, жывуць на ўсім гатовым... Ды яшчэ і камандаваць хочуць...»

Узбунтавала няйнакш мужычая, працоўная кроў у жылах у Андрэя.

«Дзіўна, як цярпеў я такое. Ды столькі!»

«А што было рабіць? Прыгрэлі мяне, уладкавалі. Ды і Ала... Такая ласкавенькая, лагодная, утульная. Убачыш яе — на ўсё, маці родную забудзеш... Але як толькі самастойнасць праявіў, дык зубкі нябось і яна паказала. Не зубкі нават, а іклы. Аднаго поля ягадкі са сваёй мамкаю. Не, сёй-той ведае, што рабіць. Як толькі выбівацца пачне чалавек, здольны — жоначку яму падсунуць. Трэба — кошачкай памурлыча, трэба — іклы воўчыя пакажа... І паспрабуй выбавіцца з пасткі, калі нават захочаш. То кватэра, то дзеці...»

«Хтосьці сказаў — ад жанчын заўсёды ў адных споднiках уцякаюць».

«Лёгка сказаць. А паспрабуй уцячы... Калі ты... Звязаны. Па руках і нагах звязаны...»

«Іншыя не менш былі звязаны».

«Хто, напрыклад?»

«А навошта табе прыклад? Зрабі так, як сам хочаш, лічыш. Ну, нешта, відаць, страціш. Але нешта і набудзеш. Ва ўсякім выпадку волю, нікому нічым абавязаны не будзеш. Урэшце, паехаць можна з Мінска. Куды? Ды на першых парах хоць бы да маці. Яна ўзрадуецца. Пажывеш

у яе, агледзішся... А там... відаць будзе, што і як рабіць...»

«А Іра?»

«Раз ускочыў у балота, не спяшайся скакаць яшчэ раз. Бо перабраўшыся да яе... Каб яшчэ лёс свой звязаць з ёю збіраўся — куды б не ішло. А калі проста так... Гэта... З усіх бакоў, як ні падумай, як ні паглядзі — нядобра...»

«А гэта, бадай, правільна. Кінуць усё — і паехаць у вёску, да маці, пажыць у яе. Якраз цяплынь — пасяўная пачынаецца. Наперадзе — лета. Папрацую ў полі, у калгасе... Маці што-кольвек памагу, селішча да ладу давяду. А там, як кажуць, бог-бацька... Што, урэшце, калі добранька падумаць, мяне з горадам звязвае? Пасада? Але ж і без яе жывуць людзі... Жонка? Яе ў мяне фактычна няма — нічога ні ў чым супольнага... Дзеці? Іх таксама няма. Кватэра? У маці кватэра ёсць. Без гарачай вады, ванны... Але ж я жыў так... Пажыву і яшчэ. Урэшце, ваду можна правесці ў хату, кацельню зрабіць, грэць. І ванну... Таксама паставіць. Хаця на чорта здалася тая ванна, калі лазня ёсць... Ды якая!»

Успомніў тую лазню, што стаяла ля сажалкі,— з добрым духмяным духам, чыстаю крынічнаю вадою, у якой мыўся калісьці, жывучы ў вёсцы.

«Падновім яе, палок паправім, печ... А не — новую можна збудаваць. Калі справа ўся толькі ў лазні...»

«Вядома, не ў лазні».

«Тады і не думай. Не чакай, калі цябе зняславяць, прымушаць пачнуць, каб з пасады пайшоў. А то і... Здымуць. Так, так, здымуць. Няма за што? Калі захочуць, дык знойдуць. «За развал работы»... «Не забяспечыў»... «Не перабудаваўся»... А то і «за амаральнасць». Ды і Ала, Эльвіра Барысаўна таксама ж драмаць не будуць. Нашэпчуць, наспяваюць, нагавораць... Ого, яны ведаюць каму, а галоўнае — умеюць. Такія навухаданосары. І пакуль не позна...»

«Спяшацца не варта».

«Але і цягнуць?»

«Таксама быццам правільна. Час цяпер такі... Не глядзяць ні на што. З пляча іншы раз сякуць. Паднялі галовы розныя... Сядзелі ціха, скрытна, а цяпер за справядлівасць, галоснасць ваяваць узяліся. Ёсць сярод іх сапраўды сумленныя, шчырыя людзі. А ёсць... Усё аплявалі б, закрэслілі б, што рабілася... Дай толькі волю. Крытыку недахопаў разумеюць як аплёўвай усё і ўсіх... Дый у тых, хто ў начальстве, заўсёды недахопы знайсці можна. Час жа які

быў... Нешта не так ці не тое — хацеў ці не хацеў — а зрабіў. Іншы раз не падумаўшы, бо ўсе так рабілі, не адзін ты, а то і прымушалі зрабіць. Начальства зверху не заўсёды рэзалюцыі піша, часцей па тэлефоне звоніць. «Андрэй Анісімавіч, зразумейце, трэба!» І як ні круцішся, быццам скурат на агні, а зробіш. Нельга не зрабіць, калі зверху просяць, загадваюць. І калі хто-небудзь пакапаецца, пашукае... Знойдзе, да чаго прычапіцца... Ды і падкажуць... Не бывае такога калектыву, каб усе начальнікам сваім задаволены былі. Ёсць і хто месца заняць вышэй хоча, сувязі мае. Тыя ж, што па службе ніжэй, як на начальніка глядзяць? Праводзіць нарады, самому на нарадах бываць, даваць парады, выгаворваць, а то і караць тых, хто не спраўляецца са сваімі абавязкамі ці зрывае працоўную дысцыпліну. Гэта куды лягчэй, чым працаваць самому. Вось і лезе кожны, хто мае на тое права ці не мае, у начальства. Даброты таксама прывабліваюць — машыны, дачы, розныя размеркавальнікі... Чым большы начальнік, чым вышэй сядзіць, тым цяжэй яго дастаць...»

«І ўсё ж, як ні прывабна быць у начальстве, чалавечай годнасці не губляй. Не будзь новым Арцёмам Гаўрылавічам... Усё жыццё «пракіраваў»... І што, чаго дамогся? Рабіў, сам не ведаючы, дзеля каго. Выконваў волю жонкі, дачкі... Цяпер сядзіць дома — без пасады, кіраўнічага крэсла хто ён? Не звоняць, нічога не просяць. Не ведае, што яму рабіць. Быццам дзіця, у якога забаўку адабралі. Ледзь не плача, з кута ў кут па кватэры сноўдаецца. Няшчасны чалавек! Па якой цане хлеб прадаюць і то не ведае. Не ведае, дзе які магазін, куды і на якім аўтобусе ці тралейбусе ехаць. А быў жа некалі звычайны чалавек, у вёсцы нарадзіўся. І бачыш, як улада сапсавала! Не будзь ты такі!»

«Ды калі не падам заявы, не вырвуся з таго нерату, у які трапіў, то... У Арцёма Гаўрылавіча хоць дачка, Ала, ёсць. А ў мяне... Быццам парабка ў сям'ю ўзялі...»

...Ішоў Андрэй, кіраваўся на працу — і невясёлыя, сумныя думкі апаноўвалі яго, настырна лезлі і лезлі ў галаву.

**4**

Установа, якую ўзначальваў Андрэй Лобач, размяшчалася ў вялікім, збудаваным з бетону і шкла дзевяціпавярховым доме. Разам з ёю тут знайшлі сабе прытулак і іншыя ўстановы і арганізацыі, якія таксама быццам

працавалі — займаліся хто навукай, хто яшчэ чым. І, падыходзячы бліжэй да дома, Андрэй бачыў, як адна за адной пад'язджалі да пад'езда машыны і з іх выкульваліся рознага рангу кіраўнікі — хто хутчэй, быццам спяшаючыся, хто паволі, спаважна, з адчуваннем годнасці і велічы. Кожны начальнік пад'язджаў на машыне адзін, як і належыць начальніку. Хвіліна-другая — і машына ад'язджала ўбок ці выкіроўвала назад на дарогу, імчала ў гараж. І зноў, як гэта ў апошні час здаралася часта, Андрэй задумаўся над тым, над чым неаднойчы ўжо думаў,— колькі дзяржаве абыходзіцца ўтрыманне кожнага начальніка. Па-першае, яму самому ідзе зарплата. Па-другое, машына. І грошы ж яна немалыя каштуе, ды і магла б іншых людзей вазіць, прыбытак дзяржаве даваць. А бензін, змазачныя матэрыялы, запасныя часткі, рамонт?.. І шафёр жа. Шафёру ж кожны месяц таксама трэба плаціць зарплату, а то, на выпадак паездак, і камандзіровачныя, гасцінічныя... А ёсць жа начальнікі, у якіх і сакратаркі, памочнікі... Колькі такіх начальнікаў? У кожным горадзе? У кожнай вобласці? У кожнай рэспубліцы? У краіне? Якая б эканомія сродкаў была, каб хоць трохі іх скараціць. Ды і шафёры б, сакратаркі, памочнікі маглі б пайсці працаваць, не хапае ж людзей на заводах, на будоўлях, у калгасах... А то ад гультайства цэлымі днямі чортведама чым займаюцца...

«Ніяк прывыкнуць не можам, што дзяржава ў нас — гэта мы самі. І кожны выкінуты абы-куды ці абы на што рубель — наш рубель,— падумаў з болем у душы Андрэй.— А такое ж ці прыкладна такое ж марнатраўства ў нас шмат дзе. Мільёны, мільярды рублёў на вецер, быццам у трубу, вылятаюць. І самае правільнае — навучыцца лічыць дзяржаўныя грошы як свае. Але калі, калі гэта будзе?»

Усміхнуўся горка сам сабе Андрэй і пашыбаваў, збочыў у пад'езд. Падняўся на ліфце на чацвёрты паверх, дзе быў яго кабінет, адчыніў дзверы. Вядома, як і ў кожнага кіраўніка такога ранґу, які быў Андрэй, у яго была прыёмная, а ў ёй — сакратарка. Звалі яе Люся — Людміла Апанасаўна. Ветлівая, паслужлівая, з ласкаваю ўсмешкаю на твары для яго, дырэктара, і грозная, крыклівая, з суровым каменным выразам на твары для ўсіх астатніх. Люся — Людміла Апанасаўна сядзела ўжо на месцы, але, па ўсім відаць, прыйшла толькі што, бо яшчэ падсоўвала нагамі, хавала пад стол нейкія сумкі, на хаду расчэсваючыся, папраўляючы прычоску.

— Дзень добры, Люсечка,— сказаў, як і заўсёды, з напускной весялосцю Андрэй.— Што тут у нас?

Люся таксама ў адказ усміхнулася, праспявала сваім салодзенькім галаском:

— Ды нічога такога, Андрэй Анісімавіч. Некалькі пісем... Некалькі заяў... Ды паперы на подпіс... Я хвілін праз колькі да вас зайду, прынясу...

— Добра, добра,— спыніў прыслужніцкі сверб сакратаркі Андрэй.— Сёння нікуды я, здаецца, не спяшаюся. Пачытаю, падпішу...

— На прыём да вас просяцца. Пускаць? — спытала, хаваючы ў адну з сумачак расчоску, Люся.

— Хто?

— Розныя.

— Падрыхтуй мне спіс. І адкладзі прыём на пасля. Словам, я скажу...

— Добра, Андрэй Анісімавіч.

Нырнуў у «шафу» — так Андрэй называў двайныя дзверы, што вялі ў кабінет. Падумаў быў: «Цікавыя гэта вынаходствы — персанальныя машыны, асабістыя шафёры, сакратаркі, памочнікі, двайныя дзверы... І ўсё дзеля аднаго — адгарадзіцца ад людзей, падкрэсліць сваю важнасць, выключнасць. Нават не сваёй персоны, а ўлады. Каб не кожны мог да начальніка дайсці, пагаварыць з вока на вока, выказаць тое, што на душы. У найбольш важных установах міліцыянераў нават пры ўваходзе паставілі — паспрабуй прарвіся. І нават добры па натуры чалавек, дэмакрат, калі трапляе ў гэтую бюракратычную машыну, перастае быць тым, кім быў. Калі ўжо трапіў у начальства, будзь такі, як усе. Інакш... «Не дарос!», «Не разумее». «Што ён, падкрэсліць хоча, што не такі, як усе?» І... Словам, развітвайся з пасадай. Так, ва ўсякім выпадку было...»

«А як будзе?»

«Пажывём — пабачым».

Кабінет у Андрэя быў вялікі, прасторны, светлы, засла্ны варсістай дывановай дарожкай — каб і чалавек, калі зойдзе, адчуваў, да каго ён зайшоў (па велічыні ж кабінета некаторыя мяркуюць пра значнасць таго, хто ў ім сядзіць!), ды і каб нараду, калі такая патрабуецца, можна было, не выходзячы з кабінета, правесці. З доўгім сталом, вакол якога стаялі крэслы, са сталом, за якім сядзеў — «працаваў» ён, Андрэй, са столікам-падстаўкай — на ім бялелі, чырванелі, жаўцелі тэлефоны... Многа, многа тэле-

фонаў — сувязь з усімі ніжэйшымі, падначаленымі яму службамі і вышэйшымі, каму ён быў падначалены сам...

«Гэта ж калі я пайду з працы, то і кабінета ў мяне не будзе. І машыны, сакратаркі... Многа чаго не будзе,— падумаў Андрэй. Але не пашкадаваў.— Божа мой, не было б большае бяды. Жывуць жа людзі без усяго гэтага. І шчаслівыя... А я... Бачыш — ужо без усяго гэтага не ўяўляю свайго жыцця. Не, правільна ў некаторых краінах робяць, што не даюць падоўгу затрымлівацца на адной і той жа пасадзе чалавеку, мяняюць час ад часу. А ў паўночных малых народаў, калі выбіралі сабе кіраўніка, то праз год узважвалі — пацяжэў хоць на кілаграм, здымалі: значыцца, думаць, клапаціцца пра іншых перастаў, таму і сыцее. А ў нас як паставяць, падымуць, дык і звякуе некаторы там. І не таму, што добра працуе, а проста прывыкаюць да яго, нават думаць сёй-той пачынае, што незаменны ён. «А каго на яго месца? Няма ж каго».

Зняў плашч, што насіў не так дзеля цяпла, а як бы дзеля важнасці (дырэктар жа, можа, а не нейкі стылягаветрагон!), павесіў у шафу, расчасаў чуб, сеў за стол. І зноў задумаўся.

«А можа, не бунтаваць? Як усё ідзе, так няхай і ідзе? Не чапаюць мяне, дык і не тузацца? Зраблю перабудову, як некаторыя робяць,— перастаўлю людзей з месца на месца, сяго-таго звольню, на пенсію выpraўлю, новых чалавек колькі вазьму. Маладых, як цяпер модна...»

«А толк з гэтага, які толк?»

«Ніякага, вядома. Затое будзе бачнасць перабудовы, абнаўлення...»

«І зноў хадзіць на пасяджэнні, самому іх праводзіць?.. Жыць так, як жыў?..»

Не, не згодзен быў ён, Андрэй, жыць так, як жыў. Усё ўнутры ў яго супраціўлялася, пратэставала.

«Жонкі, цешчы слухацца... А цяпер, калі не на пасадзе Арцём Гаўрылавіч, то даручэнняў, просьбаў, абавязкаў пабольшае. І рабіць тое... Дзеля чаго? Дзеля ціхага, утульнага жыцця, кабінета гэтага, машыны, сакратаркі?.. Перабудову трэба пачынаць з сябе. Гэта правільна гаворыцца. І я пачну яе. Бо жыць так, як жыў? Не, не жыццё гэта, а марнаванне... Ды і недастойна чалавека...»

Падняўся з крэсла, наблізіўся да акна. Але не спыніўся, не стаў глядзець у яго — там, за акном, быў сквер, і Андрэй, здаралася, гадзінамі прастойваў, глядзеў на дрэвы, птушак, што туды прыляталі, і ўспамінаў Палессе, родную

вёску, маці,— у галаву зноў прыйшла думка каму-небудзь пазваніць. А можа, нават і пад'ехаць да сяго-таго. Проста з раніцы, калі не ўкручаны вельмі яшчэ ўсе ў працу, у бягучыя клопаты.

«Але каму, каму пазваніць?»

Сяброў, асабліва блізкіх, у Андрэя не было. Былі начальнікі і падначаленыя... Тыя, хто над ім, і тыя, хто пад ім. Як і ў кожнага, дарэчы, начальніка. Сярод іх былі тыя, хто не спрыяў, варагаваў з ім, былі і тыя, хто быццам падтрымліваў яго. Праўда, падтрымка гэтая была адносная. З практыкі Андрэй ведаў: у любы час любы начальнік мог з сябра стаць ворагам... Усё залежала ад таго, якое ў кожнага з іх на сённяшні дзень становішча. Ды і становішча ў самога цябе. Моцнае — значыцца, і падтрымка будзе адпаведная. Слабае — значыцца, і падтрымка такая ж. А ўжо калі становішча тваё пахіснулася ці вось-вось пахіснецца. І не думай шукаць у каго б там ні было заступніцтва, усё адно не знойдзеш. Толькі сам сябе ўнізіш, зганьбіш. І ў сваіх, і ў чужых вачах...

Пакуль што становішча ў Андрэя было быццам нармальнае. Ну не зусім такое, як раней, калі цесць, Арцём Гаўрылавіч, на пасадзе быў. Але і не настолькі яно пахіснулася, каб упадаць у паняверку. Тым больш што Андрэй не надта даражыў сваёй службай, пакідаць нават яе сабраўся. Ага, дык каму ж пазваніць, з кім сустрэцца?

Пачаў перабіраць у галаве людзей, каму можна было б даверыцца, з кім можна было б сустрэцца, перагаварыць. Вядома, перш за ўсё Пятро Кірылавіч... Іх жа амаль сябрамі некаторыя лічаць. Абменьваюцца часта яны адзін з адным рознай інфармацыяй. Па вечарах нават разоў колькі разам гулялі. Ды і абавязаны Пятро Кірылавіч яму, Андрэю. Гэта ж не хто-небудзь іншы, а ён, Андрэй, парэкамендаваў — дзе парэкамендаваў, параіў! — узяць Пятра Кірылавіча на тую пасаду, на якой той цяпер. Сам Арцём Гаўрылавіч неяк спытаў — ці ведае ён, Андрэй, чалавека, якога можна было б узяць (была названа пасада)... Вось тады ён, Андрэй, і ўспомніў Пятра Кірылавіча. Лекцыі яго некалі ва універсітэце слухаў. Пятро Кірылавіч быў быццам неблагі чалавек. Ва ўсякім выпадку спачуваў такім вясковым хлопцам, які быў ён, Андрэй. Выручаў на экзаменах, нават калі на нейкае пытанне і не мог адказаць студэнт. Сам Пятро Кірылавіч быў родам з вёскі. Да таго ж у мінулым камсамольскі актывіст. І параўнаўча яшчэ малады. Аднак выбіўся, што называецца, у людзі — доктарскую абараніў, прафесарам стаў.

Яго, Пятра Кірылавіча, і парэкамендаваў — хутчэй за ўсё параіў Арцёму Гаўрылавічу ўзяць на вызваленую пасаду Андрэй.

— Ці можаш ты пры патрэбе на яго ўплываць? — спытаў даверліва Арцём Гаўрылавіч у Андрэя.

— Хто яго ведае,— пацінуў плячыма ён, Андрэй.— Здаецца, што так...

— Ну, глядзі, каб наадварот усё не было. Бо параім, вылучым... А потым — не рады будзем...

— Не, Пятро Кірылавіч — хлопец свойскі, згаворлівы.

— Трымай яго ў полі зроку, не адпускай ад сябе. Гэта, вядома, калі на пасадзе ён апынецца. Я са свайго боку зраблю дзеля гэтага ўсё, што ў маіх сілах...

І зрабіў. Пятро Кірылавіч, хоць быў быццам і вучоны, аднак, як хутка выявілася, аказаўся не тым чалавекам, які дзеля навукі ахвяруе ўсім. Хутчэй за ўсё ўся яго навука была якраз дзеля таго, каб заўважылі, вылучылі. І на пасаду пайшоў, як кажуць, з подбегам. І ўжо праз які месяц сядзеў у кіраўнічым крэсле так, быццам у ім нарадзіўся. Трэба было — лістам слаўся, салодзенькім, ліслівым галаском не гаварыў, а мяўкаў, трэба было — крычаў, лаяў. Ды як, як! Проста фантаніраваў. Адкуль толькі і словы ў яго браліся. Прычым не глядзеў, хто перад ім — старэйшы, больш заслужаны таварыш ці малады. Важна Пятру Кірылавічу было адно — вышэй ці ніжэй за яго чалавек па службе. З Андрэем ён падтрымліваў быццам сяброўскія адносіны. Праўда, і не набліжаў вельмі да сябе, трымаў яго на пэўнай адлегласці.

— У нашай кіраўнічай справе сяброў быць не можа,— сказаў, прызнаўся ён неяк у хвіліну шчырасці Андрэю.— У нас могуць быць спадарожнікі. На пэўным этапе, у пэўных акалічнасцях мы можам быць заадно, а ў некаторых выпадках—і не пагаджацца, а то стаць і праціўнікамі. Нічога не паробіш. Калі садзішся гуляць у карты, трэба прымаць правілы гульні. А яны бываюць часам жорсткія. І ты не крыўдуй, калі дарогі нашы раптам разыдуцца. Значыцца, інакш нельга, так трэба!

Яшчэ са школы заўважыў Андрэй, што малыя ростам людзі заўсёды хочуць быць трошкі вышэй, чым яны ёсць на самай справе. Пятро Кірылавіч таксама не ўдаўся ростам. Аднак ён не толькі хацеў быць вышэй за сябе ў росце, але і ва ўсім. Банапарцікам іншы раз імкнуўся выглядаць. Была і яшчэ адна цікавая ў яго рыса — гаворыш нешта яму сваё, ён слухае, маўчыць, а то і не згаджаецца. А праз

дзень-два паўтарае то самае табе быццам ужо сваё. Нават калі ты згаджаешся, даказвае, пераконвае.

— Дык гэта ж я вам казаў,— неяк не вытрымаў Андрэй.

— Ты? — здзівіўся, аж пакрыўдзіўся Пятро Кірылавіч.— Не можа быць, гэта мне самому ў галаву прыйшло. Ноч усю думаў...

І ў голасе, і ў паглядзе — непрыступнасць, адчужанасць: як, маўляў, ты можаш, хіба такія свежыя, думкі маглі калі-небудзь табе, казяўцы, у галаву прыйсці?..

Гэтым і карыстаўся ён, Андрэй. Калі што-небудзь хацелася правесці ў жыццё, гаварыў Пятру Кірылавічу. А той, параздумаўшы, іншы раз гэта выдаваў ужо за сваё. І праводзіў у жыццё...

Калісьці Пятро Кірылавіч аж залішне любіў заглядваць у чарачку. Напіваўся іншы раз так, што яго прыносілі на сабе сябры-сабутэльнікі дадому, на кватэру. Трапляў разоў колькі ён і ў выцвярэзнік, у міліцыю. П'янства і было прычынай таго, што камсамол выракся свайго актывіста. Цяпер жа, трапіўшы на пасаду, ён зусім перастаў піць, нават браць хоць кроплю ў рот.

— Алергія ў мяне да гэтага зелля,— казаў ён тым, хто хацеў пасядзець з ім дзе-небудзь у ціхім, нявідным, утульным месцы.

І на ўсіх прыёмах, розных застоллях і вечарах піў толькі мінеральную ваду.

З яго, вядома, пасмейваліся, асабліва тыя, хто неаднойчы бываў з ім раней у самых неверагодных кампаніях. Але ён вытрымліваў смяшкі, расказваў пры выпадку, як сам калісьці «закладваў».

— І каб не гэтая праклятая алергія, хіба ж бы я адмовіўся! — казаў ён і ўсміхаўся.

Сёй-той яму верыў. А сёй-той і сумняваўся. «Няйнакш пад коўдрай, у пасцелі п'е. Пасаду баіцца страціць»,— кпілі з яго.

Калі выйшла вядомая пастанова аб барацьбе з п'янствам, тыя, хто не злоўжываў асабліва чаркай, але і не цураўся вельмі яе, пры выпадку маглі перакуліць, асушыць, кпілі адзін з аднаго:

— Што ж, Пятрамі Кірылавічамі станем. Нічога, не памром, жыць будзем. Як і ён жыве.

Перабудова, абнаўленне пасеялі ў душы Пятра Кірылавіча пэўныя надзеі. Справа ў тым, што непасрэдны яго начальнік даўно быў пенсійнага ўзросту. Але трымаўся на

пасадзе дзякуючы сваім сувязям. Умеў ён у патрэбны час з'явіцца ў патрэбным месцы, прычым якраз тады, калі яму трэба было з'явіцца, каб выратаваць становішча. І яго цанілі. А Пятро Кірылавіч быў чалавек вучоны, са званнем. І, вядома ж, прэтэндаваў заняць месца вышэй. Між двума кіраўнікамі вялася ўпартая, зацятая і жорсткая барацьба. Стары, больш вопытны, хоць і пенсійнага ўзросту, не хацеў саступаць нікому свайго месца, імкнуўся ўсімі сіламі пасядзець яшчэ некаторы час сам на ім, пакіраваць, а малады, гарачы і менш спрактыкаваны, але з пэўнай хваткай усяляк выжываў яго, падседжваў, нават, як некаторыя казалі, пацішу пісаў на свайго начальніка ананімкі. У гэтай барацьбе са сваім непасрэдным начальнікам Пятро Кірылавіч хацеў абаперціся і на яго, Андрэя, ведаючы, што ён калі не ўсё, дык многае можа зрабіць праз Арцёма Гаўрылавіча. І ў некаторыя перыпетыі гэтай барацьбы са сваім непасрэдным начальнікам так ці інакш пасвячаў Андрэя. Андрэй рабіў свае вывады — не дапамагаў ні таму, ні другому, бо бачыў — гэта барацьба не за справу, а толькі за сябе, за месца, за пасаду. «Счапіліся, як павукі ў слоіку»,— думаў іншы раз ён, сустрэўшыся з Пятром Кірылавічам і выслухаўшы яго. І не казаў нічога Арцёму Гаўрылавічу. Ды і што было казаць? Чым далей ішоў час, тым Андрэй бачыў, адчуваў: памыліўся ён, назваўшы Пятра Кірылавіча пры вылучэнні на пасаду. «Няхай бы лепш лекцыі студэнтам чытаў. Карысць была б хоць якая. А то прысмактаўся, бы смоўж, да кіраўнічага крэсла, у барацьбу яшчэ за большае ўключыўся. Так і загіне, бедалага, у гэтай барацьбе. А калі і не загіне, выб'ецца, зойме яшчэ большае крэсла — карысць якая з яго... Справе, грамадству, народу? Ды і мне, калі на тое пайшло...»

Аднак адносіны з Пятром Кірылавічам ён, Андрэй, не парываў, падтрымліваў, наколькі можна было іх падтрымліваць. Праўда, калі Арцёма Гаўрылавіча правялі на пенсію, Пятро Кірылавіч сам пачаў пазбягаць сустрэч з ім, Андрэем, не клікаў больш яго на пагулянкі вечарам. Ды і званіць перастаў. Цяпер ужо ён, Андрэй, званіў Пятру Кірылавічу, калі што трэба было. Нешта новае і ў голасе ў Пятра Кірылавіча з'явілася, калі ён размаўляў з Андрэем. Ці то халадок, ці то сталь, ці то абыякавасць, быццам адчужанасць. А можа, гэта толькі здавалася так яму, Андрэю? І звязана было не з тым, што выправілі на пенсію Арцёма Гаўрылавіча, а з нечым іншым? Чутка ж пайшла, што прайграў Пятро Кірылавіч барацьбу за вышэйшае

крэсла. Новыя кандыдатуры на гэтае месца ўзніклі. Больш таго, ці ўседзіць на сваім месцы і сам Пятро Кірылавіч. Па-першае, ідзе перабудова, абнаўленне, і могуць яго таксама замяніць. Па-другое, быццам яго непасрэдны начальнік, на месца якога ён прэтэндаваў, так абняславіў свайго падначаленага, вылажыў такія факты, што... Таму лепш за ўсё самому заяву падаць і пайсці з працы. Так што быццам сустрэцца трэба было ім — Андрэю і Пятру Кірылавічу, парузумецца, перагаварыць пра тое-сёе.

«Але што гэта дасць? — усумніўся раптам Андрэй у патрэбе такой сустрэчы, такой размовы.— Ці адкрыецца, скажа ўсю праўду пра сябе Пятро Кірылавіч? Ды і мне... Ці варта адкрывацца, гаварыць пра сябе ўсю праўду? Раней, калі ўзнікалі скрутныя сітуацыі, Пятро Кірылавіч абяцаў: «Не бойся, прыкрыю». А то і дапамагчы збіраўся. Але ні разу так і не прыкрыў, не памог... А цяпер, калі няма на пасадзе Арцёма Гаўрылавіча... І пагатоў нічым не паможа. Ды і не трэба мне яго дапамога. Тым больш што мне... Быццам нічога ніадкуль і не пагражае... За пасаду я не трымаюся, а ўсё астатняе... Пражыву як-небудзь...»

Вярнуўся да стала, сеў у крэсла.

«Ну а калі не з Пятром Кірылавічам, дык з кім сустрэцца, пагаварыць пра тое, што душу вярэдзіць, жыць проста не дае?»

Пачаў перабіраць у памяці людзей, каго ведаў, з кім быў быццам у добрых, шчырых, амаль сяброўскіх адносінах. Здаецца, і нямала такіх было, і нямала з кім сустракаўся ён, Андрэй, і па рабоце, і ў застоллях, ды і на розных нарадах, а то і на дачы, на вуліцы. Аднак каб былі сярод іх сябры, якім можна было б даверыцца, адкрыць душу... Не, такіх не было.

«Як адзінока я жыў! Ды і не так, не так, як трэба было жыць. Школьныя, студэнцкія сябры амаль усе мяне пакінулі, а новых, надзейных, не займеў. І не імкнуўся да гэтага. Праца, дамоўка, дача... Ды і Алачка цягнула. Прыемна было быць з ёю, не адпускаць ад сябе. Бо ў яе таксама, як выявілася, ні сяброў, ні сябровак вельмі не было...»

«Па-іншаму, па-іншаму трэба было мне жыць!»

«Ага, трэба было. Аднак... Я жыў так, як жылося. Не лепшым чынам, вядома, жыў...»

«Што ж, яшчэ не позна па-новаму пачаць...»

«Позна не позна, а пачынаць давядзецца. Бо жыць так, як жыў...»

Зазваніў тэлефон, і Андрэй падняў трубку, паднёс да вуха.

## 5

Званіў якраз Пятро Кірылавіч. «Нешта здарылася, калі сам звоніць»,— падумаў Андрэй і, прыклаўшы трубку да вуха, пачаў слухаць. Адразу ж быццам холадам дыхнула — голас быў чужы, раздражнёны. Ні вітання, ні прывітання. Пятро Кірылавіч браў, што называецца, быка за рогі.

— Не думаў я, браток, што ты такое балота вакол сябе развёў... Ды і сам... На дно апусціўся... Як ты дажыў да такога?

— Вы пра што, Пятро Кірылавіч? — сказаў Андрэй і адчуў, як часта і трывожна забілася ў грудзях сэрца.

— Скарга на цябе паступіла.

— І што там?

— Усё, чым ты жывеш і што робіш. Нават донжуанскія подзвігі...— нядобра, зласліва хіхікнуў Пятро Кірылавіч.

— І хто яе напісаў?

— Няма цяпер дурных падпісвацца. Ананімка. Будзем ствараць камісію, правяраць. Так што рыхтуйся.

— Можа б, прачытаць мне тую... скаргу?

— Прачытаеш, пазнаёмяць цябе. Падзаляцеў ты, браток. Нябось ведаеш, як да маральнага ўзроўню кіраўніка ставіцца пачалі... А тут яшчэ сваяцтва... Ды і не перабудаваўся ты, па-старому працуеш... Ніякага абнаўлення...

— Можа б, сустрэліся, пагаварылі? — кідаў адну за адной прапановы, як бы прасіў, хутчэй механічна, чым усвядомлена, Андрэй.

— Няма, браток, калі. Працы па вушы. Ды, шчыра кажучы, пра што нам з табою гаварыць? Лепш думай, як і чым апраўдвацца перад камісіяй. Хоць... Як ты апраўдаешся? Проста давядзецца, мабыць, прызнаць усё, што напісана... З гэтага зробяць адпаведныя вывады. І ўсё. Будзь здароў.

Пятро Кірылавіч паклаў трубку. Але перш, чым ён гэта зрабіў, Андрэй улавіў у яго голасе як бы здаволенасць, радасць.

«Чаму б гэта ў яго? — падумаў.— Здаецца ж, я яму нідзе дарогі не перайшоў, вады не замуціў, зла не зрабіў, нават не жадаў, не зычыў. Няўжо з-за таго, што яшчэ аднаго як бы канкурэнта не будзе? Ці, можа, што не на яго ананімка тая, а на мяне?»

І тут жа думкі пераскочылі на іншае — успомніўся сённяшні сон.

«Вось ён, у руку, як кажуць...»

Было горка, прыкра — не па сабе. І што Пятро Кірылавіч гаварыў як з чужым, нават скаргу не даў прачытаць, каб падрыхтавацца да адказаў, сустракацца не захацеў, і што раней не паспеў заявы на звальненне падаць — цяпер падавай не падавай, усё адно зняслаўлены... Абароны шукаць?.. Але дзе, у каго? Дый навошта?.. Надакучыла ж, абрыдла жыць і працаваць так, як жыў і працаваў.

Быць у кабінеце, сядзець за сталом стала невыносна. Хацелася бегчы, ляцець, уцякаць... Куды — Андрэй не ведаў... І, не могучы сябе стрымаць, зваладаць з тым, што раптам звалілася, нахлынула на яго, выклікаў машыну і, нічога нікому не кажучы, заспяшаўся да лесвіцы, пачаў як не бягом спускацца па ёй уніз, да выхаду.

## Іра

### 1

Толькі сеўшы ў машыну і ўбачыўшы запытальны позірк шафёра — Васі, які гады два як вярнуўся са службы ў арміі, дзе таксама вазіў нейкага начальніка,— Андрэй падумаў: «І праўда — куды ехаць?»

Хацелася пабыць аднаму. І не ў горадзе, а дзе-небудзь на прыродзе, у лесе. Як бываў некалі, у маленстве. Тады, калі яго хто крыўдзіў, ён заўсёды ўцякаў з дому ў лес. І там, прыхінуўшыся плечуком да камля дрэва, даваў волю і сваім думкам, і слязам.

— Паедзем у лес! — сказаў, не падымаючы вачэй, шафёру.

— На дачу? — не зразумеў той.

— Ды не, куды-небудзь у іншае месца. Каб пабыць аднаму, пахадзіць.

Шафёр пацепнуў плячыма, але выруліў машыну на дарогу, паехаў па ёй. Праўда, паволі, няхутка.

— Можа, на возера? — спытаў праз некаторы час нясмела.

— Не, далей. Давай,— успомніў раптам Андрэй, куды яго цягне, куды трэба ехаць,— пад Сёмкаў Гарадок. Помніш, неяк увосень па грыбы ездзілі.

— А-а,— здагадаўся шафёр і націснуў на газ, паддаў хуткасці.

Замільгалі ўзбоч дрэвы, людзі, дамы. Машына выскачы-

ла ў поле — ужо бясснежнае, месцамі пааранае, а то і зялёнае — ажывала, пачынала ўбірацца ў сілу, гусцець рунь.

«Зноў скарга-ананімка... Якая па ліку?.. Цікава, хто іх піша?.. Няўжо я камусьці замінаю жыць так, як ён хоча, не даю?»

Потым раптам, як гэта здаралася часта ў яго ў хвіліны ўзрушэння, думкі пераскочылі на іншае. Успомнілася, як жыў у вёсцы і душа яго рвалася ў горад,— здавалася, цікавейшага, прыгажэйшага месца для жыцця няма на свеце. Таму і вучыўся, таму і імкнуўся так трапіць у горад.

«І вось у горадзе я. Універсітэт скончыў... Жаніўся... Кандыдатам навук стаў. Жыву, працую... І гарадское жыццё спазнаў, зведаў. Можна сказаць, спаўна спазнаў і зведаў. Аж надакучыла, моташна. Знешне ўсё быццам прызваіта, прыстойна. А ўнутры... Злагады няма. І радасці таксама. І хто, хто вінаваты ў гэтым? Няўжо я сам? Усе баяліся браць замуж Алу, а я асмеліўся, узяў. А гэтага якраз, мабыць, і не трэба было рабіць...»

«Але ж я кахаў Алу, падабалася яна мне. Хіба гэтага мала?»

«Відаць, мала. Акрамя кахання, штосьці яшчэ павінна быць. Каб яднала, памагала пераджываць нягоды. Мэта павінна агульная быць. Ды і павага адно да аднаго, разуменне...»

«Напачатку ўсё гэта быццам было. І яго б развіваць, узбагачаць, паглыбляць...»

«Мусіць, так яно б і было, каб мы з Алай адны жылі, не разам з яе бацькамі. А то... Пад уладу Эльвіры Барысаўны трапілі. І яна, ды і я... А пачаў не згаджацца, дык... Чужы, нялюбы стаў. Ала бачыла, як Эльвіра Барысаўна патурала мужам, і яна гэтак жа ім, Андрэем, захацела камандаваць, патураць... А ён, Андрэй, не паддаўся. Адсюль і разлад, канфлікт...»

«Можа, яшчэ ўсё абляжацца, наладзіцца...»

Хвіліну-другую засяродзіўся на гэтым, думаў.

«Не, нічога не абляжацца, не наладзіцца,— як бы падсумаваў, падбіў бабкі Андрэй.— А калі б нават і аблеглася, наладзілася, жыць так, як жыў... Не, агоркла, абрыдла. Ды і не ўдасца... Ананімка тая,— успомніў ён раптам.— Праверкі пачнуцца, гутаркі то з адным, то з другім... І каб жа не было за што зачапіцца, да чаго прыдрацца... А то ж... І на працу абы-каго я набраў, не ўстояў, паддаўся на ўгаворы Эльвіры Барысаўны, Алы, ды і іншых людзей...

І перабудовы ніякай не пачынаў... Ды і калі пачынаць, то пачынаць яе трэба, вядома ж, з сябе...»

«З Ірай варта развязацца»,— як бы падказаў яму хтосьці.

«Так,— згадзіўся адразу ж, без ваганняў, пярэчанняў, Андрэй.— Але як, як гэта зрабіць? Іра ж... Пабудзеш з ёй — і як бы памаладзееш, нанова на свет народзішся. Жыць без яе — сумна, нецікава. Праца, дамоўка, дача... Увесь час сам з сабою, са сваімі думкамі. А Іра... Нібыта з іншага свету. І нічога ніякага ў мяне не патрабуе. Радая, што прыеду, пабуду з ёю хоць нейкі час. Ды і жанчына яна... Не, не параўнаеш, не параўнаеш з Алаю. Пабыць з ёю — гэта прыемнасць, радасць».

«А можа, не ў лес, а да Іры паехаць? Расказаць ёй пра ўсё?.. Бо ў лесе цяпер... Што там? А з Іраю... Заўсёды добра. Нават калі нічога не гаворыш — маўчыш...»

«Але Іра ж не дома... На працы...»

«Хіба... Вярнуцца, пазваніць?»

«Не, нядобрая гэта прыкмета — вяртацца... Ды і ехаць з раніцы да палюбоўніцы, калі ўсе працуюць... Пасля ананімкі...»

«Усё адно ўжо... Ведаюць і так пра Іру... «Донжуанскія справы»... Вядома, што меў на ўвазе Пятро Кірылавіч... Ніякіх іншых жанчын у мяне не было. І няма. Іра, адна Іра...»

...З Іраю ён, Андрэй, пазнаёміўся выпадкова. Ехаў у камандзіроўку — у Маскву. І яна таксама туды ехала. Сустрэліся ў вагоне, у купэ. Той таварыш, з якім Андрэй меўся ехаць, нечакана захварэў. І яго жонка прадала ў апошнюю хвіліну білет. А Іра — так звалі тую, што зайшла ў купэ перад самым адыходам цягніка,— яго купіла. Вядома, яна разгубілася, убачыўшы аднаго мужчыну ў купэ і даведаўшыся, што толькі ўдваіх будуць ехаць. А потым, калі ён дастаў бутэлечку каньяку, закуску, неяк быццам паспакайнела.

— Я ўпершыню ў такім купэ еду, нават не ведала, што такія, на два месцы, ёсць,— прызналася яна.

— Ёсць, начальства прыдумала, каб разам з народам не ездзіць, не чуць, што гаворыць,— пажартаваў ён.— Удваіх — гэта не ўчацвярых... Вальней можна сябе паводзіць. Ды і адпачыць, паспаць можна.

— А я думаю, чаму раптам білет даражэйшы, чым я заўсёды плаціла?..

Пачакаўшы трохі, Андрэй прапанаваў выпіць па чарачцы за знаёмства.

Іра згадзілася. Праўда, больш піць не стала, наадрэз адмовілася.

— Мяне ў Маскве чакаюць не зусім прыемныя справы... І мне трэба быць у форме,— сказала яна.

— Якія такія «не зусім прыемныя справы»? — спытаў ён.

Іра — чарнявая і надта ж выхаваная, далікатная, да таго ж зусім маладая — закусіла ніжнюю губу. Няйнакш вагалася, прызнавацца, расказваць пра ўсё шчыра яму, выпадковаму чалавеку, ці ўсё ж лепш памаўчаць, не прызнавацца.

— Ну, калі нельга... Не трэба...

— Не, чаму ж...

Іры і самой, мабыць, карцела, рупіла расказаць, падзяліцца, што ў яе на душы, што хвалявала. І яна расказала. Няўмела, збіваючыся, пераскокваючы з аднаго на другое. З усяго яе апавядання Андрэй зразумеў вось што. У Іры ёсць муж. Ён вучыцца ў Маскве. У аспірантуры. І там... Завёў сабе жанчыну. Жыве з ёю. І яна, Іра, едзе, каб злавіць мужа, што называецца, на месцы злачынства.

— Навошта вам гэта? — здзівіўся Андрэй.

— Як гэта навошта? — успыхнула, зачырванелася Іра.— Ды я яго пасля гэтага... На парог да сябе не пушчу!

— Дык і не пускайце! Але навошта ўніжаць сябе, лавіць... Аб'явіце, скажыце яму, што вы ўсё ведаеце, і... Астатняе рабіце, як вам захочацца,— параіў ён Іры. Але праз хвіліну засумняваўся ў правільнасці сваёй парады.— А, урэшце, чужую бяду, кажуць, пальцам развяду...

Доўга ў той вечар яны не клаліся спаць, гаварылі, Андрэй расказаў пра сябе. Шчыра, без усякай утайкі. Іра таксама расказала пра сябе. Была яна дачкою настаўнікаў. Скончыла політэхнічны інстытут, працавала ў архітэктурным упраўленні. Работу сваю любіла. І мужа, Алеся, таксама кахала. Думала, пражыве з ім жыццё. А ён, ледзь толькі ад'ехаўся, да другой падлабуніўся, на яе, жонку, забыў...

Іра плакала, ёй было крыўдна. Андрэй быў старэйшы за Іру. І мужчына. Таму супакойваў яе як мог. Нават узяў быў абняў, прыгарнуў да сябе. Іра не супраціўлялася. Наадварот, сказала, прыгразіла быццам:

— Вось паеду, пераканаюся, калі ён так... То і я загуляю... Нечага, некаму будзе мне сябе берагчы...

Іра была прывабная. І з твару, і станам, і так, наогул... Нідзе нічога лішняга, адна дасканаласць, і толькі. І калі

гаварыла, хацелася слухаць, не зводзіць з яе вачэй.

Уранні, калі расставаліся, Іра спытала ў Андрэя:

— Вы дзе, у якой гасцініцы будзеце жыць?

Андрэй назваў.

— То я ўвечары прыйду да вас,— паабяцала яна.— Калі, вядома, праўда тое, што мне напісалі...

І прыйшла. Андрэй, каб хоць трохі супакоіць яе, зноў дастаў каньяк. Гэты раз Іра піла, прычым многа. Больш нават за яго. І ў пасцель да яго лягла. Сама.

Але Андрэй не дазволіў сабе ў тую ноч нічога лішняга, хоць Іра гатова была на ўсё. Нават патрабавала.

— Супакойцеся, не гарачыцеся...

Уранні Іры няёмка было за свае паводзіны. Андрэю таксама — думаў, пакрыўдзіцца на яго Іра. Бо быццам не зусім па-мужчынску паступіў ён з ёю. Іншы б на яго месцы не губляўся. А ён...

Больш за тыдзень жыў у Маскве ў гасцініцы Андрэй. І ўвесь гэты час жыла ў гасцініцы разам з ім Іра. Ёй у Маскве проста не было дзе спыніцца. А ехаць назад, дадому, не хацелася. Што было рабіць там, адной? Ды яшчэ ў такім стане? Калі ж вярнуліся дадому, у Мінск, Андрэй пачаў наведвацца, бываць у Іры на кватэры. Спярша заязджаў, каб пагаварыць, суцешыць. Ну а потым...

З мужам, Алесем, Іра парвала ўсякія адносіны. Нават на скасаванне шлюбу заяву падала... А ён, Андрэй... Не тое што закахаўся ў Іру, а як бы прывык. Лічыў ужо за абавязак наведаць яе ледзь не кожны дзень, пагаварыць, пабыць разам. Адносіны свае яны не высвятлялі. Ім удваіх было добра, і яны даражылі гэтым. У Іры былі свае прычыны быць нездаволенай мужам, у яго, Андрэя,— жонкаю. Калі ж бывалі разам, на ўсё, на ўсё забываліся. І ў гэтым было іх шчасце, іх радасць...

...«Цікава, як бы прарэагавала Іра, каб даведалася, сказаў я ёй, што збіраюся пакінуць жонку? Ды і працу заадно,— падумаў Андрэй.— Узрадавалася б ці, наадварот, засмуцілася б?»

Машына ўехала ў лес. Замільгалі камлі елак, асін, бяроз, дубоў. Дрэвы былі яшчэ голыя, нішто нідзе не зеляніла. Хіба елкі ды сосны. Але яны зялёныя заўсёды, нават зімою. Праўда, снегу і ў лесе нідзе ўжо не было. На ўзлобках-узбочынах, на санцапёку дзе-нідзе прабіваўся, вылазіў кураслеп. А ў арэшніку раптам засінела нешта, быццам вада — лужына ці азерца. Не, гэта былі пралескі. І многа-многа. Цэлая лапіна-прагаліна.

— Спыніся,— сказаў Андрэй шаферу і, як толькі той затармазіў, з'ехаўшы на абочыну, вылез з машыны і пайшоў па мяккім, яшчэ не падсохлым, мокрым леташнім лісці проста туды, дзе блакітнелі, сінелі пралескі, дзівячыся, як ціха ў лесе — птушкі і тыя маўчалі, яшчэ, можа, і не прыляцелі.

## 2

Не, ён памыліўся. Лес ужо жыў сваім актыўным, багатым вясновым жыццём. Стракатала сарока, чэкаў дзяцел. Ды і дрозд абзываўся ў хвойніку. Гугалі галубы. Нават мурашнік, што трапіўся на вочы, і то варушыўся — выпаўзалі, грэліся на сонцы пакуль яшчэ надта ж павольныя і вялыя пасля зімовай спячкі мурашкі. Цёк сок-бярозавік, і свежыя бярозавыя пні былі мокрыя, быццам іх хто знарок паабліваў вадою.

Згадалася, успомнілася: ён, Андрэй, некалі любіў гэтую раннюю вясновую пару. І нецярпліва яе чакаў. Як толькі сыходзіў снег — спяшаўся ў лес. Падсякаў тоўстую карыстую бярозу, што расла на ўзлеску, пускаў сок. І насіў яго дадому вёдрамі, зліваў у бочку. У гэтую бочку маці кідала падсмажаны ў печы хлеб, сыпала ячмень. І сок настойваўся так тыдняў колькі. А потым пілі яго, халодны — аж зубы ламала,— варылі квасоўку...

Не толькі бярозавік цягнуў, вабіў Андрэя. Цягнуў, вабіў сам лес. Без яго Андрэй проста не ўяўляў свайго жыцця. Лес акружаў вёску, у якой ён, Андрэй, нарадзіўся, з усіх бакоў. І ніколі не маўчаў — заўсёды шумеў. Улетку і ўзімку, вясною і ўвосень. То тужліва, гнеўна, то лёгка, бесклапотна, амаль весела. У лес Андрэй бегаў па шчаўе і ягады, па грыбы і арэхі, па жолуд і лісце на подсціл карове, ездзіў па дровы і жэрдкі на плот. Цяпер, вядома, лес ужо не той, што быў. Некалі ён гаманіў з небам. А якія высозныя, стройныя раслі сосны, ясені! Шапка звальвалася, калі задзіраў галаву — хацеў паглядзець на вяршыню! Ды і дубнякі, беразнякі якія былі! На некалькі кіламетраў як веяныя стаялі — бярозы — дык бярозы, дубы — дык дубы! І арэшыны выраслі такія, што не нагнуць — лезці як на дрэва трэба было, каб дастаць арэхі. Заглыбішся выпадкам у нетры, непралазь — неба не відаць. І канцакраю нідзе. Можаш дзень ісці, два, тры... А колькі птушак, звяроў самых розных пладзілася! Не злічыць... Здавалася, вечна было тут так, вечна так і будзе. Аж не. Асушылі

балоты, спрамілі рэчкі і рачулкі, пракапалі канавы, пракладзі дарогі. І лес проста на вачах пачаў знікаць — яго валілі, рэзалі, тралявалі, вывозілі да чыгуначных станцый. Гупалі, падалі вобземлю дубы, бярозы, сосны, кляны, ясені. Адну дзялянку агалялі, браліся за новую... Нішчыўся маладняк, палілася галлё, усё, што дзе ні расло, цвіло. Сыходзілі немаведама куды дзікія звяры, прападалі птушкі...

«Не тое, не тое цяпер Палессе,— шчымела, як ад болю, у Андрэя сэрца, калі ўспамінаў свае наезды дадому, у вёску.— Раней лясы нішчылі... А цяпер за балоты ўзяліся... Экскаватары, бульдозеры, скрэперы пераварочваюць усё, што вякамі некранута ляжала. Пракладваюцца каналы, з багны, непралазі палі, лугі робяцца... А да чаго гэта прывядзе? Нельга ж вымяраць усё толькі карысцю, выгадаю. Ёсць яшчэ і тое, без чаго быццам шчасце і радасць — не шчасце, не радасць. Ну хоць бы гэтая самая кветачка, пралеска. Няма яе — і вясны быццам няма...»

Стаяў Андрэй у лесе, глядзеў на пралескі, што, нібы кавалачкі неба, сінелі тут і там, любаваўся імі.

«Хіба ўзяць ды букецік нарваць? Іры завезці,— прыйшло ў галаву.— Яна, напэўна, яшчэ і не ведае, што пралескі зацвілі. Ды і я не ведаў бы, каб у лес не паехаў».

І зноў паплылі ўспаміны — пра родныя мясціны — Палессе, пра маці, Іру...

«Якое ўсё ж дзіўнае жыццё,— думаў Андрэй.— Жыў я ў вёсцы — душа ў горад іrвалася, туды, дзе я не быў і куды так хацелася. Зараз жыву ў горадзе — душа ў вёску рвецца, на Палессе... Чаму ў мяне такая дваістасць? І не толькі ў гэтым, а ва ўсім... З Алай жыву, а душа рвецца да Іры... Працую на адказнай пасадзе, а хочацца вызваліцца ад яе, быць не начальнікам, а проста чалавекам, вучоным. Няўжо ва ўсіх так? Ці толькі ў мяне?»

«Гэта, мусіць, таму, што няправільна жыву. Заблытаўся ў цянётах. А парваць іх... Сілы не хапае, рашучасці... Не за сваё я ўзяўся».

«А што сваё, правільней, тваё?»

«Сказаць так адразу — не скажаш. Але што не маё ўсё тое, што раблю, чым жыву,— гэта факт... І Эльвіра Барысаўна, і Ала, і іх кватэра, дом... Ды і праца. Колькі памучыўся, пакуль прывык не рабіць, а вырашаць... А рашэнні гэтыя не што іншае, як бюракратычныя рагаткі. Бо як жа рашаць, калі не ведаеш думкі тых, хто над табою? А тыя, хто ніжэй па службе, таксама нічога не рашаюць. Яны на

мяне спадзяюцца, а я на тых, хто нада мною. У выніку — усё адкладваецца, чакаецца, пакуль нехта зверху не скажа, што і як рабіць... І з перабудовай гэтай. Гавораць, гавораць, а што канкрэтна рабіць — ніхто не ведае. Быццам — сам думай, рашай... А паспрабуй рашы, ды яшчэ не так, як трэба?.. Вось усе і чакаюць указанняў зверху. Прывыклі ж так. А правільней — прывучылі... А перавучвацца... Ох, нялёгкая гэта справа. Ды і паспрабуй самастойнасць у чым-небудзь паказаць. Праверкі пачнуцца, высвятленні... Зацягаюць... І хто? Якраз тыя, хто ні пра якую перабудову не думае... На якое ліха здалося мне ўсё гэта?.. Пакіну пасаду і клопату ніякага мець не буду, буду жыць так, як хачу...»

«Э-э, надта ж ты хітры! А ці ведаеш, што так, як хочаш, жыць усё адно не будзеш... Тут ты слухаўся большых за сябе начальнікаў, там, ніжэй, будзеш слухацца меншых. Такога не бывае, каб нідзе нікога не слухацца...»

«З пасады ўсё адно пайсці давядзецца. Калі не па сваёй волі, дык прымусяць».

«Чаму гэта? Што ананімка паступіла?.. Дык не першая ж і, як у начальства кажуць, дай Бог, каб і не апошняя...»

«Тады мяне ратавалі. Арцём жа Гаўрылавіч, цесць, на пасадзе быў...»

«А адкуль ты ўзяў, што цяпер ратаваць не будуць? Можа, ананімка тая і напісана знарок, каб памяркоўны, больш пакладзісты быў, не такі яршысты, упарты. Каб слухаўся Эльвіры Барысаўны, Алы ды іншых. А то... Самастойнасць пачаў паказваць, непаслухмянасць... А гэтага не любяць. Любяць, каб начальнік быў рахманенькі, ціхенькі, зручненькі ўсім... І большаму начальству, і меншаму, і падначаленым... А тым больш сваім, сямейным... А можа, праверыць сёй-той хоча, ці моцна я сяджу? Як кажуць, пахістаць. Асабліва ў сувязі з адыходам на пенсію Арцёма Гаўрылавіча. І не здавацца трэба, не падымаць рук угору, а абараняцца...»

«Дзеля чаго абараняцца? Каб зноў на пасадзе сядзець, папіхачом у Эльвіры Барысаўны ды і ў іншых быць?»

«А калі заяву падам, атрымаецца ж, быццам мяне... Папрасілі, прагналі...»

«Ну і што? Розніца якая?»

«Усё ж... Сам пайшоў, не захацеў працаваць — гэта адно. І зусім іншае, калі мяне... Ну, папросяць, вызваляць... Можа, усё ж не пароць гарачкі, не спяшацца? Пачакаць, пакуль ананімку тую правераць, прысуд вынесуць?

А тым часам... Як іншае начальства робіць. У бальніцу схавацца, паляжаць. Ці... У адпачынак пайсці».

«У бальніцу схавацца? Але ж... Ніякай хваробы няма, хіба праверыцца. А ў адпачынак... Ранавата».

«Што значыць ранавата? Абавязкова на мора ехаць, у дом адпачынку? А калі да маці... У вёсцы пажыць... Паглядзець, што там цяпер і як... Працу новую падшукаць...»

«Вось гэта бадай што правільна. Бо так адразу ўсё кінуць-рынуць... І астацца без нічога... А так я... Тым часам і ананімку праверадь. Ды і Ала, Іра... Няхай без мяне пажывуць. А я — без іх. Разбяруся ў сваіх пачуццях. Бо тут... Знаёмае кола, часам механічна, як заведзены, кожны дзень паўтараеш тыя самыя хады...»

Думка — узяць адпачынак, паехаць да маці ў вёску здалася слушная. І так і гэтак паварочваў яе Андрэй у сваёй галаве, хочучы ўведаць, прадбачыць выгоды таго, што чакае яго, калі ён возьме адпачынак, з'едзе хоць на нейкі час з горада.

«Пагляджу, як там, дома, цяпер,— адвык жа я ад вёскі. Ды і па лесе пахаджу, абдумаю ўсё да драбніц. Часу ж будзе даволі... З начальствам калгасным пазнаёмлюся... Акунуся ў праблемы іхняга жыцця... Супастаўлю з тымі, што ў горадзе... І выберу тое, што трэба мне, што бліжэй... А то неяк па-дзяцінаму — падаць заяву і... Астацца без усяго ўсякага, з нуля, можна сказаць, жыццё пачынаць».

Нагнуўся, пачаў збіраць кветкі. Але рабіў гэта як бы механічна — галава была занята іншым,— уяўлялася, малявалася жыццё там, у вёсцы, на радзіме.

«Вуды куплю. На рыбалку хадзіць буду. Ды і праца. Дома, на матчыным падворку, у калгасе. А галоўнае — думаць, думаць... Думаць пра тое, як жыў і як трэба было жыць, а я...»

У вачах паўстала вёска — вялікая, з доўгаю шырокаю вуліцай, што цягнулася між балот і алешніку кіламетры на два і паабапал якой стаялі хаты, платы, сады... Родная, дарагая вёска, дзе знаёмы кожная сцежка, кожны пагорачак, кожная лапінка поля, лугу, лесу. Сходжана ж, стоптана ж, перамерана ж нагамі там уздоўж і ўпоперак усё-ўсё, і не раз, не два, а па сотні, тысячы разоў. Бо ён, Андрэй, гульма ніколі не гуляў, ніколі не цураўся працы — араў, баранаваў, абганяў бульбу, палоў грады і лён, пасвіў кароў, касіў, гроб сена, зносіў і звозіў снапы, салому. Як выдараўся вольны ад вучобы час — так і ішоў рабіць

работу. І людзі яго, Андрэя, пэўна ж, помняць, ведаюць. Ды і ён таксама людзей...

«Не тое, зусім не тое, што ў горадзе... Тут цябе ніхто не ведае і ты нікога. А там... І мяне, і маці маю ведаюць. Ды і бацьку, дзеда, бабу. Што мне, урэшце, трэба? Кавалак хлеба, конаўка малака. А ўсё астатняе, да чаго імкнуўся, да чаго рвалася калісьці душа... Зведаў ужо я, добра зведаў...»

Зрабілася неяк горка, сумна.

«Гэта ж трэба так змарнаваць столькі гадоў жыцця. І ад зямлі адарваўся, і неба не дастаў. А ўсё таму, што з жаніцьбай, працай не пашанцавала. Бяздумна я жыў, у будучыню не глядзеў. Далей носа свайго нічога не бачыў. А жыццё... Яно жорсткае. І памылак не даруе. Якіх бы і хто калі б ні рабіў... І думаць, ох як думаць трэба, перш чым што-небудзь рабіць... Нават — перш чым брацца рабіць... І гарачыцца, спяшацца...»

«Вось, вось... І таму... Не спяшайся падаваць заяву на звальненне, пакідаць дом Арцёма Гаўрылавіча... Падумай, добранька падумай, узваж усе «за» і «супраць».

«Будзе час падумаць. Месяц цэлы. Пайду ў адпачынак і... думаць буду... Ніхто, ніштo там мне замінаць не будзе...»

Зноў пачаў уяўляць сваё жыццё дома, у вёсцы. Уранні — снеданне, прыгатаванае мамай у печы. Дранікі ці аладкі, запсквараныя салам, з грыбамі булён, яечня, смятана... Нават не смятана, а зняты з гладышкі вяршок... На запітак — сырадой... Абед таксама дома, у матчынай хаце — упрэлая ў печы капуста, каша ці бабка... Работа ў полі, на лузе, у лесе. А ўвечары — тэлевізар, кнігі, газеты... Зрэдку — кіно...

«Што, што яшчэ мне трэба? Жыві ды радуйся».

«А Іра, Ала як жа?»

«Не прапалі, то і не прападуць... Ала хутка новага жаніха сабе знойдзе, замуж выйдзе... А Іра... Ці кахае яна мяне? Сышлася са мною, каб мужу адпомсціць... А як у яе з ім? Нічога, ані не гаворыць. Колькі ні спрабаваў хоць што высветліць... «Не псуй мне настрою»,— скажа. І заплача».

«Мусіць, мучыцца, перажывае, што не так, як хацелася, у яе ўсё склалася. Асабліва калі кахала, кахае яго...»

Паглядзеў на букецік пралесак — кволых, на тонкіх, амаль празрыстых, з пушком, ножках, якія нарваў, выбіраючы па адной самыя, як яму здавалася, лепшыя, прыгажэйшыя кветачкі. І быццам засаромеўся...

«Мне дарагія яны, бо маленства, дамоўку напомнілі... А ёй... Што я пра яе ведаю? Ды і ці каханне гэта ў нас?.. Сышліся пакрыўджаныя, неабагрэтыя... Як тыя крыгі ў крыгалом... Сышліся і, відаць, разыдземся...»

Пальцы неяк самі сабой расчапіліся, і кветкі адна за адной пачалі падаць са жмені на дол, на леташняе, мокрае, неабсохлае яшчэ пасля зімы лісце...

«Мабыць, правільна гэта... А то... Быццам пятнаццацігадовы юнак... Букецік пралесак нарваў... Расчуліўся...»

Павярнуўся і, не азіраючыся, хутка, амаль подбегам заспяшаўся да машыны.

## 3

Шафёр, наваліўшыся грудзьмі на руль, спаў.

«Цікава, што ён уночы робіць? Бо спаць, ды яшчэ з самай раніцы... Хаця... Малады ж, жаніўся нядаўна...»

Ляснуў дзверкай машыны, шафёр у тую ж хвіліну прахапіўся, залыпаў вачыма.

— Едзем,— сказаў Андрэй.

— У горад? — спытаў шафёр, заводзячы матор.

Андрэй кіўнуў галавою. І, як толькі машына развярнулася, выехала на асфальт, адкінуўся на спінку сядзення, заплюшчыў вочы, зноў задумаўся.

«Мусіць, правільна гэта — пайсці ў адпачынак. А там... Відаць будзе, што і як рабіць».

Уявіў, як узрадуецца маці, калі ўбачыць у хаце яго, сына, ды яшчэ пачуе, што прыехаў не на дзень, не на два, а на ўвесь месяц. Якраз жа вясна. «І соткі памагу пасеяць, ды і двор, хату, хлеў агледжу, да ладу давяду. А то... Каторы год ужо без мужчынскага вока, належнага догляду».

«Як памёр бацька, дык і...»

Успомніўшы бацьку, паківаў сумна-сумна галавою.

«Трэба было мне ўсё кідаць і ратаваць яго. У горад, да сябе прывезці, усіх, каго толькі можна, на ногі падняць, калі пачуў, што захварэў ён. А я... «Ці мала чаго жывот баліць?» Якраз жа на пасаду быў заступіў, то шчыраваў, ні на гадзінку нікуды не адлучаўся. А ў бацькі, як пасля выявілася, рак. Ніхто ніколі не хварэў на гэтую хваробу ў іхняй вёсцы, і раптам... Спахапіліся, ды... Позна ўжо было. Згас бацька за якога паўгода...»

«Помнік на магіле даўно трэба было б паставіць...»

Прыгадаў, як хацеў бацька вывучыць яго, Андрэя, каб не з працы рук хлеб еў, а з навукі.

— Можа, лягчэйшы, не такі горкі той хлеб будзе, як у мяне быў,— казаў бацька.— Бо я... Крывавым мазалём яго ўсё сваё жыццё зарабляў. То калектывізацыя была, то вайна, то пасляваенная безладзь... Вучыся, сынок, хоць ты пакаштуй іншага хлеба...

І нічога ані не шкадаваў, каб ён, Андрэй, вучыўся.

«А я, як памёр бацька, ні разу і на магілу яго не схадзіў...»

Прыкра, не па сабе на душы зрабілася.

«Няхай, цяпер схаджу... Якраз жа і Радаўніца будзе».

Успомніў — свята гэта спраўлялі ў іхняй вёсцы штовясну — хадзілі на могілкі сем'ямі — і старыя, і маладыя. Неслі з сабою гарэлку, віно, сыту, самую розную, якая толькі была ў каго, яду. І там, на могілках, наплакаўшыся і паўспамінаўшы ўволю нябожчыкаў, рассцілалі абрусы, раскладвалі, хто што браў, захапіў з дому. Частаваліся самі, частавалі і нябожчыкаў.

«Цікава, ці спраўляюць цяпер там, у нас, у вёсцы, радаўніцу? Многае ж, што раней было, забываецца, гіне, адыходзіць разам са старымі людзьмі. І не толькі прылады працы, але і звычаі. Вынішчэнне лесу, асушэнне балот далі Палессю зусім іншае жыццё. Ды і людзй новых шмат наехала. А яны... Не заўсёды ўспрымаюць тое, што вякамі сярод людзей тутэйшых было. Імкнуцца сваё, што ім блізка, што змалку засвоена, захаваць. І таму ў вёсцы... Цікава будзе за ўсім паназіраць... Ды і пажыць... Месяц, вядома, не такі вялікі тэрмін, але і яго даволі, каб сёе-тое ўбачыць, зрабіць высновы. Ды і разабрацца, што на душы, што ў думках. Бо тут, у горадзе, у штодзённай мітусні, клопаце...»

Адчуў — ён, Андрэй, стаміўся. Стаміўся ездзіць штодзень на працу і з працы, прымаць і выслухоўваць людзей, званіць то таму, то іншаму, адно ўзгадняць, другое «прабіваць», сядзець гадзінамі, а то і днямі на нарадах, рыхтаваць справаздачы і розныя дакументы, падпісваць іх. А галоўнае — стаміўся ад таго, што карысці, толку ва ўсёй гэтай мітрэнзе, мітусні не бачыў. Ды і адносіны ў сям'і, адносіны з Ірай — таксама стамлялі. Здаецца ж, і не стары яшчэ чалавек, а пачалася па начах бяссонніца...

«Вядома, калі няма злагады на душы, калі думкі, неспакой не пакідаюць ні ўдзень, ні ўночы — чаго ж іншага чакаць? І калі я не хачу атрымаць інфаркт ці інсульт... Трэба ратавацца. Завесці нармальную сям'ю, мець нармальную работу. Ды і жыць нармальна... Ва ўсякім выпадку не так, як жыву...»

Расплюшчыў вочы, паглядзеў, дзе едуць. Ехалі на полі, у калідоры бярозавых абсадаў. Бярозы былі яшчэ голыя. Праўда, голле іх набракла, пацяжэла — наліваліся, таўсцелі пупышкі. Дзень разгульваўся, набіраў сілы — адчувалася: спякота будзе зноў такая ж, як і ўчора, пазаўчора.

«Не па часе гэтая спёка. Каторы ўжо дзень. А яшчэ ж не адсеяліся. Дый зяляніны няма. Не, не на дабро гэта».

«А што на дабро? — узнікла ў галаве раптам думка.— Ала? Эльвіра Барысаўна? Іра? Ананімка? Ды і думкі мае пра пасаду, працу, сям'ю?»

Успомніўся выпадак — прыйшла да яго на прыём супрацоўніца ў першы ж дзень, калі яго прызначылі на пасаду. Маладая, мілавідная. Нават, як здалося, прыгожая. І расплакалася ў кабінеце, рады пачала прасіць, як ёй з мужам быць. «П'е ён, жыць не магу больш»,— прызналася яна. «Дык вы на скасаванне шлюбу падайце, разводзіцеся»,— параіў, нядоўга думаючы, ён. «А як жа дзіця без бацькі?» — узмалілася, аж загаласіла маладзіца. «Тады не разводзьцеся, жывіце».— «Дык жа жыць няможна!» — «Ну, а лячыць не спрабавалі?» — як за выратавальны круг ухапіўся ён, Андрэй. «Не хоча!» — «А вы ў міліцыю звярніцеся, сілаю забяруць, палечаць».— «А ён вернецца ды што са мною зробіць? Ён жа і забіць можа». І што б ён, Андрэй, ні раіў, у маладзіцы на ўсё гатовы адказ быў. Хоць у пятлю лезь, здавалася, выйсця нідзе ніякага не было.

«Так і ў мяне цяпер,— падумаў Андрэй.— Куды ні кінь — усюды клін. Дамоўка хіба адна асталася, вёска, маці... І трэба, мусіць, не марудзіць — загад на адпачынак напісаць, ускласці свае абавязкі на намесніка, Клінцова... Рамана Мітрафанавіча...»

Зноў як бы ачуўся, вочы расплюшчыў, успомніўшы свайго намесніка. Галавою ў такт сваім думкам-развагам паківаў.

«Цікавы гэты тып — Клінцоў. Культурны, далікатны, ветлівы, лагодны — хоць да раны прыкладай. Мухі, здаецца, і то не пакрыўдзіць. І рухавы, жвавы — усё ходзіць з кабінета ў кабінет, то да аднаго, то да другога. Гаворыць, шэпча. Аднаму адно, другому — другое. І быццам з усімі аднолькава шчыры. Паслухаеш яго — і яму нешта скажаш, адкрыешся. А ён, пачуўшы тое, што ты сказаў, далей панясе. І так цэлую мярэжу сплёў. Ды дзе сплёў — у яго ўсе людзі быццам марыянеткі,— ён тузае іх за ніткі, а яны... Робяць тое, што яму, Раману Мітрафанавічу,

трэба. І ўсіх трымае ў кулаку, у напружанні, бо не ведаеш, за якую нітку і калі ён каго пацягне. Не выключана, што і ананімкі не хто-небудзь, а ён папісвае... То на аднаго, то на другога. Дажыліся ж — ніхто шчыра праўды не гаворыць. Куды прасцей — ананімку напісаць. І на мяне, бачыш, зноў напісалі. Няйнакш Раман Мітрафанавіч шчыруе. Раней яму ўсё, што хацеў, удавалася. Быў звычайны супрацоўнік. Але вось паступіла ананімка на загадчыка аддзела, у якім працаваў Раман Мітрафанавіч. Ананімку праверылі, частка фактаў пацвердзілася. Загадчыка знялі. На яго месца прызначылі Рамана Мітрафанавіча. З год папрацаваў. Паступіла ананімка на намесніка дырэктара, які курыраваў аддзел Клінцова. Зноў — частка фактаў пацвердзілася, частка не. Але паколькі намеснік быў пенсійнага ўзросту, выправілі яго на пенсію. Месца намесніка заняў Клінцоў. Мабыць, «рука» ў яго недзе ёсць,— вёў свае думкі-развагі далей Андрэй.— Інакш не рухаўся б так імкліва наперад, не пракладваў бы, быццам палашом, ананімкамі сабе дарогі. А калі б і рухаўся, дык не такім шляхам. Цяпер вось рот разявіў і на маё месца. А што — Арцёма Гаўрылавіча няма, няма каму мяне бараніць, то чаму б і не паспрабаваць? Я пайду ў адпачынак і развяжу Клінцову рукі. А ён не паскупіцца, каб ачарніць. Ды і не «чысты» я».

«А хто бездакорны, не мае заган? Сонца — і тое, кажуць, з плямамі».

«Усё быццам так, правільна. Але... Заганы ад заган розняцца і плямы ад плям. Што ж да мяне... Сам бачу, не так я павінен быў жыць, як жыву, не такія павінны быць кіраўнікі, як я... І калі надумаў рашуча парваць...»

«Але ж гэта... Зусім развязаць рукі, адкрыць дарогу Клінцову?»

«Адкуль ты ўзяў, што Клінцоў зойме тваё месца? Ды і ананімка тая... Можа, хтосьці іншы яе напісаў, а не Клінцоў? Якія падставы, каб абвінавачваць? Інтуіцыя? Але ж інтуіцыя — не доказ. Гэта ўсяго толькі падазрэнне. А падазраваюць жа заўсёды найперш свайго непрыяцеля. А ён бывае і невінаваты. Ды і якая розніца, хто зойме тваё месца, прыйдзе табе на змену?»

«Усё ж лепей, каб добры чалавек прыйшоў. Бо калі прыйдзе горшы...»

«Не той цяпер час. Перш чым ставіць каго кіраўніком, думаюць, глядзяць з розных бакоў».

«Заўсёды глядзелі. А хто, якія выпадковыя людзі

траплялі на пасады? Потым іх абвінавачвалі, давалі вымовы, выключалі з партыі, некаторых судзілі... Але колькі бяды, непрыемнасцей яны паспявалі натварыць! А ўсё чаму? Таму, што галоснасці не было, шчырасці, праўду людзі развучыліся гаварыць адзін аднаму. Ды і ў людзей, з кім будучы кіраўнік працаваў, не пыталі, думкай калектыву пагарджалі. Вось і апыналіся ў кіраўніцтве выпадковыя людзі. Як, дарэчы, і я апынуўся...»

Машына ўехала ў горад — пачаліся скрыжаванні вуліц, семафоры, тармажэнні, потым раптоўныя рыўкі наперад, набіранне хуткасці, пераганкі. Андрэй, адкінуўшыся на спінку сядзення, чакаў, калі скончыцца дарога, язда, каб вылезці з машыны, падняцца ў свой кабінет і, не адкладваючы на заўтра, напісаць сёння ж загад на свой адпачынак.

## 4

Люся — Людміла Апанасаўна была на месцы, сядзела за сваім сталом. Але па яе выгляду адчувалася — яна нецярпліва чакае свайго начальніка — яго, Андрэя. І як толькі ён адчыніў дзверы, зайшоў у прыёмную, яна падхапілася, пабегла яму насустрач, зашаптала:

— Андрэй Анісімавіч, вас шукаў Дзямід Станіслававіч!

Дзямід Станіслававіч — гэта быў новы начальнік, якога прызначылі на месца Арцёма Гаўрылавіча. Андрэй яго трохі ведаў — сустракаліся на розных пасяджэннях, у розных прыёмных. Міла адзін аднаму ўсміхаліся, паціскалі рукі. Уласна, яны не залежалі адзін ад аднаго, і таму, як і звычайна ў такіх выпадках, лёгка было падтрымліваць між сабою добрыя чалавечыя адносіны. Дзямід Станіслававіч быў зусім малады, энергічны. Калісьці ён працаваў сакратаром райкома камсамола, потым пачаў, і даволі імкліва, рухацца па службовай лесвіцы вышэй. Гэтаму спрыяла не так уменне працаваць, як казалі, некаторыя знаёмствы з сім-тым, хто займаў больш высокае становішча. Да таго ж Дзямід Станіслававіч скончыў Акадэмію грамадскіх навук у Маскве.

— Сам званіў? — спытаў Андрэй.

— Сам. Праз некалькі хвілін, як вы паехалі. Сказаў, каб, калі вернецеся, пазванілі яму.

— Добра, добра,— на хаду адказаў Андрэй, кіруючыся ў свой кабінет.— Больш важных званкоў не было?

— Здаецца, не.

Зачыніў за сабою дзверы, зняў лёгкі летні плашчык, з якім не расставаўся, выходзячы на вуліцу вясною, павесіў у шафу, што была ўманціравана ў сцяну.

«Цікава, што яму трэба? — падумаў.— Відаць жа, размова тэт-а-тэт, калі званіў сам. Інакш сакратарка выклікала б. А можа — гэта новы стыль? Вядома, мне першаму трэба было яму пазваніць, павіншаваць з новай пасадай. Бадай, і пазваніў бы, калі б... Дзямід Станіслававіч не заняў пасады цесця — Арцёма Гаўрылавіча, а нейкую іншую. А так... Быццам няёмка было. Яшчэ за падхаліма палічыць. А цяпер, калі мінула некалькі тыдняў... Ці віншаваць яго, ці прамаўчаць?»

Прайшоў сюд-туд па кабінеце.

«Усё ж лепш, мабыць, павіншаваць. Бо інакш... Можа мяне няправільна зразумець. Урэшце, язык не адваліцца, калі павіншую. Тым больш не знарок жа я званю дзеля гэтага».

Падышоў да тэлефона, зняў трубку, пачаў набіраць нумар. І ўсё ж нешта стрымала яго. Набраўшы дзве лічбы, раптам паклаў назад на апарат трубку.

«Куды я спяшаюся? Падумаць трэба, што і як гаварыць. А тым часам... Іры пазваню. Можа, увечары заеду да яе».

Іра працавала непадалёку. У яе быў свой кабінет і свой тэлефон. Таму праблемы звязацца не было ніякай. Да таго ж яна заўсёды была вельмі дысцыплінаваная — амаль не пакідала свайго рабочага месца ў час працы — акуратна выседжвала тыя гадзіны, што належала. Ды і працы, як яна сама прызнавалася, хапала. Набраўшы нумар тэлефона, Андрэй пачуў знаёмы голас:

— Алё.

Ёкнула сэрца.

— Гэта ты? — расплыўся ва ўсмешцы Андрэй.

— Я,— адказала Іра. Але не так, як заўсёды — гуллíва, весела, а неяк стрымана, адчужана, нават як бы груба, са злосцю.

— У цябе людзі? — спытаў Андрэй, не прывыкшы да такога тону.

— Не, я адна.

— Даруй, голас нейкі не такі, як прывык я чуць. Я хацеў бы цябе сёння бачыць,— сказаў Андрэй.

— А я цябе не.

— Што такое? — занепакоіўся, асекся Андрэй.

— Нічога, проста не хачу цябе бачыць, і ўсё.

— Чаму, што здарылася?

— Нічога, я ж сказала ўжо, проста не хачу цябе бачыць,— адказала Іра з раздражненнем і паклала трубку.

Гэта было нешта новае. І сама размова, і тон, якім Іра гаварыла, і тое, як яна раптам, не выслухаўшы яго да канца, паклала трубку.

Андрэй нейкі час сядзеў, бы абліты варам, не ведаючы, што рабіць. А галоўнае — прычыны раздражнення, злосці не ведаў, не мог здагадацца, што ж здарылася, чаму Іра, якая заўсёды так рада была кожнаму яго званку, не гаворачы ўжо пра сустрэчы, раптам змяніла да яго свае адносіны. Не вытрымаў — набраў зноў Ірын нумар.

— Іра, што здарылася? Можа, я прыеду да цябе, разбяромся? Табе хто чаго нагаварыў? — выпаліў ён у трубку.

— Ты што, чалавечай мовы не разумееш? Я ж сказала — не хачу цябе чуць, не хачу бачыць. І ехаць да мяне не смей — не пушчу ў кватэру. А то і скандал на ўвесь дом падыму,— ужо не гаварыла, а крычала ў трубку з яўнай варожасцю Іра.— Не прыставай. І больш не звані, не прыязджай. Чуць і бачыць цябе не хачу.

І зноў палажыла трубку.

«Пазваніць яшчэ раз? Але што, што казаць ёй? Зноў упрошваць на сустрэчу, зноў у нечым пераконваць, калі Іра і слухаць, чуць мяне не хоча? Няўжо хтосьці чаго нагаварыў? Але хто, чаго?»

«А можа, пра ананімку ёй стала вядома? — успомніў раптам Андрэй.— Але ж... Пры чым тут Іра?»

«Як гэта пры чым? Ёй таксама ж непрыемнасць. Ды калі яшчэ нейкі дурань папрок ёй зрабіў, прысарамаціў, маўляў, у чалавека сям'я, а ты... Навошта разбіваеш? Ці яшчэ што-небудзь не вельмі разумнае сказаў?»

Зноў набраў Ірын нумар тэлефона.

— Іра, прабач, я не хачу быць назойлівым. Але...— уздыхнуў з адчаем Андрэй.— Я хацеў бы ўсё ж ведаць, што здарылася. Не спяшайся класці трубку, скажы хоць што-небудзь...

— Я ж сказала табе, нічога не здарылася. Проста ты мне абрыд.

— Як ты можаш такое? Ты няпраўду гаворыш. Скажы, ў чым справа? Можа, пра ананімку табе стала вядома?

— Якую ананімку? — на хвіліну як бы зацікавілася Іра. Але толькі на хвіліну, бо ў наступны момант раптам зусім узарвалася, абурылася.— Не загаворвай мне зубы! І не звані больш.

Іра з раздражненнем і злосцю палажыла трубку.

Званіць больш Андрэй не стаў.

«Значыцца, не ананімка прычына. А што?»

Хадзіў сюд-туд па кабінеце, думаў.

«Лепш бы не званіў я ёй. Ды яшчэ перад размовай з Дзямідам Станіслававічам. Не шанцуе мне сёння нешта зусім. І Пятро Кірылавіч непрыемнасць сказаў... І Іра... Няўжо і Дзямід Станіслававіч нешта таксама такое ж падрыхтаваў?..»

Размова з Ірай не давала засяродзіцца на нечым іншым — думкі зноў і зноў вярталіся да яе.

«Што, што здарылася?»

Хадзіў Андрэй па кабінеце, думаў, здагадкі розныя строіў, але здагадацца, што віною таму, чаму Іра нават гаварыць з ім не захацела, так і не змог.

«Мусіць, нехта нешта нагаварыў... І трэба ж, у той час, калі якраз ананімка паступіла. Ды і ў самога наспела на душы жаданне перамен...»

«А можа, гэта і добра? Адным махам, як кажуць, семярых забіяхам. І з Алай, домам Арцёма Гаўрылавіча расстануся, і з пасадай, і з Ірай...»

Не, што-што, а расставацца з Ірай не хацелася. Якраз менавіта яна ў апошні час яго ратавала, без яе ён ужо не мог жыць. Ці кахаў ён Іру? Над гэтым Андрэй не задумваўся. Ведаў — яму добра з Ірай, і ўсё. І цяпер... Нават быццам самалюбства закраналася — не ён Іру кідае, а яна яго, яна не хоча яго бачыць, сустракацца...

«Чаму, чаму?» — мучыла, сядзела цвіком у галаве пытанне. Было крыўдна — здавалася ж, самыя блізкія людзі, і раптам... Чаму б не сустрэцца, не пагаварыць, не расказаць шчыра пра ўсё. І калі сапраўды ён, Андрэй, у нечым вінаваты... Тады іншая справа. А то ж... Слухаць не хоча... Была такая ласкавая, вясёлая, заўсёды радая кожнаму яго званку, кожнай сустрэчы, нават слову. І раптам... Нібы яе падмянілі, муха шалёная ўкусіла...»

«Трэба будзе пазваніць ёй, высветліць усё... Бо пакідаць так... А лепш за ўсё заехаць, пагаварыць...»

«Але ж Іра сказала, каб і нагі маёй больш не было ў яе».

«Неабавязкова на кватэры ў яе сустракацца. Можна і ў не вельмі бойкім кафэ... Ці ў парку, у лесе... І неабавязкова сёння... Лепш пачакаць, калі злосць адхлыне...»

«Вядома, добра было б, каб так... Але... Колькі чакаць?

Дзень, два, тры?.. Ды і загад на адпачынак думаў сёння ж напісаць, не адкладваць...»

«Сёння і так нялёгкі дзень... А яшчэ ж... І Дзямід Станіслававіч прасіў пазваніць...» — успомніў раптам Андрэй пра тое, пра што сказала, як толькі ён зайшоў у прыёмную, Люся.

Вярнуўся да свайго стала, сеў у крэсла.

«Хіба пазваніць?»

Злавіў сябе на тым, што званіць не хацелася — рукі быццам прыраслі да стала, не адарваць, не падняць іх.

«Можа, няхай пазней пазваню,— падумаў.— Ці... На заўтра размову адкладу. Скажу, заняты быў».

«Але ж... Вышэйшае начальства не любіць, калі яму не ў час званяць. Калі сказана, дык... Кроў з носа, а давай, не адкладвай. А тут яшчэ... Упершыню ж званіць... Ды і... На месцы Арцёма Гаўрылавіча Дзямід Станіслававіч...»

Званіць трэба было сёння. І не адкладваць на пазней, а цяпер, зараз жа. Інакш...

І Андрэй, хоць яму і не хацелася гэта, пачаў нягнуткімі, амаль мёртвымі, драўлянымі пальцамі набіраць нумар тэлефона Дзяміда Станіслававіча.

«Можа, яго і на месцы няма,— супакойваў сябе, закідваў наперад як бы выратавальны круг Андрэй.— І я... Толькі хвалююся дарэмна».

## 5

Дзямід Станіслававіч быў на месцы. І як толькі Андрэй набраў патрэбны нумар тэлефона, у трубцы пачуўся знаёмы зычны бадзёры голас:

— Алё.

У Андрэя ўсярэдзіне быццам што абарвалася.

«Трэба ж»,— падумаў і ў наступную хвіліну, удыхнуўшы на поўныя грудзі паветра, амаль што пракрычаў:

— Дзямід Станіслававіч, добры дзень. Па-першае, дазвольце вас павіншаваць з новай пасадай, а па-другое...

Ён не паспеў сказаць, што «па-другое», бо яго перапынілі.

— Выбачайце, хто гэта?

— Андрэй Лобач... Мне перадалі, што вы прасілі пазваніць...— выпаліў Андрэй.

— А, Андрэй Анісімавіч,— пачуліся ў голасе Дзяміда Станіслававіча новыя ноткі, і не разабраць было, якія — суровыя ці толькі начальніцкія.— Дзень добры. Так, сап-

раўды я званіў да цябе,— перайшоў на «ты» Дзямід Станіслававіч.— Ёсць адна справа, пра якую я хацеў бы з табой перагаварыць.

— Калі ласка, Дзямід Станіслававіч, я слухаю,— насцярожыўся Андрэй.

— Не тэлефонная размова. Лепш прыедзь да мяне.

— Калі?

— Ды можна зараз жа, цяпер.

Пачуліся сігналы — Дзямід Станіслававіч паклаў трубку. А Андрэй, усё яшчэ трымаючы сваю ля вуха, слухаў.

«Што ён хоча? Чаму выклікае? — забілася часта і трывожна ў скронях.— Нешта, мабыць, важнае, калі не захацеў гаварыць па тэлефоне. І, бачыш, на маё віншаванне нічога не адказаў, не прарэагаваў. Значыцца, не палічыў патрэбным. А гэта... Як раней казалі, сушы сухары. Ды інакш і быць не можа. Калі выправілі на пенсію Арцёма Гаўрылавіча, то... Хто пакіне мяне ў спакоі?.. І я, быўшы на месцы Дзяміда Станіслававіча, таксама б... Хіба іншых людзей няма? І мне трэба было не чакаць гэтага выкліку, а даўно самому падаць заяву. І невыпадкова гэтая ананімка. Відаць, арганізавалі... Няйнакш абкладваюць з усіх бакоў, каб я, як гаворыцца, і пікнуць не пасмеў... А тут яшчэ і Іра конікі пачала выкідваць...»

Зноў, згадаўшы Іру, сённяшнія размовы з ёю, аж сцяўся як ад болю Андрэй.

«Трэба ж было мне сустрэцца з ёю тады ў вагоне. А потым і сысціся. Як усё адно назнарок, вяло мяне... А цяпер... Выходзіць, праўду ў народзе кажуць — любіш катацца, любі і саначкі вазіць».

Шчымела ў грудзях, ныла.

«Калі б не Іра, то ўсё астатняе... Не адзін я такі быў, не адзін я браў на працу тых, каго, напэўна, браць не варта было. Ды не ў гэтым справа... Быў такі час, усе рабілі не тое і не так, як трэба было, і я рабіў... А вось донжуанскія справы, як сказаў Пятро Кірылавіч... Былі б з Ірай нармальныя адносіны, параіліся б, як быць, каб і ёй і яму, Андрэю, добра было. А так... Дый... Прызнавацца ва ўсім, калі, скажам, у Дзяміда Станіслававіча зойдзе размова пра Іру, ці лепш памаўчаць, а то і рашуча адмовіцца, сказаць, што брахня гэта, паклёп?»

«Але ж... Няўжо Пятро Кірылавіч ананімку тую перадаў, паспеў ужо Дзяміда Станіслававіча праінфармаваць?»

«Пры сучасных сродках сувязі хіба гэта доўга? Ды мог

і не перадаваць, а пазнаёміць. А то і... Ананімка магла паступіць да Дзяміда Станіслававіча, а ён накіраваў, спусціў яе Пятру Кірылавічу... Ага, таму той так і гаварыў з ім, Андрэем, адразу ж рэзюме сваё і вышэйшага начальства выклаў... І нават пачытаць ананімкі не даў, не сказаў, што там, маўляў, не спяшайся, пачакай, ведаць будзеш... А каб пачытаў — ведаў бы ўсё, у чым мяне вінавацяць. І падрыхтаваўся б, зрабіў бы наперад сякія-такія вывады. Ва ўсякім выпадку — не губляўся б, калі Дзямід Станіслававіч загаворыць пра некаторыя справы... А так... Не, вялікая гэта сіла атрымаць у час патрэбную інфармацыю, падрыхтавацца да размовы, каб не знянацку цябе захапілі нейкім пытаннем ці фактам... Ды няхай... Як будзе, так будзе... Тым болей калі я працаваць больш на пасадзе не збіраюся. Ды і з Алай жыць... А Іра...»

Зноў заныла пад сэрцам, нібы струну балючую закрануў, калі ўспомніў Іру.

«Так усё складна-ладна было, і раптам...»

Выклікаў машыну і, не спыняючыся ў прыёмнай ні на хвіліну, заспяшаўся, як не пабег да ліфта...

Дзямід Станіслававіч чакаў Андрэя. І гэта Андрэй адчуў, як толькі зайшоў да яго ў кабінет. Адчуў па тым, як Дзямід Станіслававіч важна падняўся з-за стала, падаў яму руку, моўчкі паказаў вачыма на крэсла, што стаяла каля прыстаўнога століка.

Андрэй не быў у гэтым кабінеце месяцы два. І заўважыў змены. Не толькі, што за сталом сядзеў не Арцём Гаўрылавіч, а новы, зусім іншы чалавек. Быў перанесены ў зусім іншы кут і каляровы тэлевізар, перасунуты і доўгі паліраваны стол, за якім звычайна праводзіліся розныя невялікія нарады і пасяджэнні.

Сам Дзямід Станіслававіч быццам пастражэў. Шырокі, з прыкметнымі залысінамі лоб набыў думнасць, заклапочанасць. Думнасць, заклапочанасць былі і ў вачах. Ды і так, у рухах, паводзінах адчуваліся важнасць, саноўнасць.

«Што значыць даць чалавеку пасаду! — падумаў Андрэй, успамінаючы Дзяміда Станіслававіча таго, ранейшага, якога сустракаў на розных нарадах, пасяджэннях, з якім вітаўся, які яму і якому ён міла, прыязна, па-прыяцельску ўсміхаўся.— Як мяняе яна людзей!»

Дзямід Станіслававіч не спяшаўся гаварыць, чаму вы-

клікаў Андрэя. Засяроджана глядзеў некуды ўбок, на край стала, дзе ляжаў нейкі, напісаны ад рукі не вельмі акуратным почыркам — на што адразу ж звярнуў увагу ён, Андрэй («Ці не тая гэта, на мяне ананімка?»), лісток паперы, моршчыў лоб, кусаў губы. І па гэтым Андрэй здагадаўся — размова будзе, па ўсім відаць, не надта прыемная.

— Вось што, дарагі,— нарэшце падняў вочы, паглядзеў на яго, Андрэя, Дзямід Станіслававіч і тут жа адвёў, быццам спалохаўшыся, іх зноў убок.— Я думаў, мы з табою папрацуем. Аж выходзіць...

Дзямід Станіслававіч развёў рукамі.

— Што здарылася, Дзямід Станіслававіч? — падняў цяпер вочы ўжо ён, Андрэй, на Дзяміда Станіслававіча, паглядзеў больш уважліва.

— Ды быццам нічога і не здарылася. Аднак... Сам разумееш, перабудова... І яе пачынаюць з кадраў. Трэба падцягваць свежыя, маладыя сілы, шукаць рэзервы. Працаваць па-новаму. І таму...

— Але ж і я яшчэ не стары,— не вытрымаў, сказаў Андрэй.— Ва ўсякім выпадку да пенсіі мне далёка.

— Вядома, калі лічыць па гадах. Але старасць — паняцце адноснае. Галоўнае — каб па поглядах, думках, ініцыятыве чалавек быў малады. А ты, Андрэй Анісімавіч, выбачай... Сам падумай, ці здолееш ты правесці тую перабудову, якая патрабуецца, ды і працаваць па-іншаму, па-новаму...

— Як я разумею, не з перастаноўкі кадраў перабудову трэба пачынаць...

— Перабудову трэба пачынаць адусюль, з усяго,— не даў дагаварыць Андрэю, перапыніў яго Дзямід Станіслававіч.— Усё старое, аджылае, каб не замінала, убок. Дарогу новаму!

— Не ўсё новае лепшае за старое! — не вытрымаў Андрэй.

— Вядома, вядома! І ўсё ж... Свежы вецер патрэбен. Занадта шмат утварылася ў нас застойнікаў, занадта шмат некаторыя ў нас думалі і дбалі не пра справу, а пра сябе. Сямейнасць, кумаўство, групаўшчыну развялі, пратэкцыянізм, розны блат... Ды і паднашэннямі, а то і хабарам не грэбавалі. Не заўсёды і самі тыя, хто рабіў пэўныя паслугі, гэта ведалі, многае рабілася за іх спіною. Не табе гэта расказваць... Той жа Арцём Гаўрылавіч... Ведаеш, што ён рабіў, а правільней, рабілася за яго спіной, а ён як бы

прыкрываў сабой усё тое? Не буду расказваць, у нас працуе камісія... І выявілі такое...

Дзямід Станіслававіч пакруціў галавою.

— Не толькі з працы гнаць, з партыі выключаць такіх трэба,— закончыў ён, аж чырванню наліўся ад высакароднага гневу.

— А пры чым тут я? — падняў вочы на Дзяміда Станіслававіча Андрэй.

— Як гэта пры чым? Ты ж яго зяць...

— Ну і што, як зяць?

— А тое, што сёе-тое і ты рабіў.

— Ён быў начальнік, і я выконваў яго загады. Хоць не заўсёды і згодзен быў.

— Ведаю, ведаю. Цяпер усё можна сказаць, спісаць на папярэднікаў. Словам, каб не разводзіць доўгай дыскусіі... Падумай, што табе рабіць. Я на тваім месцы... Падаў бы заяву... Бо працаваць у новых умовах...

— А калі я не падам заявы? — быццам хтосьці пацягнуў за язык, усяліў дух супраціўлення Андрэю.

— Ну-у, вядома, справа твая,— вяла, неяк аж надта казённа адказаў Дзямід Станіслававіч.— Я хацеў, каб табе лепш было. Мы падумалі б, куды цябе перавесці, знайшлі б месца. А так... Давядзецца ад Арцёма Гаўрылавіча да цябе нітку праводзіць. Тым больш зачэпка ёсць, ананімка на цябе паступіла...— паглядзеў ён на той лісток паперы, што ляжаў на краі стала.— Правяраць будзем. Словам, не ў тваю карысць будзе ўсё гэта. Так падаў бы заяву — і ўсё... А калі пачнуць правяраць, шукаць... То і... Знойдуць. І тады... З вывадамі могуць вызваліць...

Правільна, усё правільна гаварыў Дзямід Станіслававіч. І каб быў на яго месцы Андрэй, ён па ўсёй верагоднасці гаварыў бы тое самае таму, хто сядзеў бы ў яго кабінеце насупраць, як вось ён сам сядзіць. Аднак... Дух супраціўлення рос, натхняў не здавацца. І вось жа — гадзіну якую назад ён, Андрэй, сам рыхтаваўся пайсці з пасады, згодзен быў у любую хвіліну падаць заяву на звальненне. А тут раптам... Быццам захацелася насуперак Дзяміду Станіслававічу, усім тым, хто за ім, за яго спіною, нешта зрабіць, і зрабіць так, як ён, Андрэй, хацеў, а не тыя, хто быў там, за спіною Дзяміда Станіслававіча.

— Не трэба палохаць мяне, я не з палахлівых. Тое, што я зяць Арцёма Гаўрылавіча... Не віна, а бяда мая. Усё ж астатняе... Няхай правяраюць. Вінаваты — адкажу, не вінаваты — значыцца, не вінаваты... Што ж да ананім-

кі...— не зводзіў вачэй цяпер ужо і ён, Андрэй, з краю стала, дзе ляжаў не вельмі акуратна спісаны ад рукі лісток паперы.— Я ўсё жыццё быў і астаюся непрымірымы вораг ананімак. Бачыш недахопы — гавары адкрыта, шчыра. А то... Каго мы выхоўваем? Не барацьбітоў, не змагароў за праўду, а тхароў, смярдзючых клапоў. І каб ад мяне гэта залежала, не надаваў бы ананімкам значэння, не прымаў бы да справы, не назначаў бы розных камісій, не правяраў бы... Тым больш цяпер, калі галоснасць...

— Але ананімкі часта пацвярджаюцца!

— Усё адно шкоды ад іх больш, чым карысці.

— Гэта таму ты так гаворыш, бо на цябе ананімка паступіла,— засмяяўся, аж заззяў Дзямід Станіслававіч.— Не будзем пра гэта, дарагі. Вернемся да нашай размовы. Я на тваім месцы так з ходу не адмаўляўся б ад таго, што табе прапаноўваюць,— падняўся з-за стала, даючы зразумець, што размова скончана, Дзямід Станіслававіч.— Падумай. І... Пазвоніш, скажаш мне.

— Я падумаў ужо,— не падымаўся, сядзеў за прыстаўным столікам Андрэй.— Пакуль што я іду ў адпачынак. Ну, а калі вярнуся... Тады і скажу...

— У адпачынак? — спалохаўся, разгубіўся Дзямід Станіслававіч, нават пачаў быў нервова стукаць костачкамі пальцаў па стале.— Глядзі, я на тваім месцы не рабіў бы так... Такога...

— А я зраблю,— сказаў цвёрда Андрэй і, акінуўшы вачыма яшчэ раз Дзяміда Станіслававіча («Ох, як хутка стаў ты чыноўнікам!»), падняўся з-за століка і, не падаючы рукі, не развітваючыся, пайшоў да дзвярэй...

## Аварыя

### 1

У той дзень Андрэй заседзеўся на працы пазней як звычайна. Хацелася сёе-тое падагнаць, давесці да ладу перад адпачынкам. Ды і папер розных назбіралася, ім трэба было даць ход. І думкі ж у галаве былі — раптам не вярнуся больш сюды на працу, то няхай нічога такога не астанецца, што мяне кампраметавала б. Андрэй поркаўся ў сталах, выцягваў то адну, то другую папку с шуфлядаў, што перагортваў, што прачытваў, што проста знішчаў, ірвучы і выкідаючы ў сметніцу. Калі быццам навёў ва ўсім

парадак, не стаў выклікаць машыны — пайшоў дадому пешкі: «Прывыкаць, прывыкаць трэба хадзіць, хопіць, і так наездзіўся больш, чым некаторыя, на машыне». Вельмі хацелася перад адыходам пазваніць Іры, але ён пераадолеў у сабе гэта, не паддаўся спакусе. «Няхай супакоіцца трохі, тады і пазваню».

Здзівіла нейкая як бы гняткая цішыня ў горадзе. Ды і людзей амаль не было на вуліцах.

«Няўжо так позна ўжо?» — падумаў Андрэй і паглядзеў на гадзіннік: было палова дзесятай...

«Няйнакш праграму «Время» людзі глядзяць. Ды і на дождж як бы збіраецца».

Сапраўды — над горадам вісела хмара. Але не такая, як звычайна бывае ў навальніцу, а нейкая надта ж ужо калматая, брудная, чорная.

«Дзіўна, грымоты, бліскавіцы павінны б быць,— падумаў Андрэй.— А тут... Цішыня. Цемра...»

Дома, калі зайшоў у кватэру і пачаў разувацца, пачуўся тэлефонны званок. Андрэй падняў трубку, хоць амаль упэўнены быў — не яму гэта званілі. Па вечарах яму рэдка хто званіў.

— Алё,— пачуў ён знаёмы голас — званілі, як ні дзіўна, якраз яму. І хто — сябра дзяцінства, Іван Пастушок.— Гэта ты, Андрэй?

— Я,— глуха, стомлена адказаў Андрэй.

— Выбачай, што званю позна. Ты, відаць, толькі з працы.

— Ага.

— На машыне ехаў?

— Не, пешкі ішоў. А што?

— Бяда,— трывожным, трохі нават трагічным голасам адказаў Іван.— Ты «Время» глядзеў?

— Не.

— А-а, тады ўсё зразумела. На Чарнобыльскай атамнай станцыі аварыя.

— Ну дык і што?

— Як што? Гэта ж недалёка ад нашых родных мясцін...

Толькі цяпер дайшло да Андрэя, чаму звоніць Іван — ён быў сам вучоны-атамнік і, відаць, сёе-тое ведаў.

— А што, аварыя гэтая... небяспечная? — спытаў, як бы зацікавіўся Андрэй.

— Вельмі. На Захадзе гвалт паднялі... Ды пра гэта пры сустрэчы. Цяпер жа вось што зрабі. Адзенне, у якім ты ішоў, ды і абутак добра пачысці... І памыйся. Асабліва галаву, валасы.

— Ты думаеш, аж сюды дайшло? — засмяяўся Андрэй.

— Я ведаю, што гэта такое... І не папярэдзіць цябе... не магу!

— Іван, не падымай панікі,— сказаў, зноў смеючыся, Андрэй.— Ды яшчэ тады, калі я акурат нарыхтаваўся ехаць у вёску. У адпачынак...

— Рабі як хочаш, але я быў бы не сябра, каб не папярэдзіў цябе. Усё ж астатняе... Давай заўтра сустрэнемся, перагаворым... А цяпер... Чысці адзенне, мыйся...

Іван паклаў трубку. Андрэй жа, пастаяўшы нейкі час ля тэлефона, разуўся і пайшоў у свой пакой — ён быў у самым канцы калідора, з акном на поўнач, у двор. Пераапрануўшыся ў піжаму, усё ж не вытрымаў — накіраваўся ў ванну. Душна ж было, некалькі разоў за дзень пацеў. І памыцца... Яно ніколі не шкодзіць.

Мыючыся, а потым і выціраючыся цёплым, сухім ручніком, думаў пра Івана Пастушка. Усё ж малайчына, што ўспомніў, пазваніў. Ён бы, Андрэй, наўрад ці згадаў бы Івана ў скрутную хвіліну. А Іван яго, Андрэя, згадваў. І на святы, і так, калі дадому, у вёску ехаў ці з вёскі прыязджаў. Пераказваў вясковыя навіны, надта ж перажываў, што ўсё там, у вёсцы, мяняецца — высякаюцца лясы, асушаюцца балоты... А калі пачалі будаваць Чарнобыльскую АЭС, і зусім быў раззлаваўся — хіба ж можна ў такім месцы будаваць атамную электрастанцыю? Каму гэта ў галаву магло ўзбрысці такое? Андрэй смяяўся з Івана — якая розніца, дзе будаваць атамную электрастанцыю? Працуюць яны бездакорна, ніякіх нідзе непажаданых выпадкаў не было. Але ён, Іван, прытрымліваўся іншых думак і поглядаў — яно добра, калі ўсё добра. А калі не дай Бог што якое здарыцца... Бяда будзе! Хто тады і як тое паправіць?..

«Ты ведаеш, што такое атам? — крычаў, гарачыўся Іван.— Гэта, акрамя каласальнай энергіі, яшчэ і нябачная смерць. Смерць усяму жывому... Джын, загнаны ў бутэльку. А калі яго выпусціць, вырвецца ён на волю...»

«Месніцтва ў табе гаворыць!» — смяяўся, кпіў з Івана ён, Андрэй.

«Няхай сабе. Аднак жа ў такім месцы, як Палессе, будаваць атамную электрастанцыю — гэта памылка. Калі не шкодніцтва...» — стаяў на сваім Іван.

«І бачыш, як у ваду глядзеў...— думаў, згаджаўся цяпер з ім Андрэй.— Праўда, як заўсёды, Іван, мабыць, трохі перабольшвае».

«Калі б невялікая аварыя, не паведамлялі б па тэлебачанні...»

«За мяжой гвалт паднялі, таму і паведамілі. Ды і галоснасць жа цяпер. А што Іван успомніў, пазваніў... То... Такі ён чалавек...»

...Даўняя і даволі блізкая дружба звязвала Андрэя з Іванам. Калісьці яны разам вучыліся ў школе, сядзелі за адной партай. Разам і па ягады, грыбы, арэхі ў лес хадзілі. Ён, Андрэй, любіў амаль аднолькава ўсе прадметы, а Іван цягу меў да матэматыкі, фізікі. Вучыліся на пяцёркі. Ва ўсякім выпадку атэстаты атрымалі за дзесяцігодку лепшыя за ўсіх. Можна было і на медалі іх абаіх прадставіць, але ў раёне збаяліся — сельская школа, дзе там раўняцца ёй з іншымі, гарадскімі... Ды і дзяцей настаўнікаў, начальства назбіралася многа. А нейкія невядомыя, вясковыя... І без медалёў пражывуць — абыдуцца...

Іван, праўда, не паступіў вучыцца далей так з ходу ў першы ж год. Не рашыў нейкай задачы, а значыцца, не дабраў патрэбнай колькасці балаў. Год давялося папрацаваць у калгасе. А ён, Андрэй, паступіў адразу. Трапіліся лёгкія пытанні, ён на іх адказаў даволі грунтоўна. Да таго ж ён быў хлопец, а хлопцамі на хімфаку даражылі — надта ж мала іх паступала, лічаныя толькі. Андрэй не пакінуў сябра ў бядзе — пасылаў яму з горада падручнікі, розныя дапаможнікі, разоў колькі прывозіў Івана і ў горад, пазнаёміў з некаторымі фізікамі, матэматыкамі, хімікамі, што жылі ў студэнцкім інтэрнаце. А Іван хлопец быў вушлы — пазапісваў задачкі, што бывалі на прыёмных экзаменах, разжыўся і білетамі. І на наступны год здаў прыёмныя экзамены на пяцёркі ўсе як адзін. І паступіў ва універсітэт.

Нягледзячы на тое, што вучыліся на розных факультэтах і розных курсах, сяброўства падтрымлівалі, часта сустракаліся, хадзілі разам і ў кіно, і на студэнцкія вечары. Праўда, калі Андрэй ажаніўся, скончыў універсітэт, пачаліся іншыя клопаты — аспіранцкія экзамены, ды і жонка аднаго нікуды не пускала. І Андрэй як бы забываўся патроху на Івана, хоць той і званіў часта, заходзіў дадому. Вядома, напачатку. А потым, і Іван аддаліўся. З лабараторый розных не выходзіў — то кандыдацкую рабіў, то доктарскую. Ды і сям'я ў яго завялася — спярша жонка, а потым і дзеткі — Тарас і Аленка. Яны ўвагі, догляду патрабавалі. Былі ў Івана непрыемнасці і па службе, пра што Андрэй краем вуха чуў і ад самога Івана, і ад іншых.

Непрымірымы ён быў, ні на якія кампрамісы не ішоў. Ні ў чым. І ад гэтага цярпеў. Яму ж, Андрэю, даказваў неаднойчы:

— У такой справе, як атамная навука, не можа быць кампрамісаў. Тут больш чым дзе трэба сем разоў адмераць, а раз адрэзаць. Калі ў нечым не ўпэўнены, не рабі. Стопрацэнтная гарантыя павінна быць ва ўсім. А ў нас... Некаторыя і ў атамную навуку хочуць занесці «цяп-ляп», «авось» ці «паспрабуем, а раптам удасца». А гэта зусім іншая галіна. І адказнасць у нас, вучоных-атамнікаў, павінна быць куды большая, чым ва ўсіх астатніх. Нам давяраюць... А сярод нашага брата розныя ж людзі ёсць. Некаторых ніякая навука не цікавіць. Іх цікавяць прэміі, званні, грошы. І такія... Дзеля прэмій, званняў, грошай ці іншых даброт гатовы на ўсё. Яны якраз найбольш прайдошлівыя, умеюць пасварыць сапраўдных вучоных, а то сяму-таму і ножку падставіць. І, здараецца, заводзяць у зман некаторых кіраўнікоў, падсоўваючы не зусім дапрацаваныя і праверaныя праекты, б'юць, як правіла, на эфект эканоміі... А што потым будзе — хоць трава не расці. Яму галоўнае сваё атрымаць. А я... Не цярплю несумленнасці, выкрываю ў навуцы невуцтва. Таму і пападае мне, бо не паддаюся ні на якія ўгаворы, нікога не слухаю, толькі аднаго сябе.

— Але ж і ты можаш памыляцца? — спрабаваў стрымліваць Івана Андрэй, настаўляў яго на шлях ісціны.— Чаму ты свой погляд, сваю думку ставіш вышэй за думку ўсіх іншых? Не ўсё ж і ты ведаеш... Дый у цябе могуць быць у распараджэнні адны факты, а ў іншых — другія. І ісціна нараджаецца ў супастаўленні розных фактаў — у спрэчках.

— Згодзен з табою. Але згадзіся і ты са мною — ісціна нараджаецца ў спрэчках толькі тады, калі спрачаюцца сапраўдныя вучоныя, калі нічога іншага не бярэцца пад увагу, толькі факты, шчырасць, жаданне высветліць ісціну. І тут, у такім выпадку, ужо не важна: хто, чый бок бярэ верх — бярэ верх ісціна! Я — з такімі людзьмі, з такімі вучонымі. Іх, ты ведаеш, нямала. На жаль, закапаўшыся ў сваіх гіпотэзах і доказах, яны мала ўнікаюць ва ўсё астатняе. А можа, і не жаль, а шчасце, што ёсць такія, хто вышэй за ўсё ставіць працу, а не тыя даброты, якіх можна дамагчыся будучы не сапраўдным вучоным, а пралазай. Астатнія, як я іх называю, «нібыта вучоныя», толькі ловяць моманты, чакаюць, калі хто-небудзь з сапраўдных вучоных памыліцца ці зробіць не тое ці не так... Тады... О,

яны майстры падняць вэрхал, з мухі зрабіць слана, утапіць сапраўднага вучонага ў балотнай твані, вымазаць дзёгцем, ачарніць...

Андрэй у душы згодзен быў з Іванам. Нават зайздросціў яму, радаваўся, што ёсць такія крыштальна чыстыя людзі, якія вышэй за ўсё ставяць ісціну. Можа, таму, што сам быў не з такіх. Не арол.

«...Калі б я быў такі, ніхто б мяне ні ў чым не заблытаў»,— думаў цяпер, мыючыся і выціраючыся Андрэй.

«Але ж тады б... Ніколі і ніхто не вылучыў бы мяне, не прызначыў бы на тую пасаду, на якой я цяпер».

«Ну і што? Жыў бы без пасады. Як Іван вунь жыве. Затое на душы быў бы спакой. Ні ад якой бы кан'юнктуры не залежаў. А то... Арцём Гаўрылавіч сваё... Пятро Кірылавіч — сваё... Ала і Эльвіра Барысаўна — сваё. І ўсіх слухаць трэба, з усімі лічыцца. Інакш... Ды і чаго, чаго я дамогся? Час толькі змарнаваў. Даўно б доктарскую абараніў. А так... Не, хопіць. Пачну жыць інакш... Паеду вось на Палессе...»

«Але ж там, як сказаў Іван, аварыя...»

«Якія адносіны мае тая аварыя да мяне, маёй вёскі? Дзе той Чарнобыль? Аж пяцьдзесят кіламетраў... Мала што Іван скажа, дык і слухаць... Сабраўся ехаць, дык і паеду...»

Выйшаў з ванны бадзёры, свежы, адчуўшы ва ўсім целе лёгкасць, пругкасць. Здаецца, і ад галавы стома адхлынула.

«Вось гэта правільна, што Іван параіў памыцца. Дзякуй яму пры сустрэчы скажу».

Паслаў пасцель, лёг на канапу. І адразу ж выключыў святло — нават, як звычайна перад сном, не стаў газет чытаць. І, уткнуўшыся тварам у падушку, раптам ні з сяго ні з таго, нечакана для сябе, горка, наўзрыд заплакаў. Заплакаў, як плакаў калісьці, даўно — у маленстве.

Усё ж, што стваралася гадамі, рушылася, распадалася, уплывала з-пад ног... Сям'я... Праца... Ды і мары... Надзеі... Не, нічога не было шкада. Шкада было самога сябе. І часу, страчанага абы-як і абы на што... Аж перапаўняла ўсяго крыўда. На што, на каго — Андрэй не ведаў, не мог сказаць. І ад гэтага было яшчэ больш горка, яшчэ больш балюча — проста невыносна...

14—995

## 2

Назаўтра, падняўшыся ўранні з пасцелі, Андрэй, як ні дзіўна, не адчуў ні стомленасці, ні разбітасці. Наадварот, быў прыліў сіл — розум і цела патрабавалі дзейнасці.

«Не здавацца, змагацца за сябе трэба,— паўтараў ён у думках, ходзячы па пакоі, які быў і яго кабінетам і цяпер спальняй.— У чым я вінаваты, у тым вінаваты. Карайце, судзіце. Але каб падаваць заяву, ісці з пасады, як таго хоча Дзямід Станіслававіч... Спяшацца не будзем, пачакаем...»

«А з адпачынкам як жа?» — вынырнула аднекуль з глыбіні думка.

«З адпачынкам? Яго мы скарыстаем. І скарыстаем, як я і задумаў, напоўніцу. Трэба выйграць час... За месяц многае зменіцца. Галоўнае — не пароць гарачкі, не прыспешваць самому ходу падзей, даверыцца часу. Ён — мудры, расставіць усё па сваіх месцах, развяжа, разрэжа самыя складаныя вузлы. Ананімку няхай правяраюць. А ўсё атстаняе... Ала, Іра... Пакінем так, як было. Урэшце, у іх свае галовы ёсць, як хочуць, так няхай і робяць. Мне ж пасля лягчэй будзе... Хоць на час уцяку ад усяго і ўсіх».

«І нічога не скажаш Іры, Але?»

«А што ім казаць? Іра, урэшце, не жонка мне... Дый... Навошта ж так — не выслухаўшы, класці трубку, абражаць? Вінаваты ў чым я, дык скажы. А то... фокусы».

«Можа, прычыны на тое ёсць?»

«Дык не цямні, скажы... А Ала? Перажываць не будзе, што мяне побач няма. Наадварот — поўная воля, што хочаш, тое і рабі, як хочаш, так і жыві. І не падумае, дзе я, не ўспомніць нават...»

«Не жорстка гэта? Яны ж — жанчыны. І іх калі не разумець, дык хоць шкадаваць трэба».

«А яны мяне шкадуюць? І адна і другая? Урэшце, не сам я да Іры лез, яна да мяне падлезла, мужу хочучы адпомсціць. А Ала... Пра сябе толькі думае і думала. А што і як я... Гэта яе не цікавіла і не цікавіць. Яна абыякавая да мяне і майго лёсу, і я маю права быць абыякавым да яе, яе лёсу...»

«Усё быццам так, правільна. І ўсё ж... Шкадаваць людзей трэба. Асабліва блізкіх».

«Я шкадаваў. А мяне... Хто мяне шкадуе? Пятро Кірылавіч і той...»

«Ён пра сябе думае. Самому б пры пасадзе астацца, ацалець. Не да парасят, калі свінню смаляць...»

«Вось іменна. Але ты — не Пятро Кірылавіч, ты — Андрэй. Чалавекам быў, чалавекам і астанься. Каб потым не шкадаваць, што так трэба было зрабіць, а ты зрабіў інакш, не ўпікаць, не асуджаць сябе, не дратаваць, не думаць...»

Неаднойчы лавіў сябе ён, Андрэй, на тым, што, калі здаралася скрутная сітуацыя і трэба было прыняць хутка канчатковае рашэнне, які б нерашучы, нясмелы ён быў, раздвойваўся — з аднаго боку, быццам і правільна, так, а з другога... Злавіў на гэтым і цяпер сябе зноў Андрэй.

«Шкадую я людзей. А гэта як для кіраўніка — мінус. Тут не шкадаваць трэба, а думаць пра справу. Каб справа перамагла, момант выйграць...»

«А людзі? Робім жа ўсё быццам дзеля людзей... А яны... Розныя бываюць. Ёсць разумныя, хітрыя, дужыя... А ёсць і не вельмі разумныя, няхітрыя, хілыя... І жыць... Жыць кожны хоча, усім трэба. Бяда, што некаторыя чалавечы фактар пачалі разумець, як выцісні з чалавека ўсё, што можна, а самога чалавека хоць на сметнік выкідай. Сёння ты дужы, здаровы, робіш усё — усё і маеш. А заўтра не зможаш рабіць — ідзі прэч, саступі дарогу іншаму. Узяць хоць бы таго ж Арцёма Гаўрылавіча...»

Па-чалавечы шкада было Андрэю Арцёма Гаўрылавіча. Не таму, што ён быў цесць. Проста адчуваў — не зусім добра так рабіць з людзьмі. Быў пры пасадзе — усе яму званілі, усім трэба ён быў. А выправілі на пенсію — нікому ён не трэба. Ды... Арцём Гаўрылавіч нават не ў прыклад. Ён не зусім сумленна служыў, многае рабіў, што якраз не трэба было рабіць. Але ж... Не ўсе такія, як Арцём Гаўрылавіч. Сярод начальства шмат людзей сумленных, якія пра справу дбалі і дбаюць. Усяго сябе, усе свае сілы аддавалі і аддаюць, каб дабро людзям зрабіць. І таксама ж... Прыйдзе новы начальнік і пачынае ўсіх, хто пад ім, нібы мятлой мясці, разганяць, новых набіраць, ставіць...

«А потым таго начальніка здымаюць і новы пачынае мясці тых, каго ранейшы, яго папярэднік, набраў. А дзе ж пераемнасць? Добра, калі пенсія ў чалавека, узрост... А вось як у мяне...»

«Дзямід Станіслававіч паабяцаў, што падшукаюць работу».

«Якую?»

«Можа, якраз такую, якая па душы будзе. І каб не ўпарціўся, паслухаў...»

«Не, надумаў пайсці ў адпачынак, паехаць дадому да маці, дык і паеду».

«Але ж там — аварыя»,— успомніў зноў пра тое, пра што гаварыў, пазваніўшы, учора ўвечары Іван Пастушок.

«Пры чым аварыя да майго адпачынку? Проста ў страха, кажуць, вочы вялікія».

«Іван — атамнік, ён сёе-тое ведае. Калі палічыў патрэбным пазваніць, папярэдзіць, то...»

«Трэба, мусіць, сустрэцца з Іванам, пагаварыць».

Зірнуў на гадзіннік — яшчэ не было васьмі.

«Рана, мусіць, каб званіць».

«Глядзі, каб потым позна не было,— быццам падагнаў, падказаў яму хтосьці.— Паедзе на свой рэактар і...»

Накінуў піжаму, пайшоў на калідор, дзе пры ўваходзе ў кватэру стаяў тэлефон.

«Пакуль Іван дома, дык і дамовімся... Бо ўдзень... Ці часу не будзе, ці забудуся, ці не знайду яго...» — падумаў, набіраючы нумар хатняга тэлефона, Андрэй.

Трубку падняў Іван. Па першым жа гудку.

— Не спіш? — спытаў як бы з насмешкаю Андрэй.

— Пра што ты гаворыш? — быццам нават пакрыўдзіўся Іван.— Я ўсю ноч не спаў. Прыехаў, каб з жонкаю, дзецьмі ўбачыцца...

— Чаму не спаў? — вырвалася нібы мімаволі ў Андрэя.

— Я ж казаў учора табе. Бяда, вялікая бяда...

— Ты пра аварыю?

— А пра што ж яшчэ? Пакуль мы, вучоныя-атамнікі, не спім, але хутка і іншыя спаць не будуць.

Голас у Івана быў зусім трагічны. І Андрэй не знайшоў нічога іншага, як прызнацца:

— Я ж, Іван, сур'ёзна казаў табе, што дадому, у вёску, сабраўся. У адпачынак.

— Не спяшайся, пачакай — вось табе мая парада. А лепш за ўсё — давай сустрэнемся, пагаворым.

— Калі?

— Ды хоць цяпер, я паўгадзінкі вольнага часу маю. Бо што будзе далей?.. Не ведаю. Не выключана, што сам я ў Чарнобылі буду. Ці паблізу яго. Дзе мы ўбачымся?

— Дзе скажаш?

— Выходзь з дому, я пад'еду на машыне.

— Ёсць, дамовіліся,— сказаў Андрэй, міжволі паддаючыся ледзь не загадам сябра. І, паклаўшы трубку, пачаў спешна збірацца — мыцца, галіцца, адзявацца. І ўжо хві-

лін праз дзесяць — пятнаццаць, паголены і адзеты, стаяў на ганку дома, дзе кватараваў, жыў.

Іван не прымусіў сябе чакаць — пад'ехаў, з'явіўся ў тую ж хвіліну, як толькі Андрэй выйшаў — быццам стаяў за рогам дома, чакаў яго. Не вылазячы з машыны, адчыніў дзверку, запрасіў садзіцца.

Андрэй хутка, борзда збег з прыступак, сеў у машыну.

— Дзень добры,— павітаўся Андрэй і з Іванам і з шафёрам.

— Прывітанне,— працягнуў, падаў руку Андрэю Іван.

І, каб унікнуць непатрэбных пытанняў, сказаў, загадаў шафёру:

— Падкінь нас, Кандрат Кандратавіч, да возера, надта ж жаўранкаў паслухаць хочацца. Кажуць, прыляцелі ўжо, спяваюць...

І больш не сказаў ні слова, пакуль не пад'ехалі да возера, не спыніліся, не выйшлі з машыны.

— Ты прабач, што я пры шафёру ні пра што не стаў гаварыць,— пачаў Іван, не падымаючы на Андрэя вачэй, калі яны адышліся, аддаліліся крокаў на колькі ад машыны.— Справа такая, што не хочацца, каб раней часу чуткі розныя паўзлі. Пакуль мы, атамнікі, і то не ўсё ведаем. Словам, павысіўся радыяцыйны фон. У дзесяткі, а месцамі ў сотні разоў. І не толькі ў раёне аварыі... Воблакі з атрутнымі ізатопамі праплылі над многімі раёнамі Беларусі... Пакуль што цяжка сказаць, дзе гэтыя ізатопы і якія з іх выпалі... Але што яны выпалі — гэта факт. Некалькі гадоў таму назад была аварыя на атамнай станцыі ў Англіі. Там ізатопы рассяяліся ў трыццацікіламетровай зоне. Як у Чарнобылі — трэба вывучаць.

— А не перабольшваеш ты, не панікуеш? — спыніўся, паглядзеў проста ў твар Івану — знаёмы з маленства з рабацінкамі на шчоках і носе, чыста паголены, інтэлігентны твар — Андрэй.

— Што ты? — спыніўся, падняў вочы — калючыя, нейкія спалоханыя — на Андрэя Іван.— Я не маю права гаварыць усё, што там, у Чарнобылі. Ды і не ўсё ведаю. Працуе дзяржаўная камісія. Ёсць, ды яшчэ, напэўна, і будуць чалавечыя ахвяры. І каб толькі гэтай аварыяй усё скончылася. За ёю могуць быць яшчэ больш непажаданыя вынікі. Залежыць — будуць яны ці не — ад многіх фактараў ды і ад нас, вучоных. Трэба ж да рэактара падступіцца, утаймаваць яго. А як? Ён жа сее вакол сябе смерць. Нябачную смерць. У гэта цяжка паверыць, цяжка да гэтага пры-

выкнуць. Ды і не падрыхтаваны мы. Гаварылі ж пра мірны атам, прывучалі ўсіх не баяцца яго. А тут? Адваротнае... Аварыю трэба ліквідаваць. І як мага хутчэй. Бо калі гэта не зробім... Нават уявіць цяжка, якая нас чакае бяда. Там жа, у той чацвёрты блок, дзе адбылася аварыя, загружаны тоны, дзесяткі тон радыёактыўных рэчываў... Ды побач жа і іншыя блокі...

— Дык ты што — не раіш мне ехаць у адпачынак дадому, у вёску? — спытаў пра тое, што яго найперш і цікавіла, Андрэй.

— Пра што ты гаворыш? На добры лад маці трэба было б забраць. Але як, як гэта зрабіць? Паніка ж пачацца можа. Калі я, ты сваіх матак забяром?.. Што людзі падумаюць? І пакідаць там... Таксама небяспечна. Вельмі нават небяспечна.

— Але ж ад нашай вёскі да Чарнобыля кіламетраў пяцьдзесят? — усклікнуў, нагадаў Андрэй Івану.

— Ведаю,— махнуў неяк нервова, быццам незадаволены, што Андрэй усё яшчэ не верыць яму, не ўсведамляе ўсёй небяспекі гэтай аварыі, Іван.— Што такое пяцьдзесят кіламетраў, калі перапалох у Швецыі, ФРГ, ва ўсёй Еўропе. Канечне, ім цалкам верыць не варта... Але ж і зусім не верыць?..

Андрэй ніколі не слухаў ніякіх замежных радыёстанцый. Неяк абыходзіўся, прывык верыць толькі савецкім радыё, тэлебачанню і газетам. Таму спытаў:

— А што яны перадаюць?

— Глушаць у нас, але ж і таго, што пачуў... даволі. Радыяцыя ў іх павысілася, ды і асадкі радыеактыўныя выпалі. Падаюць аналізы гэтых асадкаў... Ды справа нават не ў гэтых паведамленнях. Справа ў іншым — край наш, які ўсё асушалі, быццам паляпшалі, цяпер... Яшчэ і радыеактыўнымі ізатопамі засыпаны... А паўраспад некаторых з гэтых ізатопаў сотні, тысячы гадоў... Значыцца, мы з табой можам аказацца без роднага кутка... Не паедзеш туды, не паходзіш...

У Івана паказаліся на вачах слёзы.

— Кінь ты, не панікуй,— астудзіў Івана Андрэй.

— Я не панікую. Я ведаю, што кажу. Там, у самых блізкіх да Чарнобыля вёсках, туман стаіць. Дрэвы, дахі дамоў як бы ў бліскучай шэрані. Не працуе радыё, тэлевізары... Пыталі ў нас парады — самая ж гарачая пара там цяпер — сяўба ідзе. А што мы можам параіць? Не есці шчаўя, не піць малака, імкнуцца менш быць на паветры...

Але гэтага мала. Высяляць людзей адтуль трэба, ратаваць...

— Не перабольшваеш? — зноў падняў вочы, паглядзеў на Івана Андрэй.

— Дзівак ты, мне, сябру, не верыш? Вядома, я казаў ужо табе, не ўсё і я ведаю. Ды і хто, хто можа ўсё ведаць у такой справе, як энергія атамнага ядра? Асабліва калі рэактар з-пад людской улады выходзіць? Мы, вучоныя, таму так настойліва і дамагаемся, каб спыніць выпрабаванні атамнай зброі, наогул паставіць яе па-за законамі чалавечага існавання, забараніць яе ўжыванне, знішчыць. Аварыя ў Чарнобылі нагадае многім, што такое атам, якая гэта небяспечная, разбуральная сіла.

Іван пастаяў, падумаў. Потым сказаў:

— Зліквідаваць бы толькі гэтую аварыю, не даць бы, каб яна перарасла ў нешта большае і яшчэ страшнейшае.

— Ты, відаць, гэтым і займаешся? — спытаў Андрэй, бачачы, які сур'ёзны і задумлівы стаў Іван.

— Я — гэта я. Лепшыя розумы над гэтым дні і ночы думаюць. І ў Кіеве, і ў Маскве, і ва ўсім, можна сказаць, свеце. Аварыя ж гэта дыхнула тым, чаго ўсе баяцца, чалавецтва ўсё. І як мы з ёю справімся... залежыць будучыня не толькі атамнай энергетыкі, але і будучыня многіх мільёнаў людзей. Нарабілася ж такое, што не толькі нам, вучоным фізікам-атамнікам, на гады работы хопіць, але і біёлагам, заолагам, медыкам, глебазнаўцам ды і ўсім астатнім... Асабліва ў нас, у Беларусі...

— Чаму асабліва ў нас?

— Бо вецер у тыя дні дзьмуў у наш бок. І асноўная частка самых шкодных выкідаў рассеялася якраз у нашых мясцінах — на Гомельшчыне.

Падняў руку, паглядзеў на гадзіннік. І заспяшаўся раптам назад, да машыны.

— Выбачай,— сказаў ужо на хаду.— Мне трэба ехаць.

Андрэй як не подбегам засемяніў услед.

— Напалохаў ты мяне,— сказаў нібы ў одуме.— І ўцякаеш.

— Я давязу цябе да работы, гэта якраз мне па дарозе. І буду пазвоньваць, трымаць цябе ў курсе спраў. Калі, вядома, можна будзе.

— Неяк няпэўна ты ўсё гаворыш.

— Бо пэўнасці ў самога няма. Ні ў мяне, ні там,— махнуў, паказаў рукою ён на поўдзень, у той бок, дзе, як яму здавалася, быў Чарнобыль.— Ды і сам я не ведаю, дзе буду.

— Няўжо ўсё так сур'ёзна? — не даваў ніяк веры таму, што пачуў ад Івана, Андрэй.

— Дзівак, дзівак ты,— паківаў галавою, сказаў Іван, сядаючы ў машыну.— Няўжо мне цікава было б цябе палохаць.— І змоўк — паглыбіўся ў свае думкі.

Прыйшоў шафёр, дабрадушны, разважлівы Кандрат Кандратавіч — ён, задраўшы капот, нешта поркаўся ў маторы машыны і, выцершы анучкаю рукі, сеў за руль.

## 3

Хоць і не зусім верыў Андрэй усяму таму, што гаварыў пра аварыю ў Чарнобылі Іван, аднак усё адно ўстрывожыўся, захваляваўся. «Мала што ў горадзе, у Мінску, месца мне няма, дык і вёску яшчэ аднялі, не ўцячэш, не паедзеш туды. Як ваўка асочанага ў пастку заганяюць,— падумаў пра сябе, седзячы ў машыне. І калі, уехаўшы ў горад, рассталіся з Іванам, папрасіў спыніцца і выйсці — захацеў прайсціся пешкі па вуліцах, бо рана было яшчэ быць на рабоце, ды і рабіць асабліва не было чаго,— не пераставаў Андрэй думаць пра тое самае.— Вёска была, але цяпер і яе як бы няма. Хіба ўзяць ды на поўдзень, у дом адпачынку які-небудзь паехаць?»

Але тут жа, праз якую хвіліну, адагнаў ад сябе гэтыя думкі: «Як жа куды ехаць, калі гора, бяда такая. Ды і маці мая ж там... Ратаваць яе трэба. Бо калі не дай Бог здарыцца тое, што з бацькам...»

Не мог, не мог дараваць сабе Андрэй, што не спахапіўся ў час, не кінуў усё, не пасняшаўся ратаваць бацьку.

«На тым свеце ён даўно, у магіле. А калі яшчэ і маці...»

Трывога не пакідала Андрэя. І, прыйшоўшы на працу, перш чым брацца што-небудзь рабіць, звязаўся па тэлефоне са сваім раёнам. Нават са сваёю вёскаю. Папытаўся, што і як там, чым цяпер жывуць людзі. Якраз да тэлефона падышоў дырэктар саўгаса, якога Андрэй трохі ведаў — разы два-тры сустракаліся, калі прыязджаў ён, Андрэй, у вёску да маці, нават аднойчы разам за сталом пасядзелі, выпілі бутэльку гарэлкі, закусілі.

— Як вы там? — спытаў Андрэй.

— Ды нічога, сеем,— адказаў даволі стрымана дырэктар саўгаса.— Да першамайскіх свят рыхтуемся.

— А маці мая?

— Прыходзіла днямі, каб каня даў. Бульбу садзіць збіраецца. Ды і гной на поле вывезці трэба.

Падмывала, хацелася спытаць, як падзейнічала на рабочы настрой, наогул на ўсё жыццё ў вёсцы аварыя ў Чарнобылі. Але, падумаўшы, не стаў пра гэта пытаць. Калі сам дырэктар нічога не гаворыць, значыцца, і пытаць пра гэта не варта, не наганяць страху, панікі. Думаў ужо развітвацца, класці трубку, але дырэктар загаварыў раптам сам пра тое, што найбольш цікавіла Андрэя, чаму ён і званіў.

— Вы, мабыць, хацелі даведацца, ці радыяцыя дайшла да нас?

— Ну, але,— натхніў на размову дырэктара саўгаса Андрэй.

— У нас пра гэта нічога не чуваць. Вёска наша, як вы ведаеце, далёкая, лясная. А ў палявых вёсках, тых, што бліжэй да Чарнобыля, кажуць, яна ёсць. Але людзі і там працуюць — аруць, сеюць ды і ўсё астатняе, што трэба, робяць. Вясна ж. А вясновы дзень, як у нас кажуць, год корміць. Праўда, у раён наехала шмат чужых людзей. Міліцыя, салдаты... Мая жонка была якраз, калі тая самая аварыя здарылася, там, ля Чарнобыля. Ездзіла на экскурсію ў Кіеў. То, казала, там пажар, эвакуацыя людзей ідзе. А ў нас... Нібы ўсё нармальна. Так што вельмі не хвалюйцеся. Гэта замежная прапаганда гвалт на ўвесь свет падняла. А ў нас нічога, жывём, як і жылі...

«Ці не ведае дырэктар нічога, ці Іван дарэмна паніку падымае, страх наганяе? — падумаў Андрэй, закончыўшы размову з дырэктарам саўгаса і паклаўшы тэлефонную трубку.— Хаця... Дырэктар саўгаса таксама ж... І пра новых людзей — міліцыю, салдат — гаварыў, і пра пажар, эвакуацыю людзей... Каб усё там было добра, нармальна, ніхто б людзей не эвакуіраваў бы. Ды і міліцыю, салдат не прыганяў бы... Значыцца, не ўсё там нармальна... Але... І не ў такой, мабыць, ступені, як Іван гэта мне намаляваў».

Успомніў — з Івана Пастушка смяяліся ў вёсцы, кпілі, жартавалі. А ўсё праз тое, што аднойчы, як малы зусім быў, пайшоў ён у лес і на нешта жывое натрапіў. Так быў напалохаўся, што кош з грыбамі ў лесе пакінуў, а сам лататы даў — дадому ледзь жывы ад страху прыбег. Маці, бацька да яго: «Што здарылася?» А ў Івана твар як палатно, ажно гаварыць не можа. «Воўк мяне парваць хацеў».— «Дзе?» — узяліся распытваць і маці і бацька. «У Альсах».— «А які ён, той воўк, з сябе?» — «Мабыць, белы, мабыць, шэры, мабыць, паласаты»,— шаптаў, не

могучы апамятацца, Іван. Потым ужо высветлілася — і сам Іван не бачыў, хто там у кустах быў. Як пачуў, што заварушылася штосьці, зашастала — так і кінуў кош з грыбамі, даў драла з лесу...

«І тут, з гэтай аварыяй, ці не тое самае? «Мабыць, белы, мабыць, шэры, мабыць, паласаты...» Чуў Іван звон, ды не ведае, дзе ён...» — усміхнуўся сам сабе Андрэй. Але праз хвіліну зноў усумніўся ў правільнасці свайго аптымізму, смеху. «Іван цяпер не той вясковы хлапчук, а вучоны-атамнік. І не казаў бы ён мне ўсяго таго, што сказаў, каб не ўпэўнены быў у тым. Значыцца... Проста пакуль што не паведамляюць усяго, што там, у Чарнобылі...»

«А галоснасць?»

«Галоснасць галоснасцю, а паведамляць, калі на Захадзе ворагі гвалт паднялі... Ды і не ведаюць усяго яшчэ, можа. Гэта ж не абы-якая аварыя, а на атамнай станцыі. Справа, можна сказаць, новая, невядомая. І пакуль не высветлілі, не разабраліся...»

Паклікаў Люсю — Людмілу Апанасаўну, папрасіў, каб прынесла, падала яму свежыя газеты.

«Хоць прачытаю паведамленне ТАСС, як там падаецца ўсё. А то... Думаю пра гэта, а не чытаў, не чуў афіцыйнага паведамлення...»

Люся — Людміла Апанасаўна вярнулася з кіпай газет. І мясцовых, рэспубліканскіх, і маскоўскіх, цэнтральных. З прагнасцю накінуўся іх гартаць, чытаць. Так, усе газеты надрукавалі паведамленне ТАСС. Але ў ім не было нічога незвычайнага. Адбылася аварыя на атамнай станцыі ў Чарнобылі. Усе сродкі масавай інфармацыі Захада паднялі вакол гэтай аварыі гвалт. Створана дзяржаўная камісія па ліквідацыі аварыі. Вось, бадай, і ўсё. Небагата, каб строіць нейкія здагадкі. Звычайнае паведамленне, якія бываюць пасля розных аварый, няшчасных выпадкаў, крушэнняў, катастроф...

«Цікава, ці будуць яшчэ якія-небудзь паведамленні? Звычайна на тым і заканчваліся ўсякія паведамленні пра якія б там ні было няшчасці і аварыі».

«Трэба будзе ўвечары ўключыць тэлевізар, паглядзець праграму «Время»,— як бы завязаў сабе вузельчык на памяць, каб не забыць, Андрэй.

Зазваніў тэлефон. Незнаёмы жаночы голас спытаў, як ідзе падрыхтоўка дома адпачынку і піянерскага лагера да сезона. Пацікавіўшыся, адкуль звоняць — званілі з БРК прафсаюзаў,— далажыў: падрыхтоўка ідзе па плану, дом

адпачынку ўжо, можна сказаць, гатовы, а ў піянерскім лагеры заканчваюцца малярныя работы. Мінула некалькі хвілін — і той жа голас перадаў думку вышэйшага начальства — паскорыць падрыхтоўку да сезона, пастарацца, каб і дом і лагер гатовыя былі ў любы дзень прыняць і працоўных і піянераў.

«Чаму б гэта? — падумаў Андрэй.— Не было ж яшчэ такога, каб БРК прафсаюзаў цікавіўся, як падрыхтаваны піянерскі лагер і дом адпачынку да сезона».

«Новы, мабыць, стыль кіраўніцтва,— паклаўшы трубку, пачаў думаць, ходзячы па кабінеце, Андрэй.— Між іншым, правільна — цікавіцца гэтым трэба. Не толькі як хто працуе, але і як адпачывае. Бо ад адпачынку ж залежыць, як потым чалавек працаваць будзе. Адпачне добра, значыцца, з ахвоткаю і папрацуе, план не толькі выканае, але і перавыканае».

Загадаў Люсі — Людміле Апанасаўне абзваніць усіх, хто займаецца рамонтам і падрыхтоўкай да сезона піянерскага лагера і дома адпачынку, запрасіць на нараду. На нарадзе высветліў у дэталях, як ідзе падрыхтоўка да лета піянерскага лагера і дома адпачынку. Сёе-тое было зроблена, але сёе-тое і не. Не хапала рабочых. Не было і патрэбных матэрыялаў. Цяжкасці былі і з фарбамі, сродкамі дастаўкі. Сяму-таму наківаў, сяго-таго папярэдзіў, паабяцаў, што асабіста бярэ на кантроль гэтае пытанне. Даў прачуханца і свайму намесніку Клінцову Раману Мітрафанавічу. За тое, што падзапусціў гэтую работу, своечасова не сігналіў, не інфармаваў пра недахопы, як бы ўтойваў, хаваў іх.

— Трэба працаваць па-новаму,— паўтарыў ён тыя словы, якія былі цяпер на языку ва ўсіх.— Не чакаць указанняў. Кожны ведае свае абавязкі і павінен іх выконваць. І не проста выконваць, а рабіць усё як найлепш, душу ўкладваць у справу. Толькі тады толк і парадак усюды і ва ўсім будзе.

Не задаволіўшыся нарадай, паехаў сам на аб'екты. Пабываў у доме адпачынку, наведаў і піянерскі лагер. Сапраўды, дом адпачынку быў амаль гатовы, хоць сёння яго засяляй. Што ж да піянерскага лагера, то там фактычна не прыступалі яшчэ да падрыхтоўкі да сезона. Лагер, праўда, быў міжведамасны, аднак жа пакідаць усё так, як там было?

Вярнуўся ў Мінск, пазваніў дырэктару завода, на балансе якога і быў піянерскі лагер, напомніў, што трэба, каб

лагер гатовы быў прыняць піянераў і школьнікаў у любы дзень.

— Чаму такая спешка? — спытаў дырэктар.

— А гэта ты ўжо спытай у тых, хто вышэй за мяне,— сказаў як бы з загадкай Андрэй. І паклаў трубку.

Прыняў некалькі чалавек па асабістых справах, падпісаў паперы. У клопаце, мітусні нават забыўся пазваніць Іры. А калі ўспомніў, рабочы дзень ужо скончыўся.

«Хіба пачакаць, калі дадому яна прыйдзе? — падумаў.— Тады і пазваню? Папытаю, што здарылася, чаму раптам змяніла яна свае адносіны да мяне?»

Зноў заныла, быццам напятая струна, пад сэрцам.

«Трэба ж, каб усё збеглася разам. І Арцёма Гаўрылавіча на пенсію выправілі, і непаразуменне з Ірай, і ананімка гэтая, і прапанова Дзяміда Станіслававіча наконт маёй адстаўкі... А тут яшчэ і аварыя гэтая ў Чарнобылі... Думаў, у вёску, да маці, на месяц уцяку, схаваюся там ад усякіх клопатаў, перачакаю... Аж... Што хочаш, тое цяпер і рабі».

Даўно Андрэй заўважыў, ды і не адзін ён, што бяда адна ніколі не ходзіць, за сабою другую водзіць.

«А можа, і добра, што так. Бо калі б па адной беды прыходзілі... Адну збудзеш, другая на парозе стаіць... А так... Пачакаем, паглядзім, што далей будзе... Нават як бы цікава ўжо...»

Не стаў затрымлівацца на рабоце.

«Пешкі дадому пайду. І калі што — з тэлефона-аўтамата Іры пазваню»,— вырашыў.

Але калі накінуў на плечы плашч, як бы стрымаў, спыніў сябе.

«Заехаць бы да Іры, пагаварыць...»

«Але ж яна сказала, каб не смеў заязджаць».

«Мала што сказала! У яе, можа, якое гора. А я...»

Вярнуўся да тэлефона, пазваніў Іры дадому. Ніхто не адказаў. Значыцца, дома яе яшчэ не было. Так, на ўсякі выпадак, набраў рабочы нумар. Здзівіўся, што ў кабінеце нехта быў, падняў трубку.

— Ты, Іра? — радасна ўскрыкнуў ён.

Не, гэта была не Іра, а прыбіральшчыца. Яна сказала Андрэю, што Ірыны Пятроўны на рабоце няма, пайшла дадому. Падзякаваў прыбіральшчыцы, папрасіў прабачэння, развітаўся і паклаў тэлефонную трубку на месца.

«А можа, не званіць зусім? — падумаў.— Урэшце, хто яна мне такая, каб так хвалявацца, перажываць? Ну, пазнаёміліся з ёй, сышліся, нам удваіх добра было. А ця-

пер — разыдземся. І ўсё. Паступова забудзем адно аднаго. Ці мала як сыходзяцца і разыходзяцца людзі? Бо калі браць усё блізка да сэрца...»

«Але ж Іра не выпадковы чалавек. З Ірай было паразуменне, добра заўсёды мне. І вось так кідаць... Ды яшчэ калі папрокі нейкія... Не высветліўшы... Не, нядобра гэта».

Зноў падышоў да тэлефона, набраў хатні нумар.

«Раптам прыйшла, вярнулася ўжо дадому?»

Іры дома не было, не падымала яна трубкі, не адклікалася.

«Няйнакш дзесьці затрымалася. У магазін зайшла ці...»

«А раптам у яе новы паклоннік з'явіўся? — цюкнула, прыйшло раптам у галаву.— Ці з мужам зноў сышлася, паладзіла?»

Адчуў — шкрабанула, выбухнула раптам рэўнасць. Аддаваць каму б там ні было Іры не хацелася.

«Не можа быць, каб яна... Радая ж заўсёды мне была...»

«А цяпер гэтак жа радая іншаму, не табе,— як бы прадоўжыў хтосьці думку.— Хто ты ёй?» «Ты мне абрыд»,— успылі раптам словы, што пачуў, сказала Іра тады, калі апошні раз гаварылі, званіў ёй.

«Мала што сказаць яна можа?»

«І ўсё ж... Ды і даравáць?»

Пастаяў, падумаў.

Не выходзіла, ніяк не выходзіла з галавы Іра — стрэмкай сядзела, ныла і ныла, бы зубны боль.

«А яшчэ ж ноч наперадзе... І калі не пазваню... Не засну ж...»

Ведаў, добра сябе ведаў Андрэй. Варта было яму нешта не зрабіць ці зрабіць не так, як трэба было зрабіць, і ноч са звычайнай пераходзіла ў бяссонную. Абы-што лезла ў галаву, успаміналася, перабіралася да дробязей. І заўсёды так атрымлівалася, што, чым болей думаў Андрэй пра тое ці іншае, выходзіла, што ва ўсім ён, адзін ён вінаваты. І ён дакараў, дратаваў сябе. «Я, я ва ўсім вінаваты... Такі ўжо я чалавек, такі ў мяне характар...» І таму, каб такога не здарылася, Андрэй імкнуўся не пакідаць нічога няпэўнага, нявырашанага назаўтра, заўсёды рабіў усё так, каб потым не шкадаваць — трэба было так зрабіць, а зрабіў інакш.

Успомніў, згадаў: калі пазнаёміўся з Ірай, тое самае было. Лягла яна там, у гасцініцы, у Маскве, у пасцель да яго, а ён... Ці то разгубіўся, ці то збаяўся рабіць тое, што яна хацела, нават патрабавала. А пасля, назаўтра ж, надта перажываў, што гэтак абышоўся з ёю, думаў, пакрыў-

дзіцца, на ўсё жыццё пакрыўдзіцца Іра. Зноў жа, калі ўсё ў іх адбылося, блізкія адно аднаму яны сталі, быццам муж і жонка, перажываў, некалькі начэй не спаў. І сорамна было, што не ўстояў, паддаўся спакусе, і неяк непрыемна, вінавата адчуваў сябе перад Алай — здрадзіў жа ён ёй. І далей, што далей рабіць? Думаў — пасля першага разу больш нічога не будзе ў яго з Ірай. «Раз не ўстояў, але... Не, не будзе больш таго. Бо... Куды ж гэта годна — мець жонку, і...»

Трывожыла, не давала спакою і думка: «А што, калі жонка, Ала, пра ўсё даведаецца?.. Ды і як гэта — пабываўшы ў абдымках адной, ісці ў абдымкі да другой?»

«Не, не, нядобра так... Хопіць... Патушу пажар, пакуль не разгарэўся...»

Іра вабіла, цягнула да сябе. Было ў ёй нешта такое, што не давала яе забываць. І ён, Андрэй, не ўтрымаўся — зноў пайшоў да Іры.

Зноў дзень-два мучыўся, дакараў, дратаваў сябе і зноў не ўстояў.

А там і пайшло-паехала. Зусім на жонку, Алу, забыў. Ды і нелады з ёю пачаліся.

«А можа, і нелады таму пачаліся, што з Іраю я звязаўся? Жанчыны вельмі чуйныя да гэтага, нутром здраду адчуваюць, хоць пра яе і не ведаюць яшчэ. І Ала, можа, гэта адчула. І змяніла свае адносіны да мяне»,— падумаў.

«Усё, усё можа быць,— згадзіўся тут жа сам з сабою Андрэй.— І тое, што перастаў я выконваць волю Эльвіры Барысаўны, Алы... Гэта як вынік ужо маёй здрады, сувязі з Ірай... А не было б Іры — халоднасці ў мяне не было б да Алы, Эльвіры Барысаўны...»

«Але ж і калі б не было Іры, усё адно б я ўзбунтаваўся, не рабіў бы ўсяго таго, што мне загадвалі жонка і цешча. Рана ці позна, аднак бы я ўзбунтаваўся, не маўчаў бы, не быў бы такім папіхачом, як Арцём Гаўрылавіч...»

«Хто ведае, можа б, і не ўзбунтаваўся, лічыў бы, што так і трэба рабіць, жыць...»

Адагнаў ад сябе гэтыя думкі.

«Што думаць пра тое, чаго няма ці што было б. Ёсць тое, што ёсць, і пра яго трэба думаць, шукаць выйсця... І з працай як быць, і з жонкай, Алай. Ды і з Ірай...»

Паглядзеў на гадзіннік — было без пятнаццаці восем.

«Цікава, дзе Іра? Звычайна з працы яна спяшаецца дахаты. Забяжыць у магазін, купіць што-небудзь з яды — і дадому. А сёння...»

Зноў падышоў да тэлефона, набраў Ірын нумар — трубкі ніхто не падымаў. «Няхай, заўтра ўжо хіба пазваню».

І пайшоў, пакіраваўся нейкімі як бы не сваімі, чужымі нагамі да выхаду — настрой неяк ураз апаў, вяласць і абыякавасць агарнулі ўсё яго цела.

## 4

Дома, калі Андрэй адчыніў дзверы, аж не паверыў вачам сваім, убачыўшы ўсіх сямейнікаў — Арцёма Гаўрылавіча, Эльвіру Барысаўну і Алу — ля тэлевізара, няйнакш чакалі праграму «Время».

«Відаць, і ім хтосьці пра аварыю ў Чарнобылі нечага нагаварыў,— падумаў Андрэй, скідваючы з плячэй плашч і разуваючыся.— Цікава, што?»

Чакаць давялося нядоўга — з самага вялікага пакоя, які быў як бы за залу і дзе стаяў каляровы японскі тэлевізар, выйшаў Арцём Гаўрылавіч — высокі, лысы, у цёплай паласатай піжаме. Сказаў сваім добра пастаўленым, рахманым баском:

— Андрэй Анісімавіч, ці чуў ты што-небудзь пра радыяцыю?

— А што? — зрабіў наіўны выгляд Андрэй.

— Увесь свет пра гэта гаворыць. Кажуць, аж да Мінска дайшла.

— У страха вочы вялікія,— сказаў як бы з насмешкаю Андрэй.— Плёткі, мабыць.

— Не, не плёткі. Званіў я сяму-таму. Пацвярджаюць.

Выйшлі на калідор і Эльвіра Барысаўна, Ала. Абедзве ў джынсавых штоніках, у цёплых кофтах, хоць на дварэ і ў хаце не холадна было. Затараторылі наўзахапкі, перапыняючы адна адну:

— Гэта ж, мусіць, вельмі небяспечна. Нябачная смерць. Ходзіш, жывеш, а цябе забіваюць. Паволі, ты гэтага нават не заўважаеш.

— А яда? Яна ж уся атрутная будзе. Ды і праз паветра, ваду...

— Кажуць, ёд трэба піць. Па дзве кроплі на дзень. І на вуліцы менш бываць.

— У зямлі не капацца. А нам жа на дачы сёе-тое трэба пасеяць. Хіба наняць каго? — гэта сказала з роздумам, заклапочанасцю Эльвіра Барысаўна.

«Быццам і адчужанасці ніякай не было,— падумаў,

слухаючы Эльвіру Барысаўну і Алу, Андрэй.— Вось што значыць гора. Недарэмна кажуць — гора зближае людзей».

— У вас там, на рабоце, нічога не чутно? — пытаў у Андрэя, дамагаючыся свайго, Арцём Гаўрылавіч.

— Не,— адказаў як можна спакойна Андрэй.

— Што, ніхто ніадкуль зверху не званіў? — як бы здзівіўся Арцём Гаўрылавіч.

— Не. Хаця...— успомніў Андрэй пра званок з БРК прафсаюзаў.— Цікавіліся, ці гатовы да сезона дом адпачынку і піянерскі лагер. Прасілі, каб як хутчэй іх падрыхтавалі.

— Значыцца, і ў нас да эвакуацыі людзей рыхтуюцца,— апусціў свой загнуты, ястрабіны нос Арцём Гаўрылавіч.

— Якіх людзей? — спытала са страхам у голасе Ала.

— Ды тых, што ў раёне аварыі апынуліся.

Нейкую хвіліну панавала маўчанне. Потым загаварыла Эльвіра Барысаўна.

— Нам бы таксама куды-небудзь з'ехаць,— сказала як бы з уздыхам яна.

— Давайце на Чорнае мора паедзем,— прапанавала Ала.

— Не, куды заўгодна, толькі не на Чорнае мора,— рашуча закруціла сваёю вялікаю калматаю галавою Эльвіра Барысаўна.

— Гэта чаму ж? Мама, ты ж раней так любіла Чорнае мора...

— На Чорнае мора цяпер небяспечна ехаць. З Прыпяці розны бруд сплыве ў Дняпро, а па ім і ў Чорнае мора...— растлумачыла, як малому дзіцяці, Эльвіра Барысаўна дачцэ.

— А-а,— непрыгожа скрывіла нафарбаваныя губы, ледзь не загаласіла тая.— Дык што, я ніколі ўжо там і не пабуду, не пакупаюся?

— Ала, ты ж дарослы чалавек, павінна сама ўсё разумець,— папракнула дачку маці.

— Не спяшайцеся з вывадамі,— з выглядам мудраца сказаў Арцём Гаўрылавіч.— Пачакайце. Можа, Андрэй і праўду кажа — у страха вочы вялікія... Далейшае пакажа, як і што рабіць.

— У цябе ж фізік-атамнік знаёмы, Пастушок гэты, пазваніў бы яму, пацікавіўся,— папрасіла Ала.

— Не падымайце панікі,— яшчэ раз ацверазіў усіх Арцём Гаўрылавіч.— А то раскудахталіся, як куры. Цэлы

дзень ля тэлевізара сядзяць, паведамленняў нейкіх незвычайных чакаюць. Ды і на вуліцу баяцца выходзіць. Можа, сапраўды плёткі гэта, балбатня. Ну, адбылася аварыя, ліквідуюць яе, і ўсё.

— Каб жа так,— неяк злорадна, яхідна заўсміхалася Эльвіра Барысаўна.— Але ж каму я ні званіла, усе ўстрывожаны гэтым, шукаюць пуцёвак, каб куды-небудзь уцячы, не сядзець у Мінску. Ды нават і без аварыі гэтай... Пара б падумаць, куды паехаць у адпачынак... Не сядзець жа ўсё лета на дачы?

— Ага, ага,— падтрымала маці Ала.— Гэта ж такая сумоцішча, гэтая дача. Асабліва як задажджыць. Дзень і ноч сядзіш, быццам у мяшку. Ні пайсці куды, ні паехаць...

— Андрэй,— перапыніла дачку Эльвіра Барысаўна, звярнулася да зяця,— як там у цябе наконт пуцёвак? Можна спадзявацца?

— Не ведаю,— каб не адказаць нічога пэўнага, з напускной абыякавасцю сказаў Андрэй,— не цікавіўся.

— Дык ты, калі ласка, пацікаўся,— не то папрасіла, не то загадала Эльвіра Барысаўна.— І не цягні. Калі пуцёўкі ёсць, дык мы і паедзем. Можа, нават на ўсё лета.

— Не ведаю,— паціснуў плячыма Андрэй.— Цяпер гэтая перабудова, праверкі розныя. Ды і галоснасць...

— Ну дык і што? — падняла вочы на Андрэя, паглядзела строга, коршунам Эльвіра Барысаўна.— Няхай ужо чужым, знаёмым... Але каб і сабе не ўзяць тое, што трэба?..

— Не прыставай да чалавека,— заступіўся за Андрэя Арцём Гаўрылавіч.— Бачыш, з працы вярнуўся. Мабыць жа, і стаміўся.

Андрэй нічога не адказаў — пачалася праграма «Время», і ён моўчкі прайшоў у залу, сеў у крэсла, што стаяла ў баку ад астатніх і лічылася як бы яго. Дыктар і дыктарка, якіх ён чамусьці недалюбліваў, мо таму, што яны неяк занадта ўжо казённа і быццам абыякава чыталі розныя паведамленні, не ўкладваючы ў словы свае душы, расказвалі, дзе што робіцца па краіне. Няйнакш знарок было паказана некалькі сюжэтаў з тых раёнаў, якія былі паблізу Чарнобыльскай атамнай станцыі — і з Украіны і з Беларусі. Там поўным ходам ішла сяўба. Трактары цягалі па полі сеялкі, на сеялках стаялі людзі...

— Ну вось, усё, значыцца, у парадку,— усклікнуў Арцём Гаўрылавіч.— Сеюць, працуюць. Выходзіць, плёткі ўсё гэта наконт радыяцыі. Замежная прапаганда.

— Не, Арцём, пачакай, не спяшайся з вывадамі,— спыніла разважанні мужа Эльвіра Барысаўна.— Я ўсё ж больш веру тым людзям, з якімі я размаўляла, чым тэлебачанню.

— І я таксама,— усміхнулася, паглядваючы на Андрэя, як бы заігрываючы з ім, Ала.

Дыктар і дыктарка пачалі расказваць, што робіцца за мяжою. І Андрэй, бачачы, што ніякіх паведамленняў не будзе пра тое, што яго цікавіла, падняўся і пайшоў у свой пакой. Пераадзеўся ў піжаму, схадзіў у ванну, прыняў душ — усё ж, як бы там ні было, а Іванава перасцярога падзейнічала на яго. Ды і не сядзеў жа цэлы дзень у кабінеце, ездзіў, хадзіў.

«Ліха ведае, што з гэтай радыяцыяй? Ды і з аварыяй той,— падумаў.— Тэлебачанне нічога не перадало, а Іван гаварыў, што не ўсё там, у Чарнобылі, у парадку. Ды і плёткі ж, што сабралі за дзень Эльвіра Барысаўна з Алай... Не, дыму без агню не бывае... »

Хацелася, як бывала, калі толькі што жаніўся, прыйшоў да Арцёма Гаўрылавіча ў дом жыць, пасядзець за сталом ля самавара, чаго-небудзь з'есці, выпіць кубачак добрага духмянага чаю. Але... Андрэй перамог у сабе гэтае жаданне, не пайшоў на кухню. Мо таму, што пачуў, як туды гурмою, адно за адным, адразу ж, як толькі скончылася праграма «Время», падаліся Эльвіра Барысаўна, Ала і Арцём Гаўрылавіч.

«Зноў пра радыяцыю, пуцёўкі гаварыць будуць,— падумаў.— А мне... Хаця... Можа, і праўда куды-небудзь з'ехаць? Не дадому, у вёску, дык на курорт? Усё ж тут не буду...»

«З Эльвірай Барысаўнай, Алай...» — як бы засупраціўлялася нейкая думка.

«Можна і без іх... Іх у адно месца паслаць, самому паехаць у іншае?»

«Таксама нядобра. Ала ж жонка. Каб у розны час... Ды і з Ірай як жа? А мо... Алу з маці паслаць у адзін дом адпачынку, а самому паехаць у іншы... Узяць з сабою Іру...»

«Данясуць жа. І жонцы, ды і... А тут ананімка гэтая. І так правяраць будуць. Навошта дадатковыя факты?..»

«І то праўда».

«Але ж і тут аставацца? Ды яшчэ калі дадалася радыяцыя...»

«А маці? Там жа, у вёсцы, маці...»

Адчыніла дзверы, зайшла ў пакой Ала. Паглядзела як бы вінавата на яго, Андрэя, села на канапу, усміхнулася. Сказала з роздумам, нават страхам:

— А ведаеш, што радыяцыя найперш б'е на спадчынны код?

— Ну і што? — спытаў стомлена, без цікавасці Андрэй.

— Як гэта што? — вырачыла вочы Ала.— У нас жа дзяцей няма.

«Гэта нешта новае,— мільганула маланкай у галаве ў Андрэя.— Цікава, цікава».

— А хто ж табе не даваў, трэба было раджаць,— сказаў так, на ўсякі выпадак, ён.

— Ведаеш, я так баялася,— пачала гарнуцца бліжэй да Андрэя Ала.— І ўсё адцягвала, адцягвала...

— Ну, а цяпер жні тое, што пасеяла,— не адпускаўся, быў, як часта ў апошні час, жорсткі Андрэй.

— Можа, цяпер хіба ўзяць ды зацяжараць,— глядзела адданымі, нейкімі быццам памаўзлівымі вачыма Ала.

— Цяпер...— задумаўся на хвіліну Андрэй. І не знайшоў нічога іншага, як усміхнуцца. Яхідна, кпліва: — Дык цяпер жа радыяцыя...

— Можа, яна яшчэ не вельмі падзейнічала,— не зразумела Андрэя Ала.

— Дык яшчэ падзейнічае...

— І праўда,— згадзілася з Андрэем адразу ж Ала.— Аварыя не ліквідавана ж.

— Вось іменна,— ухапіўся за яе думку Андрэй — заводзіць з Алай дзяцей, ды яшчэ цяпер, калі бурыліся, проста руйнаваліся адносіны... не хацелася. І радыяцыя гэтая як выратаванне. Цікавасць жа, якая была ўзнікла, калі Ала загаварыла пра неабходнасць мець дзіця, перарастала ў насцярожанасць — што, што змянілася? Напалохала Алу, што ў час, раней не нарадзіла яна дзіцяці, ці... Памянялася нешта ў адносінах. А можа... Маці, Эльвіра Барысаўна, падказала ёй. Спалохалася — Арцём Гаўрылавіч без улады. Ды яшчэ калі страцяць і яго, Андрэя?..

«Можа, можа такое быць. А калі так, дык выходзіць — не яны ананімку на мяне напісалі, не па іх указанню. Хоць гэта высветліў, і то добра...»

Ала ж лесцілася, гарнулася да Андрэя — абдымала яго, цалавала. Як усё адно ў тыя, ранейшыя часы, калі пажаніліся.

«Ці згаладалася, ці нешта іншае»,— думаў Андрэй, застаючыся халодны і быццам безуважны.

— Ты, мусіць, на мяне пакрыўдзіўся? — урэшце прашаптала Ала, спрабуючы зазірнуць у вочы.— Але за што, за што, скажы?

Андрэй маўчаў. Ды і што, што ён мог сказаць? Праўду, усю праўду? Але ж... Ці зразумела б яго Ала? Ды і гаварыць усю праўду ён, як хутка зразумеў, не гатовы быў. Духу не хапала. Ды і... Страшна было гаварыць праўду. Даўно ж ён нікому яе не гаварыў. Бо ведаў, адчуваў — варта сказаць праўду, прызнацца ва ўсім — і ён... Не той будзе ўжо, не такі, якім быў, якім яго лічылі, прывыклі бачыць. А так быццам заставалася ўсё, як і было дагэтуль, і ён заставаўся тым, кім быў. І для сябе, і для другіх, а найперш, вядома, для яе, жонкі.

— Няхай, не будзем пра тое,— сказаў неяк вяла і неахвотна ён, Андрэй.— Што было, тое было...

— А што, што было? — нічога не разумела, хацела ведаць, выпытаць Ала.

І каб спыніць Аліны роспыты, прытворна пазяхнуў, сказаў:

— Я вельмі стаміўся... Да таго ж дрэнна ў апошні час сплю.

— Я гэта, між іншым, заўважыла,— пpыняла яго бяду, як сваю, Ала.— А чаму? Ды таму, што... О, маладому, здароваму мужчыне, я гэта ведаю, трэба, каб пад бокам жанчына была... Не хочаш да мяне ў спальню прыходзіць, дык я да цябе сама ў кабінет хадзіць буду...— заўсміхалася, закатваючы хітра вочкі, Ала.

І пацягнулася пажадліва, прыпала прагна сваімі вуснамі да яго вуснаў...

## 5

Назаўтра з самай раніцы была нарада, потым яшчэ адна — з тых нарад, якія заўсёды бываюць перад вялікімі святамі і на якія выклікаюцца кіраўнікі розных арганізацый і ўстаноў, каб каму выступіць са справаздачай, каму пачуць, што яшчэ трэба ў бліжэйшыя дні зрабіць ці дарабіць — набліжаўся ж Першамай. І да сябе на працу Андрэй прыехаў толькі пасля абеду. Зайшоў у прыёмную — і разгубіўся. Люся — Людміла Апанасаўна, такая ветлівая і заўсёды ў самым лепшым, які толькі можа быць, настроі, цяпер сядзела за сталом і плакала, румзала.

— Што здарылася, што з табою, Люся? — спытаў устрывожаны Андрэй.

— Ды... Ды, Андрэй Анісімавіч,— падняла галаву ад стала, паглядзела на яго нейкімі новымі, незразумелымі вачыма Люся — Людміла Апанасаўна.— Мяне ў партбюро выклікалі...

— Ну і што? — нічога не зразумеў Андрэй.

— Ведаеце... Там мне казалі... Быццам я ваша палюбоўніца... Змушалі прызнацца...

Люся зноў апусціла ў стол галаву, і плечы яе закалаціліся ад рыданняў.

— Хто казаў, хто змушаў прызнацца?

— Да тыя, хто там быў...— аж не магла гаварыць ад слёз, крыўды і абурэння Люся.

— А хто там быў?

— Ігар Віктаравіч... І яшчэ двое, незнаёмых... З гаркома... Камісія.

— Якая камісія?

— Ну, Ігар Віктаравіч кажа, што вас, вашу работу правяраюць...

Ігар Віктаравіч Качан быў парторг. І Андрэй, зайшоўшы ў свой кабінет, пазваніў яму. Парторг быў на месцы.

— У цябе там нікога з чужых няма? — спытаў Андрэй, павітаўшыся.

— Не, няма,— адказаў па звычцы гучна, па-маладому Ігар Віктаравіч.

— То, можа б, да мяне зайшоў?

— Проста цяпер?

— Ага.

— Добра.

І хвілін праз колькі Ігар Віктаравіч быў ужо ў яго кабінеце — быццам вырас у дзвярах. Высокі, па-спартыўнаму падцягнуты, адпрасаваны і зашпілены на ўсе гузікі. Ігар Віктаравіч як вучоны быў так сабе, нічым асаблівым не вылучаўся, але партыйную работу любіў. Хлебам яго не кармі, а дай магчымасць сход сабраць, выступіць ці штонебудзь арганізаваць. Няхай бы, можна было б і гэта яму дараваць, калі б ён рабіў партыйную работу і менш умешваўся б у не свае справы. Але з нейкага часу партыйнае бюро атрымала права кантролю над адміністрацыяй, і Ігар Віктаравіч усю сваю ўвагу скіраваў якраз на гэта. Кантралёраў і так хапала — і з райкома, і з гаркома, і з абкома. У арганізацыі павінны былі быць работнікі, а не кантралёры. І на гэтай глебе ў Андрэя з Ігарам Віктаравічам адбылося некалькі не зусім прыемных размоў і нават

стычак. Адчувалася — за спіною Ігара Віктаравіча нехта стаяў, падтрымліваў, нацкоўваў яго на Андрэя.

— Сядай,— запрасіў Ігара Віктаравіча Андрэй сядаць на крэсла ля прыстаўнога століка. Сам таксама сеў не за свой стол, а насупраць Ігара Віктаравіча.

— Што вы там робіце? — не спытаў, а хутчэй сказаў паблажліва, не спускаючы вачэй з Ігара Віктаравіча.— Навошта людзей да слёз даводзіце?

— Вы пра Люсю? — апусціў свае вочы ў стол Ігар Віктаравіч.

— Ды хаця б і пра яе...

— Я казаў, што гэта няпраўда,— не падымаў вачэй ад стала Ігар Віктаравіч.— Мне не паверылі...

— Хто не паверыў?

— Ды з гаркома... Пятрашкін і Заняпалаў... Вы іх, пэўна, не ведаеце, новыя там работнікі. Даручылі ім ананімку на вас праверыць...

— Што ў той ананімцы?

— Вам хіба не паказвалі? — здзівіўся Ігар Віктаравіч.

— Не.

— Як жа гэта так? — аж адкінуў галаву, паглядзеў на Андрэя Ігар Віктаравіч.— А я думаў, вы ўсё ведаеце, у курсе...

— Гаварыць-то мне гаварылі, але каб паказваць... Ці пазнаёміць, што там... Не, не паказвалі, не знаёмілі...

— Дык я раскажу... Хоць... Надта ж бруду там многа... І злосці, лютай злосці... Хтосьці вас вельмі ненавідзіць. Ну, што вы сваяк, зяць Арцёма Гаўрылавіча, таму нікога і нічога не баяліся. Арганізацыю ператварылі ў сваю вотчыну. Акружылі сябе падхалімамі... Не працуеце... Уладкоўваеце да сябе ў інстытут толькі па знаёмству... Пуцёўкі не так, як трэба, размяркоўваеце... Пра перабудову... Ну і пра Люсю...

— І што праверка паказала?

— Ну, сёе-тое, вядома, пацвярджаецца. Што вы зяць Арцёма Гаўрылавіча, напрыклад. Але вы гэта і не хавалі. Што сяго-таго на працу ўзялі... Але ж гэта прэрагатыва, права ваша як дырэктара... Ну, а ўсё астатняе... На кожнага кіраўніка гэта можна напісаць. Там, праўда, адна дэталь ёсць, за якую я і ўчапіўся...

— Якая дэталь? — глядзеў, не спускаў вачэй з Ігара Віктаравіча Андрэй.

— Ну, надта ж ужо расхвальваецца ваш намеснік Клінцоў Раман Мітрафанавіч. Такі ўжо ён добры — ну

святы, хоць ікону з яго малюй. Думка мне прыйшла — ці не з яго каманды гэтую ананімку хтосьці напісаў?..

— А што — у яго каманда ёсць? — зрабіў выгляд, быццам здзівіўся, Андрэй.

— Ды нібыта. Мяне неяк нават хацеў уцягнуць. Ды я... Не з тых... Як толькі ўбачыў, куды хіліць... Дык і ўбок. Ён,— паглядзеў навокал сябе, ці ніхто іх не слухае, Ігар Віктаравіч і ўжо значна цішэй дадаў: — На ваша месца меціць. Гэта — каб вы ведалі. Групу па захопу ўлады рыхтуе...

— А ты?

— Што я,— пацiснуў плячыма Ігар Віктаравіч.

— Як што — ты ж парторг? У цябе ж свая лінія павінна быць.

— Яна ёсць, і я яе праводжу. Бачыце,— памяўся, перайшоў амаль на шэпт Ігар Віктаравіч,— у камісіі нас трое. Пятрашкін вельмі ж супраць вас настроены, няйнакш хтосьці яго падкруціў. Ён і давёў да слёз Люсю. А Заняпалаў за справядлівасць. Вось я і настояў, каб праверылі, хто пісаў ананімку. Тое, што там праўда, тое праўда. Але ж навошта бруд на чалавека выліваць? Ды і хавацца?

Адлягло трохі ад сэрца ў Андрэя. «Значыцца, ананімка не страшная, не тое, што я думаў». Аж уздыхнуў з палёгкай. Ігару ж Віктаравічу сказаў:

— Калі ўжо ўзяліся правяраць, хто напісаў ананімку, то няхай падымуць і іншыя, ранейшыя... І што на мяне паступалі, ды і на іншых супрацоўнікаў таксама. Здаецца мне, што гэта адзін і той жа чалавек іх піша. Бо, калі па шчырасці прызнацца, падазрэнне ў мяне даўно на Клінцова падае. Успомніў я, як ён павышаецца. Паступіла ананімка на загадчыка, ён заняў яго месца. Паступіла ананімка на майго намесніка — зноў Клінцоў заняў яго месца. Цяпер адна за адной на мяне ананімкі пасыпаліся... Ды быццам пакуль не прыйшоў сюды да нас працаваць Клінцоў, і не было ў нас ананімак.

— А гэта думка, падкажу Заняпалаву. І няхай праверыць... А што да вас, Андрэй Анісімавіч? Няма там, у той ананімцы, ніякага крыміналу. Хутчэй бруд. Злосць. І, можа быць, добра, што вам тую ананімку не паказалі.

— Хто яго ведае, добра гэта ці дрэнна,— сказаў Андрэй.— Паглядзім, час пакажа.

І, каб забыць пра ананімку, перавёў размову на іншае:

— Я з нарад перадсвяточных вярнуўся. Як там у нас да першамайскіх свят ідзе падрыхтоўка?

— Ды быццам усё ў парадку, я дакладваў у райкоме.

— А якія наогул праблемы ёсць?

— Бюро трэба было б сабраць, сход правесці.

— Па якім пытанні?

— Ну, на бюро пра сход трэба пагаварыць. Ды і з міліцыі папера прыйшла. Пракопчыка п'янага злавілі...

Пракопчык — гэта было прозвішча чалавека, якога ён, Андрэй, не так даўно залічыў на працу. Па просьбе якраз Пятра Кірылавіча. Ці то жончын брат, ці то так хтосьці. Словам, сваяк, «пазваночнік».

— Што, ён член партыі?

— На ўлік дзён колькі як узяўся.

— І што ён зрабіў?

— Нічога асаблівага. Выпіў недзе з сябрамі і ў таксі, кажа, сеў, каб дадому заехаць. А таксіст пачаў патрабаваць дзесятку. Пракопчык засупраціўляўся, дзесятку даваць не хацеў. Той і завёз Пракопчыка ў міліцыю.— Ігар Віктаравіч засмяяўся.

— Чаго ты? — паглядзеў на Ігара Віктаравіча Андрэй.

— Працяг далей цікавы, мне сам Пракопчык расказваў.

— Ну? — як бы падагнаў, прыспешыў Андрэй Ігара Віктаравіча.

— Пракопчык не астаўся ў даўгу перад таксістам. Паквітаўся. Сказаў у міліцыі, што не старгаваліся яны з таксістам. Мала таго што дзесятку той вымагаў за праезд, дык яшчэ і гарэлку прапаноўваў, па пятнаццаць рублёў за бутэльку. Адчынілі багажнік, а там сапраўды гарэлка. Пяць бутэлек...— не пераставаў смяяцца Ігар Віктаравіч.— Словам, падкузьмілі адзін аднаго.

— Што, з партыі трэба выключаць?

— Выходзіць, што так.

— А сход на якую тэму ты думаеш правесці?

— Ды пра перабудову пара б пагаварыць. Нават у ананімцы пра гэта пішуць ужо. Думка такая ёсць, каб даклад зрабілі вы,— глядзеў у вочы Андрэю Ігар Віктаравіч.

— Гм,— гмыкнуў Андрэй.— Наогул, сход такі трэба правесці. Але ці гатовы мы?

— Ну, калі не гатовы, дык падрыхтуемся. Час жа ёсць.

— Параіцца з сім-тым трэба было б. Каб не паперад бацькі...

— Ну, вядома. Але ж і чакаць, пакуль усе правядуць такія сходы, перабудуюцца, а тады ўжо мы... Ды і райком патрабуе.

— Добра,— згадзіўся ўрэшце Андрэй.— На калі ты сход гэты назначаеш?

— Ну, бюро правядзём дзесьці адразу пасля майскіх свят. А сход пасля Дня Перамогі.

— Давай рыхтуй. Больш ніякіх праблем і пытанняў няма?

— Не,— адмоўна хітнуў галавою Ігар Віктаравіч.

— Калі ўзнікнуць — заходзь. А то ты нешта не часта ў мяне бываеш.

— Ведаеце, не было з чым заходзіць.

— А Пракопчык?.. Ды і ананімка гэтая, праверка?..

— Гэта ўсё сёння... Як гром з яснага неба... Я якраз сам збіраўся зайсці да вас, ды вы пазванілі.

— Ну, правярайце, правярайце, толькі да слёз людзей не даводзьце. Люся ж маладая, ёй замуж трэба выходзіць. Жаніха б ёй падшукалі. А вы — палюбоўніка...

— Я ж казаў вам, гэта Пятрашкін... Нехта яго нацкаваў. Ён і па іншых фактах усё лез, прыдзіраўся.

— І што вы па выніках праверкі напісалі... Ці пісаць будзеце?

— Нічога асаблівага. Як звычайна пішуць — факты не пацвердзіліся. Што ж да перабудовы, дык дзе яна надта пакуль што пачалася? Усе ж чакаюць указанняў, адкуль і як яе пачынаць. І мы чакаем. А калі трэба, настойваюць? Пачнём.

— Што ты маеш на ўвазе?

— Ну-у, нешта ж трэба рабіць.

— А канкрэтна што?

— Канкрэтна? — пацiснуў плячыма Ігар Віктаравіч.— Не ведаю.

— І я таксама не ведаю,— прызнаўся Андрэй.— Ведаю толькі — з сябе перабудову пачынаць трэба. Каб да сябе стражэйшым быць. Ды і да іншых. Каб сумленна жыць. Без усякіх выгод, адносіны чыстыя між людзьмі былі, без блатаў, званкоў... Справядлівасць усюды і ва ўсім каб запанавала. Каб не баяліся людзі праўды ў вочы адзін аднаму гаварыць. Ды і працавалі не так, як працуюць. Але гэта, як я мяркую, за адзін-два дні, нават гады не зробіш. На гэта час трэба і перабудова... Гэта не на месяц-два, а надоўга. І бяда, што некаторыя гэта прынялі як чарговую каманду, кампанію. Узяліся кадры перастаўляць. Вядома, і гэта трэба, але ж гэтага мала, зусім мала...

— Ну-у, Андрэй Анісімавіч, вас хоць сёння выпускай на трыбуну,— заўсміхаўся, падымаючыся з-за століка,

Ігар Віктаравіч.— А яшчэ хваляваліся, пыталі ў мяне, што гаварыць.

— Сказаць-то я знайду што. Але ці зразумеюць мяне людзі? Не прывыклі ж мы гаварыць на сходах па шчырасці, без паперак. Дый... Калі на тое пайшло, каб так гаварыць, самому трэба быць крыштальна чыстым. А мы ж... Усе, не толькі я, працавалі ў іншых умовах... І сам ведаеш, рабілі не заўсёды тое і так, як сумленне падказвала. Указанні зверху выконвалі. А яны, гэтыя ўказанні, розныя ж былі... Замест таго каб навукай, доследамі займацца, мы бульбу капалі, памідоры, моркву перабіралі, вуліцы мялі... Нарады, пасяджэнні нікому не патрэбныя праводзілі... Быццам не вельмі і вінаваты мы ва ўсім гэтым... І разам з тым — вінаваты...

— Усё так, правільна. І сход такі... Як бы ачысціцца ад усяго, што дасюль не лепшае было, што не давала жыць і працаваць сумленна... Трэба!

— Давай паспрабуем правесці.

Ігар Віктаравіч пайшоў з кабінета, а Андрэй, падняўшыся з крэсла, задумаўся. У які раз задумаўся над тым, пра што думаў усе апошнія дні — што рабіць? Небяспека быццам ад яго адведзена, мінавала, не ўдалося камусьці вось так адразу з ходу ўтапіць яго. Але ж... Сам, сам адчуваў ён — не можа ён, не мае права быць кіраўніком, надта ж заблытаўся ў розных цянётах. Як жа заклікаць да перабудовы, жыць і працаваць па-іншаму ўсіх, калі сам...

«Зноў пачакай, не гарачыся,— быццам перапыніў яго думкі хтосьці.— Жыццё мудрэй за ўсіх. Бачыш, здавалася дзень-два таму назад безвыходная сітуацыя. І з працай, і хатнія справы... А тут яшчэ і ў вёску, дадому, ехаць нельга. А бачыш жа — ананімка тая стрэліла міма цэлі, і дома, з Алай, быццам памірыліся, наладжваецца ўсё...»

«Э-э, не спяшайся! Нічога не змянілася. Хіба толькі ананімка лопнула, як бурбалка. А астатняе ж...»

«І ўсё ж гарачыцца не варта. І панікаваць таксама. У жыцці ўсякае бывае. Пад'ёмы і спады, радасці і няшчасці. Пара прывыкнуць да гэтага. І цярпліва, мудра на ўсё рэагаваць».

Вярнуўся да стала, сеў у крэсла — трэба было брацца за справы, працаваць.

# Нябачная смерць

## 1

Надышлі першамайскія святы, і Андрэй, каб не сядзець у горадзе, паехаў на дачу. Зграбаў леташняе, ужо збуцвелае за зіму лісце і бадылле і разам з паабразаным голлем, што ляжала ў лоўжыках па ўсім гародзе і сохла, зносіў у кучу і паліў. Густы, з гаркатою дым слаўся па зямлі, падымаўся над дрэвамі, раставаў, паволі, бясследна знікаў у блакітнай прасторы неба, якое было, як здаецца ніколі яшчэ, высокае і чыстае. І Андрэй, абапёршыся на дзяржанне віл, глядзеў, праводзіў вачыма дым і думаў, што гэтак жа, мусіць, і ўсё знікае — думкі, пачуцці, мары, ды, урэшце, і сам чалавек, не пакідаючы асабліва нідзе і ні на чым свайго знаку, сваіх слядоў. Потым, ачысціўшы пляц, узяў рыдлёўку і пачаў капаць. Гэтую работу Андрэй любіў — можа, таму, што яна напамінала дамоўку, самы шчаслівы яго час — дзяцінства, юнацтва, калі жыў у вёсцы і кожную вясну памагаў маці і бацьку сеяць соткі. І цяпер, як Андрэй адзначыў неўзабаве для сябе, яго гэтак жа, як і тады, п'яніў пах свежаўскапанай зямлі і гною.

«Хто ведае, буду есці я тое, што пасаджу сёлета тут, на дачы, ці не буду,— думаў Андрэй,— а ўскапаю, пасаджу... Няхай расце. Не я спажыву, дык нехта іншы...»

Думка пакінуць Алу, пайсці з сям'і Арцёма Гаўрылавіча не выходзіла з галавы. Хоць адносіны з Алай быццам і паляпшаліся, наладжваліся, аднак той ранейшай блізкасці ды і шчырасці не было. Нейкая нябачная не то канава, не то мяжа была між імі. Нават калі ў пасцелі разам ляжалі...

«Ва ўсім Ала вінавата, надта ж мамку сваю слухалася... Ды і я таксама ж... Чаго можна ад мяне чакаць, калі я пабыў у ложку з іншай жанчынай...»

Няёмкасць, халоднасць, адчужанасць і як бы непамыснасць адчуваліся ў адносінах з жонкай, хоць ён, Андрэй, імкнуўся гэта і хаваць, не паказваць. Дый, калі шчыра прызнацца, толькі цяпер Андрэй зразумеў, чаму так вабіла, цягнула яго да сябе Іра — не параўнаеш яе, ніяк не параўнаеш з жонкаю — надта ж нецікавая Ала была ў ложку.

«Каб не пазнаёміўся з Іраю, то і не ведаў бы, якія бываюць жанчыны»,— думаў Андрэй. І шкадаваў, шкадаваў, што так неспадзявана з Ірай усё скончылася.

«А можа, можа, усё яшчэ і не скончылася? — думаў, строіў здагадкі Андрэй.— Проста непаразуменне. Першае і таму такое балючае. Няйнакш нехта ёй нечага нагаварыў. Але хто? І чаму, навошта?»

Дні стаялі пагодлівыя, цёплыя. Толькі раз быццам нахмарыла, пакрапаў невялікі дождж. Начаваць на дачы і то было няхоладна. Спявалі жаўранкі, бегалі па полі надта ж шустрыя і дзелавыя шпакі. А ўранні, калі прачынаўся, аж глух ад цішыні — дача стаяла пры лесе, далёка ад чыгункі і шасэйных дарог, да таго ж на астатніх дачах, што былі паблізу, яшчэ ніхто не жыў. І Андрэй адпачываў, гаіўся душою і целам.

«Каб не гэты куточак, даўно б збег з горада. А так хоць трошкі ды адпачнеш калі-нікалі,— думаў Андрэй.— І на добры лад, трэба было б і жыць увесь час тут. А на працу ездзіць. Як гэта робяць у многіх краінах. Але ў нас... Такой завядзёнкі няма».

Пра аварыю, пра тое, што адбылося ў Чарнобылі, неяк забылася. Тэлебачанне пра гэта больш не напаміпала, не напамінаў і Іван Пастушок. Ён наогул недзе як праз зямлю праваліўся — знік. Праўда, ён папярэджваў Андрэя, казаў, што можа знікнуць.

«Відаць, і праўда ў Чарнобыль паехаў. Ды няхай. Гэта па яго часці. Вернецца, то раскажа, што там і да чаго».

За святы Андрэй амаль увесь участак перакапаў. Парабіў грады, пасеяў радыску, моркву, пасадзіў часнок, цыбулю, нават бульбу-скараспейку. Хоць і цёпла было, але сеяць і садзіць нешта яшчэ не асмеліўся — быццам ранавата.

«Няхай, на Дзень Перамогі падскочу, то і пасяўную ў асноўным закончу».

Шкадаваў Андрэй, што паслухаўся Івана, не паехаў у вёску да маці.

«Радыяцыі збаяўся. А маці так бы рада была. Ды і памог бы ёй. Трэба, вярнуўшыся ў горад, Івана пашукаць,— як бы наказаў, загадаў сабе.— І калі нічога вельмі небяспечнага няма, усё ж паехаць у вёску. Пажыць там, адпачыць ад усяго. Ды і падумаць — што і як далей рабіць. Бо калі Дзямід Станіслававіч прапанаваў падаць заяву... То... Ды і сямейныя справы... Жыць з Алай... Урэшце, няхай сама яна выбера — я даражэй ёй ці маці... Вось з'еду адсюль куды-небудзь... Прыедзе да мяне жыць Ала — значыцца, кахае, дарагі я ёй... А не прыедзе... І не трэба. Бачыш, пра дзіця раптам успомніла, загаварыла... Але...

Я цяпер... Заводзіць дзіця, калі не ведаю, жыць мне з ёй ці не жыць. Ды і Іра...»

Кальнула, у самае сэрца кальнула, калі ўспомніў Іру.

«Заехаць да яе трэба, пагаварыць...»

«Але ж яе... Колькі ні званю — няма і няма. Ды і сказала ж, каб не смеў заязджаць, заходзіць дадому».

«Тады... На працу да яе хіба зайсці?»

«А гэта ідэя! З працы яна не прагоніць, выслухае мяне. Ды і я яе».

І Андрэй вырашыў — адразу ж, як скончыцца свята, заедзе да Іры на працу.

«Быць таго не можа, каб яна не расказала пра ўсё. Калі прычына важная, што ж, не будзем больш сустракацца... Я мужчына, пастараюся ўсё, што было, забыць. А калі... Узважу, падумаю. Ці Ала, ці Іра?.. А можа, і не адна і не другая... Гэтага ніхто за мяне не вырашыць. Толькі я, адзін я. І чым хутчэй, тым лепш...»

З горада ніхто не прыязджаў — ні Ала, ні Эльвіра Барысаўна, ні Арцём Гаўрылавіч.

«Чаму? Раней хоць Арцём Гаўрылавіч зрэдку цікавасць да дачы, зямлі, саду праяўляў. А цяпер... Няўжо іх так усіх гэтая радыяцыя напалохала? Але ж... Каб было што сур'ёзнае — пісалі б, гаварылі б...»

Усё ж нейкая нібы трывога, неспакой не пакідалі Андрэя. І ў суботу, паабедаўшы, ён пахадзіў па садзе, гародзе і, як бы развітаўшыся з усім, што яго звязвала з дачай, паехаў у горад.

## 2

Калі Андрэй адамкнуў дзверы і зайшоў у кватэру, дома нікога не было.

«Дзе ж гэта ўсе падзеліся? — здзівіўся ён.— У госці да каго пайшлі?.. А можа, пагуляць? Пагода ж стаіць як улетку. Хоць загарай...»

Са смакам памыўся ў ванне, пайшоў на кухню, адчыніў халадзільнік — там, як і заўсёды раней, было поўна ўсякай яды — за Арцёмам Гаўрылавічам пакінулі размеркавальнік. Паеў, нават наліў сабе грамаў сто гарэлкі. Чамусьці захацелася выпіць менавіта гарэлкі. Халоднай, з халадзільніка. І ён гэта зрабіў.

На душы як бы палагаднела.

«Дарэмна я ўсё да галавы ды і да сэрца так блізка бяру. Ледзь не грэшнікам сябе лічу. Ёсць жа яшчэ горшыя за

мяне. І пасады займаюць куды большыя. І шчаслівыя. Палюбоўніц маюць, і не па адной. Жывуць з сакратаркамі, машыністкамі... Ды і на курортах заводзяць сабе жанчын... А я... З Ірай выпадкова сышоўся і то дакараю, дратую сябе... Ды і ўсё астатняе... Падумаеш, некалькі чалавек па званку на працу ўзяў, некалькі пуцёвак аддаў не таму, каму, можа, варта было аддаць... Людзі вунь хабар бяруць, нажываюцца на пасадах...»

Хацелася выпіць яшчэ, але Андрэй стрымаў сябе.

«Раптам выйсці куды-небудзь давядзецца? Хоць і свята, а ўсё ж... Міліцыя напагатове... І ловіць чамусьці не алкашоў, а тых, хто падвыпіўшы... І не рабацяг, а начальнікаў, хто ў капелюшы і пад гальштукам... Можа, нават указанне адкуль такое атрымалі...»

Пахадзіў па хаце, не ведаючы, чым заняцца, што рабіць.

«Іры хіба пазваніць?.. А то і пад'ехаць да яе? Ды і з Іванам бы звязацца? Цікава, дома ён ці не?»

Падышоў да тэлефона, набраў Іванаў нумар. Падняла трубку Іванава жонка, Святлана, якую Андрэй трохі ведаў, хоць не так, як, можа, трэба было б.

— Са святам вас! — павіншаваў ён Святлану.

— І вас таксама! — адказала Святлана.— Гэта Андрэй Анісімавіч? — пазнала яна.— Добра, што пазванілі. А то Іван ужо даручэнняў розных мне надаваў. А калі так... Самі з ім пра ўсё і пагаварыце. Іван! Іван! — закрычала Святлана, завучы мужа.— Андрэй Анісімавіч звоніць...

Іван падбег да тэлефона ў той жа міг. Не сказаў, а хутчэй выдыхнуў радасна:

— Добра, што пазваніў, ды, урэшце, і прыехаў са сваёй дачы.

— А што, ты хіба званіў, шукаў мяне? — спытаў, як заўсёды гаворачы з Іванам, весела Андрэй.

— Некалькі разоў. Я ж, можна сказаць, праездам тут. Сёння ж, літаральна праз некалькі гадзін, зноў еду.

— Усё па аварыі гэтай?

— Ага.

— А я неяк супакоіўся,— прызнаўся Андрэй.— Радыё, газеты маўчаць...

— Злачынна маўчаць, скажу я табе. Тысячы людзей кінуліся загараць, выехалі на прыроду. Ды і ў тыя раёны... Цяплынь жа стаіць... А гэта — нельга!

— Зноў ты за сваё! — як бы папракнуў, пакпіў з Івана Андрэй.

— Ты, мусіць, чарку ўзяў,— здагадаўся Іван,— бо вясёлы нешта.

— Узяў,— засмяяўся Андрэй.— Вярнуўся з дачы, у мяне дома нікога няма. Дык я чарачку сабе наліў...

— Ці хоць добра памыўся пасля дачы?

— Ды быццам так. А што?

— Лепш бы ты не ехаў на тую дачу, у зямлі не капаўся.

— Не магу я без гэтага,— з болем у душы загаварыў Андрэй.— Як вясна прыходзіць — цягне бы магнітам мяне да сябе зямля... А ты... Лепш скажы, дзе ты ў святы быў!

— Я? У тыя раёны, што ад аварыі пацярпелі, ездзіў.

— Ну і што там? — зацікавіўся Андрэй.

— У двух-трох словах не раскажаш. Давай лепш сустрэнемся, да мяне прыедзь.

— Я выпіў, таму...

— Таксі выклічы,— параіў Іван.

— Э, не, у мяне адзін супрацоўнік сеў выпіўшы ў таксі, дык таксіст яго ў міліцыю здаў. З партыі вось выключаць будзем. Давай лепш ты да мяне пад'едзь, у мяне дома якраз нікога няма.

— Ладна, еду.

І прыехаў. Хутка, Андрэй нават стол не паспеў падрыхтаваць. А хацелася пачаставаць Івана як след — і свята ж было, ды і не так часта Іван на кватэру да яго заходзіў. Але калі Іван пазваніў у дзверы і Андрэй адчыніў яму, то... разгубіўся.

— Ты што, Іван, захварэў? — спытаў Андрэй са страхам — быў Іван худы і як бы ўчарнелы. Аж шчокі запалі, скіўіцы выпіралі.

— Я казаў табе — бяда, вялікая бяда здарылася. І страшна вось што — многія не разумеюць гэтага. Паводзяць сябе, быццам нічога нідзе не здарылася — ідуць поўным ходам палявыя работы, праводзяцца мітынгі, дэманстрацыі, дзеці гуляюць па вуліцы, сёй-той загарае. Ды яшчэ дзе — за некалькі кіламетраў ад рэактара... П'юць малако, ядзяць яйкі, шчаўе, крапіву... А гэта... Атрута... Смерць...

— Ты хоць бы прысеў, у мяне стол вунь... Праўда, не паспеў я яго як належыць яшчэ падрыхтаваць...

— Не да таго, Андрэй... Людзей трэба ратаваць. Асабліва дзяцей... Бо яна, гадаўка, гэтая радыяцыя, найперш па іх б'е...

— Няўжо ўсё так страшна, як ты гаворыш? — верыў і не верыў таму, што чуў, Андрэй.

— Не тое слова — небяспечна! Час, вядома, упушчаны ўжо, але сёе-тое можна яшчэ паправіць, выратаваць людзей. Толькі трэба не марудзіць, мабілізаваць усё і ўсіх. Украінцы на другі дзень пасля аварыі за эвакуацыю ўзяліся, а мы толькі ўчора, сёння...

Андрэй усё ж усадзіў Івана за стол.

— Не гарачыся, давай па парадку ўсё раскажы...— сеўшы таксама за стол, сказаў, супакойваючы сябра, Андрэй.

— Я казаў табе — у мяне вельмі мала часу.

— Куды ты спяшаешся?

— На цягнік, у Маскву.

— І што ты рабіць там будзеш?

— ? — пацiснуў плячыма Іван.— Ведаю адно — пастараюся даказаць, што эвакуіраваць трэба не толькі тыя вёскі, што ля самага рэактара. Ды і дзяцей... Як мага больш дзяцей... Бо калі гэтага не зробім... Ніхто нам потым ніколі не даруе...

— А без эвакуацыі нельга?

— Нельга. На гэта, праўда, патрабуюцца вялікія сродкі. Трэба ж эвакуіраваных не толькі дзесьці пасяліць, але і даць ім працу. Бо дадому, у свае вёскі, яны... можа быць, сёй-той ужо і ніколі не вернецца.

— Ты што? — падняў на Івана вочы Андрэй.

— Тое, што чуеш. У некаторых вёсках, можа быць, хоць я ў гэта і не веру, калі правесці належную дэзактывацыю, з часам можна будзе і жыць. Але ў тых, што блізка да рэактара, што засыпаны стронцыем, плутоніем, цэзіем... Калі хто і будзе жыць, дык ужо не на нашай памяці... Такі куточак зямлі, можна сказаць, Богам дадзены, загубілі. Спярша абязлесілі, асушылі, а цяпер яшчэ і атрутай засыпалі...

— Ніяк паверыць я табе не магу,— адкінуўся на спінку крэсла, зажмурыў вочы Андрэй, спрабуючы асэнсаваць тое, што пачуў ад Івана.

— І ніхто, ніхто верыць не хоча! Але тое, што я кажу,— факт, рэальнасць. Тут права рашаць трэба даць тым, хто гэта хоць трохі ведае, хто ў гэтым разбіраецца. Хоць і мы... Не ўсё, далёка не ўсё ведаем! Вывучаць трэба. Але і тое, што ведаем, жахліва...

— І колькі вёсак эвакуіруецца? — расплюшчыў вочы, паглядзеў зноў на Івана Андрэй.

— Па Гомельскай вобласці больш як пяцьдзесят. Але гэта мала. Яшчэ прыкладна столькі ж трэба... Неадкладна! А там і гарадкі некаторыя, вёскі...

— А наша, як наша вёска?

— Быў я там, я казаў табе. Наогул жа, я аб'ехаў дзесяткі вёсак Хойніцкага, Брагінскага і Нараўлянскага раёнаў. Вясна, зелена ўжо там. Сады вось-вось зацвітуць. Прыгажосць — словамі не выкажаш. Людзі ўсюды варушацца — аруць, сеюць. Быццам нідзе нічога і не здарылася. А есці ж таго, што пасеюць, што вырасце, нельга будзе. У гэта цяжка паверыць, а трэба. Стаяў я на беразе Прыпяці, на рэактар той глядзеў, што з-пад чалавечай улады выйшаў. Дыміць ён, як у нас там кажуць, кўрае... І ад яго ідзе, ідзе ва ўсе бакі радыяцыя... А яна ж пранікае ў арганізм, ва ўсё жывое. Арганізм, як губка, яе ў сябе ўбірае. Кожную хвіліну ўсё больш-больш. А гэта ж — смерць... Ды і ізатопаў розных, шкодных для ўсяго жывога, рассыпалася уга колькі! Што з дажджом выпала, што ветрам занесла... Ды і нясе, цяпер нясе... І калі рэактар той утаймуюць — невядома!.. Справа гэта новая, ніколі яшчэ такога ў нас не здаралася! А побач жа і трэці, другі, першы блокі... На некалькі дзесяткаў, а то і больш кіламетраў наўкруг усё атруціць можам! І гэта мы, вучоныя, ведаем. А людзі звычайныя нічога не ведаюць, не ўяўляюць нават, жывуць так, як і жылі, быццам нідзе нічога і не здарылася. Заехаў я ў сваю вёску,— расказаў Іван.— Радыяцыя там, праўда, пакуль невысокая, можна сказаць, цярпімая, асабліва ў параўнанні з іншымі вёскамі, дзе я пабываў. І далекавата ад Чарнобыля, ды і лес прыкрывае. А правільней — воблака тое, атрутнае, што смерць несла, міма прайшло... Маці на гародзе грады сее. Вядома, узрадавалася, цалавацца кінулася. Я на рукі яе гляджу — голыя ж яны, усе ў зямлі... А ў зямлі — смерць жа!.. Пайшлі ў хату, прымусіў маці памыць рукі з мылам, спярша халоднаю, потым цёплаю вадою. Пачаў ёй расказваць, што, як і да чаго... І ведаеш, не пераканаў маці. Ні ў чым... З вёскі ехаць наадрэз адмовілася. «Куды я цяпер? Сеяць жа поле трэба!» Я: «Усё адно есці не будзеш таго, што вырасце!» А яна: «Не выдумляй, сын, а што ж я буду есці!» Тады я пра эвакуацыю загаварыў, маўляў, сілком будуць высяляць з родных мясцін людзей, ды і высяляюць ужо з некаторых вёсак, не пытаючы, хоча хто ці не хоча таго. А яна: «Гэта немцы з намі ў вайну рабілі. Цяпер свае таго не зробяць. А пачнуць рабіць — у лес паўцякаем!» Я: «Нельга тут

аставацца. Хто астанецца — памрэ». Яна: «Вечна жыць, сынок, не будзеш». Я: «Нікога пускаць сюды не будуць». Яна: «О, тым больш нікуды не паеду. Тут жа магілы, уся радня мая на могілках... І каб я адсюль куды паехала?..» Вось і ўся размова... І тое самае, прыкладна так, дарэчы, твая маці. У гародзе, як і мая, капалася, калі я заехаў да яе. Чаго ні гаварыў, як ні страшыў — словы мае — як аб сцяну гарох. Папрыраставлі людзі душой і целам да сваёй зямлі, іх, як дрэва, можна толькі з карэннямі вырываць...

— А што ж ты думаў? Бацькі, дзяды, прадзеды нашы там жылі... Бацькоўскі кут, родная зямля... І ўсё, усё там роднае,— зноў зажмурыў вочы, задумаўся Андрэй.

— Душа крывёю абліваецца... Людзі, якія працавітыя, добрыя там людзі! Нідзе я такіх не бачыў, не сустракаў. І трэба ж — гора такое на іх абрынулася. На край увесь!

Памаўчаў, падумаў.

— А яе ж, тую самую атамную станцыю, хацелі пад Кіевам збудаваць. Вучоныя выступілі супраць, дамагліся ўсё ж, каб хоць трохі далей аднеслі! Кіеў бы ўвесь ляснуў! Вось да чаго неабдуманасць магла б прывесці!

Пакруціў галавою.

— Уяўляю, што там, на станцыі, цяпер! Трэба ж неяк так зрабіць, каб іншыя блокі ацалелі. Ды і рэактар утаймаваць, каб смерць не сеяў! А потым, калі ўтаймуюць яго, колькі папрацаваць давядзецца. Зямля наўкруг засыпана ізатопамі, атручана. Яны могуць у ваду грунтавую трапіць. А звяры, птушкі, рыба... Іх жа не пазабіваеш усіх... І не скажаш, што туды нельга, там смерць... А лясы? Што з імі рабіць? Ды і з полем, лугам, балотамі?

— Ты б, можа, чарку выпіў, з'еў чаго? — спытаў, паказваючы на стол, Андрэй.— Свята ж.

— Не, не да пітва, не да яды,— аднекнуўся, адмовіўся Іван.— У Маскву трэба ехаць. Разам са мною ў купэ розныя людзі будуць. Ды і, скажу табе, пабываўшы там, не хочацца нічога ні есці, ні піць. Нарабілі самі сабе бяды, быццам мала яе ў нас было, гэтай яшчэ не хапала. І бяда гэтая... Будзе ж разносіцца. Птушкамі, звярамі, з вадою, з ядою... Нават калі калючым дротам абгарадзіць тое месца, усё адно нічога не паможа. Як, як гэта адаб'ецца на жыцці Украіны, Беларусі? Ды і не толькі... Аварыя гэтая напомніла, што такое атамная энергія і як з ёй трэба асцярожна абыходзіцца. Ага,— як бы спахапіўся Іван,— дык вось якое даручэнне ці просьба ў мяне да цябе.— Іван сцяў свае тонкія губы, як бы засяродзіўся над нечым, паду-

маў.— Паспрабуй ты пад'ехаць туды, у вёску. І ўгаварыць забраць сваю і маю маці...

— Але ж яны, ты кажаш, ехаць нікуды не хочуць — адмовіліся?

— Мала што. У бліжэйшы час эвакуацыя дзяцей пачнецца... З многіх вёсак, і з нашай таксама. А гэта дзейнічае. І яны... Можа, паддадуцца, згодзяцца да нас у Мінск прыехаць. Мяне не паслухаліся, то, можа, цябе паслухаюцца... Я не прасіў бы, але сам... Не ведаю, дзе буду. У Маскве, Кіеве ці яшчэ дзе-небудзь. Я казаў табе — вядзецца вялікая работа па ўтаймаванні рэактара. Я таксама да яе падключаны. Кожны робіць сваё, а ўсе разам адно, агульнае.

І Іван і Андрэй памаўчалі.

— Вось што,— парушыў першы маўчанне, сказаў Андрэй.— Я ў гэтай справе, вашай атамнай навуцы, прафан. Скажы, калі ласка, мне — радыяцыя небяспечна, я гэта чую, ведаю. Але ж ты, скажам, ездзіў па тых мясцінах... Ды і іншыя з табою... І тыя, што там жывуць... Маці нашы... Як адаб'ецца гэта на табе, на іх?

— Бачыш, у чым каварнасць усяго — яна, гадаўка, не адразу забівае чалавека,— як бы падумаўшы, сказаў Іван.— Пранікнуўшы ў арганізм, яна яго аслабляе, разбурае. Паступова... Асабліва жахліва дзейнічае на спадчынны код, на патомства. Колькі гадоў мінула пасля атамнай бамбёжкі Хірасімы і Нагасакі, а яшчэ і цяпер нараджаюцца калекі, непаўнацэнныя ва ўсіх адносінах дзеці...

— І ты... Ведаючы ўсё гэта, свядома рызыкуеш сабой, сваім жыццём?

— А што ж рабіць? Трэба ж небяспеку ад людзей адвесці ды і памеры бяды вызначыць. Хто гэта зробіць, як не мы, вучоныя? Самі натварылі бяды, самі і спраўляцца з ёю мусім. Я ды і іншыя вучоныя, што цяпер ночы не спяць,— не ў разлік. А вось тыя, хто церпіць з-за нас, каго выселілі ці высяляць яшчэ будуць. Ды і іншыя, хто не ведае нічога, чым гэта можа скончыцца... Вось каго шкада. Мы натварылі бяды, а яны пажынаюць плады нашых памылак...

— А ты... Ты можаш сказаць, што там, у Чарнобылі, здарылася, чаму адбылася тая аварыя? — задаваў, сыпаў пытанне за пытаннем Андрэй.

— Пакуль не. Працуе камісія, усё вывучае. Адно ясна — былі, відаць, нейкія недагляды, пралікі, а можа, і штосьці большае — парушэнні, халатнасць, недысцыпліна-

ванасць, адыход ад нормаў — і ў тых, хто будаваў і хто адказваў за эксплуатацыю. Бачыш, атамная энергія — справа новая, тут вока і вока, дысцыпліна і дысцыпліна патрэбны. А людзі некаторыя нашы... Сам ведаеш... Цяпляп, пусці-павалюся... Адносіны да працы павінны быць іншыя, трэба мяняць псіхалогію людзей. І гэта вельмі правільна, своечасова загаварылі пра перабудову. Так, як жылі і як працавалі, далей жыць і працаваць нельга. Трэба ўсё ў корані мяняць. Нельга, каб вучоных не слухалі ці, дзеля выгады нейкага выскачкі-чынушы, мянялі праекты, даты пуску аб'ектаў, правілы эксплуатацыі ды і ці мала што. У руках у людзей вельмі адказная тэхніка, і на ёй, з ёй трэба працаваць гэтак жа адказна... Чарнобыльская бяда многаму навучыць, перасцеражэ. Шкада, што яна не абмінула наш з табою родны кут. Вось жа скажы — такі вялікі зямны шар, столькі набудавана ўсюды гэтых самых атамных электрастанцый, а расплачвацца даводзіцца нам з табою, нашым сваякам, землякам. Колькі людзі нашы, зямля наша нацярпеліся і ў гэтую вайну, ды і ва ўсе мінулыя. Не, яшчэ і гэтую бяду трэба пераўжыць, спазнаць...

Усё ж не вытрымаў — пацягнууся да налітай Андрэем чаркі з гарэлкаю, выпіў. Неяк адразу, адным махам. І падняўся з-за стала, сказаў:

— Выбачай, але мне трэба ісці. Тыя, хто заварыў гэтую кашу... можа, дзе на лаўрах спачываюць. А нам трэба расхлёбваць. Мабыць, такі ўжо лёс усіх сумленных людзей — дурні і зламыснікі робяць, а разумныя ды сумленныя папраўляюць...

Падаў руку — і моўчкі, не падымаючы на Андрэя вачэй, пайшоў, як не пабег з кватэры.

## 3

Астаўшыся дома адзін, Андрэй прыбраў са стала, потым пахадзіў па кватэры, не могучы знайсці сабе нідзе ні месца, ні занятку. Тое, што пачуў ад Івана — а не паверыць яму гэты раз ён проста не мог, бо надта ж горача і пераканаўча Іван гаварыў пра ўсё, што ведаў і бачыў сам на свае вочы,— прымушала зусім па-іншаму глядзець на многае, калі не на ўсё.

«Ну, што чалавечае жыццё кароткае, міг, хвіліна адна, у любы час абарвацца можа... да гэтага я прывык, ведаю,— думаў ён.— Але каб жыццё цэлага краю, народа ды і ўсяго чалавецтва...»

Гэта было новае, ніколі яшчэ дасюль так не думалася, правільней, думалася, але як бы ў далёкай, неабсяжнай перспектыве — калі і здарыцца нешта падобнае, дык будзе гэта, можа, праз мільён ці мільярд год. Энергетычныя рэсурсы скончацца, карміцца не будзе чым, сонца астыне ці катаклізм нейкі адбудзецца — сарвецца з арбіты Зямля, сутыкнецца з якім-небудзь нябесным целам... А тут, выходзіць, самі людзі сябе пагубіць могуць. І здарыцца гэта можа кожны дзень, кожную хвіліну. Вунь колькі атамных і вадародных бомб нарыхтавана, ды і набудавана атамных электрастанцый. І варта адбыцца непрадбачанаму выпадку, і... Пачнецца незваротны працэс. Калі нават не загіне чалавецтва адразу, дык паступова, атручваючыся праз ваду, яду, паветра. Парушыцца спадчынны код... Пачнуць нараджацца непаўнацэнныя людзі, калекі...

«Вось да чаго давялі чалавецтва розныя вынаходствы,— думаў Андрэй.— Свет увесь загінуць можа. І тут Іван мае рацыю, ды і заўсёды меў — высокая духоўная культура павінна быць у сучаснага вучонага, самыя высокія паняцці аб этыцы і маралі. Ды і адказнасць. Перш чым рэкамендаваць сваё адкрыццё, ён павінен падумаць, добранька падумаць, узважыць, да чаго яно прывядзе. І не пра сябе, сваю славу і даброты вучоны павінен думаць, а пра чалавецтва, усіх, усіх людзей. І прыроду. Каб не парушыць чаго-небудзь у ёй сваім вынаходствам, захаваць той баланс, тую раўнавагу, якія ўсюды і ва ўсім былі і ёсць».

Не давала спакою і яшчэ адно — калі адбылася такая сур'ёзная аварыя ў Чарнобылі, то чаму маўчаць радыё, тэлебачанне, газеты, наогул усе сродкі інфармацыі? Гаворым пра галоснасць, а калі справа дайшла... Разгубіліся ці спалохаліся сказаць праўду?..

«А можа, і не ведаюць яшчэ ўсяго тыя, каму гэта трэба ведаць. Святы ж былі. Вучоныя-спецыялісты павінны вызначыць памеры бяды. І тады...»

«Але ж... Людзі там. Ды і тут... І ім бы ведаць, што і як рабіць. Сеяць ці не сеяць, што есці, піць? Дый ва ўсім астатнім, што рабіць? А то быццам нідзе нічога і не адбылося...»

«Можа, там, дзе сапраўды існуе небяспека, людзі папярэджаны даўно. Ссяляюць, эвакуіруюць іх».

«Зноў жа — куды? Вольных жа, незанятых кватэр у нас няма. Можа б, да людзей звярнуцца, каб у свае кватэры пусцілі...»

«Дамы адпачынку ёсць, піянерскія лагеры. Гэта Арцём

Гаўрылавіч адразу ж сказаў, як пачуў, што пыталі, у якім стане дом адпачынку і піянерскі лагер, прасілі прыспешыць іх падрыхтоўку да сезона. Стары воўк, ведае, што да чаго... І мне трэба будзе ўсе сілы кінуць, каб рамонт і падрыхтоўку піянерскага лагера як мага хутчэй скончыць. Ды і пра штаты, харчаванне, іншае забеспячэнне падумаць...»

«А маці? Як да яе з'ездзіць?»

«Хіба на Дзень Перамогі. Сам і пагляджу, наколькі гэта ўсё сур'ёзна там. І калі што якое... Сілаю маці ў машыну пасаджу, забяру да сябе. Не захоча дома ці на дачы жыць, у які-небудзь дом адпачынку завязу. Ніколі ж нідзе ні разу не адпачывала...»

«А хто калі ў вёсцы дзе адпачываў?»

«І гэта праўда. Усё дзеля гарадскога насельніцтва дамы адпачынку будуем, а дзеля вясковага... Быццам яны і не трэба. Жывуць, маўляў, на прыродзе, працуюць заўсёды на свежым паветры. Дый... Не прывык жа там ніхто адпачываць... Вось і мяне... Усё жыццё працаваць вучылі. І не толькі мяне, а і ўсіх, хто ў вёсцы нарадзіўся. І мы, дзеці вёскі, прыехаўшы ў горад, забываем пра вёску, вясковых людзей. Як яны там жылі, працавалі, адпачывалі — так няхай і жывуць, працуюць, адпачываюць. Тыя калгасныя дамы адпачынку... Колькі іх і хто там бывае?..»

Прыйшлі, вярнуліся дадому Арцём Гаўрылавіч, Эльвіра Барысаўна і Ала. Усе ў добрым, амаль вясёлым, святочным настроі — няйнакш з гасцей. Арцём Гаўрылавіч не распранаючыся адразу ж падаўся не зусім упэўненай хадою ў свой кабінет, мабыць, перабраў, выпіў лішне і яму нядобрылася. Эльвіра ж Барысаўна цвіла, усміхалася.

— Мы пуцёўкі сабе дасталі,— пахвалілася яна.— Заўтра ж і паедзем.

— Чаму так спешна? Ды і рана ж яшчэ, каб адпачываць,— сказаў, быццам нічога не ведаў, ні пра што не здагадваўся, Андрэй.

— Як гэта — спешна, рана?.. Мы ж казалі табе — у Мінску радыяцыя, павышаны фон... Чаго ж здароўем сваім рызыкаваць? — паглядзела на Андрэя як бы з выклікам Эльвіра Барысаўна.— Усе, хто можа, уцякаюць.

— І куды ж вы? — не мог ужо, каб не спытаць, Андрэй.

— У Прыбалтыку. Туды радыяцыя, кажуць, не дайшла. Алачку ратаваць трэба... Радыяцыя ж перш за ўсё на спадчынны код б'е...

— Я, мама, сама яму ўсё раскажу,— заўсміхалася,

гледзячы Андрэю ў вочы, Ала.— Ты што, толькі што з дачы прыехаў?

— А што? — паглядзеў на Алу Андрэй.

— Не трэба было туды табе ехаць,— падышла бліжэй да Андрэя, узяла яго пад руку Ала, і ён пачуў, што ад яе пахне віном.— Там жа таксама радыяцыя. Былі мы ў гасцях...— яна назвала прозвішча агульных знаёмых, з якімі сябравалі Арцём Гаўрылавіч і Эльвіра Барысаўна,— то там чалавек адзін быў. Ён і растлумачыў усё нам...

— Што, напрыклад? — глядзеў кпліва на Алу, не зводзіў з яе вачэй, быццам упершыню бачыў, Андрэй.

— Ну, што зелянiны есці нельга... Малака піць... На паветры бываць... У зямлі капацца... Наогул, радыяцыя — вельмі небяспечная, яна можа прывесці да самых розных хвароб. І таму,— заўсміхалася, склала банцікам губы Ала,— трэба ад яе ўцякаць. Вось мы пуцёўкі і дасталі праз маміных і татавых знаёмых. І паедзем.

— А мяне... Тут пакінеце?

— Я ж казала,— умяшалася зноў у гаворку Эльвіра Барысаўна,— каб ты паклапаціўся і пра сябе, і пра нас — усім нам дастаў пуцёўкі.

— А калі я не дастаў, дык вы мяне... Лішні я, выходзіць. Мой спадчынны код, значыцца, вас не цікавіць?

— Ты ж на рабоце,— паглядзела зноў у вочы Андрэю Ала.— Але калі ты так хочаш... Прыязджай да нас... Ці пуцёўку сабе таксама вазьмі. Ты ж, мабыць, маеш права?

— Маю, маю,— сказаў як бы з раздражненнем Андрэй і, зрабіўшы пакрыўджаны выгляд, пайшоў у свой пакой. Але не ўседзеў там доўга — пачуўшы, што Эльвіра Барысаўна і Алачка, сабраўшыся на кухні, пра штосьці бойка, наўзахапкі загаварылі, заспрачаліся, а Арцём Гаўрылавіч, прылёгшы на канапу, заснуў — з яго пакоя чуўся смачны храп,— Андрэй, нікому нічога не кажучы, ціхенька адчыніў дзверы і вышмыгнуў з кватэры.

Вечарэла. Вялізны чырвоны круг сонца вісеў далёка за дамамі, апускаючыся з кожнай хвілінай ніжэй і ніжэй. Дзе-нідзе ўжо зелянела, кучаравілася, і даволі густа, трава, распускаліся дрэвы — ліпы, бярозы, каштаны. Было надзіва цёпла і неяк малалюдна — недарэмна ж кажуць, што ніштo так не стамляе людзей, як доўгія святы. А сёлетнія майскія святы былі доўгія — аж чатыры дні.

Выкіраваўшыся на набярэжную, Андрэй не спяшаючыся падаўся ўсцяж Свіслачы. Гэта быў яго даўні і любімы маршрут прагулянак. І зімою, і летам, і ўвосень, і вясною,

у любое надвор'е дня і сутак. Як надаралася вольная хвіліна, так ён і кіраваўся на набярэжную, мераў і мераў яе нагамі. Іншы раз забрыдаў далёка, аж на возера. Хадзіў каля яго, глядзеў на ваду, чуў плёскат хваль — і гэта яго неяк дзіўна супакойвала, настройвала на добры, лагодны лад.

«Вядома,— думаў, як бы нават асуджаў сябе Андрэй.— Не трэба было мне паводзіць сябе, як хлапчук. Дасталі пуцёўкі, ехаць сабраліся — ну і, як у нас у вёсцы кажуць, калясом дарога, няхай едуць. А што я не свой, лішні ў іхняй хаце чалавек, дык да гэтага пара прывыкнуць. За сем'яніна мяне ніхто не лічыў тут і не палічыць, як бы я ні шчыраваў, як бы ні стараўся».

Было як ніколі крыўдна. Хоць і збіраўся, даўно збіраўся Андрэй сам пакінуць гэтую сям'ю, аднак прызнанне Эльвіры Барысаўны, што дасталі пуцёўкі і едуць (правільней, уцякаюць) у Прыбалтыку, было той апошняй кропляй, якая прымусіла яшчэ раз паглядзець на сябе нібы збоку, адчуць сваю непатрэбнасць, непаўнацэннасць.

«Бачыш, пра Алу, Алін спадчынны код падумалі... А пра мяне... Нават не ўспомнілі... Яны — гэта сям'я, а я... Я, выходзіць, і праўда лішні, чужы ім...»

Адчуваў Андрэй, ведаў, што, нават калі б прапанавалі яму паехаць у Прыбалтыку, дасталі пуцёўку, усё адно ён бы не паехаў. І ўсё ж, аднак жа...

Акрамя крыўды, была нейкая і як бы непамыснасць. І Андрэй, ідучы па набярэжнай, развярэджваў сябе ўсё больш і больш — не спыняў гульні ўяўленняў, сваіх крыўдных думак, а як бы даваў ім поўную волю.

«Мая маці, бачыш, не думае пра сябе, што з ёю будзе. Пакінуць свой дом, родны кут, магілы бацькоў... Яна не ўяўляе свайго жыцця без усяго гэтага. А яны,— думаў з непрыяззю, злосцю Андрэй пра Эльвіру Барысаўну, Алу, ды, зрэшты, і пра Арцёма Гаўрылавіча,— гатовы ўсё ў любы час пакінуць. Нічога іх не звязвае з домам, нішто ім не дарага. Куды заўгодна паедуць, абы добра ім было, абы жыццё сваё ўратаваць, далей ад небяспекі быць. Хай іншыя жыццём рызыкуюць, сваім спадчынным кодам... А яны... Яны не, нічым рызыкаваць не будуць».

Успомніўся Іван Пастушок.

«Вось такія Іваны няхай у самае пекла ідуць. І пойдуць, каб утаймаваць рэактар, каб пагрозу ад людскога жыцця адвесці. Ды і пайшлі ўжо. Іван пабываў на месцы

бяды, радыяцыі, пэўна ж, набраўся... А ён жа вучоны, ведае, на якую рызыку ідзе...»

Недзе ў глыбіні душы Андрэй пазайздросціў Івану.

«Малайчына ўсё ж ён, ніколі не шукаў для сябе выгоды, лягчэйшага жыцця. Жыў так, як хацеў, сумленна, нідзе ні ў чым нікому не саступаў, праўду, толькі праўду ўсім у вочы казаў і ўсё рабіў ад душы, па шчырасці. Цэльная натура. А я, я...»

Аж брыдка, агідна стала.

«З кім, з кім я лёс свой звязаць хацеў, за кім, за чым пагнаўся? Замест таго каб працаваць, рабіць тое, што душы блізка, я... У кіраўніцтва падаўся, штаны праседжваю, паперкі розныя перакладаю, званю па тэлефоне, узгадняю, упрошваю — час свой марную... Навошта, дзеля чаго гэта мне? Сказаў Дзямід Станіслававіч, каб заяву падаў, трэба было і падаваць... З'ехаць куды-небудзь, схавацца, забыць на ўсё, жыць як чалавек...»

«А куды, куды з'едзеш? Адзінае месца, куды можна было з'ехаць, схавацца,— вёска, родны кут — і то вунь... Замест таго каб самому там ратавацца, маці трэба ратаваць...»

«А што, калі забраць яе ды... У Казахстан, на Урал, у Сібір?..»

Адразу ж адчуў — не зробіць гэта. І не таму, што сілы волі не хопіць. Не. Любіць ён свой край, сваіх людзей, усё тое, да чаго змалку прывык, што ўвабраў у сябе за гады жыцця, да чаго душою і сэрцам прырос. І жыць без усяго гэтага не зможа, не зможа ён.

«Ды і маці не зможа. З дому, з вёскі — і то, бачыш, нікуды ехаць не хоча. А з краю, з Беларусі... І гаварыць нечага».

«Значыцца, думаць трэба, як жыццё тут уладкаваць. Без Алы ды, можа, і без сваёй вёскі... Без роднага кутка...»

Успомнілася Іра.

«Дзе яна, што робіць? Я ж нават са святам яе не павіншаваў! Хіба, можа, пашукаць тэлефон-аўтамат, пазваніць?»

Адчуў, злавіў сябе на думцы — не хочацца яму гэта рабіць. Упершыню, між іншым, адчуў, злавіў сябе на такой думцы.

«Цікава, чаму гэта раптам? Ніколі ж такога не было... Значыцца...»

«Значыцца, і яна не па́ра мне».

«Можа, можа быць»,— адразу ж згадзіўся сам з сабою Андрэй.

І думкі пераскочылі зноў на іншае, на тое, што найбольш і найглыбей хвалявала яго, не давала ў апошні час спакойна жыць — на Алу, пасаду, якую ён займаў, на тое, што здарылася ў Чарнобылі і пра што так горача і трывожна гаварыў Іван Пастушок.

«Перабудова і праўда неабходна. І не толькі ў грамадстве, але і ў адносінах да працы, у душы, ва ўсім жыцці-быцці. Шчасце ж чалавека не ў тым, каб самому спакойна, шчасліва жыць, а ў тым, каб карысць, дабро людзям прыносіць, патрэбу ў табе яны адчувалі, бачылі. Каб сэнс у самога ў жыцці быў, мэта. Жыць так, як Іван жыве...»

З прагулянкі вярнуўся позна. Аднак, калі зайшоў у кватэру, там ніхто не спаў — пакавалі чамаданы, сумкі — поўным ходам ішлі зборы на ад'езд. Хацеў непрыкметна прашмыгнуць у свой пакой, але яго заўважыла, запыніла Ала.

— Табе званілі,— паведаміла яна.

— Хто? — спытаў ён, і сэрца ёкнула: «Можа, Іра?»

— Не ведаю. Сказалі, каб, калі вернешся, тэрмінова пазваніў. Тэлефон я запісала. Вунь там, на тумбачцы, паперка ляжыць.

Не, тэлефон быў не Ірын.

— Дарэчы, пра Чарнобыль па тэлевізары перадавалі,— як бы між іншым сказала Ала, не адыходзячы ад Андрэя.

— Што?

— Абстаноўка нармалізуецца, але становішча астаецца складанае. Так што мы правільна робім, што едзем адсюль.

— Едзьце,— сказаў абыякава Андрэй і пачаў набіраць нумар, запісаны Алай, куды яго прасілі пазваніць. На яго званок адклікнуўся незнаёмы жаночы голас:

— Хто гэта гаворыць?

Андрэй назваўся.

— Я пасылаю па вас машыну,— адказаў той жа жаночы голас.— Вы павінны быць...— яму назвалі месца, дзе ён павінен быць.— Вас там чакаюць...

З гэтага вечара Андрэева жыццё было падпарадкавана іншаму рытму, іншай волі — ён больш не быў гаспадаром сам сабе.

## 4

## *ЗАПІСКІ АНДРЭЯ ЛОБАЧА*

...Вось я і на Палессі. Тут ужо сапраўдная вясна — зусім зелена. Але ні вясна, ні зеляніна не радуюць — ідзе высяленне людзей з вёсак. Пакуль што самых блізкіх да Чарнобыля. На высяленне даецца паўгадзіны. Нічога не дазваляецца з сабою браць, усё пакідаецца ў хатах, у дварах. Людзі спалоханыя, насцярожаныя — столькі дзён пасля аварыі жылі, нават працавалі ў полі, і раптам... Выганяюць, як на пажар. Але людзі ёсць людзі — усё адно кожны хапае хоць што-небудзь, нясе, валачэ з сабою. Адзін дзядзька прывалок сеткі, якімі лавіў у Прыпяці рыбу, другі чамусьці прынёс дзяжу, у якой учыняюць, месяць хлеб; жанчыны ж нясуць найчасцей коўдры, падушкі, клубкі нітак... Але іх просяць, прымушаюць нічога ані з сабою не браць, усё-ўсё выкідаць, бо яно забруджана, у ім — смерць. Нябачная смерць... Ніхто не супраціўляецца, не плача — вераць жа: высяляюць ненадоўга, на дзень-два... Так, дарэчы, і начальства людзям гаворыць.

Дзіўна, але не чуваць нідзе спеваў птушак. Ні жаўранкаў, ні якіх бы там іншых галасоў. Быццам вымерла ўсё навокал. А бывала ж! Божа, што рабілася такою парою некалі ў нас на Палессі!..

...У некаторых вёсках, пачуўшы, што будзе эвакуацыя, мужчыны ўцякаюць у лес. А ў Зялёным Лагу людзі не сталі садзіцца ў аўтобусы.

— Жылі мы тут некалькі сутак пры рацыі,— так чамусьці завуць тут радыяцыю.— І яшчэ гадзіну пабудзем.

І вынеслі з хат сталы, паставілі на іх што ў каго было. І выпілі, закусілі. Потым абдымаліся, цалаваліся, плакалі — развітваліся і з вёскай, і з сваімі хатамі, і з суседзямі.

Толькі пасля гэтага селі ў аўтобусы. Мусіць, сказаў ім хтосьці, што высяляюць іх надоўга, можа, і назусім, навечна.

Да слёз кранае, як людзі развітваюцца з могілкамі, з магіламі. Стаяць ля крыжоў, нешта шэпчуць, моляцца, хрысцяцца. Не думаў я, ніколі не думаў, што давядзецца бачыць такое...

...Спынены заняткі ў школах. Усіх дзяцей з некалькіх раёнаў трэба вывезці ў больш бяспечныя месцы. Да пяці гадоў разам з маці ў дамы адпачынку, астатніх — з на-

стаўнікамі, выхавацельніцамі дзіцячых садоў — у піянерскія лагеры.

Прыехаў я ў адну з вёсак — Божа, што робіцца! У самога слёзы на вочы нагортваюцца, плакаць хочацца, калі бачыш, як маці і бацькі расстаюцца, развітваюцца са сваімі дзецьмі. І абдымаюцца, і цалуюцца, і нешта наказваюць адно аднаму, зноў і зноў вяртаюцца, ніяк адысціся не могуць. А дзеці нейкія надта ж сур'ёзныя і насцярожаныя, быццам пасталелі адразу на некалькі гадоў. А можа, хоць і не разумеюць, а адчуваюць важнасць такога моманту, як расстанне з бацькамі, вёскаю, роднымі мясцінамі...

Начальства прыспешвае людзей, каб хутчэй развіталіся, збіралі дзяцей у дарогу. Чым жа менш будуць і людзі, і дзеці, ды і самі начальнікі на паветры, тым менш набяруцца радыяцыі. Аднак словы амаль не даходзяць да людзей.

Ідзе эвакуацыя таксама ўсіх цяжарных жанчын...

...Дзіўная штука гэтая радыяцыя! Здаецца, усе жылі ў адной вёсцы, у адных умовах, а калі пачалі правяраць, мераць гэтую самую радыяцыю — кожны набраў яе паразнаму. І залежыць, колькі яе ў каго ад многіх прычын — на паветры быў ці ў хаце, у адным канцы вёскі ці ў другім, у лесе ці ў полі, піў малако і еў яйкі ці не піў малака, не еў яек... А то яшчэ — як мыўся: часта ці рэдка, халоднаю ці гарачаю вадою...

...Заехаў я ў сваю вёску. Тут радыяцыя сапраўды не надта высокая. З вёскі вывезены дзеці, цяжарныя жанчыны і тыя, у каго на руках малыя. Асталіся мужчыны ды бабкі. Самі мужчыны дояць кароў, вараць сабе есці, даглядаюць свіней, курэй, гусей. У вёсцы малалюдна — ніхто асабліва не паказваецца ні на вуліцу, ні ў поле — не хоча хапаць лішнюю радыяцыю. Але мяне, калі я пад'ехаў на машыне, акружылі, і даволі густа. Аказваецца, помняць, ведаюць. Пасыпаліся пытанні:

— Ці надоўга дзяцей забралі з вёскі?

— Ці будуць і нас, як іншых, высяляць?

— Што можна есці?

— Чаму па радыё і тэлебачанні гавораць адно, а тут робіцца зусім іншае?

Адказваў, што мог, ведаў сам. Потым паехаў да маці. Яна радая. Расплакалася.

— Мусіць, прыехаў, каб мяне забраць? — спытала. І ўсміхнулася.— Не паеду я нікуды адсюль. Тут нарадзілася, тут і памру.

Узяўся яе пераконваць, нельга, маўляў, тут цяпер жыць, небяспечна.

— Я ж ужо грады пасеяла. Ды і бульбу пасадзіла. Хто ж дагледзіць, праполе, акапае?

Спрабаваў даказваць, што ўсё адно таго, што пасеяна і пасаджана будзе, нельга есці — атрутнае яно.

— Не, сынок, не. Усё ж так хораша паўзыходзіла і расце. Проста душа радуецца... Дый куды я са свае хаты? Не, не ўгаворвай, усё адно нікуды не паеду адсюль.

— Дык памрэш жа.

— Ну дык і што? Ніхто ж вечна не жыве, і я вечна жыць не буду... Такая ўжо доля наша людская. Пажыў сваё — саступі месца іншым, дай і ім пажыць. Так было, так і будзе.

— Навошта ж рызыкаваць?

— А я і не рызыкую, я жыву, як і жыла. Малако п’ю, яйкі ем... І ўсё, што раней піла і ела...

— Дык нельга ж, мама,— спрабаваў пераконваць я маці.— Атрутнае яно.

— А што ж есці? У магазіне нічога іншага няма, акрамя хлеба. Ды кансерваў тых, што завезлі, можа, яшчэ пры табе, калі ты ў школу хадзіў...

— У нас у горадзе хата пустуе. Мае паехалі адпачываць, радыяцыі спалохаліся,— прызнаўся я.— Пажыла б ты там, пакуль палепшае. А не — у дом адпачынку пуцёўку дастану...

— Не, сынок, не прасі, не паеду я нікуды адсюль. Гэта Івану Пастушку я сказала і табе скажу. Хай уцякаюць ад гэтай рацыі тыя, хто за сваё жыццё баіцца, а я нікуды не паеду. Нават калі і выганяць будуць.

Прыкладна тое самае сказала і Іванава маці, калі я заехаў да яе.

— Не, не, і не прасі,— адмоўна хітала яна галавою.— Сыну, Івану, сказала і табе тое скажу... Мне добра тут, навошта ж ехаць куды-небудзь, ад дабра дабра шукаць? А што да рацыі гэтай?.. Дык пра яе больш гавораць, чым яна ёсць на самай справе...

Так ні з чым і паехаў я з вёскі...

...А радыяцыя ёсць. Сёння, праязджаючы міма медыцынскага пункта, якія цяпер у кожнай вёсцы, у кожным пасёлку, я памераў яе ў сябе. Тры рэнтгены з хвосцікам! І кожную гадзіну яе большае і большае — набірае арганізм. І таму многія не толькі асцерагаюцца ездзіць па вёсках, але імкнуцца і на вуліцы не паказвацца. Сядзяць у розных канторах, дамах. Некаторыя ж, найбольш асцярожныя і баязлівыя, уцякаюць. Кідаюць працу, кідаюць усё, што ў іх ёсць, і з'язджаюць.

Камуністаў і вайсковаабавязаных не здымаюць з уліку. Начальства папярэджана — не пасылаць нікуды сваіх жонак, не сеяць панікі. Але гэта не памагае — пасылаюць некаторыя сваіх жонак далей адсюль, а некалькі чалавек і партыйныя білеты здалі...

Усюды ўжо сёння шмат незанятых месцаў — у сталовых, на поштах, у бальніцах...

...Дзіўнае пачуццё ўзнікае, калі праязджаеш па выселенай вёсцы. Хаты, хлявы замкнуты, двары зачынены. Бегаюць сабакі, кошкі, блукаюць па дварах куры. Спынішся, загаворыш — на чалавечыя галасы збягаецца ўсё жывое. У адной вёсцы ўбачылі на поплаве каня. Ён папасваўся і, калі мы праязджалі міма, падняў галаву, заіржаў... Відаць, забылі на яго, калі ішла эвакуацыя... Што з ім рабіць?.. Страляць — шкода, а гнаць... Хто пагоніць яго і куды?.. Ды і радыяцыі набраў ён столькі, што... Лепш далей ад яго быць. З зоны вярталіся позна. Ехалі па вёсцы. Ціха, цёмна. І раптам у вокнах адной хаты святло. Што такое? Людзей жа тут не павінна быць? Няўжо забыліся выключыць электрычнасць?

Спыніліся, зайшлі ў двор. Хата не замкнута. Адчынілі дзверы. І ўбачылі белагаловага хлопчыка, што сядзеў на лаве і спалохана зыркаў на нас вачанятамі. Пачалі распытваць, чаму ён разам з усімі не эвакуіраваўся. І пачулі ад яго вось што. Ён, аказваецца, нічога пра эвакуацыю не ведаў. Лавіў на рацэ рыбу. А калі прыйшоў у вёску, нікога з людзей не застаў. Падумаў, вайна пачалася, і схаваўся ў пограб. Там і праседзеў некалькі дзён. Неяк убачыў бронетранспарцёр з чырвонаю зоркаю, што ехаў па вуліцы. Гэта хлопчыка пераканала яшчэ больш, што ідзе вайна. Праўда, гэта і ўзрадавала — яшчэ не вораг у вёсцы, а свае. Што еў хлопчык? А ўсё, што траплялася,— варыў шчаўе, бульбу, лавіў і смажыў рыбу.

Забралі яго, завезлі ў бальніцу. Урачы, агледзеўшы, доўга ківалі галовамі. Лячыць такіх яны не ведаюць як. Таму накіравалі ў Гомель.

Патроху вылаўліваюць і тых мужчын, што паўцякалі ў лес. Аднаго злавілі, калі ішоў, краўся з лесу ў вёску, другога паднялі на верталёт — ляжаў ля агню, пёк у лесе пячонікі... Што гэта — недасведчанасць ці нешта зусім іншае?..

...У праграме «Время» ды і па радыё, у газетах немалое месца ўдзяляецца цяпер аварыі ў Чарнобылі. Вучоныя апраўдваюць сябе, апраўдваюць атамную энергетыку. Адзін дагаварыўся нават да таго, што, маўляў, навука патрабуе ахвяр, у тым ліку і чалавечых. Але ж гэта навука, а не невуцтва. Ды адно, калі вучоны ахвяруе сабой, і зусім іншае, калі ён ахвяруе жыццём іншых, якія пра гэта зусім нічога не ведаюць, нават не здагадваюцца. У раёне аварыі цяпер працуюць тысячы людзей, ідзе сапраўднае змаганне, вайна з нябачнай смерцю — радыяцыяй. Трэба ўтаймаваць рэактар, ліквідаваць аварыю. Інакш... Хто ведае, што можа быць? І колькі, колькі будзе працягвацца гэтае змаганне, гэтая барацьба? Тыдзень-два ці месяц, а то і год? Адкрыў жа чалавек на згубу сабе гэтую энергію атамнага ядра...

Расказваюць і пра тых, хто прыняў на сябе першы бой — пажарнікаў. Малайцы хлопцы!

Ну, а мы... Абследуем памеры бяды, вывучаем кожны лапік поля, лесу, балота, бяром пробы, накіроўваем у лабараторыі на аналіз...

...Наогул, мне можна было б і менш бываць у раёнах, дзе радыяцыя найбольшая. Некаторыя з нашай камісіі сюды прыязджаюць на гадзінку і ўцякаюць назад у Гомель. Але я не магу так. Мне проста шкада людзей, маіх землякоў, заўсёды думаю, а раптам я каму-небудзь з іх хоць чым памагу.

І памагаю. То раскажу што-небудзь людзям, чаго яны не ведаюць, то перасцерагу, суцешу, паведамлю, куды вывезлі дзяцей, дзе каго шукаць. Рэактар жа ніяк не паддаецца ўтаймаванню, пыхкае і пыхкае. І мы гэта адчуваем па тым, як то ўзрастае, то спадае радыяцыя. Відаць, не так лёгка прымусіць атам зноў падначаліцца людзям. На чыгуначныя станцыі падганяюцца эшалоны, падаюцца сот-

ні вагонаў. Па ўсім адчуваецца, рыхтуецца новая эвакуацыя... Гэты раз яшчэ большая. Паўзуць чуткі — можа здарыцца так, што будзе эвакуіраваны Гомель... Якой бяды нарабілі! Відаць, праўду казаў Іван Пастушок — не трэба было гэтую атамную станцыю тут, на Палессі, будаваць! Непадалёку ж Кіеў... І калі Гомель рыхтуецца да эвакуацыі, то, значыцца, і Кіеў... А гэта ж мільёны людзей... Дзе іх падзець, пасяліць?..

...Напружанасць узрастае. Адзін Бог, відаць, ведае, што чакае нас. Нават газета «Правда» напісала: «Становішча астаецца складанае». Што будзе з маім родным краем — Палессем? Гэта ж, як хтосьці сказаў, лёгкія Еўропы. А вада... Яна ж сплыве ў Прыпяць, потым у Дняпро. Дняпроўскімі водамі паліваюць палі Украіны, Крыма... На Палессі шмат птушак, звяроў, рыбы. І ўсё гэта не знішчыш жа. А знішчыш — звяры новыя забрыдуць, прыляцяць і птушкі... І зараза будзе разносіцца, разносіцца...

Рабілі адстрэл птушак, звяроў. Правяралі. Забруджаны лёгкія, пячонка, ныркі, страўнік... Забруджана мяса, косці... Ведама, увесь час на паветры, у лесе, у полі, ядуць, як і елі, без разбору траву, п'юць, як і пілі, з рэк, азёраў і балот ваду. Дзе ім ведаць, што ўсё гэта — атрута... Я ж думаю пра людзей. Што, што будзе, што чакае ўсіх нас?.. І заўтра, і паслязаўтра, і ў будучым?..

...Паведамілі: ёсць выпадкі, калі дзеці ўцякаюць з дарогі ды і з піянерскіх лагераў, пешкі кіруюцца дадому. Каб іх не злавілі, не вярнулі назад — хаваюцца ў кустах, у лесе... Што яны, бедныя, ведаюць? У кустах жа ды і ў лесе радыяцыя куды большая, чым у полі. І праўда, як тая цётка, што аднойчы па дарозе падабралі, у машыне падвозілі, казала: «Калі немцы наступалі, то ведалі, адкуль яны ісці будуць. Яны ў адзін бок, мы — у другі. А гэты вораг — радыяцыя — наступае з усіх бакоў, і куды ўцякаць, дзе хавацца — ніхто не ведае...»

Шкада, да слёз шкада і катоў, сабак, курэй, гусей... Людзей з вёсак выселілі, а іх пакінулі. І што такое радыяцыя, першыя на сваіх скурах спазнаюць яны...

...Ніхто нічога пэўнага сказаць не можа, што там, у Чарнобылі, цяпер. Паўзуць самыя неверагодныя чуткі...

Эвакуацыя з тых вёсак, з трыццацікіламетровай зоны, закончана, эвакуіраваны і дзеці, цяжарныя жанчыны амаль з усёй Гомельскай вобласці. А вагоны, эшалоны падаюцца, імі запруджаны запасныя пуці на станцыях. Нам загадана кожнаму быць на сваіх месцах, усе чакаем нейкіх важных указанняў. Гатоўнасць ва ўсіх нумар адзін...

Пазванілі ў Гомель. Там, нягледзячы на познюю пару, людзі на працы. Таксама чагосьці чакаюць... Ці не эвакуацыі горада?..

...Хвала Богу, паведамілі нарэшце, што вучоныя, якія працуюць у Чарнобылі на ліквідацыі аварыі, валодаюць сітуацыяй. Але да поўнага ўтаймавання рэактара яшчэ далёка. Пакуль жа ён пыхкае, выкідвае і выкідвае атрутныя рэчывы, забруджвае паветра, зямлю, ваду... І колькі, колькі ён будзе яшчэ пыхкаць, атручваць, забруджваць усё навокал сябе?..

...Прыехала змена, нам можна вяртацца назад у Мінск. Але мне, калі шчыра прызнацца, не хочацца туды ехаць. Упершыню за многія гады я займаўся справай, ад мае работы залежала жыццё і ўратаванне соцень, тысяч людзей. А там, у Мінску, што, што буду я рабіць?.. Зноў падпісваць, перасылаць са стала на стол паперкі, званіць, узгадняць, сядзець на нарадах, выступаць ці слухаць выступленні?.. Словам — кіраваць. Кім?.. Чым?..

## 5

Многа, многа разоў заходзіў Андрэй у кватэру да Арцёма Гаўрылавіча, якая з нейкага часу стала быццам і яго кватэрай, але не было яшчэ ніколі такога адчування, як цяпер, калі прыехаў з Палесся і адамкнуў дзверы. Усюды — на калідоры, на кухні, ва ўсіх пакоях бы чужы хто пагаспадарыў — валяліся на падлозе, на крэслах нейкія параскіданыя абы-дзе і абы-як купальнікі, халаты, кофты, капелюшы... Няйнакш ад'язджалі ў адпачынак спешна, хапком і не паспелі ні сабрацца як след, ні пахаваць падаставаныя і не ўзятыя з сабою рэчы.

«Быццам зладзеі тут капаліся,— падумаў Андрэй.— Так баяліся радыяцыі, што нават за сабой не прыбралі».

Ніколі яшчэ не была яму такая чужая гэтая кватэра, як цяпер. Ды і што, што яго было ў ёй? Некалькі кашуль, маек, трусоў ды касцюмы, паліто, туфлі...

«Вось забяру іх з сабой — і ўсё, як і не жыў я ніколі тут».

Зрабілася прыкра, сумна.

«І на рабоце, між іншым, тое самае... Нідзе не паспеў я пусціць каранёў, зазямліцца, нішто нідзе мяне не трымае, не дарага... Хіба толькі там, дома, у вёсцы...»

Успомніў, што цяпер там, дома, у вёсцы...

«Памагчы людзям трэба, каб біды пазбыцца. Казалі ж, планавалі нават — дэзактывацыю праводзіць, ачышчаць мясцовасць ад шкодных атрутных рэчываў».

«Але ж гэта тады можна будзе рабіць, калі рэактар утаймуюць, не будзе пасыпаць ён наўкруг сябе розную дрэнь... Дый ці паможа каму тая дэзактывацыя?»

«Значыцца, галоўная работа цяпер — там, у Чарнобылі...»

Памыўся ў ванне, пераапрануўся ў свежае, чыстае. Тое ж, у чым быў усе дні на Палессі, вынес на балкон.

«Няхай выветрыцца. А тым часам...»

Думкі перапыніў тэлефонны званок. Званіў Іван Пастушок.

— Я, можна сказаць, зноў праездам,— сказаў ён у трубку.— Дай, думаю, на ўсякі выпадак пазваню табе. Раптам дома?

— Я толькі вярнуўся,— сказаў з радасцю, што пачуў Іванаў голас, Андрэй.

— Адкуль?

— Ды з Палесся. Нават дома, у вёсцы, быў.

— У адпачынку? — здзівіўся Іван.

— Ды не, на ліквідацыю аварыі, як цяпер прынята гаварыць, ездзіў.

— Што там у нас дома? — зацікавіўся Іван.

— Вясёлага мала.

— Як нашы маці?

— Маці? Быў я і ў сваёй і ў тваёй. Нізашто ехаць нікуды не хочуць. Усе мае, як і твае ўгаворы,— гарохам аб сцяну.

— Я ж казаў табе. Зрасліся яны з вёскаю, з тым кутком, дзе нарадзіліся, карані пусцілі. Не вырваць.

— Так, ты чыстую праўду кажаш. А сам ты дзе, што робіш?

— Ды я... там,— зрабіў націск на слове «там» Іван.

— І што там?

— Работы — хоць адбаўляй, па самыя вушы. Тысячы людзей, машын... Верталёты, самалёты... Кожны ж разумее, што чым хутчэй ліквідуем аварыю, тым небяспекі менш... Але пакуль што хваліцца асабліва няма чым. Марудна, вельмі марудна ўсё ідзе. Але таго, чаго ўсе баяліся, не будзе. Мы валодаем сітуацыяй. Плануецца пабудаваць саркафаг, які навечна схавае тое, што называюць чацвёртым блокам...

— І што, выкіды спыняцца?

— Не адразу. Але каб збудаваць яго, трэба час. Ды і цэмент, жалезабетон, начынне рознае — датчыкі, фільтры і гэтак далей. Над усім гэтым мы і працуем.

— А як з небяспекай для здароўя? — спытаў Андрэй.

— Небяспека, вядома, ёсць. Але што зробіш? Здароўе аднаго чалавека ці здароўе мільёнаў! Таму рызыкуем.

— Можа б, мы сустрэліся, пагаварылі? — прапанаваў Андрэй.

— Праз некалькі хвілін я еду на аэрадром, а адтуль — у Кіеў. Так што сустрэчу адкладзём на другі раз. І так я рады, што захапіў цябе дома. Дык ты кажаш, маці не скрануць з месца?

— Не, нічым. Смерцю спрабаваў страшыць — не баяцца.

— Я ж кажу, з такімі людзьмі, як нашы, цуды можна рабіць. Ты б пабачыў, якія героі, смельчакі сярод тых, хто цяпер працуе там, у раёне аварыі. І якая дзелавітасць, самаахвярнасць! На ўсё гатовы, абы толькі хутчэй з бядою справіцца. Са ўсяго Савецкага Саюза папрыязджалі. Амаль усе добраахвотнікі. Не, з такімі людзьмі пабыць — веры набрацца, ачысціцца ад усяго непатрэбнага, наноснага. Усякая дрэнь паразбягалася, пахавалася, а сапраўдныя людзі неяк па-асабліваму паказалі сябе, высвеціліся. Хіба не так там, дзе ты быў?

— Так, Іван, так...

— Ну, то бывай, да сустрэчы!..

— Да сустрэчы!..

Іван паклаў трубку, а Андрэй усё яшчэ стаяў ля тэлефона з трубкай ля вуха. У галаве, у думках нараджалася новае, раней нязнанае.

«А што, калі... І мне туды, дзе Іван, дзе ліквідацыя аварыі ідзе?.. Там цяпер тысячы людзей... То і мне нейкая работа знойдзецца...»

Думка здалася правільнай. Аж загарэўся.

«Падам заяву — і ўсё, бывай, Ала, Эльвіра Барысаўна, Арцём Гаўрылавіч. Бывай, пасада...»

«А Іра?» — вынырнула аднекуль.

«Ды і яна. Сустрэліся выпадкова — і разыдземся. Жыць па-новаму пачну. Як іншыя жывуць, як Іван жыве. Вось пазваню Дзяміду Станіслававічу. І ўсё... Мучыцца, марнавацца не буду».

Хадзіў нейкі час з пакоя ў пакой па кватэры, нават на кухню быў зазірнуў — на кухні таксама безлад быў: стаялі абы-як на стале, ляжалі ва ўмывальніку нямытыя, з астаткамі ўжо засохлай і зацвілай яды міскі, сподачкі, кубачкі, лыжкі, відэльцы...

«Усюды тое самае... І няхай... Бачыць усяго гэтага не буду. Ды і ўсяго іншага...»

Не вытрымаў — падышоў, вярнуўся да тэлефона, набраў нумар Дзяміда Станіслававіча.

— А, гэта ты? — пазнаў яго адразу ж Дзямід Станіслававіч.— Добры дзень, Андрэй Анісімавіч, ты, кажуць, у тых раёнах быў. Што там?

— Нічога вясёлага няма,— змрочна адказаў Андрэй.

— Мне перадалі, што ты дзень і ноч працаваў, у самыя небяспечныя месцы ездзіў, сабой рызыкаваў. Даруй, я цябе не цаніў... Нават быў прапанаваў з пасады пайсці...

— Я і званю якраз па гэтым пытанні,— сказаў Андрэй і адчуў, як голас у яго міжволі задрыжаў.— Хачу падаць заяву...

— Гэта чаму ж? — здзівіўся Дзямід Станіслававіч.

— Ведаеце, хачу папрасіцца, каб мяне на ліквідацыю аварыі паслалі. У Чарнобыль. Калі нельга туды, дык на Палессе. Згодзен рабіць любую работу.

— Не гарачыся,— пачаў стрымліваць парыў Андрэя Дзямід Станіслававіч.— Тым больш... У нас на тваё месца і кандыдатуры няма.

— Раман Мітрафанавіч Клінцоў пакіруе, заменіць мяне.

— Клінцоў? А табе не дакладвалі пра яго? — спытаў, нібы са здзіўленнем, Дзямід Станіслававіч.

— Не, я ж нідзе яшчэ не быў, толькі прыехаў. А што?

— Нягоднік, вялікі нягоднік гэты твой Клінцоў. Ананімкі, як паказала экспертыза,— яго работа. Ён пісаў, а каб не пазналі, не выкрылі, жонка перапісвала. Так сказаць, сямейны падрад. І дзякуючы гэтаму рухаўся наперад, падседжваў сваіх начальнікаў. З партыі трэба выклю-

чаць, з работы праганяць. Так што не спяшайся з адстаўкай, падумай.

— Не, гэта канчатковае маё рашэнне,— цвёрда сказаў Андрэй.— Прашу ўлічыць маю просьбу.

— Няхай, аклемайся, адпачні дзень-два пасля прыезду, зойдзеш да мяне, пагаворым.

— Добра, Дзямід Станіслававіч. Але гаварыць будзем не пра маю заяву — просьба аб вызваленні канчатковая і абмеркаванню не падлягае.

— Ладна, ладна,— засмяяўся Дзямід Станіслававіч і паклаў трубку.

А Андрэй пасля гэтай размовы нібыта вялізны камень-валун з плячэй скінуў — ажыў, развесяліўся.

«Вось і асмеліўся я зрабіць тое, што даўно трэба было зрабіць. А ўсё астатняе... Таксама неяк жа будзе... Што ж да таго, хто прыйдзе на маё месца... Урэшце, участак не з лёгкіх... Ды яшчэ з такімі людзьмі, як Клінцоў...»

Успомніўшы Клінцова, засмяяўся.

«Трэба ж, каб такая падкалодная змяя побач была... Бачыш, да чаго дадумаўся!.. Сапраўды — сямейны падрад. Добрая ж, відаць, і жонка цаца, калі на такое згадзілася... Абое — рабое... Любым шляхам, абы вышэй, вышэй! Больш улады, больш славы, больш грошай! І гэта правільна, своечасова — перабудавацца, ачысціцца ад рознай дрэні. Інакш куды б і да чаго б дайшлі. Клінцова выкрылі... А колькі такіх клінцовых нявыкрытых яшчэ сядзіць, і смуродзяць, атручваюць усё і ўсіх вакол сябе?»

І думкі вярнуліся зноў да таго, чым жыў, пра што думаў усе апошнія дні — да Палесся, да таго, як памагчы людзям, выратаваць іх ад нябачнай смерці.

«Паеду туды, буду рабіць, што ў маіх сілах. Справай буду займацца. Як Іван, як іншыя. Карыснай, патрэбнай справай...»

«Але ж я апынуся без кватэры, сям'і... Ды і Іры...»

Зашчымела ўсярэдзіне.

«Гэта ж столькі дзён не бачыў яе! Ды дзе не бачыў — голасу не чуў, не размаўляў».

«І што — жывы-здаровы?»

«Ды быццам так. І ўсё ж...»

Не вытрымаў, падышоў да тэлефона, набраў Ірын рабочы нумар.

«Хоць павітаюся, даведаюся, што ў яе... А то...»

Іра была на працы. І, пачуўшы ў трубцы яе голас, Андрэй сказаў з прыкметным хваляваннем:

— Дзень добры, Іра.

— Дзень добры,— адказала Іра як бы спалохаўшыся. Потым, відаць, саўладала з сабой і адразу ж пайшла ў наступ: — Я прасіла, каб ты не званіў мне...

— Прабач, але я хацеў усё ж ведаць, што здарылася, чаму раптам ты змяніла да мяне свае адносіны?

Голас у Андрэя перасядаў, і ад гэтага было непрыемна.

— Каб ты больш не званіў, не прыставаў, я скажу...— Яна памаўчала, як бы падбіраючы словы, каб сказаць тое, што надумала, хацела сказаць.— Я... кахала і кахаю толькі аднаго... Мужа... Алеся... Перад майскімі святамі ён паклікаў мяне ў Маскву. Я з'ездзіла. І мы... Памірыліся. Зноў сышліся, жывём разам... Таму я і прашу, не звані, не напамінай пра сябе... Забудзем, што было між намі...

— Што ж, прабач... За ўсё, за ўсё прабач. Будзь шчаслівая,— прагаварыў ён хутка, не пераводзячы духу, і паклаў трубку.

Адчуванне на душы было такое, быццам памыямі яго аблілі. Ці далі пры людзях аплявуху.

«Лепш не званіў бы, наогул не сустракаў цябе,— падумаў.— Лягчэй бы мне было».

Разам з тым прыходзіла і супакаенне.

«Я мучыўся, перажываў... А выходзіць, дарэмна... Не варта яна таго. Адпомсціла мужу... А мне... У душу, у самую душу наплявала... Ды і я... Не трэба было мне, не трэба было паддавацца...»

Было непамысна і прыкра.

«Усё ж правільна я зрабіў, што пазваніў Дзяміду Станіслававічу, папрасіў вызваліць мяне ад пасады. Паеду адсюль... Хопіць, даволі... Усяго-ўсяго хопіць і даволі... Там, на новым месцы, збяруся з думкамі, па-новаму, зусім па-новаму жыць пачну...»

«А як жа з усім ранейшым? Яго ж ні з галавы, ні з сэрца не выкінеш — не забудзеш...»

«Што ж, будзем лічыць, што на памылках вучацца. І я павучуся... Галоўнае цяпер — новых бы памылак не нарабіць...»

*1987 г.*

# Незваротнае

Васіль Сяргеевіч паміраў. І, можа быць, ніхто, нават ён сам, не адчуваў так востра немінучасці таго, што павінна было не сёння-заўтра здарыцца, як адчуваў гэта я. Тым не менш, праседзеўшы далёка за поўнач ля яго ложка, я, каб лішне не насцярожваць хворага, не сеяць непатрэбных і цяжкіх думак, усё ж падымаўся з крэсла, на якім прывык сядзець, і, развітаўшыся, пажадаўшы добрай ночы, як рабіў гэта заўсёды і раней, кіраваўся дадому. Аўтобусы і трамваі ўжо не хадзілі, і я дабіраўся праз увесь горад да сваёй кватэры пеша. Дарога была знаёмая, звыклая. Колькі разоў вось гэтак уночы я мераў яе сваімі нагамі, то набліжаючыся да чорных, з патушанымі вокнамі, нібы сляпых, камяніц-гмахаў, што тут і там як бы вырасталі з цемры вялізазнымі глыбамі, то аддаляючыся ад іх, каб перайсці вуліцу, мінуць густа засаджаныя маладымі таполямі і ліпамі скверы, двары. Звычайна па дарозе дадому я ні пра што не думаў. Проста яшчэ і яшчэ ўдыхаў на поўныя грудзі паветра, якое ў гэты час нават у горадзе быццам свяжэла, і аддаваўся цалкам уладзе цішыні і спакою. Ды і пра што думаць? Усё, што мяне трывожыла і хвалявала, здавалася, было ўжо не раз і не два перадумана. Заставалася адно — чакаць. Чакаць, калі здарыцца тое, што павінна было здарыцца. І тады... Я не ўяўляў, што будзе тады, хоць падсвядома і адчуваў — дакладней, прадчуваў — яно як бы адрэжа, забярэ не толькі Васіля Сяргеевіча, але і частку мяне самога, майго жыцця. І я загадзя, ужо цяпер, рыхтаваўся да таго, развітваўся і з Васілём Сяргеевічам, і з тым, чым я жыў многія-многія гады. Перабіраючы ў памяці мінулае, я неаднойчы лавіў сябе на думцы, што не ведаю, не магу сказаць, як бы склаўся мой лёс, калі б не напаткаў на сваёй дарозе Васіля Сяргеевіча, калі б не пазнаёміўся з ім, не пачаў бываць у яго дома, на кватэры, не пасябраваў, як гэта могуць сябраваць людзі, нягледзячы на даволі значную розніцу ў гадах, словам, маладзейшы са старэйшым ці, наадварот, старэйшы з маладзейшым. Розніца між намі была не толькі ў гадах, але і ва многім іншым. Васіль

Сяргеевіч нарадзіўся да рэвалюцыі, я — перад апошняю вайною; ён быў патомны гараджанін, інтэлігент, я — вясковец, селянін; ён любіў расказваць, успамінаць, я — больш маўчаць, слухаць. Але нешта, мабыць, было ў нас і агульнае, тое, што яднала, збліжала, не давала забываць адзін на аднаго, часта сустракацца, быць разам. І калі я думаў над гэтым, дык чамусьці кожны раз успамінаў сваё і яго жыццё. Сваё жыццё, вядома, я ведаў лепш, але і тое, што ведаў пра Васіля Сяргеевіча, давала магчымасць уявіць, якое яно было ў майго старэйшага таварыша незайздроснае, як бы кручанае, нялюдскае. Незайздроснае, не зусім людскае яно было і ў мяне, але ж я яшчэ спадзяваўся, нават верыў — у мяне многае наперадзе і якраз, можа быць, не горшая яго частка, а лепшая. У Васіля ж Сяргеевіча лепшага наперадзе нічога ўжо не было, ён паміраў. Яго чакала смерць і магіла. І гэта было балюча, крыўдна да слёз. Балюча і крыўдна яшчэ і таму, што па сваёй натуры, дабрыні і характары гэты чалавек заслугоўваў куды большага, чым дало яму жыццё. І вінаваты... Хто сёння можа сказаць, хто вінаваты ў тым, што жыццё пражыта не так, як магло быць пражыта?.. Ды і не з тых я людзей, каб кагосьці ў чымсьці вінаваціць. Мяне цікавіць зусім іншае — хочацца разабрацца ва ўсім, што было і ёсць, зразумець, дайсці, як кажуць, да самой сутнасці. Гэта мне, праўда, хоць і горка прызнавацца, не заўсёды ўдаецца. Зноў жа — і ў гэтым я таксама нікога не вінавачу, хіба толькі сябе. Так, сябе, бо тыя ўмовы, тое асяроддзе, у якіх я жыў і выхоўваўся... Э, што і гаварыць... І каля я вяртаюся да свайго мінулага, да самых яго вытокаў, адкуль і калі я, можна сказаць, і пачаўся, то бачу звычайную вясковую хату, зрубленую па-старасвецку з тоўстых смалістых круглякоў-бярвенняў, з нізкай, паточанай шашалем столлю, трыма маленькімі, з бітымі шыбамі вокнамі, чорнай, месцамі гнілой падлогай, закуранай і не заўсёды цёплай печчу. Хата гэтая стаяла ля роўнага, як поле, зялёнага поплаву, адкуль і цягнулася аж кіламетры на два ўздоўж шырокага, па калена ў пяску шляху наша Хмелеўка. Вясною, у разводдзе, і ўвосень, калі лілі дажджы, вёску адразала на некалькі месяцаў ад усяго свету — хіба на чоўне можна было з яе выбрацца. У адносінах між людзьмі, ды і ў побыце панавала даўняе, дзедаўскае. Новае, што ўваходзіла ў тыя гады ў жыццё, абмінала Хмелеўку. А калі і кранала, дык не лепшым сваім бокам. Час ад часу кагосьці забіралі ў армію, кагосьці судзілі ці высылалі ў Сібір... Слёзы,

галашэнне... Іх я запомніў змалку, з першых дзён свайго жыцця на гэтым свеце.

Калі пачалася вайна і ў вёску прыйшлі немцы, слёз і галашэння пабольшала. Па-першае, людзі не хацелі аддаваць ворагу проста так таго, што нажывалася гадамі нялёгкай сялянскай працы. Па-другое, у лясах, што з усіх бакоў акружалі Хмелеўку, узнік партызанскі атрад. І немцы, наязджаючы як не штодзень, хацелі даведацца, хто трымае з партызанамі сувязь, хто іх корміць, дае адзенне ды і — пры неабходнасці — хавае. Знайшліся, як, мабыць, і ў кожнай вёсцы, і ў нашай тыя, хто паверыў акупантам, пайшоў да іх на службу, арганізаваў паліцыю. Дні і ночы сталі яшчэ больш неспакойныя. Страляніна амаль не сціхала. І як вынік яе — забітыя, гэта значыцца зноў слёзы, зноў галашэнне. Пахаванні ў вёсцы ішлі адно за адным. Надараліся дні, калі на могілкі вязлі адразу па некалькі дамавін. І прывыкнуць да такога... Не, мусіць, ніколі ніхто не прывыкне. Ды і як можна прывыкнуць, калі, здаецца, зусім нядаўна — учора — бачыў чалавека — здаровага, вясёлага, вітаўся, гаварыў, смяяўся, а сёння ён нежывы — маўклівы, глухі, бы зямля...

Бацька наш быў на фронце, ваяваў. Так, ва ўсякім выпадку, мы думалі, правёўшы яго яшчэ да прыходу немцаў разам з іншымі мужчынамі ўсёю сям'ёю за вёску, вядома, са слязьмі, з плачам. Без бацькі было сіратліва, няўтульна ў хаце. Бывала, у лес пойдзе — ён працаваў леснікам — цэлы дзень чакаем, ведаем, што нешта цікавае нам, сваім дзецям, прынясе. Улетку — суніц, чарніц, малін, парэчак, брусніц; увосень — арэхаў, грыбоў; зімою — зайца, дзіка падстрэліць... А то іншы раз і птушку якуюнебудзь зловіць, вожыка. І нам, дзецям,— радасць, вясялосць. Асабліва калі жывое што-небудзь да нас у хату трапіць. І кормім яго, і поім, і бегаем, ні на крок не адстаём, куды яно — туды і мы, глядзім, пільнуем, каб не ўцякло. Найбольш любілі мы маленькіх зайчанят, лісянят, ваўчанят. Можа, таму, што былі яны надта ж даверлівыя, бездапаможныя. І не ўцякалі ад нас, дзяцей, а, наадварот, гарнуліся, шукалі цяпла, абароны. З адыходам жа бацькі на фронт ніхто нічога ў хату не прыносіў. Хіба адна маці калі-нікалі сёе-тое прынясе. Але яна нідзе далёка не бывала — у гародзе цэлымі днямі корпалася, бульбу, буракі, моркву то палола, то акучвала, то капала, кашалямі ў сцёбку зносіла. І яшчэ ля печы раніцою і ўвечары завіхалася, есці нам, сваім дзецям, варыла. А нас, дзяцей, было пяцёра.

І ўсе малыя, адно за адно меншае. Самы старэйшы — Юра, ён у школу ўжо зіму хадзіў. Самая малая — Наташка, яна ў калысцы яшчэ ляжала, плакала, прасіла, каб яе пакалыхалі, накармілі, у сухое спавілі. І ўсе, хто забягаў ці заходзіў у нашу хату, бачылі: разжыцца чым-небудзь у нас вельмі не разжывешся, і таму хуценька ўцякалі, зачынялі за сабою дзверы. Мы ж у сваёй хаце — а яна была хоць і старая, трухлявая, але прасторная — стадола, як казала маці,— адчувалі сябе добра, асабліва калі голад не мучыў, пад'еўшы былі. Поўзалі, скакалі, бегалі з кута ў кут, прыдумвалі гульні, забаўкі, узбіраліся на лавы, ложкі, печ; а то і ў сенцы, на двор раз-пораз шмыгалі. Вясною, улетку, увосень дзе-дзе, а на дварэ ж любата! Свеціць, грэе сонца, усюды зелена, цёпла, добра. Шчабечуць, усеўшыся на страху, ластаўкі, камары, машкара таўкуць мак, бзыкаюць, кудысьці ляцяць авадні, пчолы, чмялі... Хадзі, бегай, гойсай — ганяй курэй, лаві пеўня; на карову — рагатую, хвастатую, ды і свіней можаш паглядзець, калі іх кормяць ці на пашу выганяюць. А то і ў хлеў зазірнеш, на сена, на вышкі залезеш ці на гарышча хаты. Ды і па гародзе паходзіш, палюбуешся на грады, дзе цвіце, спее мак, сланечнік, наліваюцца цудадзейнымі сокамі, растуць памідоры, агуркі, гарбузы, раскашуюцца морква, буракі, бручка, капуста... У карагля, клёца, лапту пагуляеш ды і з іншымі дзецьмі сустрэнешся — нешта пачуеш, падзелішся тым, што ты ведаеш і чаго хтосьці яшчэ не ведае... Зімою ж, як снег нападае, пазамятае сцежкі-дарожкі, маразы ўзыраць — на двор лепш не патыкайся. Бр-р, холадна! Ды і ў хаце месца сабе нідзе не знаходзіш, адусюль сіверам патыхае. З падлогі, з дзвярэй, сцен. Вокны быццам заклеены чым — так замураваў, размаляваў мароз. Прахукаеш, пальчыкам прагрэеш дзірачку, каб паглядзець, што там, на дварэ. Але багата чаго ўсё адно не ўбачыш — бела навокал, нібы ўкрыта, абкладзена ватаю. Аж ззяе, блішчыць, калі на дварэ сонца, снег. А калі сонца няма — мутна, туманна, сіне. Дзьме, свішча вецер, перамятае з месца на месца гурбы — аж дыміць, курыць. І, пасядзеўшы хвіліну ля акна, бяжыш грэцца, шукаць цяпла, хавацца на печ. Але і там, на чаране, іншы раз страшна — завывае ў коміне, гыгыкае, рагоча. Нібыта чэрці пазабіраліся ад холаду туды. А тут яшчэ, жуду наганяючы, трымцяць, аж калоцяцца, незакітаваныя шыбы, грукае, цярэцца аб вугал хаты голым голлем груша, скрыпіць непрыбітая ў шаляванні дошка. А ўночы, як ацямнее, змеркнецца — яшчэ

страшней, бо стрэлы зусім блізенька, здаецца, пад самымі вокнамі чуюцца. Тра-та-та!.. Тра-та-та-та!.. Прачнешся, на ногі спрасонку ўсхопішся... І ўжо да самай раніцы, давідна, не заснеш. Дрыжыш, калоцішся — месца сабе ў хаце нідзе не знаходзіш. Ні на ложку, ні на печы, ні на падлозе...

Неяк у адну з такіх неспакойных начэй нехта ў акно нам пастукаў. Мы думалі — партызаны. Аж не — бацька наш. Як увайшоў, уваліўся ў хату — мы не пазналі хто, пакуль не загаварыў. Ды і як было пазнаць, калі твар у яго зарос увесь шчаціннем; апрануты ж таксама нязвыкла быў — ватоўка, галіфэ, на галаве — не то хустка, не то шалік. І замёрз-замёрз — аж калоцiцца, зубамі, быццам цюцька, ляскае. Не распранаючыся, не зняўшы з сябе ватоўкі, не разуўшы лядзяшак-чаравік, на печ палез. І ляжаў там, амаль не злазячы, нешта, мабыць, ці не з тыдзень. Пал у яго пачаўся, і маці адпойвала гарачым малаком, узварам з малінніку і нейкіх зёлак. Калі ж бацька адагрэўся, апратаўся, расказаў, што на фронце ён доўга не пабыў, у палон да немцаў трапіў. І тыя трымалі яго ў лагеры, за калючым дротам. Аднойчы, калі яго разам з іншымі такімі ж, як і ён, палоннымі пераганялі з лагера ў лагер і на ноч замкнулі ў гумне, ён прадраў страху і ўцёк. Хаваючыся ў стагах сена, у кустах лазы, па полі і па лесе дабіраўся дадому. І вось, бачыце, дабраўся, дайшоў... Бацька ўсміхаўся, паказваў свае белыя зубы — радаваўся, што дома, у сваёй хаце.

Але бацькава, ды і наша, радасць была кароткая. У хату да нас неўзабаве зачасцілі паліцаі. Яны пачалі патрабаваць, каб бацька не сядзеў дома, а ўступаў у паліцыю. Уступаць у паліцыю бацька не хацеў.

— Дык ты, можа, у лес, да тых, хто разбой па начах чыніць, сабраўся? — крычаў на бацьку, махаў перад самым яго носам кулаком чорны, як грак, начальнік паліцыі, Адамчук.

Бацька ўхіляўся ад адказу, аднекваўся, маўляў, пра што ты, чалавеча, гаворыш. Хіба не бачыш, які я, душа ледзь у целе трымаецца. Ды і дзяцей поўная хата. Іх жа, можа, карміць, адзяваць, даглядаць трэба. Рад бы ў рай, ды грахі не пускаюць.

Але Адамчук не адставаў.

— Во што, запомні! — гарлапаніў ён на ўсё сваё луджанае горла.— Як толькі ты ў лес, іх,— паказваў ён на нас, дзяцей,— усіх да аднаго на штык наніжу. Сам! Нікому даручаць не буду!

І мы ведалі — наніжа. Жорсткі, бязлітасны быў Адамчук, нікога ані не шкадаваў. Забіваў і старых і малых. Бачылі, усе мы бачылі, як рабіў ён гэта ў суседнім з нашай хатай двары — гаспадыню, Насцю, з вінтоўкі застрэліў, а потым і траіх яе дзяцей пазабіваў. Прыкладам, штыком. А самага меншанькага, Алеську, у студню галавою ўніз укінуў. Нешта не ўгадзіла яму Насця, не паслухала яго, не зрабіла таго, што ён загадваў, хацеў. І Адамчук пaквітаўся, адпомсціў...

Нанізаць на штык нас, дзяцей, Адамчуку не ўдалося — хутка яго самога нанізалі на штык партызаны. Ды, як кажуць, святое месца пустым не бывае. Неўзабаве з'явіўся новы начальнік паліцыі, ужо не са сваіх, а з прышлых, з прымакоў — нехта Піліпенка. Піліпенка быў высокага росту, русявы, з чубам, што па-заліхвацку выбіваўся з-пад шапкі. І з такім грамавым голасам, што, калі гаварыў у адным канцы вёскі, чуваць было ў другім. Піліпенка па хатах не хадзіў — хто яму быў трэба, выклікаў у паліцыю. Выклікаў разоў колькі ён да сябе і нашага бацьку. І трымаў падоўгу, неяк нават у халодную — сыры мураваны пограб — замкнуў на ўсю ноч. Але бацька не паддаваўся ні на якія ўгаворы і пагрозы — не ішоў у паліцыю. Праўда, і ў лес, у партызаны, таксама не ішоў — ці то баяўся, каб паліцаі і немцы сям'ю не знішчылі, ці то так чаго, нешта іншае яго стрымлівала.

Вясною немцы зусім пашалелі — штодзень пачалі бываць у нашай вёсцы. Прыедуць, згоняць людзей да сельсавета, які цяпер называўся валасцю, выведуць то аднаго, то другога з натоўпу і застрэляць. Таму людзі, пачуўшы, што ў вёску едуць няпрошаныя госці, уцякалі са сваіх хат. Хто ў лес, хто ў зараснікі, балоты. Неяк раніцою, пачуўшы адчайдушны крык: «Немцы!» — і я, усхапіўшыся з пасцелі, кінуўся хавацца — пабег за хлеў, а там, узбіўшыся на разору, пашыўся па ёй у лазняк, што быў за гародамі, адразу ж за поплавам. У лазняку стаяла вада, ды такая халодная, што аж ногі зводзіла. Тым не менш страх быў вялікі, і я па той халоднай як лёд вадзе грэбаўся датуль, пакуль было можна. Тады, спалохаўшыся, што магу ўтапіцца, узабраўся на нейкі корч і праляжаў там, відаць, з гадзіну. Вядома, захацеў есці. Ды і одум, трывога ахапілі — дзе маці, бацька, браты, сёстры? А што, калі немцы іх забяруць ды куды-небудзь пагоняць з вёскі?.. І я... Адзін астануся? Што тады рабіць?..

Дзесьці апаўдні я не вытрымаў — выбраўся з лазняку

на сухое. Свяціла, аж сляпіла вочы зыркае чэрвеньскае сонца, бесклапотна, гарласта, імкнучыся перакрычаць адна адну, спявалі птушкі. Сарокі, чэкаўкі, сыткі... І я зусім асмялеў — здалося мне, што няма нідзе ніякіх немцаў, паехалі яны ўжо з вёскі. А можа, і наогул іх не было, не прыязджалі, проста памыліўся хтосьці, крыкнуў. І я паддаўся страху, кінуўся ўцякаць. Разважыўшы так, я выйшаў на поплаў, папраставаў да свайго гарода. І тут, ля самай, можна сказаць, разоры раптам нечакана ўбачыў немца. Ён, адкормлены, з тоўстым, амаль што бабскім задам, ляжаў, шырока раскінуўшы ногі, трымаючы ў руках аўтамат, настаўлены проста на мяне. Што было рабіць? Кінуцца, пыльнуць з усіх сіл назад, у алешнік, ці... Я разгубіўся. І немец скарыстаў гэта — паманіў пальчыкам мяне да сябе, паказаў, каб я не баяўся, ішоў да яго. Нават дастаў з кішэні пінжака цукерку ў залацістай абгортцы... Але я не зрушыўся з месца, стаяў як укопаны. І тады падняўся на ногі, устаў сам немец, пайшоў, не выпускаючы з рук аўтамата, да мяне. Ён быццам нават усміхаўся — крывіў губы, паказваў зубы. Наблізіўся крокаў на колькі, пачаў добранька, лагодненька гергетаць, пытаць, як я здагадаўся, дзе хаваюцца астатнія людзі, тыя, што паўцякалі з вёскі. Я гэтага не ведаў і таму маўчаў. Немец пырснуў слінаю, тупнуў нагою, гыркнуў. Ды так, што я, спалохаўшыся, кінуўся ад яго ўцякаць. Немец пабег за мною, але, мабыць, адчуваючы, што не дагоніць, стрэліў. Не ведаю, ці ў мяне, ці знарок міма. Куля дзыўкнула пад самым маім вухам, і я, не разумеючы чаму, нібы спатыкнуўся аб што — паваліўся, упаў у траву. І перш чым апомніўся, немец схапіў мяне за руку, пацягнуў, павалок кудысьці за сабою. Я закрычаў. Адчайна, на ўсё горла...

На мой крык з двара выскачылі, высыпалі маці, бацька, браты, сёстры... Ды і суседзі. Прыбеглі і тыя немцы, што таксама ляжалі, хаваліся ў гародзе, у засадзе. Падняўся страшэнны лямант — крык, плач...

Тое, што на мой крык збегліся людзі, мусіць, мяне і выратавала, дапамагло. Бо немцы, пагергетаўшы нешта між сабою, мяне неўзабаве адпусцілі...

Дома, калі мы сям'ёю зайшлі ў сваю хату, маці аж на рукі мяне падхапіла, падняла, пачала цалаваць — яна ніяк паверыць не магла сама сабе, што я жывы, не мёртвы. А бацька не на жарт раззлаваўся, нават разы тры дзягай мяне апяразаў, бо я, выходзіла, быў неслух, адзін хавацца пабег, і наказаў, каб больш ніколі так не рабіў, быў заўсёды разам з усімі сваімі, з сям'ёй.

— А то што ты адзін? — крычаў на мяне бацька.— Ды і мы як без цябе?

Яго наказ надта ж спатрэбіўся мне потым. І тады, калі немцы, падпаліўшы вёску, гналі ўсіх нас, яе насельнікаў, у Нямеччыну, і потым ужо, у самой Нямеччыне, дзе пасялілі нас пры шырокай шашы на ферме ў пана. Чужына ж — не дамоўка. І гэта хоць і малы быў я тады, але зразумеў добра. Усё ж там не такое, як у нас, у вёсцы. Хаты, поле, дарогі, людзі. Неба і тое, здаецца, зусім інакшае. Увесь час мучыў, дакучаў голад. І ў дарозе, па якой спярша гналі нас пеша, і ў таварных вагонах, у якія аднойчы апаўдні пагрузілі і вязлі некалькі сутак, ды і там, у Нямеччыне. Тое ж, што асталося дома,— хата, двор, гарод, поплаў, луг, лес, поле — здавалася казкай, марай. І снілася, снілася па начах. Як стуліш вочы, дык і бачыш...

Вызвалілі нас амерыканцы. І той дзень, дакладней, надвячорак, запомніўся. На шашы, якая аж калацілася, гула перад гэтым — па ёй уцякалі, адступалі, везучы на машынах, фурманках, веласіпедах, дзіцячых калясках хто што, цывільныя і вайскоўцы, раптам абязлюдзела, стала ціха-ціха. Мы і падумаць не паспелі, што ж здарылася, як на шашы з'явіліся, загрукаталі танкі. На іх вежах бялелі пяцікутныя зоркі. Тлумачыць нікому нічога не трэба было. І так ведалі — гэта былі танкі саюзнікаў, амерыканскія танкі. Ура-а, значыцца, прыйшло вызваленне. І прыйшло яно, я на ўсё жыццё запомніў гэтую дату — шостага мая сорак пятага года...

Але вызваленне — вызваленнем, а дадому, на Радзіму, вярнуліся мы няхутка. Тая мясцовасць, дзе мы адбывалі няволю, пераходзіла то пад англічан, то стала зноў амерыканская. Амерыканцы дадому нас не пускалі, наадварот, угаворвалі, каб не ехалі мы туды, страшылі, што нас каго вышлюць у Сібір, каго пасадзяць у турму. Але нашы бацькі, пажыўшы на чужыне і хапянуўшы ўволю гора, ні на што не згаджаліся, патрабавалі, настойвалі, каб адправілі дадому, і толькі дадому. Амерыканцы, відаць, убачыўшы, што з іхніх угавораў нічога не выйдзе, урэшце падагналі машыны, пагрузілі нас у кузавы і завезлі за Эльбу, дзе былі савецкія войскі.

Зноў была, цяпер ужо быццам карацейшая, дарога на Радзіму — на абцягнутых зверху брызентам грузавіках, у таварных вагонах. Потым — нялёгкае жыццё ў зямлянцы на папялішчы роднага селішча. Зноў голад... А тут, як на тое,— дзе коратка, там заўсёды ж рвецца,— яшчэ захварэў

бацька, захварэла маці — перажытае ў акупацыю, ды і ў няволі, давала пра сябе знаць.

І ўсё ж дамоўка ёсць дамоўка. Тут было ўсё звыклае, сваё, а галоўнае — свае людзі, яны і не далі памерці з голаду, загінуць. Ды і самі мы не складвалі рук, шчыравалі — і поле хадзілі перакопваць, бульбу шукаць, што асталася нявыкапаная, і ў лесе петлі на дзікіх звяроў ставілі, і дровы рэзалі ды прадавалі, каб капейку якую мець. А вясною — шчаўе, потым — ягады, грыбы...

Увосень сорак шостага года пайшоў я ў школу. Вядома, школа была не такая, як цяпер. Вучыліся па хатах — адзін клас у Сямёна, другі — у Палаг'і, трэці — у Нічыпарковай Ганны... Настаўнікі таксама былі збор-дружына. Кантужаны, зусім глухі Іван Гаўрылавіч, тоўстая, старая, амаль бяззубая Дзіяна Пятроўна, маладая, зусім дзяўчо, Леаніла Максімаўна... Іван Гаўрылавіч крычаў на ўроках, аж вушы закладвала, Дзіяна Пятроўна шаптала нешта сама сабе пад нос, так што не пачуць было, што яна гаворыць, а Леаніла Максімаўна чамусьці ўсё смяялася і ставіла ўсім, незалежна, ведаеш ці не ведаеш урок, пяцёркі. Быў сярод настаўнікаў яшчэ адзін, якога ўсе мы, вучні, надта ж любілі, хоць і ведалі, што ён — горкі п'яніца. Звалі яго Яфрэм Адамавіч. Ён не вылучаўся акуратнасцю, да таго ж часта зрываў урокі, не прыходзіў у клас. Але ўжо калі прыходзіў, то нашай радасці не было канца. Яфрэм Адамавіч надта ж прыгожа маляваў. Прычым сапраўднымі куплёнымі фарбамі. Як намалюе што-небудзь — дуб, грушу, сліву ці неба з воблакамі — заглядзішся, вачэй не адвядзеш... А яшчэ Яфрэм Адамавіч умеў чытаць — ну рыхтык артыст. І калі быў у гуморы, добрым настроі — прыходзіў да нас у клас з кнігамі Пушкіна, Гогаля ці Якуба Коласа. І, павітаўшыся, дабрадушна ўсміхнуўшыся ў свае рыжыя, багушэвіцкія, як мы, вучні, казалі, вусы, адразу ж, нават не сеўшы за стол, пачынаў чытаць. І як, як! Голас яго мяняўся, то гучаў глуха, як рэха, то звінеў, як лясны ручаёк. А калі даходзіла да перадачы размовы герояў, то Яфрэм Адамавіч нават галасы падрабляў — адзін герой у яго гаварыў басам, другі палахліва нешта не вельмі выразнае мармытаў, трэці заікаўся ці шапялявіў... Усё было як у жыцці, калі збіралася і гаварыла некалькі зусім розных людзей — адзін аднаго перапынялі, кашлялі, хекалі, злаваліся, смяяліся, жартавалі...

Відаць, ад Яфрэма Адамавіча ў мяне і любоў да мастацкай літаратуры. З тых незабыўных школьных гадоў...

Трэба сказаць, што на каго-каго, а на выкладчыкаў літаратуры мне шанцавала. Нават калі закончыў я сем класаў і паехаў вучыцца далей, у дзесяцігодку — а яна была ў мястэчку, аж за дваццаць кіламетраў ад Хмелеўкі,— там таксама працаваў настаўнік, які ведаў літаратуру, як рэдка хто, нават сам вершы, апавяданні, п'есы пісаў. Калісьці ён вучыўся ў педтэхнікуме разам з Паўлюком Трусам, Пятром Глебкам, Максімам Лужаніным і ўмеў надта ж цікава расказваць пра пісьменнікаў, іх творы. Сам настаўнік таксама мог нешта зрабіць, пакінуць след у літаратуры, аднак калі ў трыццатыя гады пачаўся, як ён называў, «хапун», ён уцёк, схаваўся на Палессе. Трапіў, вядома, пад акупацыю. У партызаны ён не пайшоў, працаваў у школе, што значыла па тых часах — супрацоўнічаў з немцамі... І ніхто тады асабліва не ўнікаў у тое, што настаўнік не на немцаў рабіў, а на сваіх — вучыў чытаць і пісаць беларускіх дзяцей, да таго ж быў падпольшчык, памагаў партызанам. Разбірацца ва ўсіх складанасцях чалавечых лёсаў ніхто вельмі тады не меў часу ды і не хацеў... Гэта я ведаў па бацьку, якога надта ж крыўдзілі, выклікаючы ў мястэчка і дамагаючыся прызнання, што быццам сам ён, па сваёй ахвоце здаўся ў палон немцам, высвятляючы, як і пры якіх акалічнасцях уцёк ён з лагера ваеннапалонных, чаму не пайшоў у партызаны... У бацькі і ўсё астатняе было не бездакорна — трапіў жа ў Нямеччыну, працаваў там на немцаў (мацаваў іх тыл!), і не савецкія войскі вызвалілі, а амерыканскія. І тых, хто выклікаў і дапытваў бацьку, цікавіла — ці не завербавалі яго амерыканцы, ці не заслалі сюды, у Савецкі Саюз, як шпіёна?.. А каб, мабыць, далей быць ад граху, бацьку і ўсю нашу сям'ю збіраліся выслаць у Сібір... Што нас выратавала, чаму ўсё ж не выслалі — ніхто сказаць не можа і дасюль.

...Тыя часы... Я запомніў іх на ўсё сваё жыццё. І не толькі, што былі яны нялёгкія, галодныя, але і... Што казаць... Неяк, будучы вучнем дзевятага класа, ехаў я з нядзелі на панядзелак цягніком у мястэчка, дзе, як я казаў ужо, вучыўся ў школе. У вагоне мне трапіўся незнаёмы спадарожнік — па-вайсковаму падцягнуты, у наапашку накінутым шынялі, хоць і без пагонаў. Нестары, чыста паголены і, як здалося мне, даволі памяркоўны. Чалавек зацікавіўся мной — пачаў распытваць, хто я, куды еду. Я па сваёй шчырасці прызнаўся, што вучуся ў школе. Гаварыў я, вядома, па-беларуску, і чалавек зрабіў выгляд, што вельмі здзівіўся, адкуль я так добра ведаю мову,

прычым не мясцовую, палескую, а літаратурную. Я сказаў, што люблю літаратуру, шмат чытаю.

— Якіх вы беларускіх пісьменнікаў чытаеце? — паглядзеў на мяне як бы з недаверам чалавек.

Я назваў усіх, каго мы вывучалі ў школе,— Францішка Багушэвіча, Максіма Багдановіча, Цётку, Янку Купалу, Якуба Коласа, Кузьму Чорнага, Міхася Лынькова...

— А больш нікога не ведаеце? — глядзеў, не спускаў з мяне вачэй чалавек.

— Чаму ж... Ведаю...

І я назваў тых пісьменнікаў, каго называў, праўда, просячы не надта запамінаць, выкладчык роднай літаратуры Гарасім Іванавіч,— Уладзіміра Дубоўку, Язэпа Пушчу, Максіма Гарэцкага, Міхася Чарота, Цішку Гартнага, Міхася Зарэцкага...

— А чаму іх твораў у нас не выдаюць? — пытаў чалавек.

— Бо яны... рэпрэсіраваны,— шчыра адказваў я.

— І Кузьма Чорны быў рэпрэсіраваны,— быццам не згадзіўся са мной чалавек.

— Ведаю.

— Але ж яго выдаюць, нават у школах на ўроках вывучаюць.

— Ён быў выпушчаны на волю. І працаваў у вайну ў газеце, у Маскве.

— Адкуль вы ўсё так ведаеце? — здзіўляўся — і непадробна! — чалавек.

— Настаўнік расказваў.

— Які настаўнік, як яго прозвішча? — І чалавек дастаў з кішэні шыняля блакнот, ручку, падрыхтаваўся запісваць.

Быццам павалоку зняў хто з маіх вачэй. Гэтак, як аднойчы, калі мы, дзеці, ірвалі ў жыце васількі і ўбачылі здалёк ля сажалкі зусім голых жанчын. Мы падумалі тады, што гэта русалкі, якімі нас, дзяцей, палохалі нашы бацькі, каб не таптаді збажыны. І раптам у адной з голых жанчын я пазнаў суседку, Полю... Прыкладна тое ж адбылося і цяпер. Я схамянуўся — што я раблю? Настаўнік даверліва назваў прозвішчы рэпрэсіраваных пісьменнікаў, прасіў не надта запамінаць, а я...

Далейшае рабілася хутка і міма мае волі. Не помню, як узяў я ў рукі торбачку, у якой вазіў у мястэчка харчы — каб хапіла на цэлы тыдзень! — як, нічога не сказаўшы, у наступную хвіліну імкліва шмыгануў з купэ. Чалавек

кінуўся ўслед за мною. Але не так лёгка было дагнаць мяне ў вагоне. Кантралёры, і то не маглі злавіць, бо ездзіў я, вядома ж, без білета. Я ўзбіраўся, як кошка, на дах вагона, выбягаў на падножку і трымаў рукамі, не даючы адчыняць, дзверы, а то і на хаду цягніка разоў колькі сігаў у кювет. Тое самае я зрабіў і цяпер — якраз быў паварот, цягнік прыцішыў ход, і я, выскачыўшы на падножку, каб быць далей ад непрыемнасцей, сігануў у цемру. Падаючы, стукнуўся аб нейкую патырчаку, але не так моцна, каб плакаць. Ды і да мястэчка было недалёка — кіламетраў пяць. А хадзіць аднаму ўночы мне было не прывыкаць. Бывала ж, і ў лес, да электрапілы, якую бацька вартаваў, хадзіў, ды і мала яшчэ куды...

Назаўтра раніцою, як ні ў чым не бывала, я накіраваўся ў школу. Яна была даваенная, старая, драўляная, з мноствам вокан і дзвярэй, вялікім прасторным двaром, агароджаная з усіх бакоў шчыльным дашчаным плотам. Вядома, я нямала здзівіўся, убачыўшы выкладчыка беларускай мовы і літаратуры — Гарасіма Іванавіча, які стаяў, быццам кагосьці чакаў, пры ўваходзе ў школу. Я аж не пазнаў яго, так ён змяніўся з твару — быў бледны, разгублены. Нават быццам шчаціннем сівым густа зарос.

— Ты ўчора ехаў у мястэчка цягніком? — насцярожана зашаптаў настаўнік, набліжаючыся да мяне.

— А што? — і ў мяне нібы абарвалася, ёкнула сэрца.

— Не хадзі ў школу. Ні сёння, ні заўтра, ні ў бліжэйшыя дні, пакуль не паедзе той чалавек, з якім ты ўчора гаварыў у вагоне. Ён ужо ў школе, будзе хадзіць па класах, цябе шукаць. Ну і падставіў жа ты мяне,— круціў вялікаю лысаю галавою Гарасім Іванавіч.— Да ўсіх маіх бед толькі гэтага яшчэ і не хапала...

Тры дні я сядзеў як мыш пад венікам, не паказваючыся на вуліцу, на той кватэры, дзе жыў. А на чацвёрты Гарасім Іванавіч прыслаў да мяне пасланца — усё, можна ісці ў школу, той чалавек, які мяне шукаў, паехаў...

Другі раз я адчуў на сабе «тыя часы» ў дзесятым класе. Усім нам, вучням, далі анкеты, каб мы запоўнілі — ваенкамат меўся прапанаваць паступаць у вайсковыя вучылішчы. І вось, калі мы гэта зрабілі і прадстаўнік ваенкамата — доўгі, худы, з вялікімі, як у зайца, вушамі — пазнаёміўся з тым, што мы напісалі ў анкетах, ён, падняўшы мяне з-за парты і паставіўшы па стойцы «смірна», папрасіў пакінуць клас.

— Чаму? — спытаў я разгублена.

— Ты ў Германіі быў, цябе амерыканскія войскі вызвалілі,— сказаў ён даволі жорстка.

Што я перажыў тады, блукаючы адзін па школьным двары, а потым, расплакаўшыся, і па парку! Помню, была вясна, май месяц. Свяціла, ззяла сонца, спявалі, аж заліваліся птушкі. І надта ж прыгожа, зелена было ўсюды. Але я нічога не бачыў, не чуў. Я цалкам быў заняты сабою, сваім. Выходзіць, я не такі, як усе мае равеснікі-аднагодкі, і тое, што можна ім, няможна мне. А хіба ж я ў чым вінаваты? Я ж не прасіў немцаў, каб яны палілі маю вёску, гналі мяне ў Нямеччыну. Ды і там... Якая розніца, хто вызваліў — савецкія войскі ці амерыканскія? Вызвалілі, і хвала Богу — я зноў дома, на радзіме. Бо калі б не вызвалілі... Звекаваў бы рабом. На чужыне ўсё б жыццё жылле рваў, карак гнуў, як рабілі гэта аж два доўгія, як вечнасць, гады мае бацька і маці... І мяне, што не астаўся ў Нямеччыне, вярнуўся, прыехаў дадому... Папракаць, не давяраць?!

Вучыўся я добра. Быў адным з лепшых вучняў у школе. «Ішоў», як тады казалі, на медаль. Але гэта было да таго, як і настаўнікі, і дырэктар школы даведаліся, што быў я ў Нямеччыне, што мяне вызвалілі амерыканцы. Калі ж пра гэта стала вядома, сёй-той завагаўся — што рабіць? Ані не сумняваўся ва мне Гарасім Іванавіч. Ён, як потым стала мне вядома, і схіліў настаўніцкі калектыў, настояў, каб на медаль мяне ўсё ж прадставілі. Праўда, было вырашана — прадстаўляць не на залаты медаль, а на сярэбраны... Ды гэта было пасля. Тады ж, у час вучобы, мяне найбольш клапаціла, займала ўсе мае думкі іншае — за што жыць, як пракарміцца. Справа ў тым, што мой бацька, перахварэўшы на раматус, амаль не мог стаяць на нагах і працаваў у леспрамгасе вартаўніком электрапілы. За гэта яму плацілі такую мізэрную плату, што яе хапала хіба купіць мяшок мукі. А нас жа ў сям'і было сямёра... І ўсім хацелася есці, трэба было хоць у што і адзявацца. Маці таксама не вялікая работніца была — у гародзе сваім корпалася, есці ўсім нам варыла, апратку мыла ды яшчэ ў калгас хадзіла, каб сотак не абразалі. І вучыць мяне ў бацькі проста не было за што. А даводзілася ж яшчэ і за кватэру плаціць, тую, дзе я жыў. Ды і нейкую капейку на тыдзень на хлеб даваць. І, каб не галадаць, я прылаўчыўся сам зарабляць грошы. Улетку драў бяросту, капаў смаловыя пні, збіраў і насіў на продаж ягады, грыбы. І пісаў пра ўсё, што адбывалася ў калгасе і ў вёсцы і, як мне здавалася, уяўляла цікавасць, пасылаў гэта не толькі ў раённую,

але і ў абласную, рэспубліканскія газеты. Мае заметкі, інфармацыі хоць і не ўсе, але друкавалі. Мне ж прысылалі ганарар. Ён, праўда, быў невялікі, але і расходы мае таксама тады былі невялікія. За тыя грошы, што зарабляў, я не толькі карміўся, але купіў сабе і боты, штаны, пінжак і нават паўпалітцэ, шапку. Ды каб пастаянна пісаць у газеты, трэба шмат дзе бываць, ведаць, дзе што робіцца. А вучню сярэдняй школы трэба на ўроках сядзець, вучыцца. Я пачаў заходзіць у рэдакцыю раённай газеты, пазнаёміўся з некаторымі яе супрацоўнікамі. І яны, не заўсёды маючы час і жаданне хадзіць на розныя мерапрыемствы, пасылалі туды мяне. Я не адмаўляўся ад даручэнняў рэдакцыі. Наадварот, радаваўся ім, ахвотна выконваў.

Сярод супрацоўнікаў газеты былі людзі чулыя, шчыра дапамагалі мне ва ўсім. Асабліва загадчык сельскагаспадарчага аддзела Арцём Сідаравіч. З ім мы нават быццам пасябравалі. Маленькага росту, як пяцікласнік, ён быў са мною з першага дня нашага знаёмства на роўных і найбольш, найчасцей выкарыстоўваў мяне як карэспандэнта, пасылаў іншы раз у бліжэйшыя калгасы, каб я напісаў што-небудзь адтуль у газету. Аднойчы я атрымаў даволі значную — па тых, вядома, часах ды і ў маім становішчы — суму ганарару, і Арцём Сідаравіч прапанаваў гэта «замачыць» — пайсці ў рэстаран. Адмовіцца?.. Але... Арцём Сідаравіч ці зразумеў бы мяне, дый ці даваў бы даручэнні і заданні рэдакцыі?

Рэстаран у нашым мястэчку нагадваў звычайную забягалаўку, дзе перакусвалі на хаду шафёры, розны іншы люд, што апынаўся ў мястэчку і затрымліваўся на больш, чым разлічваў. І быў ён непадалёку ад парку, размяшчаўся ў вялікай цаглянай будыніне. Арцём Сідаравіч як чалавек бывалы выбраў столік у самым куце, заказаў два куфлі піва, бутэльку гарэлкі і закуску — смажаную рыбу, агуркі, катлеты, хлеб... Піва да гэтага я ніколі не піў, нават не каштаваў. Яно здалося мне горкае і нясмачнае. Не піў я, у рот не браў і гарэлкі. І як ні шчыраваў Арцём Сідаравіч, як ні ўгаворваў, ні прымушаў мяне хоць «язык памачыць», «губы абмыць», я не паддаўся. Давялося Арцёму Сідаравічу аднаму выпіць і піва і гарэлку. Вядома, ён захмялеў. І добра. Так, што давялося мне браць яго пад ручку, ледзь не сілком выцягваць, валачы з рэстарана. А потым і хадзіць з ім, абняўшыся, па парку, па мястэчку. Куды падзець зусім п'янага супрацоўніка газеты — я не ведаў. Кінуць жа проста на вуліцы я таксама не мог.

— Вядзі мяне... да сябе... на кватэру! — ікаў, загадаў Арцём Сідаравіч.

Уга, гэта зрабіць я таксама не мог, бо мяне і самога не пусцілі б на парог — я жыў у яўрэяў, а яны... Умова, калі пасяляўся да іх на кватэру, была такая — каб я не вадзіў у хату нікога са знаёмых і дружбакоў. Яўрэйская сям'я была набожная, трымалася розных старых звычаяў, і каб «гоі» бывалі ў хаце... Гэта не дазвалялася.

Калі я прызнаўся, сказаў Арцёму Сідаравічу, што, на жаль, пры ўсім маім жаданні завесці яго да сябе на кватэру я не магу, ён разбурчаўся, раскрычаўся. Урэшце загадаў весці яго на кватэру да Салаўя. Салавей — гэта было прозвішча ветурача, які часта выступаў на старонках раённай газеты з рознымі карыснымі парадамі. Асабіста я яго не ведаў, як не ведаў і дзе ён жыве.

— Давай кіруй на Вакзальную вуліцу... У самы канец... Я пакажу дом,— камандаваў Арцём Сідаравіч.

Ужо не толькі даўно язык у майго спадарожніка заплятаўся, але і ногі. Да таго ж, як неўзабаве я заўважыў, ён абрамізіў самым ганебным чынам штаны — яны былі зусім мокрыя. Але ж... Не кідаць жа на вуліцы чалавека? І я неяк дацягнуў, амаль што данёс яго да таго двара, дзе, як казаў Арцём Сідаравіч, жыў Салавей.

— Грукай у дзверы... Хай адчыняюць...

Я пастукаў, спярша асцярожна, потым мацней.

Якое ж было маё здзіўленне, калі на ганак дома выйшла... не, не, у гэта цяжка, амаль немагчыма было паверыць, аднак жа... Так, так, я не памыліўся — гэта была Галіна Пятроўна... Мая класная кіраўніца, настаўніца...

І яна і я ад нечаканасці разгубіліся.

— Аляксей? — паглядзела на мяне так, што хоць уцякай, скрозь зямлю праваліся, настаўніца.— І ты, з гэтым п'яніцам? Ты што, можа, сам п'еш?

Не помню, як я пакінуў Арцёма Сідаравіча, як выбег з двара, дайшоў да кватэры, дзе жыў. Было, вядома, сорамна, прыкра. Што я нарабіў? П'янага, смярдзючага забулдыгу ў дом Галіны Пятроўны прывалок. Ды і сам... Хто мне паверыць, што я не піў, што не п'яніца? Не давала спакою і яшчэ адно — чаму мы трапілі да Галіны Пятроўны? Знарок Арцём Сідаравіч да яе мяне павёў, адрасам памыліўся... Ці... Галіна Пятроўна мае нейкае дачыненне да Салаўя? Але ж... У яе зусім іншае прозвішча — Крупенчанка.

Назаўтра ў школу я ішоў, быццам на кару. Сустрэўшы

на калідоры Галіну Пятроўну, якую я надта ж паважаў, нават любіў, бо была яна не толькі спагадлівая жанчына, але і выдатны педагог, чалавек — у гады вайны партызаніла, хадзіла на сувязь са славакамі, нават мела ўзнагароду — медаль,— я вінавата апусціў галаву.

— Што ж ты, хлопец, робіш? — пажурыла мяне Галіна Пятроўна.— Цябе бацькі прыслалі сюды, каб вучыўся. А ты?

— Я не ведаў, што павядзе да вас... Ён прасіўся да ветурача Салаўя,— апраўдваўся, нясмела бараніўся я.

— Але ж Салавей — гэта мой муж,— прызналася Галіна Пятроўна.— І не бяда, што ты прывёў п'яніцу да нас... Уранні я яго вытурыла з хаты, хоць давялося потым цэлую гадзіну шараваць дзеркачом тое месца, дзе ён ляжаў... Смурод такі, што хоць нос затыкай. Але ж ты... Ты піў з ім?

— Не, я не п'ю,— сказаў я такім тонам, што не паверыць было нельга.

— Ну хоць гэта, хвала Богу. Уцякай ад такіх людзей, як Арцём Сідаравіч, да дабра яны цябе не давядуць...

Уцякай ад такіх людзей... Добра сказаць, а зрабіць... Ды і адкуль будзеш ведаць чалавека, пакуль добра з ім не пазнаёмішся, не з'ясі, як кажуць, разам пуд солі? І не раз памыляўся я ў людзях, лічачы іх такімі, а, як выяўлялася, былі яны зусім іншыя. Не кожны ж чалавек адразу раскрываецца, здараецца, да часу хавае сваё сапраўднае аблічча, ды і нутро. А потым, як раскрыецца, убачыш ты яго ўсяго... Непрыемна, страшна робіцца. Асабліва калі паспееш перад ім сам паспавядацца, раскрыцца, уведае ён некаторыя твае таямніцы. Не памыліўся некалі я, знаёмячыся з Васілём Сяргеевічам. Ды пра гэта — будзе яшчэ час...

Там, у школе, напаткала мяне і першае каханне. Кажуць, першыя каханні рэдка ў каго бываюць шчаслівыя. Не было шчаслівае яно і ў мяне, хоць прынесла і шмат радасці, хвалявання. А пачалося ўсё з вечарынкі, якую наладзілі мы, вучні дзесятага класа, на кватэры ў незнаёмай тады мне Міры. Была зіма, вецер мёў, круціў снег, засыпаў дарогу, калі ішоў я са сваімі аднакласнікамі да таго драўлянага дома, дзе меркавалася быць гулянка. Упершыню, дарэчы, ішоў разам з тымі, з кім вучыўся, бо ганарлівыя местачкоўцы мяне, вяскоўца неачосанага, не прымалі ў свае кампаніі, цураліся. Ды, прызнацца, і я не вельмі хінуўся да іх. Па-першае, я горш за местачкоўцаў апранаўся, па-другое, быў надта ж заняты сваімі клопата-

мі. А ў той вечар нешта незразумелае са мною адбылося, быццам знарок мяне вяло, каб я сустрэўся, пазнаёміўся з Міраю. Міра, як хутка выявілася, вучылася ў дзевятым класе, і тое, што мы раней не ўбачыліся, не сустрэліся, была выпадковасць. А можа, мы і сустракаліся, бачыліся, ды не звярнулі адно на аднаго асаблівай увагі.

Хата ў Міры была прасторная, без перагародак. І жыла ў гэтай хаце яна адна. З самай акупацыі, вайны, калі яе бацьку і маці за сувязь з партызанамі забралі немцы. Міра ўцалела толькі таму, што ў той час, калі забіралі бацькоў, яе не было дома, гуляла ў суседзяў. Што немцы зрабілі з бацькамі, Міра не ведала. Верыла: яны жывыя і вернуцца дадому. Лічыла, што іх вывезлі ў Нямеччыну. І, даведаўшыся, што я быў у Нямеччыне, надта ж захацела са мною пазнаёміцца, каб, як потым яна прызналася, хоць што-кольвечы пачуць, як там і дзе жылі вывезеныя, выгнаныя савецкія людзі — спадзявалася нават — раптам я што-небудзь ведаю і скажу пра яе бацьку і маці. І ўпрасіла сваіх сяброўак — маіх аднакласніц — прывесці мяне да сябе на вечарынку.

На вечарынцы былі танцы пад гармонік і бубен, была і пачостка — дзве бутэлькі мутнаватай самагонкі і закуска — хлеб, сала, капуста, агуркі. Але ўсё гэта мяне не цікавіла. Мяне адразу ж, з першага погляду, зацікавіла сама Міра, і я не зводзіў з яе вачэй. Была яна танклявая, вёрткая і надта ж прыветная, добрая. І ўсё ўсміхалася — вачамі, губамі. Светлыя кудзеркі валасоў, што звіваліся ля вушэй і спадалі на лоб, надавалі ёй яшчэ больш вясёлы і як бы летуценны выгляд.

І калі мяне пазнаёмілі з ёю, мы ўжо не адыходзілі адно ад аднаго ні на хвіліну. А выбегшы ў цёмныя сенцы пасля імклівай полечкі халадацца, нават абняліся, пацалаваліся.

— Ты мне як брат,— шапнула мне на вуха Міра.

— А ты мне як сястра,— сказаў я таксама ёй гэтак жа ціха на вуха.

І, трэба сказаць, шчыра сказаў.

З той вечарынкі пачалі мы сустракацца з Мірай як не штодзень. Хадзілі ў кіно, у парк, а то і ўрокі разам рыхтавалі. У Міры не было бацькоў, а мае бацькі былі далёка ў вёсцы. І нам ніхто ні ў чым не замінаў, не перашкаджаў. Забегшы на хвілінку пасля ўрокаў на кватэру, дзе я жыў, і ўзяўшы патрэбныя падручнікі і сшыткі, я спяшаўся да Міры. Там я і абедаў, вячэраў. Само сабой, мы з Мірай, вядома, мілаваліся, цалаваліся. Я аж п'янеў ад яе рук,

грудзей, наогул цела... Здавалася, нічога няма лепшага ў жыцці, як быць разам з Міраю.

Калі я закончыў дзесяць класаў і паступіў ва універсітэт, Міра пісала мне лісты. І я пісаў ёй таксама — мы не ўяўлялі адно без аднаго свайго жыцця.

На жаль, не заўсёды робіцца ўсё так, як хочуць людзі. Недзе на другім курсе пад зіму я атрымаў ад Міры ліст, у якім яна паведамляла, што выходзіць замуж. Міра тлумачыла гэта тым, што яна не паступіла ў інстытут, а жыць адной, весці гаспадарку ёй абрыдла. Чакаць жа мяне — і доўга, і няпэўна. Таму яна і вырашыла выйсці замуж за таго, хто пасватаўся — шафёра з аўтабазы, нейкага Міцьку Хваста.

Вядома, Мірыну нявернасць я вельмі ж перажываў, не спаў, некалькі месяцаў месца сабе нідзе не знаходзіў.

Гады, мусіць, ці не праз два, калі быў на практыцы ў раённай газеце, я сустрэў зусім выпадкова Міру на вуліцы мястэчка. Яна была тая ж — вясёлая, гаваркая і яшчэ больш вабная, прыгожая. Убачыўшы мяне, узрадавалася:

— Мой,— так яна называла свайго мужа,— паехаў на заработкі. Вернецца дадому толькі праз месяц. Так што прыходзь да мяне, як змеркнецца. Я буду адна... Хоць нагаворымся, нацешымся... Я так хачу гэтага...

І ўсміхнулася, як умела ўсміхацца толькі адна яна.

Я, паблукаўшы па мястэчку і многае ўспомніўшы, падумаўшы, не пайшоў да Міры. Больш таго, вярнуўшыся ў рэдакцыю, сказаў, што мне трэба тэрмінова ехаць у Мінск, і ў той жа дзень пакінуў мястэчка. Чаму я так зрабіў? І сам не ведаю. Мусіць, адчуваў, што, калі астануся ў мястэчку, не вытрымаю, пайду да Міры. А гэта... Было ўсё адно што рынуцца галавою ў вір. Рана, што пакінула ў маім сэрцы Міра, зацягвалася, зарастала, і я не хацеў яе трывожыць, вярэдзіць...

О маладосць! Як бы мы жылі, калі б тое, што спазнаём пасля, спазнавалі раней!..

Школу я закончыў усё ж на медаль. Не залаты, а сярэбраны, на які мяне і прадстаўлялі. Думаць, куды паступаць вучыцца далей, патрэбы не было, я даўно ўжо выбраў сабе прафесію — хацеў стаць журналістам. Работа была знаёмая, дый, як мне здавалася, любімая... Сабраўшы неабходныя даведкі, аднойчы пайшоў я на пошту, каб іх паслаць у Мінск, ва універсітэт. Пошта была пры сельсавеце. І там я, адчыніўшы дзверы, сустрэўся тварам у твар са

старшынёй сельсавета. Быў ён яшчэ не стары, нават быццам культурны — насіў акуляры і гальштук. Спыніўшыся на хвіліну, ён пацікавіўся, куды я збіраюся паступаць вучыцца. Зноў жа, па сваёй шчырасці, я прызнаўся, што ва універсітэт, на аддзяленне журналістыкі. Старшыня хмыкнуў, неяк нядобра, здзекліва засмяяўся.

— Многа, хлопец, хочаш, ды мала палучыш...— сказаў ён гугнява ў нос, як і гаварыў заўсёды, і пайшоў, гучна ляснуўшы дзвярыма, быццам я яго нечым глыбока пакрыўдзіў ці абразіў...

Я ўспомніў старшыню сельсавета — нехарошага, зайздроснага, між іншым, чалавека і дрэннага кіраўніка, якога перад гэтым разоў колькі крытыкаваў у сваіх заметках, што друкаваліся ў газетах,— калі здаў экзамены, паступіў вучыцца і мяне, ужо студэнта, паклікалі ў нейкі кабінет, што быў у канцы калідора за абабітымі жалезам дзвярыма. Там, у тым кабінеце, за доўгім паліраваным сталом, сядзеў тоўсты, лянівы з выгляду, з зялёнымі, быццам шклянымі, вачыма, немалады чалавек.

— Вы — Лапцік Аляксей Патапавіч? — спытаў ён даволі сурова, грозна ў мяне.

— Так,— стаў я навыцяжку, не ведаючы, куды падзець рукі, бо адчуў раптам — яны ў мяне лішнія.

— Чаму вы, калі паступалі ва універсітэт, не напісалі, што былі ў Германіі, што вас вызвалілі амерыканскія войскі?

— Лічыў, што гэтым не хваляцца,— сказаў я ціха.

— А што, у аўтабіяграфіі трэба толькі хваліцца? — абурыўся, аж пачырванеў чалавек.— У аўтабіяграфіі трэба пісаць праўду, усё, як было,— гаварыў, быццам забіваў цвікі-вухналі мне ў галаву ён.— Вы ўтаілі факты, бо ведалі: калі напішаце праўду, вас не залічаць на факультэт журналістыкі, не прымуць ва універсітэт. Факультэт журналістыкі — гэта ідэалагічны факультэт, і такім, як вы, там не месца. Да таго ж ва універсітэце студэнты праходзяць вайсковую падрыхтоўку, становяцца афіцэрамі. А вы... Не маеце права быць афіцэрам...

— Але ж у Нямеччыне я быў дзіцём,— перапыніў я чалавека.— І папракаць мяне... Да таго ж, паверце, мне ўсё адно, хто мяне вызваляў... Галоўнае — вызвалілі...

— Як гэта ўсё адно? — зароў, як мядзведзь, чалавек.— Вы да ўсяго яшчэ і палітычна няспелы... Мы выганім вас з універсітэта, вучыцца тут вы не будзеце. Не дараслі! З такой біяграфіяй...

Чалавек устаў з-за стала, затупаў нагамі.

— Вось што пішуць пра вас і вашага бацьку,— і ён схапіў лісток з папкі, што ляжала на стале, пачаў махаць ім перада мною.— І хто піша! Старшыня сельсавета!

Тады там, у тым кабінеце, упершыню я і ўспомніў словы, што сказаў мне старшыня сельсавета, калі я пасылаў дакументы ва універсітэт. Ветлівы, між іншым, культурны — пры акулярах, гальштуку. «Многа, хлопец, хочаш, ды мала палучыш...»

Можа быць, ды і напэўна ж, старшыня сельсавета казаў праўду — я многа чаго хацеў. І, калі прызнацца шчыра, верыў, што, як спявалася тады ў песні «молодым везде у нас дорога...». Аж, выяўляецца, не ўсім маладым усюды ў нас дарога...

Вядома, нялёгка развітвацца са сваёй марай. А я, пасля гутаркі з тым, тоўстым і на выгляд лянівым, з зялёнымі, быццам шклянымі, вачыма чалавекам, што сядзеў за абабітымі жалезам дзвярыма, развітваўся. Развітваўся з аднакурснікамі, з тымі, з кім паспеў пасябраваць за месяц на бульбе ў калгасе, з выкладчыкамі, наогул з універсітэтам. Я ведаў, што мяне чакае далей — служба ў арміі, а потым... Невядомасць. Факт — журналістам мне не быць, не працаваць у друку. Усё ж астатняе мяне не цікавіла, не мела сэнсу...

На лекцыі я, вядома, хадзіў, хоць, седзячы на іх і слухаючы выкладчыкаў, чакаў, кожную хвіліну чакаў — вось-вось адчыняцца дзверы, мяне паклічуць у дэканат ці яшчэ куды і я больш не вярнуся ў студэнцкую аўдыторыю. Бывай, вучоба, бывай, універсітэт...

Выкладчыкі ж, нібы спаборнічаючы, кожны па-свойму хацелі спадабацца студэнтам-першакурснікам, нечым незвычайным здзівіць, уразіць, заваяваць аўтарытэт. І кожны гэта рабіў па-свойму, як умеў. Адзін, прафесар,— лысы, тоўсты, нібы надзьмуты паветрам шар, толькі на ножках,— чытаў на памяць цэлыя старонкі Пушкіна, Гогаля, Лермантава; другі — доўгі, худы, як аршын,— цытаваў Маркса, Энгельса, прычым па-нямецку; трэці — быстры, шустры, што ртуць, не заглядваючы ў канспекты, хоць і клаў іх на кафедру, не чытаў, а быццам спяваў свае лекцыі, бегаючы сюды-туды па аўдыторыі. «Амерык», вядома, ніхто вельмі не адкрываў, але цікавыя факты, думкі, чаго, ва ўсякім выпадку, я не ведаў, былі. Асабліва падабаўся нам выкладчык замежнай літаратуры, які насіў вусы і клінападобную бародку і які любіў усё супастаўляць,

параўноўваць, да таго ж свае думкі выказваць прыгожа, накшталт: «Гэта падобна на турэцкае марожанае, якое загортваюць у гарачы блін»; «у старыя мяхі ён уліў віно новага зместу»; «любіце ісціну, і яна вас таксама палюбіць». І гэтак — на працягу ўсёй лекцыі. Заблытаўшыся ў лабірынтах фактаў і думак, у канцы лекцыі ён звычайна кідаў сваю сакраментальную фразу: «Гаварылі, гавораць, гаварыць будуць, а яснасці ў гэтым пытанні не было, няма і не будзе...»

Не было яснасці і ў мяне з вучобай, маім студэнцтвам. Мяне больш нікуды не выклікалі, я наведваў лекцыі, у тым ліку і «ваенку». Выкладчыкі на вайсковай кафедры былі пры немалых званнях і надта ж любілі паганяць студэнтаў. Што ж, іх можна было зразумець. Многія з іх навуку пазнавалі не ў аўдыторыях, не ў бібліятэках, а ў вайну, у нялёгкіх крывавых баях з узброенымі да зубоў, каварнымі, бязлітаснымі фашыстамі. Але што да таго было некаторым з нас, студэнтам? І лекцыі іншы раз ператвараліся ў гумарыстычныя канцэрты. Асабліва пацяшаліся з вышкаленага служакі-недавучкі маёра Сухога. Як толькі ён размашыста, па-страявому грукаючы ботамі, заходзіў у аўдыторыю, адразу ж падымалася то тут, то там рука.

— Таварыш маёр,— па-вайсковаму звяртаўся студэнт да выкладчыка на поўным сур’ёзе,— вось вы гаворыце, што пры стральбе з вінтоўкі траекторыя палёту кулі будзе такая... — студэнт акрэсліваў, паказваў рукою гэтую траекторыю.— А калі вінтоўку павярнуць прыцэлам уніз і стрэліць? Якая тады будзе траекторыя палёту кулі?

Маёр, збіты з панталыку нечаканым пытаннем, нейкі час моршчыў шырокі, хоць боб малаці — «сакратаўскі» — лоб, думаў. Потым, не ведаючы, што адказаць, раздражнёна крычаў:

— Так ніхто не страляе, студэнт!..

Зноў некалькі слоў гаварыў выкладчык, і зноў падымалася рука:

— Таварыш маёр, вось вы кажаце, што порах вынайшлі ў Кітаі... А я чытаў, што ў Азіі...

Маёр зноў нейкі час моршчыў лоб, не ведаючы, што адказаць студэнту. Потым ніякавеў.

— Добра, я праверу...

І пасля перапынку, зайшоўшы ў аўдыторыю, крычаў яшчэ з парога:

— Што вы дурачыце мне галаву! Кітай знаходзіцца ў Азіі, значыцца, правільна і ў кнізе напісана, і я казаў...

Калі хто-небудзь са студэнтаў спазняўся на заняткі, Сухі надта ж любіў паставіць яго па стойцы «смірна» і распякаць, чытаць натацыі:

— Як вам не сорамна, студэнт! Дзяржава траціць на вас сродкі, каб вы вучыліся, даць вам спецыяльнасць... А вы... Спазняецеся!

І тады ўся аўдыторыя раптам ажывала, пачынала ратаваць няўдачніка: у маёра была дачка-студэнтка і...

— Таварыш маёр,— гудзелі адусюль,— гэта ж будучы ваш зяць, ён дачку вашу ўчора дадому праводзіў...

Сухі губляўся, ніякавеў.

— Дачку, дачку,— шаптаў ён нібы сам сабе.— Ну, няхай, сядайце...

І на вачах ва ўсіх дабрэў, усміхаўся.

Але не ўсе, далёка не ўсе былі сярод выкладчыкаў вайсковай кафедры такія, як Сухі. Большасць выкладчыкаў — людзі высокаадукаваныя, за іх плячыма былі закончаныя акадэміі, інстытуты, універсітэты, да таго ж усе прайшлі вялікую жыццёвую школу, назва якой — вайна. І павучыцца ў кожнага з іх было чаму. Адхіліўшыся ад свайго прадмета, яны іншы раз расказвалі эпізоды, а то і цэлыя гісторыі з франтавога жыцця, ды такія, што душу пераварочвала. Яно і не дзіва — людзі з баямі сваімі нагамі перамералі дарогу ад Брэста да Сталінграда, а потым ад Сталінграда да Берліна. Гэта былі не тэарэтыкі, а практыкі. І ўмелі ўсё, што трэба, рабіць у франтавых умовах, бо былі самі ў свой час і радавымі байцамі, і малодшымі камандзірамі, неаднойчы траплялі ў самыя незвычайныя абставіны, былі паранены, пахавалі на палях бітваў многіх сваіх таварышаў. І мудрасць, здабытая жыццёвым вопытам, практыкай, надта ж уражвала...

Былі, вядома, практыкі і сярод іншых выкладчыкаў, асабліва непасрэдных нашых прафесійных прадметаў. Адзін з такіх выкладчыкаў — каратканогі, з пузцом-падушачкай і лысінай на ўсю вялізную, прадаўгаватую, як дыня, галаву,— Зернеў Марат Захаравіч. Калісьці, у трыццатыя гады, ён рэдагаваў раённую газету. Часы тады былі крутыя, кожная памылка магла каштаваць жыцця. А як жа рэдагаваць газету і не рабіць памылак? Такога не бывае. Карэктар прапускае граматычныя памылкі, рэдактар — палітычныя. І Марат Захаравіч прапусціў памылку. Як па тых часах, надта ж непрыемную... «І вось,— расказваў сам Марат Захаравіч,— прыходзяць да мяне пажарнікі, каб комін пачысціць. А я чамаданчык, куды спакаваў самае

неабходнае, у рукі бяру і кажу: «Я гатовы, вядзіце...» Пажарнікі не разумеюць, чаго я ад іх хачу, а я не разумею пажарнікаў, думаю, што гэта арыштоўваць мяне прыйшлі і яшчэ пацяшаюцца, жартуюць...» Другі выкладчык — важны, пыхлівы, нават, бывала, галавы не паверне, калі з ім павітаешся,— рэдагаваў рэспубліканскую газету. Праўда, газета была не надта цікавая, друкавала ў асноўным афіцыйныя матэрыялы, бо ёю рэдактар амаль не займаўся. Пісаў доктарскую. (Пасля выявілася, пісалі супрацоўнікі газеты.) Чытаў лекцыі ён з паперак, не адрываючыся, не адыходзячы ад кафедры. Хоць прыводзіў сякія-такія факты, але прааналізаваць, разабрацца ў іх не мог. Між студэнтамі і выкладчыкамі хадзілі размовы, што ён нават дзесяцігодкі не скончыў, дакументы ж пра заканчэнне вышэйшай адукацыі набыў у вайну... Выкрываць махляра баяліся: ён быў зяцем адной высокапастаўленай асобы.

Зноў жа — такія выкладчыкі, як Сухі, Зернеў ды і рэдактар рэспубліканскай газеты,— сустракаліся і на іншых кафедрах. Але іх было не многа. Астатнія ж выкладчыкі былі сапраўдныя вучоныя, друкавалі свае працы і ў Мінску і ў Маскве і чыталі лекцыі з глыбокім веданнем прадмета. І лёгка, па-майстэрску, нават бліскуча. Іх паслухаць было цікава, карысна было і сустрэцца з імі, пагаварыць па-за межамі аўдыторыі. Да таго ж ва універсітэце былі яшчэ вучэбныя кабінеты, бібліятэкі... Менавіта яны, вучэбныя кабінеты і бібліятэкі, найбольш і прываблівалі мяне. Там, па-першае, заўсёды можна было ўзяць кнігу, якую дагэтуль ніколі ў руках не трымаў, не ведаў нават, што яна такая ёсць, па-другое, там заўсёды была цішыня. А што ёсць найлепшае ў жыцці, акрамя любімай кнігі і цішыні, магчымасці пабыць наадзіне з кнігай і гадзіну, і дзве, і тры. І я ў вольны ад заняткаў час амаль не выходзіў з вучэбных кабінетаў і бібліятэк. Адчуваў жа — у любы дзень у мяне ўсяго гэтага можа не быць. А хацелася многае прачытаць, многае ўведаць. Якраз тады з падвалаў бібліятэк падымаліся часопісы і кнігі, якія праляжалі там некранутыя гадамі. І я адкрываў для сябе кожны дзень новых і новых аўтараў. Тых, каго ў свой час у нечым абвінавачвалі, абылгалі, загналі ў турмы і знішчылі як «ворагаў народа». Прачытаў я і кнігі тых, пра каго ў свой час яшчэ ў школе гаварыў на ўроках Гарасім Іванавіч...

Смерць Сталіна, XX з'езд партыі, зварот многіх людзей, што гадамі змушаны былі адбываць розныя пакаранні ў турмах і лагерах, жыць прымусова там, дзе яны не хаце-

лі, да нармальнага жыцця, іх рэабілітацыя пасялілі і ў мяне надзею — раптам не выключаць з універсітэта, дадуць магчымасць набыць любімую спецыяльнасць, працаваць у друку. Павінна ўсё ж калі-небудзь запанаваць справядлівасць. Бо і праўда ж — у чым і перад кім я вінаваты, што быў вывезены ў Нямеччыну, што мяне вызвалілі амерыканцы?

Жыў тады я ў студэнцкім інтэрнаце. Жыў «незаконна», ці, як казалі студэнты, «на птушыных правах». У мяне быў бацька, а такім інтэрната не давалі. Хапала студэнтаў-сірот і тых, у каго не было бацькоў — пагінулі на вайне. Не адмаўлялі ў інтэрнаце і тым, у каго бацька быў інвалід... Прачуўшы пра гэта, я напісаў заяву, што ў мяне бацька — таксама інвалід. Я не маніў — мой бацька і праўда быў інвалід працы, хоць і сам ён, і мы, яго дзеці, ведалі — інваліднасць у бацькі ад вайны; у яго адняліся ногі, якія ён застудзіў некалі, лежачы ў акопах і будучы ў нямецкім палоне. Так што ў заяве я не маніў. Вядома, я мог бы не пісаць той заявы, але ж... Наняць кватэру ў мяне проста не было за што. Ложак у інтэрнаце мне выдзелілі, але запатрабавалі, каб я праз пару тыдняў прынёс даведку аб інваліднасці бацькі. Даведку такую я не мог прынесці, і камендант кожны тыдзень прыходзіў да мяне, напамінаў. А я разводзіў рукамі, казаў, што яшчэ не прыслалі...

Жыў я ў пакоі на чатыры чалавекі. Трое з нас — Сымон, Язэп і я — галадалі, дакладней, жылі ўпрогаладзь. Ні ім, ні мне ніхто ніадкуль нічым не памагаў. Не было каму. Сымон быў круглы сірата. Выхоўвала яго цётка, у якой і ў самой было ці не шасцёра дзяцей. Можна сказаць, на яго вачах немцы забілі бацьку, маці і сястру. Ён астаўся жыць, бо паспеў схавацца — залез пад ложак, у пограб... Язэп таксама быў сірата. Ні свайго бацькі, ні маці ён не помніў, не ведаў, хто яны і дзе цяпер. Яго падабралі на дарозе пасля налёту на бежанцаў нямецкіх самалётаў. Два гады ён жыў у вёсцы, кормячыся, быццам пастух, то ў адной, то ў другой хаце. Потым, калі прыйшло вызваленне, яго аддалі ў дзіцячы дом. Там ён і выхоўваўся, скончыў дзесяць класаў. Адтуль і паступіў ва універсітэт. Чацвёрты жыхар быў Альфрэд Князюк. У яго жывыя былі і бацька і маці, тым не менш ён жыў на законных правах у інтэрнаце, бо яго бацька — старшыня калгаса, як сам Альфрэд прызнаваўся, «замасліў» каго трэба. Ён, Альфрэд, і ва універсітэт паступіў без асаблівых хваляванняў і вучыўся, здаваў экзамены лёгенька, без натугі — яму ва ўсім пама-

гаў дэкан, якому, зноў жа па прызнанні самога Альфрэда, бацька заўсёды перад Новым годам свежаваў і прывозіў парсюка. У Альфрэда было поўна харчоў — сала, каўбас, масла, усялякіх іншых прысмакаў. Трымаў усё гэта ён у адмысловым, збітым з дошак і пафарбаваным у зялёны колер куфэрку, пад замком. І ніколі ядою ні з кім не дзяліўся. Адмыкаў замок, выкладваў на стол прыпасы і, гучна цмокаючы, сапучы, еў. Еў многа, аж іншы раз да ікаты. Тады, насыціўшыся ўволю, усё акуратна збіраў са стала, складваў назад у куфэрак, замыкаў яго на замок. Спярша мы сядзелі кожны на сваім ложку, глядзелі галоднымі вачыма на Альфрэда, чакаючы, што, можа, запросіць да стала, пачастуе нас. Але дудкі — так ні разу і не дачакаліся. І, каб не глытаць слінкі, мы, як толькі садзіўся за стол есці Альфрэд, выходзілі з пакоя...

Неаднойчы і Язэп, і Сымон, ды і я — падбухторвалі адзін аднаго ўзламаць замок на куфэрку, хоць раз ды добра наесціся. Але заўсёды адзін аднаго і стрымлівалі, астуджалі — раз паясі, а потым... І сорамна, брыдка, ды і навечна ж не наясіся. Трэба шукаць іншых шляхоў і крыніц, каб не галадаць...

Прылаўчыліся былі мы хадзіць на чыгуначную станцыю разгружаць і нагружаць вагоны. Плацілі там не вельмі каб, але ж... Ноч папрацуеш, то разы тры-чатыры і ў сталоўку можна схадзіць, паабедаць. Быццам усё добра, як мае быць. Ды... Гэта каб адзенне рабочае ў нас было. У тым жа, што трэба на лекцыі хадзіць, разгружаць вугаль ці мяшкі з мукою, цэментам, рознымі мінеральнымі ўгнаеннямі... Не зусім зручна было. Ды і брудзілася яно, выгляд надта ж хутка мяняла. Паспрабавалі мы і на масоўку ўладкоўвацца — інакш — здымацца ў масавых сцэнах у розных фільмах. Зноў жа — гэта былі часовыя заробкі. А нам есці хацелася штодзень, заўсёды...

У мяне была сякая-такая практыка з жыцця ў мястэчку. Я прывык есці ашчадна, так, каб нешта заставалася і назаўтра. І Язэп з Сымонам гэта ведалі. Таму, калі мяне не было ў інтэрнаце, спакойна з'ядалі тое, што я пакідаў сабе на заўтра. Крыўдаваць на іх я не мог — яны былі галодныя, а што гэта такое, мне не трэба было тлумачыць, я ведаў сам. З жыцця ў мястэчку ў мяне быў і навык пісаць у газеты, атрымліваць ганарар. Гэта я неўзабаве паспрабаваў аднавіць і, стаўшы студэнтам, пачаў пісаць розныя заметкі і інфармацыі, хадзіць па рэдакцыях. А потым і браць заданні, ездзіць у камандзіроўкі. Спярша ад піянер-

скіх газет, потым ад маладзёжных. Багата ў гэтых выданнях не заробіш, але кожная капейка была добрай падпорай у маім больш чым сціплым бюджэце.

Сымон, Язэп і я пісалі вершы. Вершы былі не бог ведае якія, іх ніхто не спяшаўся друкаваць, але з імі мы хадзілі па рэдакцыях, чыталі, прапаноўвалі. Так, з вершамі, мы трапілі неяк і ў рэдакцыю часопіса, дзе працаваў Васіль Сяргеевіч... Што тады пра яго, гэтага чалавека, мы ведалі? Бадай, нічога, нават вершаў, якія ён пісаў і зрэдку друкаваў, не чыталі. А можа, і чыталі, ды яны не зрабілі на нас уражання, забыліся, як забываецца і многае з бачанага, чытанага. А паэт, як потым мы — ды і не толькі мы! — пераканаліся, гэта быў першакласны. Тады ж, зайшоўшы да Васіля Сяргеевіча, у змрочны, закураны кабінет, дзе ён сядзеў разам з іншымі супрацоўнікамі часопіса за сталом, заваленым рознымі рукапісамі і карэктурамі, мы з цікавасцю глядзелі на немаладога пасівелага чалавека з вельмі вострым, праніклівым паглядам блакітнаватых, як васількі, вачэй, што не проста хацеў нас выслухаць, а быццам імкнуўся нечым памагчы, прыняць у нашым лёсе, як кажуць, дзейны ўдзел. Ён — і гэта мы адразу ўлавілі, адчулі — нам спачуваў. І разумеў нас з паўслова.

— Вось што, хлопцы,— сказаў у канцы нашай размовы ён, адкідваючы, зачэсваючы проста пяцярнёю назад густую чупрыну (яе паспела ўжо скрозь пабіць сівізна, хоць з выгляду Васіль Сяргеевіч не быў стары),— можа, да хаты да мяне зойдзеце, бо тут...— акінуў ён вачыма пакой, у якім было поўна незнаёмых нам людзей, што курылі, гучна гаварылі і смяяліся, рагаталі.— Хіба пагаворыш, а тым больш выслухаеш, вершы ацэніш... Я жыву непадалёку ад вашага інтэрната. Вы ж студэнты, спадзяюся, універсітэта і жывеце ў інтэрнаце?

Мы ўсе трое кіўнулі галовамі.

— Ну вось і добра... Бульбы наварым, чаю нагрэем... І пагаворым. Згода? — падміргнуў, паглядзеў на нас неяк надта ж па-прыяцельску, зычліва Васіль Сяргеевіч.

З кабінета, дзе сядзеў Васіль Сяргеевіч, мы не выйшлі, а як бы на крылах вылецелі. Не верылі самі сабе таму, што пачулі. Нас запрашаюць у госці. Ды хто? Паэт!

Толькі на вуліцы ўспомнілі — Васіль Сяргеевіч не даў нам свайго адраса. Ды і калі да яго прыходзіць — уранні, удзень ці ўвечары — таксама не сказаў. Што рабіць?

— Трэба вярнуцца,— прапанаваў хтосьці з нас.

— Вяртацца — дрэнная прыкмета,— помню, сказаў я, бо быў, як і ўсе палешукі, трохі прымхлівы.

— Але ж нас, трэба спадзявацца, шчыра запрашалі,— глядзелі на мяне шырока адкрытымі вачамі сябры.— І не пайсці? Ды і бульба, чай...

Якраз быў канец месяца, мы сядзелі, што называецца, на «нулі». Ці, кажучы сучаснай мовай, ані, нічога ў нас не было, каб паесці. Папросту мы галадалі. І не пайсці есці бульбу, піць чай...

— Але ж не ўсім вяртацца? — урэшце здаўся, я.

— Тады... Хто добраахвотнік? — абвёў нас з Язэпам вывучальным поглядам Сымон.

Добраахвотніка не было. Давялося цягнуць жэрабя — гэтым выратавальным спосабам мы заўсёды карысталіся, калі ўзнікала скрутная сітуацыя. Вяртацца выпала мне. Хоць і не хацелася гэта рабіць, а давялося.

Калі я зноў падняўся на чацвёрты паверх Дома друку і зайшоў у той самы кабінет, дзе зусім нядаўна мы былі ўсе ўтрох, Васіль Сяргеевіч вельмі здзівіўся.

— Што здарылася? — спытаў ён у мяне.

— Адрас, які ваш адрас? — паспрабаваў я ўсміхнуцца.

— Мой адрас? — засмяяўся Васіль Сяргеевіч.— А я-я, вось і запрасіў вас на госці... А адраса не сказаў... Бывае ж... Прашу выбачыць...

Ён вырваў з настольнага календара лісток, хуценька запісаў на ім свой адрас, падаў мне.

— Толькі званіце ў званок тры разы... Я не адзін на кватэры жыву... Разам са мной яшчэ дзве сям'і...

— А калі прыходзіць? — гэты раз я хацеў высветліць усё, каб не было, не ўзнікала больш ніякіх пытанняў.

— Ды не пазніцеся. Каб і пагаварыць быў час, і па бульбу ў магазін збегаць, і згатаваць. Ды і з'есці, чай папіць. Прыходзьце гадзін у сем...

Роўна ў сем мы былі ў пад'ездзе таго дома, адрас якога быў запісаны на лістку настольнага календара даволі нязграбным — быццам курыца надрапала — почыркам,— дом гэты ўзвышаўся, чырванеў непадалёку ад нашага студэнцкага інтэрната. Таўхаючы адзін аднаго локцямі — ты давай першы, ты! — наблізіліся да дзвярэй кватэры, што, на наша здзіўленне, аказалася на першым паверсе. Пазванілі ў званок. Тры разы, як было і ўмоўлена.

Дзверы адчыніла нейкая распатланая кабета — у халаце, стоптаных пантоплях на босую нагу — як потым мы даведаліся, суседка Васіля Сяргеевіча па кватэры. Яна ні

пра што ў нас не спытала, быццам ведала, да каго мы прыйшлі, моўчкі махнула рукою, паказала на дзверы, што былі направа.

Адзін за адным гуськом мы праціснуліся па вузкім калідоры, які быў застаўлены нейкімі скрынкамі, абуткам, завешаны адзеннем, да тых дзвярэй, на якія паказала кабета. Стукаць не давялося — іх ужо адчыняў, усміхаючыся на ўвесь твар, Васіль Сяргеевіч.

— Малайцы,— пахваліў ён нас.— Дакладна, як і ўмовіліся, прыйшлі.

Толькі цяпер мы ўбачылі, што Васіль Сяргеевіч стаіць, апіраючыся на палку. Значыцца, інвалід.

— Заходзьце, заходзьце,— запрашаў нас Васіль Сяргеевіч,— прысаджвайцеся,— паказваў ён на абшарпаную і, як хутка выявілася, надта ж рыпучую канапу, што стаяла ля сцяны.— Вядома, вы галодныя,— абвёў ён усіх нас вачыма.

Мы, паглядзеўшы адзін на аднаго, не таіліся — моўчкі кіўнулі галовамі.

— Калі стыпендыя? — спытаў Васіль Сяргеевіч.

Стыпендыя павінна была быць праз тры дні.

— І вы трое сутак галадалі б, калі б я не запрасіў на вячэру? — весела, з іскрынкамі смеху спытаў Васіль Сяргеевіч.

Мы памяліся — хто ведае, што б мы рабілі трое сутак. Вядома, зусім бы не галадалі — нешта б недзе пазычылі, да некага напрасіліся б паснедаць ці павячэраць, як гэта і раней неаднойчы здаралася, бывала.

— Сыты галоднаму не таварыш,— ківаў галавою, усё гэтак жа весела ўсміхаючыся, Васіль Сяргеевіч, зачыняючы дзверы і прысаджваючыся на звычайны, грубавата збіты і пафарбаваны белай фарбай табурэт, што стаяў пры круглым, заваленым газетамі і паперамі стале.— Калісьці, вярнуўшыся зноў у Мінск — а гэта было ў першы пасляваенны год,— я таксама галадаў. Помню, з тыдзень у мяне, акрамя вады, нічога ў роце не было. Хлеб той, што ў мяне быў, я з'еў, а купіць яшчэ не было за што. Дый дзе... Па картачках тады ж толькі хлеб давалі. Знаёмыя ў Мінску ў мяне, вядома, былі, я ж мінчанін, тут нарадзіўся, тут і вырас. Але паяўляцца на вочы некаторым людзям, каб ведалі, што я жывы, ды яшчэ зноў у Мінску... Не хацелася... І я накіраваўся ў адну з рэдакцый. Думаю, пачытаю там свае вершы. Што іх надрукуюць, надзеі ў мяне не было ніякай. Надзея іншая была — хто ж мяне зразумее, як не

такія ж апантаныя, як і я? І памогуць, не дадуць прапасці. У рэдакцыі прынялі мяне ветліва, папрасілі нават некаторыя вершы перапісаць на паперу і пакінуць... Я зрабіў усё, што ў мяне папрасілі. Але я з рэдакцыі не спяшаўся выходзіць, усё чакаў зручнага моманту, каб загаварыць пра тое, што мяне і прывяло сюды, што не давала спакою. Голад, кажуць, не цётка. І я не вытрымаў, прызнаўся, што даўно нічога не еў. І ведаеце, што пачуў? Каб такое не здаралася, трэба заўсёды мець на чорны дзень грошы на ашчаднай кніжцы...

Васіль Сяргеевіч зарагатаў.

— Ну, ды не будзем пра тое. Як у народзе кажуць, галоднай куме яда наўме... Вось грошы,— дастаў ён з кішэні пінжака кашалёк.— Іх, праўда, у мяне не так багата, як бы хацелася, але на тры дні на ўсіх нас, думаю, хопіць. Збегайце ў магазін, купіце бульбы, хлеба, каўбасы, цукру. І па-міністэрску павячэраем...

Яна, тая першая «міністэрская» вячэра, найбольш і запомнілася мне. І запомнілася не ядою — мы былі галодныя і, не саромеючыся, з’елі ўсё, што было на стуле, хутка, здавалася, у адзін міг,— а якраз тым, што там, за сталом, я пачуў. Бо гаварылі мы ўсе ўчацвярых і фактычна тады даведаліся адзін пра аднаго ўсё, што якраз нас яднала. А яднала нас мінулае, тое гора, што мы кожны паасобку перажылі. Калі пра сваіх сяброў я сёе-тое ведаў, дык пра жыццё Васіля Сергеевіча пачуў упершыню. І наогул пачуў упершыню пра многае, што рабілася ў ранейшыя часы, калі мяне яшчэ і на свеце не было. Васіль Сяргеевіч гаварыў з намі шчыра, даверліва, быццам ведаў, што мы яго зразумеем. Чаму? Ён жа нас амаль што ўпершыню бачыў, адкрываўся, лічы, выпадковым людзям. Калі я спытаў у яго пра гэта потым, ён сам здзіўляўся: «Відаць, надта ж набалела ў мяне на душы. І хацелася адкрыцца. А тут вы яшчэ мяне растрывожылі. Ну, няхай я столькі нацярпеўся. Дык я ж быццам дарослы быў. А вы ж — дзеці. Да слёз былі мяне давялі, чэрці...»

Ён, Васіль Сяргеевіч, нарадзіўся ў Мінску. Яго бацька змяніў шмат прафесій, але выбіцца ў людзі так і не змог. Урэшце, у час нэпа адчыніў нешта накшталт кавярні. У кавярню хадзілі выпіць чарачку, пасядзець за філіжанкай кавы многія. Ён, Васіль, тады абслугоўваў кліентаў, быў быццам за афіцыянта. І чуў, як неаднойчы паэты там чыталі адзін аднаму вершы, гаварылі пра літаратуру. Адукацыі ў яго не было, але тады ўсюды адкрываліся лікбезы.

І ён, Васіль, навучыўшыся чытаць і пісаць, ужо не расставаўся з кнігамі. Тым больш што кавярню неўзабаве зачынілі, а бацьку як нэпмана выслалі з Мінска, нават пасадзілі ў турму. За што? Ды, каб неяк зводзіць канцы з канцамі, ён змушаны быў купляць у розных выпадковых людзей спірт, самагонку. За бацькам палявалі, рабілі налётныя рэвізіі. Знайсці спірт і самагонку было нялёгка, бо хавалі ў розных пасудзінах, якія былі зроблены з двайным дном. Але, як кажуць, колькі вяровачцы ні віцца, а канцу быць. Бацька ўсё ж не ўратаваўся...

Васіль Сяргеевіч перайшоў на працу ў шавецкую майстэрню. Шыў, падбіваў абутак, рамантаваў стары. А па вечарах — вучыўся. Цяга да літаратуры ў яго была вялікая, неадольная, і ён сам паспрабаваў складаць вершы. Некалькі, самых лепшых, надрукавалі. Уступіў у «Маладняк», уладкаваўся ў адну з газет падчытчыкам. І закахаўся па самыя вушы ў карэктарку. Падумваў жаніцца. Але тут здарылася нечаканае — яго арыштавалі. Па дарозе, калі вяртаўся з працы дадому. Некалькі месяцаў дапытвалі, вадзілі то да аднаго, то да другога следчага. Віны ніякай у яго не было. Што быў высланы і пасаджаны бацька? Але з бацькам ніякай сувязі ён не меў, нават не ведаў, дзе той, ці жывы... Спрабавалі модную тады «нацдэмаўшчыну» прышыць, але зноў жа... Ніяк не вязаліся канцы з канцамі. Тым не менш пяць гадоў турмы, а потым высылку яму далі...

Адбываў пакаранне Васіль Сяргеевіч у Сібіры, потым трапіў у Казахстан. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны яго выпусцілі. Ехаць у Мінск не дазволілі, і ён паехаў у Гомель. Каб зарабляць на хлеб, паступіў у шавецкую майстэрню. Удзень працаваў, а па вечарах пісаў вершы. Пачалася Вялікая Айчынная вайна. На фронт Васіля Сяргеевіча не ўзялі — у яго балела нага. Што з ёю? На допытах пакалечылі. І не залячылі як след. Васіль Сяргеевіч не ведаў, што яму рабіць. Адступаць? Але куды адступіш, куды пойдзеш з хворай нагою? А аставацца ў Гомелі, чакаць, пакуль зоймуць яго немцы?

Пайшоў з горада, па дарозе знайшоў пустую хату ў вёсцы — яе насельнікі падаліся ў бежанцы,— і там спыніўся, жыў лета, восень. А на зіму зноў перабраўся ў Гомель, адкрыў там сваю прыватную шавецкую майстэрню. Чаму гэта зрабіў? Ды такое заданне ад партызан атрымаў. Немцы, паліцаі, па меркаваннях кіраўніцтва партызанскага атрада, чапаць яго не павінны, ён у іх быццам свой

чалавек. Пакрыўджаны савецкай уладай, рэпрэсіраваны, сядзеў у турме, быў у высылцы... А тым часам партызанам і падпольшчыкам шавецкая майстэрня — вельмі ж прыдатнае месца для сустрэч, перадач розных звестак ды і зброі, мін... Амаль два гады Васіль Сяргеевіч прасядзеў у Гомелі, рамантуючы і шыючы абутак, а калі праўду сказаць, трымаючы явачную кватэру, працуючы на партызан, на падполле. І ўсё ж яго арыштавалі, кінулі ў турму. Білі, рабілі вочныя стаўкі, пагражалі павесіць, расстраляць. Потым загналі ў таварны вагон, некуды павезлі разам з такімі ж нявольнікамі, які быў ён і сам. Відаць, у лагер ці ў Нямеччыну. Хвала Богу, эшалон, у якім яго везлі, наскочыў на партызанскую міну.

Так Васіль Сяргеевіч апынуўся ў партызанскім атрадзе. Дачакаўся вызвалення, вярнуўся зноў у Мінск.

— Вядома, Мінск быў разбураны,— расказваў Васіль Сяргеевіч.— Адны руіны. Я нічога нідзе не пазнаваў. Хадзіў як непрыкаяны па вуліцах, абмінаючы кучы друзу і цэглы. Начаваў у парку, у закінутых, напаўразбураных дамах, у сутарэннях падвалаў, на лесвічных пляцоўках. У мяне не было пашпарта, наогул ніякіх дакументаў. Але неяк усё абышлося. Я ўладкаваўся зноў у шавецкую майстэрню, зноў узяў у рукі шыла, малаток і дратву... І з гэтага жыў...

— Вы не жаніліся, жывяце адзін? — спытаў хтосьці з нас — ці не Сымон — ён быў байчэйшы, смялейшы за ўсіх нас.

— Так,— сумна паківаў галавою Васіль Сяргеевіч.

— А дзе тая карэктарка, з якой вы збіраліся жаніцца?

— Карэктарка? Яна выйшла замуж неўзабаве, як мяне арыштавалі, за іншага. Цяпер ён намеснік міністра, ну а яна... амаль міністэрша. Не пазнавала мяне ці мо рабіла выгляд. Але я... Неяк на вуліцы падышоў да яе, загаварыў. Не, яна мяне помніла, не забыла. Прызналася — у той жа дзень, як мяне арыштавалі, арыштавалі і яе. Праўда, трымалі нядоўга, выпусцілі. Была некалькі месяцаў без працы. І каб неяк жыць, ёй трэба было памяняць прозвішча. Выйшла замуж. Што ж, кажа, прывыкла да мужа, жыве...

— А каханне? — гэта сказаў я, бо нішто так у тыя дні не займала маіх думак, як Мірына нявернасць — рана, што нанесла яна мне, ніяк, ніяк не гаілася, не зажывала.

— Ці пра каханне думаць, перажыўшы такое! Эх! — уздыхнуў са скрухаю Васіль Сяргеевіч.— Колькі разоў

даводзілася з жыццём развітвацца. А яно ж, як хтосьці правільна сказаў, надта ж прыгожае. Глядзець на неба, чуць посвіст ветру, шчабятанне птушак, удыхаць на поўныя грудзі паветра... Ды і спадзявацца, чакаць, што мінецца гора, навала, надыдуць лепшыя часы... Што можа быць прыемней, шчаслівей?.. Ці, як хочаце, так і кажыце. І вы ж, пэўна, спадзеяцеся, што надыдуць лепшыя часы, зажывяце і вы не так, як жылі, жывяце цяпер? І я жыў і жыву той самай надзеяй... Не можа такога быць, каб увесь час жыццё мучыла, давіла... «Павінна ж быць і ў зайца радасць перад халоднаю зімой»,— працытаваў ён раптам адзін з вершаў, што былі надрукаваны ў часопісе маладога, зусім невядомага Уладзіміра Караткевіча.— Вы верыце ў гэта — павінна? — глядзеў, не зводзіў сваіх блакітных пранікл іўых вачэй з усіх нас Васіль Сяргеевіч.

— Павінна,—ківалі мы згодна галовамі.

— А калі так, дык будзем чакаць таго, не вешаць насоў. І памагаць адзін аднаму. Заходзьце да мяне. У любы час. Не абяцаю марцыпанаў, але бульбаю, хлебам, чаем накармлю, напаю...

І мы заходзілі. Утрох, па двух, а то і па адным. Як калі выпадала. Бо былі мы маладыя, у кожнага ўзнікалі свае, часам зусім непрадбачаныя акалічнасці і клопаты. І кожны раз чулі ад Васіля Сяргеевіча ўсё новае і новае. І не толькі пра пражытае ім, а і наогул пра жыццё на гэтым свеце.

— Дзіўна, як усё дзіўна! — закідваў галаву, зажмурваў мройна вочы, быццам задумваўся Васіль Сяргеевіч.— Нараджаецца чалавек. А чаму? Ды і не толькі чалавек, а ўсё жывое? Птушка тая ж, звер, казюрка кожная, мушка? Хто жыве сто — дзвесце гадоў, а хто толькі суткі ці ўсяго некалькі гадзін. Каб мы не трэба былі, не нараджаліся б. Але на што, каму мы трэба? Ды і жыццё само... Калі ўжо нарадзіўся чалавек, дык няхай бы і жыў, як яму хочацца. Дык не ж — аднаму трэба камандаваць, а другому падначальвацца. Не паслухаешся, засупраціўляешся — бізуном цябе агрэюць, а то і заб'юць, павесяць. Хто ва ўсім гэтым вінаваты? Бог? Але ці ёсць ён на свеце? Калі няма, дык, выходзіць, вінаваты ва ўсім сам чалавек. Надта ж ён прагны, зайдушчы, многа чаго хоча... Ды і па натуры ж... Ох, якія розныя людзі бываюць!.. Наглядзеўся за свой век. Ну адно, калі подласць з-за карысці чалавек зробіць. Дрэнь, вядома, чалавек, але зразумець яго яшчэ можна. А іншы ж... Без усякай карысці, проста так подласць зробіць. А тая ж зайздрасць? Жаданне вылучыцца, вышэй за іншых

быць? Любым шляхам абараніць тое, што мае? Ды яшчэ і больш усяго займець? Слава? Багацце? Помста? Рэўнасць? Што гэта такое? Быццам знарок усё зроблена, каб няшчасныя людзі былі, каб увесь час між імі ладу не было. Не, тут нешта не ўсё да канца прадумана. Удасканальваць трэба і самога чалавека, і тое грамадства, у якім ён жыве. Браць верх ва ўсім і над усім павінны дабрыня, спачуванне, выручка, узаемадапамога... А ў нас... Выб'ецца наверх, другога нагамі адштурхоўвае, замест таго каб руку падаць...

Сам Васіль Сяргеевіч руку падаваў. І не толькі нам тром, а многім. Бываючы ў яго дома, мы бачылі, як ён і грошы пазычаў, і начлег у сябе на кватэры даваў, і карміў галодных, выручаў тых, хто ў бяду якую-небудзь трапляў. Бывала, калі ні зойдзеш — у Васіля Сяргеевіча госці. То сябры па падполлі, партызанстве з Гомельшчыны прыехалі, то прывалілі шаўцы, тыя, з кім да вайны і пасля вайны боты шыў, абутак рамантаваў, то прыйшлі праведаць таварышы па няшчасці, з якімі ў турме, у высылцы гора дзяліў. Ды і моладзь, асабліва студэнцкая, да яго гарнулася. Не кватэра, а быццам клуб, салон. Каго толькі там не сустрэнеш, чаго не пачуеш! Іншы раз месца ўсім не хапала ў пакоі — дзверы адчынялі, на калідоры тоўпіліся, стаялі. Суседзі, вядома, касавурыліся, але... Я, ва ўсякім выпадку, не чуў, каб сварыліся. Наадварот, іншы раз самі прыходзілі да Васіля Сяргеевіча, каб пасядзець, паслухаць, пра што гутарка ідзе, а то і прыняць, як кажуць, самім актыўны ўдзел. Гарэлкі, віна ў Васіля Сяргеевіча ніколі не пілі. Пілі чай, елі, што было на стале ці прыносілі з сабой. Неяк, калі ў Васіля Сяргеевіча спыталі, адкуль у яго такая гасціннасць і прыветнасць, ён, па звычцы мройна мружачы вочы, прызнаўся:

— Жыццё мяне многаму навучыла. Я ж ніколі адзін нідзе не быў... Увесь час з людзьмі. У кавярні той нашай... У шавецкай майстэрні... У рэдакцыі... Ды і ў турме, у падполлі, у партызанах... Помню, сектант адзін мне трапіўся. За талстоўца сябе выдаваў. Яго ў адну шчаку ўдараць — ён падстаўляе другую. У яго пінжак забяруць — ён кашулю скідае. Думалі напачатку, не ў сваім розуме чалавек, смяяліся з яго, кпілі, пацяшаліся. Голага, як маці нарадзіла, галоднага пакідалі. А ён хоць бы што. Ніколі не плакаў, ніколі не смяяўся. Жыў заўсёды роўна, у адным настроі. І калі ў каго бяда здаралася, першы кідаўся на выручку, падаваў руку, дапамагаў. Я аднойчы загаварыў з ім. І ён...

Божа, як раскрыўся перада мною! Разумнейшы чалавек! І жыў паводле сваёй філасофіі... Нават у турме. Многае з таго, што ён прапаведаваў, чужое мне, не ўзяў я яго з сабою. А вось спачуванне, дапамогу... Узяў. Запомніў на ўсё жыццё яго словы: «Не разважаць трэба, а рабіць. Асабліва калі бяду людскую бачыш, бачыш, што без старонняй помачы не ўстане на ногі чалавек». Дабро не заўсёды, праўда, цэніцца, ды і забываецца многімі. Але некаторыя дабро ўсё ж цэняць і помняць. І вось дзеля такіх дабро і варта рабіць. Дый, у маім разуменні, чалавек на свет нараджаецца, каб рабіць дабро, памагаць адзін аднаму... І, калі добранька падумаць, усе мы таму і жывём, што нам хтосьці ў чымсьці памагае. Ёсць тыя, што шкодзяць, ножку падстаўляюць, але ёсць і тыя, хто памагае. У самыя цяжкія, змрочныя хвіліны раптам руку хтосьці працягне, падасць... У турме, калі я там быў, гэты талстовец знайшоўся, веру, дух мой умацаваў. У высылцы, у Казахстане, калі я з голаду паміраў, нідзе прытулку сабе не знаходзячы, пастух мяне ў стэпе галоднага падабраў, напаіў, накарміў, а потым і атару авец даверыў пасвіць... А ў вайну?.. Вось дзе людзі правяраліся, хто ёсць хто... Пад выглядам падпольшчыка да мяне на кватэру правакатар пранік. Звычайна я людзей распазнаю хутка. А тут памыліўся. Разжалобіў ён мяне, расказваючы, як у турме яго мучылі, білі... Нават пісягі на спіне паказаў ад бізуна. Сказаў, што ён уцёк з турмы. І я, стрэляны верабей, паверыў. А ён, выведаўшы, хто я, мяне выдаў. Прызнаюся — не так шкада сябе было, як шкада кватэры явачнай. Без мяне ж тыя, хто ў лесе, сувязі з горадам, з падполлем не мелі. Ну і што? Не загінуў я. А чаму? Ды таму, што ў нямецкай камендатуры свой чалавек знайшоўся. Правакатара таго, які мяне выдаў, з дарогі прыбраў. І ад мяне пагрозу адвёў... І так ва ўсіх, самых скрутных сітуацыях, у якія трапляў, знаходзіліся тыя, хто мяне выручаў... Ды, пэўна ж, тое самае і ў вас было...

З Васілём Сяргеевічам згаджаліся, ківалі галовамі. Бо, пакапаўшыся ў памяці, кожны знаходзіў «тую працягнутую яму» ў цяжкі момант руку помачы...

— І будзьце самі такія, не бойцеся памагаць чалавеку, рабіць дабро. Калі вас не ацэніць адзін-другі, іншыя ацэняць. Дый не ў гэтым справа — ацэняць ці не ацэняць. Справа ў сумленні сваім. Не будзе яно тачыць, мучыць — чалавеку трэба было памагчы, а ты не памог... Бо з усяго самага каштоўнага, што прыдумала і вынайшла чалавецт-

ва, спачуванне, дапамога, можа быць, самыя найкаштоўныя. Гэта я цвёрда помню, ведаю...

Ва ўсіх самавукаў, як я заўважыў, ёсць дзіўная абмежаванасць: ісціна, якую ён пазнае з вялікай цяжкасцю, здаецца яму канчатковая і вядомая толькі яму аднаму. У Васіля Сяргеевіча гэтага не было. Тое, што ведаў ён, свае жыццёвыя назіранні і вынашаныя гадамі думкі ён як бы супастаўляў з тым, што ведаюць іншыя. І радаваўся, калі іх аспрэчвалі, не згаджаліся.

— Толькі ў спрэчках нараджаецца ісціна, гэта недарэмна кажуць,— любіў паўтараць ён.— Бо ў мяне свой вопыт, свой круг знаёмых і кніг, свая жыццёвая аснова, а ў іншых... Таксама ўсё сваё. Чаму ж не супаставіць, што ведаю я, з тым, што ведае яшчэ хтосьці? Дый дамаседная мудрасць часта на праверку аказваецца зусім не мудрасць, а дурасць...

Цікавасць у Васіля Сяргеевіча да ўсяго, дзе што робіцца, была вялікая. Як пабываеш у камандзіроўцы — роспытам няма канца. Асабліва хвалявала яго жыццё вёскі. Можа, таму, што сам ён быў гараджанін, вёску не ведаў так, як хацелася ведаць.

— Я, лічы, толькі ў першы год вайны ў вёсцы жыў... Але ж, вы самі ведаеце, то была іншая вёска. Распадаліся калгасы, вярталася аднаасобніцтва... Ды і іншы прымітыўны промысел... Жорны, ступы, кросны... Здалося хіба толькі мне, што сельскі чалавек больш творца, чым гарадскі. Ён ва ўсім свой лад і парадак наводзіць. Жанчына — у хаце, у ядзе, у адзенні, у гародзе... Мужчына — у двары, у полі, на лузе. Дый гэта ж наогул здорава — узараць поле, пасеяць зерне, чакаць, калі яно ўзыдзе, калі нешта зацвіце, вырасце, паспее... Ды і на прыродзе ж увесь час — бачыць сонца, неба, зяляніну, каня, вала, карову, свінню, курыцу, качку, гусь... І дбаць не толькі пра сябе, сваіх дзяцей, але і пра ўсё жывое... Каб не галоднае, напоенае яно было... Не, гарадскі чалавек пазбаўлены многіх рыс, якія ўласцівы вяскоўцу...

У тыя гады ішла інтэнсіўная механізацыя сельскай гаспадаркі, што рабіла з вясковага чалавека не творцу, а хутчэй звычайнага выканаўцу запланаваных кімсьці іншым працэсаў. Да таго ж працадзень быў куцы, і многія кідалі вёску, уцякалі ў горад. Селянін цураўся зямлі. І нас, дзяцей вёскі, гэта хвалявала, трывожыла.

— Старыя адны астаюцца ў вёсцы. Тыя, каму няма куды падавацца,— казалі мы са скрухай, прызнаваліся

Васілю Сяргеевічу.— Хто працаваць будзе на зямлі, хто будзе карміць нас, дармаедаў?

— А тэхніка навошта ж? — глядзеў на нас, як на недасведчаных, цёмных людзей, Васіль Сяргеевіч.

— Тэхніка ніколі не заменіць людзей. А тым больш у полі, у лузе, у такой галіне, як жывёлагадоўля,— не згаджаліся мы.— Рукі, чалавечыя рукі — ласкавыя, добрыя — там трэба...

Не менш, чым вёска, хваляваў Васіля Сяргеевіча і горад. Знішчаліся ж, руйнаваліся проста на вачах старыя кварталы,— дамы, цэрквы, іншыя збудаванні, якім было па некалькі стагоддзяў. Пракладваліся новыя шырокія магістралі, праспекты, вуліцы, узводзіліся шматпавярховыя дамы.

— Добра, усё гэта добра, аднак жа... Быццам сённяшні горад, мінулага, гісторыі не відаць... Ну, тое, што разбурана ў вайну,— няхай сабе... Хаця сёе-тое аднавіць трэба было б, каб твар горада захаваць. Але каб знішчаць цэлыя кварталы падчыстую... Падышоў нядаўна я да аднаго прараба, пытаю, што гэта ён робіць. А якраз разбуралі дом, якому больш за трыста гадоў. «Будаўнічую пляцоўку рыхтуем...» Бачыце, каб будаваць, выходзіць, трэба збудаванае раней знішчыць, падрыхтаваць будаўнічую пляцоўку. А назвы вуліц? Учора — адна назва была, сёння — ужо іншая. І гэта не дробязі. Так мы адбіраем у людзей памяць, з патрыётаў робім перакаці-поле... Інтэлігентнасці ў многіх дзяцей «пана сахі і касы» не хапае, духоўнай культуры...

Асабліва абурала Васіля Сяргеевіча няўвага да свайго, створанага на працягу стагоддзяў самім нашым беларускім народам.

— Хапаем вяршкі чужога, часам не лепшага, а якраз горшага, смакуем, прапагандуем, захапляемся... А сваё — глыбы цэлыя! — ляжыць некранутае. Вазьміце той самы фальклор... Колькі мудрасці там, паэзіі!.. Ды і літаратура! Яна ж у нас... Дай Бог, як кажуць, кожнаму народу такую мець. А ў нас... Нават чытаць яе ў арыгінале не хочуць. Што гэта?.. Ды калі не навучыць людзей любіць сваё — мову, зямлю, наша мінулае, бацькоў, дзядоў, прадзедаў — хто ж абараняць Радзіму нашу будзе на выпадак вайны? Няма нічога дарагога ў чалавека на зямлі, то і зямля гэтая яму не дарагая, яна яму чужая...

Я — ды і мае сябры — Сымон і Язэп — надта ж прагнулі ведаў. І пасля лекцый ва універсітэце нам заўсёды хацелася пабываць яшчэ і на кватэры ў Васіля Сяргеевіча.

А то і паспрачацца з ім ці з тымі, хто ў гэты час быў у яго дома. Можа, таму, што мы шмат ездзілі, сустракалі, бачылі іншых людзей, мы адчувалі пульс жыцця, ведалі, што яно не стаіць на месцы, ідзе, імкліва ідзе наперад. Асабліва гэта відаць было пасля XX з'езда партыі. І мы іншы раз перапынялі Васіля Сяргеевіча, гаварылі, што не ўсё ў нас так блага, як можа сяму-таму здацца. Ёсць здаровыя сілы, якія акумулююць, збіраюць вакол сябе ўсё лепшае, перадавое.

Ды ён, Васіль Сяргеевіч, і сам бачыў, што жыццё мяняецца. І не да горшага, а да лепшага. І гэта яго натхняла, яму добра пісалася. Напоўненыя роздумам, глыбокія і памайстэрску дасканалыя, таленавітыя творы Васіля Сяргеевіча друкаваліся ў часопісах і газетах, выходзілі асобнымі кнігамі. Як пра паэта пра яго шмат гаварылі — на пісьменніцкіх сходах, па радыё і тэлебачанні, пісалі ў друку. Палепшылі яму і жыллёвыя ўмовы — далі асобную двухпакаёвую кватэру. Мы, яго прыхільнікі і сябры, памаглі яму ў яе пераехаць, памаглі выбраць і прывезці новую мэблю. Цяпер ніхто ўжо не замінаў у гэтай кватэры і яду гатаваць, і збірацца. Ды і начаваць, калі спрэчкі зацягваліся за поўнач.

Тут, на новай кватэры, я сустрэў і тую, хто прынёс мне самую вялікую радасць і самае вялікае гора, якія толькі я спазнаў у жыцці...

...У той вечар я прыйшоў да Васіля Сяргеевіча нешта вельмі рана. Адчыніў дзверы — яны ў Васіля Сяргеевіча ніколі не замыкаліся, і ўсе, хто ў яго бываў, гэта ведалі. Зняўшы паліто і разуўшы чаравікі, я, як і заўсёды, пакіраваўся ў першы, самы вялікі пакой, што быў за залу. І разгубіўся — у пакоі стаяла надта ж мілая светлавалосая дзяўчына, апранутая ў блакітную сукенку, што зваблівa аблягала гнуткі і тонкі стан. Дзяўчына як бы са спалохам паглядзела на мяне, я — на яе. І адразу ж быццам сонца зазірнула, усміхнулася — пасвятлела ў мяне на душы. Жанчыны, дзяўчаты ў Васіля Сяргеевіча бывалі. Але такія, такая...

Васіль Сяргеевіч, бачачы маю разгубленасць, тут жа кінуўся мяне знаёміць з дзяўчынаю. Звалі яе Таня, вучылася яна ў музычным вучылішчы.

— Гэта дачка гаспадыні, дзе я некалі кватараваў у Гомелі... Тады, вядома, яна была зусім маленькая,— гаварыў, усміхаючыся, Васіль Сяргеевіч.— Па падлозе поўзала... А цяпер... Нявеста!

— Таксама скажаце,— зачырванелася дзяўчына.

— А што? — усміхаўся Васіль Сяргеевіч.— Пазнаёмішся тут з маімі хлопцамі, і вяселле згуляем. Глядзі,— паказаў ён вачыма на мяне,— чым не жаніх?

Прыйшоў да Васіля Сяргеевіча бібліятэкар — стары, лысаваты і, як мне здавалася, даволі нудны, буркатлівы чалавек, што сяды-тады прыносіў новыя кнігі, да якіх Васіль Сяргеевіч быў вялікі ахвотнік. І жартоўны тон размовы давялося спыніць. А за бібліятэкарам пачалі і іншыя наведвальнікі прыходзіць. Адзін за адным. Ледзь зачыняцца дзверы, чуеш — зноў адчыняюцца, зноў хтосьці ідзе. І Таня, не прывыкшы да шматлюддзя, засаромелася раптам і сабралася ісці. Я вызваўся яе правесці.

На дварэ было ціха і неяк глуха,— падаў снег. У святле ліхтароў сняжынкі быццам мак таўклі — мільгацелі, мітусіліся, нібы не ведалі, што ім рабіць, дзе садзіцца, куды падаць. І мы з Таняй спыняліся раз-пораз, любаваліся імі.

Жыла Таня ў інтэрнаце. І падышоўшы да яго, паглядзеўшы на пяціпавярховую, усю ў вокнах каробку, што была з усіх бакоў абчапляна сетачкамі, торбачкамі, пасылачнымі скрынкамі, мне не захацелася адпускаць туды дзяўчыну. Ёй таксама, відаць, не вельмі хацелася ісці ў інтэрнат, і мы не спыняючыся пабрылі па вуліцы далей. Наблізіліся да кінатэатра, я прапанаваў паглядзець фільм. Фільм быў новы. Але, калі купілі білеты, нам раптам расхацелася глядзець кіно, і мы падаліся ў парк.

Снег усё гэтак жа паволі і ціха, зусім нячутна, мякка садзіўся на дрэвы, на зямлю, на нас, і мы любаваліся яго белізной і тым, як ён раптам папрыгінаў сваім цяжарам, аж ламаў пухнатыя галіны елак, сосен. Дзіўна, але мы амаль ні пра што не гаварылі — нам было добра удваіх.

Вярнуліся да Танінага інтэрната мы апоўначы. Дзверы ўжо былі замкнуты, і нам давялося доўга грукаць, будзіць дзяжурнага. Я ж, расстаўшыся з Таняй, так і не пайшоў спаць. Усю ноч праблукаў па горадзе ў нейкім як бы незвычайным чароўным одуме.

З таго вечара мы з Таняй пачалі сустракацца часта, а потым і штодзень. І на кватэры ў Васіля Сяргеевіча, і на вуліцы, у кінатэатрах, у бібліятэках, у парках, скверах. І калі бачыў я Таню, аставаўся з ёю адзін на адзін, забываў на ўсё на свеце. Нават на час, які бег надта ж імкліва і якога ніколі ў мяне не хапала.

На пятым курсе я зрабіў Тані прапанову, і яна згадзілася выйсці за мяне замуж.

Васіль Сяргеевіч, здавалася, больш за нас дваіх рады быў гэтай падзеі. Ён і падарунак нам дарагі купіў, і вяселле за свае грошы ў рэстаране справіў, і на першую шлюбную ноч да сябе на кватэру пусціў. А потым, калі мяне пакінулі ў Мінску працаваць, то і прапісаў, дазволіў у сябе пажыць, пакуль мы не знайшлі, не нанялі пакойчык у прыватным драўляным доме на Камароўцы. Ён быў нам з Таняй не толькі як старэйшы таварыш і сябра, а і за бацьку — апекаваўся, памагаў.

— У мяне сваіх дзяцей няма, будзьце за іх вы,— казаў ён, як заўсёды зычліва ўсміхаючыся.

З маёй жаніцьбай наша кампанія — «святая тройца», як нас называлі,— паступова распалася. Язэп паехаў на працу па размеркаванні ў раённую газету. Сымон хоць астаўся ў Мінску, але таксама неўзабаве ажаніўся. Само сабой, вядома, завяліся ў кожнага з нас і сякія-такія грошы. Але да Васіля Сяргеевіча мы ўсё адно хадзілі, хоць, можа, і не так часта, як раней. Ён рады заўсёды быў усім, хто да яго прыходзіў,— частаваў, паіў чаем. Асабліва радаваўся ён, калі я прыходзіў да яго з жонкаю.

— Вось як я вас сасватаў,— казаў ён Тані і мне.— Да скону дзякаваць будзеце. Такая нявеста! І такі жаніх!

Ён яўна любаваўся намі, а можа, трошкі і зайздросціў. Часы ж змяніліся, ішло зусім інакшае жыццё. Праўда перамагала няпраўду, здаровы чалавечы сэнс браў верх над хцівасцю, зайздрасцю, мярзотнасцю ды і іншымі не лепшымі чалавечымі якасцямі. Ніхто больш не ўспамінаў, не папракаў мяне Нямеччынай, тым, што вызвалілі амерыканцы. Больш таго — я неўзабаве атрымаў павышэнне па службе, а потым і кватэру. Невялікую, двухпакаёвую, але вельмі ўтульную. Мы з Таняй падумвалі пра дзіця.

— Няхай, вось экзамены здам, паступлю ў інстытут, а тады можна і дзецьмі заняцца,— казала яна.

І я верыў — так яно і будзе.

І так яно, мабыць і было б. Але...

Не, пра тое лепш не ўспамінаць. Ды яшчэ на ноч.

...Нам з Таняй захацелася пабываць на поўдні, адпачыць на беразе Чорнага мора. Пуцёвак у дом адпачынку мы не дасталі, ды гэта нас не засмуціла — тысячы, мільёны людзей адпачываюць штогод «дзікунамі», чаму мы таксама не можам гэтак жа адпачыць. Вырашылі зрабіць так — я паеду спярша адзін, знайду жыллё. І дам Тані тэлеграму. Яна ж тым часам пераведае маці ў Гомелі, а ўжо адтуль прыляціць на самалёце да мяне.

На поўдні, калі я туды прыехаў, было надзіва цёпла. Нават уночы. Ласкавае, чыстае, зусім без хмар неба, спакойнае сіняе мора, усыпаныя залацістым пяском берагі, што акружаны абпушанымі зялянінай гарамі... А паветра — якое паветра! Дыхаеш — і надыхацца не можаш.

«Хоць раз ды па-людску адпачнём»,— падумаў я.

Мне пашанцавала, я без асаблівай цяжкасці знайшоў даволі вялікі пакой у пасёлку на самым беразе мора. Адразу ж даў тэлеграму ў Гомель. І ў той жа дзень атрымаў адказ. «ВЫЛЯТАЮ ЗАЎТРА НЕ СУСТРАКАЙ ДАБЯРУСЯ САМА ТАНЯ».

Я чакаў. Чакаў дзень, чакаў два, чакаў тры... І толькі на чацвёрты, паехаўшы ў Сімферопаль, даведаўся, што самалёт, якім ляцела Таня, пацярпеў авіякатастрофу — упаў у мора. Разам з усімі пасажырамі...

Вядома, я не паверыў таму, што пачуў. Дакладней, не паверыў, што там, у тым самалёце, была Таня. Даў тэлеграму ў Гомель, пабываў на месцы, дзе пацярпеў самалёт авіякатастрофу. Потым вярнуўся ў Мінск, з'ездзіў у Гомель... Тані нідзе не было, яна, хоць у гэта і цяжка, немагчыма было паверыць, усё ж ляцела тым самалётам...

З паўгода я не знаходзіў сабе нідзе месца, усё думаў пра Таню, чакаў яе — вось-вось з'явіцца, прыедзе. Не можа быць, каб яна загінула, пакінуўшы жыць мяне аднаго.

Але, як я ні чакаў, Тані не было.

І тады я зноў зачасціў да Васіля Сяргеевіча. І таму, што ён цяжка захварэў, і... На кватэры ж у Васіля Сяргеевіча я ўпершыню ўбачыў, сустрэў Таню. Тут, на гэтай кватэры, мы правялі з ёю першую нашу шлюбную ноч, тут мы нейкі, самы шчаслівы час, жылі. І, калі я засяроджваўся ў сваіх думках, змаўкаў, мне здавалася — вось-вось адчыняцца дзверы і я ўбачу Таню — светлавалосую, апранутую ў блакітную сукенку, што надта ж звабліва аблягала талію і стан... Такую, якую я і ўбачыў некалі ўпершыню тут.

«А калі не будзе Васіля Сяргеевіча, памрэ ён, то... Разам з ім памрэ і многае з таго, што я пе       ражыў, зведаў...»

Мне шкада было і Васіля Сяргеевіча і ўсяго таго, што звязвала мяне з ім, з яго кватэрай. Шкада да слёз. І я, вяртаючыся апоўначы дадому, плакаў. Нішто ў жыцці не паўтараецца. А хацелася, як хацелася, каб многае з таго, што было,— паўтарылася. Ці хоць бы не памерла, не адышло ў нябыт...

*1987 г.*

# Змест


Баравое рэха — — — — — — — — — — — — 7
Запіскі Занядбайлы — — — — — — — — — — 62
Не на той вуліцы — — — — — — — — — — 103
Дарога ў Хатынь — — — — — — — — — — 213
Забытыя селішчы — — — — — — — — — — 257
Горкая радасць вяртання — — — — — — — — 295
Еўка — — — — — — — — — — — — — — 329
Родны кут — — — — — — — — — — — — 361
Незваротнае — — — — — — — — — — — 471

**Сачанка Б.**

С22 Выбраныя творы. У 3 т. Т. 3. Аповесці.— Мн.: Маст. літ., 1995.—511 с.

ISBN 5-340-01433-9.

У апошні, трэці том выбраных твораў вядомага беларускага пісьменніка Барыса Сачанкі ўвайшлі аповесці, героямі якіх з'яўляюцца простыя людзі-працаўнікі.

С $\frac{4702300000-015}{М 302(03)-95}$ 99—95

ББК 84(4Беи)6

Літаратурна-мастацкае выданне

**САЧАНКА**

**Барыс Іванавіч**

*Выбраныя творы ў трох тамах*

**ТОМ 3**

АПОВЕСЦІ

Рэдактары С. Р. Прыгодзіч, Г. В. Роліч. Мастак В. А. Губараў. Мастацкі рэдактар А. І. Цароў. Тэхнічны рэдактар М. Ц. Папкова. Карэктары А. Т. Глушчанка, І. М. Паланейчык.

Здадзена ў набор 20.07.94. Падп. да друку 08.11.94. Фармат 84×108¹/₃₂. Папера друк. № 1. Гарнітура звычайная новая. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 26,88. Ум. фарб.-арк. 26,88. Ул.-выд. арк. 30,58. Тыраж 5000 экз. Зак. 995.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. Ліцэнзія ЛВ № 3. 220600. Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Барыс
САЧАНКА

3

Выбранае